ПАНЯЦЬ

ПАНЯЦЬ

ШКАЛОЎСКІ РАЁН

ГІСТОРЫКА-
ДАКУМЕНТАЛЬНЫЯ
ХРОНІКІ
ГАРАДОЎ І РАЁНАЎ
БЕЛАРУСІ

ШМАТТОМНАЕ
ВЫДАННЕ
СТВАРАЕЦЦА
ПАВОДЛЕ
РАШЭННЯ
ЎРАДА
РЭСПУБЛІКІ
БЕЛАРУСЬ

ПАМЯЦЬ

ШКЛОЎСКІ РАЁН

Мінск
"Універсітэцкае"
1998

947.64
63.3 (4Беи)
П 15

Рэдакцыйная калегія:

Л. М. АНЦІПЕНКА, У. К. КАСЬКО, Г. М. ЛАЎРАНКОЎ, Л. Г. ЛЯПІЛА,
Г. Л. НАПРЭЕЎ, А. Л. ПЕТРАШКЕВІЧ, М. П. ХОБАТАЎ, М. Р. ЯРОМІЧ

РАЁННАЯ КАМІСІЯ ПА СТВАРЭННІ
ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНАЙ ХРОНІКІ «ПАМЯЦЬ»:

М. Р. ЯРОМІЧ (старшыня), М. П. ЧАПЯЛІНСКІ (нам. старшыні),
Л. М. АНЦІПЕНКА, Т. А. БАЯНАВА, Г. А. ВАЛОЗІНА, А. П. ГРУДЗІНА,
М. Ф. ІЛЬЮШЭНКА, У. А. ПАЎЛАЎ, А. Л. ТУРБІНСКІ

АРГАНІЗАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНЫ ЦЭНТР
ПА ВЫДАННІ ГІСТОРЫКА-ДАКУМЕНТАЛЬНЫХ ХРОНІК «ПАМЯЦЬ»
ДЗЯРЖАЎНАГА КАМІТЭТА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ ПА ДРУКУ:
Л. ПЕТРАШКЕВІЧ (кіраўнік цэнтра), У. І. ЛЕМЯШОНАК (галоўны рэдактар),
М. З. БАШЛАКОЎ (галоўны метадыст)

Рэдактар-укладальнік Г. Л. НАПРЭЕЎ

Мастак Э. Э. ЖАКЕВІЧ

Распрацоўка мастацка-тэхнічнага афармлення серыі В. А. РАГАЛЕВІЧА

985-09-0250-7

© Выдавецтва «Універсітэцкае», 1998

Шклоў. Выгляд з узбярэжжа Дняпра. 1996 г.
Упершыню ўпамінаецца:

1520 г.	У дакументах пасла Польскага каралеўства Герберштэйна ў час яго дыпламатычнага падарожжа ў Маскву
1535 г.	Калі быў спалены кн. Шуйскім
1762 г.	Шклоў атрымаў права горада (пазней стаў лічыцца мястэчкам)
1772 г.	Па першым падзеле Рэчы Паспалітай Шклоўшчына ўваходзіць у склад Расійскай імперыі

Этнаграфічны куток краязнаўчага музея СШ № 4 г. Шклова

1997 г.

Гісторыка-краязнаўчыя музеі дзейнічаюць у Шклове, у Заходскай, Старасельскай, Чарнарудкай і Фашчаўскай сярэдніх школах, калгасе імя Фрунзе. Працуюць каля дзесятка фальклорных калектываў пры клубах і Дамах культуры. Больш тысячы ўмельцаў займаюцца рознымі народнымі промысламі

ДА ЧЫТАЧА

Кніга, якую Вы ўзялі ў рукі, — асаблівая. Гэта першая ў гісторыі Шклоўшчыны дакументальная хроніка жыцця краю з часоў сівой даўніны да сучаснасці. «Памяць» адлюстроўвае большасць значных і важных падзей, што адбываліся на тэрыторыі, з якой склаўся сучасны адміністрацыйны раён. Па магчымасці поўна падаецца гісторыка-археалагічная, этнаграфічная і архітэктурная спадчына, важнае месца займаюць матэрыялы аб развіцці эканомікі, вытворчых адносін на розных этапах гісторыі.

Шмат старонак адведзена расказам пра людзей, якія змагаліся за волю і лепшую долю, былі актыўнымі ўдзельнікамі рэвалюцыйнай барацьбы ў дакастрычніцкі час, змагаліся за новы грамадскі лад пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Шырока асвятляюцца складаныя, а часам драматычныя грамадска-палітычныя падзеі 30—40-х гг. XX стагоддзя, Вялікай Айчыннай вайны, пасляваеннага адраджэння і развіцця народнай гаспадаркі, культуры. Прыводзяцца звесткі пра ўраджэнцаў Шклоўшчыны — вучоных, пісьменнікаў, дзяржаўных дзеячаў, герояў працы, іншых заслужаных людзей. Замалёўкі пра іх лёсы, біяграфічныя даведкі — жывая тканіна гісторыі краю, прыклад дастойнай жыццядзейнасці.

«Памяць», разам з тым, кніга па ўвекавечанні імёнаў людзей, якія загінулі ў розныя часы пры абароне Радзімы, пры выкананні грамадскага і ваеннага абавязку, інтэрнацыянальнага доўгу, на франтах, у падполлі, партызанах, прапалі без вестак у час баявых дзеянняў, былі закатаваны гітлераўцамі. Названы таксама імёны людзей, якія пацярпелі ад палітычных рэпрэсій 20—50-х гг. і былі рэабілітаваны ў апошнія гады дзяржаўнымі і праваахоўнымі органамі.

У кнізе выкарыстаны матэрыялы і дакументы архіваў былога СССР, Нацыянальнага і іншых архіваў Рэспублікі Беларусь, нацыянальнай, урадавай, акадэмічнай і іншых бібліятэк, публікацыі ў перыядычных выданнях розных гадоў. У пошукавай рабоце, акрамя навукоўцаў, прымалі ўдзел мясцовыя краязнаўцы, журналісты, супрацоўнікі рэдакцыі райгазеты, ваенкамата, іншых устаноў. На жаль, у жорсткі час ваенных ліхалецця і па іншых прычынах нямала дакументаў незваротна загінула. Таму не ўдалося пазбегнуць «прабелаў» — асобныя падзеі асветлены не так ярка ці нават зусім не ўпамінаюцца; не выяўлены ў поўнай меры імёны загінуўшых у першую сусветную, грамадзянскую, савецка-фінляндскую войнах, на Халхін-Голе, пры вызваленні Заходняй Беларусі. Уважлівы чытач, напэўна, знойдзе і іншыя недахопы выдання. Тым не менш, на наш погляд, кніга будзе карыснай для кожнага, хто цікавіцца гісторыяй свайго краю, сваёй «малой» Бацькаўшчыны.

ШКЛОЎСКІ РАЁН



Шклоўскі раён утвораны 17.07.1924 г. на тэрыторыі Гарадзішчанскай, Нічыпаравіцкай, Любініцкай, Старасельскай, Таўпечыцкай, Чарнаруцкай і Шклоўскай валасцей у складзе Магілёўскай акругі (да 26.07.1930 г.). З 15.01.1938 г. — у Магілёўскай вобласці. Плошча — 1,33 тыс. км². Падзяляецца на 12 сельсаветаў. Населеных месцаў — 212. Цэнтр — г. Шклоў.

Раён размешчаны ў межах Аршанска-Магілёўскай раўніны, заходзяць адгор'і Аршанскага ўзвышша. Карысныя выкапні: радовішча торфу Смятанка, 6 радовішчаў цагельнай сыравіны, 3 радовішчы пясчана-жвіровага матэрыялу, 3 радовішчы будаўнічых пяскоў. Рэкі: Днепр з прытокамі, Бася (бас. Сожа). Глеба ў асноўным дзярнова-падзолістая. Пад сельгасугоддзямі 67,0 %, пад лесам — 18,1 % тэрыторыі.

Прамысловыя прадпрыемствы: ААТ папяровая фабрыка «Спартак», мэблевая фабрыка, ільнозавод, завод дарожна-будаўнічых матэрыялаў, камбікормавы і малочны заводы, Гарадзішчанскі і Латвянскі цагельныя заводы; камбінаты: будматэрыялаў і вырабаў, кааператыўнай прамысловасці, бытавога абслугоўвання; будаўнічыя арганізацыі: МПМК-283, ПМК-105, дарожна-рамонтна-будаўнічае ўпраўленне 175, гаспадарча-разлікова-будаўнічы ўчастак, РМУ Віцебскага РБУ, раённае аграпрамысловае прадпрыемства матэрыяльна-тэхнічнага забеспячэння, райсельгасхімія, раённая друкарня, прадпрыемства па вытворча-тэхнічным абслугоўванні сельскай гаспадаркі, вытворча-эксплуатацыйнае прадпрыемства па энергетыцы. У раёне 23 калгасы, 4 саўгасы, эксперыментальная база «Спартак» па вырошчванні насеннай бульбы, каля 100 фермерскіх гаспадарак.

Раён перасякаюць чыгунка і шаша Орша — Магілёў, аўтамабільныя дарогі злучаюць Шклоў з Бялынічамі, Горкамі і Круглым. У 1996 г. было 15 сярэдніх, 8 няпоўных сярэдніх, 5 пачатковых школ, 2 школы-інтэрнаты, сярэдняе прафесійна-тэхнічнае вучылішча, дзіцяча-юнацкая спартыўная і музычная школы, 29 дашкольных устаноў, 25 клубных устаноў, 34 масавыя бібліятэкі, 19 кінаўстановак, 6 бальніц, 29 фельчарска-акушэрскіх пунктаў, выдаецца раённая газета «Ударны фронт».

АД ЧАСОЎ ПЕРШАБЫТНЫХ

1917

ЗЯМЛЯ НАШЫХ ПРОДКАЎ

У геаграфічных адносінах землі сучаснага Шклоўскага раёна знаходзяцца ў межах Аршанска-Магілёўскай раўніны, якая ўяўляе сабой платопадобную хвалістую паверхню з вышынямі ад 150 да 200 м над узроўнем мора і складзеную маламагутнымі лёсападобнымі суглінкамі і супесямі, на якіх пераважаюць дзярнова-падзолістыя глебы. Паблізу рэк мясцовасць расчленена глыбокімі ўрэзамі шматлікіх раўкоў і лагчын, на крутых схілах якіх агаляюцца чырвона-бурыя марэны — адкладанні ледніковага перыяду.

На тэрыторыі раёна працякае Днепр, самая значная рака Беларусі, якая адыгрывала важную ролю ў старажытнасці. Пракладка сухапутных дарог праз цяжкапраходныя лясы і балоты была справай нялёгкай і не заўсёды выканальнай. Заўсёды рака была самай зручнай дарогай, і падарожжа па ёй не патрабавала асаблівых намаганняў, ці то было плаванне ў лодках, ці перамяшчэнне зімой на санях. Ужо ў гістарычны час Дняпроўская рачная магістраль служыла воссю гандлёвых і палітычных сувязей паміж усходнеславянскімі плямёнамі. Па ёй жа праходзіў легендарны шлях «з варагаў у грэкі». Рачная даліна, багатая рыбай, птушкай, зверам, расліннасцю, была цудоўна прыстасавана для пражывання паляўнічых плямёнаў, збіральнікаў і рыбакоў, а пазней — земляробаў і жывёлаводаў. І людзі заўсёды выкарыстоўвалі прыроднае асяроддзе і ўмовы мясцовасці для паселішчаў, астаткі якіх дайшлі да нас у выглядзе помнікаў археалогіі.

З гісторыі вывучэння археалагічных помнікаў

Многія археалагічныя помнікі Шклоўшчыны вядомы па літаратуры ніча з мінулага стагоддзя. Так, у 1873 г. па прадстаўленні прафесара Д. Я. Самаквасава праз губернскія статыстычныя камітэты былі сабраны звесткі пра гарадзішчы і курганы на тэрыторыі Расіі. Для сучаснай Магілёўскай вобласці, у тым ліку і для Шклоўскага раёна, гэта былі звесткі пра помнікі археалогіі, якія не страцілі значэння да нашых дзён.

Па звестках 1873 г., на тэрыторыі раёна было зафіксавана 25 археалагічных аб'ектаў, у тым ліку гарадзішчы ў вёсках Благаўка, Гарадзец, Азер'е (Плешчыцы), Сісенева, Смятанічы, і 12 курганных могільнікаў. Пачатак вывучэння славянскіх курганоў на Шклоўшчыне таксама адносіцца да другой па-



Схема размяшчэння помнікаў археалогіі

ловы XIX ст. і звязаны з працамі археолага генерала Н. М. Турбіна, які раскапаў каля в. Дымава 12 насыпаў, што належалі крывічам.

Далейшае даследаванне археалагічных старажытнасцей раёна праводзілася вядомым беларускім этнографам і археолагам Е. Р. Раманавым. У 1895—1906 гг. ён працаваў інспектарам народных вучылішчаў Магілёўскай губерні і збіраў матэрыялы для «Археалагічнай карты Магілёўскай губерні», якую меў намер апублікаваць да адкрыцця IX археалагічнага з'езда ў Вільні (жнівень 1893 г.). Па яго данespecially, да 1892 г. на Шклоўшчыне было вядома 6 курганных могільнікаў, поўнасцю або часткова разбураных у наступны час: Благаўка (20 насыпаў), Дубраўка-2 (36), Карасі (1), Ордаць (15), Русакі (20), Сліжы (23). На старонках неафіцыйнай часткі газеты «Магілёўскія губернскія ведамасці» Е. Р. Раманаў апублікаваў артыкул «Раскопкі ў маёнтку Чырчына» аб даследаванні курганоў каля в. Тройца Шклоўскага раёна.

У 30-х гг. нашага стагоддзя А. Д. Каваленя адкрыў стаянку неаліту ў в. Новыя Стайкі. У 1936 г. вывучэннем помнікаў ранняга жалезнага веку займаўся В. Р. Тарасенка. Ён абследаваў гарадзішчы і селішчы каля вёсак Гарадок (Крывель), Плешчыцы, Ржаўцы, Хоцімка і атрымаў новыя цікавыя матэрыялы.

У пасляваенны перыяд археалагічнае вывучэнне Шклоўскага раёна прыкметна актывізавалася. У 1963 г. І. І. Арцёменка абследаваў стаянкі неаліту каля вёсак Новыя Стайкі і Ржаўцы, раскапаў курганы каля вёсак Пруды і Новыя Стайкі. У 1964—1965 гг. Г. Ф. Салаўёва раскапала курганныя могільнікі паблізу вв. Пруды і Царковішча і ажыццявіла шурфаванне гарадзішча каля в. Царковішча. Вынікам работы з'явілася адкрыццё на тэрыторыі раёна курганных пахаванняў з трупаспаленнем, якія належалі балтам, а таксама выяўленне захаванняў крывічоў у могільніку каля в. Пруды.

У 1968 г. Г. В. Штыхаў, а ў 1979 г. В. М. Ляўко даследавалі гарадзішча Хоцімка, на месцы якога знаходзіўся Стары Шклоў. А. А. Выржыкоўскі ў 1969 г. даследаваў 2 курганных насыпы каля в. Капысіца і адкрыў групавое захаванне без пахавальнага інвентару.

Далейшае археалагічнае абследаванне раёна было звязана з падрыхтоўкай да выдання «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі. Магілёўская вобласць». У выніку Шклоўшчына двойчы (у 1978 і 1983 гг.) вывучалася В. М. Ляўко.

З 1973 па 1991 г. сістэматычныя работы ў раёне праводзіліся археалагічным атрадам гістарычнага факультэта Магілёўскага педінстытута імя А. А. Кулешова пад кіраўніцтвам В. Ф. Капыціна. Было вывучана старажытнейшае паселішча каля в. Малое Зарэчча (83 м²) і адкрыта 3 стаянкі каменнага веку, 8 гарадзішчаў ранняга жалезнага веку, 11 курганных могільнікаў і 1 селішча эпохі Старажытнай Русі. У выніку ў Шклоўскім раёне абследавана каля сотні захаваўшыхся помнікаў археалогіі, матэрыялы якіх дазваляюць, у агульных рысах, узнавіць старажытную гісторыю гэтага своеасаблівага кутка Беларусі.

Паселішчы каменнага і бронзавага вякоў

Першыя пасяленні старажытных людзей на тэрыторыі сучаснага Шклоўскага раёна ўзніклі яшчэ ў канцы старажытнакаменнага веку — палеаліту (10—12 тыс. гадоў таму). Але месцаў пражывання таго часу вядома нямнога. Адно з іх размешчана на левым карэнным беразе Дняпра, у 0,5 км на паўднёвы ўсход ад в. Малое Зарэчча (Шклоў Зарэчны). На разараным полі зафіксавана два скапленні апрацаванага крэменю дыяметрам каля 5 м, якія стаяць адзін ад другога па лініі поўдзень — поўнач на 35 м. Відавочна, што гэта астаткі на шклоўскай зямлі старажытнага жылля, пакінутыя паляўнічымі на паўночнага аленя. Вакол жылля сабраны чарашковыя наканечнікі стрэлаў, канцавыя скрабкі, у тым ліку двайныя, рэтушаваныя і двухгранныя разцы, камбінаваныя прылады (скрабкі-разцы), вастрыі, праколкі. Гэта тыповы набор прылад палявання і вынікаў яго апрацоўкі. На месцы пасялення рабілася і першасная апрацоўка крэменю, на што ўказваюць знаходкі нуклеусаў, а таксама пласцін і адшчэпаў, якія з іх скалываліся.

З'яўленне тут першых насельнікаў стала магчымым пасля адступлення апошняга ледніка, які 17—18 тыс. гадоў таму прасунуўся на шыроты Оршы, змятаючы ўсё на сваім шляху. Вялізная колькасць талай вады сцякала па Дняпры, узровень якога быў значна вышэй за сучасны. Па прасторах прыледнікавай тундры блукалі гурты жывёлін: маманты, касцявыя астанкі якіх знаходзяць у Шклове і наваколлі, ваўняныя насарогі, паўночныя алені. Побач з імі пастаянна знаходзіліся драпежнікі: пясцы, ваўкі, гіены. Да пачатку апошняга міжледнікоўя — галацэна (у перакладзе з грэчаскай — «самае новае жыццё») і пры паступовым пацяпленні мамантавая фауна распалася. Адны жывёліны прасунуліся на поўнач следам за адступаючым ледніком (пяс-

цы, паўночныя алені), другія (маманты, ваўняныя насарогі) — вымерлі. У выніку пацяплення тэрыторыя сучаснай Паўночнай Беларусі вызвалілася ад лёду, змяніліся ландшафты і раслінае покрыва.

Вышэйназваныя змены адбыліся ў позналедніковы час, ад 14 да 10 тыс. гадоў таму, калі клімат быў асабліва няўстойлівы: станавілася цяплей і з'яўляліся астраўныя лясы, халадала — і зноў панавалі тундры. Менавіта ў гэтых умовах пражывалі першапраходцы шклоўскай зямлі. Апошняя хваля холаду пракацілася па Паўночнай Еўропе каля 10 тыс. гадоў таму, пасля чаго адбылося хуткае пацяпленне. З гэтага часу, па археалагічнай перыядызацыі, пачынаецца сярэднекаменны век — мезаліт (10—6 тыс. гадоў таму). Пасяленні мезалітычнага часу вядомы на другой надпойменнай тэрасе правага берага Дняпра, у 0,6 км на поўдзень ад в. Царковішча і ў 0,5 км на поўнач ад в. Рэпалава; на левым беразе Дняпра каля в. Новыя Стайкі і каля в. Ржаўцы.

Заканчэнне ледніковага перыяду, пацяпленне клімату, распаўсюджванне лясоў і сучасных відаў жывёлін спрыялі з'яўленню больш сучасных прыёмаў палявання і паляўнічай зброі, стварэнню новых тыпаў жылля і новых прылад працы. У эпоху мезаліту гісторыя чалавечага грамадства мела не толькі паступальнае развіццё, але і шматкратна паскарала тэмпы свайго руху, падобна палёту стралы — сімвала мезаліту. Менавіта ў гэты час шырока распаўсюджваецца лук са стрэламі — самая хуткастрэльная дыстанцыйная зброя старажытнасці. Калі раней, у час загоннага палявання ў палеаліце, каб паразіць звера кап'ём, трэба было падабрацца да яго ўшчыльную, то цяпер страла наганяла жывёліну здалёку. Да таго ж, на ваўкоў, лісіц, зайцаў і іншых жывёлін нельга было паляваць з дапамогай агню і загону. Паляўнічы не мог забіць жывёліну, якая перамяшчалася хутчэй чалавека. З дапамогай лука і стрэл сталі займацца індывідуальным паляваннем, верным памочнікам у якім быў сабака — першая прыручаная жывёліна.

Набор мезалітычных прылад даволі разнастайны. Як і раней, асноўная маса іх звязана з паляўнічым промыслам або рыбалоўствам. Людзі выкарыстоўвалі пераважна тры віды сыравіны: камень, косць і дрэва. На жаль, драўляныя збудаванні і вырабы, як і касцяныя, у пясчаных грунтах не захаваліся. А вось вырабы з каменя сустракаюцца на пасяленнях у вялікай колькасці. У вырабе каменных прылад у мезалітычны час часцей за ўсё выкарыстоўваўся крэмень, які лёгка расколваўся, меў вялізную цвёрдасць і пры расчапленні даваў вострыя рэжучыя краі на пласцінах і адшчэпах. Дзякуючы шырокаму распаўсюджванню крэменю ў Верхнім Прыдняпроўі магчымасці выкарыстання яго былі не абмежаваны.

У калекцыях крамянёвага інвентару надзвычай шырока прадстаўлены скрабкі, з дапамогай якіх апрацоўваліся шкуры жывёлін. Дугападобны канец скрабка афармляўся спецыяльнай крутой рэтушшу, што выключала парэзы апрацоўваемай паверхні. Разнавіднасцю скрабкоў з'яўляюцца скабелі (вырабы з выемкамі), рабочая частка якіх была ўвагнута і выкарыстоўвалася для апрацоўкі акруглых паверхняў, напрыклад дрэвак стрэл. Адзначым, што асобныя сучасныя прылады, якімі мы карыстаемся, не толькі па сваім функцыянальным прызначэнні, але і па знешнім выглядзе захавалі сходнасць з прататыпамі далёкага каменнага веку. Змяніўся толькі матэрыял, з якога яны выраблены. Сярод іх можна назваць нож і разец. Крамянёвыя нажы, якія выконвалі функцыі рэзання, мелі вострый край, завостраны рэтушшу. Яны вызначаюцца дэталёвасцю аддзелкі і дасканаласцю формаў. Разцы прызначаліся галоўным чынам для работы з косцю.

Неабходнымі прыладамі працы ў старажытнасці былі праколкі і свярдзёлкі. Праколкі выкарыстоўваліся для

шыцця вопраткі і мелі тонкае джала, апрацаванае дробнай рэтушшу. Свярдзёлкі ад праколак адрозніваліся больш масіўным рабочым канцом.

Шырокае распаўсюджванне ў лясной зоне атрымалі прылады для сячэння. Сякеру падаравала чалавеку дрэва. З яе дапамогай людзі будавалі дамы, рабілі першую мэблю, транспартныя сродкі: лодкі, сані, лыжы і інш. На працягу каменнага веку сякера відазмянялася, нараджаючы новыя прылады — цёслы, долаты, кіркі, матыкі. У мезалітычны час людзі ўсё больш сталі займацца рыбалоўствам, вынайшлі рыбалоўны кручок, сетку, розныя пасткі — заколы, ёзы, вершы і інш., выкарыстоўвалі прыёмы рыбнай лоўлі з дапамогай касцяных астрогаў і гарпуноў. Тым самым людзі мезаліту расшырылі базу свайго харчавання і зрабілі першы крок да аседласці.

Каменны век завяршае эпоха неаліту, які датуецца канцом V — III тысячагоддзяў да н. э. Неаліт атрымаў сваю назву ад новай, у параўнанні з мезалітам, тэхнікі вырабаў каменных прылад з дапамогай шліфавання, пілавання і свідравання каменя. Шырокае распаўсюджванне атрымліваюць і двухбакова апрацаваныя, старанна аформленыя крамянёвыя прылады. Маючы толькі каменныя, касцяныя і драўляныя прылады працы, старажытнае насельніцтва шырока асвоіла берагі рэк і азёраў.

У Шклоўскім раёне стаянкі неаліту вядомы на левым беразе Дняпра каля вёсак Ржаўцы і Новыя Стайкі, якія даследаваліся толькі шляхам збору пад'ёмнага матэрыялу. Мяркуючы па фрагментах керамікі і крамянёвым інвентары, абодва помнікі ўваходзяць у арэал распаўсюджвання верхнедняпроўскай неалітычнай культуры. Аналіз матэрыялаў паказвае, што асноўным заняткам насельніцтва па-ранейшаму было паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва. Палявалі, відаць, рознымі спосабамі, але да нашага часу захаваліся толькі наканечнікі стрэл і дроцікаў.

Спецыфіка пасялення на берагах рэк,



Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі в. Нічыпаравічы

у непасрэднай блізкасці ад вады, шырокае распаўсюджванне прылад сячэння, у прыватнасці цесляў для вырабу лодак, указваюць на развіццё рыбалоўства. Працягваюць займацца такімі промысламі, як апрацоўка каменя, дрэва, косці і шкур жывёлін. Асвойваецца новая галіна — ганчарная справа. З гліны ляпілі шыракагорлыя прамасценныя сасуды з вострым дном і ўпрыгожвалі іх ямчата-грабеньчатым арнаментам. Даследчыкі лічаць, што верхнедняпроўская неалітычная культура сфарміравалася на базе плямёнаў позняга мезаліту, што сведчыць пра непарапыннасць гістарычнага працэсу ў каменным веку на тэрыторыі Верхняга Прыдняпроўя.

Нягледзячы на працяглыя сістэматычныя палявыя даследаванні, у раёне яшчэ не пераадолена нераўнамернасць археалагічнага вывучэння асобных перыядаў. Да гэтага часу існуюць «белыя плямы» ў старажытнейшай гісторыі. Так, не выяўлены помнікі бронзавага веку, хоць яны вядомы на суседніх тэрыторыях. Агульнапрынята, што ў пачатку II тысячагоддзя да н. э. тэрыторыя Верхняга Прыдняпроўя была заселена плямёнамі сярэднедняпроўскай культуры, якія прасунуліся з поўдня па Дняпру і яго прытоках. Помнікі сярэднедняпроўскай культуры прадстаўлены пасяленнямі, курганнымі і грун-



Курганны могільнік, в. Ордаць

тавымі могільнікамі, а таксама асобнымі знаходкамі, пераважна каменных сякер. Адна з такіх знаходак вядома ў 1,5 км на паўночны захад ад Шклова, ва ўрочышчы Францаўка, у полі. Пасяленні размешчаны, часцей за ўсё, у пойме ракі на дзюнных узвышшах (Ксянзова Гара каля Быхава) або на мысах першых падпойменных тэрас. На пасяленні Ксянзова Гара выяўлена жыллё слуповай канструкцыі з ачаговымі ямамі і ачагамі, абкладзенымі камянямі. У курганных і грунтовых могільніках хавалі па абраду трупапакладання і трупаспалення. Яны ўяўляюць сабой родавыя могілкі з рознай колькасцю пахаванняў. Так, у грунтавых могільніках каля в. Сябровічы Гомельскай вобласці выяўлена каля ста трыццаці пахаванняў. На пасяленнях і ў могільніках выяўлены разнастайны рэчавы матэрыял: гліняны ляпны посуд, бронзавыя вырабы, крамянёвыя і каменныя прылады працы, зброя, упрыгожванні з косці, янтару і т. п. Знаходкі металічных вырабаў параўнальна рэдкія. Гэта шылы, нажы, сякеры, скроневыя кольцы, дыядэмы, грыўны, бранзалеты, пранізкі, зробленыя з металу каўказскага і балкана-карпацкага паходжання. Пойменныя лугі Дняпра, яго прытокі, якія забяспечвалі корм для жывёлы, і зручныя ўчасткі для пасеваў, садзейнічалі развіццю жывёлагадоўлі і земляробства. З бронзавага веку на тэрыторыі сучаснага Шклоўскага раёна насельніцтва канчаткова перайшло на вытворчыя формы гаспадарання, а паляванне, рыбалоўства і збіральніцтва сталі адыгрываць дапаможную ролю.

Грамадскі лад сярэднедняпроўскіх плямёнаў характарызуецца разлажэннем першабытнаабшчынных адносін, пераходам да патрыярхальнага ладу і пачаткам фарміравання маёмаснай няроўнасці.

В. Ф. Копытин. Археологические памятники Шкловского района. Могилев, 1993. С. 9—14.

Помнікі эпохі жалеза і ранняга сярэднявечча

Геаграфічны фактар абумовіў складанасць гістарычных працэсаў, якія працякалі на тэрыторыі сучаснага Шклоўскага раёна ў эпоху жалеза і ранняга сярэднявечча. На працягу I тыс. н. э. і пачатку II тыс. н. э. рэгіён Верхняга Падняпроўя быў зонай актыўнага ўзаемадзеяння розных этнічных супольнасцей, перш за ўсё славянскіх і балцкіх, носьбітамі якіх былі прадстаўнікі археалагічных культур, зафіксаваных у помніках археалогіі.

Да разглядаемага перыяду на тэрыторыі Шклоўскага раёна адносяцца гарадзішчы ранняга жалезнага веку, якія датуюцца III — I стст. да н. э.— I — II стст. н. э.; змянілі іх у III — VIII стст. адкрытыя пасяленні — селішчы, цэнтры абшчынных акруг — умацаваныя гарадзішчы, якія з'явіліся ў VI — VIII стст. З надыходам эпохі ранняга сярэднявечча (з VI ст. н. э.) з'яўляецца новы від археалагічных аб'ектаў — курганныя могільнікі — пахавальныя помнікі, у якіх жыхары селішчаў хавалі сваіх родзічаў. Магільныя скляпы ў выглядзе курганных насыпаў выкарыстоўваліся насельніцтвам аж да канца XIII ст., калі распаўсюдзіўся абрад пахавання ў ямах з нізкімі насыпамі сучаснага выгляду. Па краі магіл XIV — XV стст. можна сустрэць каменныя абкладкі, а ў галовах каменны крыж.

З развіццём феадальных адносін (узнікненнем раннедзяржаўных утварэнняў Ноўгарадскага, Полацкага, Кіеўскага княстваў), а потым стварэннем усходнееўрапейскіх дзяржаў, уключаючых у сябе па некалькі зямель-княстваў (удзелаў), адбываецца станаўленне сістэмы тэрытарыяльна-адміністрацыйнага дзялення і кіравання. Сярод родавых сельскіх пасяленняў абшчыннікаў выдзяляюцца пункты па збору даніны (налюддзя), куды прыязджалі прадстаўнікі князя, які кантраляваў дадзеную тэрыторыю. З сярэдзіны X ст. сістэма збору палюддзя была заменена строга рэгламентаванымі падаткамі, уведзенымі кіеўскай княгіняй Вольгай па ўсёй тэрыторыі, падуладнай Кіеву. Княгіня ехала з Кіева на поўнач у 947 г., у Ноўгарадскую і Пскоўскую землі, па р. Днепр (у тым ліку праз тэрыторыю Шклоўскага раёна), потым па волаку на р. Лучэсу, а з Віцебскага Падзвіння па сістэме азёраў на р. Ловаць. Гэты шлях у далейшым стаў вядомы як адзін з маршрутаў вялікага ваенна-гандлёвага шляху «з варагаў у грэкі». Па шляху следавання вялікай князёўны кіеўскай устанаўліваліся новыя пункты кіравання сельскімі акругамі і збору падаткаў — пагосты. Як правіла, гэта былі ўмацаваныя гарадзішчы, якія ўжо функцыянавалі ў якасці цэнтраў сельскіх абшчын, або зручна размешчаныя на водных шляхах буйныя сельскія паселішчы.

З наступленнем феадальнай раздробленасці, выдзяленнем самастойных удзелаў-княстваў унутры ўсходнееўрапейскіх дзяржаў князі сталі надзяляць сваіх дружыннікаў-баяр «валасцямі», даючы ім «у кармленне» былыя абшчынныя землі на тэрыторыі свайго ўдзела. На гарадзішчах эпохі жалеза сталі з'яўляцца феадальныя двары-сядзібы.



План гарадзішча ранняга жалезнага веку на беразе р. Бярозаўка

дзібы баяр, якім падпарадкоўваліся сельскія акругі. Такім чынам, археалагічныя помнікі-гарадзішчы з родавых пасяленняў ранняга жалезнага веку (III ст. да н. э.— II ст. н. э.) у VI—VII стст. ператварыліся ў цэнтры сельскіх абшчын, а асобныя з іх — у племянныя цэнтры, а ў X—XI і XII—XIII стст. яны маглі выкарыстоўвацца як пагосты або месцы размяшчэння феадальных сядзіб.

Недастатковае вывучэнне археалагічных помнікаў раёна не дае магчымасці з усёй паўнатой асвятліць больш чым тысячагадовы перыяд гістарычнага развіцця дадзенага рэгіёна. У той жа час сучасныя адміністрацыйныя межы не могуць перашкаджаць узнаўленню гістарычных працэсаў, якія мелі месца ў Верхнім Падняпроўі ў дадзены перыяд. Магутная водная артэрыя — р. Днепр была вызначальнай у лёсах многіх плямёнаў і буйных этнічных груповак на працягу I тыс. н. э.

На рубяжы н. э. насельніцтва Усходняй Еўропы было прадстаўлена фіна-ўгорскімі, балцкімі і праславянскімі плямёнамі, якія характарызуюцца рознымі рысамі, што дазваляе аб'ядноўваць іх у т. зв. археалагічныя культуры. У той перыяд Верхняе Падняпроўе было зонай размяшчэння насельніцтва мілаградскай культуры і культуры штрыхаванай керамікі, якое пражывала ў гарадзішчах. На змену мілаградскай культуры ў Магілёўскім Падняпроўі прыйшла зарубінецкая культура, носьбітаў якой даследчыкі адносяць да ранніх славян.

I — II стагоддзі н. э. адзначаны магутнай хваляй усходнееўрапейскіх міграцый. Перамяшчэнню насельніцтва садзейнічалі наступныя прычыны. Па-першае, змяніўся водна-тэмпературны баланс Усходняй Еўропы, які садзейнічаў пераходу насельніцтва з гарадзішчаў на адкрытыя пасяленні паблізу вадаёмаў і адпаведна адбыліся змены ў спосабе вядзення гаспадаркі і сацыяльнай арганізацыі абшчын. Па-другое, націск готаў з Прыбалтыкі, а сарматаў з поўдня далі штуршок да перамяшчэння насельніцтва лясной паласы (культура штрыхаванай керамікі, днепра-дзвінская культура) на ўсход і паўночны ўсход, а насельніцтва Сярэдняга Падняпроўя (зарубінецкая, познезарубінецкая культуры, а потым кіеўская) — уверх па Дняпры, Сожу, Беразіне, Друці і іх прытоках у лясную зону. Тэрыторыя Шклоўскага раёна ўваходзіць у агульную зону кантактаў розных культур і этнасаў першай паловы I тыс. н. э.

Пра гэта сведчаць матэрыялы археалагічных даследаванняў, якія праводзіліся ў раёне. Так, на гарадзішчы ў в. Гарадок (Крывель) Гарадзецкага сельсавета В. Р. Тарасенкам у 1936 г. у шурфе 1×1,5 м была выяўлена глінабітная печ для выплаўкі жалеза з балотнай руды, а таксама астаткі ачага з камянёў, вялікая колькасць шлакаў, косці жывёлін, ляпная кераміка культуры штрыхаванай керамікі і гладкасценная. Гарадзішча са слаямі ранняга жалезнага веку каля в. Царковішча ў 1965 г. даследавала Г. Ф. Салаўёва. У двух шурфах 2×2 м былі зафіксаваны напластаванні мілаградскай культуры III ст. да н. э., перакрытыя больш познімі напластаваннямі культуры штрыхаванай керамікі. У в. Пруды (Прудкі) Заходскага сельсавета на левым беразе р. Днепр размяшчалася селішча позняга этапу зарубінецкай культуры і VI — IX стст. На яго тэрыторыі былі насыпаны курганы. У насыпе аднаго з курганоў І. І. Арцёменка ў 1963 г. выявіў гладкасценную кераміку, кераміку з насечкай па версе венчыка позняга этапу зарубінецкай культуры, фрагмент глінянай патэльні.

Культурныя напластаванні з VI — IX стст. таксама фіксуюцца ў шэрагу гарадзішчаў і селішчаў Шклоўскага раёна. Так, у в. Княжыцы Гарадзецкага сельсавета А. А. Седзіным у 1989 г. праводзіліся раскопкі гарадзішча. Ускрыта плошча 128 кв. м. Выяўлены два будаўнічыя гарызонты. У ніжнім фіксаваліся ямы ад слупавых канструк-



Рэчы з курганоў: *1* — тапор (в. Пруды); *2* — навапечнік дроціка (в. Царковішча); *3* — нож (в. Варонціна)

цый, вугаль, гарэлае дрэва. У культурным слаі знойдзены жалезныя аброці, нож, лязо сякеры, шыла, шлакі, косці жывёлін, ляпная кераміка. Аналагічная ляпная гладкасценная кераміка выяўлена і на селішчы, размешчаным на паўднёвым усходзе ад гарадзішча, магутнасць культурнага слоя якога дасягае 0,4—0,7 м.

Гарадзішча і селішча трэцяй чвэрці I тыс. н. э. даследаваліся В. Р. Тарасенкам у 1936 г. каля в. Плешчыцы Заходскага сельсавета. Тут на селішчы зафіксавана шмат апаленых камянёў, жалезных шлакаў, ляпной гладкасценнай керамікі. На адным фрагменце выяўлены наляпны валік з касымі насечкамі, які сведчыць аб прыналежнасці дадзенай керамікі да калачынскай культуры.

Напластаванні трэцяй чвэрці I тыс. н. э. прысутнічаюць таксама на гарадзішчы «Захарава гара» ў в. Царковішча, гарадзішчы ў в. Ржаўцы Славенскага сельсавета. Тут В. Р. Тарасенка ў 1936 г. заклаў шурф 1×0,75 м, выявіў культурны пласт магутнасцю 0,25 м, у якім аказаліся вугаль, попел, расколатыя камяні, гладкасценная кераміка. Селішча з керамікай VI — IX стст.



Бронзавыя рэчы з курганоў, в. Пруды

Рэчы з курганоў в. Дымава: *1* — шкляныя пазалочаныя бусы; *2* — скроневыя кольцы крывічскага тыпу; *3—4* — бронзавыя падвескі; *5—6* — скроневыя сяміпрамяневыя кольцы радзімічскага тыпу; *7—9* — гаршкі з курганоў Лагойска, вв. Чаркасава, Мурава; *10—11* — бронзавыя спражкі; *12—14* — пярсцёнкі; *15—17* — колцы.

Месца, дзе быў Стары Шклоў

. І. Арцёменка абследаваў у 1963 г. Яно вядома з 1935 г. на левым беразе . Днепр каля в. Новыя Стайкі Сланскага сельсавета. Ляпная кераміка ыяўлена на гарадзішчах каля вв. Гарадзішча і Карасі.

Да трэцяй чвэрці I тыс. н. э. адносяцца і пахавальныя помнікі каля вёсак Царковішча, Прудкі (Пруды), Новыя Стайкі, дзе пахаванні зроблены па абраду трупаспалення. Яны, відаць, звязаны з тымі пасяленнямі, якія выяўлены паблізу дадзеных населеных пунктаў (гарадзішчамі і селішчамі). Каля в. Новыя Стайкі ў кургане са спаленнем І. І. Арцёменка ў 1963 г. на глыбіні 0,28 м ад паверхні кургана выявіў два раструшчаныя ляпныя сасуды, а на глыбіні 1,05 м — сляды трупаспалення. Г. Ф. Салаўёва ў 1964—1965 гг. зрабіла раскопкі курганоў каля в. Пруды (2 курганы былі з трупаспаленнямі) і каля в. Царковішча. Асабліваасцю курганоў каля в. Пруды была наяўнасць каменных агароджаў у аснове насыпу, спаленні праводзіліся па-за курганам, у курганах каля в. Царковішча трупаспаленне рабілася на месцы ўзвядзення кургана. Захаванні ў курганах каля в. Пруды па абраду трупаспалення безынвентарныя, толькі ў насыпе аднаго з іх выяўлена сякера правушная, абух якой з абодвух бакоў мае выступаючыя шчакавіцы, а правушына — яйкападобную форму. У курганах каля в. Царковішча разам з трупаспаленнямі выяўлены жалезны наканечнік дроціка, нож, ляпная кераміка, зліткі аплаўленай бронзы.

У гэтых жа могільніках выяўлены і курганы з трупапакладаннямі, якія датуюцца XI — першай паловай XII ст. Як і ў больш ранніх, пахаванні ў курганах з трупапакладаннем каля в. Пруды заключаны ў каменную агароджу. Пры іх выяўлены разнастайны рэчавы інвентар, у тым ліку бронзавыя ўпрыгожванні (скроневае дротавае кольца з напускной пацеркай, бранзалеты, званочак, фібула), шкляныя і паставыя пацеркі, бісер.

Курганы пераходнага перыяду ад трупаспаленняў да трупапакладанняў выяўлены пры раскопках могільнікаў каля

в. Тройца і в. Дымава Старасельскага сельсавета. У 1899 г. Е. Р. Раманаў раскапаў два курганы каля в. Тройца, у якіх былі астаткі крэмацыі, выкананай на абочыне. У адным з гэтых курганоў зафіксавана таксама ўпускное трупапакладанне. Пры пахаваных былі крэсіва, жалезнае кольца пад галавой, медныя чатырохгранныя кольцы каля пояса, пласцінчаты бронзавы пярсцёнак. Датуюцца курганы з трупапакладаннямі VI — VIII стст., трупапакладаннем — XI ст.

Могільнік каля в. Дымава даследаваўся Н. М. Турбіным у 1885 г. Ім раскапана тут 12 курганоў. Пераважная большасць пахаванняў — трупапакладанні на мацерыку, арыентаваныя галавой на захад. Зафіксаваны ў сідзячым становішчы адно пахаванне і адно ўпускное трупаспаленне ў насыпе. Да туюцца курганы каля в. Дымава X — пачаткам XI ст. Тут выяўлены шмат лікі рэчавы інвентар: кераміка, нажы скроневыя кольцы са звязанымі канцамі, паясныя спражкі, пласцінкавыя дротавыя колцы з бронзы, сяміпрамянё выя скроневыя кольцы, пазалочаны бочкападобныя пацеркі і інш.

Безынвентарныя пахаванні па абрад трупапакладання, арыентаваныя галавой на захад, на попельна-вугальна праслойцы (1 мужчынскае і 6 дзіця чых) у кургане каля в. Капысіца Алек сандрыйскага сельсавета выяўлены 1969 г. А. А. Выржыкоўскім, датуюцц XI — XII стст.

Культурныя напластаванні ранне сярэдневяковага перыяду (IX — XIII стст.) выяўлены як на гарадз



Схема размяшчэння селішч і гарадзішча каля в. Стары Шклоў

чах (вв. Княжыцы, Благаўка, Гарадзішча — былы фальварак, вядомы з 1649 г., Царковішча), так і на селішчах в. Плешчыцы). Найбольш выразным для дадзенага перыяду часу з'яўляецца омплекс помнікаў у вв. Хоцімка, Ставы Шклоў, які складаецца з гарадзішча, некалькіх селішчаў. У 1936 г. В. Р. Тарасенка абследаваў гарадзішча, абраўшы на разаранай пляцоўцы і схілах шлакі, кавалкі апаленай гліны, ачыльны брусок, бронзавы пярсцёнак, ляпную гладкасценную кераміку і кераміку, выраблену на ганчарным кругу. У 1968 г. Г. В. Штыхаў у раскопе плошчай 38 кв. м у культурным пласце агутнасцю 0,5 м выявіў наканечнік тралы, нажы, два шкляныя бранзалеты, жалезную спражку, званочак з крыжападобным прарэзам X — XI стст. і інш. Акрамя вялікай колькасці кругавой керамікі выяўлены таксама фрагменты ляпных сасудаў X ст. У 1979 г. В. М. Ляўко закладзены на гарадзішчы два раскопы плошчай 32 кв. м. У мацерыку прасочаны астаткі слупавых канструкцый. Побач са знаходкамі ранняга сярэднявечча выяўлены прадметы XIV — XVI стст., у тым ліку фрагменты гаршковых кафляў.

Побач з гарадзішчам на левым беразе р. Серабранка, адмежаваныя адзін ад другога прасёлкавымі дарогамі, размяшчаюцца селішчы, якія ўтрымліваюць матэрыялы XIV — XVII стст. Тут жа, на тэрыторыі, занятай кар'ерам, відаць, размяшчаліся сярэдневяковыя могілкі. Краязнаўцам І. В. Іларыёнавым у 1989 г. на селішчы знойдзены манеты 1509 г. ВКЛ і солід Іаана II, у кар'еры фрагмент бронзавага нацельнага крыжа і арнаментаваная бронзавая накладка. Культурны пласт з вялікай колькасцю керамікі прасочваецца ўздоўж р. Серабранка на прысядзібных участках в. Стары Шклоў. На правым беразе р. Серабранка насупраць гарадзішча размешчана селішча, выяўленае В. М. Ляўко ў 1977 г., якое ўтрымлівае кераміку XIV — XVI стст. Тут жа на ўзгорку В. Р. Тарасенка ў 1936 г. выявіў селішча, сінхроннае гарадзішчу. На паўднёвы захад в. Хоцімка ёсць тры курганы вышынёй 1,5—2 м, далей ва ўрочышчы Зязюльчын Роў у 1963 г. было выяўлена адлюстраванне славянскага язычаскага бажаства X ст. Скульптура з пясчаніка вышынёй 1,2 м, вагой каля 250 кг. Тулава цыліндрычнае, ніжняя частка ў выглядзе пастамента. Магчыма, ва ўрочышчы Зязюльчын Роў або паблізу размяшчалася месца здзяйснення язычаскіх абрадаў.

Асваенне Шклоўшчыны славянамі

Яшчэ ў першыя стагоддзі н. э. носьбіты праславянскіх культур — зарубінецкай, познезарубінецкай і кіеўскай — пачалі сваё перамяшчэнне на поўнач у лясную зону па водных магістралях, важнейшай з якіх была р. Днепр. У Быхаўскім Падняпроўі на правабярэжжы каля вв. Тайманава і Адаменка даследаваны пасяленні гэтых культур, якія займалі значныя плошчы разам з грунтавымі могілкамі. У рэгіёне Верхняга Падняпроўя выяўлена пераемнасць паміж кіеўскай археалагічнай культурай II — V стст. і дакладна славянскай калачынскай культурай VI — VIII стст. Усе пералічаныя культуры дэманструюць эвалюцыйнае развіццё гаспадарчага ўкладу, сацыяльна-абшчынных адносін, пахавальнага абраду, які адлюстроўвае духоўнае жыццё насельніцтва, яго светапогляд.

У зоне Аршанскага Падняпроўя, куды ўваходзіць і тэрыторыя Шклоўскага раёна, носьбіты паўднёвых культур рассяляліся ўздоўж буйных прытокаў Дняпра. Ва ўмовах наступлення больш засушлівага перыяду, па даных палеакліматалогіі, асвойвалі больш вільготныя

ўчасткі рачных далін. Такім чынам, на рубяжы эр і ў першых стагоддзях н. э. ажыццяўляецца працэс пранікнення славянскага этнасу ў асяроддзе балцкіх абарыгенаў лясной зоны, якія жылі на гарадзішчах. Невялікі працэнт археалагічных матэрыялаў, якія характарызуюць паўднёвыя культуры, на гарадзішчах ранняга жалезнага веку сведчыць аб падсяленні малых груп да абарыгенаў. У той жа час з II — III стст. н. э. павялічваецца колькасць пасяленняў Аршанскага Падняпроўя, дзе пераважна выяўлены матэрыялы познезарубінецкага часу і кіеўскай культуры. Гэта адкрытыя селішчы ўздоўж р. Адроў (Аршанскі р-н), р. Днепр (Вусце Аршанскага р-на, Новыя Стайкі Шклоўскага р-на). На поўначы групы паўднёвага насельніцтва дасягнулі міжрэчча Ловаці і Вялікай на Пскоўшчыне, перапраўшыся з Дняпроўскага басейна ў басейн Падзвіння па валоках і сістэме азёраў. Гэтыя водныя маршруты паслужылі асновай фарміравання міжнародных ваенна-гандлёвых магістраляў, якія выкарыстоўвалі славяне ў эпоху сярэднявечча. На схеме размяшчэння археалагічных помнікаў Шклоўскага раёна, якая падаецца ў кнізе, добра бачна, што найбольш кампактна асвоенымі былі прыбярэжная зона Дняпра, яго прытокаў: рэк Арціслаўкі, Серабранкі, Бярозаўкі, паселішчы размяшчаліся і ўздоўж р. Бася (прыток р. Проня). Паселішчы сярэдзіны трэцяй чвэрці I тыс. н. э. у раёне Аршанскага Падняпроўя ўтрымліваюць звычайна матэрыялы адной або некалькіх падобных паміж сабой археалагічных культур: банцараўскай, тушамлінскай або калачынскай. Асноўныя арэалы распаўсюджвання гэтых культур супадаюць з зонамі лакалізацыі летапісных крывічоў (полацкіх і смаленскіх) і радзімічаў. У Аршанскім Падняпроўі асабліва наглядна праяўляецца змяшэнне розных рыс, уласцівых гэтым культурам у домабудаўніцтве, керамічных комплексах, наборах жаночых упрыгожванняў. Крывічскія дротавыя бранзалетападобныя скроневыя кольцы сустракаюцца ў курганах каля в. Дымава побач з радзімічскімі сяміпрамянёвымі. Для радзімічаў характэрна і пахаванне памерлага ў сідзячым стане.

Калі полацкія крывічы з Падзвіння хавалі памерлых у курганных могілках з сярэдзіны I тыс. н. э., то насельніцтва калачынскай культуры Верхняга Падняпроўя выкарыстоўвала грунтавыя могілкі, таксама як і насельніцтва тушамлінскай культуры на Смаленшчыне. Для курганоў крывічоў характэрна наяўнасць доўгіх, падоўжаных і круглых у плане насыпаў. Паўднёвая мяжа распаўсюджвання курганоў крывічоў на тэрыторыі Беларусі ў трэцяй чвэрці I тыс. н. э. супадае з арэалам банцараўскай культуры і праходзіць па вадападзелу Заходняй Дзвіны і Дняпра ў Сенненскім, Аршанскім, Дубровенскім раёнах. Курганныя могілкі VI — VIII стст., выяўленыя каля вёсак Новыя Стайкі, Пруды, Царковішча на тэрыторыі Шклоўскага раёна, цалкам могуць належаць крывічам, якія апускаліся па р. Днепр з зоны свайго асноўнага распаўсюджвання. На гэта можа ўказваць і наяўнасць у курганнай групе каля в. Царковішча сярод круглых насыпаў аднаго значна падоўжанага (22×10×1,5 м). Курганы выцягнутых формаў зафіксаваны і каля в. Гарадок Старасельскага сельсавета. Курганныя могілкі з круглымі і падоўжанымі насыпамі VII — VIII стст., якія належалі крывічам, зафіксаваны і ў раёне волакаў каля г. п. Арэхаўск Аршанскага р-на і р. Вярхіты Дубровенскага р-на. Такім чынам, прарысоўваецца траса руху крывічоў з поўначы на поўдзень па водных шляхах, якія ранней выкарыстоўваліся паўднёвым насельніцтвам для пранікнення на поўнач.

У IX ст. побач з Ноўгарадскім Кіеўскім княствамі ўзнікае першае раннедзяржаўнае ўтварэнне — Полацкае княства, цэнтрам якога з'яўляецца племянны цэнтр полацкіх крывічоў. Цэнтрам смаленскіх крывічоў у гэты перыяд з'яўляецца паселішча кал

в. Гнёздава на Дняпры. Да моманту з'яўлення першых дзяржаўных утварэнняў на паўночных і паўднёвых ускраінах Усходняй Еўропы, найбольш цесна звязаных з арабскім, візантыйскім і скандынаўскім светам, крывічы з тэрыторыі Паўночна-Усходняй Беларусі і Смаленшчыны яшчэ знаходзіліся ў рамках племянных аб'яднанняў. Яны складалі частку сярэдзіннага населенага масіву тэрыторыі Усходняй Еўропы, з устойлівымі племяннымі традыцыямі і адпаведнай структурай паселішчаў (гарадзішча — цэнтр абшчыны з некалькіх селішчаў і могільнікаў). Гэты набор археалагічных аб'ектаў характэрны і для тэрыторыі Шклоўшчыны ў IX — X стст.

Падпарадкаванне смаленскіх крывічоў дзяржаўнай уладзе ажыццявіў у 882 г. ноўгарадскі князь Алег у час паходу на Кіеў з мэтай аб'яднання Паўночнай і Паўднёвай Русі. Паход Вешчага Алега на Смаленск (Гнёздава) ажыццяўляўся па Дзвінска-Тарапецкаму шляху і не закрануў водны маршрут, пралягаючы праз тэрыторыю Паўночна-Усходняй Беларусі. Таму землі крывічоў у Віцебскім Падзвінні і Аршанскім Падняпроўі хоць і знаходзіліся пад кантролем кіеўскага княжацкага дома, да сярэдзіны X ст. захоўвалі адносную самастойнасць. Магчыма, што актыўнае развіццё пасялення ў вв. Хоцімка, Стары Шклоў з X ст. звязана з устанаўленнем вялікай кіеўскай княгіняй Вольгай адміністрацыйна-гаспадарчых цэнтраў у падведамасных землях. Пасяленне ў вв. Хоцімка, Стары Шклоў аналагічна пасяленню ў Горах (Горацкі раён) і магло выконваць функцыю цэнтра акругі — воласці, як і пасяленне ў в. Чаркасава Аршанскага раёна. Па меры ўзмацнення Полацкага і Смаленскага княстваў, Віцебскае Падзвінне і Аршанскае Падняпроўе становяцца прадметам дамаганняў і ваенных спрэчак. На працягу XI — XIII стст. рэгіён Паўночна-Усходняй Беларусі неаднаразова мяняў сваю дзяржаўную прыналежнасць, уваходзячы ў састаў Полацкай, Кіеўскай, Смаленскай зямель.

В. М. Ляўко,
ст. навуковы супрацоўнік НА Беларусі

Рэестр помнікаў археалогіі

АЛЕКСАНДРЫЙСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Капысіца. Курганны могільнік XI—XII стст., у 160 м на паўднёвы захад ад вёскі, у полі.

Карзуны. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Бярозаўка (10 м), на паўночна-заходняй ускраіне вёскі. Пляцоўка і схілы задзярнованы.

Прасалы. Адзіночны курган эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бярозаўка (0,5 км), у 0,3 км на поўнач ад вёскі.

АРДАЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Ордаць. Курганны могільнік з двух насыпаў эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бася, ва ўрочышчы Круча. Вядомы з 1873 г.

Курган эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бася (0,5 км).

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на беразе р. Бася, ва ўрочышчы Барок, у лесе.

Рудзіцы. Адзіночны курган эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бася (0,6 км), на паўночнай ускраіне вёскі. У мясцовага насельніцтва вядомы пад назвай «Пусікаў курган».

ГАРАДЗЕЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Гарадзец. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Гарадня (правы прыток р. Капуснік), у 0,25 км на паўднёвы захад ад ускраіны вёскі. У мясцовага насельніцтва вядома пад назвай «Талерка».

Гарадок (Крывель). Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Днепр (1,4 км), у 0,4 км на захад ад вёскі.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Дзедва (0,2 км), у 0,3 км на паўночны захад ад маста.

Княжыцы. Гарадзішча трэцяй чвэрці I тыс. і эпохі Старажытнай Русі на паўночнай ускраіне вёскі, на правым беразе р. Капуснік.

Селішча трэцяй чвэрці I тыс., размешчана на паўднёвы ўсход ад гарадзішча.

Малое Зарэчча (Шклоў Зарэчны). Стаянка ранняга этапу грэнскай культуры, размешчана на левым беразе р. Днепр, у 1,5 км на паўднёвы ўсход ад вусця р. Капуснік.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку, у 0,3 км на паўночны ўсход ад вёскі. Па звестках 1873 г., побач з гарадзішчам знаходзіўся курганны могільнік з адзінаццаці насыпаў. Да нашага часу не захаваўся.

Слабодка. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на паўднёва-заходняй ускраіне вёскі.

ГАРАДЗІШЧАНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Благаўка. Гарадзішча ранняга жалезнага веку ў паўночна-заходняй частцы вёскі.

Па звестках 1873 г., побач з гарадзішчам знаходзіліся два курганы. Па звестках Е. Р. Раманава, у канцы XIX ст. у ваколіцах вёскі знаходзіўся курганны могільнік старажытнарускага часу з дваццаці насыпаў. Да нашага часу не захаваўся.

Гарадзішча. Гарадзішча ранняга жалезнага веку і эпохі Старажытнай Русі, размешчана на левым беразе р. Бася, у паўднёва-заходняй частцы вёскі.

Русакі (да 1977 г.), уключана ў в. Гарадзішча. Па звестках 1873 г., у вёсцы, на правым беразе р. Бася, знаходзіўся курганны могільнік з трох насыпаў.

Карасі. Курган эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бася, каля вёскі.

Карасі. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Бася, у 50 м на поўнач ад вёскі.

Малыя Сліжы. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бася, у 1,6 км на ўсход ад вёскі.

ЗАХОДСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Дубраўка-2. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Арціслаўка (0,5 км). Назва ў мясцовага насельніцтва — «Белая Гара».

Па звестках 1873 г., дзевяць курганоў знаходзіліся «при фольварке Дубровка, близ д. Озерье и р. Озеренки».

Заходы. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі ў ваколіцах вёскі, на беразе р. Азяронка, з сямі насыпаў. Звесткі 1873 г.

Плешчыцы (вв. Азер'е, Грунцік). Гарадзішча ранняга жалезнага веку на правым беразе безыменнага ручая (правы прыток р. Арціслаўка). Мясцовае насельніцтва называе помнік «Царковішча».

Селішча трэцяй чвэрці I тыс. і эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Арціслаўка, у 0,4 км на паўднёвы ўсход ад вёскі.

Пруды. Адзіночны курган на левым беразе р. Днепр, у 0,4 км на поўнач ад вусця р. Арціслаўка. Раней тут было дзевяць курганоў, уздоўж цячэння Дняпра.

Селішча VI—IX стст. на левым беразе р. Днепр, на месцы якога быў насыпаны курганны могільнік.

КАМЕННА-ЛАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Савеленкі. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Ульянка (0,5 км), у 0,8 км на паўночны ўсход ад вёскі.

Старая Вадва. Гарадзішча ранняга жалезнага веку ў вярхоўях Лахвы, каля вёскі.

Парковішча. Стаянка эпохі мезаліту на другой надпойменнай тэрасе правага берага Дняпра, у 0,6 км на поўдзень ад вёскі.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку і эпохі Старажытнай Русі, у 0,7 км на паўночны ўсход ад в. Бушлякі.

Курганны могільнік VII—VIII стст. у пойме правага берага Дняпра (50 м), у 1,1 км на паўночны ўсход ад в. Бушлякі.

РЫЖКАВІЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Вялікія Аўчыненкі. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на правым беразе р. Серабранка, у паўночна-ўсходняй частцы вёскі. Назва ў мясцовага насельніцтва — «Старыя могілкі».

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Серабранка, у 1 км на ўсход ад вёскі, у полі.

Малыя Аўчыненкі. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Серабранка (0,5 км), у 0,2 км на ўсход ад вёскі.

Новыя Аўчыненкі. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі, у 0,4 км на паўднёвы захад ад вёскі.

Рэпалава. Стаянка каменнага веку на другой надпойменнай тэрасе правага берага Дняпра, у 0,5 км на поўнач ад вёскі.

Хоцімка. Гарадзішча эпохі Старажытнай Русі і Вялікага Княства Літоўскага ў лукавіне левага берага р. Серабранка (Шклавянка), у 0,2 км на ўсход ад вёскі.

Селішча эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Серабранка, насупраць гарадзішча, у 0,3 км на паўднёвы ўсход ад вёскі.

Шклоўскі ідал. Выява славянскага языческага бажаства X ст., знойдзеная ў 1963 г. на беразе р. Серабранка каля Шклова. Скульптура высечана з пясчаніку, вышыня — 1,2 м, маса каля 250 кг, тулава цыліндрычнае, ніжняя частка апрацавана як пастамент, твар мае індывідуальныя рысы. Шклоўскі ідал, мабыць, быў схаваны мясцовымі язычнікамі пасля прыняцця хрысціянства. Зберагаецца ў Дзяржаўным музеі Рэспублікі Беларусь.

СЛАВЕНСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Вялікія Славені. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі ў пойме левага берага р. Чарніца, у 1 км на захад ад вёскі.

Новыя Стайкі. Стаянка каменнага веку на левым беразе р. Днепр, на паўднёвай ускраіне вёскі.

Селішча VI—IX стст. на левым беразе р. Днепр, супраць вусця р. Бярозаўка.

Адзіночны курган у пойме левага берага р. Днепр, у 2,5 км на поўдзень ад вёскі.

Мікіцінічы. Селішча эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Чарніца, у 1 км на поўдзень ад вёскі.

Стаянка каменнага веку на левым беразе р. Каменка, на 0,2—0,3 км вышэй вусця.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Каменка, у 0,2 км на ўсход ад вёскі.

Ржаўцы. Стаянка эпохі неаліту ва ўрочышчы Бухшын.

Стаянка эпохі мезаліту, у 1 км на паўночны захад ад вёскі.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку каля вусця безыменнага ручая.

Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Мар'янка (20 м), у цэнтры вёскі.

Сапронькі. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Чарніца (30 м), на паўднёвай ускраіне вёскі.

Стараселле. Адзіночны курган эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Мар'янка (80 м), у 0,3 км на паўночны захад ад вёскі.

СТАРАСЕЛЬСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Бярозаўка. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі з чатырнаццаці насыпаў, знаходзіўся ў ваколіцах вёскі (па звестках 1873 г.).

Баркі. Па звестках 1873 г., курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі з дваццаці дзевяці насыпаў, знаходзіўся ў ваколіцах вёскі.

Гарадок. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на правым беразе р. Бярозаўка, у 0,1 км на поўнач ад вёскі.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бярозаўка (0,5 км), у 0,6 км на паўночны ўсход ад вёскі.

Дымава. Курганны могільнік крывічоў X — пач. XI ст. на правым беразе р. Дымаўка (0,3 км), у 0,5 км на поўдзень ад вёскі.

Мацава. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Тросенка (0,3 км), у 0,5 км на паўднёвы ўсход ад вёскі. Сярод мясцовага насельніцтва вядома пад назвай «Гарадок».

Малое Уланава. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бярозаўка (0,2 км), на поўнач ад вёскі.

Новае Брашчына. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі, знаходзіўся ў ваколіцах вёскі.

Смальянцы. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на левым беразе р. Бярозаўка (0,5 км), у 0,8 км на ўсход ад вёскі.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бярозаўка (0,6 км).

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі, у 1,3 км на ўсход ад вёскі.

Сісенева. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бярозаўка, у 1,5 км на ўсход ад в. Тройца.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Бярозаўка (25 м), у 1 км на паўднёвы ўсход ад вёскі.

Стараселле. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на правым беразе р. Бярозаўка, каля вусця безыменнага ручая.

Тройца. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі, у 1 км на поўдзень ад в. Сісенева.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бярозаўка, у 0,3 км на паўднёвы захад ад вадасховішча. Па звестках 1873 г., тут знаходзілася сорак курганоў.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Бярозаўка (0,2 км), у 0,5 км на паўночны захад ад вёскі.

Чырчына. Адзіночны курган эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Валошанка (0,5 км).

ТАЎКАЧОЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Смятанічы. Гарадзішча ранняга жалезнага веку на правым беразе р. Смятанка, у 0,15 км на поўнач ад вёскі.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе р. Смятанка (1 км), у 0,2 км на поўдзень ад вёскі (другі пасёлак), ва ўрочышчы Курганне.

ФАШЧАЎСКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Дубраўка. Гарадзішча «Белая Гара», знаходзіцца каля паўночна-ўсходняй ускраіны вёскі.

Нічыпаравічы. Адзіночны курган эпохі Старажытнай Русі на правым беразе р. Арціслаўка, у 0,5 км на паўднёвы захад ад вёскі.

Чарапы. Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі каля вёскі, уключаў шэсць насыпаў.

ЧАРНАРУЦКІ СЕЛЬСКІ САВЕТ

ВЁСКІ

Чарнаручча. Гарадзішча ранняга жалезнага веку ва ўрочышчы Гарадзец.

Курганны могільнік эпохі Старажытнай Русі на левым беразе ручая Чорны.

В. Ф. Копытин. Археологические памятники Шкловского района... С. 27—49.

СТАРОНКІ МІНУЛАГА

У складзе Вялікага княства Літоўскага

У сярэдзіне XIII—XIV ст. усе землі Беларусі паступова ўвайшлі ў склад поліэтнічнай феадальнай дзяржавы — Вялікага княства Літоўскага (ВКЛ), ядром якога была летапісная Літва, што займала тэрыторыю паміж Нёманам і Віліяй з цэнтрам у Навагародку (Навагрудку) і заселеная славянскім (пераважна ў гарадах), балцкім і славянізаваным балта-славянскім насельніцтвам. В. Ю. Ластоўскі аб гэтым гаварыў: «Гэта мешанае... населеньне, відаць, не хацела залежаць ад Кіева, але жадала аддзяліцца... Сюды, здаецца, уцекла такжэ і частка палачан...» (Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910, С. 11—12).

У 1307 г. Полацкая зямля ўваходзіць у склад ВКЛ на правах аўтаноміі паводле дагавора-«рады», а некалькі паней — як састаўная частка княства. У княжанне Гедыміна ў склад ВКЛ увайшла асноўная частка Беларусі на ўсход, да Дняпра, пры Альгердзе і Вітаўце — усё Падняпроўе. Сталіцай Вялікага княства Літоўскага быў Навагародак, з 1323 г.— Вільня.

Падначаленне раздробленых усходнеславянскіх княстваў і зямель адзінай дзяржаўнай уладзе спыніла працэс феадальнага драблення і садзейнічала стварэнню агульнай этнічнай тэрыторыі Беларусі, у склад якой уваходзілі Полацкая, Віцебская, Навагародская землі, а таксама Слуцкае, Кобрынскае, Мсціслаўскае і іншыя княствы, што захоўвалі сацыяльна-эканамічную і юрыдычна-прававую аўтаномію ў складзе дзяржавы. Многія гарады і мястэчкі мелі права на самакіраванне паводле т. зв. Магдэбургскага права. Аднак своеасаблівая аўтаномія далучаных да ВКЛ зямель, княстваў, гарадоў дзейнічала толькі на пачатку іх «асваення». Пад націскам дастаткова моцнай унітарнай феадальнай сістэмы, дасканалай па тым часе выканаўчай улады на чале з вялікім князем сістэма мясцовага княжання, самакіраванне зводзілася на нішто. У кнізе «Живописная Россия» аб гэтым гаворыцца: «В 1500 г. исчезает последняя тень удельной системы на территории нынешней Белоруссии. Уничтожаются самые титулы княжеств и вместо их учреждаются воеводства: Полоцкое, Новогородское (Новогрудское), Витебское (состоящее из уездов Витебского и Оршанского). Но с учреждением Смоленского воеводства, Оршанский уезд, под названием Оршанской земли с бывшими княжествами Друцким и Лукомльским и с городами Толочином, Горы-Горками, Копысем, Шкловом, Белыничами входили в состав означенного воеводства, по упразднении которого причислены к Витебскому. Минское, Мстиславское (учреждено в 1590 г.), Инфлянтское, Пинское и Туровское княжества причислены были к Брест-Литовскому воеводству» (СПб., 1882. С. 218—219).

У аснову дзяржаўнага заканадаўства ВКЛ было пакладзена мясцовае звычайнае і пісанае права, кадыфікаванае ў Статуты (1529, 1566, 1588 гг.), што з'явілася асноўным законам дзяржаўнага і цывільнага жыцця да другой паловы XIX ст. Беларуская (дакладней, старабеларуская) мова з'яўлялася дзяржаўнай. Уся паўната ўлады належала вялікаму князю-гаспадару. Існавала як дарадчая гаспадарская рада («паны-рада»), у якую ўваходзілі буйныя феадалы, святары. На чале мясцовага ўпраўлення стаялі намеснікі, старасты, соцкія, дзесяцкія, цівуны, старцы. У 1566 г. у паветах і ваяводствах былі створаны земскія і падкаморскія суды, членамі якіх выбіралася шляхта*.

* Шляхта — прывілеяванае саслоўе ў Польшчы, Чэхіі, Літве, на Беларусі і Украіне

Асноўнай вытворчай сілай на Шклоўшчыне, як і ва ўсім беларускім краі, былі, аднак, не паны — шляхта, а людзі «простага стану» (саслоўя) — сяляне, ці, як іх звычайна называлі, мужыкі, халопы. Сяляне складалі суседскую ці вясковую абшчыну, жылі пераважна ў невялікіх вёсках. Асобнай катэгорыяй была «чэлядзь», якая жыла ў дварах феадалаў-паноў і, як правіла, не мела зямельных надзелаў. Пераважалі аднасямейныя гаспадаркі («дымы»), але частка іх вялася сумесна некалькімі сем'ямі. «Дымы» мелі жылыя і гаспадарчыя пабудовы, рабочую і прадукцыйную жывёлу, інвентар, сельгасугоддзі. У непасрэдным карыстанні сялян была і частка зямлі, якая належала феадалам. За зямлю плацілі феадальную рэнту. Да XV ст. пераважнай катэгорыяй сялян былі даннікі. Затым пачаўся пераход на баршчыну («цяглыя», ці прыгонныя, сяляне) і на рэнту грашыма («асадныя» сяляне). Выконваліся многія іншыя павіннасці (рамонт дарог, пабудоў гаспадара і інш.). Рост феадальнай эксплуатацыі суправаджаўся ўзмацненнем асабістай залежнасці сялян. Па прывілеі Казіміра 1447 г. асноўная маса іх ператварылася ў «вотчынна-падданых». Феадал-уласнік мог сялян прадаваць, закладваць, дарыць і завяшчаць разам з зямлёй. Чэлядзь нявольная — уласнасць феадала — перадавалася па спадчыне. Статуты Вялікага княства Літоўскага ўзаконьвалі неабмежаванае права князёў, паноў, баяр-шляхціцаў і іншага прывілеяванага саслоўя не толькі распараджацца зямлёй, але і людзьмі. Пасля Люблінскай уніі 1569 г. (пагадненне аб дзяржаўна-палітычным саюзе Вялікага княства Літоўскага з Польшчай, паводле якога ўтварылася феадальная дзяржава — Рэч Паспалітая. — *Рэд.*) вядучай тэндэнцыяй правячай вярхушкі становіцца апора на польскіх магнатаў і каталіцкую царкву. Для расшырэння ўплыву апошняй у 80-х гг. XVI ст. быў задуманы план уніі праваслаўнай і каталіцкай цэркваў, якая павінна была дапоўніць дзяржаўную унію 1569 г. і замацаваць уладу вярхушкі феадалаў над народнымі масамі. У 1596 г. такая унія была заключана ў Брэсце, згодна яе стваралася царква уніяцкая. Да XVII ст. насельніцтва Беларусі было ў веравызначальных адносінах амаль усё праваслаўнае, па ўсходняму абраду. Каталіцкае веравызнанне, рэфарматарскія вучэнні (кальвіністаў і інш.) простым народам не ўспрымаліся. Выключэнне складалі асобныя дваранскія роды, залежная ад іх шляхта.

Люблінская унія 1569 г., паводле якой аб'ядналіся ВКЛ з Польшчай, пазней Брэсцкая царкоўная унія значна змянілі грамадскі лад Беларусі, усходніх яе раёнаў у прыватнасці. Сюды накіроўваюцца шмат якія езуіцкія прапаведнікі, каталіцкія святары, будуюцца касцёлы, манастыры. «Главная задача иезуитов, — заўважае А. Кіркор у кнізе «Живописная Россия», — состояла

ў XIII — XX стст. Эканамічнай асновай пануючага становішча шляхты была феадальная ўласнасць на зямлю. У Вялікім княстве Літоўскім з XIII ст. асноўная маса феадалаў называлася баярамі. З першай чвэрці XVI ст. гэта назва канчаткова заменена тэрмінам шляхта. Ужываўся і тэрмін баяры-шляхта. У яе асяроддзі існавала значная маёмасная няроўнасць. У XIV—XV стст. з агульнай масы вылучаюцца князі і знатныя баяры (паны). На самай ніжэйшай прыступцы шляхецкага саслоўя знаходзілася дробная шляхта, якая мела невялікія ўчасткі зямлі з некалькімі сялянамі або без сялян. Існавала значная па колькасці група ваеннаслужачых людзей, куды ўваходзілі не толькі нашчадкі дробных беларускіх і літоўскіх баяр і дружыннікаў, але, у асобных выпадках, і прадстаўнікі незапрыгоненых сялян — людзей «пахожых». Феадальнае заканадаўства ВКЛ паступова замацавала і пашырыла правы шляхты, што знайшло адлюстраванне ў радзе прывілей і Статутах.

На Беларусі асноўную масу шляхты складалі сярэднія і дробныя феадалы беларускага паходжання (93,8 % у Мсціслаўскім княстве). У сярэдзіне XVI ст. шляхта Беларусі ўступіла ў саюз з велікакняжацкай уладай і дамаглася ўзвышэння сваёй палітычнай ролі ў дзяржаве: узмацнілася роля сеймаў, з прадстаўнікоў усёй шляхты ствараліся павятовыя сеймікі, якія цалкам кіравалі на месцах, былі створаны шляхецкія суды ў паветах, кадыфікавана феадальнае права (гл.: Даведнік у Статуце Вялікага княства Літоўскага, 1588. БСЭ, 1989. С. 544).

в том, чтобы обратить в католиков все дворянское сословие. На мещан и крестьян они не обращали внимания. По тогдашним понятиям политическая сторона не требовала этого; но в догматическом отношении важно было только то, чтобы народ греческой веры признавал папу (Римского. — *Рэд.*) главою церкви. С этой целью и придумана была уния, как переходное состояние... Уния принималась народом бессознательно, по приказанию владельцев. Обрядность, язык оставались прежние, и народ не замечал даже или не понимал основной перемены, именно в признании папы. Православное духовенство в то время было так грубо и необразованно, что не могло влиять благотворно на сельское сословие, не могло соперничать с иезуитами и по отношению к высшим сословиям» (с. 306). У гарадах езуіты сустракалі моцны адпор (напрыклад, паўстанне ў Віцебску супраць архібіскупа Кунцэвіча, дзе яго і забілі).

Антыуніяцкі рух ахапіў і многія тэрыторыі цяперашняй Шклоўшчыны. Гэты рух быў адначасова і супраць феадальнага прыгнёту. Сяляне адмаўляліся ад выканання шматлікіх павіннасцей, уцякалі ў Расію і ва Украіну да казакаў. Узброеныя дружыны ствараліся ў асобных населеных пунктах. Многія сяльчане, гарадская бедната ўдзельнічалі ў антыфеадальных выступленнях казакаў пад кіраўніцтвам С. Налівайкі. Нямала сялян з вёсак і мястэчак удзельнічала ў барацьбе супраць Рэчы Паспалітай на поўдні Беларусі ў складзе казацка-сялянскіх атрадаў Б. Хмяльніцкага.

Г. Напрэй

СА СКАРГІ БЕЛАРУСКАГА ПРАВАСЛАЎНАГА ЕПІСКАПА ГЕОРГІЯ КАНІСКАГА СІНОДУ АБ НАСІЛЬНЫМ АБАРАЧЭННІ ВА УНІЯЦТВА І АБМЕЖАВАННІ Ў ПРАВАХ ПРАВАСЛАЎНЫХ ЖЫХАРОЎ БЕЛАРУСІ

1761 г.

Малой здешней Христовой церкви какой ныне вид есть, по причине миссии доминиканской, смотрети на оной без слез богобоящемуся человеку нельзя. Доминикан оный, прозываемый Овлочинский (который и на меня в гор. Орше в церковь разбойников с оружием прислал, и в мест. Уле бывший благочестивого греко-российского исповедования народ разными крещениями и мучениями в унию превратил), с сообщниками своими доминиканами ж не престает и до ныне от города до города пресмыкается, как-то и недавно отправлял он свое лжеапостольство в гор. Полоцке, а ныне находится в Шклове, куда прибывши, с помощью шляхты и других как римской, так и униатской религии обывателей, насильно собирая в деревнях благочестивых людей, но всяк день, как овец, до костела гонит, и тамо в первых неделях великого поста заключив, ласкает словами и прельщает ложными и смеха достойными чудесами...

Оные же миссионеры обязывают господ своих под клятвою панскою, дабы благочестивым нашим людям не допущали, больше жить при благочестивой вере ни в селах, ни в городах, но или в унию насильно прынуждали бы, или не хотящих игнали бы прочь... В Полоцке по особливым королевским давным привилегиям доселе в магистре чиновные люди состояли одна половина из римлян и униатов, а другая из благочестивых: ныне же они под клятвою приказали своим, дабы наших от сего времени к чинам магистратским не допущать, також дабы на суд свой называли тех, которые отца или матерь, а по крайней мере деда или бабку римского или униатского закона имели, а сами в благочестие крестились и в нем живут, из которых несколько человек ныне из Шклова: оставя свои жилища, ко мне прибегло, укрываясь и прося заступления, а другие, там же в Шклове в тюрьмы быв насажены, ран и разорения, ежели твердо при благочестии стоять будут, ожидают...

Цыт. па кн.: Белоруссия в эпоху феодализма. Т. 2. Мн., 1960. С. 371—372.

Шклоўскія землі ў XIV — XVIII стагоддзях: межы, уладальнікі

Тэрыторыя, якая атрымала ў другой палове XVI ст. назву «Шклоўскае графства», займала частку сучаснага Шклоўскага раёна, на ўсходзе заходзіла ў межы сучаснага Горацкага раёна, на паўночным захадзе ўключала населеныя пункты, што ўваходзілі ў састаў Аршанскага і Талочынскага раёнаў. М. Б. Тапольская адзначае, што Шклоўскія землі складваліся з дзвюх частак, размешчаных па абодва бакі р. Днепр. Заходняя частка прымыкала непасрэдна да р. Днепр і была выцягнута паласой кампактна размешчаных паселішчаў з поўначы на поўдзень. Усходняя частка Шклоўскіх зямель (Задняпроўская) таксама была выцягнута з поўначы на поўдзень кампактнай паласой паселішчаў уздоўж р. Бася і на поўдні злучалася з заходняй часткай па лініі вв. Хадулы, Путнікі, Заходы, Царковішча, Рудня. Крайняй паўднёвай кропкай шклоўскіх уладанняў з'яўляецца в. Слабодка.



У складзе Віцебскага ваяводства

У другой палове XVI ст. Шклоўскае графства межавала на паўднёвым захадзе з валасцямі Галоўчынскай і Задзвінскай, якія належалі Галоўчынскім. У раёне в. Высокае на паўночным захадзе мяжа праходзіла ўздоўж уладанняў каханоўскіх Сапегаў, на захадзе — уздоўж зямель Старасельскіх, якія таксама належалі Сапегам. На поўначы суседзямі Шклоўскага графства былі княства смаленскіх Сангушкаў, воласць Пагосцкая, якая належала Тышкевічам, і графства Дубровенскае, якім валодалі Глебавічы. З усходу да Шклоўскага графства прымыкалі землі графства Горы-Горскага Сапегаў. На паўднёвым усходзе Шклоўскія землі межавалі з Магілёўскай эканоміяй (у XVIII ст. цэнтральная частка паўднёвай мяжы Шклоўскага графства праходзіла ўздоўж уладанняў аршанскіх езуітаў — Фашчаўскія землі).

Левабярэжжа Дняпра паміж заходняй і ўсходняй (Задняпроўскай) часткамі Шклоўскага графства займалі землі Копыскія, якія належалі Радзівілам. Варта адзначыць, што межы Шклоўскага графства праходзілі ў асноўным уздоўж пушчаў і лясоў, якія належалі суседнім уладанням. Уласна шклоўскія лясы займалі да 15 % тэрыторыі графства ў сярэдзіне XVII ст. і да 11 % пасля ста гадоў. Копыскія землі, якія ўклініліся паміж заходняй і ўсходняй часткамі Шклоўскага графства, відаць, раней складалі непадзельную тэрыторыю, якая належала роду Гаштольдаў, і былі перададзены К. Астрожскаму ва ўладанне толькі пасля таго, як род Гаштольдаў згас. У канцы XVI ст. (1595—1600) Аляксандр і Карл Хадкевічы зрабілі спробу вяртання Копыскіх зямель да Шклоўскіх уладанняў, але беспаспяхова.

На тэрытарыяльна-адміністрацыйным дзяленні XVI ст. землі Шклоўскага графства ўваходзілі ў Аршанскі павет Віцебскага ваяводства, якое было заснавана ў 1506 г. замест скасаванай Віцебскай зямлі. У канцы XIII — сярэдзіне XIV ст. Віцебская і Полацкая землі на падставе пагаднення («рады») баярства гэтых зямель з літоўскімі князямі, захаваўшы сваю тэрытарыяльную цэласць і правы, увайшлі ў састаў Вялікага княства Літоўскага. У гэты перыяд у паўднёвай частцы Віцебскай зямлі размяшчалася воласць Рошская (Аршанская), да якой прымыкалі велізарныя Верхнедняпроўскія ўладанні князёў Друцкіх.

Шклоўскае графства. XVI—XVIII стст.

Феадальная вайна 1432—1439 гг. прывяла да стварэння на тэрыторыі Полацкай, Віцебскай і Смаленскай зямель «Вялікага княства Рускага» на чале са Свідрыгайлам Альгердавічам. Яно праіснавала на падставе дзяржаўнай аўтаноміі гэтых зямель на працягу чатырох гадоў, да перамогі вялікага князя Жыгімонта і яго прыхільнікаў. «...Князь велиций Жигимонт собра всю свою силу литовскую и посла сына своего князя Михаила на Русь. И пришед князь Михаил станеть на Рши. И смоляне стретили князя Михаила на Рши, и далися смоляне князю великому Жигимонту и его сыну», — паведамляе летапіс (ПСРЛ. Т. 35. С. 99).

Зыходзячы з карты, састаўленай М. Любаўскім на 1514 г. па пісьмовых крыніцах, у Аршанскі павет уваходзілі воласці Межаўская, Мікулінская, Любаўская, Дубровенская, Двор Смальняны з воласцю, а таксама ўладанні князёў Друцкіх (у тым ліку Зубрэвічы,

Слабодка, якія ўвайшлі потым у Шклоўскае графства).

Зыходзячы з апісання меж Аршанскага павета ў матэрыялах, падрыхтаваных да Віленскага сейма 1565 — 1566 гг., ён у сярэдзіне XVI ст. займаў велізарную тэрыторыю. На поўдні яго межы ўключалі Магілёў, Цяцерын, Княжычы. Згодна карце, выданай М. Хрыстафорам Радзівілам у 1613 г., тэрыторыя Аршанскага павета зменшылася ў параўнанні з сярэдзінай XVI ст. Паўднёва-ўсходняя мяжа праходзіць крыху ніжэй Галоўчына, Бялыніч, Княжыч, Шклова, Басеі, Дуброўна. У гэтых жа межах Аршанскі павет застаецца і ў 1730 г., калі часова ўваходзіць у састаў Мсціслаўскага ваяводства.

Такім чынам, у XVI — XVIII стст. аснову Аршанскага павета складалі землі былой Аршанскай воласці, а таксама ўладанні князёў Друцкіх і Сенскіх (родавы замак Сянно). У межах павета адбываюцца якасныя змены шэрага населеных пунктаў. На месцы вёсак узнікаюць феадальныя двары, замкі, пры якіх развіваюцца мястэчкі. Частка паселішчаў XIV — XVI стст. пачалі сваё існаванне яшчэ ў раннім сярэднявеччы. Калі параўнаць карту-схему Шклоўскага графства са схемай размяшчэння помнікаў археалогіі раёна, то стане відавочным, што большасць археалагічных аб'ектаў прывязана да населеных пунктаў, якія працягвалі сваё існаванне і ў познім сярэднявеччы. Амаль усе сёлы, вядомыя па інвентарах Шклоўскага графства XVII — XVIII стст., можна адшукаць на карце сучаснага тэрытарыяльна-адміністрацыйнага дзялення, што сведчыць пра стабільнасць засялення дадзенай тэрыторыі на працягу шэрага стагоддзяў.

В. І. Мялешка ў «Нарысах па аграрнай гісторыі Усходняй Беларусі» (другая палова XVII — XVIII ст.) называе тры формы зямельнай уласнасці: дзяржаўную, царкоўную і шляхецкую, якія з'яўляліся асноўнымі ў эпоху сярэднявечча. Шклоўскія землі адносяцца да разраду магнацкіх латыфундый. У XVI ст. яны належалі знатным родам літоўскім: Гаштольдам і Хадкевічам, у XVII ст. — Сіняўскім, а з другой чвэрці XVIII ст. — Чартарыйскім.

Шклоў упамінаецца ў 1520 г. у дакументах каралеўскага пасла З. Герберштэйна, у час яго дыпламатычнага падарожжа ў Маскву. Па паведамленнях 1527 і 1532 гг. быў уласнасцю Альбрэхта Гаштольда, а з 1541 г. — яго сына Станіслава, апошняга прадстаўніка гэтага роду.

Альбрэхт Гаштольд, ваявода Трокскі, атрымаў гэтыя землі ў спадчыну ад сваёй бабкі княгіні Марыны Сямёнаўны Трабской. Яна ж, у сваю чаргу, была дачкою князя Дзмітрыя Зубрэвічскага (радавы маёнтак Зубрэвічы ў межах Шклоўскага графства) і жонкай князя Сямёна Дзмітрыевіча Друцкага. Ён меў ва ўладанні двор Зубрэвічы, Хімы, пусташ Дубровенскую, двары Быхаў, Дубосну і інш. Такім чынам, Шклоўскае графства ўяўляе сабой частку спадчынных уладанняў роду князёў Друцкіх.

У сярэдзіне XVI ст. Шклоўскія ўладанні перайшлі да Хадкевічаў. Па прывілеі караля Сігізмунда Аўгуста ад 10 чэрвеня 1568 г., выданай у Оўручы, Ліфляндскаму губернатару і старасту Жмудскаму Івану Хадкевічу быў пажалавыны тытул графа «на Шклове, Слуцку, Мышы і Быхаве». Як адзначае М. Б. Тапольская, гэты тытул быў пажалаваны Івану Хадкевічу для зацвярджэння яго ў краі і ў процівагу ўплыву Габсбургаў у Літве. Пасля смерці Івана Хадкевіча Шклоўскае графства перайшло да двух яго сыноў Аляксандра і маладзейшага на год Карла. З 1599 г. Шклоў і Мыш ужо належалі толькі Аляксандру, а Быхаў — Карлу. Пасля смерці Аляксандра Шклоўскае графства перайшло ў спадчыну яго трохгадоваму ўнуку, чые інтарэсы прадстаўляла маці, Ганна Еўфрасіння, народжаная Хадкевіч. Пасля смерці Ганны і яе мужа Пракопа Сіняўскага (памёр у

1626 г.) разгарэлася спрэчка паміж Хадкевічамі і Сіняўскімі з-за Шклоўскага графства. Закончылася яна на карысць Сіняўскіх, і першы інвентар 1643 г. уладанняў Шклоўскіх упамінае Адама Ераніма Сіняўскага, графа на Шклове і Мышы. У далейшым уладальнікамі графства былі яго сын Мікалай і ўнук Адам Сіняўскія, пра што паведамляюць гербоўнікі і тытульныя лісты інвентароў Шклоўскага графства.

У 1731 г. апошняя прадстаўніца роду Сіняўскіх Марыя Сафія, дачка Адама, прынесла ў пасаг Аўгусту Чартарыйскаму 17 вялікіх валасцей і 5 старастваў. Шклоўскія ўладанні сталі з таго часу адным з 39 комплексаў гаспадаркі роду Чартарыйскіх і складалі іх уласнасць да першага падзелу Рэчы Паспалітай*.

В. Ляўко

* Першы падзел Рэчы Паспалітай паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй адбыўся ў 1772 г. Паводле Пецярбургскай канвенцыі ад 5.08.1772 г., усходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад Расійскай імперыі.

* * *

СІМВАЛ ГОРАДА

Анатоль Цітоў у кнізе «Гарадская геральдыка Беларусі» (Мн., 1989) сцвярджае, што «гарадскі герб — сведчанне таго, што горад, які мае яго, перайшоў у сваім дзяржаўна-палітычным жыцці на якасна новую прыступку арганізацыі сацыяльна-прававога апарату і ў юрыдычным плане істотна адрозніваецца ад навакольных вёсак і мястэчак і нават іншых гарадоў» (с. 10).

Менавіта такім горадам стаў у пачатку другой паловы XVIII ст. Шклоў, калі займеў свой герб 10 красавіка 1762 г. Аўтар кнігі дае кароткае апісанне сімвала незалежнасці нашых продкаў-гараджан: «У блакітным полі рука, якая трымае срэбраны бязмен» (с. 202). Гэта сведчыць пра тое, што шклаўчане таго часу актыўна развівалі гандаль. Горад меў таксама сваю пячатку, якая прымянялася з 1767 г.

Л. Анціпенка

ШКЛОЎ У «МАГІЛЁЎСКАЙ ХРОНІЦЫ»

Часопіс «Полымя» ў двух нумарах, за ліпень (с. 144—172) і жнівень (с. 194—216) 1992 г., надрукаваў матэрыял **«Магілёўская хроніка Трафіма Раманавіча Сурты і Юры Трубіцкага»**. У ёй месцамі апісваюцца падзеі, якія звязаны са Шкловам.

Пад 1655 г. пазначана, што пад Магілёвам быў з вялікім войскам маскоўскі цар Аляксей Міхайлавіч, які хадзіў пад Вільню і Рыгу. Крыху ніжэй сцвярджаецца: «...Пасля гэтага за год і Шклоўскую браму муравать пачата».

Упамінаецца Шклоў у «Хроніцы» пад 1664 г. з наступнымі падзеямі: «Князь Якаў Кудэнекавіч Чаркаскі з Пазароўскім і з Баратынскім аблажылі Копысь і Шклоў. А Міхаіл Пац, ваявода віленскі, стаў з войскам пад Шкловам, дзе Масква, патаемна пераправіўшыся цераз Днепр, наступіла вялікім войскам месяца чэрвеня 15-га дня». Убачыўшы такую сілу, Пац адступіў да Магілёва...

Прыпаднесла прырода неверагодны сюрпрыз магілёўцам і шклоўцам летам 1694 г. «Месяца жніўня 11-га па рускім календары, у суботні дзень, а другой гадзіне папоўдні, наплыла нечакана з паўночнага боку (ад Шклова. — *Л. А.*) такая страшная, цёмная і вялікая, як ноч, хмара, якая навяла жах як на горад, так і на ваколіцы, мястэчкі і вёскі чуванай і бачнай грымотай, градам, які спачатку падаў дзіўнай праявай, як чатырохвугольны арэх. Таксама на паветры ў ваколіцах быў такі вялікі буран, што ведаем, панскія стадолы, вясковыя хаты адзямлі паадарвала, збожжа месцамі з грунту павыбівала.

У гэты ж час і розныя купцы, якія ехалі з Рыгі, тое ж самае расказвалі, а менавіта што мілі за чатыры ад Рыгі разваліла мураваны замак курляндскага князя. У гэты ж час расказана віднымі людзьмі шляхецкага і купецкага станаў, што ў дарозе карэты пасла прускага князя з коньмі і саміх віхорам далёка занесла, што ад страху не ведаў у які бок і ехаць».

У даўнія часы Днепр вясновай паводкай прыносіў шмат бяды прылеглым гарадам і вёскам. У «Хроніцы» прыводзіцца такі выпадак, які прыпадае на 1695 г.: «Страшна вялікая вада была вясною, якая шкоды на

рабіла і нямала людзей з дамоў павыганяла, агароды, замёты і тыны пазносіла. Потым у гэтым жа годзе месяца ліпеня 4 дня на Божае цела (свята каталіцкай царквы ў першы чацвер пасля тройцы, руская праваслаўная царква яго не прызнае. — *Л. А.*) у суботу вечарам выпаў вялікі снег, які ляжаў у Магілёве некалькі дзён. А за Беразіною, за Нёманам і далей было яшчэ ў тры разы горш. Цэлае лета холаду і марозу пашкодзіла збажыну, з-за чаго і дарагавізна з'явілася».

«Хроніка» паведамляе, што ў 1696 г. зноў «шкодзіла на збожжа саранча».

Летапіс падрабязна расказвае пра паездку маскоўскага цара Пятра Аляксеевіча ў 1697 г. за мяжу, наведаўшага Рыгу, феадальную Германію, Рым і розныя каралеўствы і княствы. «Вяртаючыся тады з нямецкіх краін, быў ён у ягамосці караля Аўгуста, бавіўся кампаніямі і пацехамі, потым ішоў на Шклоў і на мяжы, за кадзінам, загадаў паставіць на памяць слуп».

Наступіла XVIII ст. У першым жа годзе яго «Шклоўская царква змуравана і дакончана панам Базылём Аўсяевічам, шклоўскім купцом, ягоным коштам, толькі, падобна, не без дапамогі другіх». Патурбаваўся чалавек такім вось макарам упісаць сваё імя ў гісторыю — нямарна пражыў купец на свеце.

Следам за паведамленнем аб завяршэнні будаўніцтва Шклоўскай царквы чытаем: «...У гэтым жа годзе, на першым тыдні ад дзевятай гадзіны аж да адзінаццатай былі бачны тры сонцы, адно было вышэй, а два ніжэй. Звычайнае было вышэйшым, а ніжэйшыя былі цямнейшымі і мелі прамені, як бы трубы, адзін на ўсход, а другі на захад. Потым гэтыя два згінулі, на што мы самі глядзелі».

У 1704 г. зноў з'явілася камета на небасхіле. А здарылася гэта «...дня 20 ліпеня, у вячэрні час, як гналася быдла, паказалася камета з малой зоркі, а потым, павялічыўшыся, вяла свой хвост на поўнач, і страшна гэта было. У гэты час, увечары, адслужаны ў цэрквах усеагульныя малебны. Трывала гэтая камета аж да апоўначы».

Надыходзіў час, калі наспявала вайна паміж рускай дзяржавай і шведамі. Ужо 1706 г. у Магілёве адбываліся «пераходы пераезды розных войск», узводзіліся масты праз Днепр. Не мінулі падрыхтаванні да вайны і Шклова: «Гэтага ж года 1706. Мая чатырнаццатага дня быў заказаны гораду правіянт на дывізію генерала Баура, да якога ў Шклоў ездзілі панове магістратавыя і, каб не даваць правіянту, задобрылі генерала Баура тысячаю тынфаў. У гэты час адбілася рэха, быццам бы прыбліжаецца і кіруецца да Магілёва швед, з-за чаго з горада да Слуцка, Мінска і далей пасылана шпегаў, але не ўзялі ніякай весткі, бо швед у гэты час яшчэ не ўвайшоў у Польшчу».

Вядома, што цар Пётр праязджаў праз Шклоў, калі «...чэрвеня 21 дня ўдалося пачуць, што едзе цар ягамосць у Магілёў вадою, гэта значыць Дняпром». У той дзень маскоўскага ўладара ўрачыста сустракалі ў Магілёве. «А потым цар ягамосць хутка, у гэтую ж ноч, узяўшы праваднікоў, падплыў ад Магілёва да Кіева».

Ваенныя падзеі наспявалі. У 1707 г. «пастаянна то ў Літву праз Магілёў, то з Літвы за Магілёў прагульваліся маскоўскія войскі. А пад Копысем стаяла немалое, некалькі дзесяткаў палкоў, пяхотнае і конскае войска, і тут капалі акопы. На капанне гэтых акопаў давана сялянскага люду з рыдлёўкамі і сякерамі з усяго Аршанскага павета па некалькі соцень на тыдзень, таксама і з Магілёўскай эканоміі і з самога Магілёва ў тыдзень давана і выслана на капанне гэтых акопаў па дзвесце чалавек. А гэтыя акопы капаны па такой прычыне, што меўся швед, перайшоўшы ў Копысі Днепр (бо ў Копысі ў гэты час Днепр быў неглыбокі, што войска магло перабрацца на другі бок па вадзе конна), ісці на Маскву. І так тут маскоўскае войска, каб не прапусціць у Копысі праз Днепр шведа, умацоўвалася».

Праз год зноў Копысь упамінаецца ў летапісе: «У гэтым годзе 1708. Месяца студзеня 10-га быў цар ягамосць Пётр Аляксеевіч у Копысі, бо тут скапілася ў грамаду вялікае маскоўскае войска і тут, пад Копысем, стаяла ў акопах для адпору шведу, які цягнуўся на Русь».

«Магілёўская хроніка» заканчваецца даволі цікавым эпізодам: «Пасля смерці шведскага караля дадзена знаць маскоўскаму цару, што памёр. Цар ягамосць, даведаўшыся, што гэта праўда, горка па ім плакаў. А калі сенатары гаварылі, што не гадзіцца плакаць па сваім непрыяцелю, адказаў, што з чужой смерці не трэба цешыцца, бо ўсе мы смяротныя, а што быў мне непрыяцелем, на гэта ёсць вайна, а чаму плачу па ім, плачу, што быў адважным кавалерам і дасведчаным рыцарам у ваенных справах, з якімі, калі б заключылі мір і адзінства, то ўсе нацыі перад намі дрыжалі б».

Л. Анціпенка

ШКЛАЎЧАНЕ Ў МАСКВЕ

Як сведчаць гістарычныя дакументы, значная колькасць выхадцаў з Беларусі перасялілася ў XVII ст. у Рускую дзяржаву. Гэта ў асноўным майстравыя людзі. Тым больш, што Беларусь у той час славілася керамічнымі вырабамі. У Маскве таксама актыўна развівалася гэтая галіна. Тут выраблялася кафля беларускімі майстрамі, якія прыехалі ў Маскву ў час руска-польскай вайны 1654—1667 гг.

У літаратуры па гісторыі маскоўскай архітэктурна-дэкаратыўнай керамікі ўпамінаюцца два беларускія майстры Сцяпан Іваноў з Мсціслава і Ігнат Максімаў з Копысі, а таксама шкловец Васіль Мікулаеў.

Сярод тых, хто прыехаў у Маскву, былі збройнікі Максім Міхайлаў і Трахім Цердзік з Копысі, Восіп Іваноў са Шклова. Да 1676 г., пасля заснавання Мяшчанскай слабады, у ёй пасялілася 487 сем'яў з Беларусі. На перапісе 1684 г. іх колькасць узрасла да 612. Сярод рамеснікаў слабады 32 выхадцы са Шклова: 1 ганчар, 15 краўцоў, 3 сярэбранікі, 2 збройнікі, па аднаму скарняжніку, каретнаму збойшчыку, абутніку, чунніку, шорніку, алавянніку. Былі купцы. Шырокай гандлёвай дзейнасцю вызначаўся шкловец Сямён Цімафееў.

М. Ільюшэнка

КЛІМ МІХАЙЛАЎ

Паходзіў са Шклова. Выдатны мастак-разьбяр па дрэве другой паловы XVII ст. Разам з іншымі беларусамі быў вывезены ў Маскву. У 1650—1660-х гг. быў перададзены патрыярху Нікану для аздаблення Васкрасенскага сабора Нова-Іерусалімскага манастыра на Істры.

З Арсеніям Старцам і Сцяпанам Зіноўевым працаваў у Палаце разбярскіх і сталярных спраў Маскоўскага Крамля. Удзельнічаў у стварэнні «Іарданскай сені» (1668, цяпер у саборы Раства Багародзіцы ў Суздалі). У 1681 г., пасля смерці Арсенія, узначаліў Палату.

У 1667—1668 гг. удзельнічаў у аздабленні Каломенскага палаца — падмаскоўнай рэзідэнцыі цароў. Цудоўнае ўражанне рабіла раскошная ўнутраная апрацоўка палаца, аздобленая пазалотай аб'ёмная ажурная разьба, узорыстыя вокны, яркія шматколерныя кафлі печаў, мастацкі роспіс сцен і столі, розныя карнізы, кранштэйны. Шчыты пакрываліся пазалотай або размалёўваліся «жывапісным пісьмом». Талент Кліма Міхайлава асабліва праявіўся, калі пад яго кіраўніцтвам група беларусаў стварыла іканастас 3 цэркваў у Ізмайлаве, кліраса і пяціярусны іканастас Смаленскага сабора Новадзявочага манастыра ў Маскве.

А. Грудзіна

МАГНАЦКАЯ І СЯЛЯНСКАЯ ГАСПАДАРКА ШКЛОЎСКАГА ГРАФСТВА Ў ДРУГОЙ ПАЛОВЕ XVII — ПЕРШАЙ ПАЛОВЕ XVIII ст.

1. Общая характеристика экономического состояния поместья.

К началу войны графство состояло из 161 села и двух местечек (Александрия и Зубровичи). В 1650 г. во всем владении насчитывалось 4279 волок*. Из этого количества было 2182 оседлые волоки, с которых крестьяне несли обычные повинности владельцу графства (чинш, денежный налог, так называемая «арендовщина» и сторожовщина, оброк натурой (гуси, куры, яйцо) и барщина 10 дней с волоки в год). 154 оседлые волоки принадлежали боярам, лавникам и лесничим, с которых взимался облегченный чинш, как с «наездных» волок, 257 волок «наездных» и двора и свыше 860 волок «вольных».

2. Состояние крестьянского и господского хозяйства после войны середины XVII в.

Война принесла огромные бедствия для сельского населения графства. В результате войны и сопутствующих ей голода и эпидемий во владении погибло свыше 10 800 крестьян мужского пола (женский пол инвентари не учитывали). Многие крестьянские семьи разошлись в другие места. В графстве осталось 2421 пустующая волока (75,2 % всех волок графства).

3. Восстановление крестьянского и господского хозяйства в конце XVII в.

Для более успешного их восстановления крестьянам предоставлялись некоторые льготы, была временно ликвидирована существовавшая, хотя и незначительная, барщина (10 дней в год с волоки), натуральный оброк (тягло) и подводная повинность были заменены де

* Валока раўнялася 30 моргам, або 21,36 гектара.

нежным эквивалентом. За свой надел крестьяне уплачивали только денежный чинш. Пустые волоки раздавались крестьянам в прием и на 3-й сноп. Значительная часть их обрабатывалась наездом. В 1688 г. во всем графстве имелись 1622 волоки «наездные» и лишь 447 оседлых.

4. Новые разорения, причиненные Северной войной в начале XVIII в.

Северная война прервала и на некоторое время задержала процесс восстановления сельского хозяйства. Огромные контрибуции и грабежи шведских войск причинили значительный урон крестьянскому и господскому хозяйству. Доход владельца графства с волок в виде чинша даже в 1712 г. почти в 3 раза был меньше, чем в 1650 г.

5. Состав сельского населения.

Основной категорией сельского населения были оседлые чиншевые и тягловые крестьяне. Довольно значительную группу составляли также шляхта, сельские ремесленники. В графстве имели место люди «лезные» и бобыли, занимавшиеся ремеслом, случайными заработками и работавшие по найму у зажиточных крестьян, двора, а также на промысловых предприятиях.

6. Состояние фольварочного хозяйства.

Фольварочно-барщинная система в графстве не получила сколько-нибудь заметного развития. В XVII — первой половине XVIII в. во всем владении имелось всего лишь 3 фольварка, которые во второй половине XVIII в. были ликвидированы. Существовавшие фольварки по своим размерам были незначительны и обеспечивали продукцией лишь нужды двора. Урожайность в фольварках была низкая. На протяжении 10 лет, с 1704 по 1714 г., средний урожай зерновых составил: ржи — 2,25, овса — 2,2, ячменя — 4,3, пшеницы — 2,9, гречихи — 2, гороха — 4,0, конопли — 3,5 зерна (?). Отсюда и доходность их была низкая...

7. Занятия крестьян.

Основным занятием крестьян было земледелие. Как в XVII, так и в XVIII в. существовала трехпольная система севооборота. По размерам высева первое место среди культур занимала рожь, затем следовали овес, ячмень, гречиха, горох, пшеница, конопля. Урожаи были сравнительно низкие.

Большой удельный вес в сельском хозяйстве занимали промыслы, главным образом лесные и железорудные. В 1693 г. доход от промыслов и связанной с ними аренды составил 43,6 % общего дохода владельца графства. Развито было также бортничество.

... 10. Применение наемного труда.

В связи с ростом товарности господского хозяйства все больше возникала необходимость применения не только принудительного, но и свободного найма. Как тот, так и другой больше применялись в промысловой отрасли феодального хозяйства. Владелец графства наряду с принудительным наймом (возчики золы и руды) нанимал специалистов поташного и железорудного дела (будников, мастеров поташного и железоделательного дела, ремесленников), которые работали на договорных началах, получая за свой труд «ординарий» и денежную плату.

Из выступления В. И. Мелешко на VIII (Московской) сессии симпозиума по аграрной истории Восточной Европы (сентябрь 1965 г.). МГУ, 1965. С. 56—59.

АПУСТАШЭННЕ ЗА АПУСТАШЭННЕМ

«Белоруссия одинаково страдала от опустошения, произведенного войсками враждовавших между собой сторон. Не менее ей были бедственны войны: Царя Иоанна Васильевича с Польским Королем Сигизмундом Августом и Стефаном Баторием, Царя Михаила Феодоровича с Сигизмундом III и Владиславом IV, Царя Алексея Михайловича с Иоанном Казимировичем, Императора Петра Великого с Карлом XII. В эти-то смутные периоды разоренные жители, лишенные домашнего счастья и покоя, в дремучих лесах искали для себя спасения и приюта; многие их тысячи погибли от меча, болезней, голода, язвы; пожары истребили памятники древности, архивы, акты, летописи.

...Белоруссия — страна, где мечом решались споры враждовавших народов между собою; в ней каждая верста была оспариваема мужеством, куплена кровью, ознаменована славою! Эту землю можно называть обширным кладбищем бесчисленного числа побитых, сражавшихся за веру, права своих властителей, их честь и достояние: селищам мирных жителей — несчастных жертв войны, нашедших себе последний спокойный приют в недрах этой самой земли, на которой в первый раз взглянули на свет божий».

Без-Корнилович М. И. Исторические сведения о примечательнейших местах в Белоруссии... СПб., 1855. С. 17—18.

* * *

Працоўны народ моцна цярпеў ад бясконцых міжусобіц феадалаў-спадароў, ад старост і іншых служак багацеяў на месцах, ад пастаянных набораў, міжканфесійных спрэчак. Але яшчэ больш страшныя апусташэнні цярпела зямля Беларусі, Шклоўшчына ў тым ліку, у выніку зацяжных ваенных сутыкненняў паміж ВКЛ, Рэччу Паспалітай і мацнеючай Маскоўскай дзяржавай. В. Ю. Ластоўскі аб гэтым пісаў: «З даўна ішлі споры з Масквой аб літоўскарускіх граніцах, але, калі за Іаана III Масква пачувалася на сілах, яна заявіла свае правы на беларускія землі быццам яны з даўніх часоў належалі да Масквы, былі «вотчынай» маскоўскіх цароў. І вось за гэту «вотчыну» пачаліся даўгалетнія войны (цягнуўшыяся блізка 150 гадоў), у каторых на сьмерць змагаліся Масква і Русь літоўская. Вайна гэта была цяжкая і доўгая: яна большую часць Беларусі абярнула ў шчырую пустыню. Мірные сяляне, грабленыя і паленыя, пакідалі свае загоны і кут родны і беглі ў палудзенныя старны...» (Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. С. 36).

«...Иоан III с завистью смотрел на возрастающее могущество Великого княжества Литовского (поўная назва ў XV — XVI стст. «Великое княжество Литовское, Русское и Жемойтское». — *Рэд.*). Ему не нравился союз Литвы и Руси с Польшею, и он серьезно помышлял о том, как бы слить Литву и Русь воедино с Московским государством. Эта мысль постоянно крепла, созревала и никогда уже не оставляла Московских властителей, а несчастная Белоруссия была обречена в жертву, как передовой пост воинских набегов, и много, много пострадала» (Живописная Россия. С. 301).

* * *

Перагорнем асобныя старонкі гісторыі вечнага супрацьстаяння паміж ВКЛ і Рускай дзяржавай, якое абвастрылася, як сцвярджаюць даследчыкі, з канца XV ст. і непасрэдна закранае тэрыторыю сучаснай Шклоўшчыны.

Спачатку канфрантацыя мела характар невялікай прымежнай вайны (1487—1494), у выніку якой Вялікае княства Літоўскае адмаўлялася на карысць Маскоўскага ад Вяземскага княства і часткі іншых княстваў. За Маскоўскім гасударом замацоўваўся тытул «Вялікага князя ўсяе Русі». Аднак супярэчнасці паміж дзвюма дзяржавамі зняты не былі, а ў 1500 г. адносіны канчаткова былі разарваны. Войскі Івана III занялі Бранск, Мцэнск, Гомель, паўднёвую частку Смаленскай зямлі і тэрыторыі Чарнігава-Старадубскага і Ноўгарад-Северскага княстваў. 14 жніўня 1500 г. адбыўся разгром літоўскага войска каля Смаленска. Потым гэта вайна працягвалася яшчэ два гады.

Наступальную палітыку Івана III у справе аб'яднання з Маскоўскай дзяржавай зямель, населеных рускімі, украінцамі, беларусамі, прадоўжыў яго сын Васілій III. Ваенныя дзеянні ішлі ў 1507—1508, 1512—1514 гг. Пасля таго, як быў захоплены Смаленск (30 чэрвеня 1514 г.), Васілій III рушыў да Оршы і Друцка. Каля Оршы яго войскі пацярпелі поўнае паражэнне. Спустошана было наваколле. Але спробы ВКЛ выкарыстаць перамогу, вярнуць аднятыя Масквой землі поспеху не мелі. У 1522 г. было заключана 5-гадовае перамір'е, якое было яшчэ прадоўжана да 1533 г. (Менавіта ў гэты смутны час быў упершыню ўпамянуты Шклоў.)

Смерць Васілія III і смуты ў Маскоўскай дзяржаве пры яго малагадовым пераемніку штурхнулі Вялікае княства Літоўскае да яшчэ адной няўдалай спробы вяртання завяванага Масквой у час вайны 1534—1537 гг. Літоўскае княства вярнула толькі Гомель і некаторыя воласці на ўсходзе. Новае перамір'е мела затым працяг аж да пачатку Лівонскай вайны (1561). Да сярэдзіны XVI ст. Вялікае княства Літоўскае ўжо не магло супрацьстаяць на роўных Рускай дзяржаве. Логіка барацьбы вымусіла ВКЛ да больш цеснага аб'яднання з Польшчай. (Больш за 100 гадоў яно знаходзілася ў стане персанальнай уніі з Польшчай, застаючыся пры гэтым суверэннай дзяржавай дзякуючы намаганням рускіх і літоўскіх феадалаў.)

Узнікненне ў 1569 г. у выніку Люблінскай уніі магутнай сярэдневяковай дзяржавы Рэчы Паспалітай паклала пачатак новай трагічнай старонкі ў гісторыі Беларусі, вядома і Шклоўшчыны. Менавіта яе тэрыторыя стала тэатрам ваенных дзеянняў. Войскі Івана IV яшчэ ў 1563 г. захапілі Полацк, а затым значную частку другіх беларускіх зямель. Аднак, калі на прэстол Рэчы Паспалітай узышоў сяміградскі ваявода Стэфан Баторый, фартуна павярнулася да польска-літоўскіх войскаў. Баторый здолеў рэарган-

заваць і ўмацаваць армію, перайсці да наступальных дзеянняў. У жніўні 1579 г. ён авалодаў Полацкам, радам смаленскіх і северскіх зямель. Толькі пасля няўдач пад Псковам Рэч Паспалітая заключыла з Рускай дзяржавай перамір'е на 10 гадоў.

Спакою для народа яно, аднак, не прынесла. Узмацненне прыгоннай эксплуатацыі, частыя неўраджаі, голад, эпідэміі — усё гэта клалася цяжкім ярмом на сялян і гарадскі люд. Апусташальнаму грабяжу падвяргалася насельніцтва і падчас вайны шляхты і наёмнікаў супраць казацка-сялянскіх атрадаў Галоты, Налівайкі, пазней — войска Б. Хмяльніцкага. Непамерныя паборы на сваё ўтрыманне, адкрытыя грабяжы над мясцовымі жыхарамі ўчынялі вайсковыя атрады магнатаў Рэчы Паспалітай, шляхты, калі яны накіроўваліся на дапамогу палякам ў «смутныя гады» Маскоўскай дзяржавы.

У маі 1654 г. пачалася руска-польская вайна, у якой прыняла ўдзел значная колькасць жыхароў Шклоўшчыны. Для рускай арміі яна праходзіла ў першы час паспяхова. Спроба гетмана Радзівіла арганізаваць адпор не мела поспеху. Праўда, пад Оршай адзін з яго атрадаў нанёс паражэнне войскам Чаркаскага, але затым пад Шкловам падаспеўшымі сіламі князя Трубяцкога было разгромлена ўсё войска Радзівіла, а сам ён выратаваўся ўцёкам, пакінуўшы на полі бою свой гетманскі бунчук. Да канца 1655 г. рускія войскі занялі амаль усю тэрыторыю Беларусі, значную частку Украіны, дзе яны дзейнічалі сумесна з войскамі Б. Хмяльніцкага. У 1657 г. па розных прычынах вайна прыняла зацяжны характар. Ужо ў 1661 г. рускія пакідаюць рад гарадоў, у тым ліку Магілёў. Знясіленыя дзяржавы ў 1667 г. у в. Андрусава, паблізу Смаленска, падпісалі перамір'е на трынаццаць з паловай гадоў. Расія вярнула сабе Смаленскае ваяводства з усімі паветамі і гарадамі, Старадубскі павет і Чарнігаўскае ваяводства, Левабярэжную Украіну. Беларусь засталася ў Рэчы Паспалітай. Для Шклоўшчыны вайна 1654—1667 гг. азначала страту амаль палавіны насельніцтва, зруйнаванне вялікай колькасці пабудоў, згубу пасеваў, жывёлы, а разам з тым эпідэміі, галечу, бясконцыя бядоты.

Г. Напрэеў

БАТАЛІІ ПАЎНОЧНАЙ ВАЙНЫ НА ШКЛОЎШЧЫНЕ

Цяжкія выпрабаванні прынесла мясцоваму насельніцтву Паўночная вайна Расіі са Швецыяй (1700—1721). Руская армія ў 1708 г. адступала да меж Расіі па тэрыторыі Беларусі. Спроба шведаў навязаць рускім генеральную бітву ў нязручных для іх умовах не мела поспеху. Кароткія абарончыя баі рускіх войск прымусілі Карла XII змяніць план уварвання ў краіну. Ён вымушаны быў прыняць кружны план паходу на Маскву, пайшоўшы на Украіну, дзе яго чакаў гетман Мазепа. Туды ж павінен быў прыбыць і шведскі корпус А. Левенгаупта.

Да гэтага часу былі ўзведзены апорныя пункты: Полацк — умацаванні будаваліся ў 1707 г., Смаленск — узмоцнены ў 1706 г., замкі ў Оршы, Копысі, Магілёве і Быхаве. Тут былі рускія гарнізоны. Да прыходу рускай арміі да рэк Бераэіна і Ула былі падрыхтаваны магазіны (тылавыя абозы, склады) у Копысі, Шклове, Быхаве, Смаленску і Полацку. Маставыя пераправы ў розны час узводзяцца ў Быхаве, паблізу Магілёва, Шклова, Копысі, Оршы.

Руская армія раздзялялася на дзве часткі. Каля 26,5 тыс. воінаў знаходзілася ў веданні Шарамецьева і каля 31 тыс. — князя Меншыкава. Мястэчка Стараселле было вузлавым пунктам з Оршы, Копысі і Шклова, з аднаго боку, і Машчаніцы, Галоўчына і Талочына — з другога. Размешчаны ў Стараселлі атрад перакрываў шлях з Круглага. Клімавічы лічыліся зручным месцам для абароны дэфіле на шляху Цяцерын — Шупень — Шклоў. Займаючы яго, можна было лёгка перамясціцца як да Стараселля, так і да Галоўчына — таксама вузлавога пункта дарог на Стараселле, Шклоў, Магілёў.

Пакуль праходзілі перамяшчэнні рускіх і работы па ўмацаванні абаронных ліній, Карл XII паступова сцягваў войскі да Галоўчына. Мясцовасць садзейнічала шведам. З высокага берага р. Бабіч на адлегласці дзвюх вёрст відаць было, што рабілася ў рускім стане. А царква на могілках на поўначы ад Галоўчына, дзве царквы ў самім мястэчку былі добрымі назіральнымі пунктамі.

З ліпеня адбылася бітва пры Галоўчыне. Рускія войскі пацярпелі паражэнне. Дывізія Меншыкава адступіла да Шклова, Гольц — да Магілёва, Аларт і Флюк — да Копысі. 6 ліпеня ў Шклове адбылася ваенная нарада. На ёй было вырашана: паколькі Магілёў абараніць немагчыма, то зрабіць спробу перашкодзіць праціўніку пераправіцца праз Днепр. Калі гэта немагчыма, то, аб'яднаўшыся, назіраць, куды пойдзе ён, і старацца яго апярэдзіць. Падпісалі: Шарамецьеў, Меншыкаў, Галаўнін, Г. Даўгарукі, Гольц, Рэпнін, Аларт, Бруг, Рэп, Дальбон.

Карл XII павярнуў на Украіну. У верасні 1708 г. шведскі генерал Левенгаупт, які ішоў на злучэнне з каралём, паслаў свой авангард у Магілёў для нарыхтоўкі правіянту і падрыхтоўкі кватэр. Магілёўцы, дамы якіх знішчылі пажарам войскі Пятра I, прасілі Левенгаупта «аслабаніць ад пастою няшчасных жыхароў, якія цярпелі ва ўсім нястачу». Уміласціўлены гараджанамі генерал сваё войска і абоз накіраваў па дарозе да Шклова, дзе і пераправіўся праз Днепр. Выходзячы з мястэчка, патрабаваў ад жыхароў яго кантрыбуцыю. Незадаволены ёю, разбурыў Шклоў. Пераправа каля яго была занята 21 і 22 верасня, пасля чаго Левенгаупт атрымаў загад прабівацца да Старадуба.

...Гады вайны нанеслі вялізны ўрон эканоміцы Шклова. Непазнавальным стала Шклоўскае графства. Яно амаль напалову апусцела. За час вайны поўнасцю вымерла 217 сем'яў (19 %). Усяго смерць унесла 2340 жыхароў — 29 %. Многія жыхары пакінулі абжытыя мясціны. У выніку колькасць двароў у графстве зменшылася на 21,4, а разам з вымерлымі — на 40,4 %. Пасля гэтай вайны Шклову не было суджана падняцца да перыяду свайго росквіту (сярэдзіна XVII ст.) ажно да канца XVIII ст.

М. Ільюшэнка. «Ударны фронт». 1988. 23—25 кастрычніка. 1990. 18 жніўня.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

З Ніканаўскага летапісу: «В лето 7047 (1535—1536)... Воеводы же великого государя, Бог дал, выидоша здравы з великою корыстию и со многым пленом воевав грады литовьскые от Мстиславля: Кричев, Радомль, Могылев, Княжичи, Шклов, Копос, Оршу, Дубровну, острогы имали и посады жгли и людей многых побили и живых имали». (Цыт. па пісьму «О первом упоминании г. Шклова». ЦГАДА от 2.08.83 г.)

З Баркулабаўскай хронікі: «Року 1580 господарь кроль Стэфан был под Псковом и взял город Псков. А Москва, то ест Серебреный з немалым войском место славное Могилев выжог. Там же у крои Шклов, Копысу, села велмы выпустошили» (Помнікі старажытнай пісьменнасці. М., 1975. С. 116—117).

У СКЛАДЗЕ РАСІЙСКАЙ ІМПЕРЫІ

Палітычны і сацыяльна-эканамічны крызіс, які ахапіў Рэч Паспалітую напрыканцы XVIII ст., прывёў у рэшце рэшт да падзелу яе паміж Прусіяй, Аўстрыяй і Расіяй. У 1772 г. імянным указам Екацярыны II было аб'яўлена аб далучэнні да Расійскай імперыі ўсходніх зямель Беларусі з гарадамі Магілёў, Віцебск, Полацк. Новая граніца паміж Расіяй і Рэччу Паспалітай стала праходзіць па Заходняй Дзвіне, Друці і Дняпру. (У 1793 г. да Расіі адышлі цэнтральная і ў 1795 г. — заходняя часткі Беларусі. — *Рэд.*) Усходняя частка Беларусі ўвайшла ў склад асобага генерал-губернатарства, падзеленага на дзве губерні — Пскоўскую і Магілёўскую. У 1776 г. Пскоўская губерня была перайменавана ў Полацкую, з якой выключылі Пскоўскую і Вялікалуцкую правінцыі, а ў канцы 1795 г. Полацкая і Магілёўская губерні аб'ядналіся ў адну Беларускую (праіснавала да пачатку 1802 г.).

Беларускія губерні ў 1773 г. Сенат раздзяліў на паветы. «...Уездными же городами, в которых правлению уездных Комиссаров быть, назначаются следующие:

В Могилевской провинции местечки Шклов и Быхов. Мстиславские местечки Череков и Милославичи. Оршанские местечки Сенное и Дубровну. Рогачевские местечки Гомель и Чечерск.

Все сіи для уездных городов назначаемые местечки выбраны в таком рассуждении, чтоб уездные Комиссары весь им вверяемый уезд способно почасту

объезжать и все им повелеваемы исполнять могли, и чтоб при этом и каждый житель по положению оного не далеко правосудія и разрешенія дела своего искать принужден был». (Полн. собр. законов Российской империи с 1689 г. Том XIX, лл. 796—799).

Пераход з-пад улады Рэчы Паспалітай да самадзяржаўнай Расіі не пазбавіў працоўны народ ад феадальна-прыгонніцкага ладу, але ён меў важныя вынікі ў лёсе беларусаў. Для асноўнай масы людзей акт далучэння да Расіі азначаў уз'яднанне з родным па паходжанні, мове, гістарычным мінулым, веравызнанні рускім народам. Станоўчае значэнне мела, асабліва ў першыя гады пасля ўз'яднання, некаторае абмежаванне сваволля шляхты, буйных землеўладальнікаў, зніжэнне падаткаў (чаму садзейнічала ў немалой меры паўстанне 1794 г. Т. Касцюшкі). Грамата Кацярыны II аб стварэнні Беларускай каталіцкай епархіі (1774) дазваляла выконваць каталіцкія абрады, захоўвала маёмасць касцёлаў і манастыроў, тым не менш каталіцкая царква сваё пануючае становішча на ўсходне-беларускіх землях страціла. Народу прадастаўлялася права свабоднага выбару хрысціянскага веравызнання.

Паступова край выходзіў з цяжкага крызісу. Расшыраліся пасевы збожжа, ільну, канаплі і іншых культур. Расла таварнасць памешчыцкага землеўладання. Наладжваўся гандаль з суседзямі. Сталі развівацца вотчынныя мануфактуры, многія рамёслы. Князь Пацёмкін, якому ў 1773 г. Кацярына II падарыла Шклоў, адкрыў тут фабрыку гадзіннікаў. У 1778 г. мястэчка з немалой колькасцю вёсак Шклоўскага графства стала ўласнасцю Сямёна Гаўрылавіча Зорыча — чалавека, які праславіў сябе стварэннем у Шклове тэатра, кадэцкага корпуса, некалькіх прыгонных мануфактур.

НА СЛУЖБЕ Ў РАСІІ

Зорыч (Неранчыч) С. Г. — генерал-маёр, нарадзіўся ў 1745 г. Перасяліўся ў Расію з Сербіі разам са сваім стрыечным дзядзькам Максімам Фёдаравічам Зорычам, які ўсынавіў пляменніка і дазволіў яму карыстацца сваім прозвішчам і прывілеямі. Дзядзька ўладкаваў яго ў Расіі на ваенную службу. Сямён Зорыч добра ездзіў верхам на кані, адменна страляў, валодаў шпагай. Удзельнічаючы ў Сямігадовай вайне з 1760 г. у чыне вахмістра гусарскага палка, Зорыч неаднаразова праяўляў адвагу, атрымаў некалькі ран, пабываў у палоне, быў узведзены ў чын паручніка.

С. Г. Зорыч

У 1764 г. удзельнічаў у ваенных дзеяннях у Полыпчы і 1 студзеня 1767 г. пераведзены ў ротмістры.

Асабліва праявіў сябе Зорыч у Першую турэцкую вайну. Дзякуючы яму рускія ў многіх аперацыях атрымалі поспех. Але 3 ліпеня 1770 г. Зорыч з атрадам быў акружаны, тройчы паранены, захоплены ў палон. Пры размене палонных пасля Кучук-Кайнарджыкскага міру ў 1775 г. вярнуўся ў Расію. За доблесць у руска-турэцкай вайне Зорыч адзначаны ордэнам Георгія IV ступені. Яму было 30 гадоў, прыгожы, спрытны, здаровы, з рэпутацыяй героя.

на полу посуду. Стены ямы выводятся кирпичем вверх в виде свода, аршина на полтора от поверхности земли, и в самом верху оставляется круглое отверстие, через которое вставляют гори на под, и вынимают из него посуду. Внизу с передней стороны оставляется другое отверстие против столба, через которое по обеим сторонам кладутся дрова для выкаливания посуды. Выкаливают посуду постепенно: сначала разводят небольшой огонь, пока посуда согреется, потом дрова подбавляют, и как только хоть одна штука посуды накалится в горне докрасна, то подкладывается дров как можно больше, и усиливается огонь до такой степени, что пламя охватывает всю посуду, и она одновременно вся накаливается докрасна. Раскаленную посуду тотчас вынимают по пять или шесть штук из горна через верхнее отверстие и для укрепления качают в холодной воде. В воду примешивают какой-либо муки или большею частью конопляных мякин. Докаленная докрасна и покачанная в воде с мукой или конопляной мякиной, посуда становится рябая. Мука или мякина, примешанная в воду, не придают прочность посуде, но появляющаяся от них рябизна на посуде служит признаком, что посуда достаточно докалена и прочна. Недокаленная посуда или за медленностью при вынимании остывшая, не принимает рябизны, а остается красною и бывает не прочна. Впрочем, и достаточно накалившаяся в горне посуда не только не принимает рябизны, но даже трескается от воды, если при самом вынимании её из горна захватит её ветер. Хозяин немало имеет урону в посуде, если подует сильный ветер в то самое время, когда нужно вынимать её из горна, потому что палить её дальше нельзя: она накалилась докрасна; а если раскаленную докрасна посуду по причине продолжающегося ветра продолжать палить, то она сольется с другой, как чугун, потеряет свою форму и при разрывании потрескается; а если перестать палить и не вынимать из горна, то посуда остынет, и после не примет на себя рябизны в воде, останется красною непрочною: нерябой красной посуды никто не станет покупать. Конечно, чтобы ветер не охватывал посуду при вынимании из горна, следовало бы обнести горн срубом: но за недостатком строевого леса все горны стоят на открытом поле.

Есть еще другой вид посуды, зависящий от способа выкаливания: накаливши посуду докрасна, не вынимают её из горна, а тотчас печатают оба отверстия горна — верхнее и нижнее, и оставляют горн запечатанным до тех пор, пока посуда в нем совершенно остынет; тогда вынимается из горна посуда темно-синего цвета наподобие чугунной, только она не так прочна, как рябая. Эта посуда называется пейсачною, её покупают преимущественно евреи, особенно перед Пейсахом. Для домашнего употребления евреи не покупают рябой посуды, разве только для продажи. Рябую посуду, качаную в воде с мукою или мякиною, считают трефною.

Приготовленную посуду крестьяне сбывают по соседним деревням на хлеб; а если кому из них нужно сбыть на деньги, то продают в г. Шклове, реже в г. Могилеве. Выручка бывает различна, смотря по времени, зимой продают дешевле, а летом дороже. Вообще штука продается от одной до четырех копеек серебром. Конечно, экономически высчитывается время, труд, стоимость глины и покупные дрова, барыш выходит незавидный.

Один работник за полторы недели может заготовить посуды на горн, а из горна выручается не более двух рублей серебром.

Между тем каждый владелец горна должен платить за глину рубля четыре серебром ежегодно. Еловый сухой лес для выкаливания посуды также приобретается покупкой. Недостаток леса и составляет одну из главнейших причин плохого состояния, в котором находится описанный промысел. Кроме того, что немалая имеется потребность в сухом еловом дровяном лесе, и строевой лес также необходим: все горны устроены на открытом поле и за недостатком леса не обнесены срубом, от того случающийся при вынимании ветер схватывает оную и много портит.

Излишне считаю описывать различные виды приготавливаемой посуды: приготавливаются обыкновенные горшки, в коих варят пищу, миски глубокие и мелкие вроде тарелок, горлачи для собирания молока, глеки. Впрочем, по заказу делают посуду различной величины и всех возможных видов.

С. Котырло

Могилевские губернские ведомости. № 33. 1867. 19 августа.

РУХ ГРУЗАЎ У БАСЕЙНЕ р. ДНЕПР — АД стн. ГУСІНА АРШАНСКАГА ПАВЕТА ДА ВУСЦЯ р. ПРЫПЯЦЬ

З апісання 1892 г., снежня 5.

...На судах по Днепру в рассматриваемом районе перевозятся главным образом следующие предметы: между Оршею и Могилевом — разного сорта муки, сельди, тарань, овес, керосин, кожи, крупы, известь, камень... из южных же губерний по Днепру идут сахар, пшеница и соль.

Как для разгрузки, так и для нагрузки товаров на Днепре, в пределах рассматриваемого района, особых пристаней не устроено, устроены же лишь только амбары для складов товара в следующих пунктах: в г. Орше, м. Шклове, г. Могилеве и м. Жлобине. Для разгрузки и нагрузки товаров в означенных пунктах суда подходят непосредственно к самому берегу...

Рейсы непаровых судов при благоприятных условиях совершаются: от Орши до Шклова — 1 сутки, а обратно — $1^1/_2$ суток; от Шклова до Могилева — 1 сутки, а обратно — 2 суток... Буксирное же сообщение производится скорее.

Белоруссия в эпоху капитализма. Т. 2. Мн., 1990. С. 179—180.

Торговый оборот на ярмарках в Шклове:
Девятницкая, в половине июня, — привезено товаров на 21 974 р., продано на 17 950.
Сборницкая, в половине марта, — привезено на 16 448 р., продано на 10 092.

Там же. С. 153.

ПАДЗЕІ 1863 г. НА ШКЛОЎШЧЫНЕ

У 1863—1864 гг. у Расіі пачаўся нацыянальна-вызваленчы рух, які ахапіў Польшчу, Беларусь, Літву і Правабярэжную Украіну. Важнае значэнне паўстанцы надавалі Магілёўскай губерні, адкуль паўстанцкі рух планавалася перакінуць у Расію.

На дапамогу паўстанцкаму ваеннаму начальніку губерні Л. М. Звяждоўскаму з Пецярбурга і Масквы прыбылі афіцэры А. В. Аленскі і І. М. Будзіловіч, якія фарміравалі паўстанцкія атрады ў Горацкім, Магілёўскім, Аршанскім паветах, куды ўваходзіла і тэрыторыя сучаснага Шклоўскага раёна.

На што разлічвалі паўстанцы? На першы погляд іх спроба была авантурнай. Але пры дэтальным абследаванні сітуацыі ў губерні высвятляецца, што яны мелі магчымасць дасягнуць поспеху. У розных месцах губерні знаходзілася малая колькасць войска, усяго каля 20 рот (амаль 2 тыс. чалавек). Паўстанцы мелі намер захапіць артылерыйскія батарэі, якія размяшчаліся ў Оршы, Шклове, Магілёве, Быхаве, Гомелі, Чэрыкаве, Крычаве і Мсціслаўі (Русский вестник. Т. 54. М., 1864. С. 389). Сілы ж паўстанцаў налічвалі каля 800 чалавек. Да таго ж мясцовыя арганізатары прадставілі Л. М. Звяждоўскаму звесткі пра навербаваных да 15 тыс. чалавек. Гэтых сіл з падмацаваннем шляхты было б дастаткова, каб разбіць раскіданыя царскія сілы паасобку. Разлічвалі яны і на незадавальненне народа вынікамі рэформы 1861 г.

Адносны поспех спадарожнічаў першаму выступленню атрада Людвіга Звяждоўскага. Пры падтрымцы студэнтаў Горы-Горацкага земляробчага інстытута яму ў ноч з 23 на 24 красавіка 1863 г. удалося захапіць г. Горкі. Аднак мясцовыя жыхары не падтрымалі яго, і паўстанцы былі разбіты.

Крыху больш трымаліся атрады, якія дзейнічалі на рубяжы Магілёўскага і Аршанскага паветаў, у тым ліку атрад Антонія Аленскага, які дзейнічаў на правым беразе Дняпра — сучасная Шклоўшчына. 22 красавіка 1863 г. у фальварку Чарнаручча ў памешчыка Макавецкага сабралася 30 чалавек. Месца збору — Чарнаруцкі лес. Адсюль і назва атрада — Чарнаруцкі.

Вось як апісваюць дакументы падзеі таго дня:

«Паны с разных сторон, по одной и по две повозки, направлялись в лес к месту, называемому Макаровым кругом. Не доезжая до него, для безопасности, отправляли людей обратно, а далее шли пешком... На Макаровом кругу полковник Антоний, в золотом

шитом кундуше, вечером принял команду, проверил присутствующих, и на ночь вся компания человек до 100 отправилась в фольварк Черноручье к помещику Маковецкому, где был готов ужин и хозяин встретил их на крыльце с хлебом и солью» (Восстание в Литве и Белоруссии 1863—1864 гг. М., 1965. С. 485).

Атрад пад кіраўніцтвам Антонія пачаў весці агітацыю сярод сялян за падтрымку паўстаўшых. Яго кіраўнік валодаў красамоўствам і ўмеў схіляць да сябе насельніцтва. У кожнай вёсцы Аленскі збіраў сходкі і агітаваў сялян за паўстанне. Так, 23 красавіка на золку ён адправіўся са сваім атрадам у суседнюю ад Чарнаруцкага фальварка вёску Навасёлле і загадаў сялянам сабрацца. Было свята — Юр'еў дзень. Аленскі сказаў: «...От нынешнего дня вы не обязаны служить пригонь, уничтожайте также акциз на водку и соль. На выкуп не давайте ни гроша. Эта земля вся ваша и детей ваших. Рекрут у вас насильно брать не будут, разве только по собственной охоте. Рекруту будет пенсии в сутки 25 грошей, 4 фунта белого хлеба и 1,5 фунта мяса». У вёсцы Палыкавічы Антоній сабраў сялян каля карчмы, выступіў з прамовай, якая нагадвала прамову ў Навасёллі, але дапоўніў не словамі: «Вас уже семь лет обманывают вольностью, французы уже в Минске, коль скоро мы прогоним москалей, будет другая воля, в рекруты брать не будут, а служить будут в своем уезде. Подати платить по три злотых; барщину — только до Юрьева дня» (там же, с. 360).

Шклоўскі ксёндз прачытаў прысягу на вернасць польскаму каралю і французскаму імператару. Потым запрасіў ахвотнікаў ісці ў атрад. Але ніхто з сялян не зварухнуўся. Атрад пайшоў далей, ксёндз — з крыжам наперадзе.

Раніцай 23 красавіка да станавога прыстава ў Шклоў завітаў селянін з ваколіц Чарнаручча з паведамленнем, што ён сустрэў у лесе натоўп узброеных людзей. Яны прасілі паказаць дарогу на Макараў круг і дабавілі, што яны палякі і французы, забралі Пецярбург і Варшаву і ідуць на Магілёў.

Станавы Вейль адправіўся ў Магілёў з паведамленнем, што ў Чарнаруччы сабралася шайка і адправілася па дарозе на Друцк. Вечарам з Магілёва была паслана стралковая рота з 20 казакамі. А ў Віцебск паслана тэлеграма губернатару з просьбай направіць з Сянна роту насустрач шайцы.

24 чысла рота на падводах і казакі выступілі са Шклова, напалі на след атрада паўстанцаў і па іх слядах накіраваліся на Друцк. 27 красавіка атрад быў разгромлены ў Сенненскім павеце. 21 чалавек быў забіты, двое паранена, 19 паўстанцаў узята ў палон. Пазней сяляне вылавілі яшчэ 60 паўстанцаў. Выратаваліся толькі Антоній і ксёндз са Шклова Пржыалкоўскі, якія былі злоўлены ў Мінскай губерні і расстраляны.

Улады Магілёўскай губерні не дазволілі распаўсюдзіцца полымю паўстання, лакалізавалі яго. Следам быў выдадзены загад магілёўскага губернатара: «...Несостоявшие в военной службе жители Могилевской губернии, кроме крестьян православного вероисповедования, обязаны, в день объявления сего, снести всякое имеющееся у них огнестрельное и холодное оружие, а также порох в местные полицейские управления... Ослушники всех этих распоряжений будут судимы, как мятежники, на основании военных полевых законов» (Современная летопись. № 16. 1863. С. 4—5).

Такім чынам, сяляне Шклоўшчыны, як і ўсёй губерні, падманутыя дэмагагічнай агітацыяй улад і праваслаўнага духавенства, дапамагалі лавіць паўстанцаў. Яны ўспрымалі паўстанне як барацьбу за аднаўленне прыгонніцтва. Многія сяляне сцвярджалі, што «мяцежнікі-паны хацелі ісці супраць Аляксандра Мікалаевіча, які даў нам волю» (Русский инвалид. № 23. 1863. С. 7—8).

Паўстанне было падаўлена, але ўрад адмяніў з красавіка 1863 г. у Беларусі і Літве часоваабавязаныя адносіны сялян да памешчыкаў, зменшыўшы на 20% выкупныя плацяжы. Была вернута частка зямлі, аднятая да рэформы, што значна аблегчыла іх становішча.

А. Турбінск

АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭРЫТАРЫЯЛЬНЫ ПАДЗЕЛ НА ПАЧАТАК XX ст. (у сучасных граніцах раёна)

Для адміністрацыйнага кіравання Магілёўская губерня была падзелена на 11 паветаў, 36 станаў і 145 валасцей.

Воласці	Плошча (тыс. дзес.*)	Усіх нас. пунктаў**	Колькасць двароў
Гарадзішчанская	22—21	50	1476
Любініцкая	20—37	43	1700
Нічыпаравіцкая	21—14	47	1590
Старасельская	32—35	118	1814
Таўпечыцкая	14—14	45	1056
Чарнаруцкая	18—22	55	1172
Шклоўская	19—14	68	1826

Статистический обзор Могилевской губернии по 1914 г. Могилев, 1915, февраль. С. 14—21.

* Першая лічба ў плошчах — па даных Губстаткамітэта, другая — па даных лесазах. камітэта.

** Па даных на 1910 г.

ВЯСКОВЫЯ ТАВАРЫСТВЫ. 1912 г.

Магілёўскі павет, воласці: Таўпечыцкая — 14, Чарнаруцкая — 22, Шклоўская — 20.
Горацкі павет, воласці: Гарадзішчанская — 23, Любініцкая — 22, Нічыпаравіцкая — 25.
Аршанскі павет, Старасельская воласць — 27.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1912 г. С. XXV.

Мяшчанскія ўправы: Шклоўская (староста А. М. Вільчынскі), мясцовыя ўпраўленні — Зарэчна-Шклоўскае, Старасельскае.

* * *

СПІС ВАЛАСНЫХ ПРАЎЛЕННЯЎ, СТАРШЫНЬ, ПІСАРАЎ

Магілёўскі павет: Таўпечыцкае — В. А. Манкевіч, Д. Р. Пракоўеў; Чарнаруцкае — І. Ф. Захаранка, Н. А. Шмулянцоў; Шклоўскае — П. В. Новікаў, М. Г. Аляшкевіч.
Горацкі павет: Гарадзішчанскае — К. Д. Дучкоў, А. П. Ульянаўскі; Любініцкае — Ф. А. Ананьеў, А. М. Падабед; Нічыпараўскае — Я. М. Іўлеў, А. Г. Міронаў.
Аршанскі павет: Старасельскае — І. А. Карабіцкі, І. С. Падбярэзскі.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 г. С. 109—110.

ЦАРКОЎНЫЯ ПРЫХОДЫ

Праваслаўныя: Александрыйскі, Бракаўскі, Вазнясенскі, Варанцэвіцкі, Вадвянскі, Васкрасенскі, Гарадзішчанскі, Гарадзецкі, Дудавіцкі, Зарэцкі, Заходскі, Язерскі, Кішчыцкі, Капыскі, Камсеніцкі, Любіжскі, Любініцкі, Лазіцкі, Машанацкі, Мікалаеўскі, Нічыпараўскі, Отмуцкі, Прэабражэнскі, Плешчыцкі, Петрапаўлаўскі, Раства Багародзіцы, Сліжоўскі, Славенскі, Свята-Духаўскі, Старасельскі, Слабадскі, Старашклоўскі, Свяцілаўскі, Тубышскі, Фашчаўскі, Чырчынскі, Чарнаруцкі, Чарнянскі, Шклоўскі.

Рымска-каталіцкія: Шклоўскі, Фашчаўскі, Старасельскі, Вадвянскі, Бракаўскі.
Каталіцкія: Шклоў. Іудзейскія сінагогі і малітоўныя дамы. Лютаранская царква (Магілёў).

Названы па «Списку населенных мест Могилевской губернии». Могилев, 1908. С. 20—59.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

СА СПРАВАЗДАЧЫ МАГІЛЁЎСКАГА ЕПАРХІЯЛЬНАГА ВУЧЫЛІШЧНАГА САВЕТА АБ ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКІХ ШКОЛАХ І ШКОЛАХ ПІСЬМЕННІАСЦІ МАГІЛЁЎСКАЙ ЕПАРХІІ ЗА 1887—1888 гг.

Могилевский уезд.
Первый округ благочиния.

Водвянского прихода — церковноприходская школа в с. Водва; помещается она в устроенном для нее доме, учителем состоит сын псаломщика Григорий Голодновский, обучавшийся в духовном училище; законоучителем состоит священник Иоанн Голодновский; первый получает 50 р., последний — 20 р. за учебное время; учащихся 25 мальчиков.

Общее число прихожан 1763 чел.; учащихся 25; один учащийся на 70 чел.

Высоцкого прихода — церковноприходская школа в с. Высоком; помещается она в устроенном для нее доме, учителем состоит кр. Авакум Воробьев, получает по 7 р. за учебный месяц. Законоучителем состоит священник Николай Шафрановский; учащихся 25 мальчиков и 2 девочки.

Общее число прихожан 1728 чел.; учащихся 27; один учащийся на 64 чел.

Комсеничского прихода — церковноприходская школа в с. Комсеничи; помещается она в устроенном для нее доме, учителем состоит сын священника Тимофей Скребнев, обучавшийся в духовном училище, получает от общества 70 р. за учебное время; законоучителем состоит священник Парфентий Солнцев; учащихся 30 мальчиков.

Того же прихода школа грамотности в д. Клепеничах, помещается она в устроенном для нее доме, учителем состоит унтер-офицер Василий Степанов, получает от общества 30 р. за учебное время; учащихся 16 мальчиков.

Общее число прихожан 2037 чел.; учащихся 46, один учащийся на 44 чел.

Лозицкого прихода — церковноприходская школа в с. Лозицах, помещается она в устроенном для нее доме, учителем состоит кр. Лука Лобковский, получает от общества 70 р. за учебное время, законоучителем состоит Василий Добровольский, учащихся 25 мальчиков.

Того же прихода школы грамотности: в д. Говядах, школа помещается в устроенном для нее доме, учителем состоит кр. Севастьян Леонов, получает от общества 45 р. за учебное время. Учащихся 20 мальчиков и 1 девочка;

в д. Новоселках школа помещается в доме учителя, которым состоит кр. Василий Ануфриев; получает от общества 25 р. за учебное время, учащихся 15 мальчиков.

Число душ в приходе 2026; учащихся 61, один учащийся на 33 чел.

Черноручского прихода — школы грамотности:

в д. Ступлянах школа помещается в наемном доме, учителем состоит кр. Федор Стефанов, получает от прихожан 40 р. в зиму; учащихся 12 мальчиков и 1 девочка;

в д. Тудорово школа помещается в устроенном для нее доме, учителем состоит кр. Никита Фомин, получает от прихода 30 р. за учебное время; учащихся 13 мальчиков.

Число душ в приходе 2162; учащихся 26, один учащийся на 83 чел.

Чернянского прихода — церковноприходская школа в с. Черном, помещается она в наемном доме, учителем состоит сын псаломщика Семен Книжников, получает от общества 25 р. за учебное время; законоучителем состоит священник Александр Цытович; учащихся 20 мальчиков.

Того же прихода школа грамотности в д. Толкочах, помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Сильвестор Снитко, получает от общества 20 р. за учебное время; учащихся 16 девочек.

Общее число прихожан 939 чел.; учащихся 36, один учащийся на 26 чел.

Чирчинского прихода — церковноприходская школа в с. Езерах, помещается она в устроенном для нее доме, учительницею состоит дочь священника Евдокия Билецкая, окончившая курс в Буйничском женском духовном училище, получает от общества 40 р. за учебное время, законоучителем состоит священник Лука Клиндухов; учащихся 29 мальчиков и 1 девочка.

Того же прихода школа грамотности в д. Литовск, помещается она в крестьянском доме, учителем состоит солдат Петр Величко, получает от общества 30 р. за учебное время; учащихся 13 мальчиков.

Общее число душ в приходе 1694; учащихся 43, один учащийся на 34 чел.

Шкловского Преображенского прихода:

Школа грамотности в д. Уланово, помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Алексей Григорьев, получает 20 р. за учебное время; учащихся 15 мальчиков.

Число душ в приходе 1352; учащихся 15, один учащийся на 90 чел.

Шкловского Воскресенского прихода — церковноприходская школа в м. Шклове, помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Гавриил Буланович, обучавшийся в Го-

рецком земледельческом училище, получает 20 р. в зиму от общества; законоучителем состоит священник Петр Пославский; учащихся 23 мальчика и 8 девочек.

Того же прихода школа грамотности в д. Загорье; помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Никифор Войтех, получает от общества 4 р. в месяц; учащихся 10 мальчиков и 3 девочки.

Общее число прихожан 1100 чел.; учащихся 44, один учащийся на 25 чел.

Шкловского Троицкого прихода — церковноприходская школа в м. Шклове, помещается она в наемном доме; законоучителем и учителем состоит псаломщик Григорий Голынец, окончивший курс духовной семинарии, получает 20 р. за учебное время; учащихся 4 мальчика и 6 девочек.

Того же прихода школа грамотности в д. Заходах, помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Степан Алексеев, получает 20 р. за учебное время; учащихся 10 мальчиков.

Общее число населения прихода 1319 чел.; учащихся 20, один учащийся на 65 чел.

Старошкловского прихода — церковноприходская школа в с. Старом Шклове, помещается она в наемном доме, учителем состоит псаломщик Адам Троянов, обучавшийся в духовном училище, получает от общества 30 р. за учебное время; законоучителем состоит священник Петр Ангелейко; учащихся 17 мальчиков и 1 девочка.

Того же прихода — школы грамотности: в д. Овчиненках школа помещается в наемном здании, учителем состоит кр. Афанасий Белиза, получает 20 р. за учебное время; учащихся 13 мальчиков;

в д. Тросне обучаются поочередно в домах родителей, учителем состоит кр. Алексей Старовойтов, получает от общества 26 р. в зиму; учащихся 11 мальчиков.

Общее число прихожан 1374 чел.; учащихся 37, один учащийся на 37 чел.

Могилевские епархиальные ведомости, 1889. С. 6—7.

Второй округ благочиния.

Александрийского прихода — церковноприходская школа в с. Александрия, помещается она в наемном доме, учителем состоит кр. Василий Кастонович, получает от родителей учащихся по 60 коп. в месяц за ученика; законоучителем состоит священник Федор Ливрентович; учащихся 14 мальчиков и 2 девочки.

Старосельского прихода — школа грамотности в д. Барках, школа помещается в наемном доме, учителем состоит кр. Петр Лаврентьев, получает от родителей по 25 коп. в месяц за учащегося; законоучителем состоит священник Петр Высоцкий; учащихся 23 мальчика и 2 девочки.

В д. Смальянцах школа помещается в доме помещицы Менщинской бесплатно, учителем состоит кр. Иван Крупенин, получает от помещицы Менщинской 10 р. в учебный месяц; законоучителем состоит священник Петр Высоцкий; учащихся 23 мальчика и 9 девочек.

Населения прихода 2593 души; учащихся 57, один учащийся на 45 чел.

Могилевские епархиальные ведомости, 1889. С. 30.

* * *

Сяленні, дзе меліся вучэбныя ўстановы, падведамасныя Магілёўскай дырэкцыі народных вучылішч:

Гарадзішча, Любінічы, Нічыпаравічы, Фашчаўка, Шклоў (2), Княжыцы, Таўпечыцы, Чарнаручча, Стараселле.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1901 г. С. 240—242.

ЦАРКОЎНАПРЫХОДСКІЯ ШКОЛЫ

1907 г.: Старашклоўская, Тудараўская, Чарнянская, Шклоўска-Вазнясенская, Барсукоўская, Вадвянская, Княжыцкая, Лазіцкая, Царковіцкая — Магілёўскі павет; Бабініцкая, Заходская, Любіжская, Плешчыцкая, Зарэчна-Шклоўская, Сліжоўская — Горацкі павет; Ордаўская — Аршанскі павет.

Памятная книжка Могилевской губернии на 1907 г. С. 83—86.

ЗАГІНУЛІ Ў РУСКА-ЯПОНСКУЮ ВАЙНУ 1904—1905 гг*.

Гарадзішчанская воласць

Алексяёнак Фама, Гнедзікаў Іван, Данькоў Мікіта, Дубровіч Гаўрыла, Кавалёў Рыгор, Лычаў Дзямід, Мінін Пётр, Новікаў Рыгор, Няхаеў Сямён, Парцянкін Апанас, Пачкаеў Мікіта, Плоцін Фама, Сенакосаў Аляксандр, Снарок Якаў, Феакцістаў Аляксей, Цёплы Герасім, Цішкоў Рыгор, Чушаеў Іван.

Любініцкая воласць

Азарэвіч Кузьма, Алейнікаў Сцяпан, Андрэеў Лук'ян, Беларускі Цімафей, Беларускі Міхаіл, Бялянка Якаў, Дандзюкоў Юрый, Дзянісенка Феафан, Жмудзікаў, Казакоў Сямён, Казянецкі Мімха, Каідаў Мікалай, Крупацін Рыгор, Кузьмін Сямён, Ларыёнаў Фёдар, Лашкевіч Сямён, Лунікаў Емяльян, Мінкін Піліп, Міхатулін Емяльян, Парфянкоў Антон, Саўкін Рыгор, Сафронаў Апанас, Сідараў Антон, Сідараў Кандрат, Спірыдонаў Васіль, Старасценка Ульян, Цымбалаў Тарас, Цімошчанка Ерафей, Цэлікаў Фёдар, Шалкоў Пётр, Шкураў Стэфан, Шыдлоўскі Захар, Якімаў Цімафей, Яфрэмаў Сямён.

Нічыпараўская воласць

Анішчанка Яфім, Бабіў Зіновій, Буданаў Пётр, Бічкароў Кандрат, Гарбузоў Маісей, Гарнікаў Апанас, Васіленка Іван, Данілаў Дзямід, Жыгуноў Мікалай, Зубрыновіч Антон, Захарыкаў Рыгор, Казлоў Іван, Кавалёў Андрэй, Курпаткін Пётр, Магдэнак Гаўрыла, Маркаў Максім, Навумёнак Арцём, Новікаў Уладзімір, Нікіфараў Савелій, Палякоў Міхаіл, Пронцішаў Лука, Рэянтовіч Пётр, Сляпцоў Аўрам, Сойкін Лук'ян, Хацінцаў Ягор, Цыкуноў Максім, Цыкуноў Дзмітрый, Цішкоўскі Павел, Цемрукоў Дзяніс, Шкатухоў Гаўрыла, Юрчакоў Аляксей, Ярмоленка Ягор.

Старасельская воласць

Грыгор'еў Дзмітрый, Каліноўскі Іван, Прусаў Андрэй.

Таўпечыцкая воласць

Андрэйчыкаў Пётр, Жогаў Палікарп, Забурскі Міхаіл, Рабцаў Пімен, Скарабагаты Дзмітрый.

Чарнаруцкая воласць

Бараболь Фёдар, Беглякоў Карп, Бондараў Фядос, Бондараў Павел, Гаршэчнікаў Даніла, Васількоў Аляксей, Дземчанка Антон, Жыгуноў Павел, Зубчанкоў Якаў, Іваноў Восіп, Іўчанка Васіль, Кавалёў Пракоп, Казлоў Апанас, Канавалаў Захар, Мікалаеў Іван, Новікаў Емяльян, Патапаў Якаў, Сазонаў Восіп, Салодкі Фёдар, Салодкі Арцём, Свірыдаў Пётр, Сідаронак Навум, Сотнікаў Якаў, Сямёнаў Ізот, Цярэшчанка Сазон, Шабайда Ануфрый, Шабулда Георгій, Шарай Іван, Шынкароў Сямён, Шунькоў Антон.

Шклоўская воласць

Арэлікаў Арцём, Булда Рыгор, Васільеў Якаў, Дзям'янаў Іван, Іваноў Максім, Казяніцкі Сімга, Крукоўскі Цімафей, Курчык Шмуель, Маісееў Сцяпан, Маіхізёнак Рыгор, Міхайлаў Якаў, Мікалуцкі Станіслаў, Мурашкін Яўсей, Паўлаў Усцін, Паўчанка Іван, Сітнікаў Восіп, Фінкельштэйн Ефранім, Чахоўскі Іван, Шэфтэнь Лейзер, Шкуранкоў Сідар, Шмерлін Гірша.

* * *

Вінаградаў Ціхан, Дзянісаў Пракоп, Дуброўскі Пётр, Ксяндзоў Цімафей, Міронаў Якаў, Ніколін Васіль, Раманькоў Архіп.

Падрыхтавала *В. Паўлава*

* Спіс няпоўны. У Дзяржаўнай бібліятэцы імя Салтыкова-Шчадрына знойдзены імёны ваеннаслужачых 161-га пяхотнага Александрыйскага, 34-га Усходнесібірскага, 7-га стралковага палкоў, якія загінулі ў баях пад Мукдэнам, каля населеных пунктаў Цаохентунь, Тафашынь і радзе іншых у канцы 1904 — лютым 1905 гг. Лёс другіх землякоў, у тым ліку рэзервістаў, невядомы.

Напярэдадні першай рэвалюцыі ў Расіі

Напярэдадні рэвалюцыі 1905—1907 гг. начальнік Магілёўскага жандарскага ўпраўлення даносіў у дэпартамент паліцыі, што ў выніку шырокага пранікнення сацыял-дэмакратычных ідэй у бліжэйшыя да Копысі і Шклова вёскі ўжо летам 1903 г. узмацніўся сялянскі рух, які праяўляўся ў спробах захопу зямель памешчыкаў. Сяляне вёсак Зубава, Леўкава, Мікіцінічы, Ржаўцы і іншых на чале са шклоўскімі і капыскімі рабочымі, гаворыцца ў данясенні, сталі «збірацца ў вольны час на сходкі ў лясах і абмяркоўваць пытанні аб паляпшэнні свайго быту за кошт сярэдніх землеўладальнікаў, будучы перакананымі, што зямля не павінна належаць памешчыку, які яе асабіста сам

не апрацоўвае, а павінна быць падзелена паміж сялянамі, якія апрацоўваюць яе сваёй асабістай працай».

У кастрычніку таго ж года газета «Искра» (№ 50) паведамляла, што карэспандэнт з Копысі і Шклова піша: «Старыя жалобныя песні змяніліся бадзёрымі, рэвалюцыйнымі гімнамі. Расце і мацнее рэвалюцыйная свядомасць і настрой мас». Некалькі соцень копыскіх і шклоўскіх рабочых забаставалі ў сувязі з маючым адбыцца судом над іх таварышамі і наладзілі ў Шклове палітычную дэманстрацыю, якая прайшла пад лозунгам «Далоў царскія законы, суды, далоў царскае самадзяржаўе!» Пасля дэманстрацыі за горадам адбыўся масавы сход, дзе абмяркоўваліся задачы рабочага класа. Паліцыя рабіла спробу адразу арыштаваць удзельнікаў сходу, але беспаспяхова.

Больш шырокі размах барацьба з царызмам працоўных Шклоўшчыны набыла ў 1905—1907 гг. У адказ на расстрэл піцерскіх рабочых у студзені 1905 г. сацыял-дэмакраты Шклова арганізавалі масавую палітычную дэманстрацыю. Услед за гэтым былі падпалены дзяржаўныя ўстановы, памешчыцкія маёнткі. У ноч на 20 красавіка 1905 г. у Шклове была спалена гандлёвая база, а 28 красавіка — фабрычная канюшня.

А вось што тэлеграфавалі памешчыкі Горацкага павета міністру ўнутраных спраў 8 чэрвеня 1905 г.: «Рэвалюцыйны рух, які даўно існуе ў Копысі, Шклове, Смятанцы ў якасці забастовак, населяў і нават забойстваў, з вясны распаўсюджваецца на сельскія мясцовасці сумежных паветаў Магілёўскай губерні, на якіх бадзяюцца агітатары, раскідваючы пракламацыі і сеючы смуту. Вынікам з'яўляецца: самаўпраўная пасьба на ўладальніцкіх землях, пагрозы лясной ахове, заявы ўладальнікам, што сяляне будуць з гэтага часу карыстацца землямі, не пытаючыся іх згоды... Мясцовыя ўлады бяссільны падтрымаць парадак». У заключэнні памешчыкі прасілі міністра прыняць меры для аднаўлення законнасці.

У тым жа годзе 6 жніўня на вуліцы Шклова быў забіты паліцэйскі ўраднік. Пасля масавых выступленняў шклоўскіх рабочых, рамеснікаў і сялян 16, 23 і 31 жніўня 1905 г. магілёўскі губернатар выклікаў з Вільні казакаў і ўчыніў у Шклове і Смятанцы збіванне розгамі рабочых і сялян. 13 кастрычніка начальнік жандармерыі Палякоў данёс у дэпартамент паліцыі, што ў Шклове забаставалі рабочыя фабрыкі Крывашэіна, дробных майстэрняў і іншых прадпрыемстваў, у тым ліку гандлёвых.

Пра тое, што гэта забастоўка была ў Шклове 13 кастрычніка, пацвярджае рапарт загадчыка шклоўскага двухкласнага яўрэйскага пачатковага вучылішча інспектару вучылішч Магілёўскай губерні: «Сёння, 13 кастрычніка 1905 года ў пачатку заняткаў у памяшканне вучылішча ўварваўся натоўп рабочых і патрабаваў роспуску вучняў з выпадку таго, што ў Шклове аб'яўлена ўсеагульная забастоўка. ...На мае довады, што для саміх дзяцей не зусім бяспечна ў цяперашні час без усялякага нагляду бегаць па вуліцах і быць сведкам многіх непрыстойных вулічных сцэн і г. д., яны мне адказалі, што не жадаюць, каб дзеці займаліся ў школе, калі дарослыя бастуюць, і што з іх боку будуць прыняты меры, каб дзеці не бегалі па вуліцах...»

У дзень аб'яўлення царскага маніфеста «17 кастрычніка» ў Оршы адбылася дэманстрацыя працоўных, у якой прынялі ўдзел і шклоўскія сацыял-дэмакраты. У адказ на гэта царскія карнікі арганізавалі крывавы яўрэйскі пагром, у якім загінулі 22 члены самаабароны шклоўскай і дубровенскай рэвалюцыйных арганізацый.

Як сведчаць гэтыя факты, пралетарыят Шклова прымаў актыўны ўдзел у рэвалюцыйных падзеях 1905—1907 гг.

М. Ільюшэнка

''Ударны фронт''. 1985. 24 студзеня.

З ЖУРНАЛА ПАЛІЦЫІ АРШАНСКАГА ПАВЕТА

Февраль 1905 г. Имен. Александрия, Староселькой вол. Исправник доносил: «Совместно с земским начальником и чинами полиции выезжал для принятия мер к подавлению насильственных действий со стороны крестьян м. Александрия по отношению к помещику имен. Алек-я Герасимову».

НАРБ, ф. 2001, воп. 1, спр. 1999, л. 7.

АБ РАБОЧЫМ І СЯЛЯНСКІМ РУХУ Ў г. КОПЫСІ І ЯГО ВАКОЛІЦАХ

З данясення начальніка Магілёўскага губернскага жандарскага ўпраўлення ў дэпартаменце паліцыі

1903 г. верасня 16.
Сакрэтна.

Вследствие предложения Департамента полиции от 9 сентября с. г. за № 8271 имею честь уведомить, что по наблюдениям последнего времени с половины июля с. г. стало заметным распространение вредных идей социал-демократического характера, коими заражены все рабочие, как евреи, так и русские, на фабриках, заводах и в мастерских заштатного г. Копыси, с. Сметанки и м. Шклова, а также крестьянское население прилегающих к означенным пунктам деревень, по преимуществу Любинической волости Горецкого уезда. По заявлению местных землевладельцев Чачкова, Курча, генерала Рейна и др., такая перемена в настроении крестьянских умов особенно сказалась в конце истекшего лета и выразилась более рельефно в убийстве полицейского урядника Якушевича в ночь с 8 на 9 сентября с. г. в с. Сметанке через окно из ружья. В таковом преступлении подозреваются и, кажется, достаточно уличены двое крестьян-рабочих того же селения: Иван Сергеев-Шершнёв, Самуил Семёнов-Садовский с завода Песельника.

Одновременно с упомянутым убийством было покушение на жизнь сидевшего с покойным Якушевичем за одним столом управляющего крахмальным заводом г-на Чачкова Николая Калиновского, но последний, несмотря на выстрел, направленный в него через другое окно того же помещения, по счастливой случайности остался невредим.

Ввиду вышеупомянутого убийства, а равно и выдающихся сходок рабочих, совершавшихся в г. Копыси и его окрестностях 13, 16, 31 августа с. г. с участием крестьян, г-н губернатор решил перейти к более внушительным мерам, способным показать фактически населению местечек и более или менее отдалённых деревень Любинической волости и др., что правительство, когда нужно, всегда располагает надлежащими средствами воздействия для восстановления и поддержания порядка. А потому и губернатор вызвал по телефону из г. Вильно сотню казаков, которая и прибыла по железной дороге 13 сего сентября через Оршу и была распределена по полусотне в м. Шклове и заштатном г. Копыси со Сметанкой.

Такая неожиданная мера, видимо, произвела на население, как еврейское, так и русское, довольно сильное впечатление, усугублённое ещё тем, что по распоряжению г-на губернатора 15 сего сентября в с. Сметанке, отстоящей в 8 верстах от Копыси, были подвергнуты, при большом стечении крестьян из разных селений и евреев, телесному наказанию розгами лица, особо обратившие на себя внимание своей тайно-преступной деятельностью среди рабочих и крестьян...

...В ночь с 14 на 15 сего сентября были произведены 15 обысков в г. Копыси и селениях Александрии и Сметанке у еврейских и русских рабочих кафельных фабрик, причём у рабочего Ефима Петрашина были обнаружены нелегальные песни.

Полковник *Поляков*

Документы и материалы по истории Белоруссии. 1900—1917. Т. 3. Мн., 1953. С. 370—371.

ТЭЛЕГРАМА НАЧАЛЬНІКА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБЕРНСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ Ў ДЭПАРТАМЕНТ ПАЛІЦЫІ АБ ЗАБАСТОЎЦЫ Ў г. ШКЛОВЕ 1905 г. КАСТРЫЧНІКА 13

В г. Шклове забастовали рабочие завода Кривошеина и мелких мастерских, остановлена деятельность почтовой конторы, учебные заведения, питейные лавки закрыты, направлена туда рота из Орши.

Полковник *Поляков*

НАЧАЛЬНІК МАГІЛЁЎСКАГА ЖАНДАРСКАГА ЎПРАЎЛЕННЯ

9 ліпеня 1903 г.

В ночь на 4-е число сего июля в м. Шклов были разбросаны гектографированные прокламации противоправительственного содержания, изданные Могилевским социал-демократическим комитетом под двумя заглавиями: 1) «Ко всем» и 2) «К Шкловским рабочим». Такие прокламации подобраны на улицах, во дворах м. Шклов... Всего 145 экземпляров.

Виновных в распространении сих прокламаций пока не удалось обнаружить, почему негласное расследование продолжается.

В прокламации под заглавием «Ко всем» между прочим приводится случай избиения рабочего в м. Шклов полицейскими чинами, задержанного 29 июня.

К сожалению случай этот подтвержается.

Полковник *Поляков*

ДАРФ 68 349 $\frac{III\ 96}{7д\text{-}15VII}$ лист 6.

Шклоўская арганізацыя РСДРП, узнікла ў 1903 г., з утварэннем Палескага камітэта РСДРП (студзень 1904 г.) увайшла ў яго склад. Удзельнічала ў I з'ездзе арганізацый РСДРП Палескага раёна (май 1905, Гомель), на якім зацверджана паўнамоцнай арганізацыяй.

21.08.1904 г. пад кіраўніцтвам мясцовых сацыял-дэмакратаў у горадзе адбылася антыўрадавая дэманстрацыя рабочых, якія пратэставалі супраць суда над 60 рабочымі — удзельнікамі першамайскай дэманстрацыі. У знак пратэсту супраць расстрэлу 12.02.1904 г. у Беластоку мітынгу рабочых сацыял-дэмакраты Шклова арганізавалі палітычную стачку, праводзілі антываенныя дэманстрацыі і мітынгі. Пад уплывам рэвалюцыйнай прапаганды членаў Шклоўскай арганізацыі РСДРП сяляне навакольных вв. Зубава, Ляўкова, Мікіцінічы, Валосавічы наладжвалі сходкі, дзе абмяркоўвалі сваё становішча, неабходнасць палітычных свабод у краіне. Найбольш актыўную дзейнасць Шклоўская арганізацыя праводзіла ў перыяд рэвалюцыі 1905—1907 гг. у адказ на адозву Палескага камітэта РСДРП «таварышы рабочыя» ў сувязі з падзеямі 9.01.1905 г. у Пецярбургу ў горадзе адбыліся стачкі, палітычныя дэманстрацыі і ўзброеныя сутычкі з паліцыяй; напярэдадні 1 Мая 1905 г. у стачцы-масоўцы ўдзельнічала каля 500 чалавек. У час Усерасійскай палітычнай стачкі баставалі рабочыя завода Крывашэіна, майстэрняў, служачыя паштовых кантор і навучэнцы. Каб задушыць забастоўку, царскія ўлады накіравалі ў Шклоў салдат.

Для ўзмацнення работы ў вёсцы ў 1906 г. пры Шклоўскай арганізацыі РСДРП створана сялянская група. У першыя гады рэакцыі (1907—1908) дзейнасць Шклоўскай арганізацыі амаль спынілася. З канца 1908 г. актывізавалася; у 1909 г. перамогай закончылася 4-месячная стачка шчаціншчыкаў, якія на нейкі час адстаялі 8-гадзінны рабочы дзень. У ноч на 20.04.1913 г. паліцыя арыштавала 4 членаў Шклоўскай арганізацыі РСДРП — рабочых цэлюлознай фабрыкі; пры вобыску знойдзены лістоўкі, спісы членаў арганізацыі, пратаколы сходаў і іншыя партыйныя дакументы. Да 1914 г. Шклоўская арганізацыя РСДРП умацавалася, пад яе кіраўніцтвам адбылася забастоўка краўцоў горада (1914 г.). Перастала існаваць у першую сусветную вайну.

БелСЭ. Мн., 1974. Т. 11. С. 330.

У ГАДЫ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ

Из просмотренных газетных публикаций ериода первой мировой войны сведений о обытиях в Шкловской и других волостях ынешнего Шкловского района обнаружить далось крайне мало. Лишь кое-что попадало рубрику «Местная жизнь» газеты «Могиевский вестник». Например, такая картинка з жизни провинциального Шклова: «В центе м. Шклов болото не просыхает, по улицам и базару пройти нельзя, к лавкам доступа нет, грязью заливается поперек вся улица. Зловоние, грязь жить не дают. ...Летом из-за пыли окон открыть нельзя, на улице и площади глаза песком засыпает. Домовладельцы на устройство мостовой не идут, отвечая: «Наши деды и прадеды жили без мостовой...» Домовладельцы и лавочники отказались платить нанятым было четырем ночным

сторожам по 20—30 копеек в месяц, и сторожа ушли, бросив все. Сильно бедствуют солдатские семьи, у некоторых из них по 4—6 детей... Во дворах грязь, мусор, нечистоты, отбросы, всякая нечисть и падаль. Убрать бы все это к теплу!» — восклицает в заключение корреспондент заметки, скрывший свою фамилию под псевдонимом Лишний («МВ». № 55, 8 марта 1915 г.).

Общественность, обыватели с наступлением теплых дней все больше стали возлагать надежды на старосту Шкловской мещанской управы А. М. Вильчинского (11 лет в должности), членов управы С. М. Идельсона и С. М. Шарая (14 лет избирается в управу) и кандидата в члены А. Начевкина (№ 53. 6 марта 1915 г.). Обстановка заставила управу образовать санитарную комиссию во главе с земским начальником М. А. Игнациусом (председатель), членами которой стали: земский врач Н. Я. Мышковская, земский гласный Макаревич и священник — отец Г. Корейша. Местечко было разбито на 8 участков, в каждом из которых действовали санитарными попечителями и некоторые обыватели м. Шклов. Наименования участков позволяют судить о некоторых очагах местечка: фабрично-пристанский (попечитель И. В. Конопацкий), Бульварный (доктор Лейкин и Ф. Городецкий), Могилевский (нотариус И. Е. Гончаров и Д. Р. Прокофьев), Школьный (тот же Д. Р. Прокофьев), Карпиловский (доктор Нискевич и фельдшер Вишневский), Базарный (зав. училищем С. Н. Петрашкевич), Костёльный (земский страховой агент В. И. Готальский). На собраниях попечителей решались вопросы: о приведении в порядок колодцев; об очистке площадей и дворов; о свалке нечистот; об осмотре бань, торгово-промышленных и фабричных заведений, ночлежных домов, чайных и столовой, бойни и лавок и т. д., о добровольном пожарном обществе (№ 78. 8 апреля 1915 г.).

Прослеживаются и факты классового социального расслоения людей в Шкловской волости, подчас с трагическим исходом. Так, у д. Путники, расположенной в 7 верстах от Шклова, в апреле 1915 г. сторожем частнособственнической рощи Августово был убит выстрелом из револьвера крестьянин Андрей Бораднов только за то, что последний срубил несколько тонких лозин (№ 94. 28 апреля, 1915 г.).

Война вносила в жизнь Шковщины много необычного. В помещичьих имениях, на фабриках и в некоторых мастерских появились в качестве рабочей силы пленные немцы и австрийцы. А их пленено на фронте к тому времени было уже немало. Только через Минск с начала войны по 1 февраля 1915 г. прошло военнопленных германцев — 1880 офицеров и 102 103 солдата (№ 27. 4 февраля 1915 г.).

Одновременно Заднепровье, в том числе и Шковщину, стали заполнять потоки беженцев, хлынувших с западных фронтовых и прифронтовых районов. Белорусские крестьяне встречали беженцев из Гроднещины, Минщины и Ковенщины хлебом, молоком, овощными продуктами, давали им приют и кров, при этом стыдились, что немногим могут помочь (№ 181. 19 августа 1915 г.). Душа белорусского крестьянина болела и наполнялась состраданием к бедствующим беженцам, и об этом с участием писали газеты.

Первоначально путь беженцев проходил через пункты: Белыничи — Нежково — Княжицы — Полыковичи и далее на Красное (Смоленщина). Поток их был настолько интенсивным и многотысячным, что властям и саперным частям пришлось соорудить через Днепр дополнительные временные мосты (№ 206. 17 сентября 1915 г.). К концу сентября, в связи с окончательным оборудованием питательных пунктов, устройством бараков и организацией санитарного обслуживания беженцев, обеспечения фуражем лошадей и скота, их потоки были направлены измененным путем: Белыничи — Головчин — Говяды — Шклов — Локути и далее на восток (№ 207. 22 сентября 1915 г.).

К началу сентября 1915 г. поток беженцев стал еще напряженнее, за день проходило несколько десятков тысяч человек, в связи с чем были оборудованы новые пункты. Обозначились три тракта потока беженцев. Северный маршрут шел через Бобруйск — Толочин — Оршу — Холбня, средний — через Белыничи — Шклов — Горки — Романово, южный — через Дворец — Рогачев — Кричев — Рославль. И, наконец, беженцами была загружена железная дорога Калинковичи — Речица — Гомель — Новозыбков. И так продолжалось до второй половины октября, когда поток беженцев стал несколько спадать (№ 239. 1 ноября 1915 г.).

В Шклове для детей беженцев был организован приемно-распределительный приют на 20 человек. Здесь обессиленных от голода и изнурительных передвижений с запада на восток детей лечили, кормили и потом уже окрепшими отправляли в Могилев. Некото-

рые дети-сироты оседали в Шклове и волостных деревнях, принятые в семьи сердобольных жителей Шкловщины (№ 237. 30 октября 1915 г.). Оседали и целыми семьями.

Одновременно с беженцами через Шкловщину проходили на восток и многотысячные стада скота. Поток их был настолько велик, что журналисты и власти окрестили его «Коровьим нашествием». От недостатка кормов, фуража и сена коровы сотнями погибали, и, как отмечалось в газетах, «между Шкловом и Копысью по берегам Днепра и в самой реке валялись и плавали множество трупов коров». Наступила угроза эпидемий, приглушенная лишь заморозками и приближающейся морозной зимой (№ 219. 8 октября 1915 г.).

Подсчитано, что с 29 сентября по 20 октября через Шкловский питательный пункт проследовало свыше 300 тысяч беженцев и более 50 тысяч лошадей с телегами и повозками со скарбом убегающих от фронта и наступающих германцев (№ 255. 21 ноября 1915 г.).

Для лечения больных беженцев в Шклове была открыта больница, в которой работали один лечащий врач и два фельдшера. В больницу обращались за помощью и некоторые жители Шклова и близлежащих деревень (№ 255. 21 ноября 1915 г.).

Многие беженцы, обремененные трудностями в поисках фуража для своих лошадей, вынуждены были их продавать местным крестьянам. Чтобы ликвидировать злоупотребления в этом деле, в Шклове была создана комиссия по скупке лошадей, повозок, упряжи от беженцев. Одновременно из приднепровских деревень в Шклов по реке направлялось закупленное сено, а оттуда — во все питательные пункты Шкловщины, и не только ее. В Петрограде побывали агенты по сбору теплых вещей, и оттуда в Шклов прибыло шесть вагонов. Вскоре детский приют для беженцев в Шклове был расширен для проживания в нем 40 детей (№ 256. 24 ноября 1915 г.).

Небезынтересно узнать, что на питательных пунктах в Шклове, Городище, д. Говяды Княжицкой волости и других беженцы ежедневно получали по 2 фунта (800 граммов) хлеба, суп с мясом или щи, гречневую кашу с салом, чай. Имелись утепленные ночлежные бараки, а также для содержания на случай эпидемий сыпного тифа и холеры, дизентерии и брюшного тифа (№ 255. 21 ноября 1915 г.).

Шкловское волостное правление до 1915 г. не было связано телефоном с Могилевом, в губернии тогда имелось всего 17 телефонов земской телефонной сети. Слабой материальной базой обладали и почтовые станции. Так, в Черноручской земской конно-почтовой станции имелось всего три лошади, дополненные еще одной лошадью к февралю 1915 г. (№ 29. 6 февраля 1915 г.). Но в связи с многотысячным потоком беженцев и необходимостью в минимальные сроки решать неотложные вопросы, к началу июля 1915 года была открыта телефонная линия Шклов — Могилев через Черноручье (№ 155. 15 июля 1915 г.).

В годы первой мировой войны население Шкловщины сильно разочаровалось в политике правительства Николая II, прозванного в народе Николаем Кровавым. Горечь от утраты родных и близких, убитых на фронтах проклятой народом империалистической бойни, рост осиротевших солдатских семей, опустошение края волнами нахлынувших беженцев, появление эпидемических болезней, упадок промышленного и сельскохозяйственного производства и другие неурядицы обострили к концу 1916 — началу 1917 г. социальное положение на Шкловщине, социальный взрыв приближался...

І. Краўцоў

РОДАМ СА ШКЛОЎШЧЫНЫ

АКСЕЛЬРОД Павел Барысавіч (1850, Шклоў Магілёўскай губерні, — 17.04.1928), сацыял-дэмакрат, адзін з лідэраў меншавізму, публіцыст. З бедных мяшчан. Закончыў Шклоўскую рускую пачатковую школу, Магілёўскую гімназію (1869), вучыўся ў Кіеўскім універсітэце (1872—1874). У 70-х гг. народнік, пасля расколу «Зямлі і волі» прымкнуў да групы «Чорны перадзел». У пачатку 80-х гг. арыштаваны ў Ясах і высланы з Румыніі, эмігрыраваў у Швейцарыю. З 1883 г. прымаў удзел у стварэнні групы «Вызваленне працы», саратнік і сябра Г. В. Пляханава. «Основание русской социал-демократии — главная заслуга группы «Освобождение труда», Плеханова, Аксельрода и их друзей», — адзначаў У. І. Ленін (Поўн. зб. тв. Т. 4. С. 245). Дэлегат

П. Б. Аксельрод

Парыжскага (1889), Цюрыхскага (1893), Лонданскага (1896) кангрэсаў II Інтэрнацыянала, сустракаўся з Ф. Энгельсам (ліпень 1889 г.). У 1896—1899 гг. адзін з рэдактараў зборніка «Работнік». З 1900 г. — член редакцыі «Іскры» і «Зары». З 1895 г. — саратнік, а з 1903 г. — апанент Леніна. Дэлегат II, V з'ездаў, V (агульнарасійскай) канферэнцыі РСДРП. Член Савета партыі (1903—1905). У 1905 г. выказаў ідэю склікання шырокага «рабочега съезда», які ён супрацьпаставіў партыі пралетарыяту. У гады рэакцыі адзін з кіраўнікоў ліквідатараў, уваходзіў у рэдакцыю меншавіцкай газеты «Голас сацыял-дэмакрата», супрацоўнічаў у нелегальнай газеце «Неўскі голас», у часопісе «Наша зара» і іншых меншавіцкіх выданнях. У 1912 г. удзельнічаў у антыпартыйным «жнівеньскім блоку». У час першай сусветнай вайны займаў цэнтрысцкую пазіцыю. Дэлегат Цымервальдскай (1915) і Кінтальскай (1916) сацыялістычных канферэнцый, дзе прымкнуў да правага крыла. Пасля лютаўскай рэвалюцыі член выканкома Петраградскага савета, падтрымліваў Часовы ўрад. Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў варожа, эмігрыраваў у Германію, прапагандаваў узброеную інтэрвенцыю супраць Савецкай Расіі. Выдаў кнігу ўспамінаў «Пережытае і перадуманае» (т. І. Берлін, 1923). Памёр і пахаваны ў Берліне (История КПСС: В 6 т. Т. 1. М., 1964. С. 125, 129, 146, 158, 221, 332).

Э. Карніловіч

ВАЛЫНСКІ Віктар Якаўлевіч (1.10. 1882, Шклоў Магілёўскай губерні, — 9.04.1934), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Расіі, журналіст, дыпламат. Член РСДРП, меншавік з 1903 г. (член КПСС з 1919 г.). З сям'і служачага. Закончыў Адэскае рэальнае вучылішча (1902). Рэвалюцыйную дзейнасць пачаў у 1902 г. у Адэсе агітатарам, 26 сакавіка 1903 г. арыштаваны і высланы на 4 гады ў Якуцкую вобласць. У лютым — сакавіку 1904 г. — удзельнік Якуцкага ўзброенага пратэсту палітссыльных, прыгаворан да 12 гадоў катаргі. У студзені 1905 г. збег з Аляксандраўскага цэнтрала, эмігрыраваў у Швейцарыю, працаваў у жэнеўскай друкарні «Іскра». З ліпеня 1905 г. — член Крымскага камітэта РСДРП, кіраўнік усеагульнай забастоўкі ў Мелітопалі, удзельнік Севастопальскага узброенага паўстання, збег у Амерыку. У 1907 г. вярнуўся ў Расію, рэвалюцыйную работу вёў у Адэсе, Пецярбургу, Беластоку і яшчэ тройчы арыштоўваўся. У 1911 г. эмігрыраваў, жыў у Англіі, Аргенціне, Аўстраліі, Афрыцы. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. вярнуўся ў Адэсу, удзельнічаў у барацьбе за савецкую ўладу ў горадзе. З 1920 г. — намеснік старшыні Адэскага губсаўнаргаса, загадчык агітпрапа Адэскага губкома РКП(б), рэдактар губернскай газеты «Камуніст». З канца 1920 г. — на дыпламатычнай рабоце: першы сакратар савецкага паўпрэдства ў Латвіі, Эстоніі, Мексіцы. З 1926 г. — у рэдакцыі газеты «Гудок», загадчык аддзела друку Далькрайкома ВКП(б), арганізоўваў энцыклапедыю Далёкаўсходняга краю (адкладзена). З 1932 г. — памочнік галоўнага рэдактара БСЭ, загадчык бюро друку паўпрэдства СССР у Кітаі. Член Цэнтральнага савета Усесаюзнага таварыства паліткатаржан. Памёр у Шанхаі. (Политическая каторга и ссылка: Биограф. справочник. М., 1934. С. 124; Корнилович Э. А. На гребне истории. Мн., 1989. С. 17, 18.)

Э. Карніловіч

ГОЛМАН Іван Дзмітрыевіч (1873, Шклоў Магілёўскай губерні, — 1.09.1934), дзеяч рэвалюцыйнага руху ў Расіі, партыйны работнік. Член РСДРП з 1898 г. З сям'і лесагандляроў. Закончыў рамесніцкае вучылішча, ліцейшчык. З 1898 г. вёў рэвалюцыйную работу ў Екацярынаславе, Баку, Таганрозе як агітатар і прапагандыст. Удзельнік першай расійскай рэвалюцыі ў Наварасійску, у 1905 г. — арганізатар першамайскай дэманстрацыі, член Наварасійскага Савета рабочых дэпутатаў, сакратар Чарнаморскага камітэта РСДРП. Чатыры разы арыштоўваўся царскімі ўладамі, прыгаворваўся да смяротнага пакарання, сядзеў у Екацярынадарскай турме, ва Уладзімірскім

цэнтралі. З 1913 г. — на пасяленні ў Енісейскай губерні. У гады першай сусветнай вайны — у сацыяльна-дэмакратычных арганізацыях Паўночнага Каўказа. У 1917—1920 гг. — удзельнік барацьбы за савецкую ўладу на Паўночным Каўказе. Пасля грамадзянскай вайны — на партыйнай рабоце. У 30-я гг. — старшыня рэўкамісіі Азова-Чарнаморскага крайкома ВКП(б). Памёр у маскоўскай бальніцы. (Политическая каторга и ссылка: Биограф. справочник. М., 1934. С. 150; «Известия». 1934. 3 сентября. Сообщение о смерти.)

Э. Карніловіч

ГУЗІКАЎ Восіп. Нарадзіўся 2 верасня 1806 г. у Шклове ў сям'і вандроўнага музыканта. Бацька ўтрымліваў сям'ю, зарабляючы ігрой на флейце на сялянскіх вяселлях, кірмашах і гуляннях у навакольных сёлах. Слава пра таленавітага музыку распаўсюдзілася на ўсю Магілёўскую губерню і нават да Масквы. Неаднойчы стары Міхалка ездзіў у сталіцу, дзе паспяшаў велікасвецкае кола.

Рана далучыўся да музыкі і сын Восіп. Дзесяцігадовым хлапчуком ён дасканала валодаў ігрой на флейце. Не ведаючы нот, па памяці чыста выконваў мноства народных песень, танцаў, найгрышаў — беларускіх, рускіх, украінскіх, яўрэйскіх. Неўзабаве на вяселлях Восіп стаў замяняць вайго бацьку. Акампанаваў яму на скрыпцы яго старэйшы брат, таксама віртуоз.

У 16 гадоў Восіпа ажанілі па волі бацькоў. Неўзабаве ў яго з'явілася двое дзяцей. Пачалося нялёгкае жыццё. Да сямейных клопатаў дабавілася цяжкая хвароба — сухоты. Фізічна хворы, але не згубіўшы прытомнасці духу, Восіп задумаў вынайсці новы, да гэтага часу нікому не вядомы музычны інструмент. Не ведаючы матэматыкі і законаў акустыкі, самавучка-вынаходца сканструяваў інструмент (ксілафон), які сваім гучаннем здзівіў і захапіў музычную Еўропу. Але першымі слухачамі і суддзямі яго былі сяляне навакольных суседніх вёсак. Пачуўшы музыку Гузікава, яны кідалі працу і спяшаліся на яго імправізаваны канцэрт, які найчасцей даваўся на прызбе роднай хаты.

В. Гузікаў

Неўзабаве старога знаёмага з новым інструментам сустракала Масква, дзе Гузікаў, як паведамлялася, «нашел живой общий отклик». Потым ён адправіўся ў Кіеў. Тут у той час даваў канцэрты польскі скрыпач і дырыжор К. Ліпінскі. Ігра музыканта-самавучкі яго зачаравала. У літаратуры прыводзяцца наступныя словы: «Поистине, Гузиков, я восхищаюсь Вами. Вы еще больший художник, чем я. Я использовал средства, которые были представлены в мое распоряжение. Вы же создали себе новые».

Акрылены такой высокай ацэнкай масцітага музыканта, Гузікаў з захапленнем аддаецца ўдасканальванню ігры на сваім вынаходстве. Яму апладзіравалі не толькі ў гарадах Расіі, а і ў Польшчы, Германіі, Аўстрыі, Францыі і Галандыі.

Старажытны Кракаў прымаў Гузікава «с величайшими почестями». Але сапраўднай сенсацыяй, якая прынесла яму заслужанае прызнанне ў самай патрабавальнай публікі, сталі яго выступленні ў Вене — адным з самых музыкальных гарадоў Еўропы.

Пасля Вены ён наведаў многія гарады Германіі. Выдатны нямецкі кампазітар, піяніст і дырыжор Ф. Мендэльсон так выказаўся пасля канцэрта: «Это настоящий феномен, исключительный музыкант, стоящий не ниже любого великого виртуоза как по манере исполнения, так и по своему зрелому мастерству. И потому-то он обрадовал меня своей игрой на этом деревянно-соломенном инструменте гораздо больше, чем многие своей игрой на фортепьяно, хотя инструмент его очень неблагодарен... Как бы то ни было, я уже давно не испытывал такого наслаждения от концерта, ибо Гузиков поистине гений».

Памёр ён 21 кастрычніка 1837 г. у нямецкім г. Ахене ў час канцэрта з інструментам у руках. Месца пахавання яго астанкаў невядома, у рускім друку не з'явілася пра гэта ні слова. А між тым патрабавальная заходнееўрапейская публіка параўноўвала Гузікава з Паганіні.

Многае яшчэ невядома ў біяграфіі знакамітага ўраджэнца Шклова. Не вызначаны рэпертуар музыканта, якія ён выконваў народныя творы і творы прафесійных кампазітараў. Нічога пакуль невядома і пра яго ўласныя сачыненні і імправізацыі.

Відаць, небескарыснай можа аказацца спроба адшукаць сам інструмент Гузікава, які, магчыма, захаваўся ў якім-небудзь зарубежным этнаграфічным музеі — прататып сучаснага ксілафона.

Неабходна заўважыць, што гэта быў час, калі ў Расіі фанатычна захапляліся ўсім замежным, калі для рускага дваранства, выхаванага на еўрапейскіх узорах культуры, сваё роднае, айчыннае аставалася далёкім і чужым. Сляпое пакланенне захаду прывяло да таго, што самабытная народная творчасць не прыжывалася і не дапускалася на сцэну. В. Гузікаў быў адным з нямногіх, хто разбурыў гэтыя стэрэатыпы.

А. Турбінскі, А. Грудзіна

МАРГОЛІН Маісей Маркавіч (17.03.1862, Шклоў Магілёўскай губерні), публіцыст, пісьменнік. З купецкай сям'і. Закончыў юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. З 1890 г. — супрацоўнік, з 1891 г. — галоўны сакратар рэдакцыі Энцыклапедычнага слоўніка Э. Брагкаўза і І. А. Эфрона. Найбольш буйны яго артыкул у слоўніку — «Банкі». Супрацоўнічаў у часопісах «Усход» і «Яўрэйскае жыццё». З 1904 г. — рэдактар часопіса «Яўрэйскае жыццё». Аўтар кнігі «Асноўныя плыні ў гісторыі яўрэйскага народа» (1900 г.). (Энциклопедический словарь. Дополн., т. 11. СП6., 1906. С. 140; Венгеров С. А. Критико-библиографич. словарь русских писателей и ученых. Петроград, 1915. Т. 2. С. 61.)

Э. Карніловіч

ХАНІН Леў Рыгоравіч (1882, Шклоў Магілёўскай губерні, — 1959), прафесійны рэвалюцыянер, удзельнік трох расійскіх рэвалюцый. Член РСДРП з 1901 г. З сям'і мяшчан. Закончыў Пецярбургскі тэхналагічны інстытут (1913). З 1902 г. — у Екацярынаславе, студэнт Вышэйшага горнага вучылішча, член Екацярынаслаўскага камітэта РСДРП, вёў прапаганду на Бранскім заводзе, у рабочым пасёлку Амур. У маі 1903 г. арыштаваны і высланы з горада, паехаў у Адэсу. Удзельнік першай расійскай рэвалюцыі, снежаньскага ўзброенага паўстання ў Маскве. Са студзеня 1906 г. — член Маскоўскага чыгуначнага камітэта РСДРП, партыйны арганізатар і прапагандыст на Мікалаеўскай і Яраслаўскай чыгункі. У снежні 1906 г. у м. Куокала, на дачы «Ваза» сустрэўся з У. І. Леніным, гутарыў з ім пра выпуск нелегальнай газеты «Чыгуначнік». Тады ж у Пецярбургу арыштаваны і заключаны ў турму «Крыжы», дзе прасядзеў 5 месяцаў. З чэрвеня 1907 г. — на партыйнай рабоце ў Пецярбургу, вёў агітацыю ў рабочых гуртках Маскоўскай заставы, вучыўся ў інстытуце, працаваў на розных будоўлях. Пасля лютаўскай рэвалюцыі 1917 г. — член легендарнага Маскоўска-Застаўскага райкома партыі, член Петраградскай гарадской думы. Удзельнік кастрычніцкага ўзброенага паўстання ў Петраградзе, член раённага рэўкома, са снежня — член Нарвскага раённага Савета ад фабрыкі «Скараход», камісар раённай управы. Пасля грамадзянскай вайны — на кіруючай гаспадарча-адміністрацыйнай рабоце. Узнагароджаны ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга (1955). Аўтар успамінаў пра У. І. Леніна, пра Кастрычніцкую рэвалюцыю. У апошнія гады — персанальны пенсіянер (Герои Октября. М., 1967. Т. 2. С. 539—540).

Э. Карніловіч

ФУНДАМІНСКІ Мацвей Ісідаравіч (1866, Шклоў Магілёўскай губерні, — 15.03.1896), рэвалюцыянер-народавалец, студэнт. З сям'і купца. Закончыў 1-е маскоўскае рэальнае вучылішча, вучыўся на 2-м курсе Пятроўскай земляробчай акадэміі. Валодаў пяццю замежнымі мовамі, праявіў здольнасці да матэматыкі і прыродазнаўства. З 1884 г. — член маскоўскай рэвалюцыйнай нелегальнай арганізацыі «Народная воля». Летам 1886 г. ездзіў у Парыж для перагавораў аб адраджэнні народавольскай арганізацыі, гутарыў з П. Л. Лаўровым, А. Н. Бахам. У снежні 1886 г. арыштаваны ў Маскве за прыналежнасць да рэвалюцыйнай арганізацыі і заключаны ў маскоўскую турму, у якой прасядзеў паўтара года. Летам 1888 г. адміністрацыйна высланы на 10 гадоў у Якуцк, дзе 22 сакавіка 1889 г. удзельнічаў ва ўзброеным супраціўленні палітссыльных у доме Манастырова, быў цяжка

паранены. Ваенны суд прыгаварыў яго да 20 гадоў катаргі, якую адбываў у Вілюйску, Атакуі, Горным Зерантуі. У 1895 г. выйшаў на вольнае пасяленне. Праз год у Іркуцкай бальніцы памёр ад сухотаў. Пахаваны ў Іркуцку. (Бах А. Н. Записки народовольца. М., 1929. С. 51; В якутской неволе: Сб. воспом. и мат. М., 1927. С. 94.)

Э. Карніловіч

Шклоў

Здаецца, бачу тыя стругі,
Што так напорыста плывуць.
Шчыты і новыя кальчугі
Бліснуць — маланкай паласнуць.
Плывуць варагі ўніз — на Кіеў,
А сведкай — родны мой Дняпро.
Мячы надзейныя такія —
Як шчасце вернага пяро!
А прашчур мой карчуе ляда
На правым беразе ракі,
Кладзе камель на панарады,
Глядзіць на дзіва з-пад рукі.
Тады свае павесіў лыкі
На тым жа ліпавым суку,
Прамовіў: — Страх то не вялікі,
Не тое ўбачыш на вяку...

Не раз прымервалі да шыі
Пятлю мангольскага ярма
Нашчадкі лютага Батыя,
Ды самі ўбачылі — дарма.
Свайго няўстойлівага лёсу
Прайшоў крутыя віражы,
Сагнуты быў і безгалосы,
Пра шчасце толькі варажыў.
Даўно забыў — скажу да слова —
Свой горкі лёс і лебяду.
Я назву сціпленькую Шклова
На карце вобмацкам знайду.

В. Гаўрусеў

1917

1941

ДА НОВАГА ГРАМАДСКАГА ЛАДУ

Ад Лютага да Кастрычніка

Першая сусветная вайна давяла Расію да глыбокага крызісу — ваеннага, эканамічнага, палітычнага. Надзвычай цяжка склаўся лёс Беларусі. Пасля паражэння расійскіх войск ва ўсходняй Прусіі і паследуючага адступлення на яе тэрыторыі разгарнуліся ваенныя дзеянні. Да кастрычніка 1915 г. нямецкія войскі захапілі значную частку Беларусі — да лініі Дзвінск — Паставы — Баранавічы — Пінск, усталявалі тут жорсткі акупацыйны рэжым. Ва ўсходніх раёнах, на Шклоўшчыне ў тым ліку, становішча было таксама цяжкае. Праз паветы і воласці праходзіла і затрымлівалася многа бежанцаў. У Магілёве размясцілася Стаўка Вярхоўнага камандавання, а ў навакольных месцах — шматлікія армейскія ўстановы, значная колькасць войск, на ўтрыманне якіх рэквізавалі жывёлу, фураж, прадукты харчавання. Дарослых мужчын мабілізоўвалі і адпраўлялі на фронт. Мясцовыя прадпрыемствы з-за недахопу кваліфікаваных рабочых, сыравіны, паліва амаль поўнасцю спынілі работу, сельская гаспадарка прыйшла ў заняпад. Імклівa расла дарагавізна, востра адчуваўся недахоп усіх тавараў спажывання. Усё гэта ўзмацняла незадавальненне мас народа самадзяржаўем, ваенна-палітычным рэжымам, гнётам мясцовых багацеяў, чыноўнікаў. У краіне наспяваў рэвалюцыйны выбух. І ў лютым 1917 г. ён адбыўся.

Рэвалюцыя пачалася ў Петраградзе і хутка ахапіла ўсю Расію. Царскае самадзяржаўе было звергнута. Узнік Часовы ўрад з прадстаўнікоў фінансавага капітала, памешчыкаў, розных буржуазных, а пазней і дробнабуржуазных партый. Побач з афіцыйным Часовым урадам «...узнік галоўны, неафіцыйны, неразвіты яшчэ, параўнальна слабы рабочы ўрад, які выражае інтарэсы пралетарыяту і ўсёй бяднейшай часткі гарадскога і сельскага насельніцтва» (Ленін У. І. Поўны зб. тв. Т. 31. С. 18). Меліся на ўвазе Саветы рабочых, сялянскіх і салдацкіх дэпутатаў. Аднак вясной і летам 1917 г. у большасці з іх верхаводзілі згодніцкія палітыкі — эсэры, меньшавікі і інш. Атрымалася двоеўладдзе — своеасаблівае перапляценне ўлады буржуазіі — Часовага ўрада і згодніцкіх Саветаў. Выканаць волю народных мас — забяспечыць мір — усім людзям, зямлю — сялянам, фабрыкі і заводы — пад кантроль мас — яны не маглі і не хацелі з прычыны сваіх класавых інтарэсаў. Вайна не спынялася, памешчыцкае землеўладанне не закраналася, нічога не атрымаў рабочы клас. Наспявала рэвалюцыя, якая б здольна была ажыццявіць інтарэсы мільёнаў працоўных, прывесці да новага грамадскага ладу.

У кастрычніку 1917 г. паўсталі рабочыя і рэвалюцыйна настроеныя салдаты

ў Петраградзе. Часовы ўрад быў звергнуты. Другі Усерасійскі з'езд Саветаў прыняў доўгачаканыя народам Дэкрэты аб міры, аб зямлі, утварыў новы ўрад — Савет Народных Камісараў Расійскай рэспублікі на чале з У. І. Леніным. Кастрычніцкая рэвалюцыя, атрымаўшы перамогу ў цэнтры Расіі, стала пашырацца па ўсёй краіне.

У Мінску ўлада перайшла ў рукі Саветаў адразу ж як стала вядома аб перамозе ўзброенага паўстання ў Петраградзе. Савецкая ўлада была ўстаноўлена ў Віцебску, Гомелі, Оршы, многіх іншых гарадах і населеных пунктах. Складаней было становішча ў Магілёве, дзе размяшчалася Стаўка. Яе давялося ліквідаваць атраду рэвалюцыйных сіл. 19 лістапада 1917 г. тадышні Магілёўскі Савет прызнаў Савецкую ўладу і стварыў Ваенрэўком, да якога перайшлі ўлада ў горадзе і кантроль над Стаўкай. А раніцай 20 лістапада пачала дзейнічаць новая, Рэвалюцыйная Стаўка на чале з М. В. Крыленкам.

У Шклове і валасцях, якія пазней увайшлі ў склад раёна, Савецкая ўлада таксама ўсталявалася ў лістападзе 1917 г. Тады ж у Шклове быў створаны атрад Чырвонай гвардыі. Вялікую ролю адыграў у гэтым К. С. Бакуновіч — марак з «Аўроры», удзельнік ліквідацыі контррэвалюцыйнай Стаўкі ў Магілёве.

Паступова Саветы стваралі свае органы кіравання, скасавалі земствы, управы і іншыя ўстановы былога Часовага ўрада. Аднак дзейнічалі мясцовыя адміністрацыі, у тым ліку ў Шклове, якія ўпэўнена. У другой палове снежня 1917 г. газета «Революционная Ставка» ў справаздачы аб I з'ездзе Саветаў Магілёўскай губ. (закончыў работу 18 снежня.— *Рэд.*) паведамляла:

«... Заседавший в течение 2 дней подряд съезд Советов рабочих и солдатских депутатов, функционирующих в пределах Могилевской губ., закончил свои занятия... заслушав большую программу вопросов и много докладов с мест, представляющих значительный интерес.

...В повествовании председателя Шкловского Совета рабочих и солдатских депутатов слышатся минорные нотки, свидетельствующие, пожалуй, об известной нерешительности, об отсутствии твердости в выявлении своей воли.

«Местечко Шклов,— говорит оратор,— историческое, но никакой роли в истории наш Совет не сыграет! Мы не имеем той вооруженной силы, на которую мы могли бы опереться, у нас, наконец, считанные работники! — плачется делегат и иллюстрирует свою мысль двумя примерами: — В Шклове функционирует спичечная фабрика, дающая заработок около 400 рабочим. И вот крестьяне отказываются решительно возить дрова на эту фабрику, вследствие чего громадное предприятие неминуемо должно прекратить свое производство. Рабочие, которым предстоит перспектива быть выброшенными на улицу, прямо осаждают нас просьбами: «Проявите свой авторитет, образумьте крестьян!..» Но все наши попытки в этом смысле не дали никакого результата. И выходит так, что там, где речь идет о мелочах (например, заботы о керосине для населения), различные реквизиции продовольственных продуктов у местных торговцев и прочем, там, пожалуй, мы проявляем себя, а как только речь заходит о событиях крупного масштаба, вроде, например, вышеприведенного или же имевшего недавно место стремления крестьянского населения Шкловского у. образовать отдельное земство, без участия в нем рабочего пролетариата из местечка, что явилось результатом агитации черной сотни, тем как бы расписываемся в бессилии. Опять-таки, квартирующие у нас армейские части определенно заявили, что применять вооруженную силу в пользу той или иной стороны они не станут, буде даже в этом представится надобность...

«Хватит с нас»,— говорят они и проводят политику полного нейтралитета.

Таковы вот картины из жизни Шкловского Совета!» («Революционная Ставка». 1917. 21—23 декабря).

Як у Шклове, так і ў валасцях мелася нямала непаладкаў у рабоце Саветаў. Адчувалася не толькі няўмеласць, але і адкрытае і скрытае супраціўленне ранейшае існаваўшых і меўшых пэўны ўплыў на людзей згодніцкіх партый меншавікоў, эсэраў, бундаўцаў. Тым не менш Саветы як органы народаўладдзя паступова ўмацоўваліся.

5—10 студзеня 1918 г. у Магілёве адбыліся II губернскі з'езд Саветаў рабочых і салдацкіх дэпутатаў і IV губернскі з'езд сялянскіх дэпутатаў. Дэлегаты абодвух з'ездаў выказаліся за падтрымку Савецкага ўрада, выбралі свае выканаўчыя камітэты і вырашылі аб'яднацца ў адзіны Савет рабочых, салдацкіх і сялянскіх дэпутатаў. Ён быў утвораны 14 студзеня. Старшынёй выканкома стаў М. Л. Гольман (гл.: Гісторыя Беларускай ССР. Т. 3. Мн., 1973. С. 79).

Г. Напрэеў

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

ТЭЛЕГРАМА ВЫКАНКОМА МАГІЛЁЎСКАГА ГУБ. САВЕТА Ў ПЕТРАГРАД АБ АРГАНІЗАЦЫІ САВЕТАЎ У ГУБЕРНІ

22 студзеня 1918 г.

Советы имеются в уездных городах: Быхове, Гомеле, Горках, Климовичах, Мстиславле, Орше, Рогачеве, Сенно, Чаусах и Черикове; кроме того, местечковые: ...Копысский — Копысь Горецкого у.; ...Толочинский — Толочин Оршанского у.; Шкловский — Шклов Могилевского у. ...

В Могилеве имеются губернский и уездный Советы.

Председатель губисполкома *Журавлев*
Секретарь *Пеньевский*

Великая Октябрьская Социалистическая революция в Белоруссии. Т. 2. Мн., 1957. С. 816.

* * *

18 лютага 1918 г. кайзераўская Германія, спыніўшы раней дасягнутае перамір'е, кінула больш за 50 германскіх і аўстра-венгерскіх дывізій у наступленне супраць Савецкай Расіі. Сіл на барацьбу з агрэсарам не хапала, і ўжо ў першыя тыдні на цэнтральным напрамку праціўнік захапіў Мінск, Полацк, Оршу, значную частку Магілёўскай губерні*, у тым ліку правабярэжную (р. Дняпро.— *Рэд.*) частку валасцей Шклоўшчыны. Акупанты разграмілі Саветы, адабралі ў рабочых і сялян усё, што яны атрымалі ад рэвалюцыі, няшчадна разбуралі прадпрыемствы, адымалі жывёлу, хлеб, вывозілі ў Германію нарабаванае і нават людзей. Аб масавых рэпрэсіях захопнікаў паведамляў Савету Народных Камісараў РСФСР Паўночна-Заходні абласны камітэт РКП(б): «Немцы палююць на людзей, ловяць пагалоўна ўсіх на вуліцах і ў дамах, трымаюць у лагерах пад вартай, а затым грузяць у наглуха запячатаныя вагоны і вывозяць у невядомым напрамку» (гл.: Гісторыя Беларускай ССР. Т. 2. Мн., 1958. С. 93).

* 12 сакавіка — 31 кастрычніка Магілёў быў акупіраваны корпусам Доўбар-Мусніцкага, з мая — кайзераўскай Германіяй.

СА ЗВОДКІ АПЕРАТЫЎНАГА АДДЗЕЛА ВЫШЭЙШАГА ВАЕННАГА АДДЗЕЛА АБ АКУПАЦЫЙНЫМ РЭЖЫМЕ НА ЗАНЯТАЙ ГЕРМАНСКІМІ ВОЙСКАМІ ТЭРЫТОРЫІ

№ 2352 р

1 жніўня 1918 г.

...Весь ревизованный запас продуктов, скота и других материалов немцами усиленно вывозится в Германию. Так, 10 июля со стн. Шклов немцами вывезено 32 вагона льна, 22 вагона тряпья, 38 вагонов бумаги со шкловской фабрики, 40 вагонов лошадей и с 10 июля ежедневно вывозится 2—3 вагона домашних животных. Аналогичные донесения поступают и из других уездов Белоруссии.

Начальник оперативного управления Высш. Воен. Совета генерального штаба *Н. Сулейман*

Помощник по развед. части генштаба *Б. Шапошников*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Сб. док. Т. 1. Мн., 1968. С. 171.

ПАВЕДАМЛЕННЕ ГАРАЦКАГА ІНФАРМАЦЫЙНАГА БЮРО ГАЛОЎКАЗАХУ АБ АРГАНІЗАЦЫІ ПАВЯТОВЫМІ САВЕТАМІ МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ БАРАЦЬБЫ З АКУПАНТАМІ

1918. Сакавіка 30 (17)

С занятием немцами Могилева губернский исполнительный комитет фактически не существует.

Руководство местной жизнью перешло в руки местных уездных Советов. Горецкий Совет организует оборону Могилевской губернии, собирает оставшиеся силы и закрепляет связь с ближайшими местностями.

По всем уездам организованы партизанские отряды для борьбы с германскими бандами, переходящими демаркационную линию в целях грабежа.

Борьба с обеих сторон беспощадная. Пленных не берут. Из германского тыла к нам приходят группами и по одиночке наши там оставшиеся солдаты, приводя нередко с собою пленных германцев или легионеров, принося пулеметы и оружие.

Железная дорога до Орши со станциями Копысь и Шклов занята немцами.

Из города Чаусы польские легионеры выбиты нашим партизанским отрядом. Климовичи, Чериков и Мстиславль в наших руках.

Оставшиеся уездные Советы учреждают свое областное объединение.

Информационное бюро

Документы и материалы по истории Белоруссии. Т. 4. Мн., 1954. С. 384—385.

З ДАКЛАДА АДКАЗНАГА АРГАНІЗАТАРА УСЕРАСІЙСКАЙ КАЛЕГІІ С. КРАЎЗЕ АБ ФАРМІРАВАННІ ЧАСЦЕЙ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ І ПАРТЫЗАНСКІХ АТРАДАЎ У МАГІЛЁЎСКАЙ ГУБЕРНІ

5 красавіка 1918 г.

По приезде в Могилев 2 марта узнаю следующее: 1) Совет эвакуируется в Смоленск, 2) Революционный штаб с 600 чел. боевой дружины и партизанских отрядов принял боевую обстановку.

13 марта взял боевую задачу: удержать наступление легионеров на Могилев и дать эвакуироваться, что и было сделано. С 200 чел. боевой дружины при двух пулеметах отправился в м. Селец, в 12 верстах юго-западнее Могилева, где и продержался до 4 часов дня 14 марта, после чего отступил на Лотву и Шклов, северо-западнее Могилева, где принялся за работу по организации Красной Армии. Был создан штаб Красной Армии из местных организаций и к 17 марта было завербовано 390 чел. в Красную Армию. После налаженной работы в Шклове отправился на Оршу, откуда отправился в волость, где на общих митингах были вынесены резолюции — поголовно вступить в ряды партизанских отрядов и Красной Армии. В результате в настоящее время в Оршанском уезде около 1400 партизан и 900 чел. Красной Армии, чем и заканчиваю свою работу. 26 — 27 марта выезжаю в Петроград, по пути останавливаюсь в Витебске — впечатление хорошее...

Ответственный организатор *Станислав Краузе*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Сб. док. Т. 1. С. 63.

ПАСТАНОВА СХОДУ СЯЛЯН с. ПЛЕШЧЫЦ НІЧЫПАРАВІЦКАЙ вол. ГОРАЦКАГА п. МАГІЛЁЎСКАЙ губ. АБ ПАДТРЫМЦЫ САВЕЦКАЙ УЛАДЫ

Мы, нижеподписавшиеся граждане с. Плещиц Могилевской губ. Горецкого уезда Ничипоровичской волости, присутствовали на собравшемся сельском сходе, в присутствии сельского комитета и всего нашего общего населения постановили стоять за Советскую Федеративную Республику и постановили единогласно. Всего было на сельском сходе и баллотировало поднятием рук за Советскую Федеративную Республику 1062 голоса. За германских империалистов не оказалось ни одного, в чём и подписуемся грамотные: Василий Власцов, Мирон Практиков, Михаил Куропаткин, Алексей Судьков, Малак Миронов, Козлов, Карп Судаков.

Председатель *С. Шлапаков*

Секретарь (подпись неразборчива)

Комитеты бедноты Белоруссии. Мн., 1958. С. 63.

РЭЗАЛЮЦЫЯ СХОДУ СЯЛЯН ВЁСКІ ЦІМОХАЎКІ ГАРАДЗІШЧАНСКАЙ ВОЛАСЦІ

11 чэрвеня 1918 г.

Под председательством Тимоховского сельского совета был собран полный сход нашего селения с 20-летнего возраста и до старых (всего 250 членов мужчин и женщин), вынесли резолюцию открытым голосованием, что селение Тимоховка Могилевской губ. Горецкого у. Городищенской волостной земской управы все единогласно отказалось от границ германско-украинских, желает остаться в границах Федеративной Российской Советской Республики.

Да здравствует Федеративная Советская Республика! Да здравствуют народные комиссары! Да здравствуют граждане-товарищи!

Председатель Совета *Сипаков*

Секретарь (подпись неразборчива)

Комитеты бедноты Белоруссии. Сб. док. Мн., 1958. С. 63.

Падрыхтаваў *А. Турбінскі*

Падпольны падраённы камітэт РКП(б) у Шклове

У маі 1918 г. быў створаны і дзейнічаў да кастрычніка 1918 г. падпольны падраённы камітэт РКП(б) у г. Магілёве. Ён ажыццяўляў таксама кіраўніцтва дзейнасцю Шклоўскага і Быхаўскага падраённых камітэтаў партыі.

Шклоўскі падпольны падрайком РКП(б) створаны ў канцы мая 1918 г. У склад камітэта ўвайшлі П. І. Сямёнаў (падпольная мянушка Мухін) — старшыня, М. Л. Матронкін — нам. старшыні, Г. М. Лабузноў — сакратар, В. Карага, Ф. Кайдаў. Некалькі пазней у камітэт увайшлі А. Спіцкі, І. Папкоў. Актыўнымі падпольшчыкамі з'яўляліся М. Новікаў, Н. Кароткін, С. Галінскі, Т. Матронкін, В. Матронкін, А. Котаў, Ф. Чарвякоў, К. Гуляй, Е. Барадзёнак, А. Рэдзькін і інш.

Падрайком праводзіў работу ў пяці валасцях Магілёўскага павета: Шклоўскай, Стара-Чарнаруцкай, Таўпечанскай, Круглянскай, Паўлавіцкай. У кастрычніку 1918 г. Шклоўская падпольная падраённая партыйная арганізацыя налічвала больш 40 членаў РКП(б), 83 спачуваючых (гл.: Почанин С. В грозовом восемнадцатом. Мн., 1969. С. 130—131).

СПРАВАЗДАЧА АБ ДЗЕЙНАСЦІ ШКЛОЎСКАГА ПАДРАЁННАГА КАМІТЭТА РКП(б)

Не раней 28 кастрычніка 1918 г.

В великие майские дни 1918 г., когда в Белоруссии свирепствовал немецкий империализм, представителями Облискомзапа т. П. И. Семеновым и т. Брегманом была начата подпольная организация РКП (большевиков). К этим вождям освобождения темной массы первый навстречу пришел т. Матренкин, который как сын страны ознакомил этих вождей с популярностью хода жизни сел, деревень и рабочих писчебумажной фабрики, к коим навстречу пришли тт. Лобузнов, Кайдов, Коряга, Новиков, Червяков, Ножиков, Лужанков и другие, с наболевшим сердцем проводившие жизнь под немецким гнетом, и, видя тяжесть напавших на народ германских вампиров и всей буржуазии, которая засела под теплое крылышко Вильгельма и терзает до изнеможения. Они ждали этого избавления, но под угрозой немецких штыков им приходилось жить врозь, не понимая друг друга, которые через небольшое время слились воедино, составляя из себя авангард темной массы, и в августе месяце 11, 12 и 13 числа состоялся съезд представителей Белоруссии и Литвы, на котором участвовали от нашего Шкловского подрайона тт. Матренкин, Лобузнов, Кайдов, Напсиков, Новиков, Коряга, Червяков и Галинский, где осведомились с другими товарищами и наметили общий план дальнейшей работы.

По возвращении на свои старые места, несмотря на угрозы немецких штыков, принялись осведомлять товарищей, делать собрания, которые состоялись по уютным избам, лесам, оврагам и кладбищам, и так с каждым днем набирались члены и успешно организовывались ячейки, которые из них следующие: на писчебумажной фабрике м. Шклова, в с. Старый Шклов, д. Загорье, в д. Земцы и в д. Тросно и Литовск и т. д. Но чем раньше было организовать ячейки был избран подпольный Шкловский подрайонный комитет партии... который вел дальнейшую партийную работу, распространял литературу везде и всюду, регистрировал поступающих членов в партию и вел активную агитацию среди немецких солдат и населения. Затем, узнав о нашей деятельности, пришли к нам на помощь старый активный работник т. Спицкий и т. Попков, которые принимали активное участие в нашей работе.

Итак, за несколько недель до ухода немцев из Шклова состоялось общее собрание членов партии и сочувствующих, на котором выставили из себя административную власть, так называемый Военно-революционный комитет, названы были следующие товарищи: А. Спицкий, Попков, Кайдов, Матренкин, Коряго, Городенко, Гуляй, Короткин, Редькин, который сейчас же начал по уходе немцев занимать Шклов и его окрестности, взяв всю полноту власти в свои руки. За три дня до ухода немцев была организована добровольческая дружина в составе 150 человек и переправлена за демаркационную линию — р. Днепр. 28 октября 1918 г. перешли в Шклов, и власть перешла в руки Военно-революционного комитета.

Шкловский подрайонный комитет РКП (большевиков) перешел на легальное положение... Сейчас же была созвана конференция всех партийных ячеек всего подрайона, и произошло слияние с существующей тогда в Шклове городской ячейкой во главе со старым партийным работником т. Ципкиным, на которой была реорганизована вся организация и были распущены все члены, принадлежащие ко всем ячейкам, и регистрировались новые члены в партию, считаясь с их прошлым поведением в партийном отношении, и был избран подрайонный комитет партии из самых преданных, стойких, дисциплинированных партийных товарищей, во главе которого т. Спицкий — председателем и т. Ципкин — товарищем председателя и т. Лобузнов — секретарем, членами — тт. Попков, Матренкин, Валусько и Кравцов.

В настоящее время комитет партии является высшим контролирующим органом всего подрайона (все распоряжения и руководящие указания проводятся в жизнь всеми партийными и советскими работниками), контролирует все советские учреждения в расположении своего подрайона; партийный комитет развивает свою агитаторскую культурно-просветительскую деятельность, как то: устраивание митингов, лекций, собеседований по всем вопросам текущей жизни. Привлекаются к лекциям рабочие и деревенская беднота. Развитие агитаторской деятельности тормозится частью тем, что в ответственных партийных работниках комитет нуждается, и в особенности в литературе, которая должна быть в широком масштабе распространена между крестьянами в деревнях, которые хотят и жаждут знать о ходе революционной жизни. В организации входят преимущественно деревенская беднота и рабочие...

Председатель партии *А. И. Спицкий* Секретарь *Г. М. Лобузнов*

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Сб. док. Т. 1. С. 281—283.

СПІЦКІ Аляксандр Іванавіч (1895, в. Старое месца Магілёўскага павета, цяпер Шклоўскага р-на). Удзельнік барацьбы за Савецкую ўладу ў Беларусі, першай сусветнай і грамадзянскай войнаў. Член КПСС з 1917. З сялян. Закончыў Шклоўскае народнае вучылішча. З 1915 — у царскай арміі, ваяваў на Заходнім фронце, удзельнічаў у баях пад Варшавай, атручаны газамі. Лячыўся ў маскоўскім шпіталі, дзе пазнаёміўся з салдатамі-балышавікамі. Са студзеня 1918 — на радзіме, у час нямецкай акупацыі вёў падпольную работу ў Шклоўскай воласці. Вымушаны быў часова выехаць на неакупіраваную тэрыторыю. Летам 1918 вярнуўся ў Шклоў і актыўна ўключыўся ў партыйную падпольную работу, выбраны членам падпольнага Шклоўскага падрайкома партыі. З лістапада 1918 — старшыня Шклоўскага райкома РКП(б), з кастрычніка 1919 — старшыня Шклоўскага валрэўкома. У 1919 старшыня першага Шклоўскага выканкома, адначасова ваенны камісар павета, стварыў партызанскі атрад. У ліпені 1920 добраахвотна ўступіў у Чырвоную Армію, ваенны камісар зводнай стралковай брыгады, ваяваў на Заходнім фронце. Вясной 1921 дэмабілізаваўся, зноў стаў старшынёй Шклоўскага райвыканкома.

Пасля Вялікай Айчыннай вайны — персанальны пенсіянер. Жыў у г. Балахна Горкаўскай вобл.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Сб. док. Т. 1. С. 282—283.

Э. Карніловіч

А. І. Спіцкі

СЯМЁНАЎ Пётр Іванавіч. Член КПСС з красавіка 1917. Удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі ў Нясвіжы. Член Нясвіжскага Савета рабочых і салдацкіх дэпутатаў у 1917. У красавіку 1918 разам з іншымі таварышамі ЦК і Паўночна-Заходнім абласным камітэтам РКП(б) накіраваны на партыйную работу ў Беларусь і з мая па лістапад 1918 быў старшынёй Шклоўскага падпольнага падраённага камітэта і намеснікам старшыні Магілёўскага падпольнага райкома партыі. Пасля выгнання нямецкіх акупантаў у 1918—1924 працаваў у органах Наркамхарча. З 1924 па 1937 — у РКІ і партыйным кантролі. З 1938 па 1955 — на кіруючай гаспадарчай рабоце. З 1955 — на пенсіі.

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 464, л. 15.

Э. Карніловіч

АБ РАБОЦЕ ШКЛОЎСКАГА ПАДПОЛЬНАГА КАМІТЭТА ПАРТЫІ Ў ТЫЛЕ НЯМЕЦКІХ АКУПАНТАЎ У 1918 г.

З успамінаў П. І. Сямёнава

...Во время февральской буржуазно-демократической революции я служил в 675-м пехотном Конотопском полку взводным унтер-офицером. В апреле 1917 г. вступил в РКП(б). В полку не плохо была поставлена организационно-политическая работа большевиками, в результате чего солдаты полка активно действовали во время февральской революции... В начале июля 1917 г. полк был разоружен по приказу Керенского, личный состав направлен на пополнение других частей.

...Через несколько дней после Октябрьской революции, по просьбе представителя армейского комитета 2-й армии одним из батальонов участвовали в изгнании казаков из Несвижа. От батальона был избран членом Несвижского городского Совета рабочих и солдатских депутатов. Работал в продовольственной комиссии при городской управе.

Когда началось наступление немцев, пришлось в конце февраля 1918 г. эвакуироваться вместе с предгорсовета Некрасовым, дру-

гими членами Совета. Явились в Смоленск в распоряжение Облкомзапа. Вскоре по указанию ЦК партии был направлен на подпольную работу в районы, оккупированные кайзеровскими войсками. После ряда «мытарств» оказался на Шкловщине. Ехал туда с товарищем Шаповаловым из Могилевского уезда.

...В первой же деревне, где ночевали, утром собралось много крестьян. Я провел беседу, информировал о положении в нашей стране, рассказал, что надо делать им на месте, рекомендовал избрать руководителя для работы, снабдил их агитационными брошюрами, которых мы имели около 500 экз. Проезжая другое село, снова имел беседу с крестьянами. Порекомендовал начать организовывать отряд на месте, избрать командира, знающего военное дело. Информировал их о положении в стране.

В этом же селе был задержан Шаповалов и отведен к немецкому коменданту. Пришлось задержаться. Крестьяне помогли переодеться, выдали меня за своего, местного. Выручили они и моего товарища. Вскоре познакомился с жителем д. Земцы Матренкиным Михаилом. Он охотно согласился вести работу в подполье. Познакомился с учителем из д. Загорье Лабузновым Георгием, который также активно включился в дело. Согласились также с Корягой, рабочим писчебумажной фабрики.

В дальнейшем для обеспечения руководства организацией партизанских отрядов и проведения политической работы среди рабочих и крестьян был создан подрайонный комитет под моим председательством. Секретарем был Лабузнов. В состав комитета входили также Матренкин, Коряга и Спицкий. Заседания проводили больше всего на квартире Коряги. Руководящие указания получали от Могилевского районного подпольного комитета, председателем которого был Брегман Александр, заместителем — я.

В нашей работе было два периода. Согласно директив Облкомзапа вначале главным направлением в работе являлась организация партизанских отрядов, ведение разведки о расположении немецких войск, их составе, вооружении и т. д. Данные сообщали коменданту Оршанского участка Рывину. Через него же получали винтовки, боеприпасы, которые хранили на базе в лесу. Ведали ей Матренкина Тамара и Котов Артем, бывший матрос из д. Земцы.

...Распространением агитационной литературы занимались все партизаны. Получали из Могилева через сестер Эмму и Цету Ремз.

15 августа 1918 г. в Смоленске состоялась партийная конференция подпольных работников Литвы и Белоруссии. Брегман и я были в президиуме. Руководил конференцией Алимбеков и известная большевичка Самойлова.

После конференции главное внимание сосредоточили на организацию партячеек, активизацию политической работы среди населения оккупированной немцами местности. Рабочие и крестьяне, бедняки и середняки активно помогали подпольщикам: не брали денег за ночлег, обеспечивали продуктами, транспортом...

За время подпольной работы много выросло хороших работников, которые тогда же вступили в партию. Нейман из Быхова в 30-х годах работал в ЦКК — РКИ, Спицкий после реоккупации стал председателем райисполкома, Коряга — зав. отделом райисполкома, Соболев — военным комиссаром волости.

Активно участвовали в подпольной работе женщины. Они были связистами, дежурили на постах охраны собраний и т. д.

...Из указанных мною подпольных работников знаю, что Матренкин, Коряга и Койдов умерли; Брегман убит поляками, когда он был комиссаром бригады в Красной Армии; Лобузнов живет в Минске.

Успаміны датаваны красавіком 1957 г.

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 464, лл. 2—25.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

ЛАБУЗНОЎ Георгій Малахавіч (1898—27.10.1973) — в. Загор'е Шклоўскага р-на, з беднай сялянскай сям'і. Член КПСС з 1918. У 1917 служыў у арміі. У красавіку 1918 вярнуўся на радзіму, актыўна ўключыўся ў работу падраённага Шклоўскага камітэта партыі. З лістапада 1918, пасля вызвалення Шклова, — сакратар Шклоўскага камітэта партыі і адначасова намеснік старшыні аблвыканкома. У жніўні 1919 мабілізаваны ў Чырвоную Армію. Удзельнік грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. У мірны час працаваў у органах народнай асветы. Заслужаны настаўнік БССР (1949). Персанальны пенсіянер. Пахаваны ў Загор'і.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918—1920. Сб. док. Т. 1. С. 281.

З успамінаў Г. М. Лабузнова

Г. М. Лабузноў

...На Шкловщине засевшие еще во время Керенского в Советы эсеры и меньшевики долго тормозили проведение в жизнь декретов, принятых II съездом Советов. Еще в январе 1918 г. помещица Кривошеина как сидела в своем имении, так и продолжала сидеть. Все крупные и другого калибра торговцы и купцы... продолжали торговать, скупать у крестьян хлеб, лён и другие продукты.

С приходом в феврале 1918 г. на Шкловщину польских легионеров, а с ними и немецких оккупантов жизнь трудового народа, а особенно крестьян, еще больше ухудшилась...

Восстановление Советской власти. 1 ноября 1918 г. Могилевским губревкомом было принято постановление об восстановлении Советской власти в губернии. Шкловский ревком... утверждается районным революционным комитетом — высшей властью в районе, в который входят следующие волости: Шкловская, Старосельская, Черноручская, Солнечницкая, Круглянская и Павловичская. Районному ревкому предписывается срочно распустить все волостные и земские управы и передать все дела волостным ревкомам...

Принимались все меры для того, чтобы в Шклове и в районе было спокойно, не допускались антисоветские выступления... Подрайком партии и ревком взялись за изыскание хлеба для Красной Армии и средств для органов местной власти. На крупных торговцев и кулаков была наложена контрибуция...

Со стороны кулаков, дезертиров, воров, спекулянтов, бандитов и грабителей мы встретили организованное и неорганизованное сопротивление... Кулаки д. Овчиненки подчинились требованиям местной власти только тогда, когда на место выехал вооруженный отряд с уполномоченными от ревкома Хлиманцовым Ф. С. и Кайдовым Ф. Я. На подавление кулацкого саботажа в д. Комсеничи выезжал с отрядом районный военный комиссар т. Соболев М. Ф., военрук т. Малахов И. К. и Волусько Д. Ф. ...На ликвидацию «зеленых», засевших в лесах Горки — Шклов, составляющих большую силу из дезертиров, в помощь воинскому подразделению г. Смоленска были направлены из Шклова боевые силы и вооруженные комсомольцы. «Зеленые» были ликвидированы. Банда из семи человек, скрывавшаяся во Францовке, была местными силами поймана и передана в распоряжение Латышского полка, проходившего тогда через Шклов, и по решению полкового суда была в Шклове расстреляна.

С первых дней восстановления Советской власти в Шклове были организованы отделы ревкома: административный, военный, продовольственный, земельный, народного хозяйства, народного просвещения, народного здравоохранения и регистрации. А также была создана ЧК, организована местная караульная дружина из добровольцев для охраны города и налажен выпуск местной (печатной) газеты «Известия». ...На писчебумажной фабрике был создан рабочий комитет, который осуществлял контроль над администрацией фабрики.

В марте 1919 г. Шкловский районный революционный комитет был реорганизован в волостной исполнительный комитет Совета рабочих, крестьянских и красноармейских депутатов. Председателем исполкома Совета был избран Спицкий А. И., заместителем Лабузнов Г. М., секретарем Брегман А. Было возбуждено ходатайство о переименовании местечка Шклов в город Шклов.

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 465, лл. 13, 32—38.

КАРАГА Васіль, рабочы Шклоўскай папяровай фабрыкі. Член падпольнага камітэта партыі. Пасля вызвалення Шклова быў абраны ў новы склад камітэта і з'яўляўся членам райкома.

Починин С. В грозовом восемнадцатом. С. 130.

РЭЗАЛЮЦЫЯ АБ СТВАРЭННІ ЗАХОДНЯЙ ВОБЛАСЦІ, ПРЫНЯТАЯ II З'ЕЗДАМ САВЕТАЎ

11 красавіка 1918 г.
г. Смаленск

II съезд Советов Западной области признает, что в ходе Российской Революции выявилась необходимость объединения старых губерний в областные единицы по принципам экономическим, географическим и этнографическим, что губернии Смоленская, Могилевская, Витебская и Минская как губернии не промышленные... и в то же время сливающиеся по своему географическому расположению, естественно тяготеют друг к другу, образуя одно целое — Западную область, что дезорганизация хозяйственной жизни, вызванная близостью придвинувшегося фронта, одинаково диктует всем четырем губерниям необходимость создания сильного объединяющегося областного центра, могущего взять на себя задачу воссоздания разрушенного хозяйственного аппарата и руководства экономической жизнью области.

Считаясь со всеми этими обстоятельствами, съезд Советов Западной области постановляет:

включить Смоленскую, Витебскую, Могилевскую и Минскую губернии в состав Западной области и организовать областной центр Советской власти в Смоленске, как естественном центре Западной области.

ФДА, Магілёў, ф. 464, воп. 1, спр. 2, лл. 118—119.

РЭЗАЛЮЦЫЯ ПАЎНОЧНА-ЗАХОДНЯЙ АБЛАСНОЙ КАНФЕРЭНЦЫІ РКП(б) ПА ПЫТАННІ АБ ПАРТЫЙНЫХ АРГАНІЗАЦЫЯХ У ВОБЛАСЦІ

1. Во главе всех организаций Западной области стоит избранный Областной конференцией Областной комитет.

...О районных объединениях

8. Вся область распадается на районные объединения, состоящие из уездных (подрайонных волостных и деревенских организаций).

Сентябрь 1918 г.

ФДА, Магілёў, ф. 6606, воп. 1, спр. 25а, л. 195.

Камбеды на Шклоўшчыне

11 чэрвеня 1918 г. УЦВК і СНК рынялі Дэкрэт «Аб арганізацыі вясовай беднаты і забеспячэнні яе хлебам, прадметамі першай неабходнасці сельскагаспадарчымі прыладамі».

Шклоўшчына ў той час знаходзілася прыфрантавой паласе. Ворагі Савецкай улады распускалі чуткі, што наш край пяройдзе пад уладу германцаў. сваіх рэзалюцыях, прынятых на сходах, сяляне выказвалі рашучасць змацца за тое, каб застацца ў саставе СФСР. Такі сход адбыўся ў чэрвені 918 г. у Гарадзішчанскай воласці.

Усе сяляне прагаласавалі за Савецкую ўладу і на сходзе, які адбыўся в. Гарадзец. У памянёных вёсках, а аксама ў іншых населеных пунктах тваралiся ўзброеныя дружыны, якія памагалі прадстаўнікам Петраграда, Масквы, іншых прамысловых цэнтраў Расіі арганізоўваць камбеды. На іх ускладваліся задачы ўліку і канфіскацыі ў кулакоў лішкаў хлеба, размеркаванне яго паміж беднымі, паставак хлеба Чырвонай Арміі, аховы лясоў ад самавольных парубак, распаўсюджванне культуры на сяле і інш. Бязлітасна праследаваліся тыя, хто вырабляў самагон, знішчаючы тым самым хлеб і адурманьваючы насельніцтва.

Камбеды бралі на ўлік і перадавалі харчовым камітэтам паветаў лішкі хлеба, які рэалізоўваўся толькі па цвёрдых цэнах. Адносіны да камітэтаў беднаты былі дваякія: беднякі іх падтрымлівалі, кулакі, вядома, былі супраць. Праўда, як адзначалася 30 кастрычніка 1918 г. на VII надзвычайным з'ездзе Саветаў і камбедаў Чавускага павета ў выступленні Котава, мелі месца і некаторыя перагібы: «У межах Чэрвенскай воласці бываюць выпадкі, калі рэквізуюцца прадукты харчавання без спецыяльнага дазволу».

Камбеды садзейнічалі пераходу на бок Савецкай улады сераднякоў, упарадкавалі ўлік і размеркаванне хлеба, абясшкоджвалі многіх контррэвалюцыянераў.

У. Скульбедаў

СПІС ЧЛЕНАЎ ЛЮБІНІЦКАГА ВАЛАСНОГА ВЫКАНКОМА

ТРУБКИН Прохор Савастьянович, сочувствующий коммунистам-большевикам, председатель.

ПЕТРУШКИН Никита Якимович, большевик, зав. земотделом.

ГУРИНОВ Павел Самсонович, сочувствующий большевикам, казначей.

ИСАКОВ Иван Иванович, сочувствующий большевикам, член исполкома.

НАРБ, ф. 2037, воп. 1, спр. 16, л. 26.

ПРАТАКОЛ АГУЛЬНАГА СХОДУ ЗАБРОДСКАГА ТАВАРЫСТВА

22 кастрычніка 1918 г.

Собрались в полном составе 85 человек, в присутствии комитета деревенской бедноты деревни Забродье было разъяснено на полученную комитетом бумагу из Горецкого уездного исполкома... кто состоял или состоит большевиком, коммунистом или беспартийным... Единогласно признали быть сочувствующими большевикам и поддерживать Советскую власть.

Председатель *И. Жолудов*

Секретарь *С. Жолудов*

НАРБ, ф. 2037, воп. 1, спр. 16, л. 46.

* * *

Не прынёс спакою на беларускую зямлю год 19-ты. Не паспелі збавіцца ад нямецкіх захопнікаў, як навісла новая пагроза чужаземнага закабалення. На гэты раз яна зыходзіла ад буржуазнай Польшчы, за спіной якой стаялі магутныя сілы імперыялістаў ЗША і краін Заходняй Еўропы. У пачатку сакавіка польскія войскі ўварваліся ў межы Беларусі, за параўнаўча кароткі тэрмін захапілі заходнія і цэнтральныя раёны, а вясной 1920 г. нясцямі ўглыбіліся далёка на тэрыторыю Гомельшчыны і Магілёўшчыны. Польскія інтэрвенты нічым не адрозніваліся ад кайзераўска-германскіх. Зноў тэрор, рабаўніцтва, знішчэнне людзей і народнага багацця, што яшчэ засталося ад часоў імперыялістычнай вайны, нямецкай акупацыі, бандыцкіх налётаў атрадаў Доўбар-Мусніцкага, Булак-Булаховіча і іншых. Зноў давялося напружваць усе сілы на барацьбу з інтэрвентамі і іх белагвардзейскімі памагатымі, нацыяналістамі.

Жыхары Шклоўскай і другіх валасцей не заставаліся ў баку ад барацьбы. На фронт адпраўляліся мабілізаваныя камуністы і беспартыйныя патрыёты, у тым ліку члены камітэта РКП(б) і Шклоўскага выканкома Савета Спіцкі, Лабузноў, Шукальскі, Казінецкі, Катовіч. На фронт ішлі многія камсамольцы, маладыя рабочыя. «Соха и молот» пісала аб провадах шклаўчан 2 верасня: «Рано в 5 часов состоялось

прощальное торжественное собрание Компарта, Комола, членов фабзавкома г. Шклова. На собрании с кратким приветствием выступил от имени Компарта Коган (старшыня к-та РКП(б).— *Рэд.*). В приветствии всех выступивших была одна мысль, пролетариат не остановится ни перед чем, только бы сохранить свою Советскую власть. Потом строем все организации со знаменами и флагами направились на стн. Шклов». У баях з інтэрвентамі загінулі шклоўскія камсамольцы А. Качурын, А. Ерухімовіч, Л. Марголін. (На жаль, устанавіць імёны ўсіх загінуўшых пакуль не ўдалося.— *Рэд.*)

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

РАДКІ З ГАЗЕТ

Местечко Шклов Могилевской губ. С первых дней советской власти в местечке составился кружок любителей под режиссерством М. Макаровой, который задался просветительской целью; кружок вошел в ведение отдела народного образования и почти каждую неделю ставит спектакль. 26 января с. г. ставили пьесу Островского «Без вины виноватые». Пожелаем же успеха в этом благом начинании! Необходимо обратить особенное внимание на такие кружки, необходимо проникнуть в деревню, которая никогда не видела сцены и не имеет понятия, что такое «театр».

«Соха и Молот». 1919. 29 января.

III МАГІЛЁЎСКІ ГУБЕРНСКІ З'ЕЗД ПРАФЕСІЯНАЛЬНЫХ САЮЗАЎ

(Даклады з месцаў)

Шклов. Т. Флеер: Рабочих в Шклове насчитывается 1200 человек. На одной только писчебумажной фабрике находится 700 человек. Имеется и лесопильный завод. Писчебумажная фабрика не имеет своих представителей в Союзе профсоюзов. В Совет входит пять союзов: союз текстильщиков — 20 человек, объединенный союз рабочих, союз советских служащих, союз учителей и союз почтовых служащих. Особых комиссий, кроме комиссии по проверке трудящихся при союзах, не существует. Пока Совет объединяет 800 членов профсоюзов, но за последнее время цифра стала сильно расти.

Вступительный взнос 50 коп. Месячный членский взнос 1% зарплаты. Безработных членов профсоюзов насчитывается 120 человек. Страховой кассы нет. На писчебумажной фабрике имеется больничная касса. Тарифных ставок нет. Советские служащие имеют очень низкие тарифы, как и в волости, между тем Шклов насчитывает 15 тыс. населения. На днях открывается рабочий кооператив. Работа в Совете профсоюзов только в стадии налаживания.

«Соха и Молот». 1919. 15 января.

ДАКУМЕНТЫ СВЕДЧАЦЬ

У Дзяржархіве Магілёўскай вобл. ёсць дакументы, якія характарызуюць стан Шклоўскай папяровай фабрыкі «Спартак» у гады ўсталявання савецкай улады, яе ролю ў развіцці прамысловасці рэспублікі, звесткі па гісторыі прадпрыемства.

У дакладзе дырэктара-распарадчыка фабрыкі юрыста М. С. Айзенштадта (лістапад 1918 г.) указана, што фабрыка спачатку выпускала кардон і абгортачную паперу. Сябе не апраўдвала і была прададзена гандлёваму дому Валенберга і К°, а Крывашэін увайшоў у справу як удзельнік. 15 кастрычніка 1906 г. фабрыка была прададзена акцыянернаму таварыству рускай кардоннай і картанажнай вытворчасці, а затым здадзена ў арэнду Г. Н. Гарнштэйну. З 1910 г. пачынаецца расшырэнне вытворчасці, фабрыка пераходзіць на атапленне вугалем, устанаўліваецца дадатковае абсталяванне — паравыя катлы, два дызельныя маторы па 600 конскіх сіл кожны. Аднак даход ад прадпрыемства быў нязначны, і ў 1914 г. Гарнштэйн перадаў яго акцыянернаму таварыству, якое знаходзілася ў Петраградзе. Праўленне таварыства ведала продажам паперы, займалася забеспячэннем фабрыкі сыравінай і матэрыяламі. Мела значныя сродкі і шырока субсідзіравалася банкамі. Гэта дало магчымасць паставіць вытворчасць так, што фабрыка ў хуткім часе заняла адно з першых месцаў сярод папяровых фабрык Расіі. Яна стала выпускаць розныя гатункі паперы, пачынаючы з тонкай папяроснай (філігран) і канчаючы газетнай і грубай абгортачнай.

Фабрыка састаяла з аддзяленняў: анучасартыровачнага, ануча-прамыўнога, рольнага, папяровых машын, пакамернага і апаратурнага. Яна мела наступныя падсобныя цэ-

хі: слясарны, такарны, цяслярны, мулярны, ліцейны. Упраўленне фабрыкі складалі аддзелы: продажу, бухгалтарска-фінансавы, забеспячэння, які дзяліўся на пададдзелы: забеспячэння палівам, сыравінай і матэрыяламі.

Займаемая плошча прадпрыемства складала 20 дзесяцін, на якіх размяшчаліся вялікі фабрычны корпус, 5 драўляных і 1 мураваны дамы, школа для дзяцей рабочых, амбулаторыя, 2 магазіны, кааператыўная лаўка, іншыя гаспадарчыя пабудовы.

На фабрыцы працавала (у 3 змены) 500 рабочых і 53 служачых (лістапад 1918 г.). За месяц яны выпускалі 2200 пудоў папяроснай паперы і 2600 — курыльнай. Абсталяванне складалася з 5 паравых катлоў, 6 паравых машын, 2 дызель-матораў, 3 генератараў, 3 папераробчых машын, якія выпускалі ў суткі па 400 пудоў газетнай і пісчай паперы або па 700 пудоў абгортачнай, па 100 пудоў курыльнай паперы.

Пастановай калегіі Галоўнага ўпраўлення прадпрыемствамі па папяровай прамысловасці ў снежні 1918 г. усе справы, капіталы і іншая маёмасць фабрыкі былі аб'яўлены ўласнасцю РСФСР.

«Ударны фронт». 1963. 23 сакавіка.

* * *

На Шкловской бумажной фабрике непрерывно 144 часа в неделю работает 600 рабочих, разделившись на три смены. Основное ядро фабрики — это немногим меньше половины общего числа, мужчины — рабочие с 20 до 45-летнего возраста. Остальную часть работающих составляют женщины и небольшое число подростков.

Довольно тяжелое экономическое положение рабочих. Средний заработок рабочего 20 — 22 руб. в день. Можно себе представить, каковы условия существования многосемейных рабочих при теперешней дороговизне и несмотря на то, что многие рабочие уже успели в м. Шклове, приобретя небольшое «хозяйство», в том числе и коровенку, несносность их существования доходит до крайних пределов...

«Соха и Молот». 1919. 1 февраля.

АДЗІН З ПЕРШЫХ

Пра кіраўнікоў папяровай фабрыкі «Спартак», у тым ліку пра яе заснавальніка А. Крывашэіна, нямала сказана. А вось пра Аляксеева вядома толькі прозвішча. Ён адзін з першых кіраўнікоў фабрыкі савецкага часу. Быў прызначаны дырэктарам у 1931 г. пасля пажару на прадпрыемстве. Пад яго кіраўніцтвам папернікі дасягнулі значных поспехаў, пастаянна перавыконваючы даводзімыя заданні.

...Аляксееў 20-гадовым хлопцам пайшоў працаваць на адну з папяровых фабрык Пецярбурга. У 1914 г. рабочыя часта баставалі. Аляксееў таксама быў у іх радах, за што і быў зволены з фабрыкі. Давялося перайсці на тэкстыльную фабрыку. Але доўга на ёй не папрацаваў, бо стаў радавым царскай арміі.

Бурныя падзеі 1917 г. у Расіі заспелі яго ў Румыніі ў дзеючай арміі. Быў непасрэдным удзельнікам Кастрычніцкай рэвалюцыі. Неўзабаве Аляксееў зноў вяртаецца на папяровую фабрыку. Тут у студзені 1918 г. ён актыўна ўдзельнічае ў стварэнні атрадаў Чырвонай гвардыі. Сам прызначаецца камісарам кулямётнай каманды па змаганні з контррэвалюцыянерамі. Давялося ваяваць з белапалякамі, змагацца з бандытамі ў 1921—1922 гг. у Тамбоўскай і Варонежскай губернях.

Працуючы ў Шклове, Аляксееў становіцца ініцыятарам будаўніцтва новага цэха па выкарыстанні адходаў ільнопрадукцыі для вырабу паперы. У 1938 г. уступае ў строй новы цэх па перапрацоўцы драўлянай масы. Дзякуючы павышэнню прадукцыйнасці працы прырост зарплаты з 1930 па 1933 г. склаў 37%. Калектыў фабрыкі атрымаў Усесаюзную прэмію ў суме 10 тыс. руб. Яна была выкарыстана на паляпшэнне культурна-бытавых умоў рабочых. За 3 гады пабудаваны трохпавярховы дом на 36 кватэр, дзіцячыя яслі, сталовая, была свая прыгарадная сельская гаспадарка. 76 рабочым пажылога ўзросту дадзены дадатковыя адпачынкі да 12 дзён.

М. Ільюшэнка. «Ударны фронт». 1987. 8 верасня.

ПАВЯТОВЫ З'ЕЗД САВЕТАЎ
(Даклады з месцаў)

Шкловская волость.

Тов. Спицкий: К нашей волости принадлежат 29 деревень с 18-тысячным населением. Исполком был организован через 1,5 месяца после реоккупации...

Наличие сельхозинвентаря: молотилок конных с приводом — 263, соломорезок — 188, плугов — 7902, борон пружинных — 125, окучников — 188. За 1925 г. закупки сельхозинвентаря и улучшенных семян зерновых культур и посевных трав по сравнению с довоенным периодом несомненно увеличились...

За последние три года середняцкая группа хозяйств увеличилась преимущественно за счет верхушки старой деревни, с притоком служилого элемента. С уменьшением земли эта часть зажиточной группы первая взяла курс на повышение товарности в хозяйстве.., с применением ростовщичества и частного кабального кредита, прячась под рубрику середняка. Наряду с этим еще больше увеличилась бедняцкая группа хозяйств...

Хлеба не хватает главным образом у бедняцкой группы хозяйств. Самой бедняцкой части — до так называемого Рождества, а маломощной — до Пасхи. Незначительная часть середняцких хозяйств при недостатке хлеба, особенно в зимний период, комбинирует другие продукты, которые у бедняка отсутствуют...

Животноводство (по данным Окрстатбюро за 1925 г.): рабочих лошадей — 9219, лошадей до 3 лет — 2275, быков старше 2 лет — 99, коров — 11 157, подтелков и бычков до 2 лет — 3878, телят до 1 года — 3709, овец — 4590, ягнят — 16 350, коз и козлов — 150, свиней старше 4 месяцев — 13 630, поросят до 4 месяцев — 8962. Всего — 83 999.

По сравнению с довоенным временем количество рабочего и крупнорогатого скота увеличилось благодаря увеличению числа хозяйств и развития травосеяния, а также общей тяги населения к товарности в сельском хозяйстве; количество свиней и овец уменьшилось из-за свирепствующей чумы и сибирской язвы.

В 1925 г. имелось хозяйств без рабочего скота — 11,21 %, с единицей рабочего скота — 75,49 %, хозяйств без коров — 6,1 %, с одной коровой — 66,49 %, с двумя — 25,16 %, с тремя — 1,65 %, с четырьмя — 0,55 %...

В районе в крестьянских хозяйствах имелось 181 десятина садов, в Госфондах — 90 десятин, из коих 8 десятин — в распоряжении Черноручского садово-огородного товарищества... В 1925 г. в районе имелось пчелоульев рамочных — 232 и колодных 594...

* * *

Сельскохозяйственное кредитное товарищество с закупочно-бытовыми и снабженческими пунктами имелось одно — в Шклове (1470 членов). В 1926 г. организовано Лутнянское сельскохозяйственное машинное товарищество (15 членов). Имеется Лутнянская молочная артель (20 пайщиков) и Карасевская сыроваренная (19 членов), Черянское пчеловодное товарищество (27 пайщиков), садово-огородное товарищество в бывшем имении Черноручье (5 пайщиков)...

Кооперировано по кредитному товариществу 14 % крестьянских хозяйств, в том числе бедняков — 60 %, середняков — 25 %, зажиточных — 15 %.

Совхозов в районе нет. Колхозы, коммуны и артели. В районе — 2 артели, одна еврейская земледельческая артель «Спартак» (на месте бывшей фабричной фермы). Артель занимает 170 десятин земли (пахотной — 130, усадебной — 4 и луга — 36 десятин). В артель вошло 14 семейств с 69 едоками.

Вторая артель «Гавриловка», образованная с 1923 г. в бывшем имении Гавриловка в порядке землеустройства на площади 42 десятины земли. В состав артели входят 8 семейств с 32 едоками.

В артель «Спартак» вступило 70 % трудового еврейского населения Шклова и 30 % нетрудового элемента, живущего в городе в собственных домах и частных квартирах, до сего времени занимающихся торговлей. В артель «Гавриловку» вошли семейства, собравшиеся из разных деревень (беднота и демобилизованные красноармейцы)...

Отношение крестьянского населения к артелям отрицательное, так как население района за весь период революции не видало ни одного примерного сельскохозяйственного объединения в районе.

Отношение артелей к кооперации потребительское, не имеющее между собой нужной связи о сбыте и закупке сельхозпродуктов и промышленных товаров.

В феврале 1926 г. райисполкомом вынесено постановление: «Гавриловку», как не имеющую никаких перспектив на возобновление артельного труда, ликвидировать, прося ОкрЗо артель перевести в поселок, землеустроить ее по минимальной норме с отводом усадебных мест и широких полос.

Объективным показателем к упрочению молодой еврейской артели «Спартак» имеется: 1) стремление к обработке земли без наемного труда; 2) быстрый рост сельхозинвентаря; 3) наличие приобретенного оборудования для развития производственной части хозяйства...

Откупленный артелью «Спартак» от бывшей фабричной фермы урожай на корне за 1925 г., по сравнению с крестьянским, стоял несколько выше. Культурные приемы выражаются в многолетнем севообороте, культивировании семян, разведении племенного и молочного скота и применением обработки земли более усовершенствованным сельхозинвентарем, за исключением трактора.

Отдельные хозяйства артели «Гавриловка» ничем не отличаются во всей своей жизни от маломощных крестьянских хозяйств...

Райисполком к поднятию существующих артелей и организации новых практических мер не принимал...

Лесное хозяйство. Общая площадь лесов, включая и леса местного значения, — 20088,43 десятин. Потребность в строевом лесе удовлетворяется на 40 %, в дровяном — на 70 %... Переданные местному населению леса обеспечат их потребность на 60 % в топливе и на 25 % в строевом поделочном материале.

Промышленность.

1. Писчебумажная фабрика «Спартак». В довоенное время работала при 3 бумажных машинах. По имеющимся данным за 1913 г. выработано разной бумаги 345,224 пуда. Рабочих было 602 человека, из них на древомассом заводе — 61 человек. Средний заработок квалифицированного рабочего — 25—30 руб., неквалифицированного — 15—20 руб. В настоящее время за 1924/25 бюджетный год выработано разной бумаги 243,884 пуда. Рабочих — 686 человек и временных — 24 человека, средний заработок квалифицированного рабочего — 50—55 руб., неквалифицированного — 25—30 руб. Фабрика работает при 3 бумажных машинах; недогрузка их примерно на 15—20 % идет главным образом за счет плохого состояния силового хозяйства.

2. **Шкловская паровая мельница** при фабрике «Борьба», находящаяся в арендном пользовании граждан С. Хатиновера и Шифрина. Рабочих на мельнице 5 человек, средний заработок 30—50 руб. Мельница перерабатывает от 600 до 800 пудов зерна при рабочем 8-часовом дне за одну смену. Зерно доставляется крестьянами окрестных деревень.

Лесопильный завод при фабрике спичечной соломки «Борьба», при котором работает мельница, бездействует из-за отсутствия и дороговизны лесоматериала (осина).

3. **Электростанция** оборудована и пущена в Шклове 18 марта 1925 г. Рабочих — 3 человека. Обслуживает местное население (квартиры и учреждения). Двигатель-дизель 60 л. с.; динамо-машина переменного тока завода «Унион-Берлин», 40 киловатт.

4. **Старошкловская паровая мельница** (в арендном пользовании артели «Красный мукомол»). Рабочих — 7 человек. За сутки перемалывается на одном поставе около 700 пудов зерна крестьян окрестных деревень.

5. **Шкловская турбинная мельница «Пролетарий»,** эксплуатируется РИКом. 16 рабочих. Выработка до 300 пудов в сутки при работе одного постава.

6. Ржавцевская водяная мельница.
7. Заречно-Шкловская мельница.
8. Путниковская мельница.

9. Вильяново-Погостская мельница.
10. Даньковичская мельница.
11. Чирчинская мельница.
12. Городищенская мельница.
13. Троицкая мельница.

Кустарно-ремесленная промышленность. По Шклову: сапожных промыслов — 42 (50 чел.), портняжных — 19 (33 чел.), кузнечных — 17 (23 чел.), слесарных — 9 (15 чел.), булочных — 6 (17 чел.), парикмахерских — 14 (20 чел.), шапочных — 7 (9 чел.), волночесных — 5 (10 чел.), мукомольных — 1 (7 чел.), крупорушек — 1 (5 чел.), колбасных — 3 (6 чел.), красильных — 2 (4 чел.), кожевенных — 7 (7 чел.), колесных — 1 (1 чел.), столярных 3 (3 чел.), кирпичных — 1 (1 чел.), фотографий — 2 (2 чел.), часовых дел — 2 (2 чел.), шорных — 2 (2 чел.), заготовочных — 3 (3 чел.); итого: 147 (220 чел.). **По сельской** местности: рыболовных и охотничьих — 6 (6чел.), кирпичных — 2 (4чел.), гончарных — 146 (156 чел.), кузнечных — 33 (44 чел.), столярных — 17 (17 чел.), бондарных — 13 (13 чел.), санных — 18 (18 чел.), колесных — 27 (29 чел.), мукомольных — 22 (31 чел.), сальников — 19 (19 чел.), овчинных — 6 (8 чел.), волночесных — 6 (13 чел.), портняжных — 51 (56 чел.), сапожных — 43 (47 чел.), слесарных — 5 (5 чел.), лыжных — 8 (8 чел.); итого — 424 (476 чел.).

По г. Шклову с 1924 г. существует общество кустарей — 122 члена, в состав коего входят 5 артелей, зарегистрированных в ВСНХ БССР, и трудколлектив швейников — 28 человек при Могилевском отделе труда, всего объединено 59 человек. Остальные члены об-ва работают в одиночку.

* * *

Безработных по району 88 человек. Учтено 160 батраков и батрачек. Средний заработок батрака — 40 руб. в год.

* * *

По состоянию на 1 января 1926 г. в районе имелось 8 потребкооперативов, из них в городе — потребобщество «Селянін» с тремя лавками, обслуживающие 15 деревень, а остальные 7 кооперативов расположены в Городище, Бращино, Высоком, Б. Лозицах, Слижах, Черноручье и Любиничах. Всего в сельских кооперативах 2138 пайщиков, что составляет по отношению к 8927 сельским хозяйствам 23,9 %.

* * *

Городское и сельское благоустройство и строительство находится в разрушенном и запущенном состоянии. Шкловской больнице угрожает снятие электроосвещения из-за отсутствия средств на оплату. Водоснабжение — кроме колодцев — отсутствует. Новое строительство в городе — здание Дома культуры и частичный ремонт для учреждений...

Культура. В прошлом году в районе имелось 53 школы при 93 комплектах, в настоящем — 56 школ, из них одна семилетка, а остальные — четырехлетки. Охвачено детей школьного возраста 56 %. Число комплектов — 102. Имеется 4 гос. избы-читальни, 1 народный дом, 1 райбиблиотека, 2 клуба при фабрике «Спартак» и «Борьба» и гортеатр в Шклове. В сети политпросветучреждений имеется, кроме того, 17 ликпунктов, красные уголки и чтецкие пункты. На 1 января по району считается в среднем на 4,6 двора одна газета... В Шклове имеется нарбольница, рабочая амбулатория и врачебно-акушерский пункт. Врачебные пункты имеются в Городище, Черноручье.

НАРБ, ф. 6, воп. 1, спр. 862, лл. 195—265.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

* * *

У 1925 г. у раёне дзейнічала 272 гандлёвых прадпрыемствы, у тым ліку дзяржаўных — 6, кааператыўных — 49 і прыватных — 217.

У 1927 г. камітэты сялянскай узаемадапамогі аб'ядноўвалі звыш 80 працэнтаў сялянскіх двароў раёна.

* * *

У 1928 г. у раёне арганізавана 5 калектыўных гаспадарак і 2 камуны: «Ільіч» — на землях памешчыка Рубаноўскага і імя Молатава — у в. Лутня. Узбуйнілася яўрэйская сельгасарцель «Іскра». Да канца 1929 г. было створана 29 калгасаў з агульнай зямельнай плошчай 5 тыс. га.

«Ударны фронт». 1977. 4, 9, 16 жніўня.

* * *

У 1928 г. з шасці бядняцкіх гаспадарак быў створаны калгас «Гарадок», які меў 140 га зямлі.

* * *

Вясной 1929 г. у в. Сарціслаў арганізаваны калгас «Прамень камунізму». Аб'ядноўваў 25 гаспадарак, меў 215 га зямлі ворнай і 15 — сельгасугоддзяў. Першым старшынёй праўлення быў мясцовы бядняк Іван Марозаў. У гэтым жа годзе арганізаваўся і калгас імя Леніна ў в. Рыжкавічы. Меў 105 га палявой, 21 га гароднінай зямлі і 12 — сенакосу. У калгасе пабудавалі кузню, узвялі цагельны завод і свінарнік на 50 галоў, распачалі будаўніцтва малочнай фермы на 200 кароў.

«Ударны фронт». 1977. 16 жніўня.

Датэрмінова адведзены

На пленуме Шклоўскага местачковага савета за бяздзейнасць у справе калектывізацыі выведзены са складу сяброў сельсавета тт. Коша, Какушка, Смаргуноў, Куткевіч, Данкевіч, Алёна Адзесава, Маісееў і Новікаў, а сябру сельсавета Аўдакову вынесена вымова. Замест тых, хто стаяў у баку ад працы па арганізацыі калгаса, абраны сапраўдныя змагары за правядзенне калектывізацыі.

Н-скі

Сельсавет абараняе эксплуататараў

Акунёўскі сельсавет у сваёй практычнай рабоце захоўвае кулакоў ад выканання перад дзяржавай тых абавязкаў, якія вызначаны нашым урадам у адносінах да тых, хто карыстаецца найміцкай сілай.

Кулакі з вёскі Царковішча Тарасаў З. і Кірылаў Ігнат, якія трымалі батракоў на працягу года, невядома па якой прычыне абкладзены сельгаспадаткам у індывідуальным парадку. Старшыня сельсавета наўмысна не звярнуў на гэта ўвагі. Трэба выправіць памылку Акунёўскага сельсавета і вінаўных прыцягнуць да адказнасці.

Пяро селькора

«Камунар Магілёўшчыны». 1930. 28 лютага.

З актаў абследавання арцеляў

У снежні 1925 г. прэзідыум Магілёўскага акружнога выканкома прыняў пастанову аб абследаванні калектыўных гаспадарак акругі на вызначэнне іх рэнтабельнасці. Захавалася некалькі актаў камісіі па абследаванні сельскагаспадарчых арцеляў на Шклоўшчыне. Так, камісія прадстаўнікоў акрвыканкома зрабіла абследаванне стану гаспадаркі арцеляў «Спартак» і «Гаўрылаўка».

Сельскагаспадарчая арцель «Спартак» была арганізавана па ініцыятыве мясцовага насельніцтва і атрымала ў карыстанне 170 дзесяцін зямлі, з якіх пад сенакосам было 37 дзесяцін, пад садам — 21 дзесяціна. Ужо на пачатку, у першыя месяцы існавання арцелі, у яе ўваходзіла 14 сем'яў сялян, якія жылі ў Шклове. Члены арцелі закупілі абсталяванне і пачалі будаўніцтва сукнавалкі і маслабойкі.

Ворная зямля, адведзеная для арцельнага карыстання, была добрая. Заліўны луг даваў да 250 пудоў сена з дзесяціны, але частка яго была забалочана. Таму члены арцелі ставілі пытанне перад райвыканкомам аб правядзенні меліярацыйных работ.

Уся жывёла была абагульнена. Кармілі яе сенам і бульбай і ўтрымлівалі ва ўзорным стане. Будынкі былі ўцеплены і абсталяваны. Ураджай, малако, мяса і іншыя сельгаспрадукты дзяліліся паміж членамі арцелі па едаках, а іх было 69. Сяляне з задавальненнем працавалі ў сваёй калектыўнай гаспадарцы, паказваючы добры прыклад сваім землякам, яшчэ не ўступіўшым у арцель.

Праверыўшы стан арцелі, камісія пастанавіла: «Для правільнага, хутчэйшага развіцця гаспадаркі арцелі патрэбны крэдыты: на племянную і прадуктыўную жывёлу 10 550 рублёў, сельскагаспадарчыя машыны і прылады — 1075 рублёў, на меліярацыю — 5000 рублёў, на тэхнічныя мерапры-

емствы — 7500 рублёў». Райвыканкому было даручана «ўдзяліць арцелі больш увагі ў яе паўсядзённай рабоце і аказаць садзейнічанне ў вырашэнні кватэрнага пытання, назіраць за своечасовым рамонтам дзяржпабудоў».

Арцель «Гаўрылаўка» была створана ў 1923 г. на землях былога памешчыка. У яе ўвайшло 8 сем'яў з 32 членамі-едакамі. Ім было адведзена 42 дзесяціны зямлі, з якіх пад сенакосам — 7,75 дзесяціны. Луг быў забалочаны і знаходзіўся каля вёскі Бабчына.

Ні дзяржаўных пабудоў, ні сада арцель не атрымала. Члены яе пасяліліся на абрэзках садова-агароднай гаспадаркі Гаўрылаўка і пачалі забудоўвацца — узвялі 6 дамоў і некалькі хлявоў. «Восем сем'яў сабраліся з розных вёсак, — гаварылася ў акце камісіі, — крайняя беднота, якая служыла ў Чырвонай Арміі. Жывуць зусім бедна, бо сяло спустошана былымі карыстальнікамі — арэндатарамі і аднавіць яе ўрадлівасць арцель пакуль не змагла. У пачатку арганізацыі пробавалі грамадскае заворванне, але з гэтага нічога не выйшла з-за адсутнасці патрэбнага інвентару, машын».

І ўсё ж, нягледзячы на крайнюю беднасць членаў арцелі, на адсутнасць вопыту, недахоп матэрыяльных сродкаў, наяўнасць у многіх членаў арцелі старых прыватніцкіх звычак, калектыўны рух ужо тады развіваўся хуткімі тэмпамі, сяляне бачылі ў сваім аб'яднанні адзіны выхад са сваёй вечнай галечы.

К. Свасціна. «Ударны фронт». 1981. 10 сакавіка.

РАСКУЛАЧВАННЕ ПА ЦЯЛЬНЯШКІНУ

Іншы з усіх бакоў вяскоўцы і хутаране. Усе яны накіроўваліся да хаты-чытальні — былой сядзібы раскулачанага і высланага хутаранiна Апанаса.

Блізіўся час пачатку сходкі. І вось на ганак выйшаў старшыня сельсавета Цяльняшкін, якога ўпотай называлі «сучкай», бо ён быў здатны кусаць кожнага і вельмі балюча. Прывітаўшыся з сялянамі, запрасіў іх заходзіць у памяшканне. Потым пачаў рабіць пераклічку. Выявілася, што на сход не з'явіліся Ігнат Глінка і Аляксей Пістратаў. Тут старшыня паклікаў да сябе сакратара камсамольскай ячэйкі Ваську Суворукава па мянушцы «Герчык» і даў заданне сёння ж напісаць на варотах або дзвярах дамоў кожнага з іх вялікімі літарамі «сабатажнік». Слова, якога баяліся сяляне больш самага моцнага разраду маланкі ў летнюю навальніцу.

...Слова бярэ Цяльняшкін. Ён гаворыць, што вышэйстаячыя ўлады давялі план раскулачыць з высылкай на Урал яшчэ адну гаспадарку. Ёсць намер выслаць Смольскага Аляксандра, бо ён у пазамінулым годзе карыстаўся працай наёмнага батрака.

Цішыня. Толькі ўсхліпванне жанчын пачулася ў зале.

— Хопіць! Масква слязам не верыць, — пагрозліва сказаў старшыня. — Мы зробім гэта ў пяцідзённы тэрмін.

Тут з лаўкі падняўся Смольскі і дрыжачым голасам пачаў:

— Дарагія мае аднавяскоўцы, даруйце мне, калі я перад вамі вінаваты. Я сапраўды наймаў у работнікі Сямёна Ваўка з Галабурд, але ж без яго засталося б не засеянае поле. А ў мяне вялікая сям'я, і кожны хоча есці. Памілуйце, не губіце дзяцей.

— Хопіць, кулацкае адроддзе! Пазбаўляю цябе слова, — грымнуў старшыня і звярнуўся да прысутных: — Па вашых тварах бачу, што згодны з нашым рашэннем. Галасаваць не будзем.

Прысутныя, наадварот, былі не задаволены такім рашэннем, бо ведалі, што раскулачванню падлягаў другі гаспадар, які жыў таксама, як і Смольскі, у Кашчэеўцы. У яго было 7 кароў, трое коней, шмат іншай дробнай жывёлы і птушкі.

— Але ж Андрэеў з радні Цяльняшкіну, і ён вырашыў замяніць яго Смольскім. Так сумна закончылася барацьба з кулацтвам у нашай вёсцы, — прыгадвала бабка Агрыпіна, з вуснаў якой запісаны гэты расказ.

...Дзень выдаўся цёплы, сонечны, па-сапраўднаму майскі. Каля хаты Смольскіх сабралася шмат народу. Людзі прыйшлі праводзіць у далёкую дарогу аднавяскоўцаў. Нябачна было на двары толькі Андрэевых, самых блізкіх суседзяў гаротнікаў.

Неўзабаве з'явіўся Цяльняшкін з узброеным міліцыянерам.

У сям'і Смольскіх было 9 дзяцей. Старэйшай з іх Надзеі — 17, а самай малодшай не споўнілася яшчэ і двух гадоў. Пры зборах людзі бачылі, што ў ад'язджаючых нават няма ўдосталь хлеба на дарогу. А калі дзяцей пачалі апранаць, то выявілася, што на ўсю гэтую араву знайшлося толькі тры пары лапцей.

Неўзабаве міліцыянер даў загад запрэгчы ў калёсы адзінага Аляксандравага каня, каб

адвезці сям'ю выгнаннікаў у Шклоў на чы-
гунку. На калёсы пагрузілі небагаты скарб,
пасадзілі малых дзяцей і сталі чакаць тых,
хто абяцаў прынесці са сваіх двароў сёе-тое,
каб папоўніць «багацце» раскулачанага.

Калі падалі каманду ехаць, пачалося та-
кое, чаго ніхто не мог прыпомніць са свайго
жыцця. Жанчыны падыходзілі да Малан-
ні — маці абяздоленай сям'і. Яны развіт-
валіся і плакалі больш чым па нябожчыку.
Дзеці на возе і каля яго паднялі таксама
страшэнны лямант.

Перш чым адправіцца ў дарогу, Цяль-
няшкін загадаў прынесці дошкі, малаток,
цвікі, і сам пачаў забіваць вокны накрыж.
Раздаваўся раздзіраючы душу стук малатка,
які апавяшчаў Смольскім, што яны тут ужо
не гаспадары.

Павольна перастаўляла ногі замучаная
працай кляча, а побач з ёй ішлі аднавяскоў-
цы. Калі даехалі да мяжы Аляксандравай
зямлі і суседа Сяргея, спыніліся. Аляк-
сандр і Малання апусціліся на калені, па-
цалавалі зямлю, пакланіліся натоўпу.
Жанчына-гаротніца роспачна прамовіла:

— Бывай, радзіма, наша родная зямля
і наш дом. Бывайце, добрыя людзі...

І. Сіверын. «Ударны фронт». 1990. 22 лістапада.

ЧЫСТКА ПАРТЫІ ПА ШКЛОЎСКАМУ РАЁНУ

Чыстка пачалася з 10 ліпеня 1929 г. Пра-
вяркомам сумесна з РК КП(б)Б выпрацава-
ны план, які шырока абвешчаны насельніцт-
ву, а таксама правярком звярнуўся да на-
сельніцтва з адозвай аб удзеле ў чыстцы.
У горадзе, на чыгунцы і на фабрыцы «Ба-
рацьба» вывешаны скрыні для заяў. Па вёс-
ках расклеены аб'явы.

Да 16 ліпеня 1929 г. праверана тры ячэй-
кі з лікам 18 сяброў і кандыдатаў партыі.
Насельніцтва досыць добра папярэдне аз-
наёмлена з прадстаячай чысткай.

З 18 праверэных выключана з радоў парт-
ыі — адзін сябар і два кандыдаты, ад-
носна двух — справы перадаюцца ў АКК з-за
няяўкі іх на праверку (Фашчаўская ячэй-
ка — Лабкоўскі і Лукашоў, яны кандыдаты
на выключэнне). Выключаны: Парцянка
Апанас, сябар партыі (Гарадзішчанская
ячэйка) — за п'янства з кулаком і былым
папом, за сакрыццё свайго маёмаснага стано-
вішча, раней у вёсцы займаўся гандлем, меў
краму, не карыстаецца аўтарытэтам сярод
сялянства. Біндзераў і Камедаў (Гарадзец-
кая ячэйка) — за непраяўленне дастатковай
ініцыятывы па арганізацыі калектыву, у
якім яны састаялі, за склоку паміж сабой,
з прычыны чаго калектыў распаўся, за анты-
сімітызм і несправядлівае атрыманне
льгот. Камедаў (як старшыня КС) — за не-
законны вобыск і Біндзіраў — за рэлігійны
абрад хрышчэння дзіцяці.

Накладзены партспагнанні: Крупеньку
(Фашчаўская ячэйка) — за выпіўку і неда-
статковую барацьбу з самагонаварэннем —
аб'яўлена вымова. Бруеву (Гарадзецкая
ячэйка) — за цяганіну па справе перадачы
з земфонда — аб'яўлена вымова. Пабядзін-
скаму — за непрыняцце дастатковых мер су-
праць утварэння ў яго сям'і рэлігійнага аб-
раду хрышчэння — пастаўлена на від.

Трэба адзначыць, што сялянства, не сум-
няваючыся, гаворыць аб недахопах у працы
нашых партыйцаў (аб Парцянку выказалася
15 чалавек), але ў некаторых ячэйках самі
партыйцы на сходах маўчаць аб недахопах
і паводзінах сваіх жа таварышаў.

«Магілёўскі селянін». 1929. 21 ліпеня.

З ПРАТАКОЛА БЮРО ЦК КП(б)Б

ад 16.05.1931 г.

1. Лічыць неабходным высяленне кулакоў праводзіць с 1 чэрвеня 1931 г., у першую чаргу раскулачаных.
2. Лічыць неабходным паслаць усім РК і гаркомам КП(б)Б зачынены дырэктыўны ліст аб высяленні кулакоў... (Знайсці ліст не ўдалося.— *Рэд.*)

НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр. 41, ч. 3, л. 797.

СА СХОДУ ПАРТАКТЫВУ РАЁНА

11 сакавіка 1931 г.

...Прыняць крокі к недапушчэнню самавольнага разбору інвентара, насення і жывёлы шляхам шырокай растлумачальнай работы сярод батрацка-бядняцка-серадняцкай масы, адначасова ўзмацніць барацьбу з рознымі кулацкімі і іншымі варожымі дзеяннямі...

Шырока разгарнуць работу па абагульненні рабочай жывёлы згодна статуту. Дабіцца таго, каб поўнасцю забяспечыць знаходжанне ў калгасе ўсіх бядняцка-серадняцкіх гаспадарак, раней запісаўшыхся ў калгас...

Не паслабляць работу па ачыстцы калгасаў ад кулацкіх і варожых элементаў.

НАРБ, ф. 4, воп. 3, спр. 34, ч. 3, л. 1095.

* * *

Нягледзячы на «крутыя» меры зніжэнне колькасці калектывізаваных гаспадарак працягвалася. Па Магілёўскай акрузе ў цэлым у сакавіку 1931 г. — з 70,6 да 19,2 %.

Тамсама, л. 1123.

Нягледзячы на тое, што патрэбнай матэ-
рыяльнай і псіхалагічнай асновы для па-
спяховага правядзення калектывізацыі не
было, тым не менш, абапіраючыся на мэтады
прымусу, у рэспубліцы на 1 сакавіка
1930 г. калектывізавалі 457,7 тыс. сялян-
скіх гаспадарак, ці 58 % іх агульнай коль-
касці. А ў 30 раёнах працэнт калектывіза-
цыі дасягнуў 86 %. У Магілёўскай акрузе,
у якую ўваходзіў Шклоўскі раён, гэты пра-
цэнт перавысіў 80. Такія тэмпы далі пад-
ставу кіраўніцтву рэспублікі лічыць, што
да канца 1930 г. уся Беларусь стане поўнас-
ці калектывізаванай. Зыходзячы з гэтага,
10 лютага 1930 г. яно звярнулася ў ЦК
ВКП(б) з дакладной запіскай, у якой прасіла
ўключыць БССР у лік раёнаў буйнога
абагульнення сельскай гаспадаркі і абвяс-
ціць яе рэспублікай суцэльнай калектывіза-
цыі.

З гэтага, аднак, нічога не атрымалася. Ужо
ў канцы лютага — пачатку сакавіка па рэс-
публіцы пачалі адзначацца сялянскія хва-
ляванні, масавыя выхады са штучна ствара-
ных калектыўных гаспадарак, разбіранне
абабяржаўленай маёмасці. Пасля ж артыку-
ла І. В. Сталіна «Головокружение от успе-
хов», які быў надрукаваны 2 сакавіка
1930 г., інтэнсіўнасць адтоку з калгасаў
нават больш узрасла. Кіраўніцтву рэспубліі
давялося тэрмінова мяняць лявацкую так-
тыку «кідка ў камуну», а пасля сталінскага
артыкула і адпаведных пастаноў ЦК
ВКП(б), калі пачаўся афіцыйны адыход ад
праводзімага курса, шукаць вінаватых у пе-
рагібах.

У ліку такіх вінаватых аказалася кіраў-
ніцтва Шклоўскага раёна, якое не толькі
імкнулася стрымаць выхады сялянскіх гас
падарак з калгасаў, але і паспрабавала віну
за «заскокі» ўскласці перш за ўсё на вышэй
шых кіраўнікоў з Мінска і Масквы. Аба-
піраючыся на актыў, раённае кіраўніцтва
афіцыйна заявіла, што адступленне нанясе
значна большую шкоду, чым тое, што ўжо
зроблена шляхам ціску на сялян. На па-
сяджэнні пленума РК КП(б)Б рэспубліка
скае партыйнае кіраўніцтва было абвінава
чана ў тым, што яно прымае рашэнні, не
абгаварваючы іх папярэдне ў нізавых пар
тыйных калектывах, а потым гэтыя калек
тывы абвінавачваюцца ў правалах. Кры
тычныя заўвагі, хоць і ў стрыманай фор
ме, былі выказаны і па артыкулах Ста
ліна.

Напалохаўшыся магчымых вынікаў, пер
шы сакратар ЦК КП(б)Б К. В. Гей патраба
ваў тэрмінова абмеркаваць становішча ў
Шклоўскай партыйнай арганізацыі на па
сяджэнні бюро ЦК КП(б)Б. Райком парты
быў распушчаны, яго лінія кваліфікавана
як апартуністычная. Пасля пасяджэння ён
накіраваў І. В. Сталіну спецыяльны ліст,
у якім інфармаваў аб прынятых мерах па
кіраўніцтву раёна і запэўніў у адданасці
генеральнай лініі. Адначасова, зыходзячы

а становішча, якое склалася з ходам калектывізацыі, прасіў дапамогі для яе актывізацыі ў далейшым.

Прыводзім пастанову ЦК КП(б)Б па Шклоўскаму раёну і ліст Гея генеральнаму сакратару ЦК ВКП(б).

ПАСТАНОВА БЮРО ЦК КП(б)Б «АБ СТАНОВІШЧЫ Ў ШКЛОЎСКАЙ РАЁННАЙ ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ МАГІЛЁЎСКАЙ АКРУГІ»

26 сакавіка 1930 г.

Бюро ЦК КП(б)Б, заслухаўшы даклад сакратара Магілёўскага АК КП(б)Б т. Нейланда аб рашэннях бюро Шклоўскага РК КП(б)Б «Аб барацьбе са скрыўленнямі партлініі ў калгасным руху» і артыкул т. Сталіна «Головокружение от успехов», канстатуе, што гэтыя рашэнні Шклоўскага РК яўна апартуністычныя, з'яўляюцца пратэстам супраць лініі партыі на выпраўленне скрыўленняў партыйнай лініі ў калгасным будаўніцтве, гэтыя рашэнні азначаюць супраціўленне Шклоўскага РК КП(б)Б правядзенню ў жыццё пастановы ЦК Усе КП(б)Б («Правда», 15.III).

Бюро ЦК пастанаўляе:

1. Распусціць Шклоўскі райком КП(б)Б, склікаць не пазней 5 красавіка ўнечарговую раённую партыйную канферэнцыю для выбараў новага райкома. Даручыць Магілёўскаму АК КП(б)Б у адносінах да членаў райкома, супраціўляючыхся правядзенню ў жыццё лініі партыі, прымяніць суровыя меры партыйнага спагнання.

2. Сябра Магілёўскага АК КП(б)Б, рэдактар газеты «Камунар Магілёўшчыны» т. Пераход, які знаходзіўся ў Шклоўскім раёне на працы па калектывізацыі і правядзенні веснавой сяўбы, ведаў аб гэтых рашэннях Шклоўскага райкома і ні сам на месцы, ні праз акругком, ні праз газету не прыняў належных мер дзеля адмены гэтых пастаноў — зняць з працы рэдактара газеты і вывесці са складу акругкома.

Кандыдат бюро Магілёўскага АК КП(б)Б т. Зельдовіч, якому было даручана акругкомам правесці сход партактыва ў Шклове з мэтай мабілізацыі партарганізацыі на выкананне пастановы ЦК Усе КП(б) «Аб барацьбе са скрыўленнямі партлініі ў калгасным будаўніцтве», так правёў актыў, што апошні фактычна далучыўся да апартуністычнай пастановы Шклоўскага РК, — вывесці са складу бюро Магілёўскага акругкома. Паведаміць аб гэтым паліткіраўніцтва Беларускай Вайсковай Акругі.

3. Бюро ЦК адзначае, што бюро Магілёўскага АК КП(б)Б не надало належнага палітычнага значэння апартуністычным рашэнням бюро Шклоўскага райкома, яўна позна рэагавала на гэтыя з'явішчы, за што паставіць на від бюро Магілёўскага АК КП(б)Б.

Даручыць Магілёўскаму АК КП(б)Б тэрмінова праверыць прапрацоўку ва ўсіх ячэйках партыйнай арганізацыі пастановы ЦК Усе КП(б)Б «Аб барацьбе са скрыўленнямі партлініі ў калгасным будаўніцтве», мабілізаваўшы ўсю партыйную арганізацыю на правядзенне ў жыццё гэтай пастановы.

Бюро ЦК КП(б)Б даручае Магілёўскаму акругкому тэрмінова расследаваць абураючыя выпадкі затрымання і захавання газет з артыкулам т. Сталіна «Головокружение от успехов» і далажыць бюро ЦК аб выніках расследавання.

Сакратар ЦК КП(б)Б (Гей)

НАРБ, ф 4, воп. 3, спр. 34-III, лл. 1058—1059.

ПЛЕНУМ ЦК КП(б)Б АБ ПАЗІЦЫІ ШКЛОЎСКАГА РАЙКОМА ПАРТЫІ

З РЭЗАЛЮЦЫІ «АБ ХОДЗЕ КАЛЕКТЫВІЗАЦЫІ І ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА ВЕСНАВОЙ ПАСЯЎНОЙ КАМПАНІІ»

27—30 сакавіка 1930 г.

Аб тым, што некаторыя члены партыі памылкі і перагібы, дапушчаныя імі пры правядзенні калектывізацыі, выдавалі за лінію партыі і тым самым супрацьпастаўлялі гэтыя скажэнні правільнай лініі партыі, сведчыць пастанова Шклоўскага райкома партыі (Магілёўская акруга), які замест энергічнага выпраўлення дапушчаных скрыўленняў партыйнай лініі на падставе артыкула т. Сталіна і пастановы ЦК Усе КП(б)Б выступіў супраць гэтай пастановы і артыкула.

Пленум ЦК КП(б)Б, ацэньваючы гэты факт як супраціўленне праводзімай партыяй лініі, катэгарычна асуджае паказаны праваапартуністычны падыход да выканання дырэктыў партыі і пастанаўляе: адобрыць пастанову Бюро ЦК аб роспуске Шклоўскага райкома КП(б)Б, аб скліканні нечарговай райпартканферэнцыі для выбараў новага райкома, аб прыцягненні да партыйнай адказнасці асобных членаў райкома як непапраўных апартуністаў, а таксама пастанову Бюро аб пастаноўцы на від Магілёўскаму АК за несвоечасовае рэагаванне на палітычна шкодную пастанову Шклоўскага РК КП(б)Б.

«Партыйны работнік». 1930. № 6-7. С. 37—41.

ЛІСТ ПЕРШАГА САКРАТАРА ЦК КП(б)Б К. ГЕЯ І. В. СТАЛІНУ

28 сакавіка 1930 г.

Уважаемый тов. Сталин!

26 марта мы обсудили дело Шковского райкома на бюро ЦК. Отношение райкома к директивам ЦК ВКП(б) и к Вашей статье мы характеризовали: 1) как оппортунистическое, 2) как сопротивление проведению партлинии и исправлению искажений и перегибов в колхозном строительстве. Постановлением бюро ЦК КП(б)Б Шковский райком распущен, назначены досрочные перевыборы.

Два обстоятельства заслуживают того, чтобы быть упомянутыми. Шковский райком не согласен с Вашей статьей и с директивами партии, но записать это прямо в своем решении у шковцев не хватило духа. Решение, принятое ими, говорит о том, что следовало бы, мол, сначала обсудить статью в парторганизациях, а потом публиковать во всеобщее сведение. Это звучит как требование: дайте дискуссию.

Второе обстоятельство заключается в том, что окружком не реагировал своевременно на решения Шковского райкома, хотя представители окружкома принимали участие в заседаниях бюро и актива района. В нашем решении, которое прилагается, Вы найдете, как мы реагировали на это. Этот факт показывает, что даже окружная организация не мобилизовалась достаточно быстро на исправление искажений.

Сказанным выше не исчерпывается, однако, ответ на вопрос, поставленный Вами. Сопротивление проведению в жизнь директив партии не ограничивается случаем со Шковским районом. В иных формах оно проявляется, например, в фактах сокрытия газет с Вашей статьей. Оценка Вашей статьи и постановления ЦК ВКП(б) от 10 марта, как «отступления», относятся к явлениям того же порядка. Эти разговоры не только голоса зарвавшихся «коллективизаторов» в кавычках, но, как показала Республиканская конференция батрацко-бедняцких групп — это настроение соответствует той мелкобуржуазной революционности (рррреволюционности), которая свойственна бедняцким слоям деревни, поскольку они не руководятся или плохо руководятся нами. Есть нарекания и такого рода, что статья эта появилась поздно, когда на местах зашли уж слишком далеко. В то же время статья Ваша встретила, безусловно, положительное отношение в здоровой части организации, в массах бедноты и среднего крестьянства и среди колхозников, главным образом, более устойчивых и заботящихся о хозяйственной прочности колхоза. Мы проводим сейчас большую разъяснительную работу, ставя в центре ее вопрос об исправлении допущенных ошибок и извращений.

Положение колхозов в настоящее время находится в прямой зависимости от методов их создания. Чем больше было перегибов и извращений, тем сильнее явления распада и выхода из колхозов. Решающим является сейчас иметь быструю ориентировку организации, устранение всякого сопротивления, так как оно задерживает переход колхозов на более здоровую основу, увеличивает длительность того периода, который связан с ликвидацией бумажного и непрочного в колхозном строительстве. Как велик будет этот отлив из колхозов, судить пока трудно. В наиболее зарвавшемся Мозырском округе, где процент коллективизации свыше 70 %, реально осталось сейчас около 30 %, да и о тех еще преждевременно говорить, что это осталось прочно. Лично думаю, что процент ярового клина, который будет засеян колхозами, составит все-таки по БССР между 30 % и 40 % против тех бумажных 60 %, которые мы имели к концу февраля.

Коллективизация в БССР проходит в условиях более трудных, чем в большинстве других районов Союза. Это в первую очередь молодость и малочисленность рабочего класса и в особенности его состава. Рабочий в Белоруссии в очень значительной своей части не связан с деревней, выходец из мещанско-ремесленных слоев города. 40 % рабочих по национальности составляют евреи. Подбор руководящих кадров для колхозов встречает

поэтому особенные трудности. Совхозы по своему положению находятся на той ступени развития, при которой они не могут играть ведущей роли в сельском хозяйстве. Лишь теперь это дело ставится серьезно.

На 1 октября 1929 г. количество тракторов в республике составило всего 198 единиц. В таком положении виноваты, конечно, и республиканские органы. Прищеповщина не интересовалась этим делом. Хуже всего, однако, что и дальнейшее снабжение нас тракторами идет совершенно недопустимыми темпами. Наиболее реальное, что мы имеем, это те 40 тракторов для пограничной полосы, которые мы получаем во внеплановом порядке и при Вашем непосредственном содействии. Плановое же снабжение идет следующим образом: по плану следовало получить до весеннего сева 196 тракторов, фактически получено 23. Вчера получена телеграмма т. Яковлева о том, что нам назначено еще 30 тракторов. Если они не опоздают к севу, то эти 53 трактора составят все, что мы получаем в счет выполнения плана в 196 тракторов.

Следующая трудность колхозного строительства заключается в том, что основным направлением сельского хозяйства республики является животноводство, что представляется делом более сложным, чем зерновое хозяйство. Наконец, если учесть крайнюю бедность крестьянского хозяйства, которая усиливает стремление к коллективизации, но одновременно способствует развитию потребительских настроений в колхозах, станет ясно, что республика нуждается в серьезной помощи в деле укрепления колхозов и руководства ими. Конкретно я просил бы о следующем:

1) Массовые мобилизации в деревне прекращены. Было бы, однако, целесообразно выделить нам, путем персонального отбора, человек 200 партийных работников, знающих деревню и сельское хозяйство, из которых каждый мог бы быть руководителем колхоза. Мы используем их, главным образом, в погранокругах.

2) Обеспечить максимально возможное удовлетворение разработанного нами по поручению ПБ плана хозяйственного укрепления колхозов погранполосы, в частности, обеспечить полное удовлетворение нашей заявки на трактора в погранполосе (6 тракторных станций по 100 тракторов в каждой в этом еще году).

3) В случае необходимости поддержать нас в деле выделения кредитов для целевого кредитования колхозов (на животноводство).

Полагаю также, что было бы целесообразно вскоре после XVI съезда партии заслушать в Политбюро доклад ЦК КП(б)Б, который намечался к слушанию еще в прошлом году, но слушание которого было отложено.

С товарищеским приветом (Гей)

НАРБ, ф. 4. воп. 21, спр. 192, лл. 239—242; воп. 3, спр. 34 (III), л. 1058.

Падрыхтаваў *Р. Платонаў*, доктар гістарычных навук

овы прыліў*

Нягледзячы на перагібы ў правядзенні алектывізацыі на Шклоўшчыне, на сёньшні дзень маецца значны прыліў у калга-, а таксама арганізацыя новых калгасаў добраахвотных асновах.

Пасьля адліву ў арганізаваных калгасах таўся касьцяк калгасьнікаў, якія поўнасью перайшлі на шлях сацыялістычнай рэінструкцыі вёскі, якія поўнасьцю перакаліся ў выгаднасці калектыўнай працы...

Калгасы Шклоўшчыны, у якіх быў паўлены правільны ўчот працы, правільнае зьмеркаванне ўраджаю, як, напрыклад, Барацьба», «Камінтэрн», калгасьнікам выдзіць у дзень 2 руб., а жанчынам па кап. у сярэднім на кожны працоўны ень, акрамя тых пераваг, што калгасьнік атрымлівае ўсе прадукты па цьвёрдай цане...

Зараз назіраецца прыліў і арганізацыя новых калгасаў. Прылілося 360 гаспадарак, і арганізавана 8 новых калгасаў з 130 гаспадарак, што складае калектывізацыю раёна на 10.11.30 г. 1230 гаспадарак, або 13,3 % з 9 % 1929 г. Арганізацыя калгасаў і ініцыятыўных груп ідзе і далей, такім чынам дырэктыва... да 1.01.31 г. калектывізаваць раён да 20 % будзе выканана...

Культурная праца ў калгасах яшчэ недастатковая. Ліквідацыя непісьменнасці, арганізацыя розных гурткоў у калгасах, — задачы не толькі культпрацоўнікаў, а ўсіх арганізацый.

«Шляхі калектывізацыі». 1931. № 1. 1 студзеня. С. 22.

* Скарочана.

Зьдзельшчына апраўдала сябе

Шклоўскі раён мае 93 калгасы, у іх 2093 гаспадаркі, што складае 31,3 % калектывізацыі бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

80 калгасаў пераведзены на зьдзельшчыну, якая павысіла вытворчасьць працы і ўцягнула новыя бядняцка-серадняцкія гаспадаркі ў калгасы. Недахопам на сёньняшні дзень з'яўляецца тое, што праўленьне поўнасьцю не пераключылася на добры ўчот зьдзельных работ...

«Шляхі калектывізацыі». 1931. № 12. С. 7.

А. Я. Кляшчоў

Вясной 1930 г. паводле рашэння ЦК КП(б)Б і СНК БССР арганізавана першая ў раёне Шклоўская машынна-трактарная станцыя. Першым дырэктарам быў А. Я. Кляшчоў. У 1931 г. МТС мела 40 трактароў, абслугоўвала 79 калгасаў.

«Ударны фронт». 1977. 23 жніўня.

КЛЯШЧОЎ Аляксей Яўхімавіч, 12(25). 03.1905, в. Міхнавічы Мазырскага пав. Мінскай губ. — 13.12.1968, савецкі партыйны і дзяржаўны дзеяч, адзін з арганізатараў і кіраўнікоў партызанскага руху на Беларусі ў Айчынную вайну. Ген.-м. (1943). Герой Савецкага Саюза (1944). З сялян... Працоўную дзейнасць пачаў у Петрыкаўскім р-не. У 1927—1929 — у Чырвонай Арміі. З 1930 — дырэктар Шклоўскай, Дрысенскай, Мехаўскай МТС... У Айчынную вайну — у тыле ворага... упаўнаважаны ЦК КП(б)Б па Пінскай вобл., сакратар Пінскага падпольнага абкома КП(б)Б. Камандзір Пінскага партызанскага злучэння... У 1948—1953 — старшыня СМ БССР...

БелСЭ. Т. VI. 1972. С. 36.

СА СПРАВАЗДАЧЫ АБ ДЗЕЙНАСЦІ РАЙПАРТАРГАНІЗАЦЫІ НА ПАРТКАНФЕРЭНЦЫІ

Дакл. Кіштэмаў

8 студзеня 1934 г.

...Да канферэнцыі прыйшлі з наступнымі паказчыкамі ў справе сацыялістычнага будаўніцтва: на канец 1933 г. ф-ка «Спартак» выпусціла прадукцыі (вал., у цэнах 1926/27 гг.) на 5,9 млн руб. На прадпрыемстве ўведзены новы цэх, які забяспечваў сыравінай і паўфабрыкатамі. У 1932 г. арганізаваны ў якасці цэха фабрыкі торфазавод «Вольніца», што вырашыла праблему забеспячэння палівам.

Лесазавод «Барацьба» за тры кварталы 1933 г. выпусціў гатовай прадукцыі на 329,9 тыс. руб. Завод некалькі расшырыўся, было ўзведзена тры жылыя дамы. Паспяхова справіўся з выкананнем планавых заданняў трэцяга квартала 1933 г. лесазавод «Другая пяцігодка». На Шклоўскім ільнозаводзе імя Сталіна ўстаноўлена дзве турбіны па выпрацоўцы доўгага і кароткага валакна. Аднак «у выніку абязлічкі, цякучкі кадраў, нізкай працоўнай дысцыпліны ільнозавод сістэматычна не выконваў даведзеных заданняў». План 10 месяцаў 1933 г. выкананы ўсяго на 40,9 %. Не выканалі планавыя заданні і цагельныя заводы.

У 18 розных арцелях было занята 309 рабочых. Іх валавая прадукцыя за год склала 1,7 млн руб. Амаль усе арцелі працавалі на прывазной сыравіне і выпускалі тавары бытавога прызначэння.

На тэрыторыі раёна створаны леспрамгас, у распараджэнні якога 13 251 га лясоў дзяржаўнага і 10 500 га мясцовага значэння. За год нарыхтавана больш за 30 тыс. кубаметраў драўніны і 23 тыс. кубаметраў паліва. Лясная гаспадарка вялася ў планавым парадку. Насадкі маладога лесу перавышалі плошчы вырубленага. Толькі ў 1933 г. пасаджаны 596 га лесу.

У справаздачы адзначаліся поспехі ў калектывізацыі сельскай гаспадаркі. У раёне было 229 калгасаў, 85 з якіх абслугоўвала МТС, у якой мелася 40 трактароў. Калгасы мелі 49,5 тыс. га worнай зямлі.

Раён калектывізаваны на 54 %. Праводзіцца значная работа па арганізацыйна-гаспадарчаму ўмацаванню калгасаў, паляпшэнню дысцыпліны, узняццю прадукцыйнасці працы. У 1932 г. у сярэднім на 1 працадзень выдадзена 2,5 кг зерня, 3,8 кг бульбы, 24 кап. грашыма. У 1933 г. аплата павысілася: на працадзень у сярэднім выдавалі па 4 кг зерня, 6 кг бульбы, 42,5 кап. грашыма.

Спецыялізацыя сельскай гаспадаркі па-ранейшаму ішла ў напрамку расшырэння льнаводства (8 тыс. га ў 1931 г., 10,5 тыс. га ў 1933 г.). У калгасах раёна 148 малочнатаварных і 46 свінагадоўчых ферм. Пагалоўе буйной рагатай жывёлы складала 4707 галоў і свіней 1973 галавы. Асноўнай цяглавай сілай былі коні. Іх налічвалася больш 10 тыс. і каля 4 тыс. маладняку.

У раёне працавалі саўгас «Белдортранса» і 2 кааператыўныя гаспадаркі (адна пры папяровай ф-цы і адна пры гарпо), але яны не сталі вядучымі сельскагаспадарчымі прадпрыемствамі.

Электрыфікацыя сельскай гаспадаркі, у першую чаргу ў калгасах, пачалася ў 1932 г. У пачатку 1934 г. «лямпачка Ільіча» загарэлася ў населеных пунктах шасці сельскіх Саветаў.

У 1933 г. працавала 156 школ, дзе навучалася 15,8 тыс. дзяцей. Настаўнікаў было 408. Аднак у справе ліквідацыі непісьменнасці і малапісьменнасці былі недахопы. З 4886 непісьменных закончылі лікбезы ўсяго 2572 чалавекі.

Расшырылася сетка культурна-асветніцкіх устаноў. Працавалі адзін народны дом, раённая бібліятэка, 27 сельскіх Дамоў культуры, 2 стацыянарныя і 6 перасоўных кінаўстановак.

Праяўляліся клопаты аб ахове здароўя. Працавалі дзве бальніцы, тры ўрачэбныя амбулаторыі, тры фельчарска-акушэрскія пункты, 21 аздараўленчы пункт. Яслямі ў горадзе было ахоплена 27 дзяцей і ў вёсцы на перыяд сельгасработ 1250 дзяцей.

«Прамень камунізму». 1934. 10 студзеня.

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

8 сельсаветаў тэлефанізавана да гэтага часу ў раёне, а таксама Шклоўская і Фашчаўская МТС. У студзені намечана тэлефанізаваць яшчэ 4 сельсаветы, прадугледжаных планам 1935 г. Колькасць тэлефонных абанентаў горада ўзрасла са 191 на 1 студзеня 1935 г. да 271 — у снежні.

* * *

Радыёвузлом устаноўлена 510 кропак, магутнасць яго складае 30 ват. З пачатку 1936 г. радыёвузел будзе расшыраны да 100 ват з ахопам 1500 радыёкропак. Намечана радыёфікаваць поўнасцю калгас «VII з'езд Саветаў» Шклоўскага сельсавета, імя Сталіна, «Праўда», імя Леніна Рыжкавіцкага сельсавета, а таксама вёскі Данькавічы, Загор'е і Зароўцы гэтага сельсавета. На расшырэнне і пераабсталяванне радыёвузла выркуецца патраціць 30 тыс. рублёў.

* * *

Пры калгасе «Іскра» Рыжкавіцкага сельсавета адчынены маслабойны завод для перапрацоўкі лыняного семя і канапель на масла. Прымаюцца заказы на перапрацоўку ад калгасаў, калгаснікаў і аднаасобнікаў.

«Прамень камунізму». 1936. 3 студзеня.

* * *

Мікіцінічы. У калгасе «1 Мая» (в. Н. Стайкі) упершыню загарэлася «лямпачка Ільіча». Электрафікаваныя будынкі, у якіх зімуе жывёла, — канюшня, свінарнік і кароўнік. Праведзена электрычнасць і ў канцэлярыі калгаса. Электрыфікацыя калгаса працягваецца. Хутка засвеціцца «лямпачка Ільіча» ў хатах калгаснікаў.

І. Марозаў. «Прамень камунізму». 1936. 3 студзеня.

* * *

Пры гарадской амбулаторыі абсталяваны новы электракабінет, у якім наладжана электралячэнне. У кабінеце ёсць наступная апаратура: кварц (чорнае сонца), або лямпа Баха, сіняе святло, агульная светавая ванна і фарэдзізацыя. Калі ў чэрвені было 347 наведванняў электракабінета, то ў верасні — 619 наведванняў.

* * *

Фашчаўская МТС, якая знаходзіцца ад Шклова на адлегласці 18 кіламетраў, электрыфікавана і радыёфікавана. З кастрычніка ў кватэрах работнікаў МТС, у канторы і сталоўцы, на вуліцах загарэлася «лямпачка Ільіча». У сталовай установлены радыёпрыёмнік. Кожны вечар сюды збіраюцца і слухаюць радыёперадачы не толькі работнікі МТС, але і калгаснікі калгаса «Спартак».

І. Юханаў. «Прамень камунізму». 1936. 8 кастрычніка.

* * *

110 ясляў, з іх 9 сталых, арганізоўваецца ў калгасах на час палявых работ. Для забеспячэння ясляў кадрамі прапушчана праз курсы ясельных сясцёр 33 чалавекі. На час палявых работ арганізоўваецца 100 перасовачных аптэк.

«Прамень камунізму». 1935. 20 красавіка.

* * *

Рыжкавічы. У калгасе імя Валадарскага пабудаваны дзіцячыя яслі. Памяшканне добра абсталявана, сцены аббіты шпалерай. Для дзяцей закуплена цацак на 70 руб. і кухонных прылад на 48 руб. У калгасе ахоплены дзіцячымі яслямі 22 дзіцяці.

«Прамень камунізму». 1935. 28 мая.

* * *

У Каменна-Лаўскім сельсавеце ў гэтым годзе адчыняецца ўрачэбнамедыцынскі пункт. Усяго ў раёне будзе працаваць у 1936 г. 7 урачэбна-фельчарскіх пунктаў.

* * *

У 1935/36 навучальным годзе ў нашым раёне налічваецца 85 пачатковых, 24 няпоўных сярэдніх і 2 сярэднія школы. Усімі школамі ахоплена 15 258 дзяцей. Акрамя таго, у горадзе ёсць адна вячэрняя школа павышанага тыпу і 55 школ для малапісьменных у раёне.

«Прамень камунізму». 1936. 25 студзеня.

* * *

У калгасах «Другая пяцігодка» Падгайцаўскага сельсавета і «Чырвоны партызан» Таўкачоўскага сельсавета будуюцца цагельныя заводы. У 1937 г. яны дадуць па 2000 штук цэглы. Для аказання дапамогі калгасам у будаўніцтве гэтых заводаў адпушчаны доўгатэрміновы крэдыт.

«Прамень камунізму». 1936. 15 верасня.

* * *

Новыя хаты-радзільні адчынены ў гэтым годзе ў Вяліка-Лазіцкім і Нова-Брашчынскім сельсаветах. Хата-радзільня з акушэрскім пунктам на 2—3 ложкі днямі адчыняецца ў Таўкачоўскім сельсавеце. Акрамя гэтага, райздравам намечана адчыніць яшчэ дзве хаты-радзільні ў Славенскім і Каменна-Лаўскім сельсаветах. Для забеспячэння хат-радзільняў акушэрскімі кадрамі паслана на гадзічныя акушэрскія курсы ў горад Оршу 5 чалавек, 4 чалавекі пасланы на 3-месячныя курсы работнікаў дзіцячых ясляў.

«Прамень камунізму». 1936. 5 кастрычніка.

ЗЯМЛЯ ЗАМАЦАВАНА НАВЕЧНА

На 10 кастрычніка Шклоўскі раён закончыў выдачу калгасам дзяржаўных актаў на вечнае карыстанне зямлёй. Калгасам уручана 209 актаў і замацавана за імі 94 606,82 га зямлі. Цвёрда акрэсленыя граніцы калгасаў значна аблегчаць складанне перспектыўнага плана развіцця кожнага калгаса.

Тэхнікі-землеўпарадкавальнікі райза пасланы на дапамогу другім раёнам БССР.

«Прамень камунізму». 1936. 18 кастрычніка.

І ТАК БЫЛО...

Шклоў. У горадзе ёсць лазня, якая функцыяніруе два разы на тыдні. У ёй заўсёды

поўна народу, у прадлазніку са столі капаюць халодныя кроплі вады...

Толькі нядаўна ў кінатэатры ўстаноўлены гукавыя кінаапараты. За апошні час дэманстраваліся карціны «Чапаеў», «Тры песні аб Леніне», «Кіраў», «Вясёлыя рабяты». Гэта добра. Для раённага цэнтра гэта вялікае дасягненне. Аднак і тут не без бяды. Бываюць моманты, калі дэманструецца гукавая кінакарціна, нечакана робяць перапынак на дзве гадзіны... У кінатэатры холадна, пачынаюць заўсёды са спазненнем, новае фае не абсталявана.

Ужо наступіла вясна. Нікога не хвалюе, што пачнецца паводка. Нельга будзе прайсці не толькі на базар, але ж і з адной вуліцы на другую. Давядзецца спыніць рух па гораду.

Вось так выглядае наш раённы цэнтр... Горад не ўпарадкаваны, электрычныя ліхтары не гараць, тратуары паразбіваны, лазня не ў парадку, у кіно беспарадак. Парк пры фабрыцы «Спартак» ператвораны ў звалку. Не мае Шклоў выгляду раённага цэнтра...

«Прамень камунізму». 1935. 25 сакавіка.

ПРАВЕРКА СЦВЯРДЖАЛА

На пачатку 1937 г. у шэрагу сельскіх раёнаў Беларусі праводзілася праверка работы падатковых і фінансавых органаў. Былі выяўлены масавыя парушэнні дзейнічаўшых у той час законаў, перш за ўсё, у адносінах да аднаасобных гаспадарак. У Шклоўскім раёне, як і ў многіх іншых, спачатку апісвалася, а потым насільна забіралася маёмасць аднаасобнікаў за невыкананне імі, як тлумачылася ў актах, абавязацельстваў па хлебапастаўках і ільназдачы, а таксама фінансавых плацяжоў, культзбору, сельгаспадатку і інш., пры вылічэнні так званых кан'юнктурных даходаў. Абавязацельствы па хлебапастаўкаў, напрыклад, даводзіліся да сялянскага двара з разліку складзенага плана сяўбы, сам жа план у многіх выпадках распрацоўваўся фармальна і не забяспечваўся адводам аднаасобнікам зямельных участкаў, альбо такія ўчасткі адводзіліся за 10—15 км ад месца жыхарства. Гэта пазбаўляла сялян магчымасці выканаць дзяржаўныя абавязацельствы, што, у сваю чаргу, выкарыстоўвалася для рэпрэсій. Друкуецца далей дакладная запіска, прызначаная сакратарам ЦК КП(б)Б, напісаная на канкрэтных прыкладах парушэнняў законнасці і скрыўленняў фінансава-падатковай палітыкі ў раёне.

Сёння відавочна, што парушэнні выклікаліся, з аднаго боку, імкненнем мясцовых работнікаў заняць «вышэйшая месца», у параўнанні з іншымі, па ўзроўні акругі, рэспублікі. Такое «спаборніцтва» ў сялян заахвочвалася зверху. А, з другога боку, такім спосабам падштурхоўвалі аднаасобнікаў да хутчэйшага ўступлення ў калгасы і канчатковага завяршэння калектывізацыі. Не выпадкова ва ўсе сельскія саветы раённы фінансавы аддзел накіраваў інструкцыйны ліст аб адабранні ў сялян маёмасці за нявыплату падаткаў, які быў распрацаваны на падставе дырэктыў 1934 г.— часа шырокай калектывізацыі (друкуецца).

Летам 1937 г. кіраўніцтва БССР было абвінавачана ў стварэнні разгалінаванага аж да раёнаў «антысавецкага падполля», мэтай якога нібыта была падрыхтоўка выхаду з СССР. Усіх вышэйшых кіраўнікоў рэспублікі рэпрэсіравалі. Многіх раённых работнікаў арыштоўвалі і судзілі, нярэдка на адкрытых працэсах у раёнах, абвінавачваючы ў тым, што яны быццам бы свядомым скрыўленнем фінансава-падатковай палітыкі імкнуліся выклікаць масавае незадавальненне сялян-аднаасобнікаў, а таксама калгаснікаў Савецкай уладай.

Секретарям ЦК КП(б)Б
тов. Волкову
тов. Левицкому
тов. Репинскому

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА АБ ПАРУШЭННІ РЭВАЛЮЦЫЙНАЙ ЗАКОННАСЦІ І СКРЫЎЛЕННІ ФІНАНСАВА-ПАДАТКОВАЙ ПАЛІТЫКІ ПА ШКЛОЎСКАМУ РАЁНУ

Проверкой установлено, что в районе было допущено грубое искривление и нарушение революционной законности в отношении единоличных хозяйств. Производилось массовое и незаконное изъятие имущества: 1934 г. у 100 хозяйств, 1935 г. у 138 хозяйств, 1936 г. у 266 хозяйств, а всего подвергнуто изъятию 504 хозяйства. В 1937 г. РИКом отменено и возвращено, как незаконно изъятое, имущество 222 хозяйствам, из них возвращено натурой

107 хоз[яйствам] и деньгами — 114 х[озяй]ствам. Одновременно, по линии Комитета заготовок, за невыполнение государственных обязательств применялись массовые штрафы к единоличным хозяйствам. За 1936 г. оштрафовано 48 хозяйств на сумму 15 400 р[ублей]. В 1937 г. президиумом РИКа штрафы отменены, а незаконно наложенные и взысканные возвращены.

При изъятии имущества забирали вещи домашнего обихода без их описи, что давало возможность присваивать имущество отдельным работникам. Например, у единоличника Федосова Ивана — д. Озеры Заходского с[ельского] совета — членом с[ельского] совета Стасовым изъято: лошадь, телега, хомут, навозные вилы, лопата, кастрюля, ведро, веревка и 10 веников. Вырученные за имущество деньги не пошли в погашение недоимки. РИКом в 1937 г. возвращено имущество гр-ну Федосову, а Стасов отдан под суд — осужден на 3 года.

У единоличника Овсянникова Сергея — д. Подгайцы Подгайцевского [ельского] с[овета] первый раз изъяли: корову, лошадь, хомут, два сарая, амбар за недоимки, а второй раз, за незаконно наложенный штраф, явились ночью и забрали трое поросят, телку, сена 80 пуд[ов], соломы 50 пуд[ов], две цепи, окучник и две доски. РИКом имущество возвращено в 1937 г., а виновные — пред[седатель] с[ельского] с[овета] Симочков, Тайцев и др. отданы под суд (Симочков арестован).

Вместо прекращения недопустимого произвола в изъятии имущества Шкловским РИКом за подписью Савицкого (согласно решения СНК БССР от 28.11.34 г.) спущено инструктивное письмо, которое устанавливает нормативы изъятия и обязывает с[ельские] с[оветы] производить массовые изъятия имущества и творить беззакония.

РК КП(б)Б и РИК знали о грубом извращении политики партии в районе, в частности, финансово-налоговой политики и массовых изъятиях, но не мобилизовали парторганизацию на исправление допущенных извращений и выявление действительного положения в районе. Возвращали крестьянам имущество [лишь] по сигналам, от случая к случаю.

...

Инструктор сельхозотдела ЦК КП(б)Б (Зайцев)

13 февраля 1938 г.

НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 1276, л. 88—90.

Всем сельсоветам
Шкловского района
Чернянскому сельсовету

ІНСТРУКТЫЎНАЕ ПІСЬМО ЗАГ. РАЙФА САВІЦКАГА АБ АДАБРАННІ Ў СЯЛЯН МАЁМАСЦІ ЗА НЯВЫПЛАТУ ПАДАТКАЎ

Люты, 1934

Настоящим разъясняем, что взыскание в принудительном порядке производится путем изъятия имущества по единоличным крестьянским хозяйствам за невыполнение государственных обязательных натуральных поставок и денежных платежей в установленные сроки на все имущество, принадлежащее тому или иному хозяину, за исключением необходимого для недоимщика и всех, кто находится на его иждивении,— одежды, обуви, белья и других вещей домашнего обихода на каждое лицо:

1. Одно летнее или осеннее пальто, бурка или поддевка.
2. Одно зимнее пальто или полушубок, или шуба.
3. Один зимний костюм для мужчин, а для женщин — два летних платья.
4. Одна летняя шапка и одна теплая шапка, а для женщин — два летних и один теплый платок.
5. Один кожух на крестьянский двор.
6. Три пары нательного белья.
7. Одна пара кожаной и валеной обуви.
8. Одна кровать, матрац, одна подушка, две простыни, две наволочки, одно одеяло и два полотенца.

9. Один комплект тарелок, вилок, ножей, ложек, один стул.

Кроме этого, на каждую семью недоимщика накидывается один самовар, чугун или чайник, два кухонных полотенца, две скатерти, самая необходимая кухонная посуда и детская одежда, обувь, белье и прочие детские вещи, одна хата и необходимое количество топлива на три месяца. Изъятие не распространяется на паевые взносы членов кооперативных организаций и на страховое вознаграждение по обязательному страхованию. Все остальное имущество, имеющееся в единоличном хозяйстве, подлежит изъятию на покрытие задолженности.

Одновременно с дачей этого указания Райфо категорически требует от каждого председателя, счетовода с[ельского] совета самой быстрой реализации изъятого имущества не более чем через два дня.

Предупреждаем, что в случае долгого держания изъятого имущества, работа с[ельского] совета будет расцениваться как проявление либерализма и нежеление выполнять возложенные обязанности. Быстрая реализация изъятого имущества может послужить уроком для других недоимщиков.

Примите самые решительные меры, мобилизуйте весь имеющийся актив, особенно вовлекайте в это дело фининспекцию, заменив неработоспособных членов финсекций лучшими работающими людьми, с таким расчетом, чтобы финансовый план вашего с[ельского] совета был выполнен к 15.12.34 г. полностью по всем видам платежей. Райфо надеется, что вы проявите в выполнении финплана свое гражданское мужество, энергию, настойчивость.

НАРБ, ф. 4. воп. 21, спр. 1276, лл. 91—92.

Падрыхтаваў *Р. Платонаў*

* * *

У 1937 г. у раёне назіраліся масавыя выступленні сялян за аднаўленне дзейнасці зачыненых цэркваў. Выступленні адбыліся адначасова у суседніх населеных пунктах Шклоўскага, Дрыбінскага, а таксама Магілёўскага раёнаў, веручыя з якіх уваходзілі ў адзіныя прыходы. Колькасць удзельнікаў называецца па-рознаму: у спецпаведамленні НКУС БССР першаму сакратару ЦК КП(б)Р В. Ф. Шаранговічу — за 1000 чалавек, у дакладной запісцы РК КП(б)Б другому сакратару ЦК Д. І. Валковічу — звыш 500. У адпаведнасці з палітычнай атмасферай таго часу арганізатары выступленняў былі абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці і выкарыстанні рэлігіі ў контррэвалюцыйных мэтах.

Сов. секретно
Секретарю ЦК КП(б)Б т. **Шаранговичу**

СПЕЦСООБЩЕНИЕ НКВД БССР
О МАССОВЫХ ВЫСТУПЛЕНИЯХ ЗА ОТКРЫТИЕ ЦЕРКВЕЙ
В ШКЛОВСКОМ И ДРИБИНСКОМ РАЙОНАХ БССР

1) 7 апреля 1937 г. в дер. Ничипоровичи Шкловского района около Ничипоровической церкви, которая в 1936 г. была закрыта и оборудована под клуб, собралась толпа около 1000 человек с требованием передать им ключи от бывш[ей] церкви и, после получения отказа в этом, толпа начала ломать двери, разбивать замок и пыталась самовольно проникнуть в помещение клуба.

Выездом на место окр[ужного] работника и произведенным расследованием установлено, что непосредственными инициаторами и зачинщиками этого выступления явилась группа единоличников-середняков, бывших членов церковного совета в числе 7 человек, которые нами арестованы.

По делу ведется следствие.

2) 9 апреля 1937 г. группа в числе свыше 100 человек явилась в Рясянский сельсовет Дрибинского района с требованием немедленного открытия бездействующей, но официально незакрытой Рясянской церкви.

Инициаторами этого выступления, как установлено, является проживающий в местечке Рясна поп Монетин, который группирует вокруг себя к/р церковный актив.

Монетина подвергаем аресту.

Шкловский и прилегающий к нему Дрибинский районы насыщены церковными элементами. За последние два года нами по этим районам ликвидирован ряд к/р церковных групп.

Симптоматично, что открытые выступления за открытие церквей в ряде районов (Кировский, Шкловский, Дрибинский) были приурочены ко дню религиозного праздника «благовещенье» — 7—9 апреля, что указывает на несомненное наличие единого центра, организующего эти выступления.

Зам. наркомвнудел БССР комиссар госбезопасности 3-го ранга *Каруцкий*

16 апреля 1937 г.
№ 53715
г. Минск, БССР

НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 1096, лл. 129—130.

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА ШКЛОЎСКАГА РАЙКОМА ПАРТЫІ Ў ЦК КП(б)Б АД 21 КРАСАВІКА 1937 г.
ВЫСТУПЛЕННІ СЯЛЯН У НІЧЫПАРАЎСКІМ СЕЛЬСАВЕЦЕ З ПАТРАБАВАННЕМ АДЧЫНІЦЬ ЦАРКВУ

Сакрэтна
Сакратару ЦК КП(б)Б т. **Валковічу**

ДАКЛАДНАЯ ЗАПІСКА

Шклоўскі РК КП(б)Б паведамляе Вас аб меўшым месца 7 красавіка 1937 года выступленні ў Нічыпараўскім сельсавеце нашага раёна з боку даволі значнай групы сялян, пераважна аднаасобнікаў, з патрабаваннем адчыніць царкву ў гэтым сельсавеце, і ажыўленні ў некаторых іншых сельсаветах клерыкальна-антысавецкіх элементаў (вёскі Ст. Шклоў Рыжкавіцкага сельсавета, Барэцкі Каменна-Лаўскага сельсавета).

7 красавіка, у дзень Благавешчання, чалавек звыш 500 сялян сабраліся ў вёску Нічыпаравічы да царквы з патрабаваннем адчыніць царкву. Гэтая царква была зачынена ў 1936 годзе на падставе жадання большасці насельніцтва дадзенага сельсавета шляхам збору подпісаў і адчужэння гэтай царквы было дазволена рашэннем РВК і ЦВК БССР.

Зараз жа, як стала вядома ў раёне (было паведамлена па тэлефоне) аб гэтым антысавецкім выступленні ў сельсавет былі напраўлены два работнікі райаддзялення НКВД і старшыня аргбюро ваяўнічых бязбожнікаў член КП(б)Б для расследавання і прынятця мер на месцы.

Папярэднім расследаваннем устаноўлена, што арганізатарам гэтага выступлення з'явіўся царкоўны савет, які заставаўся існаваць і пасля зачынення царквы. Усёй гэтай падрыхтоўкай і выступленнем кіраваў поп Уладзіміраў, які служыў у Нічыпараўскай царкве да зачынення царквы, а зараз знаходзіцца ў Магілёве. Гэты царкоўны Савет састаяў з адных аднаасобнікаў, антысавецкі настроеных элементаў Нічыпараўскага сельсавета Шклоўскага раёна і вёскі Даманы Дрыбінскага раёна.

Для таго каб сабраць больш людзей, гэтымі антысавецкімі элементамі былі пушчаны чуткі, што ў гэты дзень прыедуць у сельсавет старшыня РВК тав. Козінцаў і пракурор раёна для вырашэння пытання аб царкве.

У гэтым выступленні ўдзельнічалі грамадзяне Нічыпараўскага сельсавета і частка Заходскага [сельсавета] Шклоўскага раёна, Еганаўскага сельсавета Дрыбінскага раёна і некаторых бліжэйшых вёсак Магілёўскага раёна.

Раённыя работнікі, якія выехалі ў сельсавет, растлумачылі тым жа грамадзянам, што царква аднята на законнай падставе, згодна подпісаў большасці насельніцтва і таму адчынена яна быць не можа. Пасля чаго яны разышліся.

Восем чалавек арыштавана, усе аднаасобнікі, антысавецкі настроеныя элементы, актыўныя ўдзельнікі падрыхтоўкі гэтага выступлення. На месцы прыняты меры па разгортванні і наладжванні работы арганізацый ваяўнічых бязбожнікаў. Падбіраем адналедных людзей-камуністаў для ўзмацнення партыйнага кіраўніцтва і масава-палітычнай работы ў гэтым сельсавеце.

Па лініі райсаюза туды падкінута на некалькі тысяч рублёў прамтавараў.

У вёсках Ст. Шклоў Рыжкавіцкага сельсавета і Барэцкі Каменна-Лаўскага, дзе цэрквы зачынены, але не адчужаны, назіраецца некаторае ажыўленне з боку часткі аднаасобнікаў і калгаснікаў за адчыненне гэтых цэркваў. У гэтыя калгасы паслана некалькі таварышаў з раённага партыйнага актыву для наладжвання масава-палітычнай і антырэлігійнай работы.

Сакратар Шклоўскага РК КП(б)Б (Ермакоў)

21 красавіка 1937 г.
Шклоў

НАРБ, ф. 4, воп. 21, спр. 1053, лл. 201—202.

Падрыхтаваў *Р. Платонаў*

У НЕКАЛЬКІ РАДКОЎ

Узбуйненне калгасаў

На працягу 1935 г. і да сакавіка 1936 г. па раёну на базе 39 дробных калгасаў было створана 19 узбуйненых. Узбуйненне праводзілася ў адміністрацыйных межах сельскіх Саветаў.

«Ударны фронт». 1977. 15 лістапада.

* * *

На 10 мая 1938 г. у калектыўныя гаспадаркі аб'ядналіся 11 789 аднаасобных гаспадарак (88,7 % усёй колькасці). Калгасы апрацоўвалі 95 % ад агульнай плошчы ворных зямель раёна. Усяго было 207 калгасаў.

У трох МТС — Шклоўскай, Фашчаўскай і Любініцкай мелася 126 трактароў, 15 збожкаўборачных камбайнаў, 35 ільноцерабілак, нямала іншай сельгастэхнікі. Калгасы мелі 15 грузавых аўтамабіляў.

«Ударны фронт». 1977. 6 снежня.

Партыйныя і камсамольскія арганізацыі

У 1938 г. па стану на май раённая партарганізацыя складалася з 18 пярвічных, трох кандыдацкіх груп і 14 камуністаў-адзіночак. Усяго на ўліку было 159 камуністаў. Па партстажу: з 1917 па 1920 г. — 12, з 1921 па 1925 г. — 31, з 1926 па 1929 г. — 44 чалавекі. Астатнія ўступілі ў партыю пасля 1929 г.

У раёне дзейнічала 125 пярвічных камсамольскіх арганізацый, аб'яднаўшых у сваіх радах 2134 камсамольцы.

«Ударны фронт». 1977. 6 снежня.

На службе Радзіме

Аляксей Мікітавіч Ціханаў нарадзіўся і вырас у в. Гарадзец у бядняцкай сялянскай сям'і, пазнаў цяжкую працу. З-за яе было не да вучобы. Юнаку споўнілася 19 гадоў, калі ў 1916 г. закончыў Капыскае пачатковае вучылішча.

Неўзабаве Аляксея прызвалі ў царскую армію. Ішла імперыялістычная вайна, і амаль адразу малады салдат аказаўся на Заходнім фронце. Праявіў мужнасць пры падрыве моста, па якому перапраўляліся кайзераўскія войскі, за што быў узнагароджаны Георгіеўскім крыжам. У хуткім часе атрымаў званне малодшага унтэр-афіцэра. Дарагой цаной заплаціў салдат за ўзнагароду і званне. У баях страціў вока, быў атручаны газам. Інвалідам вярнуўся ў родную вёску.

Кастрычніцкую рэвалюцыю сустрэў з радасцю, становіцца адным з актывістаў па станаўленні ўлады Саветаў у навакольных вёсках. Раздаваў сялянам зямельныя надзелы багацеяў, канфіскаваную маёмасць, справай і словам агітаваў за свабоднае жыццё. У кастрычніку 1918 г. Ціханаў уступае ў рады Чырвонай Арміі. Інжынерная

часць, дзе ён служыў, узводзіла ўмацаваную лінію абароны пад Барысавам, а пасля масты на рэках Бярэзіна і Нёман. Узначальваў барацьбу з бандытызмам у Горацкім павеце.

Грамадзянская вайна ўрэшце закончылася. Пачаўся новы этап барацьбы за Савецкую ўладу на Шклоўшчыне. Аляксея Мікітавіча прызначаюць сакратаром Гарадзецкага сельсавета. Пазней працаваў старшынёй рабінай зямельнай камісіі, загадчыкам земельнага аддзела і намеснікам старшыні Шклоўскага райвыканкома. У 1926 г. звязаў свой лёс з партыяй Леніна. На пачатку 30-х гадоў яго прызначылі старшынёй Крычаўскага райвыканкома. Клопатаў прыбавілася, а ведаў не хапала. Папрасіўся на вучобу. Закончыў Мінскі дарожны тэхнікум. Затым працаваў загадчыкам дарожнага аддзела Шклоўскага райвыканкома. Пад яго кіраўніцтвам рамантаваліся і будаваліся новыя дарогі. Тры апошнія гады перад вайной узначальваў Магілёўскі абласны дарожны аддзел, быў загадчыкам транспартнага аддзела абкома партыі.

...Пачалася Вялікая Айчынная вайна. Карані гітлераўцы былі ўжо на подступах да Магілёва, а дэсантныя групы фашыстаў высаджваліся за дзесяткі кіламетраў на Усход ад яго. А. М. Ціханаву даручылі даставіць архіўныя дакументы абкома партыі ў Тамбоў. Адказнае заданне было выканана, а ў канцы ліпеня 1941 г. Аляксей Мікітавіч залічаны ў дзеючую армію. У адным з баёў на Бранскім фронце быў цяжка паранены. Пасля шпіталю накіроўваецца ў глыбокі тыл, у Башкірскую АССР. Там сустрэў і сваю сям'ю, якая была эвакуіравана на пачатку вайны з Магілёва. Зноў партыйная работа на пасадзе другога сакратара Куюргазінскага райкома партыі. «Усё для фронту, усё для перамогі!» — пад такім дэвізам працавалі работнікі тылу. Тыднямі не мог наведаць сям'ю. Сустрэчы і выступленні ў калектывах, справы на прамысловых прадпрыемствах, у калгасах і саўгасах не пакідалі часу для адпачынку. Затое на фронт ішлі эшалоны з хлебам і мясам, мабілізаванымі воінамі, тэхнікай і абмундзіраваннем.

Пачатак верасня 1942 г. Тэлеграма з Масквы Башкірскаму абкому партыі: «Накіруйце ў распараджэнне ЦК КП(б) Беларусі А. М. Ціханава». І вось сустрэча ў Маскве з адказнымі работнікамі апарата ЦК КП(б)Б, якая закончылася вучобай у спецшколе адной з воінскіх часцей. І зноў баявое заданне. У камандзіровачным прадпісанні, выдадзеным Беларускім штабам партызанскага руху 23 лютага 1943 г., было сказана: «...т. Ціханаў Аляксей Мікітавіч камандзіруецца на аэрадром Бухары для арганізацыі ўсёй работы, звязанай з адпраўкай боепрыпасаў у тыл праціўніка, у партызанскія атрады Беларусі...». Дзесяткі тон патрэбных народным мсціўцам грузаў адправіў Аляксей Мікітавіч самалётамі ў родную Беларусь. Нямала зрабіў А. М. Ціханаў як прадстаўнік Беларускага штаба партызанскага руху, у час барацьбы Чырвонай Арміі і партызан за вызваленне Беларусі.

Баявы шлях ветэрана — абаронцы Радзімы — адзначаны двума ордэнамі Чырвонай Зоркі і многімі медалямі.

М. Ільюшэнка

* * *

Дэлегатам II Усесаюзнага з'езда калгаснікаў-ударнікаў (люты 1932 г.) ад Шклоўскага раёна была ўдарніца перадавога калгаса «Зара» Стара-Вадвянскага сельсавета Марыя Фёдараўна Кузняцова.

* * *

У сакавіку 1935 г. адбыўся раённы злёт калгаснікаў-ударнікаў.

Былі першымі стаханаўцамі

Шырокі размах прыняў у раёне стаханаўскі рух. На папяровай фабрыцы «Спартак» у 1935 г. намнога перавыконвалі нормы выпрацоўкі Шляхота, Чыжэўскі, Манцэвіч, Рыжанкоў.

* * *

У Фашчаўскай МТС прыклад у рабоце паказала трактарная брыгада № 1, якую ўзначальваў Суслаў. За 10 месяцаў 1935 г. выпрацоўка ў пераводзе на мяккае ворыва склала 1784 га пры гадавым заданні 1440 га. Высокай выпрацоўкі і эканоміі паліва дабіліся трактарысты Голубеў і Храпановіч.

* * *

Стаханаўка Кундалёва з калгаса «Ленінскі шлях» Чарнаруцкага сельсавета за дзень

апрацоўвала па 13—15 кг ільновалакна пры норме 4—5 кг. Ільнотрапальшчыца калгаса «Перамога» Александрыйскага сельсавета Анастасія Гаваркова, прымяняючы стаханаўскія метады па апрацоўцы лёну, за дзень, 6 снежня, натрапала 68 кг валакна. Па 42—55 кг валакна на рахунку ў гэты дзень у Ганны Сматрыцкай, Ульяны Анікеевай, Еўдакіі Архіпавай. За праяўленую ініцыятыву і першынство ў барацьбе за выкананне высокіх норм, працоўны гераізм і выдатныя поспехі ў павышэнні прадукцыйнасці працы па апрацоўцы лёну пастановай ЦК КП(б)Б і Савета Народных Камісараў БССР стаханаўкі-льнаводкі калгаса «Перамога»: А. Гаваркова ўзнагароджана граматай ЦВК і СНК БССР (а крыху пазней — ордэнам «Знак пашаны») і прэміравана швейнай машынай, А. Архіпава, У. Анікеева — грамatамі ЦВК і СНК БССР і прэміраваны патэфонамі, А. Сматрыцкая — швейнай машынай.

Па матэрыялах газеты «Прамень камунізму». Жнівень — снежань 1935 г.

Масавы працоўны энтузіязм

На вёсцы першымі ў нашым раёне пачалі працаваць па-стаханаўску калектывы малочнатаварных ферм калгасаў імя Кірава Славенскага, імя Фрунзе Гарадзецкага, «Зара» Стара-Вадвянскага сельсаветаў.

У пачатку 1936 г. ЦВК СССР узнагародзіў ордэнамі перадавікоў жывёлагадоўлі краіны. Ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга — першая ў раёне такая высокая ўзнагарода — быў уручаны загадчыку малочнатаварнай фермы калгаса імя Кірава Славенскага сельсавета Івану Адамавічу Клімянкову. Ён быў дэлегатам Усесаюзнай нарады жывёлаводаў у Маскве. З выпадку ўручэння ўзнагароды СНК БССР прыслаў яму прывітанне: «Віншуем Вас, Іван Адамавіч Клімянкоў, з высокай узнагародай — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, якім Вас узнагародзіў урад Саюза ССР за Вашу выдатную працу па ўздыму сацыялістычнай жывёлагадоўлі. Ваша праца і высокая ўзнагарода Вас павінны быць прыкладам для калгаснікаў... Жадаем далейшых поспехаў у Вашай працы!»

У летапіс народнай славы ўвайшлі імёны другіх пачынальнікаў стаханаўскага руху сярод жывёлаводаў: свінаркі калгаса імя Фрунзе Гарадзецкага сельсавета М. Ф. Кадушкінай, загадчыка конегадоўчай фермы калгаса «Зара» Стара-Вадвянскага сельсавета Н. П. Носава, даяркі калгаса «Прыют» Каменна-Лаўскага сельсавета А. М. Стрыжанавай, загадчыка авечкагадоўчай фермы калгаса «Ударнік» Славенскага сельсавета П. Ф. Арашкова.

Працаваў па-стаханаўску калектыў жывёлагадоўчай фермы калгаса «Молат» Славенскага сельсавета, дзе загадчыцай была Марыя Аўрамаўна Манькова. Пасля заканчэння тэхнікума яна працавала ў раёне да выхаду на пенсію ўчастковым заатэхнікам райземаддзела, удзельнічала ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы.

Шырокі размах набыў стаханаўскі рух сярод механізатараў раёна. Аднаму з першых гэтае ганаровае званне было прысвоена па выніках работы за 1935 г. трактарысту Шклоўскай МТС Іпаліту Восіпавічу Цымбарэвічу. Яшчэ ў 1928 г. ён уступіў у камуну імя Молатава ў яго роднай вёсцы Лутна. Дзяржава выдзеліла маладой гаспадарцы трактар «Фардзон». Два гады працаваў Цымбарэвіч на ім у камуне. А калі была арганізавана Шклоўская МТС, яго паслалі на курсы па падрыхтоўцы трактарыстаў для работы на айчынных трактарах маркі «Пуцілавец». Пасля вучобы амаль па тры нормы выконваў малады трактарыст. Потым зноў вучоба на курсах брыгадзіраў пры Белсельгасакадэміі. Яго трактарная брыгада заўсёды заваёўвала першынство. У перадваенным 1940 г. брыгада выканала гадавое заданне на 136 %. Іпаліта Восіпавіча ўзнагародзілі граматай Наркамзема рэспублікі і ўручылі яму грашовую прэмію. Ветэран Айчыннай вайны аднаўляў разбураную акупантамі МТС, працаваў тут да канца свайго жыцця.

Зайздросны лёс і ў стаханаўца 30-х гадоў брыгадзіра трактарнай брыгады гэтай жа МТС Георгія Дзядкова. За высокія паказчыкі ў працы ён быў у 1940 г. удзельнікам Усесаюзнай сельгасвыстаўкі. Не змяніў сваёй прафесіі і пасля вайны. Па ўсіх паказчыках брыгада заўсёды перакрывала заданні. У 1955 г. Георгія Дзядкова выбралі дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР.

У Фашчаўскай МТС адну з трактарных брыгад узначальваў Антон Сімпліцыянавіч Суслаў. План веснавых палявых работ у 1935 г. калектыў брыгады выканаў на 113 %. Кожны механізатар да канца года даваў выпрацоўку на трактар да 445 га пры норме 260.

М. Ільюшэнка. «Ударны фронт». 1985. 15 жніўня.

МІЦКЕВІЧ Анастасія Георгіеўна. Звеннявая стаханаўскага звяна калгаса «Запаветы Леніна» Александрыйскага сельсавета. Вырошчвала лён на 10 га. На кожным з іх было атрымана па 10,3 ц ільновалакна і 8 ц ільносемя. Яе прадукцыя экспанавалася на сельгасвыстаўцы ў Маскве. У 1938 г. А. Г. Міцкевіч была выбрана дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У 1939 г. узнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга, была ў ліку дэлегатаў ад рэспублікі на адкрыцці Ферганскага канала. Пасля Вялікай Айчыннай вайны працавала старшынёй Александрыйскага сельсавета.

А. Г. Міцкевіч

* * *

У пачатку лютага 1936 г. адбылася Усесаюзная нарада па жывёлагадоўлі. Ад Шклоўскага раёна на ёй удзельнічалі І. А. Клімянкоў, свінарка калгаса імя Фрунзе Гарадзецкага сельсавета М. Е. Кадушкіна, загадчык конегадоўчай фермы калгаса «Зара» Стара-Вадвянскага сельсавета Н. П. Носаў, старшыня калгаса «Прыют» Каменна-Лаўскага сельсавета Н. П. Аладдзеў, даярка гэтай жа гаспадаркі А. М. Стрыжанава, загадчык авечкагадоўчай фермы калгаса «Ударнік» Славенскага сельсавета П. Ф. Арашкоў.

«Ударны фронт». 1977. 1 лістапада.

З ПРАТАКОЛА ПАСЯДЖЭННЯ АРГКАМІТЭТА ПРЭЗІДЫУМА ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР ПА МАГІЛЁЎСКАЙ ВОБЛАСЦІ АД 10 МАЯ 1939 ГОДА

Зацвердзіць кандыдатамі на ўдзел ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы ад Шклоўскага раёна:

Калгас «Перамога» Каменна-Лаўскага сельсавета, дзе атрымана ў 1937 г. з плошчы 32 га ільновалакна 116,44 ц, а ў 1938 г. з плошчы 27 га валавы збор склаў 120,15 ц;

ГЛАДЗІКАВА Аляксея Кузьміча — старшага механіка Фашчаўскай МТС за своечасовы і дабраякасны рамонт трактароў у 1937—1939 гг., якія прыняты дзяржаўнай камісіяй з адзнакай «добра»;

ІВАНОВУ Еўдакію Апанасаўну — звеннявую калгаса імя Варашылава Мікіцініцкага сельсавета, якая атрымала ўраджай з 1 га ў 1937 г.— 9,5 ц ільновалакна, а ў 1938 г.— 8,2 ц;

ЩІНА Гіршу Вульфавіча — рахункавода калгаса «Іскра» Рыжкавіцкага сельсавета, які дабіўся значнага скарачэння адміністрацыйна-гаспадарчых расходаў;

РОЯК Зафіру Аронаўну, якая ў 1937—1938 гг. абслугоўвала племферму калгаса «Чырвоны ўдарнік» Гарадзецкага сельсавета. У выніку стараннай работы атрымала ў сярэднім за 2 гады па 15 парасят на адну свінаматку;

ЧАРНЯЎСКАГА Сямёна Якаўлевіча — трактарыста Фашчаўскай МТС, выпрацаваўшага за змену на трактары ХТЗ больш за 360 га і зэканоміўшага пры гэтым 277,5 кг паліва. Работа яго прынята з адзнакай «добра».

«Ударны фронт». 1989. 25 сакавіка.

УДЗЕЛЬНІКІ УСГВ У 1940 г.

Самая большая колькасць іх была з вёсак цяперашняга калгаса імя Леніна — 8 чалавек. Сярод іх — звеннявая Еўдакія Карпаўна Зубрыновіч, якая ў 1939 г. выпрацавала 375 працадзён і атрымала ўраджайнасць ільновалакна 6 цэнтнераў з гектара на пло-

шчы 5 га; брыгада Івана Гаўрылавіча Ільюшэнкі вырасціла на кожным гектары па 5,7 ц ільновалакна на плошчы 29,5 га, брыгадзір быў удзельнікам выстаўкі. У Ганаровую кнігу УСГВ таксама занесены цялятніца Пелагея Антонаўна Капышава, старшыня праўлення калгаса Піліп Аляксандравіч Крупін, садавод Піліп Апанасавіч Паніфедаў, брыгадзір Дзмітрый Якаўлевіч Смаргуноў.

Пяць чалавек занесены ў Ганаровую кнігу УСГВ з вёсак калгаса «Радзіма». Звеннявыя Анастасія Платонаўна Пракопава і Ніна Фёдараўна Каляснёва ўдастоены такога гонару за тое, што ў 1938 г. вырасцілі на кожным гектары па 11,9 ц ільнасемя. Былі ўдзельнікамі выстаўкі таксама загадчык авечкагадоўчай фермы Емяльян Дзмітрыевіч Кунакін, старшыня былога калгаса «Ленінскі шлях» Сямён Нікіфаравіч Аўдзеенка.

Былі ўдзельнікамі выстаўкі і прадстаўнікі вёсак калгаса імя Кірава: загадчык авечкагадоўчай фермы Іван Емяльянавіч Кавалькоў, цялятніца Сцепаніда Тарасаўна Нікіціна, аўчар Уладзімір Іванавіч Афіцэраў, старшыня калгаса Антон Цімафеевіч Прохараў.

Славіліся да вайны і сельскія працаўнікі вёсак калгаса «Перамога». Сярод удзельнікаў выстаўкі былі брыгадзір-садавод Сцяпан Васільевіч Якаўлеў, аўчар Панцеляймон Мартынавіч Стральцоў, звеннявая па лёну Марыя Іванаўна Абрамовіч.

Усяго з раёна занесена ў Ганаровую кнігу УСГВ 1940 г. больш за 70 перадавікоў сельскай гаспадаркі.

«Ударны фронт». 1967. 17 студзеня.

ПАСЛАНЕЦ ПЕРШАЙ СЕЛЬГАСВЫСТАЎКІ

У суровыя гады грамадзянскай вайны пачалі ўзнікаць калектыўныя гаспадаркі — сельскагаспадарчыя камуны, арцелі, таварыствы па супольнай апрацоўцы зямлі. Першае такое аб'яднанне ў былой Шклоўскай воласці было створана рабочымі папяровай фабрыкі на землях памешчыка Крывашэіна. З 1921 па 1924 г. гэтую гаспадарку ўзнаваў арганізатар і кіраўнік Савецкай улады ў воласці Аляксандр Іванавіч Спіцкі. Гаспадарка вялася дбайна і была паказальная. Удзельнік першай Усесаюзнай нарады па пралетарскім земляробстве, якая адбылася ў 1923 г. у Маскве, А. І. Спіцкі прадстаўляў гэтую гаспадарку на І сельскагаспадарчай выстаўцы.

Калектыўная гаспадарка папернікаў, якая атрымала назву «Іскра», напачатку развівалася марудна і была на грані распаду. Умелы арганізатар А. І. Спіцкі, вярнуўшыся з франтоў грамадзянскай вайны, змог залучыць бядняцкія яўрэйскія гаспадаркі, дробных рамеснікаў, рабочыя прадпрыемствы. Былі набыты амаль усе сельгасмашыны і прылады. Яны ў значнай ступені аблягчалі працу. Гэта — жняркі-снопавязалкі, касілкі, бульбакапалкі, камбінаваная малатарня. Члены арцелі апрацоўвалі 222 га зямлі, мелі 41 га натуральных сенакосаў. У іх было 124 галавы буйной рагатай жывёлы, звыш 40 коней.

Статыстыка не захавала даных па прадуктыўнасці статка. А вось па ўраджайнасці зерневых хлебаробы дасягнулі значных поспехаў. З кожнага гектара збіралі па 13—15 ц амбарнага зерня. Інтэнсіўнае развіццё набыло агародніцтва і садаводства.

У «Іскру» ехалі, каб пераняць вопыт. А павучыцца тут было чаму. Прымянялася здзельнае размеркаванне працы і аплаты яе па разрадах у залежнасці ад аб'ёмаў выкананых работ. Добра была пастаўлена культурна-асветніцкая работа. Усе дзеці вучыліся на сродкі арцелі, летам арганізоўваліся дзіцячыя пляцоўкі і яслі. У гарачы час работ працавала сталовая.

«Ударны фронт». 1983. 3 лістапада.

КАНДЫДАТЫ НА УСГВ 1941 г.

Па выніках работы за 1940 г. кандыдатамі на Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку 1941 г. былі вылучаны: трактарыст Любініцкай МТС А. А. Васіленка, слесар гэтай МТС Г. Е. Рабека, цялятніца калгаса «Новае жыццё» Старасельскага сельсавета Е. І. Беляковіч, цялятніца калгаса «Чырвоная ніва» Рыжкавіцкага сельсавета П. А. Капышава, цялятніца калгаса «Праўда» Рыжкавіцкага сельсавета А. Н. Савіцкая і ўсе работнікі зямельнага атрада, якія забяспечылі ўвядзенне севазваротаў у 138 калгасах раёна.

«Ударны фронт». 1977. 20 снежня.

Жыхары Шклоўскага раёна — ахвяры беспадстаўных палітычных рэпрэсій 1930—1950 гг.

Складаныя абставіны склаліся на Шклоўшчыне, як і ва ўсёй краіне, у надзвычай супярэчлівыя 30-я гады. З аднаго боку — аб гэтым красамоўна сведчаць матэрыялы і дакументы, змешчаныя ў хроніцы «Памяць», — упартая, самаадданая праца па ажыццяўленні планаў першых, перадваенных пяцігодак. Людзі радаваліся поспехам, якія ўдавалася дасягнуць калектывам прадпрыемстваў. Менш стала «перагібаў» у развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. Няпроста і нялёгка прайшоўшая калектывізацыя змяніла ўвесь уклад сялянства, масы насельніцтва на сацыялістычных асновах. Паступова адыходзілі ў нябыт непісьменнасць, бескультур'е. У цэхі прадпрыемстваў, на калгасныя палі і будаўнічыя пляцоўкі прыйшло новае пакаленне, якое вырасла ўжо пры савецкай уладзе, настойліва імкнулася да новага жыцця, светлай будучыні, аб якой марыла пакаленне бацькоў. Не ўсё, чаго жадалі, здзяйснялася, і тым не менш людзі радаваліся ўсяму, што дапамагала жыць лепш і весялей», як калісьці спявалі. Так было, дакладней, хацелася, каб было.

Але ж сапраўднасць мела (аб чым у хроніцы нямала сказана) і адваротную старонку: прыносіла не толькі добрае, а і многа гора для людзей. Гаворка ідзе аб трагічным лёсе сотні грамадзян раёна, несправядліва абвінавачаных у «шпіянажы і шкодніцтве», іншых «грахах». Рэалізацыя вядомага тэзіса Сталіна аб абвастрэнні класавай барацьбы на меры руху да сацыялізму, дэфармацыя ўлады, беззаконне, як і многія іншыя фактары, — усё гэта нанесла краіне велізарную шкоду, прывяло да масавых рэпрэсій супраць дастойных людзей — партыйных, савецкіх і гаспадарчых кіраўнікоў, настаўнікаў, культпрасветработнікаў, медыкаў, рабочых і сялян. Трагічнымі былі «метады» правядзення суцэльнай калектывізацыі, барацьбы з кулацтвам. Менавіта тады, асабліва у 1937—1938 гг., была арыштавана, накіравана ў ВПЛ, выслана за межы рэспублікі, знішчана найбольшая колькасць жыхароў Шклоўшчыны. Нездарма трыццатыя гады ўвайшлі ў нашу гісторыю як гады «вялікага тэрору», жорсткай дзейнасці судовых, а ячэ ў большай меры пазасудовых органаў: «дваек», «троек», асобных нарад, калегій АДПУ, НКУС, КДБ і інш. Палітычныя рэпрэсіі надоўга ўсялілі ў свядомасць многіх жыхароў падазронасць, недавер'е, страх. Людзі вырошчвалі хлеб, гадавалі дзяцей, займаліся мірнай стваральнай працай і раптам станавіліся «ворагамі народа», страчвалі свабоду, часта жыццё. Якія толькі абвінавачванні не прыпісваліся ім: і ўдзельнікі «антысавецкіх, дыверсійна-тэрарыстычных, контррэвалюцыйных арганізацый», і «агенты замежных разведак». Прыцягваліся да адказнасці за антысавецкую прапаганду, распаўсюджанне контррэвалюцыйных чутак, агітацыю супраць калгасаў, шкодніцтва і інш.

Няпроста было тады разабрацца у тым, што адбывалася. Многія верылі, што быццам сярод нас жывуць ворагі, таму падтрымлівалі органы НКУС, КДБ, якія, уласна кажучы, вялі «непрымірымую» барацьбу з імі ж. Толькі праз гады мы даведаліся праўдзіва аб тых, хто без віны загінуў у турмах, спецпасяленнях, засценках НКУС. Сотні сялян раёна аказаліся рэпрэсіраванымі ў адміністрацыйным парадку (раскулачаны) і высланы на Поўнач, Урал, у Сібір...

Справядлівасць, аднак, узяла верх: у 1950—1970-х гг. многія з неабгрунтавана рэпрэсіраваных рэабілітаваны. Людзям вяртаюць іх чэсныя імёны. Работа гэта складаная, яна ўсё яшчэ працягваецца: некаторыя справы ўдакладняюцца, правяраюцца.

У мэтах справядлівасці, увекавечання памяці ахвяр рэпрэсій спісы рэабілітаваных жыхароў Шклоўскага раёна друкуюцца у хроніцы «Памяць».

АБЛАЖЧЫКАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1891 у в. Ст. Вадва, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АБЛОЖЫКАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1891 у в. Ст. Вадва, аднаасобнік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АБРАЖЭЕЎ Міхаіл Сазонавіч, н. у 1886 у в. Патапава. Рэпрэсіраваны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989 г.

АБРАЖЭЕЎ Яфім Міхайлавіч, н. у 1890 у в. Сапронькі. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

АБРАМОВІЧ Пракоп Ануфрыевіч, н. у 1901 у в. Лотва, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АБРАМОВІЧ Іван Васільевіч, н. у 1903 у в. Лотва, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АГАФОНАЎ Пётр Паўлавіч, н. у 1907 у в. Барыскавічы, старшыня калгаса. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АДАШЧЫК Канстанцін Лукіч, н. у 1894 у в. Манькава, калгаснік. Асуджаны на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

АКІНЦІНАЎ Іван Іванавіч, н. у 1900 ў в. Гарадзішча, аднаасобнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

АКУЛАЎ Аляксей Ігнатавіч, н. у 1908 у в. Мікалаеўка, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АКШЭЎСКІ Міхаіл Казіміравіч, н. у 1878 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

АЛАДЗЕЎ Рыгор Максімавіч, н. у 1891 у в. Падкняжанне. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛДАНАЎ Ігнат Самуйлавіч, н. у 1898 у в. Саведенкі. Арыштаваны ў 1921. Рэабілітаваны.

АЛДАНАЎ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1870 у в. Саведенкі, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЕЙНІКАЎ Іпаліт Паўлавіч, н. у 1884 у в. Слабодка. Асуджаны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1957.

АЛЕЙНІКАЎ Антон Станіслававіч, н. у 1887 у в. Слабодка. Рэпрэсіраваны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЕЙНІКАЎ Вікенцій Сцяпанавіч, н. у 1898 у в. Слабодка, настаўнік Княжыцкай школы. Асуджаны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

АЛЕЙНІКАЎ Іван Іванавіч, н. у 1876 у в. Слабодка. Рэпрэсіраваны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЕЙНІКАЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1893 у в. Слабодка. Рэпрэсіраваны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЕШЧЫК Канстанцін Лукіч, н. у 1894 у в. Нядведка Навагрудскага пав., калгаснік в. Манькава. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

АЛЁШЫН Мікалай Сяргеевіч, н. у 1899 у Маскве, жыхар Шклова, аднаасобнік. Асуджаны ў 1932 на 3 гады высылкі ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

АЛЯХНОВІЧ Баніфацый Францавіч, н. у 1899 у в. Аляксандраўка, старшыня калгаса. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959.

АНАНЬЕЎ Мікіта Іванавіч, н. у 1878 у в. Любінічы, земляроб. Арыштаваны ў 1932, асуджаны на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

АНДРОСАЎ Васіль Іванавіч, н. у 1890, слесар Шклоўскага льнозавода. Асуджаны ў 1934 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

АНІСІМАЎ Андрэй Андрэевіч, н. у 1875 у в. Клін, члены сям'і: **Еўдакія Аксёнаўна,** н. у 1879, **Вера,** н. у 1916, **Марыя,** н. у 1918, **Анастасія,** н. у 1919, **Віктар,** н. у 1921, **Клаўдзія,** н. у 1924. Сасланы ў 1930 у Свярдлоўскую вобл. Рэабілітаваны ў 1993.

АНІХІМОЎСКІ Мартын Пятровіч, н. у 1883 у в. Балбасава Аршанскага р-на, токар папяровай ф-кі «Спартак». Асуджаны ў 1936 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1959.

АНТОНЧЫКАЎ (АНТАНОВІЧ) Трафім Фадзеевіч, н. у 1897 у в. Тударава, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

АНЦІПЁНКА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1892, жыхар Шклова, загадчык агароднінай базы раённай нарыхтоўчай канторы. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1970.

АРАШКОЎ Іван Піліпавіч, н. у 1870 у в. Стараселле, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

АРЖАНОВІЧ Канстанцін Іванавіч, н. у 1875 у в. Чамаданы. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

АРЖАНОВІЧ Леанід Восіпавіч, н. у 1913 у в. Чамаданы, ваеннаслужачы. Асуджаны ў 1945 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

АРЛОВІЧ Іван Антонавіч, н. у 1874 у в. Зароўцы, прыёмшчык агародніны райзага. Арыштаваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1938.

АРЛОВІЧ Восіп Мікалаевіч, н. у 1880 ў в. Зароўцы, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АРЛОВІЧ Антон Фёдаравіч, н. у 1864 у в. Зароўцы, калгаснік. Асуджаны на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АРЛОЎ Сяргей Іванавіч, н. у 1883, члены сям'і: **Вольга Ягораўна,** н. у 1882, **Мікалай Сяргеевіч,** н. у 1909, **Вера Сяргееўна,** н. у 1911, **Андрэй Сяргеевіч,** н. у 1917 — жыхары в. Гарадзішча. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

АСІПЁНАК Яфім Емяльянавіч, н. у 1890 у в. Крывая Гродзенскай вобл., цясляр на будоўлі дзіцячых ясляў у Шклове. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

АТРОШКІН Герасім Максімавіч, н. у 1909 у в. Гавяды, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АТРОШКІН Дзмітрый Антонавіч, н. у 1891 у в. Гавяды, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АТРОШКІН Васіль Лявонавіч, н. у 1887 у в. Аўчыненкі, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎХІМКОЎ Сяргей Ільіч, н. у 1879, у в. Навасёлкі, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎХІМКОЎ Антон Ільіч, н. у 1894 у в. Навасёлкі, земляроб. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АЎХІМКОЎ Сяргей Ільіч, н. у 1878. у в. Навасёлкі, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

АФАНАСЬЕЎ Мікалай Якаўлевіч, н. у 1874 у в. Стараселле, святар. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны 16.01.1989.

АХАНЬКОЎ Міхаіл Іванавіч, н. у 1881 у в. Пударава, аднаасобнік, арыштаваны ў 1937, асуджаны на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАБІЧАЎ Пётр Яўсеевіч, н. у 1876 у в. Заполле. Асуджаны ў 1933 на высылку на 3 гады ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

БАБІЧАЎ Ягор Пятровіч, н. у 1906, у в. Заполле, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАБРОЎ Карп Ціханавіч, н. у 1875 у в. Палывавічы, калгаснік. Асуджаны на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

БАГАЙСКІ Станіслаў Іванавіч, н. у 1873 у в. Камаровічы Мазырскага пав., электраманцёр папяровай ф-кі «Спартак». Асуджаны ў 1936 на 6 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

БАГДАНОЎСКАЯ Алена Венядзіктаўна, члены сям'і: **Ігнат Іванавіч, Ганна Іванаўна, Антаніна Іванаўна, Вікенцій Іванавіч** — жыхары в. Бабравінне. Раскулачаны ў 1930, сасланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны ў 1992.

БАЙДАКОЎ Міхаіл Дзмітрыевіч, н. у 1922 у в. Шэоўцы, працаваў на шахтах Украіны. Асуджаны на 10 гадоў пазбаўлення волі ў 1948. Рэабілітаваны ў 1964.

БАНДАРКОЎ Аляксей Мінавіч, н. у 1875 у в. Камароўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

БАРАНАЎ Якаў Лук'янавіч, н. у 1892 у в. Мілінічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

БАРАНАЎ Яўхім Аўрамавіч, н. у 1868 у в. Дайнава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1931 на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1992.

БАРАНІНКАЎ Яўсей Антонавіч, н. у 1896 у в. Зарэчча, настаўнік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

БАРКОЎ Ерафей Цітавіч, н. у 1883 у в. Дабрэйка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1966.

БАРЫСЕВІЧ Адам Ануфрыевіч, н. у 1890 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1949 на высылку ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1962.

БАРЫСЕВІЧ Адам Ануфрыевіч, н. у 1892 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

БАРЫСЕВІЧ Мікалай Ануфрыевіч, н. у 1902 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

БАСКОВА Надзея Іванаўна, н. у 1922 у в. Горкі, рахункавод ільнозавода. Асуджана на 8 гадоў ВПЛ. Рэабілітавана ў 1963.

БАТУРЭВІЧ Сяргей Паўлавіч, н. у 1881 у в. Стараселле. Асуджаны ў 1929 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

БАХАНЬКОЎ Ягор Пятровіч, н. у 1898 у в. Ст. Вадва, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БАШАНКОЎ Георгій Палікарпавіч, н. у 1886 у в. Ордаць, настаўнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕДУШЭЎСКІ Піліп Васільевіч, н. у 1883 у в. Ларoўцы. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕКАРЭВІЧ Павел Аляксеевіч, н. у 1883 у в. Юрцава Аршанскага р-на, святар, жыў на стн. Шклоў. Асуджаны ў 1930 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

БЕЛЯКОВІЧ Мацвей Восіпавіч, н. у 1891 у в. Каменка, селянін. Арыштаваны і расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

БЕЛЯКОВІЧ Ягор Ісаевіч, н. у 1879 у в. Каменка, селянін. Асуджаны ў 1929 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

БІРУКОЎ Мікалай Андрэевіч, н. у 1889 у в. Ждановічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1964.

БЛІЗНЯКОЎ Восіп Маркавіч, н. у 1888 у в. Бярозаўка Бялыніцкага р-на, жыў у в. Смятанічы. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1961.

БЛУНОЎ Карл Якаўлевіч, н. у 1891 на хут. Цэнас (Латвія), калгаснік в. Башкіраўка. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

БОБЫСЛЕЎ Панарыл Ферасавіч, н. у 1882 у в. Цвіркава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1934 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БОЛБАРАЎ Дзмітрый Дзмітрыевіч, н. у 1896 у в. Стрыеўка Гродзенскай вобл., калгаснік в. Любінічы. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БОРШ Андрэй Канстанцінавіч, н. у 1891, члены сям'і: **Міхаіл Андрэевіч,** н. у 1922, **Мікалай Андрэевіч,** н. у 1928, **Лідзія Антонаўна,** н. у 1903, **Марыя Андрэеўна,** н. у 1926, **Аляксандр Андрэевіч,** н. у 1930 — жыхары в. Папоўцы. Раскулачаны ў 1930 і сасланы ў Пермскую вобл. Рэабілітаваны ў 1992.

БРАКАЎ Ерафонт Цітавіч, н. у 1883 у в. Дабрэйка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1966.

БРЫКУНОЎ Макар Гаўрылавіч, н. у 1906 у в. Завараты, калгаснік. Асуджаны ў 1931 на высылку. Рэабілітаваны ў 1989.

БУГАЕВІЧ Іван Ігнатавіч, н. у 1876 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

БУГАЁЎ Якаў Цімафеевіч, н. у 1894 у в. Ордаць, калгаснік. Арыштаваны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1990.

БУРАНКОЎ Рыгор Нікіфаравіч, н. у 1885 у в. Рудзіцы. Арыштаваны ў 1937, расстраляны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1958.

БУРАНКОЎ Рыгор Нікіфаравіч, н. у 1885 у в. Рудзіцы, фельчар Каменна-Лаўскага медпункта. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

БУРДЗІЛОЎСКІ Сцяпан Васільевіч, н. у 1883 на хут. Сады, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930, сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1964.

БУРДЗІЛОЎСКІ Мікалай Васільевіч, н. у 1879 на хут. Сады, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930, сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1964.

БУТРАМЕНКА Іван Якаўлевіч, жыхар в. Кадзевічы, раскулачаны ў 1932. Рэабілітаваны ў 1992.

БУТРАМЕНКА Антон Васільевіч, н. у 1911 у в. Папоўцы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

БУТРАМЕНКА Васіль Іванавіч, н. у 1885 у в. Папоўцы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930, сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

БУТРАМЕНКАЎ Віктар Восіпавіч, н. у 1902

у в. Папоўцы, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны.

БЫКОЎСКІ Іван Іванавіч, н. у 1906 у в. Лотва, земляроб. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

БЫЧКОЎ Міхаіл Антонавіч, н. у 1884 у в. Цейца Люблінскай губ. (Польшча), калгаснік В. Рыжкавічы. Асуджаны ў 1938. Рэабілітаваны ў 1960.

БЯЛЕВІЧ Фелікс Восіпавіч, н. у 1875 у маёнтку Сухі Бор Вільнюскага р-на, рэзчык папяровай ф-кі «Спартак». Асуджаны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

БЯРОЗКА Захар Стэфанавіч, н. у 1895 у в. Н. Брашчына, члены сям'і: **Марыя Кузьмінічна, Іван Захаравіч,** н. у 1923, **Вольга Захараўна,** н. у 1918. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1995.

ВАЙЦУЛЕВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1875 у в. Даргелева Дрысенскага пав. Віцебскай губ., пенсіянер в. Падбор'е. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959.

ВАЛУСЬКА Нікіфар Пятровіч, н. у 1884 у в. Гавяды, святар. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАЛЧКОЎ Анісім Ігнатавіч, н. у 1903 у в. Капысіца, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

ВАЛЧКОЎ Навум Ігнатавіч, н. у 1898 у в. Капысіца, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

ВАЛЧКОЎ Васіль Ігнатавіч, н. у 1889 у в. Засценак, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

ВАРАНОВІЧ Восіп Андрэевіч, н. у 1896 у в. Гвалтоўнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ВАРЭНІКАЎ Яўсей Антонавіч, н. у 1896 у в. Зарэчча, настаўнік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ВАСІЛЕЎСКІ Фёдар Іванавіч, н. у 1897 у в. Забудзькі Асіповіцкага р-на, электрык стн. Шклоў. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ВАСІЛЕНКА Апанас Лук'янавіч, н. у 1885 у в. Н. Стайкі, рабочы. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕЎСКІ Панцеляймон Фролавіч, н. у 1870 у в. Дубраўка. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

ВАСІЛЬЕЎ Васіль Мікалаевіч, н. у 1896 у в. Таўкачы, калгаснік. Асуджаны ў 1936. Рэабілітаваны ў 1958.

ВАСІЛЬЕЎ Якаў Міхайлавіч, н. у 1873 у в. Барыскавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 з пазбаўленнем права пражывання ў асобных зонах СССР тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЬЕЎ Гаўрыла Васільевіч, н. у 1870 у в. Карасі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАСІЛЕНКА Рыгор Іванавіч, н. у 1865 у в. Уланава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ВАШЧАНКА Апанас Паўлавіч, н. у 1912 у в. Курына Віцебскага р-на, механік ільнозавода. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1968.

ВЕРАБ'ЁЎ Рыгор Пятровіч, н. у 1925 у с. Прыгоннікі. Асуджаны ў 1942 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1964.

ВЕРАМЕЕЎ Пётр Іванавіч, н. у 1904 у в. Слабодка, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ВЕРАМЕЕЎ Антон Маркавіч, н. у 1898 у в. Слабодка, калгаснік. Арыштаваны ў 1933, асуджаны на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

ВЕРХАЎЦОЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1906 у в. Трэгушкі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЕРЦЯХОЎСКІ Браніслаў Іванавіч, н. у 1884, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВІЛЬЧЫК Трафім Трафімавіч, н. у 1877 у в. Таперкі Гродзенскай губ., вартаўнік райспажыўсаюза. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЙТАЎ Пётр Васільевіч, н. у 1867 у в. Н. Ждановічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930, сасланы ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1964.

ВОЛІКАЎ Фінадот Пятровіч, н. у 1875 у в. Плешчыцы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ВОЛКАЎ Лаўрэнцій Паўлавіч, н. у 1897 у в. Еўдакімавічы, земляроб. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ВОЛКАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1880 у в. Хілец, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Міхаіл Канстанцінавіч, н. у 1885 у в. Еўдакімавічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Міхаіл Пятровіч, н. у 1880 у в. Хілец, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Нікіфар Антонавіч, н. у 1882 у в. Уланава, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Сяргей Пятровіч, н. у 1875 у в. Кустоk, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

ВОЛКАЎ Фёдар Пятровіч, н. у 1883 у в. Хілец, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЫРВІЧ Ягор Сямёнавіч, н. у 1898 у в. Апалонаўка, калгаснік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЫРВІЧ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1872 у в. Шнараўка, калгаснік. Асуджаны ў 1932 на 3 гады пазбаўлення права пражывання ў 12 раёнах. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЫСОЦКІ Емяльян Нікіфаровіч, н. у 1877 у в. Лазіцы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЫСОЦКІ Міхаіл Кірылавіч, н. у 1880 у в. Смятанічы, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ВЯРХОЎЦАЎ Міхаіл Аляксеевіч, н. у 1906 у в. Трабушкі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Васіль Дарафеевіч, н. у 1879 у в. Паленка Аршанскага р-на, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Фама Дарафеевіч, н. у 1885 у в. Паленка Горацкага пав., жыхар в. Зарэчча, без пэўных заняткаў. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАВАЧ Аляксандр Андрэевіч, н. у в. Банкетаўка Княжыцкага сельсавета. Рэпрэсіраваны ў 1931. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛАГАЕЎ Віктар Міхайлавіч, н. у 1920 у в. Таўкачы, ваеннаслужачы. Асуджаны ў 1944 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1945.

ГАЛАНАЎ Клім Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Навасёлкі, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1961.

ГАЛЕЦКІ Дзмітрый Тарасавіч, н. у 1888 у в. Гарадок, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛІНОЎСКІ Адам Сямёнавіч, н. у 1919 у в. Лазіцы, калгаснік. Арыштаваны ў 1950, асуджаны на 25 гадоў ВПЛ. Рэабілатаваны ў 1955.

ГАЛІНСКІ Адам Сямёнавіч, н. у 1919 у в. Лазіцы, калгаснік. Асуджаны на 25 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1955.

ГАЛІНСКІ Сцяпан Васільевіч, н. у 1888 у в. М. Лазіцы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЛУБЦОЎ Захар Мікітавіч, н. у 1886 у в. Акунёўка, калгаснік. Асуджаны, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1960.

ГАНГАРУК Раман Фёдаравіч, н. у 1908 у в. Ст. Бярозава Гродзенскай вобл., рахункавод калгаса імя Валадарскага Шклоўскага р-на. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАНЧАРОЎ Антон Іванавіч, н. у 1888 у в. Крывель, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1966.

ГАПЕЕЎ Пётр Агафонавіч, н. у 1883 у в. Еўдакімавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАРУСАЎ Панас Мікітавіч, н. у 1890 у в. Благаўка, прадавец. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ГАРУСАЎ Панас Мікітавіч, н. у 1896 у в. Благаўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады перасялення ў Казахстан. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЎРУСЕЎ Пуда Трафімавіч, н. у 1872 у в. Барыскавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 з пазбаўленнем права пражывання ў асобных зонах СССР тэрмінам на 3 гады. Рэабілітаваны ў 1989.

ГАЎРУСЕЎ Павел Піліпавіч, н. у 1905 у в. Барыскавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЕНЕРАЛАЎ Цімафей Конанавіч, н. у 1897 у в. Капысіца, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГЛУШАКОЎ Васіль Панасавіч, н. у 1898 у в. Ліцвінавічы. Асуджаны ў 1933 на 3 гады працоўнага пасялення. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАКАЎ Цімафей Пятровіч, н. у 1898 у в. Шастакі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАМАКОЎСКІ Аляксандр Мікалаевіч, н. у 1893 у в. Грамакі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на 1 год ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАМАКОЎСКІ Аляксандр Еўдакімавіч, н. у 1867 у в. Грамакі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАМАКОЎСКІ Вікенцій Адамавіч, н. у 1879 у в. Канапельчыцы Талачынскага р-на, аднаасобнік в. Дубраўка. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРАНЬКОЎ Іван Міхайлавіч, н. у 1887 у в. Чамаданы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1969.

ГРАНЬКОЎ Пётр Мікітавіч, н. у 1892 у в. Дзіўнае. Асуджаны ў 1931 на 5 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1992.

ГРОМАЎ Пётр Іванавіч, н. у 1896 у в. Гарадзішча, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ГРОМАЎ Усцін Ігнатавіч, н. у 1891 у в. Гарадзішча, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ГРУШЭЦКІ Віктар Пятровіч, н. у 1881, з кулакоў. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны.

ГРЫГАРУК Купрыян Фёдаравіч, н. у 1893, аднаасобнік в. Шнараўка. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ГРЫГАРУК Раман Фёдаравіч, н. у 1908, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ГРЫШЧАНКОЎ Уладзімір Данілавіч, н. у 1889 у в. К. Лавы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ГУНКЕВІЧ Аляксандр Васільевіч, н. у 1878 у в. Зарэчны Шклоў, калгаснік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ГУНКЕВІЧ Павел Васільевіч, н. у 1885 у в. Любінічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ГУСЛЕЎ Міхаіл Ягоравіч, н. у 1904 у в. Пата нава, святар. Асуджаны ў 1937, расстраляны Рэабілітаваны ў 1966.

СУРГАНАЎ Сяргей Ісакавіч, н. у 1899 у в. Дзіўнава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

СУЧКОЎ Ілья Міхайлавіч, н. у 1880, члены сям'і: **Вольга Міхайлаўна,** н. у 1883, **Любоў Ільінічна,** н. у 1914, **Аляксандр Ільіч,** н. у 1915, **Пётр Ільіч,** н. у 1917, **Зінаіда Ільінічна,** н. у 1921 — жыхары в. Старасселле. Раскулачаны ў 1930. Рэабілітаваны ў 1992.

СЦЯПАНАЎ Антон Ціханавіч, н. у 1881 у с. Вейна, святар в. Гарадзішча. Асуджаны ў 1932 на 3 гады ВПЛ, у 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЦЯПАНАЎ Міхаіл Арцёмавіч, н. у 1924 у в. Пронцаўка, ваеннаслужачы. Асуджаны ў 1945 на катаржныя работы на 20 гадоў. Рэабілітаваны ў 1978.

СЦЯПАНАЎ Васіль Піліпавіч, н. у 1888 у в. К. Лавы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЧАСНЫ Антон Францавіч, н. у 1894 у в. Крывель, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі. Рэабілітаваны ў 1989.

СЫЧОЎ Яўмен Іванавіч, н. у 1885 у в. Гарадзішча, аднаасобнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

СЮРКІН Ульян Цітавіч, н. у 1891 у в. Чарапы, хлебароб. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Іван Іванавіч, н. у 1894 у в. Дубраўка, ветфельчар. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Адам Юр'евіч, н. у 1890 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1980.

СЯКАЦКІ Антон Венядзіктавіч, н. у 1900 у в. Н. Чамаданы, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Венядзікт Абражэевіч, н. у 1872 у в. Н. Чамаданы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Восіп Францавіч, н. у 1888 у в. Чамаданы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Антон Якаўлевіч, н. у 1884 у в. Фашчаўка, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Якаў Ігнатавіч, н. у 1874 у в. Чамаданы, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Мартын Вікенцьевіч, н. у 1874 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯКАЦКІ Восіп Іванавіч, н. у 1904 у в. Дубраўка. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

СЯКАЦКІ Іван Фабіянавіч, н. у 1860 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1982.

СЯКАЦКІ Лука Іванавіч, н. у 1893 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1982.

СЯКАЦКІ Рыгор Іванавіч, н. у 1902 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1982.

СЯКАЦКІ Бярнард Станіслававіч, н. у 1885 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1982.

СЯКАЦКІ Сцяпан Фабіянавіч, н. у 1867 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯМАШКА Сямён Паўлавіч, н. у 1894 у в. Слабодка, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1956.

СЯМЁНАЎ Восіп Фёдаравіч, н. у 1880 у в. Варкова. Асуджаны ў 1933 на 3 гады працоўнага пасялення. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯМЁНАЎ Даніла Сямёнавіч, н. у 1862, аднаасобнік в. Навасёлкі. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯРБАЕЎ Лявон Антонавіч, н. у 1861 у в. Заваты. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯРБАЕЎ Сяргей Мікалаевіч, н. у 1901 у в. Патапава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯРГЕЕЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1869 у в. Чорнае, аднаасобнік. Асуджаны ў 1929 на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯРГЕЕЎ Фёдар Сцяпанавіч, н. у 1866 у в. Чорнае, без пэўных заняткаў. Асуджаны ў 1931 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

СЯРВІВА Фелікс Пятровіч, н. у 1892 у в. Дубраўка, старшыня калгаса. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

СЯРВІВА Аляксандр Пятровіч, н. у 1906 у в. Дубраўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

СЯЧКОЎ Цярэнцій Тарасавіч, н. у 1884, аднаасобнік в. Зарэчча. Асуджаны ў 1934, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ТАМАШЭВІЧ Іван Рыгоравіч, н. у 1884 у в. Каменка, настаўнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ТАМАШЭВІЧ Аляксандр Адамавіч, н. у 1897 у в. Бабравінная, земляроб. Рэабілітаваны ў 1989.

ТАМАШЭВІЧ Нікіфар Пятровіч, н. у 1896 у в. Мерч, калгаснік. Асуджаны на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1964.

ТАРАКАНАВА Ірына Прохараўна, н. у 1906 у в. Русакі, калгасніца. Асуджана ў 1945 на 5 гадоў высылкі ў Краснаярскі край. Рэабілітавана ў 1990.

ТАРАСАЎ Аляксей Фаміч, н. у 1884 у в. Царковішча, калгаснік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТАРАСАЎ Барыс Рыгоравіч, н. у 1897 у в. Царковішча, калгаснік. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТКАЧУК Антон Антонавіч, н. у 1894 у в. Курылаўцы Навадворскай вол. Віленскай губ., загадчык сталовай торфазавода. Асуджаны ў 1936, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959.

ТРАПАЧОЎ Емяльян Аляксеевіч, н. у 1904 у в. Путнікі, конюх калгаса. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТРЫЗОНАЎ Іван Антонавіч, н. у 1890 у в. Чаніданы, аднаасобнік, царкоўны стараста. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1966.

ТРЫХМІНАЎ Сямён Рыгоравіч, н. у 1877 у в. Тударава, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ТУЗ Аляксей Мікітавіч, н. у 1900 у в. Каменка, ваенурач. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1957.

ТУМАНАЎ Гаўрыла Іванавіч, н. у 1882 у в. Чорнае, святар. Асуджаны ў 1929 на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ТУРБІНСКІ Іван Пятровіч, н. у 1898, аднаасобнік в. Заходы. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

УБСКІ Стэфан Ягоравіч, н. у 1908 у в. Уланава, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

УБСКІ Фёдар Ягоравіч, н. у 1910 у в. Уланава, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

УДАЛЬЕЎ Іван Аляксеевіч, н. у 1883 у в. М. Сліжы, аднасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

УЛАДЗІМІРАЎ Іван Васільевіч, н. у 1879 у в. Дабройка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1966.

УСАЎ Мацвей Прохаравіч, н. у 1891 у в. Шастакі. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

УСАЎ Станіслаў Андрэевіч, н. у 1897 у в. Дубраўка, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

УСЦІНАЎ Аляксандр Афанасьевіч, н. у 1902 у в. Шнараўка, бухгалтар. Асуджаны ў 1932 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

УСЦІНАЎ Восіп Сяргеевіч, н. у 1903 у в. Саваленкі, кагласнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ФАМІН Аляксандр Міхайлавіч, н. у 1884 у в. Нічыпаравічы, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ФІЛАЦІСТАЎ Ігнат Васільевіч, н. у 1877 у в. Радзішына, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ФЕДЗЮКОЎ Васіль Ігнатавіч, н. у 1886 у в. Дольдзева Сеннінскага р-на, шорнік калгаса ў в. Н. Стайкі. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ХАДАСЕВІЧ Дзмітрый Самсонавіч, члены сям'і: **Сцепаніда, Захар Дзмітрыевіч, Аляксандр Дзмітрыевіч** — жыхары в. Калінаўка. Раскулачаны ў 1930, асланы ў Котлас. Рэабілітаваны ў 1992.

ХАЛАМЁНАК Георгій Яўменавіч, н. у 1898, дырэктар папяровай ф-кі «Спартак». Рэпрэсіраваны і рэабілітаваны.

ХАЛСТОВІЧ Іван Сцяпанавіч, н. у 1892 у Старобінскім р-не, цясляр калгаса в. Каменка. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1973.

ХАЛЯНКОЎ Аляксей Рыгоравіч, н. у 1873 у в. Мікіцінічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ умоўна. Рэабілітаваны ў 1958.

ХАРКЕВІЧ Іван Антонавіч, н. у 1897 у в. Смятанічы, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 8 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1962.

ХАРКЕВІЧ Клімянціна Баляслававўна, н. у 1908, тэлеграфістка ў г. Шклове. Асуджана ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітавана ў 1962.

ХАРКЕВІЧ Лідзія Францаўна, н. у Н. Вадва, аднаасобніца. Асуджана ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітавана ў 1989.

ХАРЫКАЎ Апанас Якімавіч, н. у 1878 у в. Ордаць. Асуджаны ў 1939 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1991.

ХАРЫН Якаў Іванавіч, н. у 1877 у с. Чарняева Арлоўскай губ., майстар папяровай ф-кі «Спартак». Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ХАРЫТАНОВІЧ Адам Пятровіч, жыхар в. Катэнка. Раскулачаны ў 1930, сасланы ў Якуцію. Рэабілітаваны ў 1992.

ХРАМЦОЎ Міхаіл Спірыдонавіч, н. у 1853 у в. Алюты, аднаасобнік. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1964.

ХРАМЦОЎ Рыгор Барысавіч, н. у 1899 у в. Ліцвінавічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ХРАМЦОЎ Тарас Рыгоравіч, н. у 1879 у в. Ліцвінавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1959.

ХРАНОЎСКІ Міхаіл Іванавіч, н. у 1886 у в. Дубраўка, вартаўнік аўтарамзавода. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ХРУШЧОЎ Аляксандр Ягоравіч, н. у 1902 у в. Масікава Аршанскага р-на, калгаснік в. Забор'е. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЕВАК Васіль Сямёнавіч, н. у 1902 у в. Хваросна Пінскага пав., загадчык Леннарыхтоўгандлю па Шклоўскаму р-ну. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІМАФЕЕЎ Аляксандр Іванавіч, н. у 1886 у в. Дымава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІТКОЎ Аляксей Антонавіч, н. у 1907 у в. Н. Лешча, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІТОЎ Фама Рыгоравіч, н. у 1902 у в. Мікіцінічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЦІХАНАЎ Антон Сяргеевіч, н. у 1895 у в. Акунёўка, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦІХАНАЎ Кандрат Міхайлавіч, н. у 1909 у в. Гарадзец. Арыштаваны ў 1944. Рэабілітаваны ў 1949.

ЦІХАНАЎ Рыгор Мітрафанавіч, н. у 1890 у в. Акунёўка, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ЦЫГАНКОЎ Лявон Андрэевіч, н. у 1886 у в. Таўкачы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫМБАРЭВІЧ Адам Феліксавіч, н. у 1898 у в. Зацішша, не працаваў. Асуджаны ў 1934 на 8 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЦЫМБАРЭВІЧ Віктар Феліксавіч, н. у 1897 у в. Зацішша, пажарнік нафтасклада. Асуджаны ў 1934 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1957.

ЦЯМРУК Восіп Францавіч, н. у 1889 у в. Крывель. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧАМАНСКІ Максім Восіпавіч, н. у 1885 у в. Рудня Жлобінскага р-на, механік лесазавода «Барацьба». Асуджаны ў 1948 на 3,5 года пазбаўлення волі. Рэабілітаваны ў 1990.

ЧАПЛЮК Восіп Вікенцьевіч, н. у 1899 у в. Канюхі Гродзенскай губ., упраўляючы «Нарыхтоўжывёла» ў г. Шклове. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1962.

ЧАРНЯЎСКІ Яўціхій Апанасавіч, н. у 1908 у в. Навасёлкі, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧУМАКОЎ Карп Кірылавіч, н. у 1883 у в. Азер'е, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЧУМАКОЎ Карп Кірылавіч, н. у 1878 у в. Азер'е, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧУШАЎ Аксён Анісімавіч, н. у 1882 у в. Шастакі, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1990.

ЧУШАЎ Серафім Аксёнавіч, н. у 1908 у в. Шастакі, без пэўных заняткаў. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЧЫРКОЎ Яфім Іларыёнавіч, н. у 1895 у в. Патапава, аднаасобнік. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1966.

ЧЭЛАЧАЎ Сафон Тарасавіч, н. у 1897 у в. Еўдакімавічы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЧЭЛАЧАЎ Расон Тарасавіч, н. у 1878 у в. Еўдакімавічы. Асуджаны ў 1933 на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1958.

ШАБУЛДА Дар'я Арцёмаўна, н. у в. Рагозна. Раскулачана ў 1932. Рэабілітавана ў 1993.

ШАЙКОЎ Яфім Харытонавіч, н. у 1893 у в. Высокае, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙКОЎ Іван Харытонавіч, н. у 1880 у в. Высокае, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАЙКОЎ Міхаіл Мітрафанавіч, н. у 1909 у в. Высокае, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАРНІКАЎ Андрэй Архіпавіч, н. у 1896 у в. Літоўск, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАРНІКАЎ Ціт Андрэевіч, н. у 1883 у в. Літоўск, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАСТАКОЎ Раман Андрэевіч, н. у 1885 у в. Н. Брашчына. Раскулачаны ў 1933. Рэабілітаваны ў 1995.

ШАФРАНСКІ Уладзімір Клімавіч, н. у 1879 у в. Дубраўка. Асуджаны ў 1930 на высылку ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1991. Рэпрэсіраваны ў 1937. Рэабілітаваны ў 1989.

ШАФРАНСКАЯ Фёкла Васільеўна, н. у 1896 у в. Дубраўка, калгасніца. Асуджана ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітавана ў 1962.

ШПУРГАЛАЎ Яфім Макаравіч, н. у 1890 у в. Н. Сліжы, калгаснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУПЛЯКОЎ Іван Сямёнавіч, н. у 1877 у в. Чарнаручча, аднаасобнік в. Загаранка Чавускага р-на. Асуджаны ў 1930 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУРАНКОЎ Павел Іванавіч, н. у 1903 у в. Таўкачы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУРЫНАЎ Міхаіл Барысавіч, н. у 1898 у в. Еўдакімавічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ШУЦІКАЎ Сцяпан Сяргеевіч, н. у 1893 у в. Тросенка, калгаснік. Асуджаны ў 1942 на 8 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШУЦІКАЎ Захар Іванавіч, н. у 1890 у в. Чорнае, ляснік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЫПІЦА Леанід Паўлавіч, н. у 1893 у м. Індуры Гродзенскай губ., сталяр арцелі «Чырвоны бондар» г. Шклова. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1958.

ШЫПІЛКА Сцяпан Васільевіч, н. у 1892 у в. Вабічы, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫПІЛКА Іван Васільевіч, н. у 1898 у в. Вабічы, аднаасобнік. Асуджаны на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЫПІЛА-ШЫПІЦАВА Анастасія Якаўлеўна, н. у 1901 у в. Канюкі Гродзенскай губ., хатняя гаспадыня ў г. Шклове. Асуджана ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітавана ў 1958.

ШЫЦІКАЎ Пімен Іванавіч, н. у 1876 у в. Чорнае, рабочы цякарні. Асуджаны ў 1929 на 3 гады высылкі ў Паўночны край. Рэабілітаваны ў 1989.

ШЭНДЗЕРАЎ Васіль Захаравіч, н. у 1895 у в. Азер'е, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1958.

ЮРЫСАЎ Рыгор Паўлавіч, н. у 1893 у в. Трэбушкі, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЮРАСАЎ Тарас Маісеевіч, н. у 1892 у в. Тросна, калгаснік. Асуджаны ў 1938 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1963.

ЮР'ЕЎ Раман Восіпавіч, н. у 1891 у в. Мікіцінічы, настаўнік. Асуджаны ў 1938, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1967.

ЮРЧАНКА Іван Іванавіч, н. у 1905 у в. Плешчыцы, чырвонаармеец. Асуджаны ў 1937 на 6 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1960.

ЮРЭВІЧ-ГРУБЭ Альвіна Якаўлена, н. у 1888 у Латвіі, калгасніца в. Лотва. Асуджана ў 1938, расстраляна. Рэабілітавана ў 1989.

ЯНУКОВІЧ Пётр Іванавіч, н. у 1863, ксёндз Фашчаўскага касцёла. Асуджаны ў 1937, расстраляны. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯКУКОВІЧ Супліцыян, н. у 1891 у в. Фашчаўка, калгаснік. Асуджаны ў 1937 на 10 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1987.

ЯНЧАНКА Емяльян Сямёнавіч, н. у 1886 у в. Хоцімка. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРМОЛЕНКА Іван Дзмітрыевіч, н. у 1898 у в. Таўкачы, калгаснік. Асуджаны ў 1933 на 5 гадоў ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯРОШКІН Іван Ігнатавіч, н. у 1908 у в. В. Славені, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

ЯЎСЕЕЎ Сямён Цімафеевіч, н. у 1919 у в. Забродзе, аднаасобнік. Асуджаны ў 1933 на 3 гады ВПЛ. Рэабілітаваны ў 1989.

1941

1945

У ГАДЫ ВЯЛІКАЙ АЙЧЫННАЙ ВАЙНЫ

Да досвітку 22 чэрвеня 1941 г. фашысцкая Германія, вераломна парушыўшы дагавор аб ненападзенні, пачала вайну супраць Савецкага Саюза. Тысячы варожых самалётаў падверглі варварскай бамбардзіроўцы мірныя гарады і вёскі, важныя жыццёвыя цэнтры краіны. На савецкую зямлю напалі добра падрыхтаваныя танкавыя і матарызаваныя дывізіі трох магутных груп армій «Поўнач», «Цэнтр», «Поўдзень», а з імі войскі сатэлітаў тагачаснай Германіі — Венгрыі, Італіі, Румыніі, Фінляндыі, — агульнай колькасцю 5,5 млн салдат і афіцэраў. На іх узбраенні мелася звыш 47 тыс. гармат і мінамётаў, каля 4300 танкаў і штурмавых гармат, 4980 баявых самалётаў (гл.: История второй мировой войны 1939—1945 гг.: В 12 т. Т. 4. М., 1974. С. 21—22). У другім эшалоне за перадавымі часцямі знаходзіліся 5 ахоўных дывізій, паліцэйскі полк «Цэнтр», матарызаваныя і кавалерыйскія часці СС, падраздзяленні жандармерыі.

Непасрэдна на Беларусь наступалі войскі групы армій «Цэнтр». У яе склад уваходзілі дзве арміі (4-я і 9-я) і дзве танкавыя групы (2-я і 3-я) — усяго 50 поўнасцю ўкамплектаваных дывізій (у тым ліку 9 танкавых, 6 матарызаваных і 1 кавалерыйская) і дзве брыгады. Групу армій падтрымліваў 2-гі паветраны флот — самы моцны ў нацысцкай арміі (1670 баявых самалётаў). Акрамя таго, ёй было перададзена больш трэці ўсіх інжынерных і дарожна-будаўнічых войск і каля палавіны асобных артылерыйскіх, зенітных і супрацьтанкавых дывізіёнаў і батарэй рэзерву сухапутных сіл Германіі (гл.: Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков: В 3 т. Т. 1. Мн., 1983. С. 38). Уся гэтая армада навалілася на пагранічныя атрады, 3, 10, і 4-ю савецкія арміі, што знаходзіліся на тэрыторыі Беларусі, нанесла ім цяжкія страты. У кнізе «Великая Отечественная война Советского Союза. 1941—1945. Краткая история» так характарызуецца становішча, якое склалася ў Заходняй асобай ваеннай акрузе (з 22 чэрвеня перайменавана ў Заходні фронт): «С переходом в наступление главных сил немецко-фашистской армии количественное превосходство гитлеровцев стало подавляющим... Это позволило противнику на многих участках быстро преодолеть сопротивление передовых частей Красной Армии. Оборона советских войск носила очаговый характер. Части прикрытия вступали в бой неодновременно и неорганизованно. Вблизи направлений главных ударов врага не было сильных резервов. Отсутствие сплошного фронта обороны давало возможность танковым и моторизованным соединениям противника обходить узлы

сопротивления наших войск и наносить им удары во фланги и с тыла. В результате этого части и подразделения Красной Армии нередко вынуждены были или драться в окружении, или отходить на восток» (с. 61).

Аднак і ў гэтых умовах у першыя ж дні і тыдні вайны савецкія воіны праявілі нябачаную мужнасць, гераізм. У летапіс стойкасці і адвагі ўвайшлі абарона Брэсцкай крэпасці, баі пад Мінскам, на рубяжах Бярэзіны. Тым не менш, спыніць наступленне не ўдавалася. У пачатку ліпеня агнявы вал вайны дасягнуў усходніх раёнаў Беларусі. Група армій «Цэнтр» імкнулася з ходу авалодаць Оршай, Магілёвам, Віцебскам, Смаленскам, акружыць тут і разграміць войсковыя злучэнні Заходняга фронту, выйсці на прамы шлях да Масквы. Менавіта на землях Магілёўшчыны, Гомельшчыны, Віцебшчыны, Смаленшчыны ў ліпені — жніўні 1941 г. адбыліся ахваткі з варожымі сіламі, якія ў немалой меры садзейнічалі зрыву гітлераўскага плана маланкавай вайны.

Упарта і стойка абаранялі Оршу часці 73-й стралковай дывізіі (кам. палк. А. І. Акімаў). На ўчастку Шклоў — Магілёў — Быхаў цвёрдае процідзеянне наступаючым нямецкім войскам аказалі воіны 61-га стралковага корпуса (кам. ген.-маёр Ф. А. Бакунін). У яго склад уваходзілі 53, 110, 172-я стралковыя дывізіі з радам прыданых часцей. Важнейшай задачай корпуса была абарона Магілёва, якая пачалася ў канцы першай дэкады ліпеня і працягвалася амаль да канца месяца. Асноўны ўдар тут прыйшоўся на 172-ю стралковую дывізію (кам. ген.-маёр М. Т. Раманаў). Байцоў падтрымлівалі тысячы магілёўцаў. Вялікія былі страты, аднак і вораг згубіў нямала. Тэмпы наступлення групы армій «Цэнтр» на маскоўскім напрамку былі запаволены. Пазней аб выніках баёў за Магілёў маршал К. Я. Варашылаў пісаў ва ўспамінах: «Оглядываясь сквозь призму лет, можно сказать: если Брест явился образцом беспримерного мужества горстки советских людей, их стойкости в борьбе против ударной группировки гитлеровской армии на пограничном рубеже нашей Родины, то на втором стратегическом рубеже — по реке Днепр — более обширным очагом такого же упорного сопротивления стал город Могилев...

Многие защитники города на Днепре погибли на поле боя. Но никогда не будет забыт их вклад в победу над врагом. Они незримо присутствовали в боях под Москвой и Сталинградом, на Кавказе и Курской дуге, на Днепре, Немане, Одере, штурмовали Берлин, поднимали флаги над рейхстагом» (цыт па: Всенародная борьба в Белоруссии... С. 69).

Абарона Шклова

У пачатку ліпеня абарону па правым беразе Дняпра на ўчастку Копысь — Шклоў занялі часці 53-й стралковай дывізіі*. Яе левы фланг на працягу 10 км займаў 223-ці стралковы полк падмацаваны дывізіёнам 122-мм гармат (кам. палка падпалк. В. А. Сямёнаў). На правым флангу працягам 15 км рыхтаваўся да баёў 12-ы стралковы полк з прыданым дывізіёнам 152-мм гаўбіц (кам. палка палк. М. А. Жук). Суседзямі справа і злева былі адпаведна 110-я і 137-я стралковыя дывізіі. Камандны пункт 53-й стралковай дывізіі размясціўся ў в. Славені.

Гітлераўцы імкліва рваліся да Дняпра. Перад фронтам 61-га корпуса дзей

* 53-я Чырвонасцяжная, ордэна Суворава II ступені Нова-Украінская сд была сфарміравана восенню 1931 г. у Саратаўскай вобласці і ўвайшла у склад Асобага 63-га ск. У 1941 г. дывізію ўзначаліў палк. Ф. П. Канавалаў. Па прыбыцці на Заходні фронт яна была ўключана ў склад 61-га ск 13-й арміі (камандуючы ген.-л. Ф. Н. Рамізаў). Удзельнічала ў баях на Магілёўшчыне, пад Масквой, у Смаленскай, Бранскай і Калужскай абласцях, ва Украіне і ў Малдавіі.

нічалі з Бабруйскага напрамку 3-я і 4-я танкавыя дывізіі, а з боку Барысава — Беразіно — 10, 17, 18-я танкавыя і 29-я матарызаваная дывізіі немцаў. Выстаўленыя супраць заслоны з двух батальёнаў 223-га і 12-га стралковых палкоў амаль двое сутак на Друці стрымлівалі націск намнога перавышаючых сіл праціўніка, знішчылі там нямала тэхнікі, салдат, але і самі мелі вялікія страты. У ноч з 5 на 6 ліпеня па загаду камандзіра дывізіі байцы атрадаў заслоны адышлі на рубеж Дняпра. 6 ліпеня пад прыкрыццём авіяцыі сюды прарваліся і гітлераўскія мехчасці. Артылерыйскім і аружэйна-кулямётным агнём іх удалося затрымаць. Да цемнаты падбілі некалькі танкаў, знішчылі сотні фашысцкіх салдат. А раніцай 7 ліпеня зноў давялося ўступіць у бой, які не спыніўся і на наступны дзень. Сотні самалётаў бамбілі пазіцыі нашых воінаў у раёне Копысі, вв. Славені, Гарадзец, Гарадзішча і ў іншых месцах. Асабліва моцнымі былі паветраныя ўдары па месце праз Днепр. Тут стварылася вялікае скапленне пяхоты і ваеннай тэхнікі часцей Чырвонай Арміі, якія вымушаны былі адыходзіць на левы бераг Дняпра. Страты былі велізарныя. А пасля таго, як днём 8 ліпеня мост парушылі, апошняя пераправа для правабярэжных часцей перастала існаваць. Немцы яшчэ больш узмацнілі націск, імкнучыся скінуць савецкія падраздзяленні ў раку. Атака ішла за атакай. Не спыняліся бамбёжкі. Варожая артылерыя біла па абодвух берагах Дняпра.

Абяскроўленыя часці дывізіі і ўсяго 61-га стралковага корпуса не мелі танкаў і самалётаў, не мелі сродкаў для іх знішчэння. Тым не менш, вораг, хаця і не надоўга, быў затрыманы. На ўсходні бераг Дняпра сумелі пераправіць нямала тэхнікі, маёмасці прадпрыемстваў, калгасаў, бежанцаў, баявых падраздзяленняў. Толькі 9 ліпеня ўвечары нямецкім часцям удалося ў раёне Копысі забяспечыць фарсіраванне Дняпра. Немцы захапілі плацдармы злева і справа ад размяшчэння 53-й стралковай дывізіі. Камандзір дывізіі Ф. П. Канавалаў, камандзір 12-га стралковага палка М. А. Жук, многія другія камандзіры, сотні чырвонаармейцаў былі параненыя. Чалавечымі целамі заслаліся акопы.

11 ліпеня гітлераўцы захапілі Шклоў, усю заходнюю частку раёна. Часці 53-й дывізіі сталі адыходзіць на рубеж Акунёўка — Гарадзішча. 13 ліпеня каля вечара немцы прарваліся ў яе тыл. Адступаючы, падраздзяленні вымушаны былі бясконца ўступаць у бой. Каля 21 гадзіны варожыя аўтаматчыкі акружылі штаб дывізіі. Завязаўся рукапашны бой. Пад моцным агнём невялікай групе прарыву ўдалося ўратаваць сцяг дывізіі, вынесці яго з варожага кольца. Многім давялося застацца ў акружэнні. Разрозненыя часці дывізіі працягвалі адступленне, а вечарам 17 ліпеня змаглі вырвацца з варожага кольца, выйсці ў размяшчэнне 28-й арміі. Сюды з невялікім атрадам чырвонаармейцаў выйшлі таксама камандзір дывізіі Ф. П. Канавалаў, начальнік штаба А. Н. Крымскі, камісар К. А. Зыкаў. Пасля кровапралітных баёў на Дняпры і паследуючага выхаду з акружэння ў дывізіі засталося толькі каля тысячы чалавек. Загадам камандуючага 28-й арміяй ген.-маёра В. Я. Качалава 53-я стралковая дывізія ўвайшла ў склад 33-га стралковага корпуса (гл.: До последнего часа. Саратов, 1987. С. 2—32).

Гітлераўцы паспяшылі «пахаваць» дывізію, аб чым сведчыла захопленая ў афіцэра карта. Яе яшчэ чакаў вялікі баявы шлях. «Если же проявить некоторую долю злопамятства, — писал позже К. Симонов, — то следует добавить, что 10-я танковая и 29-я моторизованная дивизии немцев, в июле сорок первого года нанесшие на Днепре такой тяжкий удар нашей 53-й дивизии, закончили свое существование при следующих обстоятельствах: 29-я моторизованная дивизия была разбита и взята нами в плен под Сталинградом зимой 1943 года, 10-я танковая воевала на Восточном фронте до 1942 года, после тяжелых

потерь была выведена на переформирование в Южную Францию, потом переброшена в Африку и в мае 1943 года сложила оружие перед англичанами» (Симонов К. Собр. соч.: В 10 т. Т. 8. М., 1982. С. 100—101).

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

З успамінаў былога камандзіра артылерыі 53-й стралковай дывізіі Р. Д. Пласкова

Да 5 ліпеня 1941 г. часці нашай дывізіі, якія падвяргаліся ўдарам праціўніка з паветра, неслі страты, занялі абарону на ўсходнім беразе Дняпра. У гэты ж дзень камандзір дывізіі Ф. П. Канавалаў, камісар К. А. Зыкаў і я выехалі на камандны пункт камандзіра 61-га стралковага корпуса. Генерал Ф. А. Бакунін уважліва выслухаў даклад палкоўніка Ф. П. Канавалава аб стане і дзеяннях дывізіі і паставіў задачу: заняць і надзейна ахоўваць паласу абароны Копысь — Шклоў. Уся артылерыя добра акапалася, асабліва супрацьтанкавая, замаскіравалася, супрацьлеглы бераг быў добра бачны, прыстрэлены. На світанні 8 ліпеня разведка данесла аб перамяшчэнні дзвюх варожых калон танкаў і бронетранспарцёраў у напрамку нашага пярэдняга краю. Хутка з лесу паказаліся і самі калоны. Відаць, немцы не спадзяваліся сустрэць на Дняпры супраціўленне і рухаліся даволі бяспечна. Падпусціўшы танкі на адлегласць 600—800 метраў, адкрыў моцны агонь прамой наводкай лёгкі артылерыйскі полк і асобны супрацьтанкавы артылерыйскі дывізіён. А 64-ы гаўбічны артылерыйскі полк адкрыў агонь з закрытых пазіцый. Да дзесятка варожых машын было падбіта і падпалена, астатнія пачалі спешна адыходзіць да лесу. Але радавацца было рана. Перагрупіраваўшыся, гітлераўцы пры падтрымцы артылерыі і авіяцыі зноў пайшлі на рубяжы нашай абароны. Артылерыя спыніла танкавую лавіну ворага і прымусіла зноў павярнуць назад. На заходнім беразе Дняпра гарэла ўжо каля двух дзесяткаў непрыяцельскіх танкаў.

На працягу двух сутак часці 53-й дывізіі стрымлівалі імкнуўшыхся да Дняпра гітлераўцаў, адбіваючы па некалькі атак за дзень. Асабліва варта адзначыць майстэрства камандзіра 2-га дывізіёна 64-га артылерыйскага палка капітана З. М. Падбярэзіна. У час бою ён не адлучаўся з назіральнага пункта, умела кіраваў батарэямі пры адбіцці атак танкаў ворага агнём гармат прамой наводкі. Таксама ўмела дзейнічаў і камандзір батарэі гэтага ж палка старшы лейтэнант Т. І. Шаламаў. На рахунку яго батарэі былі дзесяткі падбітых варожых танкаў. Пры штабе дывізіі быў узвод коннай разведкі — 30 стралкоў. Камандаваў імі лейтэнант Сахараў. У першых жа баях кавалерысты рабілі цуды. Рухаючыся побач з шашой па лясных сцежках, коннікі заходзілі ў фланг наступаючым гітлераўцам і з-за кустоў з блізкай адлегласці расстрэльвалі пяхоту. У баях адважныя коннікі амаль усе загінулі. Лейтэнант Чайкін камандуючы ўзводам, толькі ў адным баі знішчыў каля 30 фашыстаў і захапіў першага палоннага. Адным з першых у дывізіі лейтэнант быў узнагароджаны ордэнам Леніна. У баях на Дняпры цяжка паранены. Камандзір батальёна 12-га стралковага палка маёр Цярэшчанка ў баі на Дняпры загінуў. Яго замяніў камандзір роты старшы лейтэнант Лядзяеў. Гітлераўцы ўклініліся ў абарону батальёна пад прыкрыццём танкаў. Умелай арганізацыяй бою больш за сто фашыстаў было знішчана.

Запомнілася размова камісара 12-га палка В. Д. Фёдарава з камандзірам палка М. А. Жуком.

— Міхаіл Антонавіч, едзь у шпіталь, падлячыся, — сказаў Фёдараў.

— Няма на каго полк пакінуць.

— Як няма на каго? У палку шмат Лядзяевых!

Умела камандаваў батальёнам капітан А. І. Бараеў. Яму даводзілася прыкрываць адыход з бою галоўных сіл дывізіі. Страты ў батальёне былі меншыя, чым у іншых. Паспяхова ён вайваў на Дняпры, пад Ельняй, на Дясне

Самаддана змагалася на Дняпры батарэя 36-га артылерыйскага палка пад кіраўніцтвам старшага лейтэнанта Ф. Ф. Пастаногава. Часта камандзіры стралковых падраздзяленняў прасілі, каб іх падтрымаў менавіта ён.

...Пасля 4-дзённых напружаных баёў гітлераўцы зноў пайшлі ў атаку. Раніцай 12 ліпеня пачаўся наш адыход у лес, які знаходзіўся на паўночным усходзе ад Шклова. Тут да нас пад'ехаў сяржант кавалерыйскага эскадрона і паведаміў, што лявей нашай калоны стаяць нямецкія грузавыя машыны, пакрытыя брызентам. З начальнікам штаба дывізіі палкоўнікам А. Н. Крымскім разам з ротай аховы мы накіраваліся да гэтых машын. На іх бартах была свастыка. Дзіўным падалося, што адсутнічалі прыкметы жыцця. Заглянулі ўнутр машын і сваім вачам не паверылі. У машынах спалі напаўголыя немцы. Усюды былі раскінуты бутэлькі з-пад гарэлкі і кансервавыя бляшанкі. Крымскі загадаў адкрыць агонь, акружыўшы машыны. Немцы з дзікім лямантам адкрылі агонь у адказ, але ў беспарадку. Нашы байцы расстрэльвалі ўцякаючых, закідалі кузавы бутэлькамі з гаручай сумессю.

...Нам, артылерыстам, прыйшлося адбіваць не адну атаку гітлераўцаў каля Шклова. Побач з намі мужна змагаліся і воіны 100-й стралковай дывізіі ген.-маёра І. Н. Русіянава, якія з баямі выйшлі з варожага кольца з-пад Мінска. Дывізія мела вялікія страты, разам мы адыходзілі на ўсход.

«Ударны фронт». 1971. 26 чэрвеня, 1 ліпеня.

На Дняпроўскім рубяжы

Ліпень 1941 г., сярэдзіна месяца

...Да 15 ліпеня актыўнымі баявымі дзеяннямі 61-ы корпус, падтрыманы часцямі 20-га мехкорпуса, не даваў магчымасці войскам праціўніка выйсці да Магілёва з поўначы. Пры гэтым нашы часці не толькі ўпарта абараняліся, але і самі пераходзілі ў контратаку. Менавіта такая контратака была зроблена 12—13 ліпеня з рубяжа Саскаўка — Мікалаеўка ў напрамку вёсак Бель і Рыжкавічы. Праціўнік быў адкінуты на 2—3 км і панёс адчувальныя страты.

14 ліпеня раніцай праціўнік буйнымі сіламі атакаваў часці 53-й дывізіі ў раёне Копысі. У гэтым баі загінулі выконваючы абавязкі начальніка штаба корпуса Фурынаў і кантужаны камандзір корпуса Бакунін. Начальнікам штаба корпуса быў зацверджаны Каракі.

Сумесна з 1-й Маскоўскай механізаванай дывізіяй (кам. палк. Глуздоўскі) 61-ы стралковы полк 17 ліпеня з рубяжа Сухары — Машынакі нанёс удар па ворагу ў напрамку Дубраўка — Копысь. У выніку былі вызвалены населеныя пункты Даманы, Займішча, Дзіўнава, Ордаць, Старыя Чамаданы, Забродзе і інш. Падраздзяленні 110-й стралковай дывізіі падышлі да Копысі. Аднак працягваць наступленне не было сіл. Да таго ж флангі 61-га стралковага корпуса аказаліся адкрытымі, сувязь з суседнімі часцямі згублена, занята ворагам чыгуначная стн. Цёмны лес. Варожае кольца акружэння часцей 61-га корпуса сціскалася, яны вымушаны былі адысці на ўчастак Чэрнеўка — Кішчыцы — Княжыцы — Масток, а затым з цяжкімі баямі прарывацца з варожага акружэння. На захад ад Чэрыкава далучыліся да часцей Чырвонай Арміі.

М. Ільюшэнка

Маленькая доктарка

Маленькая докторша Таня Овсянникова... Образ этой обоятельной и храброй молодой женщины из знаменитой трилогии К. Симонова «Живые и мертвые» хорошо знаком и близок миллионам читателей. Но далеко не всем известно, что ее прообразом послужила Валентина Владимировна Тимофеева — бывшая военфельдшер 53-й стрелковой дивизии.

«Эта женщина, в присутствии которой мужчина не смеет не быть храбрым», — написал в своем очерке К. Симонов.

Раннее детство Валя провела в Аткарске, после переезда семьи в Саратов училась в 19-й средней школе, летом в зубоврачебном техникуме. В воздухе пахло войной и она решила связать свою жизнь с Красной Армией. Муж, кадровый командир С. К. Шевченин, не возражал.

С началом войны Валя попросилась на передовую, и ее направили в 223-й стрелковый полк 53-й стрелковой дивизии. В бою находилась на самых горячих участках: выносила раненых из-под огня, оказывала им первую медицинскую помощь... Сколько в то время было сделано перевязок, сколько спасла человеческих жизней? Этого она и сама не знает, не считала, не до того было. Наравне с мужчинами пришлось в полной мере испытать всю горечь первого самого трудного военного лета. Подразделение, в котором находилась Валя, оказалось в окружении. Попала в партизанский отряд, возглавляемый бывшим командиром 110-й стрелковой дивизии полковником В. А. Хлебцовым. Единственная женщина в отряде, она лечила раненых, готовила пищу, проводила санитарную обработку, нередко выполняла боевые задания, была разведчицей. В бою её ранило в ногу. Некоторое время Вале пришлось жить у местных жителей, выдавая себя за белорусскую крестьянку. А когда рана затянулась, она возвратилась в партизанский отряд, с ним, в декабре 1941 г., вышли к своим на территории Тульщины.

Валентине дали возможность встретиться на родине с матерью, сыном, друзьями. Затем снова фронтовые будни, ранение, госпиталь. И назло всем чертям осталась жива. В 1979 г. приезжала в Саратов на встречу с однополчанами *(До последнего часа. Саратов, 1956. С. 32—36).*

Г. Напрэеў

У першыя месяцы акупацыі раёна

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ СТАРШАГА АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ СЛЯПЦОВА Я. А. У ЦК КП(б)Б

8 кастрычніка 1941 г.*

...Во всех городах и сельских советах фашисты устанавливают свои комендатуры. Я наблюдал, что и в Шклове, и в Копыси, да и других местах полицейскими служат наши «граждане». В селе Любиничи Шкловского района говорят об одном таком, что когда-то он был заведующим собеса в Могилевском уезде — это в 1923—1924 гг., потом — «активистом» во время коллективизации. Сейчас он «начальник» колхоза и неплохой предатель. Немцы забирают с помощью таких все у колхозников. Я видел, как немцы захваченный колхозный скот оставляют, а у колхозников их скот забирают, вплоть до последней коровы.

В деревне (название неразборчиво. — *Ред.*) немцы у единоличницы, у которой сын летчик, а муж взят на трудовые работы, забрали все: лошадь, кабана, ячмень — последние два пуда. В этой же деревне у колхозницы взяли последний полушубок, холст, платки и другие вещи, тут же связали их шпагатом, написали адрес и положили в почтовую машину. В селе Столбцы немецкие солдаты начали тянуть, чтобы изнасиловать, дочь одной женщины. Дочь была последней в семье. Изверги убили эту 19-летнюю девушку.

Слепцов

8.10.41 г.

НАРБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 77, лл. 300—302.

З ДАДАТКАЎ ДА ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ

...В районе Шклова, где мне пришлось быть долгое время, я наблюдал, как идет уборка урожая, которую организовали немцы... На работу должны были выходить по звонку все трудоспособные с 14-летнего возраста и старше. Работали по 11—12 часов.

...В большинстве случаев, когда приходит немецкая армия, до установления ею своего

[1] Слянцоў Я. А. Знаходзіўся на тэрыторыі раёна з 3 па 17 верасня 1941 г.

порядка, колхозники разбирают общее имущество. Делят лошадей — на 2—3 двора лошадь, также збрую и другой инвентарь, а также и хлеб, где он был...

Настроение у большинства колхозников упадническое... Я писал в докладной записке, что ходят всякие лживые слухи. У людей много недовольства. Говорят, что в докладах убеждали, что нас никто не победит, а сейчас что произошло? Сами все убежали, а нас оставили на издевательства немцам... Люди ободряются, когда говоришь им, что мы немца все равно разобьем, даже те, кто заявляет, что им все равно, где работать, и так работать, и этак работать...

В Шкловском районе нет лесов, поэтому нет и партизанского отряда. Но я видел в Горецком районе, д. Каменка, как колхозники везли продукты партизанам. И с воодушевлением рассказывали, как партизаны громят немцев. Я пытался узнать о конкретных действиях партизан, но они на эту тему не стали со мной разговаривать.

Население, особенно призывного возраста, пока все дома, но взяты немцами на учет. Кое-кто из них работает на восстановительных работах.

Картофель, когда я уходил из Шклова, еще почти не убирали. Еще много и хлеба на полях. Уборка идет вяло. Норм выработки нет, колхозники работают, лишь бы провести день. Я говорил об этом с колхозниками д. Староселье Шкловского района. Они говорят, что пришло время «отдыха» и на работу, и на еду. Люди понимают теперь прекрасно, что трудятся не на себя, а на немцев.

11.10.41 г.

НАРБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 77, лл. 303—304.

Падрыхтаваў *Р. Платонаў*

Палітыка рабаўніцтва, насілля, крывавага тэрору

Акупацыйны рэжым, які быў устаноўлены на захопленай тэрыторыі Савецкага Саюза, з'яўляўся сродкам ажыццяўлення злачыннай палітыкі каланізацыі і германізацыі «инородческого населения, ограбления и истребления его». Па вядомым плане «Ост» толькі ў Беларусі намячалася за адносна кароткі тэрмін «выселить» (чытай: знішчыць) 75 % насельніцтва, а астатніх анямечыць, выкарыстаць у якасці рабоў. «Новы парадак» насаджалі шматлікія ваенныя, грамадзянскія і паліцэйскія органы, гестапа, т. зв. «служба бяспекі», палявыя і мясцовыя камендатуры, розныя нацыяналістычныя, здраднiцкія органы і арганізацыі. Актыўна дзейнічала фашысцкая прапаганда.

Абапіраючыся на карныя атрады, на мясцовых здраднікаў, фашысцкія разбойнікі забіралі зерне, жывёлу, рабавалі маёмасць і культурныя каштоўнасці, вывозілі з прадпрыемстваў машыны, абсталяванне, палілі пабудовы. Пагрозамі, штрафамі, збіеннямі яны прымушалі выконваць шматлікія павіннасці, непакорных знішчалі. Па распараджэнні камандуючага тылам групы армій «Цэнтр» ад 31 жніўня 1941 г. у раёне праводзіліся перапіс насельніцтва, выяўленне немясцовых жыхароў, пошукі чырвонаармейцаў. Загадвалася здаваць зброю, фотаапараты, радыёпрыёмнікі, ваенную маёмасць. Людзей расстрэльвалі за самыя нязначныя падазрэнні ў сувязях з партызанамі, падпольшчыкамі, губілі за нявыплату бясконцых падаткаў, за непаслухмянасць, за любое супраціўленне. З асаблівай жорсткасцю распраўляліся з камуністамі і камсамольцамі, савецкімі актывістамі.

Адным з жахлівых бакоў фашысцкага акупацыйнага рэжыму было правядзенне генацыду ў адносінах да асоб яўрэйскай нацыянальнасці. Нашэсце нямецкіх войск на нашу краіну павінна было садзейнічаць «канчатковаму вырашэнню яўрэйскага пытання». Антысемітызм гітлераўцы зрабілі асноўным пунктам сваёй прапаганды, якая была накіравана на насельніцтва Беларусі. Акупацыя падавалася імі як выратаванне жыхароў рэспублікі ад «яўрэйскага бальшавізму».

Па ўказанні Гітлера фашысцкія верхаводы загадзя пачалі распрацоўваць план «канчатковага вырашэння яўрэйскага пытання», што азначала знішчэнне ўсіх яўрэяў... Па звестках начальніка 4-га аддзела гестапа Эйхмана, якому Гітлер даручыў правядзенне ў жыццё гэтай праграмы, было забіта 6 млн яўрэяў, што складала $^1/_3$ частку яўрэяў усяго свету (Нюрнбергский процесс: В 7 т. Т. 7. М., 1961. С. 401—402).

Звярыную палітыку знішчэння савецкіх грамадзян яўрэйскай нацыянальнасці гітлераўскія галаварэзы з бяспрыкладнай жорсткасцю ажыццяўлялі на ўсёй часова акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Шклоўшчыне. Сюды ўслед за войскамі вермахта прыбылі айнзацкаманды, зондэркаманды, тайная палявая паліцыя (ГФП), паліцыя бяспекі і СД, фельдкамендатуры, ортскамендатуры, жандармерыя і іншыя карныя органы, у абавязкі якіх разам з вермахтам уваходзіла і вырашэнне «яўрэйскага пытання». Усе гэтыя органы і часці былі ўкамплектаваны спецыяльна падабранымі асобамі, якія былі выхаваны ў духу нацызму і вызначаліся асаблівай жорсткасцю ў адносінах да людзей іншых нацыянальнасцей. Менавіта яны адразу ж аддзялілі яўрэяў ад мясцовых жыхароў і загналі іх у гета.

Загады палявых і мясцовых камендатур па стварэнні гета выдаваліся паўсюдна: у Бабруйску, Баранавічах, Брэсце, Мазыры, Лідзе, Мінску і іншых гарадах Беларусі. У асноўным гета ствараліся закрытага тыпу. Іх тэрыторыі абносіліся калючым дротам, ахоўваліся гітлераўскімі салдатамі і паліцыяй.

Згодна з распараджэннем нямецкіх акупацыйных улад, яўрэям забаранялася самавольна пакідаць гета, мяняць месцажыхарства і кватэры ў гета, карыстацца тратуарамі, грамадскім транспартам, установамі і паркамі, наведваць школы.

Для яўрэяў уводзілася абавязковае нашэнне апазнавальных знакаў — акруглыя латы і шасціканцовыя зоркі жоўтага колеру, нарукаўныя павязкі з шасціканцовымі зоркамі.

Амаль да ліквідацыі гета яўрэі павінны былі прымусова выконваць работу для акупантаў, пры якой многія з іх паміралі з-за нечалавечых умоў жыцця і працы, з-за адсутнасці медыцынскай дапамогі.

Часткай злачыннага акупацыйнага рэжыму з'яўляўся вываз працаздольнага насельніцтва з Беларусі ў Германію ў якасці дармавой рабочай сілы. Правал планаў маланкавай вайны, значныя страты ў жывой сіле на савецка-германскім фронце патрабавалі мабілізацыі ў вермахт усё больш чалавечых рэсурсаў, што пазбаўляла прамысловасць і сельскую гаспадарку фашысцкай Германіі рабочых рук. Гэты недахоп гітлераўскія правіцелі імкнуліся папоўніць за кошт асоб, гвалтоўна вывезеных з акупіраванай тэрыторыі СССР.

Ужо ў лістападзе 1941 г. было дадзена ўказанне па выкарыстанні «рускай рабочай сілы» ў Германіі. У пачатку 1942 г. была пастаўлена задача вывезці на прымусовыя работы ў Германію з акупіраваных абласцей СССР 15 млн чалавек. Гаспадарчай інспекцыі групы армій «Цэнтр» і генеральнай акрузе «Беларусь» прадпісвалася штодзённа пасылаць у рэйх па 500—1000 рабочых.

Спачатку вярбоўка насельніцтва ў Германію вялася на добраахвотнай аснове. Аднак у спецыяльных разнарадках па валасцях указвалася, колькі чалавек і ў які тэрмін воласць павінна паставіць. У сувязі з ростам колькасці тых, хто адмаўляўся ад вярбоўкі, гітлераўцы перайшлі да насільных метадаў. Паўсюдна на акупіраванай тэрыторыі Беларусі, у тым ліку і на Шклоўшчыне, акупанты пачалі шырока ўжываць метад масавых аблаў. Ачапляліся цэлыя гарадскія раёны, кварталы, вуліцы, базары, вакзалы, вёскі. Адбывалася сапраўднае паляванне на людзей, асабліва ў перыяд правядзення карных аперацый супраць партызан.

Вываз на фашысцкую катаргу ажыццяўлялі спецыяльныя ведамствы на чале з генеральным упаўнаважаным па выкарыстанні рабочай сілы, войскі і паліцыя. Працаздольных мужчын, жанчын і падлеткаў пад канвоем адпраўлялі ў пера-

ыльныя лагеры, жорстка здзекваліся. цэлым гітлераўцам удалося захапіць вывезці ў Германію з акупіраваных бласцей СССР каля 5 млн чалавек, тым ліку з Беларусі каля 380 тыс., са Іклоўскага раёна — звыш 2 тыс. чавек.

Умовы жыцця і працы савецкіх людзей у Германіі былі выключна цяжкімі. ны рэгламентаваліся спецыяльнай інструкцыяй, у якой гаварылася: «Усе абочыя павінны атрымліваць такую ежу, такое жыллё і падвяргацца такому абыходжанню, якое давала б магчымасць эксплуатаваць іх у самай высокай ступені і пры самых мінімальных затратах». Непасільная праца, голад, антысанітарыя прыводзілі да шматлікіх захворванняў і вялікай смяротнасці. Ратаванне савецкіх людзей ад вывазу ў фашысцкае рабства было адной з важнейшых задач падпольных партыйных органаў, партызан і падпольшчыкаў.

У. Лемяшонак, доктар гістарычных навук

З ДЫРЭКТЫВЫ РЭЙХСФЮРЭРА СС І ПАЛІЦЫІ ФОН Д. БАХА АФІЦЭРАМ І ПАЛІЦЫІ

1.XI.1943 г.

...С этого времени стараться захватить как можно больше пленных. На основании указания ОКВ приказывается всех лиц, встречающихся в непосредственной близости к районам военных действий, рассматривать как пленных. Их нельзя обвинить в ведении военных действий, но можно рассматривать как пособников банд партизан.

Зараженные бандами партизан районы объявить районами военных действий и эвакуировать. Всех трудоспособных мужчин этих районов в возрасте 16—55 лет считать военнопленными и сразу же отправлять в рейх. Всех мужчин моложе 16 и старше 55 лет и всех работоспособных женщин отправлять в приемные лагеря, а оттуда кратчайшим путем в рейх. Все оставшееся население, особенно женщины и дети, выселяются и используются на полезных работах.

Пераклад з нямецкай Г. Г. Бялькевіча

НАРБ, ф. 845, воп. 1, спр. 206, л. 12.

З РАСПАРАДЖЭННЯ ГЕНЕРАЛЬНАГА КАМІСАРА БЕЛАРУСІ КУБЭ І НАЧАЛЬНІКА СС І ПАЛІЦЫІ ГЕНЕРАЛЬНАЙ АКРУГІ БЕЛАРУСІ ЦЭНЭРА

1. Забараняецца падтрымліваць бальшавіцкія банды, іншых хаўруснікаў і асоб, якія да іх належаць...

2. Кожны абавязаны ў выпадку з'яўлення бальшавіцкіх бандаў, іхных памагатых ці падазроных асоб ... безадкладна заявіць бліжэйшай нямецкай установе... За памыснае супрацоўніцтва будуць выдавацца грашовыя ўзнагароды, а таксама гарэлка, папяросы і махорка. Сяляне, якія асабліва адзначацца ў змаганні з бальшавіцкімі бандамі, атрымаюць як узнагароду сялянскую гаспадарку.

3. Усякае быццё на вуліцы, пляцах, сенажацях, палях і ў лясах сурова забараняецца. Забароненым часам наогул з'яўляецца час ад 21 да 5 гадзін, на вёсках ад 21 да 4 гадзін і ў Мінску ад 22 да 5 гадзін...

4. Усякае перасяленне і змена месца жыхарства, а таксама язда ў якасці падарожнікаў на аўто і фурманках без дазволу нямецкіх улад забараняецца...

5. Усякі збор людзей як пад адкрытым небам, так і ў будынках забараняецца...

6. Падазроныя асобы могуць быць паліцэйскімі ўладамі затрыманыя. Яны павінны ў гэтым выпадку адразу падняць ўгару рукі. Пры непаслухмянасці будзе ўжыта зброя... Да злачынных элементаў будуць ужывацца самыя суровыя пакаранні, у дадзеным выпадку — аж да кары смерцю праз расстрэл.

Вышэйпададзеныя распараджэнні ўваходзяць у сілу безадкладна.

Мінск, 1 лістапада 1942 г. Подпісы

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 335, лл. 2—4.

З АБ'ЯВЫ АБ НАКІРАВАННІ НА РАБОТУ Ў ГЕРМАНІЮ

...Кроме уже признанных на работу лиц 1925 года рождения, обязаны также выполнять трудовую повинность в Германии и лица 1926 года рождения. Исключение и впредь составляют только лица, поступившие добровольцами в РОА и освободительные отряды или в отряды службы порядка.

8 августа 1943 г. Главнокомандующий

НАРБ, ф. 4683, воп. 3, спр. 335, л. 16.

СА СПРАВАЗДАЧ АБ ДЗЕЙНАСЦІ 723-й ГРУПЫ ГФП

(тайнай палявой паліцыі)

...Комендантом стн. Шклов доставлены в группы ГФП русские Павлючук Александр, Контратский Иосиф, Юженков Павел за вскрытие вагона с мукой для вермахта. Расстреляны 11.02.1941 г.

Са справаздачы за студзень 1942 г.: 12.01.1942 г. вблизи Шклова, удалось захватить партизанскую банду в составе: Иван Дудков, 1918 г. рождения, уроженец д. Уланово; Павел Зоргин, 1923 г. рождения, уроженец д. Вышково; Алексей Николаев, 1924 г. рождения, уроженец д. Уланово; Андрей Шнаков, 1909 г. рождения, уроженец д. Полыковичи; Роман Иванов, 1918 г. рождения, уроженец д. Вышково... Банда уже длительное время действовала в этом районе. На ее счету убийство полицейского городской полиции Шклова, поджог колхозной конюшни и др. Все они расстреляны.

... 4.01.1942 г. расстрелян за принадлежность к банде Иван Бардулов, 1918 г. рождения, уроженец и житель д. Заречье. Во время обыска в его доме была обнаружена укороченная партизанская винтовка с патронами и ручная граната.

Са справаздачы за сакавік 1942 г.: В д. Ордать было выяснено, что проживающие там красноармейцы в последнее время занимаются активной антинемецкой пропагандой, будоражат население, угрожают ему скорым возвращением Красной Армии и уничтожением всех пронемецки настроенных лиц. В ходе проведенного расследования были выявлены следующие бывшие красноармейцы: Дмитрий Иванов, 1895 г. рождения, уроженец Москвы; Валентин Зверев, 1913 г. рождения, житель Москвы; Гавалов Эпштейн, 1916 г. рождения, уроженец и житель д. Ордать, еврей.

На допросах они были изобличены в антинемецкой пропаганде и разоблачены как партизаны... Они были расстреляны.

У справаздачы за 26 сакавіка паведамлялася: «Рускія Вусаў Станіслаў з в. Дубраўкі каля Шклова, былы партыйны камісар са Шклова і немясцовы жыхар Еўдакімчык Васіль былі выкрыты як партызанскія памагатыя і расстраляны». Толькі за жнівень 1942 г. групай было «арыштавана 584 чал., з якіх расстраляна 353 чал.».

Са справаздачы за студзень 1943 г.: Русские полицейские службы порядка, переодетые в бандитов, направились в д. Рубеж, чтобы установить пофамильно бандитских связников. Их с радостью приняли Гузова Ольга и ее дочь Кулакова Анюта. Обе женщины охотно согласились оказывать всяческую поддержку «бандитам» и просили их уничтожить полицейских службы порядка в д. Толкачи. Они обещали узнать численность полицейских и их вооружение. Арестованные группой ГФП, они сначала все отрицали, но в конце концов вынуждены были сознаться. В ходе следствия установлено, что муж Гузовой и ее сын уже давно расстреляны как бандиты, а они сами до сих пор поддерживали связь с бандитами, снабжали их продовольствием, передавали им сведения и выполняли роль курьеров.

Обе женщины расстреляны.

Са справаздачы за люты 1943 г.: ...Районной полицией службы порядка были арестованы и доставлены в группу ГФП следующие лица: Киреев Сергей из д. Копысь, Паборцев Егор Иванович из д. Александрия, Денисенко Константин Иванович из д. Мошники, Шараев Демьян Данилович из д. Копысь, Чариков Василий Иванович из д. Копысь, Башков Семен Павлович из д. Мошники.

Они были изобличены и сознались в совершении нескольких грабительских нападений на различные деревни в Шкловском районе в середине прошлого года... Они были расстреляны.

...По подозрению в принадлежности к бандитской деятельности полицией службы порядка были арестованы и доставлены в группу ГФП следующие лица: Сорокин Михаил из д. Ярки, Игнатенко Григорий из д. Копысь, Гречка Василий из д. Копысь.

Перечисленные лица несколько месяцев находились в банде и участвовали в нападениях. С их слов, они были принудительно мобилизованы в банду. Однако предоставившиеся им ранее возможности для побега не использовали, а бежали только тогда, когда банда была атакована. Во время ареста и обыска в квартире Игнатенко был обнаружен спрятанный пистолет.

Указанные лица были расстреляны.

Са справаздачы за сакавік 1943 г.: ...В группу ГФП был доставлен захваченный раненым бандит Воронов Николай. Он являлся бывшим служащим восточного батальона и в конце декабря вместе с двумя другими служащими батальона получил задание от лейтенанта Турбинова разведать расположение банды и договориться с ней о переходе к бандитам лейтенанта Турбинова с его людьми из восточного батальона.

Турбинов в последних числах января вместе с 20 служащими его роты восточного батальона и двумя противотанковыми орудиями сбежал из восточного батальона и присоединился к банде Смирнова (Селицкого). 12.02.1943 г. вся бригада должна была выступить в Лепель. Со слов Воронова, он и еще два бандита проспали время выступления бригады и не смогли присоединиться к ней. Трое суток они бродили по лесу и 26.02 были застигнуты восточным батальоном. В бою Воронов был ранен и захвачен в плен. Двум другим бандитам удалось уйти.

Воронов был расстрелян.

...Периферийной командой Могилева арестованы Сивакова Юлиана, Озилина Альма по подозрению в вербовке в банды служащих местных формирований и обеспечении их фальшивыми документами. В ходе следствия подтвердилось, что обвиняемые действительно имели разговор на эту тему с тремя служащими украинского батальона. Паспорта для них должен был изготовить бывший начальник паспортного стола в Шклове Петренко Алексей, который имел для этой цели чистые бланки. Все трое настойчиво и до последнего момента отрицали обвинение, в особенности свою связь с бандитами, однако все они были изобличены и расстреляны.

В периферийную команду ГФП в Шклове был доставлен захваченный во время нападения на д. Скубиловку, 12 км юго-западней Шклова, в ночь на 1.03.1943 г. бандит Вильчик Никита. Последний был захвачен на санной упряжке и при себе имел 2 гранаты, 1 русскую винтовку с 50 патронами и пистолет с 25 патронами, а также маскировочный халат... Вильчик был передан 709-й группе ГФП.

7.03.1943 г. из д. Староселье к бандитам бежало 15 служащих 286-го кавалерийского эскадрона. В этой связи была арестована русская Миронова Галина, которая несмотря на отрицание своей вины была изобличена в том, что являлась посредницей между бежавшими украинцами — кавалеристами и бандитами, а также в том, что длительное время выполняла роль курьера бандитов.

Она была расстреляна.

...Периферийной командой ГФП в Шклове были арестованы Антошкевич Евгения Денисовна, Шариков Федор Иванович и Кудьянова Любовь Федоровна, жители д. Рацево. Все они были изобличены в том, что систематически поддерживали связь с бандитами, снабжали их различными сведениями, предоставляли им укрытие, в особенности дом Антошкевич Е. Д. (мать бандитского командира Денисова) служил местом встреч и пребывания бандитов из окрестностей, а также проведения собраний...

Все арестованные расстреляны.

Са справаздачы за красавік 1943 г.: ...В группу ГФП поступило сообщение, что 13.04.1943 г. после зверской расправы над начальником полиции в д. Черноручье Якушевым, которая была учинена полицейским Линдаренко, главарем и подстрекателем к бунту, вся полицейская служба порядка в количестве 38 человек перешла к бандитам.

В последующие дни бежавшие полицейские постепенно добровольно начали возвращаться обратно и, кроме 8 человек, все явились или на свой опорный пункт или же в опорный пункт д. Толкачи, а также Шклов. Остальные 8 бежавших полицейских во время операции против партизан были застигнуты в лесу возле д. Шахово. Пятеро из них были арестованы, а полицейский Пантелюшин убит при бегстве. Бывшим полицейским Линдаренко и Слесаренко удалось бежать.

...Установлено, что Линдаренко после убийства начальника полиции вместе со своим соучастником Пантелюшиным, угрожая пистолетом, разоружил указанных выше полицейских службы порядка и во главе их выступил в болотистую местность возле д. Березовки. В конце концов большинство полицейских бежали обратно, остались только Линдаренко со своими сообщниками, из которых в указанной выше операции были арестованы: 1. Николай Сесульчик, 2. Николай Ралько, 3. Иван Микалуцкий, 4. Георгий Савельев (Завельев), 5. Петр Ус.

Указанные под цифрами 2, 3, 5 русские принимали участие в убийстве старосты д. Рагозна. Сесульчик и Савельев были близкими друзьями Линдаренко и уже давно были в курсе его плана вместе с полицейскими опорного пункта перейти к бандитам... Все пятеро были расстреляны.

Са справаздачы за жнівень 1943 г.: ...На основании показаний бандитского перебежчика периферийной командой ГФП в Шклове был арестован бургомистр д. Слижи Роганов.

В ходе следствия было установлено, что он поддерживал связь с начальником бандитской разведки и систематически передавал этой банде различные сведения, а также оказывал банде всевозможную помощь. Его жена уже давно находится в этом бандитском лагере.

Роганов при попытке к бегству был расстрелян.

Са справаздачы за верасень 1943 г.: ...В группу ГФП поступило сообщение, что в р-не д. Никитичи появилась банда грабителей, маскирующаяся днем под безобидных крестьян. По подозрению в Шклове было арестовано 20 человек. Из них трое: Терещенко Владимир, Баранов Павел и Стариков Михаил — были разоблачены как участники указанной банды и расстреляны.

...Команда ГВП секретариата в Шклове при въезде в д. Уланово для ареста бежавшего полицейского службы порядка натолкнулась на 2 вооруженных бандитов. В ходе перестрелки они были убиты. Ими оказались бывший полицейский Галецкий Николай, бежавший к бандитам, и бандитка Сидлерова Валентина. Возле трупов были захвачены автомат, 1 пистолет, 1 карабин, 1 ручная граната, 1 лимонка и 100 штук патронов.

Пераклад з нямецкай Г. Г. Бялькевіча

НАРБ, ф. 4683, воп. 1, 3.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

Перевод с немецкого Г. Г. Белькевича

З ДАКЛАДА МАГІЛЁЎСКАЙ АБЛАСНОЙ КАМІСІІ АБ МАСАВЫМ ВЫНІШЧЭННІ МІРНАГА НАСЕЛЬНІЦТВА ГІТЛЕРАЎСКІМІ ЗАХОПНІКАМІ, РАЗГРАБЛЕННІ І ЗНІШЧЭННІ ІМІ НАРОДНАГА ЗДАБЫТКУ І АСАБІСТАЙ МАЁМАСЦІ САВЕЦКІХ ГРАМАДЗЯН НА ТЭРЫТОРЫІ ВОБЛАСЦІ ЎЎ 1941-1944 гг.

Не раней 27 чэрвеня 1944 г.

...В 1941 г. в сентябре в Шклове фашисты согнали до 300 чел., погнали их к противотанковому рву у д. Заречье и произвели массовый расстрел. Заставили самих несчастных людей ложиться в противотанковый ров, после чего их расстреливали. Часть людей осталось живыми и ранеными, и их вместе с мертвыми засыпали землей. Двое суток шевелилась земля на этом месте.

Очевидцы рассказывают и о других фактах зверств немецко-фашистских захватчиков. В июле 1943 г. в д. Великие Лозицы Шкловского района прибыл немецкий карательный отряд с целью насильственного угона в немецкое рабство молодежи из этой деревни. 17 молодых девушек убежали из деревни и спрятались в пещере. Немцы обнаружили девушек и предложили им выйти из пещеры, но девушки предпочли умереть на родной земле и выйти из пещеры отказались. Тогда немецкие изверги забросали убежище девушек гранатами, начиненными отравляющими веществами, где и погибли 17 советских девушек...

НАРБ, ф. 845, воп. 1, спр. 56, лл. 145, 192.

* * *

...22 чэрвеня 1942 г. карны атрад гітлераўцаў акружыў вёску Смятанічы Таўкачоўскага сельсавета. Старыя, жанчыны і дзеці былі сагнаны ў дом і хлеў. Будынкі немцы падпёрлі і запалілі іх. Шмат дзяцей схавалася ў агародах. Немцы знаходзілі іх і жывымі кідалі ў агонь.

«Чырвоны барацьбіт». 1945. 22 сакавіка.

З АКТА АБ ЗЛАЧЫНСТВАХ НЯМЕЦКА-ФАШЫСЦКІХ ЗАХОПНІКАЎ У в. МАЛАЯ ЛАЗІЦА 26 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

Мы, нижеподписавшиеся колхозники колхоза «Новое житье» с. Малая Лозица: Луженков Петр Алексеевич (71 г.), Галинский Яков Сергеевич (63 г.), Павлович Андрей Иванович (61 г.), Галинская Агафья Федоровна (60 г.), майор Власов и капитан Лайтер — составили настоящий акт о следующем:

...Немецкие бандиты отравили 25 колхозников, среди них много женщин и детей в д. Б. Лозицы Шкловского района.

Сожгли д. Сметаничи Шкловского района (100 домов), в которых сгорело 85 колхозников.

В Шкловском и Могилевском районах расстреляли больше 1000 колхозников.

В чем и составлен настоящий акт.

П. А. Луженков, Я. С. Галинский, А. И. Павлович, А. Ф. Галинская, майор А. Власов и капитан И. Лайтер.

ЦАМА РФ, ф. 1140, т. 1, спр. 212, л. 62; «Сталинец». 1944. № 88.

З успамінаў А. Паўлючэнкі — сведкі знішчэння аднавяскоўцаў

У лёсе кожнага народа, кожнага чалавека вайна, акрамя агульнай для ўсіх бяды, пакідае яшчэ сваю адметную злавесную адзнаку. Не з'яўляецца выключэннем з гэтага і мой асабісты лёс, і лёс маёй роднай в. Дзіўнава. Пра некаторыя трагічныя падзеі часоў акупацыі лічу сваім абавязкам расказаць чытачам кнігі «Памяць», тым больш, што жывых сведак засталося мала.

Дык вось 11 ліпеня 1941 года мы, вяскоўцы, каго не мабілізавалі ў армію, нагляделі шэрую хмару пылу, які падняўся над палявой дарогай у раёне в. Гарадзішча. Як высветлілася, гэта нямецкае вайсковае падраздзяленне звярнула з шашы Орша — Магілёў і рушыла ў напрамку Горак. Наша вёска, апынуўшыся непадалёку, застыла ў трывожнай невядомасці...

Праз два дні варожая артылерыя з-за лесу зрабіла кароткі абстрэл уяўных акопаў (а гэта была меліярацыйная канава) і праз вёску праехалі дзве бронемашыны і чатыры ці пяць матацыклаў з нямецкімі салдатамі. Мой бацька, Ціт Іванавіч, паслаў маю маці, Анастасію Іосіфаўну, у Чарапоўскі лес — там была наша вайсковая часць, каб напярэдзіць чырвонаармейцаў. Праз некаторы час яны з'явіліся ў вёсцы і наладзілі засаду. Старшы лейтэнант, які камандаваў аперацыяй, арганізаваў справу як мае быць. Як калі варожыя салдаты вярталіся, напэўна з разведкі, з імі пакваталіся стралкі засады. Бронемашыны і два матацыклы былі спалены, забіты чатыры салдаты. Уцалелыя, на двух матацыклах, паспелі ўцячы.

Наступныя два дні зноў было трывожнае зацішша — ні нашых, ні немцаў... На досвітку 15 ліпеня ў вёсцы пачуліся стрэлы — быў забіты стары Хальцаў Фама Захаравіч. Гэта ў Дзіўнава ўцягвалася нямецкая калона. На грузавіках, матацыклах, конных павозках у суправаджэнні бронемашын. Прыкладна праз дзве гадзіны ў цэнтры вёскі, якраз насупраць нашай хаты, пры пераездзе цераз канаву, застыла легкавушка. Немцы пачалі корпацца ў маторы. У гэты час усё з таго ж Чарапоўскага лесу паявіліся чырвонаармейцы. Чатыры заваёўнікі засталіся ляжаць, дзе іх напаткала смерць. Ахвяр з боку чырвонаармейцаў не было.

Зноў наступіла трывожнае чаканне... 18 ліпеня, раніцай, па загаду старшыні калгаса Архіпа Салапаева, трупы немцаў пахавалі ў агульнай магіле на ўзбочыне вясковых могілак. А недзе каля адзінаццатай гадзіны дня мясцовыя назіральнікі апавясцілі, што з боку в. Чамаданы ў напрамку Дзіўнава рушыцца калона немцаў. Неўзабаве ланцугом яны акружылі вёску. Запылалі сялянскія хаты і гаспадарчыя пабудовы, распачалася страляніна. Усіх жыхароў — старых, жанчын, дзяцей і падлеткаў — выганялі з хат, прымітыўных зямлянак-бамбасховішчаў і пад канвоем накіроўвалі ў канец вёскі. Там, на скрыжаванні вуліц, дзе калісьці стаяла карчма, ад агульнай масы аддзялялі ў асобную групу больш здаровых мужчын і падлеткаў. Туды трапіў і я. Калі набралася 16 чалавек, пад узмоцненай вартай нас пагналі за межы вёскі. Калі міналі могілкі, павярнулі туды. Нам загадалі сесці на ўскрайку, якраз насупраць нямецкай магілы. Траім выдалі па лапаце і загадалі адкапаць пакойнікаў. Пакуль раскопвалі магілу, да нашай

групы прывялі яшчэ дваіх мужчын. Такім чынам нас набралася 18 чалавек. Некалькі салдат і афіцэраў справілі над выкапанымі з магілы нейкі цырыманіял, фатаграфавалі іх і самі фатаграфаваліся, а нас прымусілі капаць новую яму. Стала зразумела, што гэта будзе наша вечнае прытулішча. Пры гэтым перакладчык з гневам сказаў, што «вандалам» (гэта значыць нам) «не будзе літасці за смерць і здзекі над нямецкімі салдатамі-вызваленцамі». Надзеі на нейкі цуд заставалася ўсё меней і меней. Каб ратавацца бегствам не магло быць і думкі. Шанс на выратаванне — прасіць ворага пашкадаваць нас, не расстрэльваць. Амаль кожны выказваў сваю просьбу. Напрыклад, Павел Салапаеў, Павел Якіменка і я спасылаліся на сваё малалецтва — нам ледзь-ледзь споўнілася па шаснаццаць гадоў. Нехта паказваў лістоўкі, у якіх немцы абяцалі ўсе даброты таму, хто прад'явіць іх... Але ніхто не прасіў сабе паратунку...

Праз нейкі час перакладчык (ён меў афіцэрскі чын) звярнуўся з нейкім зваротам да іншага афіцэра, відаць вышэйшага звання, і паказаў на нашы постаці, а затым загадаў выйсці з агульнай групы шасцярым — нам, траім малалеткам, сямейнай пары са Шклова і аднаму бежанцу з Магілёва. Сказана было нам тут жа на могілках назбіраць кветак, каб ускласці на магілу нямецкіх салдат, якіх зноў закапвалі. Мы выканалі распараджэнне. Нашым вяскоўцам загадалі стаць непадалёк ад свежавыкапанай ямы. Выбухнуў нейкі нечалавечы ці то стон, ці то крык. Грымнуў залп. Стралялі амаль ва ўпор. Як падкошаныя ўсе дванаццаць зваліліся, хто на спіну, хто на бок. Тут жа кожнаму паслалі па кулі. Стралялі яшчэ і яшчэ па кожным, у каго цяплілася жыццё. Я добра запомніў, як цяжка паміраў Павел Кавалёў — яму дасталася пяць куль...

Нам загадалі пахаваць расстраляных. Амаль у бяспамяцтве пачалі зносіць і ўкладваць у яму акрываўленыя целы сваіх таварышаў. Паклалі па чатыры ў рад, адзін на аднаго ў тры рады. Закрылі забітых скошанай канюшынай, засыпалі зямлёй.

...У 1969 годзе, калі на брацкай магіле ставілі помнік, напісалі імёны семярых: Васьковіч Аляксей П., Васьковіч Віктар М., Кавалёў Павел С., Салапаеў Архіп А., Ушакоў Міхаіл С., Чэлачаў Ягор М., Шынкароў Фядос Г. На жаль, траіх так і не ўспомнілі, відаць, ад іх роду ў вёсцы ці ў блізкіх мясцінах нікога не засталося. А яшчэ ў гэтай магіле аказалася двое невядомых салдат. Іх узялі ў палон дзесьці на шляху да нашай вёскі. Па знешнім абліччы верагодна гэта былі казахі ці ўзбекі. Яны былі раздзетыя да бялізны, босыя і за ўвесь час да расстрэлу не вымавілі ніводнага слова.

Такім крывава-ахвярным стаў першы дзень акупацыі маёй роднай вёскі Дзіўнава.

Яшчэ адна крывавая трагедыя разыгралася ў вёсцы пад самы канец акупацыі. 9 мая 1944 года група партызан днём пераходзіла лясную дарогу паміж вёскамі Саськаўка і Дзіўнава. У гэты ж самы час з Фашчаўкі у Займішча, дзе стаялі невялікія варожыя гарнізоны, на дзвюх падводах па гэтай жа дарозе ехалі немцы. І так было лёсам накавана, каб яны сустрэліся, што называецца тварам у твар. Партызаны былі насцярожаныя і заўважылі немцаў першымі. З засады адкрылі агонь і забілі чатырох ворагаў. Некалькім удалося выратавацца. Партызаны сабралі трафеі і пайшлі сваім маршрутам. А немцы тым жа надвячоркам правялі карную экспедыцыю. У Дзіўнаве і Саськаўцы сабралі 11 старых і аднаго падлетка і ўсіх расстралялі. Саманму старэйшаму з расстраляных, майму дзеду па маці з вёскі Саськаўка Сякацкаму Іосіфу Рыгоравічу, ішоў 84-ы год, саманму малодшаму хлопчыку з Дзіўнава, Салапаеву Сярожу, не споўнілася і 14. Астатнім было далёка за 60. На заву імёны расстраляных у гэты дзень усіх дзіўнаўскіх дзядоў: Кавалёў Васіль (дзед Маргай), Гаранкоў Пракоп, Жураў Ціхан, Жураў Мікіта (дзед Цар), Васьковіч Аўхім, Хальцаў Фама. Няхай прабачаць мяне саськаўцы, іх імёнаў, на жаль, не ведаю. Перш чым пакінуць месца расправы, немцы замініравалі некалькі трупаў. Калі родныя забіралі нябожчыкаў, каб пахаваць, адна міна ўзарвалася і пакалечыла жанчыну.

Помняцца і іншыя крывавыя сляды акупацыйнага ліхалецця. Аднойчы дзед «Макаравіч» (Аляксандраў Васіль Макаравіч) — найцікавейшы ў сваіх нестандартных паводзінах чалавек — вяртаўся з гасцей, вядома ж на лёгкім падпітку. І трэба яму на тое ліха спыніцца ля рэшткаў даўно спаленай нямецкай аўтамашыны. Адкуль ні вазьміся з лесу на дарогу выехала некалькі верхавых немцаў. Не паспеў наш дзед ачаломецца, як адзін з коннікаў прыцэліўся ў яго з карабіна: «Бах!» — няма «Макаравіча».

І яшчэ... Дзесьці на пачатку зімы 1943—1944 гадоў, калі фронт спыніўся на раць Проня, акрамя звыклых партызан па начах сталі наведвацца невядомыя людзі, узброеныя аўтаматамі, у новых армейскіх кажухах. Былі

гэта ці то разведчыкі, ці чырвонаармейцы-дэсантнікі. Недзе ў лясной мярэчы ў трохвугольніку вёсак Дзіўнава — Чарапы — Саськаўка яны змайстравалі будан, у ім і жылі. Пра гэту стаянку ведалі многія, але адзін хлопец, Паўлючэнка Фёдар Васільевіч, які пасля акружэння прабіраўся ў сваю вёску, наладзіў з імі сувязь. Ды, як хадзілі чуткі, нейкаму нядобраму чалавеку расказаў пра сваю «вандроўку», а той давёў да вушэй немцаў. Развязка наступіла хутка. Немцы злавілі Фёдара і прымусілі яго весці іх у лес. Каб выратаваць сям'ю, а дома былі маці, маладая жонка і брат-падлетак, Фёдар павёў ворагаў у лес па сваіх слядах, выразна бачных на снезе. Не даходзячы колькі сотняў метраў да будана, ён, пятляючы паміж дрэў, кінуўся наўцёкі. Немцы распачалі страляніну, забілі Фёдара, але выдалі сябе. Чырвонаармейцы-разведчыкі паспелі пакінуць стаянку, знікнуць з гэтага месца. Так наш вясковец-патрыёт выратаваў жыцці баявых малазнаёмых таварышаў.

Апошняя трагедыя з крывавым канцом разыгралася роўна за два тыдні да вызвалення — 12 чэрвеня 1944 года. Пасля прарыву апошняй блакады горацкіх лясоў некаторыя партызанскія групы перабраліся ў нашы мясціны. Аднойчы, пераходзячы з аднаго ляснога масіву ў іншы, партызаны пакінулі добра бачны след на чэрвеньскай расе. Гэта прыкмета і паслужыла немцам арыенцірам для праследавання. След вёў міма хутара Хальцава Аксёна Фаміча і губляўся ў лесе. Немцы ў лес не сунуліся, а ўсю сваю звярыную лютасць вымесцілі на сям'і мірнага хутараніна. На парозе хаты застрэлілі гаспадыню Елізавету з паўтарамесячным немаўляткам на руках, а затым падпалілі пабудовы. У схованцы ад дыму задыхнуўся сам гаспадар Аксён Фаміч, 1903 года нараджэння, і два сыны.

...За тры гады акупацыі дзіўнаўцы перажылі цяжкія выпрабаванні. На вайну з 128 двароў пайшлі больш як 150 воінаў, а вярнулася ледзь 30 параненых, скалечаных, хворых. Астатнія — хто «загінуў на фронце», хто «прапаў без вестак», хто «не прыйшоў з вайны». У самой вёсцы немцы забілі ці спалілі 26 мужчын, старых, дзяцей. Кожная сям'я панесла незваротныя чалавечыя і матэрыяльныя ахвяры. Вайна забрала пяць братоў Салапаевых — Архіпа, Аўхіма, Івана, Паўла і Сярожу, чатырох братоў Зязюліных — Якава, Івана, Захара і Рамана, траіх братоў Якіменкаў — Мяфодзія, Петрака і Аўрама. Гэты паімённы спіс не мае канца...

Прыход 26 чэрвеня 1944 года Савецкай Арміі быў сустрэты як цудадзейная ява, як выратавальная сіла, як збавенне ад пастаяннага жаху, як вяртанне кожнага ўцалелага да свайго натуральнага чалавечага аблічча, чалавечай вартасці і каштоўнасці. З гэтым пачуццём і цяпер жыве кожны, каму давялося прайсці праз трохгадовае пекла акупацыі.

Я ўдзячны свайму маладзейшаму таварышу-аднавяскоўцу Хальцаву Івану Аксёнавічу за тое, што ён дапамог мне ўзнавіць у памяці і абнародаваць у гэтым допісе некаторыя падзеі, факты, даты, імёны. Няхай не сатрэцца ў гадах стужка чалавечай памяці ні пра добрае, ні пра благое...

А. Паўлючэнка

З успамінаў В. І. Мільто — вязня канцлагера

Валянцін Іванавіч Мільто — адзін з тых, у каго дзяцінствам была вайна, а дзіцячым садам — канцлагер. Друкуем яго успамін як жывога сведкі таго жудаснага і бесчалавечнага, што прынесла нашаму народу фашысцкая акупацыя.

«...У лістападзе 1943 г., — расказвае ён, — маіх маці, Антаніну Яфімаўну, састарэлага дзядулю Яфіма, шасцігадовага брата Эдуарда, мяне — чатырохгадовага хлапчука, некалькіх аднавяскоўцаў Тамару Рыбакову, Віктара Акулава заваёўнікі забралі з бацькоўскіх хат, пагрузілі ў вагон з нарамі і павезлі аж ва Усходнюю Прусію. Больш года жылі ў нейкім фанерным бараку. Маці ганялі на ўзвядзенне ўмацаванняў, а дзядулю з іншымі мужчынамі — працаваць на цагельны завод. Мы, дзеці, мерзлі ў чаканні той бурды, што была для нас адзінай ежай. Памятаю, увесь час хацелася есці. Не забудзецца яшчэ, як з братам залезлі пад аўтамабіль, а мяне раз'юшаны гітлеравец кінуў у пясок, нацэліўся застрэліць. Яго руку адвёў другі немец, відаць, з добрай душой.

Памятаю, трымаючы мяне на руках, маці паказвала на вогненныя стрэлы «кацюш», што ляцелі ў бок умацаванняў пад г. Хайсбергам (там знаходзіўся і канцлагер). Савецкія салдаты пачаставалі мёдам — боскім падарункам для нас. На конях (на тры сям'і падвода) дабіраліся да Мінска, адтуль ужо на цягніку ў Шклоў. Дом быў разбіты, уладкаваліся ў дзядзькі... Нямецкі «дзетсадзік» доўга вылазіў бокам: некалькі разоў хварэў на запаленне лёгкіх. Прыйшла пахавальная на бацьку-франтавіка. Але нічога, выжылі, адбудаваліся, сталі на ногі...»

Валянцін Іванавіч Мільто, ужо дарослым, працаваў токарам, завочна закончыў вучобу ў Магілёўскім палітэхнікуме і ў Горацкай сельгасакадэміі. А пасля былы вязень канцлагера стаў начальнікам раённай інспекцыі па экалогіі.

Запісаў *У. Паўлаў*

Народ не пакарыўся

Фронт у тыле ворага. Жорсткі акупацыйны рэжым не зламаў волю і мужнасць большасці савецкіх людзей. Яны сталі падымацца на справядлівую, свяшчэнную вайну супраць фашысцкіх захопнікаў. Вялікую ролю ў гэтым адыграла шырока разгорнутая арганізацыйна-мабілізацыйная і прапагандысцкая работа, што пачалася адразу ж пасля выступлення па радыё 22 чэрвеня нам. старшыні Саўнаркома і наркома замежных спраў В. М. Молатава. У звароце да народа ўтрымліваўся заклік да з'яднання, арганізаванасці ў барацьбе з ворагам. Ставілася задача пры вымушаным адыходзе часцей Чырвонай Арміі не пакідаць акупантам хлеба, жывёлы, паліва, ніякіх каштоўнасцей; арганізоўваць партызанскія атрады і дыверсійныя групы, умацоўваць веру ў перамогу над фашысцкай Германіяй.

У той жа дзень ЦК КП(б)Б прыняў пастанову «Аб задачах і мерапрыемствах у сувязі з выступленнем па радыё намесніка старшыні СНК СССР Молатава В. М.», у якой гаварылася: «...Созвать в Минске и в других областных городах партийные активы для мобилизации партийных организаций на разрешение задач, вытекающих из военной обстановки. На Минском партийном активе (созвать на 3 часа дня) выступление поручить тов. Пономаренко.

На всех предприятиях, в колхозах, совхозах, учреждениях провести митинги.

Обязать все обкомы, горкомы и райкомы, советские, комсомольские и профсоюзные организации принять меры к организованному переводу работы промышленности и транспорта на нужды Красной Армии».

НАРБ, ф. 4, воп. 33, спр. 1, л. 1.

Праграмным дакументам для партыйных і савецкіх органаў, для народа з'явіліся Дырэктывы СНК СССР і ЦК ВКП(б) ад 29.06.1941 г. партыйным і савецкім арганізацыям прыфрантавых абласцей. Патрабавалавася:

...4) При вынужденном отходе частей Красной Армии угонять подвижной железнодорожный состав, не оставлять врагу ни одного паровоза, ни одного вагона, не оставлять противнику ни килограмма хлеба, ни литра горючего. Колхозники должны угонять скот, хлеб сдавать под сохранность государственным органам для вывозки его в тыловые районы. Все ценное имущество, в том числе цветные металлы, хлеб и горючее, которое не может быть вывезено, должно, безусловно, уничтожаться.

5) В занятых врагом районах создавать партизанские отряды и диверсионные группы для борьбы с частями вражеской армии, для разжигания партизанской войны всюду и везде, для взрыва мостов, дорог, порчи телефонной и телеграфной связи, поджога складов. В захваченных районах создавать невыносимые условия для врага и всех его пособников, преследовать и уничтожать их на каждом шагу, срывать все их мероприятия.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. С. 50—51.

З ДЫРЭКТЫВЫ ЦК КП(б)Б АД 1.07.1941 г. ПАРТЫЙНЫМ, САВЕЦКІМ І КАМСАМОЛЬСКІМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПА РАЗГОРТВАННІ ПАРТЫЗАНСКАЙ ВАЙНЫ Ў ТЫЛЕ ВОРАГА

... 2. Все местности Белоруссии, занятые врагом, должны немедленно покрыться густой сетью партизанских отрядов, ведущих непрерывную ожесточенную борьбу на уничтожение врага.

3. В районах и селах создаются подпольные партийные и комсомольские ячейки, главная задача которых — мобилизация народа на беспощадную расправу с врагом. Для

этой цели все коммунисты и комсомольцы, способные носить оружие, остаются на территории, занятой врагом.

4. Подпольные организации и партизанские отряды должны иметь явочные квартиры, адреса которых сообщить военному отделу ЦК. Эти явки помогут держать связь, объединять (подпольщиков) и направлять (им) директивы и помощь.

5. Твердо помнить, что партизанская борьба не имеет ничего общего с выжидательной пассивной тактикой. Она имеет боевой наступательный характер. Не надо ждать врага — надо его искать и уничтожать.

6. Задачи партизан: уничтожать всякую связь в тылу врага, взрывать и портить мосты, дороги, поджигать склады горючего и продовольствия, автомашины, самолеты, устраивать крушения поездов. Уничтожать врагов, не давать им покоя ни днем ни ночью. Убивать их всюду, где застигнешь, убивать чем попало: топором, косой, ломом, вилами, ножом. Объединить несколько партизанских отрядов, нападать неожиданно на отряды противника и уничтожать. Особенно важно напасть ночью на аэродромы, сжечь самолеты, перебить летчиков...

7. Нельзя ждать ни минуты, начинать действовать сейчас же, быстро и решительно.

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны... С. 53—54.

БУКШТЫНАЎ Фёдар Іванавіч, н. у 1903 г., беларус, член КПСС з 1928 г. Напярэдадні вайны працаваў у сакратарыяце старшыні СНК СССР. У ліпені 1941 г. стаў камандзірам узвода ў дывізіі народнага апалчэння Ленінскага раёна Масквы. З чэрвеня 1942 г. — камандзір аддзялення 277-га партызанскага атрада ў Магілёўскай вобл. Са жніўня 1942 па студзень 1943 г. быў камандзірам 5-га атрада ў партызанскай брыгадзе «Чэкіст», адначасова ў кастрычніку 1942 — сакавіку 1943 г. — камісар гэтай брыгады. З чэрвеня 1943 па май 1944 г. з'яўляўся сакратаром Шклоўскага падпольнага райкома КП(б)Б. У жніўні 1943 — маі 1944 г. уваходзіў у кіруючы склад Шклоўскай ваенна-аператыўнай групы. У маі 1944 г. адазваны ў распараджэнне Магілёўскага падпольнага абкома партыі. Узнагароджаны некалькімі ордэнамі і медалямі СССР.

У барацьбе за вызваленне роднай зямлі

З успамінаў Ф. І. Букштынава

Аднымі з першых у Шклоўскім раёне, хто стаў на барацьбу з гітлераўскімі акупантамі, былі такія беззаветныя патрыёты сваёй краіны, як Мікалай Шусцікаў, Уладзімір і Пётр Чарновы з в. Грыбачы, Любоў Крывельская і Зінаіда Платонава з в. Рыжкавічы, сёстры Хаўранковы з в. Ганцавічы, Кацярына Краўчанка з в. Дымава. Усе яны — выхаванцы камсамола, душой і сэрцам адданыя савецкай уладзе, бацькоўскай зямлі. Гэта яны ўжо ў першыя тыдні вайны, перапісваючы з аркуша на аркуш словы з прамовы І. В. Сталіна, з якой ён звярнуўся 3 ліпеня 1941 г. да савецкага народа, па начах расклейвалі іх на вуліцах райцэнтра і вёсак Шклоўшчыны.

У сілу неспрыяльных умоў, якія склаліся для савецкіх войск у пачатку вайны, на акупіраванай ворагам тэрыторыі апынуліся і многія чырвонаармейцы, камандзіры Чырвонай Арміі. Тут, у Магілёўскай вобласці, яны адразу ж уключыліся ў барацьбу з ворагам. У ліку іх быў і лейтэнант Іван Дзмітрыевіч Буланаў, якога шляхі адступлення прывялі ў в. Вышкава Шклоўскага раёна. Сумесна з мясцовымі жыхарамі Паўлам Хаткевічам, Канстанцінам Кітовым, Зояй Аладзевай і іншымі патрыётамі з Вышкава, Тройцы і Уланава Іван Дзмітрыевіч арганізоўвае групу, з якой вясной 1942 г. вырастае партызанскі атрад.

Такія ж патрыятычныя групы былі створаны ў вёсках Літоўск і Шчацінка. У іх арганізуючае ядро ўваходзілі старшы лейтэнант Рыгор Сямёнавіч Іваноў, Уладзімір Мікалаевіч Рабінін, Віктар Фёдаравіч Чысцякоў, настаўніца-камсамолка Марыя Каліст-ратаўна Венядзіктава. А ў суседніх вёсках Алькоўка і Бярозаўка Аршанскага раёна сфарміравалася група лейтэнанта Барыса Мікалаевіча Клюшнікава.

Ф. І. Букштынаў

Сярод партызан Шклоўскага раёна знаходзіліся і былыя супрацоўнікі райаддзела міліцыі. У гэтую групу, якой кіраваў Міхаіл Мікалаевіч Бараноўскі, уваходзілі Павел Аксёнавіч Красякоў, Міхаіл Мікалаевіч Іваноў, Сяргей Андрэевіч Пушылін, Леў Рыгоравіч Салавей і інш.

У атрадах ваявала нямала пагранічнікаў. Магчыма, гэтыя абставіны і навялі на думку ўпаўнаважанага ЦК Кампартыі Беларусі Івана Якаўлевіча Канькова, які ў той час быў на Шклоўшчыне, аб тым, што створанае аб'яднанне партызанскіх атрадаў павінна іменавацца не інакш як партызанская брыгада «Чэкіст».

Камандзірам брыгады стаў Герасім Аляксеевіч Кірпіч, камісарам — былы палітработнік аднаго з падраздзяленняў Чырвонай Арміі Фёдар Міхайлавіч Сядлецкі, а начальнікам штаба — Іван Дзмітрыевіч Буланаў. Агульны партыйны сход, які праходзіў у тыя дні, выбраў партбюро брыгады на чале з Георгіем Мікалаевічам Андрэевым.

З кожным днём павялічваўся прыток жадаючых стаць у рады народных мсціўцаў. Здзяйсняючы ўцёкі з варожага палону, былыя чырвонаармейцы шукалі дарогу да партызан. Так, пры дапамозе нашых сувязных Любы Крывельскай і Зіны Платонавай у брыгаду трапіла вялікая група ваеннапалонных, якім удалося вырвацца з-за калючага дроту лагера пасёлка Барань паблізу Оршы. А праз некаторы час у рады партызан улілося каля 30 чалавек з гарнізона, які стварылі фашысты з былых ваеннапалонных у вёсцы Дубраўка таго ж Аршанскага раёна. Іх прывяла наша разведчыца Паліна Войтава.

Ужо летам 1942 г. камандаванню брыгады давялося заняцца ўзбуйненнем сваіх падраздзяленняў. Былі створаны новыя атрады пад кіраўніцтвам Аляксандра Фёдаравіча Сімдзянкіна, Андрэя Сцяпанавіча Нікітчанкі, Івана Мікалаевіча Суворава і Аляксандра Іванавіча Шамарына.

Такім чынам, праз год з невялікім пасля пачатку вайны на тэрыторыі Шклоўскага раёна ўжо дзейнічала даволі буйная партызанская брыгада з васьмі атрадаў, кожны з якіх у сярэднім налічваў каля сотні байцоў. Акрамя таго, у жніўні брыгада выдзеліла са сваіх радоў ініцыятыўныя групы пад кіраўніцтвам М. М. Іванова і І. В. Кананыхіна, якія павінны былі разрасціся ў асобныя адзінкі і дзейнічаць на левабярэжнай частцы Шклоўскага раёна.

Рост партызанскіх радоў патрабаваў вялікай колькасці ўзбраення, якое неабходна было здабываць у баях з фашыстамі. Даволі значнае папаўненне партызанскага арсенала мы атрымалі пры разгроме варожага гарнізона і валасной управы ў вёсках Старое Брашчына і Старасялле, а таксама ў час дывер-сіі на чыгуначным перагоне Копысь — Шклоў, калі пад адхон пусцілі нямецкі эшалон. Неацэнную дапамогу тады партызанам аказала моладзь многіх населеных пунктаў. Так, камсамольцы з вёскі Мікалаеўка Андрэй Акулаў і Мікалай Шумейка, патрыёты з вёскі Бушлякі Кірыла Кутузаў і Аляксей Шусцікаў са сваімі таварышамі сабралі і даставілі ў атрады не адзін дзесятак вінтовак і аўтаматаў, не адну сотню патронаў.

З гэтай жа мэтай летам 1942 г. мы ажыццявілі аперацыю «Сенакос». У разгар уборкі лугоў на левабярэжжы Дняпра, дзе пры адступленні савецкія войскі вялі цяжкія абарончыя баі, паслалі спецыяльную пошукавую групу на чале з камуністам Іванам Самсонавічам Шчарбаковым. Сабраць некалькі дзесяткаў вінтовак і аўтаматаў аказалася лягчэй, чым пераправіць іх праз Дняпр у партызанскую зону. Выручыла кемлівасць. Займеўшы некалькі падвод, група Шчарбакова паклала свой цэнны груз на дно калёс, а зверху нагрузіла сена. Гэты абоз «касцоў» пераправіўся праз Днепр прама па шклоўскім мосце на вачах у фашыстаў. Камандзір групы І. С. Шчарбакоў за гэтую паспяхова праведзеную аперацыю быў узнагароджаны медалём «За баявыя заслугі».

У выніку партызанскіх налётаў вясной і летам 1942 г. на правабярэжнай частцы Шклоўскага і прылеглых да яго Бялыніцкага, Круглянскага і Талачынскага раёнаў, дзе дзейнічалі сумесна з нашымі атрады К. М. Белавусава, С. Г. Жуніна, М. І. Абрамава, Н. Д. Авяр'янава і іншыя, былі амаль паўсюдна разгромлены гітлераўскія гарнізоны. Фашысты ўтрымлівалі толькі раённыя цэнтры ды лічаныя найбольш буйныя населеныя пункты, абсталяваўшы там цытадэлі за дротавымі загародамі і земляны-мі валамі.

...Доўга заставацца такое становішча, вядома, не магло. З дня на дзень трэба было чакаць, што вораг абавязкова прыме якінебудзь контрмеры. І вось 20 ліпеня ў штаб брыгады паступілі звесткі, што фашысты

збіраюць сілы для карацельнай аперацыі ў зоне дзеяння нашых атрадаў. Для гэтага прыцягваліся падраздзяленні шклоўскага, аршанскага і магілёўскага гарнізонаў.

Ужо к вечару наступнага дня ў вв. Калінаўка, Карзуны і Уланава з'явіліся авангарды праціўніка, якія ішлі са Шклова. Праз гадзіны паўтары стала вядома, што частка фашысцкіх падраздзяленняў магілёўскага гарнізона, якая рухалася па дарозе Чарнаручча — Шчацінка — Тройца, павярнула на ўсход, заняла вв. Чыжоўку і Чырчын, спрабуючы ўдарыць у тыл атраду А. С. Нікітчанкі, які ўжо вёў бой каля Уланава. Веставыя атрада своечасова паведамілі пра небяспеку, і партызаны пад прыкрыццём цемнаты ўздоўж лясной рачулкі Бярозаўка за ноч выйшлі з небяспечнай зоны.

Раніцай 22 ліпеня ўсе нашы атрады сабраліся каля в. Дымава. Атрад А. Ф. Сімдзянкіна заняў абарону на ўскраіне Рацаўскага лесу каля Гвалтоўніка. Атрады А. С. Дзяніса-ва і Б. М. Клюшнікава выставілі ахоўныя заслоны на дарогах у нашу зону з Круглага і Талачына, а атрады Г. С. Іванова і Н. П. Кавалёва сумесна з прыбыўшымі сюды на золку партызанамі з атрада А. С. Нікітчанкі акапаліся на ўскрайку Рацаўскага лесу, разлічваючы, што праціўнік, які следаваў уздоўж рэчкі Бярозаўка, абавязкова павінен з'явіцца на дарозе Хацькова — Стараселле з наступленнем дня. Меркаванні спраўдзіліся. У 10 гадзін раніцы на полі каля даваеннага Дымаўскага дома інвалідаў з'явіліся фашысты магілёўскай групы, а неўзабаве да іх далучыліся і гітлераўцы, якія ішлі ад Стараселля.

Народныя мсціўцы ўдарылі па ворагу з усіх відаў зброі — мінамётаў, кулямётаў, вінтовак. Апынуўшыся пад агнём сярод чыстага поля, гітлераўцы не ведалі, куды дзявацца. Адзін з іх, кінуўшы зброю, пабег да ўскрайку лесу, адкуль партызаны вялі агонь.

— Іх бін дэмакрат!.. Іх віль лебен!..* Не страляйт! — закрычаў ён яшчэ здалёку.

Але дабегчы да лесу яму не ўдалося: упаў, скошаны куляй, насланай услед кімсьці з паспеўшых залегчы фашыстаў.

— Гады! Свайго ўхлопалі, — працадзіў скрозь зубы наш аўтаматчык Мікалай Мільто.

...Бой закончыўся перамогай партызан. Толькі горстцы фашыстаў удалося дабегчы да аўтамашын і спешна ўцячы ў бок Чарнаручча. Партызаны падабралі на месцы бою багатыя трафеі і адышлі ў глыб Рацаўскага лесу.

...Летам 1942 г. у штабе начальніка тылу групы нямецка-фашысцкіх армій «Цэнтр» дэталёва распрацавалі план карнай аперацыі пад кодавай назвай «Сава». Яна пачалася ў першых числах верасня. Тылавым фашысцкім войскам дадалі некалькі палявых часцей, якія накіроўваліся на фронт, і авіяцыю. Гітлераўцы паставілі даволі пэўную мэту: акружыць партызанскую брыгаду «Чэкіст» і поўнасцю знішчыць яе.

Цаной немалых намаганняў нам усё ж удалося вырвацца з варожага кольца і, зрабіўшы шматдзённы марш, перайсці ў Віцебскую вобласць**. Амаль на паўгода Лепельскі, Чашніцкі раёны Віцебскай і часткова Халопеніцкі раён Мінскай вобласці сталі зонай дзеяння нашай брыгады, і толькі 11 красавіка 1943 г., выконваючы загад БШПД, мы вярнуліся ў Шклоўскі раён***.

Трэба адзначыць, што к гэтаму часу карэнным чынам змянілася становішча спраў на Магілёўшчыне ў каардынацыі баявых дзеянняў партызан. Барацьбу супраць захопнікаў у вобласці ўзначаліў Магілёўскі падпольны абком КП(б)Б, створаны па рашэнні ЦК КП(б)Б у красавіку 1943 г. Пры абкоме была ваенна-аператыўная група, якая кіравала ўсёй практычнай работай па арганізацыі, каардынацыі і развіцці партызанскага руху ў Магілёўскай вобласці. У раёнах сталі ствацца падпольныя парторганы. 28 чэрвеня 1943 г. такі орган — падпольны райком партыі — узнік і ў Шклоўскім раёне. У састаў яго ўвайшлі: камбрыг Г. А. Кірпіч, Ш. Л. Кеслер, Ф. Т. Сіялка, І. С. Шчарбакоў. Сакратаром выбралі мяне.

Падпольны райком партыі ў больш шырокіх маштабах пачаў весці агітацыйную і прапагандысцкую работу сярод насельніцтва. У кожным партызанскім атрадзе стварылі прапагандысцкія групы, якія не толькі рэгулярна праводзілі палітгутаркі з таварышамі па зброі, але і выступалі перад жыхарамі вёсак раёна. Інфармацыю пра становішча спраў на франтах, працоўныя дасягненні савецкага народа, зарубежныя навіны мы атрымлівалі па рацыі — яе прымала радыстка В. А. Палішчук, якую прыслалі ў наш раён з-за лініі фронту.

---

* Я — дэмакрат!.. Я хачу жыць!..

** Пры гэтым атрады І. М. Суворава і М. К. Хадорыка загінулі, атрады А. С. Нікітчанкі і Н. І. Кавалёва часова ўвайшлі ў састаў 8-й Круглянскай партызанскай брыгады.

*** Пасля гэтага атрады брыгады атрымалі нумарныя абазначэнні.

Нейкі час райком партыі абыходзіўся без свайго друкаванага органа, але абставіны ўсё настойлівей патрабавалі стварэння падпольнай газеты. Такія газеты ўжо выдаваліся ў многіх раёнах вобласці. Шклоўскія камуністы звярнуліся за дапамогай да падпольшчыкаў Оршы і Магілёва, і неўзабаве да нас, у партызанскую зону, літаральна па прыгаршчах, пачаў прыбываць друкарскі шрыфт. Знайшоўся і спецыяліст друкарскай справы — адзін з нашых партызан — П. І. Кальчэнка. Дзякуючы яго знаходлівасці абсталявалі паходную касу для шрыфту, якая ўяўляла сабой метровы кавалак брызенту з мноствам мяшэчкаў-кішэньчыкаў — для кожнай літары свой. Гэта аказалася вельмі практычна ў нашым паходным жыцці. Такім жа негрузасткім і зручным у паходзе быў і астатні друкарскі інвентар.

Рэдактарам падпольнай раённай газеты, якой далі назву «За Родину», стаў член райкома партыі І. С. Шчарбакоў. Супрацоўнічалі ў ёй і баявыя камандзіры, і радавыя партызаны, і жыхары раёна.

З вялікай павагай і даверам адносіўся народ да друкаванага слова, і таму заўсёды партызанскія разведчыкі і сувязныя, ідучы на заданне, бралі свежыя нумары газеты.

Газеты і лістоўкі мы актыўна выкарыстоўвалі ў рабоце па разлажэнні варожых гарнізонаў, за вяртанне ў рады змагароў за свабоду Радзімы тых людзей, хто, паддаўся падману, аказаўся ў радах так званай «Рускай вызваленчай арміі».

...Але вайна ў тыле ворага — гэта не толькі адкрытыя баі, не толькі разгром гарнізонаў праціўніка або дыверсіі падрыўнікоў на шасэйных дарогах і чыгунках. Нашым людзям даводзілася забірацца ў гітлераўскія ўстановы, у размяшчэнне іх часцей, каб весці там вельмі патрэбную разведачную работу. А патрапіць туды няпроста. Патрабаваліся адпаведныя дакументы.

Такія пасведчанні акупацыйных улад і ўсемагчымыя пропускі выдатна рабіў партызан нашай брыгады Казачонак. Па зробленых ім дакументах у Оршы, напрыклад, былі ўладкаваны на працу падпольшчыцы Марыя Глушанкова, Вольга Гарбацэвіч, Антаніна Фаміна і Вольга Дземеш. Там жа, у Оршы, працавала і самая малодшая з шасці сясцёр-падпольшчыц Хаўранковых з в. Ганцавічы — Зінаіда Піліпаўна, праз якую да партызан паступалі звесткі пра рух нямецкіх войск не толькі па чыгункі Мінск — Смаленск, а і па аўтадарожных магістралях Орша — Магілёў, Орша — Смаленск. У задачу гэтай падпольшчыцы ўваходзіў таксама збор звестак пра размяшчэнне ў горадзе і на станцыі варожых складоў з узбраеннем і боепрыпасамі.

Хочацца сказаць некалькі цёплых слоў пра тых людзей, хто быў прыняты Шклоўскім райкомам партыі ў тыя грозныя гады ў рады камуністаў. Іх некалькі дзесяткаў, і сярод іх такія, як Іван Дзмітрыевіч Буланаў — начальнік штаба брыгады «Чэкіст», Рыгор Мікалаевіч Севасцьянаў — намеснік камбрыга, а пазней начальнік штаба ваенна-аператыўнай групы пры падпольным райкоме партыі, Павел Агафонавіч Галіцын — начальнік разведкі, падрыўнік Махадалі Тапвалдыеў, якому за смеласць і адвагу ў адной з аперацый на «жалезцы» прысвоілі высокае званне Героя Савецкага Саюза, і інш.

...Вайна з'явілася цяжкім выпрабаваннем для нас, савецкіх людзей. І гэтае вялікае выпрабаванне мы вытрымалі з гонарам.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на Шклоўшчыне

Адным з буйнейшых фарміраванняў была **партызанская брыгада «Чэкіст»**.

Створана ў канцы мая 1942 г. з атрадаў Г. А. Кірпіча (пазней партызанскі атрад 1-ы) і І. Дз. Буланава (пазней партызанскі атрад 10-ы) як «Аб'яднанне партызанскіх атрадаў». У ліпені 1942 г. рэарганізавана ў брыгаду «Чэкіст». Атрады атрымалі нумарныя абазначэнні.

У чэрвені 1942 г. на базе атрада Г. А. Кірпіча (1-ы) быў створаны атрад А. Ф. Сімдзянкіна (5-ы), з асабовага складу, выдзеленага атрадам І. Дз. Буланава (10-ы), — атрад А. С. Нікітчанкі (12-ы). У ліпені ў брыгадзе арганізаваны атрад І. М. Суворава (у кастрычніку раскіданы ў час бою з карнікамі, камандзір загінуў). У гэтым жа месяцы ў брыгаду былі ўключаны асобныя атрады Б. М. Клюшнікава (20-ы), М. М. Бараноўскага (40-ы), М. К. Хадорыка (у кастрычніку 1942 г. расфарміраваны). У жніўні 1942 г. створаны атрады А. І. Шамарына

(15-ы) і А. І. Зайцава (у гэтым жа месяцы рассеяны ў баі з карнікамі).

У верасні 1942 г. у час экспедыцыі карнікаў брыгада прарвала блакаду і выйшла ў Лепельскі раён Віцебскай вобл. Атрады А. С. Нікітчанкі і П. А. Красякова (былы М. М. Бараноўскага) перабраліся ў Круглянскі раён, дзе ўвайшлі ў 8-ю Круглянскую брыгаду пад нумарамі 12-ы і 40-ы.

У красавіку 1943 г. у брыгадзе быў створаны атрад «25 лет Октября» (пазней 25-ы). У гэтым жа месяцы брыгада зноў прыбыла ў Шклоўскі раён і была ўключана ў склад Магілёўскай (абласной) ваенна-аператыўнай групы. У ліпені 1943 г. вярнуўся ў брыгаду 40-ы атрад.

Акрамя Шклоўскага брыгада «Чэкіст» дзейнічала ў Круглянскім, Бялыніцкім, Талачынскім, Аршанскім і Лепельскім раёнах. Партызаны вялі баі з ворагам, ратавалі насельніцтва ад загубы і вывазу на катаржныя работы ў Германію. Праводзілі аперацыі на чыгуначных участках Мінск — Орша, Орша — Магілёў.

У жніўні 1943 г. у сувязі з арганізацыяй Шклоўскай ваенна-аператыўнай групы* брыгада расфарміравана. На гэты час яна мела 7 атрадаў агульным лікам больш за 800 партызанаў.

Камандзір брыгады — Кірпіч Герасім Аляксеевіч (май 1942 — жнівень 1943); камісары: Сядлецкі Фёдар Міхайлавіч (май 1942 — кастрычнік 1942, сакавік 1943 — жнівень 1943); Букштынаў Фёдар Іванавіч (кастрычнік 1943 — сакавік 1943); нач. штаба — Буланаў Іван Дзмітрыевіч (май 1942 — кастрычнік 1942, сакавік 1943 — жнівень 1943), Севасцьянаў Рыгор Мікалаевіч (кастрычнік 1942 — сакавік 1943).

1-ы асобны атрад — арганізаваны ў сакавіку 1942 г. на тэрыторыі Круглянскага раёна з груп Г. С. Іванова, В. Н. Рабініна, А. Ф. Сімдзянкіна і Г. А. Кірпіча. Пазней у атрад улілася група Р. М. Севасцьянава, П. А. Галіцына. У канцы мая ўвайшоў у склад брыгады «Чэкіст», у жніўні 1943 г. уключаны ў склад Шклоўскай ВАГ. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй, 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 485 партызан, у т. л. мужчын — 429, жанчын — 56. Камандзіры: Кірпіч Герасім Аляксеевіч (сакавік 1942 — чэрвень 1942), Іваноў Рыгор Сямёнавіч (чэрвень 1942 — чэрвень 1944); камісары: Счаслаўскі Пётр Ігнатавіч (сакавік 1942 — май 1944, загінуў), Данілаў Мікалай Міхайлавіч (май 1944 — чэрвень 1944); нач. штаба — Шамарын Аляксандр Іванавіч (люты 1943 — жнівень 1943), Папоў Дзяніс Фёдаравіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944).

5-ы асобны атрад — сфарміраваны ў чэрвені 1942 г. у Сасноўскай дачы Шклоўскага раёна з асабовага складу, які выдзеліў 1-ы атрад. У жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі налічваў 362 партызаны, у т. л. мужчын — 339, жанчын — 23. Камандзір — Сімдзянкін Аляксандр Фёдаравіч; камісары: Кунгурцаў Ігнат Яўстахавіч (чэрвень 1942 — ліпень 1942), Ельканавіч Самуіл Муліч (ліпень 1942 — жнівень 1942, загінуў), Букштынаў Фёдар Іванавіч (жнівень 1942 — студзень 1943), Крэнеў Сяргей Аляксандравіч (студзень 1943 — снежань 1943); Саўчанка Сцяпан Пятровіч (снежань 1943 — чэрвень 1944); нач. штаба — Пракапец Давыд Якаўлевіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

10-ы асобны атрад — арганізаваны ў красавіку 1942 г. у Сісенеўскай дачы Шклоўскага раёна, дзейнічаў самастойна, у канцы мая 1942 г. увайшоў у склад брыгады «Чэкіст», у жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй, 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 376 партызан, у т. л. мужчын — 335, жанчын — 41. Камандзіры: Буланаў Іван Дзмітрыевіч (красавік 1942 — чэрвень 1942), Дзянісаў Аляксандр Сямёнавіч (ліпень 1942 — верасень 1942, загінуў), Маркаў Пётр Іванавіч (верасень 1942 — сакавік 1943, загінуў), Дзякаў Мікалай Сямёнавіч (сакавік 1943 — красавік 1944), Крымцаў Іван Міхайлавіч (красавік 1944 — чэрвень 1944, загінуў), Белабрагін Антон Антонавіч (чэрвень 1944); камісары: Пракапец Давыд Якаўлевіч (чэрвень 1942 — жнівень 1942), Грышанаў Фёдар Адамавіч (жнівень 1942 — чэрвень 1944); нач. штаба — Красоўскі Станіслаў Міхайлавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

* Ваенна-аператыўная група — адна з формаў аператыўнага і партыйнага кіраўніцтва партызанскім рухам. Створана ў жніўні 1943 г. на базе партызанскіх атрадаў 1, 5, 10, 15, 20, 25, 40-га партызанскай брыгады «Чэкіст». У верасні 1943 г. створаны атрад 60-ы, у кастрычніку — 31-ы. У снежні 1943 г. атрады 15-ы і 40-ы перададзены партызанскай брыгадзе 8-й. Кіраўніцтва ВАГ: сакратары падпольнага РК КП(б)Б Ф. І. Букштынаў, А. У. Бай; камандзір Г. А. Кірпіч, нач. штаба Р. М. Севасцьянаў. ВАГ пры падпольным райкоме партыі як партызанскае фарміраванне ўваходзіла ў Магілёўскае партызанскае злучэнне (Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945. Мн., 1990. С. 638).

20-ы асобны атрад — арганізаваны ў чэрвені 1942 г. у Шклоўскім раёне на базе групы Б. М. Клюшнікава (створана зімой 1941—1942 у Аршанскім раёне). У чэрвені 1942 г. уключаны ў склад брыгады «Чэкіст», у жніўні 1943 г. перададзены Шклоўскай ВАГ. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 29 чэрвеня 1944 г., налічваў 418 партызан, у т. л. мужчын — 386, жанчын — 32. Камандзіры: Клюшнікаў Барыс Мікалаевіч (чэрвень 1942 — кастрычнік 1942, загінуў), Якімаў Сцяпан Мікітавіч (кастрычнік 1942 — чэрвень 1944); камісары: Масюраў Мікалай Іванавіч (ліпень 1942 — кастрычнік 1942, загінуў), Сіялка Фёдар Цімафеевіч (кастрычнік 1942 — жнівень 1943), Ігнаценка Георгій Ісаевіч (жнівень 1943 — чэрвень 1944); нач. штаба — Мацюшэўскі Анатоль Іларыёнавіч (чэрвень 1943 — чэрвень 1944).

25-ы асобны атрад — арганізаваны ў красавіку 1943 г. у складзе брыгады «Чэкіст» на базе ўзвода з 10-га атрада. Спачатку называўся «25 лет Октября», потым — 25-ы. У жніўні 1943 г. уключаны ў склад Шклоўскай ВАГ. На дзень злучэння з Чырвонай Арміяй налічваў 152 партызаны, у т. л. мужчын — 147, жанчын — 5. Камандзір — Якушка Ілья Аляксеевіч (красавік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Левін Мікалай Фёдаравіч (красавік 1943 — май 1944), Пічугін Міхаіл Паўлавіч (май — чэрвень 1944); нач. штаба: Макееў Ягор Аўціхавіч (чэрвень 1943 — красавік 1944), Цімашэнка Якаў Ціханавіч (красавік — чэрвень 1944).

60-ы асобны атрад імя Ф. М. Сядлецкага — арганізаваны ў верасні 1943 г. у складзе Шклоўскай ВАГ на базе партызанскай групы, створанай у жніўні 1943 г. Да лістапада 1943 г. называўся 30-ы, затым — 60-ы, у снежні 1943 г. яму прысвоена імя загінуўшага камандзіра М. Ф. Сядлецкага. На дзень злучэння з часцямі Чырвонай Арміі, 29.06.1944 г., налічваў 331 партызана, у т. л. мужчын — 303, жанчын — 28. Камандзіры: Сядлецкі Фёдар Міхайлавіч (верасень 1943 — снежань 1943, загінуў), Крэнеў Сяргей Аляксеевіч (снежань 1943 — чэрвень 1944); камісар — Букштынаў Павел Іванавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944); нач. штаба: Хадорык Макс Канстанцінавіч (верасень 1943 — кастрычнік 1943, загінуў), Жамейка Іван Восіпавіч (кастрычнік 1943 — сакавік 1944, загінуў), Тразін Мікалай Мікалаевіч (сакавік — чэрвень 1944).

Партизанские формирования Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. 1941—1944. Мн., 1983. С. 563—568.

115-ы Горацкі атрад. У кастрычніку 1943 г. з разрозненых партызанскіх груп 17-й брыгады і іншых фарміраванняў, якія выйшлі з блакады ў Горацкі і сумежныя з ім раёны, быў арганізаваны атрад 35-ы (8 лютага 1944 г. перайменаваны ў 115-ы Горацкі). Атрад дзейнічаў у Горацкім, Шклоўскім, Дрыбінскім раёнах Магілёўскай і Дубровенскім, Аршанскім Віцебскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 26 чэрвеня 1944 г. агульнай колькасцю 801 партызан, у т. л. мужчын — 705, жанчын — 96. Пасля выхаду атрада ў савецкі тыл БШПР вызначыў яго 115-й Горацкай брыгадай. Камандзір — Ленчыкаў Георгій Рыгоравіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Лагімахаў Іван Іванавіч (кастрычнік 1943 — май 1944), Палікарпаў Аляксей Фролавіч (май — чэрвень 1944).

112-ы Горацкі асобны атрад — арганізаваны ў верасні 1943 г. у Горацкім раёне. Да мая 1944 г. уваходзіў 2-м атрадам у 115-ю Горацкую брыгаду, затым выдзеліўся ў самастойны. Дзейнічаў у Горацкім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай, Дубровенскім, Аршанскім Віцебскай абласцей. На 26 чэрвеня 1944 г. налічваў 681 партызана, у т. л. мужчын — 579, жанчын — 102. Камандзір атрада — Шароў Васіль Данілавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Бурлаеў Уладзімір Захаравіч (лістапад 1943 — студзень 1944), Рэвякаў Пётр Сільвестравіч (студзень — чэрвень 1944, загінуў); нач. штаба — Кумчы Сяргей Цітавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944).

Партизанские формирования Белоруссии... С. 573—574.

277-ы партызанскі полк Клічаўскай ВАГ, створаны ў верасні 1943 г. Дзейнічаў у складзе Клічаўскай ВАГ у Клічаўскім, Бялыніцкім, Магілёўскім, Быхаўскім, Кіраўскім, Шклоўскім раёнах Магілёўскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 28 чэрвеня 1944 г. Камандзіры палка: Ізох Ігнат Зіноўевіч (верасень 1943 — май 1944), Коканцаў Міхаіл Паўлавіч (чэрвень 1944); камісары: Гершовіч Ісак Маісеевіч (верасень 1943 — люты 1944), Кніга Мікалай Іванавіч (люты — чэрвень 1944), Радзюк Арсеній Максімавіч (чэрвень 1944); нач. штаба — Токараў Савелій Ціханавіч (верасень 1943 — чэрвень 1944).

Партизанские формирования Белоруссии... С. 522—523.

278-ы асобны атрад, створаны 9 чэрвеня 1942 г. як спецатрад пры Клічаўскім падпольным райкоме КП(б)Б з партызан, якія выдзелены 277-м асобным атрадам. Дзейнічаў у Клічаўскім, Бярэзінскім, Кіраўскім, Бялыніцкім, Шклоўскім, Быхаўскім раёнах. Камандзіры: Кніга Мікалай Іванавіч (чэрвень 1942 — кастрычнік 1943), Анoніч Васіль Малахавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісары: Латышаў Аляксей Міхайлавіч (чэрвень — кастрычнік 1942), Заяц Якаў Іванавіч (красавік 1943), Курганаў Андрэй Цімафеевіч (красавік 1943 — чэрвень 1944); нач. штаба: Кушнер Павел Андрэевіч (люты 1943 — май 1944), Рудоў Іван Фёдаравіч (чэрвень 1944).

122-гі партызанскі полк «За Радзіму» Бялыніцкай ВАГ, сфарміраваны ў кастрычніку 1943 г. Дзейнічаў у Бялыніцкім і Шклоўскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. Камандзір — Ліпскі Антон Іванавіч (кастрычнік 1943 — чэрвень 1944); камісар — Кручынін Мікалай Фёдаравіч; нач. штаба: Сікорскі Павел Андрэевіч (кастрычнік 1943 — лістапад 1943), Салтаказін Мікалай Аляксеевіч (лістапад 1943 — чэрвень 1944).

760-я брыгада імя М. Беразоўскага*, дзейнічала з лютага 1942 г. спачатку як атрад 5-й Клічаўскай, затым 5-й Магілёўскай брыгады, з ліпеня 1943 г. — Бялыніцкай ВАГ на тэрыторыі Клічаўскага, Бялыніцкага, Шклоўскага раёнаў. Брыгадай стала лічыцца з верасня 1943 г. Камандзіры: Келбнеў Георгій Міхайлавіч (люты 1942 — красавік 1942, загінуў), Пярэсценка Рыгор Іванавіч (красавік 1942 — чэрвень 1944); камісар — Міхайлаў Васіль Максімавіч (люты 1942 — чэрвень 1944); нач. штаба: Лантухоў Іван Яфімавіч (люты — красавік 1942, загінуў), Баранаў Міхаіл Антонавіч (красавік 1942 — ліпень 1943), Ражаў Канстанцін Іванавіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944).

35-я брыгада Бялыніцкай ВАГ, створана ў Тудараўскім лесе Шклоўскага раёна ў верасні 1942 г. з асобных партызанскіх груп, якія засталіся пасля баёў з карнікамі атрада Ф. І. Чабыкіна. У красавіку 1943 г. групы аб'ядналіся ў атрад, які дзейнічаў самастойна ў Горацкім, Дрыбінскім і Шклоўскім раёнах. Пасля злучэння з часцямі Чырвонай Арміі 30 чэрвеня 1944 г. БШПР вызначыў атрад 35-й брыгадай са студзеня 1944 г. Камандзіры: Саўчак Пётр Іванавіч (красавік 1943 — май 1943, загінуў), Прахарэнка Іван Рыгоравіч (май 1943 — ліпень 1944); камісары: Шонін Сцяпан Аляксандравіч (красавік 1943 — чэрвень 1943), Думчаў Рыгор Ільіч (чэрвень 1943 — ліпень 1943, красавік 1944 — чэрвень 1944); нач. штаба — Мамінаў Ігнат Мікалаевіч (ліпень 1943 — чэрвень 1944).

Партизанские формирования Белоруссии... С. 525—526, 529—530, 531—532.

61-я брыгада Магілёўскай ВАГ, створана ў Клічаўскім раёне з ґрупы ваеннаслужачых, якая ў маі 1942 г. стала атрадам. Дзейнічаў як асобны ў Бялыніцкім, Клічаўскім, Магілёўскім, Шклоўскім, Быхаўскім, Кіраўскім раёнах. Пасля выхаду ў савецкі тыл у ліпені 1944 г. вызначаны 61-й брыгадай. Камандзір — Паўлаў Рыгор Кузьміч (май 1942 — чэрвень 1944).

8-я Круглянская брыгада, створана ў сярэдзіне чэрвеня 1942 г. з партызанскіх атрадаў С. Г. Жуніна, Д. А. Кулікова, Г. С. Місніка і асобных груп, якія дзейнічалі ў Круглянскім і сумежных з ім раёнах з вясны 1942 г. У кастрычніку 1942 г. у склад брыгады ўліліся атрады А. С. Нікітчанкі і П. А. Красякова, якія адсталі ад асноўных сіл брыгады «Чэкіст» у час выхаду з блакады праціўніка. (У ліпені 1943 г. атрад Красякова (№ 40) вернуты брыгадзе «Чэкіст».) Дзейнічала брыгада ў Круглянскім, Шклоўскім, Бялыніцкім раёнах Магілёўскай і Крупскім раёне Мінскай абласцей. У жніўні 1943 г. брыгада была расфарміравана, а яе атрады перададзены (як асобныя) Круглянскай ваенна-аператыўнай групе. Камандзіры брыгады: Маршчынскі Аляксандр Аляксеевіч (чэрвень — кастрычнік 1942), Жунін Сяргей Георгіевіч (кастрычнік 1942 — жнівень 1943, са жніўня да снежня 1943 г. — камандзір ВАГ).

Партизанские формирования Белоруссии... С. 553, 560.

2-гі асобны атрад, пачаў арганізоўвацца ў ліпені 1942 г. у Шклоўскім і Горацкім раёнах, канчаткова сфарміраваўся ў верасні 1942 г. Дзейнічаў у Шклоўскім, Горацкім, Чэрыкаўскім, Хоцімскім, Прапойскім (Слаўгарадскім), Краснапольскім раёнах. Злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі 29 верасня 1943 г. Камандзіры: Чабыкін Фёдар Іванавіч (верасень 1942 — красавік 1943), Кірылаў Яўгеній Пятровіч (красавік — верасень 1943).

* Міхаіл Беразоўскі — адзін з арганізатараў атрада, загінуў у баі 6 сакавіка 1942 г.

Г. А. Кірпіч

І. Дз. Буланаў

3-ці асобны атрад, створаны ў верасні 1942 г. У студзені 1942 г. каля в. Лазіцы Шклоўскага раёна стварылася партызанская група (8 чал.) на чале з Іванам Васільевічам Кананыхіным. У чэрвені 1942 г. яна ўлілася ў брыгаду «Чэкіст». У жніўні 1942 г. па загаду камандавання брыгады група дзейнічала ў Шклоўскім, Горацкім раёнах, колькасна выросла і ў верасні аформілася ў атрад. З кастрычніка 1942 г. да сакавіка 1943 г. ён уваходзіў у склад групы атрадаў М. Н. Іванова ў Чачэрскім раёне. 2 кастрычніка 1943 г. атрад злучыўся з часцямі Чырвонай Арміі.

Партизанские формирования Белоруссии... С. 584.

Брыгада «Звязда», створана ў жніўні 1942 г. у Горацкім раёне. Дзейнічала таксама ў Шклоўскім і Дрыбінскім раёнах Магілёўскай, Аршанскім, Дубровінскім Віцебскай абласцей. Камандзіры: Іўлеў Міхаіл Ігнатавіч (жнівень — верасень 1942), Войстраў Дзмітрый Фёдаравіч (верасень — кастрычнік 1942, ч. в.). У кастрычніку 1942 г. ва ўмовах карнай экспедыцыі праціўніка брыгада была падзелена на дробныя групы, а галоўны атрад вясной 1943 г. увайшоў у Чавускім раёне ў склад палка «Трынадцать», а асобныя групы ў склад 112-га і 115-га Горацкіх атрадаў.

Партизанские формирования Белоруссии... С. 594.

85-ы асобны атрад, арганізаваны 30 чэрвеня 1941 г. у Заслаўскім раёне з камандната складу 85-й сд, які не выйшаў з варожага тылу. Атрад дзейнічаў да ліпеня ў Заслаўскім, затым у Бярэзінскім, Шклоўскім і Мсціслаўскім раёнах. На 17 ліпеня 1941 г. налічваў 43 партызаны. З верасня 1941 г. гісторыя атрада па дакументах не прасочваецца. Камандзір атрада — Малышаў Барыс (чэрвень 1941), нач. штаба — Харцый Сцяпан Фёдаравіч (чэрвень 1941).

Партизанские формирования Белоруссии... С. 595.

КІРПІЧ Герасім Аляксеевіч, н. 15.01.1909 г. у в. Яцкі Васількаўскага р-на Кіеўскай вобл. у сям'і селяніна. Украінец. С 1918 па 1923 г. вучыўся ў пачатковай школе, затым стаў працаваць: па найму ў заможных сялян, у паказальных Тозах, саўгасе «Лосятин». У 1929 г. прымаў удзел у арганізацыі калгаса ў в. Яцкі. У 1930 г. закончыў 7 класаў вячэрняй школы, пасля — курсы рахункаводаў. У 1932 г. быў накіраваны ў распараджэнне УПВ ОГПУ, атрымаў назначэнне ў Цімкавіцкі 17-ы пагранатрад. Вучыўся ў школе малодшага камсаставу, служыў камандзірам узвода, старшынёй кулямётнага дывізіёна пагранатрада. У 1934 г. прыняты кандыдатам у члены КПСС. Застаўся на звыштэрміновай службе на пасадзе старшыні 9-й пагранзаставы. Атрымаў сярэднюю адукацыю. У ліпені 1937 г. прыняты ў члены КПСС.

На пасадзе камандзіра кулямётнага ўзвода ўдзельнічаў у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь. Служыў затым у пагранвойсках (Брэст, Гродна, Беласток). Удзельнічаў у баях з нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў р-не Ваўкавыска, Слоніма, Любчы, Мінска. Па заданні камандавання быў перакінуты ў раён Оршы — Шклова, дзе прыняў удзел у стварэнні партызанскага атрада (жнівень 1941 г.). З сакавіка 1942 г. камандзір партызанскай брыгады «Чэкіст». Быў членам Шклоўскага падпольнага райкома КП(б)Б, камандзірам Ваенна-аператыўнай групы (да злучэння з Чырвонай Арміяй 3.07.1944 г.). Пастановай бюро ЦК КП(б)Б быў назначаны інструктарам, затым загадчыкам сектара аддзела кадраў ЦК. Пасля заканчэння Рэспубліканскай партыйнай школы працаваў нам. загадчыка аддзела парторганаў Мінскага АК КПБ, з 1953 па студзень 1959 г. — сакратаром Рудзенскага РК па зоне МТС. У 1958 г. закончыў ВПШ пры ЦК КПСС. Працаваў у Камітэце партдзяржкантролю пры СМ БССР, Міністэрстве сацыяльнага забеспячэння.

За заслугі перад Радзімай узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі (1942), Суворава I ступені (1944), «Знак Пашаны» (1944), медалямі «Партызану Айчыннай вайны» I і II ступені, «За перамогу над Германіяй...», «За працоўныя заслугі», Войска Польскага, юбілейнымі.

Г. Напрэеў

Шклоўскі гарадскі Савет дэпутатаў

Выканаўчы камітэт

РАШЭННЕ № 9 ад 30.09.1994 г.
АБ ПРЫСВАЕННІ ЗВАННЯ ГАНАРОВАГА ГРАМАДЗЯНІНА ГОРАДА ШКЛОВА КІРПІЧУ Г. А.

Разгледзеўшы зварот савета ветэранаў партызанскай брыгады «Чэкіст» аб прысваенні камандзіру партызанскай брыгады «Чэкіст» палкоўніку ў адстаўцы Герасіму Аляксеевічу Кірпічу звання ганаровага грамадзяніна горада Шклова і ўлічваючы наступнае:

Г. А. Кірпіч унёс дастойны ўклад у барацьбу з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. З першых дзён акупацыі Беларусі ён прымаў актыўны ўдзел у арганізацыі і кіраўніцтве партызанскай брыгады. З мая 1942 года да дня вызвалення кіраваў партызанскай брыгадай «Чэкіст».

У брыгадзе дзейнічала 9 партызанскіх атрадаў, у якіх ваявала з акупантамі 3231 чалавек і некалькі соцень падпольшчыкаў і сувязных.

Партызаны брыгады знішчылі каля 11 000 гітлераўцаў, пусцілі пад адхон 265 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай праціўніка, знішчылі 372 аўтамабілі і бронемашыны, вывелі са строю шмат кіламетраў сувязі, разграмілі некалькі дзесяткаў фашысцкіх гарнізонаў, унеслі вялікі ўклад у вызваленне горада Шклова ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Выканаўчы камітэт гарадскога Савета дэпутатаў вырашыў:

прысвоіць Герасіму Аляксеевічу Кірпічу — палкоўніку ў адстаўцы, камандзіру брыгады «Чэкіст» — званне ганаровага грамадзяніна горада Шклова.

Старшыня Савета — А. М. Чупрынскі

Сакратар выканкома — М. У. Ананьеў

БУЛАНАЎ Іван Дзмітрыевіч, н. у 1913, станіца Мелехаўская Растоўскай вобл. у сялянскай сям'і. 4-гадовым астаўся без бацькі (памёр). У дзяцінстве закончыў 5 класаў. З 1934 г. працаваў на будаўніцтве водаправода (г. Шахты), вучыўся ў вячэрняй школе, потым на курсах электрамашыністаў. У 1936 г. прызваны ў Чырвоную Армію. Служыў напачатку ў Растоўскай вобл., потым у Беларусі. У 1938—1939 гг. вучоба на курсах мал. лейтэнантаў ва Уруччы (пад Мінскам), атрымаў назначэнне ў 100-ю сд (ген.-маёр Русіянаў) на пасаду кам. узвода. Удзельнічаў у вызваленні Заходняй Беларусі, у баях з фінамі. Быў узнагароджаны медалём «За адвагу» і атрымаў званне — лейтэнант. Пасля вяртання дывізіі ў Масюкоўшчыну (пад Мінскам) дэмабілізаваўся і працаваў нейкі час у Кіраўскім райвыканкоме г. Мінска. У пачатку вайны з Германіяй вярнуўся ў сваю дывізію, удзельнічаў у баі ў раёне Астрашыцкага гарадка. Паблізу Шклова ўзвод Буланава аказаўся адрэзаным ад сваёй часці, астаўся ў тыле ворага. Байцы разышліся па блізкіх вёсках (Уланава, Трылесіна, Вышкава і інш.), а праз нейкі час, з вясны 1942 г., сталі арганізоўвацца ў партызанскі атрад.

З успамінаў І. Дз. Буланава

...Часова мы сталі жыхарамі Вышкава, Уланава і іншых вёсак. Актыўна рыхтаваліся да стварэння партызанскага атрада. У яго арганізацыі дапамогу нам аказалі камсамольцы Ваня Хаткевіч з в. Хілец і Зоя Аладзева з Уланава. У сакавіку 1942 г. з групай у 16 чалавек выйшлі ў Сасновы бор паблізу Уланава. У групу ўваходзілі Аляксандр Васін, Пётр Корнеў, Ягор Рогаў, Уладзімір Праканец, Аляксандр Дзянісаў, Сямён Левін, Канстанцін Вараб'ёў, Уладзімір Астакаў. З намі былі Зоя Алданава, Ваня Хаткевіч і інш. Усе ведалі, што я меў воінскае званне лейтэнант, і таму назначылі мяне камандзірам партызанскага атрада.

Зрабіўшы ў лесе шалашы, праз некалькі дзён выйшлі на першую баявую аперацыю: у м. Стараселле разгромілі паліцэйскі ўчастак, узялі першыя трафеі — каля 10 вінтовак і некалькі соцень патронаў. Неўзабаве разгромілі другі паліцэйскі ўчастак у Ст. Брашчыне. У красавіку 1942 г. у атрад рэгулярна ішло папаўненне, у тым ліку Андрэй Сцяпанавіч Нікітчанка з чатырма таварышамі, якія ўцяклі з аршанскага лагера ваеннапалонных. Потым далучылася група Бараноўскага, Якавенкі, але мы пачалі ім арганізаваць свой атрад. Наш атрад налічваў ужо 60 чалавек. Вырашылі наладзіць сувязь з фронтам. Гэтую місію выканалі Ваня Хаткевіч і Зоя Аладзева. Мы тым часам з Нікітчанкам, Якавенкам і групай партызан каля стн. Копысь разабралі ўчастак рэек, дзе сышоў пад адхон паравоз з вагонамі. У канцы красавіка 1942 г. каля стн. Коханава такім жа метадам пусцілі пад адхон другі нямецкі цягнік. Былі разбіты 4 вагоны з жывой сілай, меліся забітыя і параненыя фашысты. У аперацыі ўдзельнічалі А. Нікітчанка, А. Васін, нашы разведчыцы Люба Крывельская, Зіна Платонава і інш. У маі таго ж года група партызан пад камандаваннем А. Нікітчанкі на шляху Шклоў — Стараселле падарвала і спаліла нямецкую аўтамашыну. Было забіта 4 акупанты.

У канцы мая 1942 г. у Сасновы бор на сувязь прыйшлі з суседняга партызанскага атрада Г. А. Кірпіч, Р. М. Севасцьянаў, Г. М. Салафутдзінаў, Ф. М. Сядлецкі. Было вырашана аб'яднацца ў партызанскую брыгаду, якой далі назву «Чэкіст».

У саставе брыгады былі створаны 4 партызанскія атрады. Камандаванне першым атрадам даручылі А. Сімдзянкіну, другім — Р. Іванову. Мой атрад раздзялілі на два. Камандзірам аднаго стаў А. Нікітчанка, другога — А. Дзянісаў. У састаў брыгады таксама ўвайшоў атрад Бараноўскага. Пазней з Аршанскага раёна ўліўся атрад Б. Клюшніка. Быў арганізаваны конны разведатрад на чале з кадравым афіцэрам Шамарыным.

Пакуль камплектавалася брыгада, атрад Нікітчанкі правёў некалькі баявых аперацый. Так, з засады каля в. Уланава была знішчана група немцаў і паліцаяў, узарваны чыгуначны мост паміж Шкловам і Копыссю. Кіраваў гэтай аперацыяй Аляксандр Васін. У аперацыі каля стн. Коханава ўдзельнічалі атрады Іванова і Сімдзянкіна, якія разабралі чыгуначныя рэйкі. Мінёры ўстанавілі на палатне міны. Букштынаў, Сімдзянкін, Іваноў, я і група партызан былі ў прыкрыцці. Праз нейкі час убачылі ад Коханава агеньчыкі цягніка. Паравоз узарваўся на міне, цягнік астаўся стаяць на месцы. На жаль, зарад аказаўся не надта моцным. Гэта была наша першая няўдача.

Нашы аперацыі непакоілі немцаў. Яны вырашылі знішчыць нас, сканцэнтравалі групу карнікаў з немцаў і паліцэйскіх у Стараселлі. Атрады былі прыведзены ў баявую гатоўнасць. Раніцай 22 чэрвеня 1942 г. гэтая групоўка паявілася ў в. Дымава. На ўзлеску знаходзіліся атрады Нікітчанкі і Іванова. У гэтым напрамку і пайшоў вораг разгорнутым фронтам. Партызаны падпусцілі яго на прыцэльны выстрал, адкрылі масіраваны агонь. Дзесяткі трупаў фашыстаў засталіся на дымаўскім полі. Пасля гэтага бою гітлераўцы да верасня 1942 г. не паказваліся ў Рацаўскі лес, дзе базіравалася брыгада.

З-за лініі фронту ў ліпені 1942 г. вярнулася Зоя Аладзева з групай спецыялістаў-падрыўнікоў на чале з Максімам Гарбаценкам. Цэнтральны штаб партызанскага руху прыслаў з Зояй радыёстанцыю і радыстку Клаву Буракову. Ваня Хаткевіч з задання не вярнуўся, загінуў пры пераходзе лініі фронту. Быў пасмяротна ўзнагароджаны ордэнам Чырвонай Зоркі. Праз рацыю мы наладзілі сувязь з Беларускім штабам партызанскага руху, перадавалі разведданыя.

У пачатку жніўня 1942 г. вырашылі вывесці са строю нямецкі вузел сувязі ў Лісунах, дзе быў нямецкі гарнізон. За гэтую справу ўзяліся камандзір атрада Ключнікаў і яго камісар Масюраў. Ноччу выйшлі на зыходнае становішча. Камандзір роты Якімцоў і начальнік разведкі Фралоў з групай партызан наглядалі за гарнізонам, удакладнялі становішча. На другую ноч прыступілі да аперацыі. Першую роту пакінулі ў заслонах на дарозе з Коханава і Оршы. Партызаны вывелі са строю тэлефонную сувязь. Галоўны ўдар наносілі ад Оршы. Якімцоў і Фралоў з групай партызан павінны былі падысці да школы, дзе быў гарнізон, і закідаць немцаў гранатамі. Ноч была на зыходзе. Да школы заставалася не больш за сто метраў. Заляглі, паўзком набліжаліся да цэлі. Нямецкі варты паспеў падняць трывогу. Партызаны адкрылі ружэйна-кулямётны агонь. З вокнаў жа школы паляцелі нямецкія гранаты, а затым немцы адкрылі моцны агонь. Бой пра-

цягваўся каля 2 гадзін. У партызан канчаліся патроны. Давялося даць каманду на адыход. У гэтым баі было страчана два партызаны. І сярод немцаў былі забітыя і параненыя.

Да верасня 1942 г. атрады брыгады «Чэкіст» нанеслі шмат адчувальных удараў па акупантах. І вораг задумаў каварную пастку партызанам, базы якіх знаходзіліся ў Шклоўскім і Талачынскім раёнах. Фашысты вырашылі раптоўна блакіраваць і знішчыць базу нашай брыгады. Але мы былі інфармаваны пра гэты намер і аб канцэнтрацыі праціўніка ў Шклове і на сти. Копысь. На другі дзень раніцай, узброены артылерыяй і бронемашынамі, вораг паявіўся ў Стараселлі і іншых вёсках. Сілы былі няроўныя. Камандаванне брыгады вырашыла пакінуць лагеры, вывесці з Рацаўскага лесу ўсе атрады. З наступленнем цемры яны накіраваліся ў Крупскі лес. У гэты дзень адзін з атрадаў, камандзірам якога быў І. А. Суворaў, знаходзіўся на аператыўным заданні. Я быў пакінуты з групай партызан у Рацаўскім лесе, каб вывесці атрад з-пад удару ворага. Са мной асталіся партызаны Мікалай Пяхота, Мікалай Каялаў, Хадорчык. Усю ноч хадзілі па лесе, але атрада Суворава не дачакаліся. Прачасаўшы лес, праціўнік пераканаўся, што тут, акрамя пустых партызанскіх шалашоў, нікога няма. Калі ж вораг пакінуў лес, мы накіраваліся ва ўмоўленае месца да сваіх атрадаў. У прыцемках праходзілі каля в. Рацаўская Слабада. Убачылі, што фашысты стоўпіліся каля паходнай кухні. М. Пяхота даў доўгую аўтаматную чаргу па ворагу. Сярод фашыстаў пачалася паніка, адкрылася хаатычная страляніна. Мы пайшлі далей.

У пошуках сваіх даведаліся, што Г. А. Кірпіч змяніў ранейшы намер і павёў брыгаду не ў Крупскі лес, а ў Лепельскі раён. Брыгада раздзялілася на дзве групы, каб перайсці чыгунку і аўтамагістраль Мінск — Масква. У адну з іх уваходзілі штаб брыгады, атрады Іванова, Сімдзянкіна і Шамарына, у другую — атрады Нікітчанкі, Дзянісава і Ключнікава. Сувязь з атрадам Суворава яшчэ не была наладжана. Першая група паспяхова адолела перашкоду на захадзе ад стн. Коханава. Другая ж на чале з Нікітчанкам паспрабавала прарвацца на ўчастку на ўсход ад станцыі, але была абстраляна ворагам і вымушана была вярнуцца ў ранейшы раён дыслакацыі.

Наша група з пяці чалавек сустрэлася з разведчыкамі атрада Ключнікава, а таксама з Нікітчанкам. Апошні неўзабаве перабазіраваўся ў Крупскія лясы і далучыўся да брыгады С. Г. Жуніна. Наша група з атрадам Ключнікава знаходзілася ў лесе каля в. Альхоўка. Неўзабаве разведкай было ўстаноўлена, што праціўнік канцэнтруе сілы для блакады Альхоўскага лесу, дзе мы знаходзіліся некалькі сутак. Вырашылі перадыслацыравацца на ранейшую базу — у Рацаўскі лес. Тут мы сустрэліся з атрадам Дзянісава, якім на той час камандаваў маёр Мікалай Іванавіч Кавалёў, ураджэнец Старасельля. Мы ўстанавілі, што праціўнік у Арэхаўцы ўзвёў умацаванні, размясціўся гарнізонам. Вырашылі наладзіць засаду паміж Арэхаўкай і Хацькоовым з удзелам дзвюх груп Ключнікава і Кавалёва пад камандаваннем апошняга. Дазор паведаміў, што ад Хацькова ідзе конны абоз праціўніка. І вось, калі паказалася апошняя павозка, партызаны адкрылі масіраваны агонь па фашыстах. Праціўнік выслаў падмацаванне з Арэхаўскага гарнізона. Партызаны зняліся і без страт адышлі ў глыб лесу. А праз паўгадзіны Кавалёў дакладваў мне аб паспяховым выкананні задання. Вораг панёс значныя страты.

У красавіку 1943 г. брыгада «Чэкіст» вярнулася на сваю базу — у Рацаўскі лес. У першыя дні мы разграмілі буйны нямецка-паліцэйскі гарнізон у Елькаўшчыне. Потым перадыслацыраваліся ў Бялыніцкі раён, устанавілі сувязь са штабам Магілёўскага падпольнага абкома КП(б)Б.

Летам 1943 г., у сувязі з падзеямі на Арлоўска-Курскім напрамку, з Цэнтральнага штаба партызанскага руху была атрымана радыёграма: «Падрыхтуйце пляцоўку для прыёму грузаў з самалётаў». Камандзіры атрадаў Сімдзянкін і Іваноў падрыхтавалі такую пляцоўку. І вось з-за верхавін дрэў выплыў сілуэт самалёта. Ён пачаў разварот, на самалёце замігцелі сігнальныя агеньчыкі. Раздалася каманда: «Запаліць вогнішчы». Лётчык зрабіў яшчэ адзін круг. З трэцяга заходу лётчыкі пачалі скідваць нам груз — каля 10 мяшкоў па сто кілаграмаў кожны. У іх у асноўным былі скрыні з толам, дэтанатары, бікфордаў шнур, запальнікі, некалькі аўтаматаў ППШ, карабіны, патроны, медыкаменты, некалькі камплектаў абмундзіравання, махорка і нават сухафрукты.

У хуткім часе пасля атрымання грузаў у брыгаду прыбыў афіцэр сувязі — прадстаўнік Цэнтральнага штаба партызанскага руху. Ён уручыў камандзіру брыгады сакрэтны пакет. На ім быў надпіс: «Ускрыць па сігналу з Цэнтральнага штаба партызанскага руху». Перад штабам брыгады была пастаўлена задача: быць гатовымі для правядзення «рэйкавай вайны». Таму паміж атрадамі размеркавалі ўчасткі чыгунак, правялі інструктыўныя заняткі. І вось наступіў доўгачаканы дзень. Атрады Сімдзянкіна, Іванова, Шамарына, Дзянісава павінны былі дзейнічаць на ўчастку чыгункі Мінск — Масква паміж станцыямі Бор і Талачын; другая група атрадаў Якімава, Крэнева, Якуткі, Белабрагіна — на чыгункі Кіеў — Ленінград паміж станцыямі Орша і Магілёў. Аперацыя «рэйкавая вайна» прайшла паспяхова. У гэтую ноч на ўсіх чыгунках Беларусі грымелі выбухі. Рух варожых паяздоў на пэўны час быў спынены...

«Ударны фронт». 1965. №№ 151—154.

Падрыхтаваў *Л. Анціпенка*

Р. С. Іваноў

П. І. Счаслаўскі

ІВАНОЎ Рыгор Сямёнавіч, н. у 1915 г. Кадравы камандзір Чырвонай Арміі. Удзельнік баёў з белафінамі ў 1939—1940 гг. Да Вялікай Айчыннай вайны служыў у 8-й сд, якая адной з першых уступіла ў бой з фашысцкімі захопнікамі. Дывізія панесла вялікія страты і аказалася ў акружэнні. Не ўсе выйшлі з акружэння. У жніўні 1941 г. Р. С. Іваноў прыбыў у в. Літоўск Шклоўскага раёна і адразу ўключыўся ў падпольную работу. З утварэннем брыгады «Чэкіст» узначаліў атрад 1-ы, якім кіраваў да злучэння з савецкімі воінамі ў канцы чэрвеня 1944 г. Пасля вызвалення Беларусі да выхаду на пенсію працаваў на кіруючых пасадах у Мінску і Мінскай вобл. Узнагароджаны многімі ордэнамі і медалямі.

З успамінаў Р. С. Іванова

Калі я прыбыў у в. Літоўск, акупанты пачалі здзяйсняць свой новы крывавы парадак. З'явіліся шыбеніцы, канцлагеры. Але гэта не запалохала савецкіх патрыётаў. Яны аб'ядноўваліся ў баявыя падпольныя групы. Такая арганізацыя была створана ў нас. У яе ўвайшлі патрыёты з суседніх вёсак Шклоўскага, Круглянскага і Бялыніцкага раёнаў. Узначалілі гэтыя групы я і камсамолка Марыя Венядзіктава. Актыўна ўдзельнічалі ў рабоце групы Аляксандр, Яўген, Ніна Радзьковы, Зінаіда і Ніна Прохаравы, Мікалай Дзякаў, Мікалай Дземідзенка, Іван Даніленка, Віктар Кейзераў, Лідзія і Сяргей Ганчаровы, Мікалай Купрыянаў, Аляксандр і Андрэй Савельевы. Збіралі зброю і боепрыпасы. Сталі абучаць моладзь ваеннай справе. Распаўсюджвалі антыфашысцкія лістоўкі сярод насельніцтва на падставе зводак Саўінфармбюро. Наша работа яшчэ больш узмацнілася пасля сустрэчы з групамі Г. А. Кірпіча і У. М. Рабініна.

...У студзені 1942 г. раніцай ад Круглага прыбыў атрад карнікаў. Гэтая акцыя была загадзя задумана, каб спячымі захапіць падпольшчыкаў. Некаторым з іх удалося ўцячы ў лес, а Аляксандра Радзькова і яго маці, Машу Венядзіктаву, Зінаіду Прохараву арыштавалі і павезлі ў Круглае. Пасля доўгіх здзекаў А. Радзькова расстралялі. Катаванні падарвалі здароўе Зінаіды Прохаравай, і яна хутка памерла. Машы Венядзіктавай з дапамогай круглянскіх падпольшчыкаў удалося ўцячы.

Вясной наша група на чале з Г. А. Кірпічам пачынае ўзброеную барацьбу. Грамілі нямецка-паліцэйскія ўправы, маслазаводы, наладжвалі дыверсіі на шасэйных і чыгуначных дарогах.

У канцы мая 1942 г. аб'ядналіся ў партызанскую брыгаду. Я быў прызначаны камандзірам атрада № 1. У пачатку чэрвеня ва ўсіх атрадах камандзіры і байцы прынялі партызанскую клятву на вернасць Радзіме.

На пытанне, якая з многіх баявых аперацый атрада была праведзена найбольш бліскуча, мой адказ быў адназначны: тая, дзе пастаўленая задача поўнасцю выконвалася без страт або з мінімумам іх. Да такіх аперацый з удзелам атрада трэба аднесці дымаўскі бой, разгром гарнізонаў у Галоўчыне, Прыганях, Карзунах, Стараселлі. А вось пры разгроме Галошаўскага гарнізона загінуў камісар атрада П. І. Счаслаўскі. Восенню 1942 г. у выніку масіраванай блакіроўкі

брыгада з баямі перамясцілася ў Лепельскую зону.

У красавіку 1943 г. брыгада вяртаецца ў сваю зону дзеянняў. Зноў пачаліся баявыя партызанскія будні. Актыўна дзейнічалі падрыўнікі атрада. На дзень злучэння з рэгулярнымі часцямі байцамі атрада было пушчана пад адхон 55 эшалонаў з жывой сілай і тэхнікай ворага, знішчаны 44 паравозы, 441 вагон, падарвана 333 рэйкі, знішчана 47 аўтамашын, танкаў і бронемашын — 3, а таксама 20 чыгуначных і шасэйных мастоў. Збіты адзін варожы самалёт. Забіта 56 нямецкіх афіцэраў, 4438 салдат, 135 паліцаяў.

Але многія не дажылі да дня перамогі, геаічна загінулі ў баях з ворагам. Сярод іх П. І. Пятроў, П. М. Крыўчыкаў, Г. Л. Салтанаў, П. Ф. Какорын, В. М. Бурмін, М. Д. Вязькоў, В. М. Крыцкі, Ф. М. Болдаў, Д. Н. Страхаў, П. Т. Шваюк, Д. Казакоў, Н. Н. Баянаў, М. А. Грушэцкая, В. А. Грушэцкі.

Запісала *В. Паўлава*

СЧАСЛАЎСКІ Пётр Ігнатавіч, н. у 1908 г. у в. Казлы Круглянскага р-на.

1925—1928 гг.— вучыўся ў Бялыніцкай школе. З 1928 па 1929 г. працаваў грузчыкам у вагонарамонтных майстэрнях, г. Масква.

1929—1931 гг.— студэнт тэхнікума.

1931—1935 гг.— студэнт Маскоўскага лесатэхнічнага інстытута.

1935—1936 гг.— студэнт Ленінградскай лесатэхнічнай акадэміі імя С. М. Кірава.

1937—1939 гг.— галоўны механік фанернага завода «Звезда».

1939—1940 гг.— тэхрук фанернага завода «Красный октябрь», Мазыр Палескай вобл.

1.02.40—1.08.40 г.— загадчык прамысловага аддзела Палескага абкома КП(б)Б.

1.08.40—22.06.41 гг.— дырэктар Мазырскай ГЗС.

З 22.05.42 г.— камісар партызанскага атрада № 1 брыгады «Чэкіст». Загінуў 16.05.1944 г.

В. Паўлава

УСПАМІН АБ КАМІСАРЫ

Заўсёды з вялікай любоўю і цеплынёй успамінаюць былыя паплечнікі па партызанскай барацьбе камісара атрада № 1 брыгады «Чэкіст» Пятра Ігнатавіча Счаслаўскага.

Ён быў пакінуты на акупіраванай фашысцкімі войскамі тэрыторыі для арганізацыі і кіраўніцтва партызанскай барацьбой. Пераадольваючы вялікія цяжкасці, дабраўся ён да роднай вёскі і тут напачатку актыўна ўключыўся ў падпольную работу. У снежні 1941 года ў вёсцы Шчацінка Старасельскага сельсавета нашага раёна адбылася сустрэча Пятра Счаслаўскага з будучым камандзірам брыгады «Чэкіст» Герасімам Аляксеевічам Кірпічам, у якога ўжо была група народных мсціўцаў. У сакавіку 1942 года П. І. Счаслаўскі ўступае ў атрад № 1 брыгады «Чэкіст», камандуе ўзводам. У гэтым жа годзе быў зацверджаны камісарам атрада.

Так, ён быў сапраўдным камісарам... Счаслаўскі не толькі вёў арганізатарскую і палітыка-выхаваўчую работу з байцамі і насельніцтвам, але і сам актыўна ўдзельнічаў у баявых аперацыях, асабістым прыкладам агітаваў байцоў на адданую барацьбу супраць ворага.

...Ішоў другі год вайны. Полымя партызанскай барацьбы разгаралася, набірала моц, і з кожным днём папаўняліся рады народных мсціўцаў.

...Успамінаецца такі выпадак. З-за лініі фронту паступіў вялікі запас патронаў да аўтаматаў ППШ, а іх у партызан было мала. І вось П. І. Счаслаўскі прапанаваў выраблять аўтаматы непасрэдна ў партызанскім атрадзе. Многія не верылі ў поспех гэтай справы. Аднак майстры-энтузіясты хутка развеялі ўсе сумненні. Задумка ўвасобілася ў канкрэтны вынік. Праз непрацяглы час у штаб дастаўлены самаробны аўтамат.

Такі аўтамат за нумарам «2» быў падараваны начальніку Цэнтральнага штаба партызанскага руху П. К. Панамарэнку.

...16 мая 1944 года, незадоўга да злучэння з часцямі Савецкай Арміі, стаў ракавым днём для камісара Пятра Счаслаўскага. Гэта здарылася пры разгроме фашысцкага гарнізона ў вёсцы Галошава, размешчанага паміж населенымі пунктамі Старасельле і Коханава.

...Пад прыкрыццём агню кулямётчыкаў Міхаіла Жданько і Яўгена Белячкова Счаслаўскі з групай партызан прабраліся да будынка, дзе замацаваліся гітлераўцы. Ён зрабіў замах, каб кінуць гранату, але не паспеў...

Пасля вайны родная вёска Казлы, у якой нарадзіўся Пётр Ігнатавіч, перайменавана ў Счаслаўскую.

«Ударны фронт». 1990. 13 верасня.

І. Кулікаў

З ХАРАКТАРЫСТЫКІ І. С. ШЧАРБАКОВА

ЩЕРБАКОВ Иван Самсонович является членом Шкловского РК КП(б)Б. Рождения 1902 г., белорус, образование среднее, член ВКП(б) с 1932 г., в партизанах с 5 апреля 1942 г. по день соединения с Красной Армией — 1 июля 1944 г. За период пребывания в партизанах тов. Щербаков проявил себя в борьбе с немецким фашизмом как патриот своей великой социалистической родины. Является активным участником в организации партизанского отряда. Работал диверсантом, лично им взорвано четыре вражеских эшелона с живой силой и техникой. С марта месяца 1943 г. по июль 1944 г. работал ответственным секретарем партбюро партизанской бригады «Чекист», где провел большую работу по организации и укреплению парторганизаций в партизанских отрядах бригады. При организации Шкловского подпольного РК КП(б)Б в июне месяце 1943 г. тов. Щербаков назначен членом РК КП(б)Б, зав. отдела пропаганды и агитации и ответственным редактором райгазеты, где также провел большую политмассовую работу в отрядах... Наряду с этим организовывал работу подпольной печати — выпуск газет и листовок. Пользуется авторитетом, политически грамотен и тактичен. С 3 июля с. г. по совместительству работает комиссаром партизанского отряда № 31. Дважды представлен к высшей правительственной награде, что и удостоверяется.

Секретарь Шкловского подпольного РК КП(б)Б Бай
12.VII.1944 г.

НАРБ, ф. 4171, воп. 1, спр. 3, л. 38.

З ХАРАКТАРЫСТЫКІ Ш. Л. КЕСЛЕРА

КЕСЛЕР Шлема Лейбович, рождения 1915 г., член КПСС с 1940 г. С мая месяца 1942 г. в партизанском отряде № 1... Принимал активное участие в партийной жизни. Работал парторгом отряда. Всю работу партийной организации направлял на активизацию боевых действий. Участник подрыва двух вражеских эшелонов. Участник разгрома 9 (девяти) вражеских гарнизонов и многих открытых боев с немецкими захватчиками.

С июня 1943 г. избран членом Шкловского подпольного РК КП(б)Б и работал секретарем подпольного РК ЛКСМБ... Представлен к правительственной награде, что и удостоверяется.

Секретарь Шкловского подпольного РК КП(б)Б Бай
16.VII.1944 г.

НАРБ, ф. 4171, воп. 1, спр. 3, л. 39.

З ДАКЛАДНОЙ ЗАПІСКІ КАМАНДАВАННЯ ПАРТЫЗАНСКАЙ БРЫГАДЫ «ЧЭКІСТ» У ЦК КП(б)Б

17 жніўня 1942 г.

...В районах Шкловском, Толочинском, Круглянском и частично Оршанском и Белыничском действует партизанская бригада «Чекист» численностью в 600 бойцов и командиров, из них членов и кандидатов КП(б)Б — 60 человек, комсомольцев свыше 100 человек. Командир бригады ст. лейтенант — начальник пограничной заставы Кирпич Г. А., начальник штаба — лейтенант Буланов И. Д., комиссар бригады — батальонный комиссар Седлецкий Ф. М. Штаб бригады расположен в Рацевском лесу, около д. Хатьково Шкловского района. В состав бригады входят 9 отрядов...

На вооружении бригады имеются: 23 ручных и станковых пулемета, автоматов ППД и винтовок — около 500, 2 миномета без мин...

Бригада создана в начале июля, а движение и работа по созданию бригады из малых групп началась с марта. Первоначально это были одиночные, пока еще незначительные выступления, действовали разрозненно, без единого плана руководства; только в июне месяце 1942 года в первых числах все группы и отряды смогли объединиться в сводный отряд. Тогда же был организован и штаб.

За время существования бригады проведены следующие операции.

Прежде всего, отряды уничтожали органы немецкой власти — волостные управы. В разное время за отчетный период разгромлены и прекратили свое существование волости Старосельская, Улановская, Черноручинская, Новобращинская, Лозитская Шкловского района; Туминичевская и Дубровская Оршанского района; Воронцевичская, Жукневская, Полудовская и другие Круглянского и Толочинского районов; Браковская Могилевского района; Головчинская Белыничского. На территории разгромленных волостей прекращены заготовки продуктов для немцев.

Наряду с этой работой, отряды действовали на железных дорогах, срывая движение поездов. Для этого использовались всяческие средства: разборка путей, подрыв мостов, закладка мин, обстрел поездов. В результате организовано крушение 8 разных воинских поездов и взрыв одного большого железнодорожного моста. Крушение поездов производилось на участках железной дороги Орша — Могилев и Орша — Толочин. До сих пор еще лежат разбитые паровозы и вагоны у путей...

Одновременно отряды бьют фашистов из засад и в открытом бою. За это время было много схваток с ними...

Кроме боевой работы бригадой проводится в деревнях среди населения массово-разъяснительная работа специальными агитаторами на темы: «Кто такие партизаны и за что они борются», «Об организации в деревнях групп самообороны», «Не давать врагу продуктов», «Кто такие фашисты и их цели». Деятельность бригады только устной агитацией не ограничивается. В деревнях и даже районах комендатур распространяются воззвания и обращения к населению.

С организацией штаба партизанские отряды получают оперативные задания от штаба и об их исполнении отчитываются. Между отрядами распределяются дни и участки железных дорог и других объектов, когда и где должна проводиться диверсионная работа.

...В районах действий партизанской бригады немецкая власть представлена бургомистрами, полицией и батальонами так называемой «народной армии». Так, в Шклове имеется 800 человек «народоармейцев» и 270 человек полиции, набранной из белорусского населения, немцев — ни одного. Комендант Шклова — русский, бывший майор Красной Армии — Воронов. В Копыси 100 человек «народоармейцев» и 6 человек немцев охраняют лесопилку и железную дорогу...

При переходе из районов нашего действия через фронт мы на всем своем пути устанавливали, что немцев нет и власть поддерживается только предателями, вступившими в полицию...

Активные действия партизан, отсутствие немцев, затяжка войны, а также грабительская политика немцев создали коренной перелом в политическом настроении населения Белоруссии. Если в первые дни были отдельные крестьяне, которые к немцам относились благожелательно, даже приветствовали их, то теперь, после хозяйничанья оккупантов, даже эти без ненависти говорить о них не могут. Население поддерживает партизан и ждет прихода Красной Армии. Налицо колоссальные симпатии ко всему советскому. При переходе отрядов через деревни, население выходит на улицы и приветствует их. У отрядов тесная связь с населением. Сейчас следует ожидать дальнейшего возрастания ненависти к захватчикам со стороны населения, так как немцы приступают к сбору урожая, а размеры этого сбора немалые. С гектара подлежит сдаче 21 пуд ржи, с гектара — 24 пуда сена, с гектара — 120 пудов картофеля. Сбор урожая в таком количестве оставит население без хлеба, скот без кормов, а это приведет, как указывалось выше, к дальнейшему росту недовольства против оккупантов. Кроме того, каждый обязан сдавать с одной коровы 400 литров молока, платить за собаку 75 рублей, за каждую душу населения — 150 рублей, мяса берут сколько требуется, лошадей также. Есть деревни без единой коровы, без единой лошади.

Меры воздействия на непокорных или медлительных — расстрел и повешение. Но весьма часты случаи, когда внезапно приезжает в деревню отряд немцев, хватает кого встретит, без всяких причин расстреливает и уезжает...

Террор вносит другой оттенок в настроения людей; это постоянный страх, ужас, люди друг друга боятся, разговаривают озираясь.

Нашумевший «новый земельный закон» на практике представляет собой следующее: в отдельных районах земля разделена между хозяйствами, в отдельных районах посев

произведен общинно и теперь засеянные поля предполагается делить. Ежедневно можно видеть большие группы людей и сейчас, которые ходят по полю с криками и руганью между собой — делят землю, сенокосы. Определенной системы и нормы в земельных наделах нет; в одной деревне семья в 6 душ пользуется землей в 3 гектара, в другой — семья в 5 душ обрабатывает участок в 4 гектара; делят землю сами крестьяне.

Торговля отсутствует. Никаких товаров не завозится... В наших районах, а также в районах, через которые мы прошли, школы не работали и не работают.

В райцентрах есть лечпункты, но только для немцев или представителей власти. Для населения нет ничего: ни амбулаторий, ни больниц, ни аптек. Заболевших тифом, скарлатиной и другими заразными болезнями немцы расстреливают. Это имело место в Копыси, Орше и других местах.

В промышленности никакой жизни нет, все разрушено и стоит, если не считать торфзавода в Шклове и лесопилки в Копыси, которые работают.

Днепр, как водный путь, в районах от Могилева до Орши не используется.

В районах действия нашей бригады имеется 2 железные дороги: Орша — Могилев и Орша — Минск. Дорога Орша — Могилев сейчас работает слабо, в день проходит 2—3 поезда, ночью поезда не проходят совсем. На этой дороге почти ежедневно дежурят наши отряды, они подрывают путь, обстреливают поезда. Движение на этом участке слабо еще, по-видимому, потому, что нашим отрядом у д. Слободка подорвана ферма моста и поезда проходят только по одному пути. Дорога Орша — Минск работает интенсивно. Днем поезда идут через каждые 20—30 минут, а иногда с еще меньшими интервалами, но ночью и здесь поезда или не идут совсем, или проходят 2—3. По шоссейной магистрали Орша — Минск движение автотранспорта также интенсивно, но только днем. Дорога Лепель — Орша не работает. Железная дорога Витебск — Полоцк работает весьма интенсивно, поезда идут через каждые 15—20 минут. За последнее время усилена охрана дорог, к охране их привлекается местное население, на километр на ночь выставляется во главе с немцами наряд от 5 до 8 человек.

...В лагерях военнопленных существует кошмарный режим, людям, доведенным голодом до умирания, предлагают хорошую обеспеченную жизнь, им обещают хорошее питание, если они вступят в «народную армию». «Вам, — говорят пленным, — охранять склады, дороги, собирать урожай и бороться с партизанами, но не силой оружия, а агитацией, вы будете их уговаривать, чтобы они бросали оружие и переходили на сторону немецких властей. Не нужно партизан убивать, их нужно убеждать».

Спасая жизнь, люди вступали в эту «народную армию»...

В батальоне, который стоит в Шклове, есть 10 станковых пулеметов «Максим». В понедельник 27 июля этот батальон по заданию своего командования должен выступить из Шклова в разгромленные волости для восстановления власти. Настроение бойцов так называемой «народной армии» для немцев неблагоприятное. С партизанами они воевать не собираются, говорят, что при первом же бое перейдут на сторону партизан.

Нашим отрядом один из этих бойцов был задержан, он оказался из Сталинградской области, шофер. В составе этой так называемой «народной армии» есть и москвичи, и ленинградцы, и сибиряки, и узбеки, и казахи — называют их «украинцы». Штабом бригады были составлены обращения к этим «украинцам» и распространены среди них, а задержанного сталинградского шофера Козлова опустили с наказом провести работу среди своих товарищей и обеспечить переход их на сторону партизан. Отряды часто задерживают шпионов, засылаемых к партизанам. Нашей бригадой разоблачено и расстреляно свыше 30 человек.

* * *

Подводя итоги данной характеристики положения в Белоруссии, необходимо сказать следующее:

1. 80 %, а местами и более, мужского состава населения сидит дома.
2. Рост партизанского движения повсеместно.
3. Сочувственное отношение населения к партизанам, помощь партизанам, связь с ними.
4. Озлобление против немцев со стороны населения.

5. Недостаточное обеспечение партизанских отрядов и оружием и боеприпасами, что ограничивает численный рост.

6. Партизанские группы все еще действуют на территории Белоруссии разрозненно, отсутствует руководящий центр, который объединил бы их и там, на месте, руководил бы ими. Руководить через фронт нельзя.

7. Назрел момент для организации всебелорусского восстания, что возможно осуществить при организации снабжения оружием и при поддержке Красной Армии с фронта.

8. Тыл немцев слаб и необходимо этот момент использовать для нанесения сокрушительного удара врагу на территории всей Белоруссии, что и будет началом полного разгрома его в этом году.

17.VIII.1942 г.

(Игнатенко, Граблевский, Клюшников)

НАРБ, ф. 4, воп. 33а, спр. 638, лл. 70—72.

Падрыхтаваў *Р. Платонаў*

Атрады дзейнічаюць

Пры ўзнікненні партызанскіх атрадаў і пачатку іх баявых дзеянняў праціўнік вёў сябе выключна бяспечна, не маючы ніякіх умацаванняў. Такое становішча дазваляла партызанам правесці шэраг паспяховых аперацый па разгроме нямецка-фашысцкіх гарнізонаў.

У в. Новае Брашчына знаходзіўся паліцэйскі гарнізон і валасная ўправа: 7 паліцэйскіх, бургамістр з пісарам. У в. Уланава размяшчалася валасная ўправа з 12 паліцэйскімі. Г. А. Кірпіч прыняў рашэнне ў ноч на 5.05.1942 г. правесці налёт на Нова-Брашчынскую валасную ўправу. Гэтая першая аперацыя была поўнай нечаканасцю для немцаў і паліцэйскіх.

Першая дыверсія на чыгунцы была праведзена камандзірам атрада Буланавым. 17 мая 1942 г. ён з групай у 16 чалавек выйшаў на чыгунку Орша — Магілёў на перагоне Копысь — Шклоў з задачай разабраць рэйкі, спусціць варожы эшалон. У выніку пайшоў пад адхон эшалон з вуглем, чыгунка на ўчастку не працавала двое сутак.

І. Кулікаў

Бой каля в. Дымава

З успамінаў былога партызана брыгады «Чэкіст» І. В. Кулікава

Пасля дыверсій на ўчастку чыгункі Орша — Магілёў войскі праціўніка, прызначаныя для фронту, адправіцца не мелі магчымасці, у выніку ўтварылася скапленне эшалонаў на станцыях Орша, Копысь, Коханава, Талачын. Мясцовыя нямецкія ўлады дамовіліся з камандаваннем часцей, якія накіроўваліся на фронт, прачасаць Рацаўскі, Казённы лясы і Сісенеўскую дачу. У гэты час атрад № 12 Нікітчанкі знаходзіўся ў Сісенеўскай дачы. Штаб брыгады і астатнія атрады базіраваліся ў Рацаўскім і Казённым лясах.

Ноччу на 20.06.1942 г. праціўнік блакіраваў Сісенеўскую дачу. На світанку пры дапамозе мясцовых здраднікаў немцы да 300 чалавек пайшлі лесам. Пры падыходзе да лагера, дзе адпачывалі партызаны, праціўнік быў выяўлены вартавым М. Смірновым, які падаў сігнал пра небяспеку. Партызаны падняліся па трывозе і выйшлі з лагера. Праціўнік праз некалькі мінут з'явіўся ў лагеры, разграміў яго, спаліў шалашы, забраў прадукты і вопратку.

Агульная колькасць праціўніка, па даных насельніцтва, была 500—600 чалавек на 53 машынах. Гітлераўцы па-зверску распраўляліся з мірным насельніцтвам у вёсках, якія наведвалі партызаны. Так, у в. Тройца яны спалілі некалькі хат.

Нікітчанка ўмела манеўраваў, страціў толькі аднаго чалавека. З наступленнем цемры прыбыў у Рацаўскі лес. 21.06.1942 г. разведка данесла, што праціўнік размясціўся ў м. Коханава з мэтай барацьбы з партызанамі. Камандзірам атрадаў быў аддадзены загад зрабіць засады на верагодных падыходах праціўніка і пры з'яўленні яго ўступіць у бой.

Атрад № 1 заняў абарону на ўзлеску па шляху Галошава — Старасельле, атрад № 5 — на шляху Галошава — Рацава, атрад № 12 заняў узлесак на захадзе ад вв. Дымава, Хацькова, атрад № 20 быў у рэзерве.

Р. М. Севасцьянаў

22.06.1942 г. праціўнік заняў в. Кувечына і м. Старасельле, стаў рухацца на Дымава. Партызаны, якія рыхтаваліся даць яму адпор, занялі выгадныя пазіцыі, падпусцілі карнікаў на блізкую адлегласць, а затым адкрылі моцны ружэйна-кулямётны агонь.

Для праціўніка ён аказаўся нечаканым. На полі бою засталіся каля 30 гітлераўцаў, не менш за 40 было паранена. Партызанам дасталася нямала зброі, патронаў.

З успамінаў Р. Севасцьянава

...Паспяховае завяршэнне бою з гітлераўцамі каля в. Дымава 22 чэрвеня 1942 г. натхніла мсціўцаў на новыя подзвігі. Мястэчка Галоўчын Бялыніцкага р-на знаходзіцца на даволі бойкім месцы — на дарозе Талачын — Круглае — Магілёў, якія, у сваю чаргу, звязаны з важнымі стратэгічнымі магістралямі Магілёў — Мінск, Мінск — Орша.

Нямецкае камандаванне з першых дзён акупацыі выкарыстоўвала гэты населены пункт як апорны. Быў тут і моцны гітлераўскі гарнізон. Пад казарму было прыстасавана 2-павярховае памяшканне, вакол мястэчка — агнявыя ўмацаванні, усё абнесена калючым дротам. Галоўчынскія маслазавод, лесапільня таксама выкарыстоўваліся ворагам. Вось чаму так важна было для нас разграміць гітлераўскі гарнізон у Галоўчыне.

Пасля глыбокай разведкі, дэталёвага аналізу мясцовасці камандаванне прыйшло да вываду напасці на Галоўчын днём. З гэтай мэтай пераапранулі партызан у нямецкую форму, на машыны, куды яны паселі, устанавілі станковыя кулямёты, да кожнага кузава прымацавалі па гармаце. Так планавалі ўехаць у мястэчка. Для падмацавання выставілі свае заставы ад Круглага, Бялыніч і Магілёва, каб не даць ворагу падцягнуць падмацаванне. Падрыхтавалі і добраўзброены кавалерыйскі эскадрон з атрада А. М. Шамарына, які прытаіўся ў пералеску.

І вось 25 ліпеня калона з аўтамашын, матацыклаў, веласіпедаў урачыста, інакш і не скажаш, уехала ў мястэчка. Вартавыя паспешліва адчынілі цэнтральныя вароты. Калона накіравалася прама да казармы. Па камандзе І. Дз. Буланава, начальніка штаба, усе імкліва саскочылі з машын і накіраваліся да казармы. Тыя, хто назіраў за прыбыўшымі з акна, зразумелі, у чым справа. Але ўжо было позна, супраціўленне ворага было падаўлена.

У гэтай аперацыі, якая працягвалася каля гадзіны, быў знішчаны гітлераўскі апорны пункт, захоплены багатыя трафеі, у тым ліку шмат прадуктаў, якімі мы падзяліліся з мірнымі жыхарамі.

Запісаў *Л. Анціпенка*

З успамінаў Г. А. Кірпіча

Ішоў сакавік 1942 г. Камандаванне партызанскага атрада, рэарганізаванага неўзабаве ў брыгаду «Чэкіст», распрацавала чарговую ваенную аперацыю. Задача зводзілася да разгрому параўнальна невялікага нямецка-паліцэйскага гарнізона ў в. Новае Брашчына. Пры ўдакладненні плана я вырашыў пагутарыць з падабранымі ў штабе правадніками. Сярод іх аказаўся юнак з в. Тройца Мікалай Мільто. Мне падабаліся яго павадзіны, спакойны твар, вытрымка. Ён цудоўна ведаў мясцовасць, падыходныя шляхі да валасной управы і да дома, дзе кватэраваў бургамістр, здраднік Ільюшэнка. Гэта дапамагло нам паспяхова ажыццявіць аперацыю. Варожы гарнізон быў разгромлены без нашых страт. У якасці трафеяў былі ўзяты 1 ручны кулямёт, 12 вінтовак, 2 парабелумы, каля 3000 патронаў, 32 ручныя гранаты. Былі вызвалены савецкія салдаты, сабраныя паліцэйскімі ў вёсках для адпраўкі ў Шклоў. Арыштаваны бургамістр Ільюшэнка быў расстраляны па прыгавору аператыўнага савета атрада.

Увесь гэты час я ўважліва назіраў за нашым маладым правадніком. Аперацыя партызан зрабіла на яго моцнае ўражанне, а неў

забаве сам стаў адным з актыўных і адважных байцоў брыгады. Такіх мужных, як Мікалай Мільто, было шмат. Але я хачу расказаць пра Мікалая Дзмітрыевіча Мільто як пра чалавека, у характары, патрыятычных дзеяннях і ўчынках якога можна наглядна бачыць пачуцці і настрой тых савецкіх юнакоў, якія, аказаўшыся на часова акупіраванай ворагам тэрыторыі, па закліку сэрца пачалі барацьбу з фашысцкімі варварамі з першых жа дзён акупацыі.

* * *

Вёска Тройца Шклоўскага раёна з'яўляецца цэнтрам калгаса імя М. І. Калініна. Я ж прыпамінаю гэтую вёску ў першыя месяцы вайны. Была яна па-свойму прыгожая, размешчаная ў луцэ рэчкі. На вуліцах можна было касіць траву, як на лузе. І толькі вузкая сцяжынка па сярэдзіне была вытаптана. Мне, партызану, якому давялося ваяваць з акупантамі ў гэтых мясцінах, такой і прыпамінаецца гэтая вёска. Часта прыпамінаю тыя гады, тыя мясціны, людзей, з якімі даводзілася тады сустракацца. Памятаю наведванне Тройцы ў першых числах красавіка 1942 г. Наша брыгада тады толькі пачынала фарміравацца. Нам патрэбны былі верныя людзі, зброя. У вёску я накіраваўся з маім намеснікам па разведцы Рыгорам Мікалаевічам Севасцьянавым. Нас суправаджалі аўтаматчыкі Павел Булаеў, Алесь Бачкоў і Яцына Н. Н. Па-веснавому свяціла сонца, звінелі ручаі, парыла зямля. Але людзі былі задуменныя і маўклівыя. З намі, праўда, былі прыветлівыя, не задавалі лішніх пытанняў. У Тройцы сустрэліся са знаёмым Севасцьянаву пажылым калгаснікам Жураўскім Міхаілам Антонавічам. Ён ахвотна расказваў пра сваіх аднасяльчан, пра даваеннае калгаснае жыццё. Тут быў параўнальна невялікі, але перадавы калгас «Чырвоны шлях». На чале яго быў камуніст са стажам, удзельнік грамадзянскай вайны Фёдар Пракопавіч Пятроўскі. У калгасе тады збіралі па 18 ц з гектара збожжавых, добрыя ўраджаі даваў лён, малочнатаварная ферма была багатая і высокапрадукцыйная. Лета 1941-га абяцала асабліва багаты ўраджай. І збожжавыя, і лён, і канюшына — усё буйна даспявала. Радаваў стары сад багаццем фруктаў. Тут жа быў пчальнік ў 111 сем'яў. Калгаснікі жылі спакойна, радаваліся сваім дасягненням.

Ніхто не думаў, што так нечакана ўсё зменіцца. Вайна парушыла мірнае жыццё маленькай вёсачкі. Гора і слёзы пасяліліся ў хатах. Наш субяседнік жыва намаляваў нам провады аднасяльчан на фронт. Двух сыноў правёў на вайну Мікіта Пятровіч Жураўскі. Адправіла на фронт сыноў Марыя Навумаўна Раманькова. Гэтая жанчына рана аўдавела, шмат вынесла гора, пакуль падняла на ногі 12 дзяцей. З яе дома пайшло ваяваць шасцёра сыноў. (Наведваючы Тройцу пасля вайны, я даведаўся, што сыны Мікіты Пятровіча загінулі: Фёдар — пад Масквой, а Косця — пад Берлінам. Да Марыі Раманьковай вярнуўся толькі адзін сын Герасім.)

Слухаючы Міхаіла Антонавіча, мы зноў перажывалі цяжкія падзеі тых дзён. Нялёгка было праводзіць сваіх родных і блізкіх людзей. Нялёгка было заставацца ў тыле. Гнеў выклікалі дзікія зверствы фашыстаў, пра якія мы таксама дастаткова ведалі.

Не паспелі, аднак, высахнуць слёзы развітання, як у вёсцы з'явіліся немцы. Вакол ішлі баі. Паміж вёскамі Сісенева і Калінаўка, пад Манькавым і Стараселлем шмат палягло нашых салдат. ...Жураўскі сказаў нам, што ў вёсцы ведаюць пра партызан і многія згодны ім памагаць і папоўніць рады. Па яго словах, група моладзі была гатова да дзеянняў, толькі не было каму іх арганізаваць. Стары, назіральны чалавек выдзеліў з групы моладзі Мікалая Мільто, які тады працаваў на млыне, быў сувязным партызан.

Мікалай працаваў адзін, малоў зерне, збіраў гарнцавыя фунты па савецкіх законах. Нарыхтаваную муку хаваў у тайніках, раздаваў па дварах гаспадыням, і тыя пяклі хлеб партызанам. Кожная гаспадыня атрымлівала норму выпечкі хлеба на тыдзень. І гэта дабравольна выконвалася ўсімі жыхарамі вёскі.

Пагутарыўшы з Мільто, мы з Севасцьянавым вырашылі, што перад намі цудоўны партызанскі разведчык. «Вось што, Мікалай, — сказаў я, — ты добры млынар, але прафесія разведчыка табе падыдзе больш. З млынам жа ўправіцца Мікалай Антонавіч Жураўскі». Юнак тут жа згадзіўся ісці да нас, хоць у Мікалая на руках была сям'я: маці-ўдава, дзве сястры, брат, пляменнікі. Ён быў у доме гаспадар, галоўны працаўнік, кармілец, як называла яго маці. Мікалай ведаў, як усім будзе цяжка, калі ён пойдзе да партызан, як жорстка распраўляюцца з сем'ямі партызан немцы. І ўсё-такі адказаў нам: «Я гатовы». Акрамя таго, назваў таварышаў, якія гатовы пайсці з ім, назваў

людзей, якіх можна было выкарыстаць як сувязных. Імі пазней сталі Д. М. Мільто, сястра Мікалая Ганна, юны Ваня Жураўскі, яго аднагодка Оля Жураўская. З дапамогай таварышаў Мікалай Мільто збіраў па начах зброю, якая засталася на полі бою, і хаваў не ў надзейных месцах у лесе. У тайніках аказаліся: адзін станковы кулямёт, 6 ручных кулямётаў, 12 вінтовак, тры скрыні гранат з капсулямі, тры наганы, столькі ж аўтаматаў, 8 цынкавых скрынь вінтовачных патронаў, 4 скрыні патронаў у стужках да станковага кулямёта, тысяч пяць аўтаматных патронаў у драўляных скрынях.

— Гэта цэлы арсенал, гэта клад, — радаваліся мы. Зброю забралі ў той жа дзень. Пажылыя калгаснікі Міхаіл і Мікалай Жураўскія, Мікалай Старажэвіч, Пётр Мільто памаглі нам запрэгчы коней, пагрузіць зброю і боепрыпасы на калёсы і паспяхова давезці да Рацаўскага лесу. На ўскрайку яны асталіся, а мы адвезлі зброю ў лагер. Праз некалькі гадзін вярнулі ім коней.

Текст: Во исполнение оперативного плана ВОГ Могилевского подпольного обкома КП(б)Б и приказов командования ВОГ Шкловского подпольного РК КП(б)Б, командиры отрядов т. Иванов и т. Кренев, находясь на участке Шкловского р-на, провели ряд операций по борьбе с фашистами и спасению населения от угона в Германию, по уничтожению телефонной связи противника.

Наиболее характерные операции:

19 января с. г. командир отряда № 60 т. Кренев получил данные о противнике: карательный отряд г. Шклова, организованный из немцев и полиции, численностью 60 человек, сильно вооруженный автоматическим оружием, вышел по шляху Шклов — Круглое на деревни: Черное, Черноручье для ограбления и угона населения в Германию.

Т. Кренев и нач. штаба т. Жамейко умело организовали засаду в районе д. Александровка и, подпустив противника на близкое расстояние, внезапным ударом разбили его.

В результате боя уничтожено 28 предателей и немцев, в том числе нач. полиции г. Шклова, 4 ранено и 1 взят в плен, остальные, бросив обоз и оружие, разбежались.

Подобраны трофеи: 3 пулемета, из которых 1 станковый французский, 1 автомат, 15 винтовок, более 2 тыс. патронов, 7 лошадей с упряжью. Своих потерь отряд не имеет.

Также отряд организовал крушение воинского эшелона противника. Уничтожил зерносклад (15 тонн зерна) в д. Химы Оршанского р-на.

Командир отряда № 1 т. Иванов подготовил данные о противнике гарнизона д. Корзуны Шкловского р-на численностью 79 человек, в том числе 9 немцев, 1 унтер-офицер с вооружением 1 станковый пулемёт, 5 ручных пулеметов, автоматы, винтовки. Гарнизон расположен на шоссе и сильно укреплен дзотами, обнесен проволочным заграждением.

Т. Иванов вместе с комиссаром т. Счеславским и нач. штаба Поповым наметили план операции, выделив штурмовую группу во главе с командиром роты т. Крымцовым и в ночь на 23.01.44 г. в 3.00 ночи бесшумно подошла к укреплениям, с трех сторон ворвались в расположение противника, забрасывая гранатами и ведя автоматический огонь по окнам общежития и огневым точкам противника.

В результате боя уничтожено: 28 полицейских, 5 немцев, из них 1 унтер-офицер. Части противника удалось спастись бегством по траншеям и крестьянским сараям. Уничтожено 7 общежитий, склад с боеприпасами, караульное помещение, столовая, разрушены укрепления.

Взяты трофеи: 1 ручной пулемет, 16 винтовок, 2 пистолета, часть патронов, 10 лошадей, обувь и обмундирование. Отряд без потерь вышел из боя, имея 5 бойцов раненых.

Отряд также за январь месяц организовал крушение 5 воинских эшелонов противника с живой силой и техникой.

Не плохо также организована диверсионная работа в отряде № 20 командиром отряда т. Якимовым. За декабрь 1943 г. и январь месяц 1944 г. организовано крушение 8 вражеских эшелонов с живой силой и техникой.

Приказываю:

За высокое воспитание личного состава, за боевую выучку, смелость и руководство в бою от имени РК КП(б)Б и командования ВОГ объявить благодарность:

Командиру отряда № 1 лейтенанту Иванову Г. С., комиссару отряда Счеславскому П. И., нач. штаба лейтенанту Попову, пом. комиссара по комсомолу Кудрявцеву В. И., командиру роты ст. лейтенанту Крымцеву И. М., политрукам рот: Дмитриеву А. Л., мл. политруку Карпенко И. С., командирам взводов: Скорба М. П., Кумчевскому Г. А., командиру диверсионной группы Ключ М. Н., командирам отделений: Ломко С. С., Генералову Н. В., бойцам: Исполину Н. И., Азоренок А. С., Матюшевскому И., Барилову П. А., Вольковской Е. Н., лечпому Ковалевой А. Ф.

Командиру отряда № 60 им. Седлецкого лейтенанту Креневу С. А., комиссару т. Букштынову П. И., нач. штаба лейтенанту Жамейко И. И., командирам взводов: Комлеву М. А., Копранову И. Ф., командиру отделений: Павлову Н. К., пулеметчикам: Ралейчик Н. С., Липину Н. В., Моткину А. А., фельдшеру Карьерову А. М.

Секретарь Шкловского подпольного РК КП(б)Б Букштынов
Командир ВОГ при Шкловском подпольном РК КП(б)Б полковник Кирпич
Нач. штаба ВОГ Севостьянов

НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 15, л. 17.

Разведчык Тапвалдыеў

...Шмат баявых спраў было на рахунку камандзіра аддзялення разведкі брыгады «Чэкіст», слаўнага сына узбекскага народа камсамольца Мамадалі Тапвалдыева. У ходзе жорсткіх баёў з нямецка-фашысцкімі войскамі на мінскім напрамку ў чэрвені 1941 г. часць, у якой служыў яфрэйтар М. Тапвалдыеў, трапіла ў акружэнне. Перайшоўшы да партызанскіх формаў барацьбы ў тыле ворага ў лістападзе 1941 г., ён разам з разведчыкам М. М. Пяхотам прабраўся ў Барысаў, перарэзаў драцяную загароду ў лагеры ваеннапалонных і вызваліў з фашысцкай няволі 146 байцоў Чырвонай Арміі. 25 сакавіка 1942 г. Тапвалдыеў на чале групы ваеннаслужачых у колькасці 13 чалавек з ручным кулямётам і 2 вінтоўкамі прыбыў у партызанскі атрад Г. А. Кірпіча. Неўзабаве яго прызначылі камандзірам аддзялення разведкі. Ён удзельнічаў у многіх баях і засадах, але найбольш праявіў сябе ў разведцы. Сярод разведчыкаў ён займаў першае месца па колькасці дастаўленых «языкоў». У канцы ліпеня 1942 г., знаходзячыся ў разведцы каля в. Варынцэвічы Талачынскага р-на, адзін прыняў бой з групай карнікаў і кулямётным агнём знішчыў 6 гітлераўцаў. Адважнаму разведчыку ўдалося пранікнуць восенню 1942 г. у Талачын, у часць, якую фарміравалі гітлераўцы з ваеннапалонных для барацьбы з партызанамі, і вывесці адтуль у сваю брыгаду 27 чалавек са зброяй.

За мужнасць і гераізм, праяўленыя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі, Указам Прэзідыума ВС СССР ад 15 жніўня 1944 г. Мамадалі Тапвалдыеву прысвоена званне Героя Савецкага Саюза.

Всенародная борьба в Белоруссии... Т. 1. С. 373.

М. Тапвалдыеў

М. М. Пяхота

Падрыўнік М. Пяхота

У жніўні 1941 г. Мікалай Максімавіч па заданні ЦК КП(б)Б быў накіраваны ў Беларусь у саставе групы падрыўнікоў для правядзення дыверсій на камунікацыях ворага — на тэрыторыі Шклоўскага, Бялыніцкага, Круглянскага і Талачынскага раёнаў. Ветэран успамінае: «Лета 42-га. Вораг ірвецца да Волгі. Па чыгункі Орша — Магілёў ідуць фашысцкія эшалоны з баявой тэхнікай і жывой сілай. У брыгаду «Чэкіст» паступіў за-

гад перарэзаць гэтую магістраль, а таксама ўзарваць чыгуначны мост каля вёскі Слабодка. Да аперацыі рыхтаваліся загадзя. Знайшлі авіяцыйныя бомбы, з якіх выплавілі 80 кг толу, падрыхтавалі капсулі і шнур. Была наладжана сувязь з палоннымі, якія маглі аказаць дапамогу ў правядзенні аперацыі».

І вось да маста ад Шклова падыходзіць 12 партызан, з якіх два падрыўнікі ў нямецкай форме, двое — у паліцэйскай. Міхаіл Нудэльман, які дасканала ведаў нямецкую мову, паведаміў ахоўнікам, што са Шклова ім выслана падмога. Размова з ворагам была кароткай. Калі зайшлі ў службовае памяшканне, ахоўнікаў абяззброілі і звязалі.

А Мікалай Пяхота і яго сябра масквіч Віктар Чысцякоў устанавілі на фермах маста два зарады па 50 кг кожны, запалілі бікфордаў шнур. Якраз у гэты час з-за пагорка вынырнуў варожы эшалон, да адказу напоўнены танкамі, гарматамі і жывой сілай. Адступаць у лес партызанам не было ніякай магчымасці, таму яны асталіся на месцы дыверсіі, каля маста. Мікалай Максімавіч прыветна памахаў рукой фашыстам на поездзе. Паравоз на мосце. Яшчэ некалькі секунд — і раздаецца аглушальны выбух. Мост, а разам з ім і цягнік асядаюць у ваду.

Пасля гэтага важная для акупантаў магістраль не працавала амаль цэлы тыдзень.

* * *

М. М. Пяхота ўзнагароджаны за паспяховае выкананне баявых заданняў ордэнамі Чырвонага Сцяга, Чырвонай Зоркі (двума), многімі медалямі.

А. Шчасновіч

Вайна на рэйках

Напярэдадні «рэйкавай вайны» ў 1943 г. на самалётах была дастаўлена ў брыгаду ўзрыўчатка. На нарадзе камандзіраў і палітработнікаў атрадаў Г. А. Кірпіч назваў участкі чыгунак Мінск — Орша і Орша — Магілёў, якія на працягу больш за 10 кіламетраў трэба было вывесці са строю. У атрадах прайшлі заняткі па падрыўной справе, праведзены праверкі па тэхніцы бяспекі. Тым часам разведкі атрадаў грунтоўна вывучалі падыходы да чыгункі, сістэму яе аховы. Будучы байцом атрада № 25, мне двойчы давялося ўдзельнічаць у разведцы ўчастка ад раз'езда ў бок Шклова. Узначальваў разведку палітрук роты атрада С. В. Марчанка, ураджэнец в. Стары Шклоў, які добра ведаў мясцовасць. Са жніўня начальнік штаба атрада Я. Е. Макееў выдаў нам па дзве толавыя шашкі, дэтанатары, па 12—15 см бікфордавага шнура да іх. У прызначаны час атрад з Шахаўскага лесу накіраваўся на аперацыю. Падышлі да чыгункі, па ўмоўленым знаку С. В. Марчанкі заклалі шашкі пад рэйкі, падпалілі шнуры і хуценька залеглі ў кювет. І вось пачалася кананада. Потым зрабілі другі заход. Пасля выкарыстання ўсёй узрыўчаткі атрад накіраваўся ў в. Макараўка...

Другі этап вайны на рэйках пад кодавай назвай «Канцэрт» праводзіўся з 19 верасня да лістапада 1943 г. Натхнёныя пачаткам вызвалення Беларусі савецкімі войскамі, партызаны актывізавалі сваю дзейнасць. Так, оперупаўнаважаны атрада № 5 Мікалай Сафонаў з групай вывеў са строю шпалапрапітачны завод, узарваў дызель на стн. Талачын, а на перагоне Слаўнае — Трацылава, каля маста праз Друць Ніна Ласкевіч падарвала варожы эшалон. Больш за 25 т бензіну было спалена, знішчана 10 гармат, 6 танкаў, некалькі вагонаў з афіцэрамі і салдатамі.

Трэці масавы этап «рэйкавай вайны» праведзены перад пачаткам аперацыі «Багратыён». Да гэтага партызаны брыгады правялі разбуральныя аперацыі на ўчастку шашы Магілёў — Мінск. Аперацыя на чыгунцы намячалася на ноч з 19 на 20 чэрвеня 1944 г. Брыгадзе адводзіўся ўчастак паміж станцыямі Слаўнае — Трацылава. Кіраваў аперацыяй камбрыг Г. А. Кірпіч. У 24 гадзіны ў неба з Філатаўскага лесу ўзвіліся дзве чырвоныя ракеты. Атрады прыступілі да справы. Падрыўнікі памкнуліся да чыгуначнага палатна. Нямецкая ахова пачала страляніну з дзотаў і ўмацаванняў. Партызаны ў адказ адкрылі масіраваны агонь. І хоць гітлераўцы ўвялі ў бой мінамёты, хутка агонь праціўніка быў падаўлены. Партызаны смялей пачалі дзейнічаць на рэйках. Хутка тут разгулялася кананада. Выбухі грымелі на працягу дзвюх гадзін. І вось у небе ўспыхнула белая ракета, якая абазначыла канец аперацыі.

І. Кулікаў

РАПАРТ
НАЧАЛЬНІКУ АПЕРАТЫЎНАЙ ГРУПЫ ПАРТЫЗАНСКАГА РУХУ ПРЫ ШТАБЕ ЗАХОДНЯГА ФРОНТУ А. А. АРХАНГЕЛЬСКАМУ АБ ВЫНІКАХ АПЕРАЦЫІ ПА ПАДРЫВУ РЭЕК У НОЧ НА 20 ЧЭРВЕНЯ 1944 г.

Доношу, что партизанскими отрядами ВОГ в ночь на 20 июня 1944 г. была проведена боевая операция по взрыву рельсов на железной дороге Борисов — Орша, участок Славное — Троцилово.

При проведении операции отряды с боем заняли железнодорожное полотно и каждый отряд взорвал следующее количество рельсов:

отряд № 1—250 рельсов и вывел из строя 1200 м т[елеграфно] -телеф[онной линии] связи;

отряд № 5—392 рельса и вывел из строя 700 м телеграфно-телефонной [линии] связи;

рота отряда № 10—101 рельс;

отряд № 20—352 рельса и вывел из строя 400 м телеграфно-телефонной [линии] связи;

отряд № 31—245 рельсов;

отряд № 60—280 рельсов;

отряд № 25, действовавший на железной дороге Орша — Могилев, участок Шклов — Лотва, взорвал 65 рельсов.

Всего взорвано 1685 рельсов. Уничтожено 2300 м телеграфно-телефонной [линии] связи.

Уничтожено 2 засады и охрана из двух бункеров противника. Жертвы противника не установлены, один солдат взят в плен.

Свои потери: 7 убито, 2 умерло от ран, 1 пропал без вести, 27 ранено.

Секретарь Шкловского подпольного РК КП(б)Б Бай
Командир Шкловской ВОГ Кирпич

Всенародное партизанское движение в Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Т. 3. С. 444—445.

Сям'я патрыётаў

Пра Усцінню Сідлярову «раёнка» пісала яшчэ ў 1933 г. Астаўшыся ўдавой з пяццю дзецьмі, яна ўступіла ў толькі што створаны калгас «Пэўны шлях» і пайшла працаваць на жывёлагадоўчую ферму. У першы ж год калектыўнага жыцця зарабіла 800 працадзён, 41 пуд жыта, 22 пуды ячменю і 4 пуды грэчкі.

Ва ўдавы падрасталі дзеці. Надзейнымі памочнікамі маці сталі старэйшыя Акуліна, Іван і Валя. Працавітымі раслі блізняты Косця і Оля. Перад пачаткам Вялікай Айчыннай вайны і яны дапамагалі маці.

У першыя дні вайны на фронт пайшоў Іван. Акуліна на той час працавала на Нова-Брашчынскім ільнозаводзе. Валя, Косця і Оля жылі ў вёсцы з маці. Калі Уланава было занята фашыстамі, на палях бою і ў лясах асталося шмат параненых байцоў і камандзіраў Чырвонай Арміі. Вясковыя патрыёты аказвалі ім усялякую дапамогу. Валя з Акулінай падабралі і прывезлі ў свой дом цяжка параненага камандзіра і вылечылі яго. Дзяўчаты вёскі збіралі зброю і боепрыпасы і хавалі ў надзейных тайніках. Валя на той час ужо была сувязной толькі што створанага партызанскага атрада.

Пра дзейнасць сям'і патрыётаў даведаліся карнікі. Заставацца ў вёсцы было небяспечна. Сёстры Акуліна і Валя пайшлі ў лес да народных мсціўцаў, пачалі змагацца з нямецкімі захопнікамі. Пра баявыя подзвігі сясцёр цёпла расказваў былы начальнік штаба брыгады «Чэкіст» Р. М. Севасцьянаў. Вось радкі з яго кнігі ўспамінаў:

«...У вёсцы Шэпялевічы размяшчаўся буйны варожы гарнізон. Разгарэўся сустрэчны бой. У ранішнюю цішыню ўварваліся кулямётныя і аўтаматныя чэргі. Камбрыг загадаў разгарнуць атрады і кіравацца да вёскі Боўсевічы. Сярод параненых аказаўся камісар брыгады Ф. І. Букштынаў. Смерцю храбрых пала ў баі Акуліна Сідлярова. Услед за ёй уступілі ў атрад яе брат Косця і сястра Валя. У маі ў Сісенеўскім лесе ў баі з карнікамі яна прыкрывала адыход партызан, была цяжка паранена. Карнікі акружылі яе і сталі прыбліжацца. Страляць не было чым. Валя ўзяла апошнюю гранату, і калі фашысты падышлі зусім блізка, ірванула кольца... Дорага аддала яна жыццё. Фашысты доўга здзекваліся над яе целам. Потым расстралялі яе маці Усцінню Васільеўну».

...Мне давялося сустрэцца з былым юным партызанам Канстанцінам Сідляровым. Ён расказаў, што восенню 1943 г. пасля гібелі сясцёр і расстрэлу маці малодшую сястру Олю і сына Акуліны камандаванне брыгады адправіла самалётам у савецкі тыл. У першыя дні вайны загінуў брат Іван. Пасля вызвалення раёна Косця працаваў у калгасе на розных работах.

М. Ільюшэнка

Байцы нябачнага фронту

Успех партизанской борьбы в большей мере зависел от того, как работает разведка — глаза и уши бригады.

Надо отметить, что разведка бригады «Чекист», возглавляемая сначала Г. Н. Севостьяновым, а с февраля сорок третьего года и до соединения с Советской Армией П. А. Голицыным, работала активно. Это, конечно, не означает, что не было ошибок, провалов. Надо иметь в виду, что работала и фашистская разведка, были изменники и провокаторы.

...Опытных разведчиков в бригаду присылал БШПД. Несколько групп прибыло в 1942 году. Это были замечательные разведчики, подрывники, снайперы, прошедшие специальную подготовку на Большой земле. В декабре 1942 года прибыли в бригаду Алексей Астахов и Михаил Баканин. Оба комсомольца закончили в Москве курсы снайперов, потом спецшколу. Оба зарекомендовали себя в отряде Иванова как смелые и опытные подрывники и разведчики, участвовали во многих боевых операциях.

Алексей Астахов погиб при разгроме Приганьского гарнизона, а ленинградец Михаил Баканин был разведчиком до соединения бригады «Чекист» с частями Советской Армии.

Если же разведчики попадали в руки оккупантов, их ожидала мученическая смерть.

Молодая женщина из Оршанского района Мария Егоровна Шачикова стала партизанской связной с первых дней зарождения партизанского движения. Она много раз была в Орше, доставляла партизанам ценные сведения о работе железнодорожного узла и гарнизона. Мария неоднократно посещала Дубровский гарнизон немцев, установила связи с полицейскими, которые желали перейти на сторону партизан. Весной 1943 года гарнизон почти в полном составе перешел в бригаду «Чекист». Оккупантам стало известно, что Мария Шачикова сыграла большую роль в переводе гарнизона. Над ней нависла угроза ареста. Тогда Мария ушла в партизанский отряд № 60 Ф. М. Седлецкого. Через некоторое время, когда Мария шла на боевое задание, она была схвачена оккупантами. Марию подвергли нечеловеческим пыткам: у нее вырезали грудь, отрезали язык и уши и, полуживую, истекшую кровью, расстреляли. Не оставили в покое и маму Марии. Старуху схватили, облили бензином и сожгли.

Всего один год проработала учительницей в Воронцевичской школе Ольга Фадеевна Гуренова. Началась война. Молодая учительница-комсомолка стала связной партизанского отряда № 5 бригады «Чекист». Ходила в Коханово и Толочин, выполняя партизанские задания. Однажды ее задержал часовой полицейский на железнодорожном переезде станции Толочин. Олю обыскали. В прическе девушки нашли шифровку, из которой было видно, что она партизанская разведчица. Ольгу страшно били, поместили в одиночную камеру. Не вынесла она зверских пыток палачей, сошла с ума. Ее расстреляли в Толочине.

В июне 1942 года из Горок в бригаду «Чекист» прибыли Валентина Воробьева и Нина Ласкевич. Первые боевые задания девушки выполнили успешно и умело. После этого 28 июля 1942 года был подписан приказ: «Зачислить в бригадную разведку:

1. Валентину Филипповну Воробьеву, 1921 года рождения, белоруску, члена ВЛКСМ, образование среднее;

2. Нину Ивановну Ласкевич, 1923 года рождения, белоруску, члена ВЛКСМ, образование среднее».

Перед самой войной Нина окончила Горецкую СШ с похвальной грамотой, мечтала стать учительницей...

Более года В. Воробьева и Н. Ласкевич выполняли ответственные задания. Они ходили в Шклов и Толочин, Копысь и Оршу, Круглое и Белыничи, на левый берег Днепра и в Усакинские леса для связи с подпольным обкомом партии. В сентябре 1942 года, когда бригада выходила из огненного кольца фашистской блокировки, Валя Воробьева пошла с Павлом Голицыным за линию фронта с докладом в БШПД. Валя дожила до светлого Дня Победы. Иначе сложилась судьба Нины. 8 сентября 1943 года она с 17-летним парнем со Смоленщины Николаем Шелухиным на подводе отправилась в Круглое на

связь с партизанским подпольщиком. Недалеко от Круглого они нарвались на фашистскую засаду. Завязалась перестрелка. Раненые Нина и Николай попали в руки полицаев. Их дико избивали, обливали холодной водой и опять били. 11 сентября их, полуживых, повесили, но они не выдали ни одного подпольщика, ни одного связного, они остались верны партизанской присяге и умерли как герои.

В июне 1941 года группа учителей Мстиславльского района возвращалась с экскурсии в город Ленинград. В группе экскурсантов была молодая учительница-комсомолка Галина Авдеевна Миронова. В это время фашисты бомбили станции на железной дороге Ленинград — Киев, и поезд остановился где-то около Невеля. Галина Авдеевна пешком добралась до деревни Рацево, где жили ее родители.

Когда весной 1942 года в Рацевском лесу зажглись первые партизанские костры, Галина Миронова и ее подруга Анна Алехнович становятся партизанскими связными. Более года они пробирались во вражеские гарнизоны, ходили в Коханово, Толочин, Круглое, приносили «чекистам» нужные и важные сведения.

Последнее задание было не из легких, но Галина и Анна взялись с охотой. Весной 1943 года оккупанты разместили в Староселье, что в пяти-шести километрах от Рацева, крупный гарнизон, состоящий из немцев и власовцев. Связные узнали, что многие власовцы желают перейти в партизаны. Начальник разведки 1-го отряда Иван Гаврилович Сафронов рассказывает: «Галина Миронова и Анна Алехнович по нашему заданию много раз ходили в Старосельский гарнизон. После рискового разговора с власовцами они привели двух из них в условленное место — на опушку Рацевского леса. Там был обсужден вопрос перехода в партизаны».

Однако эта операция прошла не совсем удачно. Только 26 власовцам в эту июньскую ночь суждено было стать партизанами. Немцы подняли тревогу и всех остальных власовцев направили в Шклов. Начался допрос тех, кто не сумел оставить гарнизон. И случилось страшное, роковое в судьбе Галины Мироновой. Один из тех, кто желал стать партизаном, не выдержал пыток и назвал ее имя. Июньским днем 1943 года карательный отряд со Шклова неожиданно окружил Рацево. Первое, что сделали каратели, — это схватили Галину Миронову. Ее жестоко пытали, держали в одиночной камере.

Галина никого не выдала.

Когда же ее, избитую и измученную, вели на расстрел, она запела свою любимую песню о Родине.

...Агентурную разведку в отряде № 5 с момента его образования и до соединения с частями Советской Армии возглавлял Николай Алексеевич Сафронов. До призыва в армию он работал учителем в Марийской АССР. В начале июля 1941 года он попал в окружение и остановился в деревне Воронцевичи. За период проживания в этой деревне он хорошо узнал людей не только Воронцевич, но и окрестных деревень. В его группе агентурной разведки были не только кадровые бойцы Советской Армии, попавшие в плен или окружение, но и местные жители — Анатолий Мачаховский, Василий Ветошкин, Володя Благуш, Иван Королев, Володя Бельский, Николай Борозна и другие товарищи. Разведчики группы Николая Сафронова участвовали во многих боях, диверсиях на коммуникациях врага, вели боевую разведку при передвижениях отряда и бригады.

Постоянной же задачей группы была агентурная разведка. Летом 1943 года группа имела более 30 связных и подпольщиков в разных населенных пунктах. Только на станции Толочин по заданию группы работали Иван Павлович Гончаров, Бронислав Петрович Пиотух, Емельян Артемьевич Панченко — отец известного белорусского поэта Пимена Панченко. До сентября 1943 года здесь же работал Володя Бельский, пока над ним не нависла угроза ареста. Тогда он пришел в группу и проявил себя смелым и находчивым разведчиком.

...С образованием Шкловского подпольного райкома партии на связь с подпольным обкомом партии в Усакинские леса Кличевского района от Шкловской ВОГ посылались Нина Ласкевич, Валя Воробьева и некоторые другие партизанские разведчики. Однако чаще всего направлялся в обком партии Сергей Андреевич Пушилин. Старший сержант Красной Армии Сергей Пушилин был участником тяжелых оборонительных боев летом 1941 года при защите Могилева. Один из немногих оставшихся в живых окруженцев он остался на Шкловщине, а весной 1942 года стал организатором партизанской борьбы с врагом. Когда партизанские отряды начали строиться по принципу батальонов, Сергей Пушилин назначается командиром взвода в отряде А. С. Никитченки. Не лишенный чувства юмора, о себе он

говорил: «Липецкий колхозник — белорусский партизан». Родом он был из села Большой Хомутец Липецкой области, до войны работал в колхозе. Друзья и товарищи по борьбе говорили о нем: «В минуты смертельной опасности он становится хладнокровнее, более сосредоточен, внимателен и спокоен». Получая в штабе бригады или в обкоме партии пакет с грифом «Совершенно секретно», Сергей Андреевич обыкновенно полушутя, полусерьезно говорил: «Сам погибай, а пакет уничтожай, но врагу не отдавай». Он пользовался доверием партизан, командования бригады и работников подпольного обкома партии. Он был тоже бойцом невидимого фронта.

И. М. Прусский. Партизанская бригада «Чекист». С. 101—110.

Разведка дакладвала

З успамінаў П. А. Галіцына

Павел Агафонавіч Галіцын нарадзіўся 31 снежня 1922 г. у Свярдлоўскай вобл. у сям'і рабочага. З 1940 да 1984 служыў у Савецкай Арміі. Камандзір разведкі ўзвода, начальнік разведкі партызанскай брыгады «Чэкіст», нам. начальніка разведкі стралковай і кулямётна-артылерыйскай дывізіі, начальнік разведкі арміі, начальнік аддзела Генеральнага штаба, нам. начальніка навукова-даследчага інстытута. Выконваў спецыяльныя заданні камандавання. Член КПСС з 1944 г. (прыняты ў партыю Шклоўскім падпольным РК КП(б)Б. Удзельнік парада Перамогі 1945 г. Мае ўрадавыя ўзнагароды — 8 ордэнаў і 14 медалёў. П. А. Галіцын — генерал-маёр у адстаўцы, на заслужаным адпачынку.

П. А. Галіцын

...У баявых дзеяннях партызанскай брыгады «Чэкіст» вялікае значэнне надавалася разведцы і дыверсіям на камунікацыях. Брыгада дзейнічала на стратэгічным напрамку, праз які праходзяць чыгуначная і аўтамабільная дарогі Мінск — Масква, што дазваляла гітлераўцам карацейшым шляхам перакідваць з Германіі на Заходні фронт войскі, баявую тэхніку, узбраенне і боепрыпасы. Чыгуначныя і аўтамабільныя дарогі Ленінград — Віцебск, Орша — Кіеў давалі магчымасць немцам выконваць перагрупоўкі ўздоўж фронту. У раёнах Оршы, Магілёва, Барысава і іншых населеных пунктаў размяшчаліся аператыўныя і стратэгічныя рэзервы праціўніка. На гэтыя і іншыя аб'екты нацэльвалася камандаваннем партызанская разведка. Брыгадная разведка рэгулярна інфармавала цэнтральны і беларускі штабы партызанскага руху, штаб Заходняга фронту аб воінскіх перавозках, перадыслакацыі часцей і мерапрыемствах гітлераўскага камандавання. Разведка арганізоўвалася і вялася ў даволі шырокай паласе, у якую ўваходзілі Аршанскі, Магілёўскі, Шклоўскі, Бялыніцкі, Круглянскі, Талачынскі і Крупскі раёны. Гэтая паласа падзялялася на зоны дзеянняў партызанскіх атрадаў, у якіх яны неслі адказнасць за арганізацыю разведкі і баявых дзеянняў. Так, 10-ы і 25-ы атрады вялі разведку праціўніка на Шклоў, Магілёў і яго прыгарады, а 1-ы атрад дзейнічаў у Шклоўскім раёне. Разведвальная дзейнасць праводзілася ў інтарэсах камандавання дзеючых франтоў і непасрэдна брыгады. Асноўнымі выканаўцамі гэтай адказнай задачы былі партызаны-разведчыкі атрадаў, штаба брыгады, падпольшчыкі і сувязныя. Назіралі за перавозкамі праціўніка, мініравалі чыгунку, наладжвалі дыверсіі ў Шклове і Лотве — Дзяніс і Іван Грышчанковы, Міхаіл і Рыгор Ермачэнкі, у Магілёве — Аляксей і Ларыса Варламавы, муж і жонка Новікавы, многія іншыя. Сапраўднымі патрыётамі-разведчыкамі і сувязнымі на Шклоўшчыне былі члены сям'і Хаўранковых з вёскі Ганцавічы. Падпольная група на чале з Сяргеем Шугалеем вяла разведку ў Шклове, Лотве, здзяйсняла дыверсіі на чыгункі. Група пастаянна падтрымлівала сувязь з партызанамі 10-га атрада, праз А. А. Белабрагіна перадавала ім каштоўную інфармацыю.

Значны ўрон захопнікам наносілі дыверсійныя групы атрадаў, на рахунку якіх па некалькі чыгуначных эшалонаў, пушчаных пад адхон. Так, В. Юрчанка з 20-га атрада

падарваў 19 эшалонаў, М. Агаценка з 1-га атрада — 17, Н. Скакуноў і І. Савін з 20-га атрада — па 13 эшалонаў, А. Казанцаў з 5-га атрада — 10 і іншыя. Многія з партызан прымалі ўдзел у 2—3 аперацыях па знішчэнні воінскіх эшалонаў праціўніка. Вясной 1943 г. разведка брыгады інфармавала галоўнае камандаванне аб перакідцы нямецкіх войск пад Курск і Белгарад, аб перавозцы туды новых танкаў «Тыгр» і самаходных артылерыйскіх установак «Пантэра». Летам пасля паражэння немцаў на Курскай дузе разведка брыгады дакладвала пра паток нямецкіх эшалонаў на захад з параненымі, аб эвакуацыі прыфрантавой зоны складоў і баз, вывазе крадзенай маёмасці. Напярэдадні стратэгічнай аперацыі «Баграціён» па вызваленні Беларусі разведкай брыгады была ўскрыта групоўка войск 4-й нямецкай арміі, якая супрацьстаяла нашаму Заходняму фронту, з указаннем флангаў і стыкаў паміж дзеючымі нямецкімі дывізіямі.

Адной з асноўных крыніц атрымання разведвальных звестак былі паказанні палонных фашыстаў. Мэтанакіраваныя задачы па захопу іх ставіліся разведчыкам Н. Каянаву, М. Тапавалдыеву, В. Закрэўскаму, А. Іванову, П. Страздзіну і іншым. Так, за паўтара месяца да пачатку беларускай аперацыі ў штаб Заходняга фронту на самалёце была дастаўлена з брыгады падрабязная схема інжынерных збудаванняў на абарончым рубяжы немцаў па заходнім беразе Дняпра. Разведка яго пад Шкловам вялася разведчыкамі спецыяльна сфарміраванай групы на чале з С. Малашкевічам. Акрамя таго, звесткі паступалі ад палонных немцаў, паліцэйскіх і ўласаўцаў, якія ўдзельнічалі ў будаўніцтве збудаванняў, а таксама ад вясковых жыхароў. Разведданыя брыгады напярэдадні наступлення савецкіх войск у Беларусі былі высока ацэнены камандаваннем Заходняга фронту. Камандзіру, нач. штаба, нач. разведкі брыгады камандуючы войскамі фронту выказаў падзяку, ад яго імя былі ўручаны каштоўныя падарункі.

Пры актыўным удзеле разведчыкаў разгромлены гарнізоны ў Жукніве, Клімавічах, Тросне, Лотве, Чарнаруччы, Елькаўшчыне і іншыя. Лепшымі разведчыкамі, кіраўнікамі разведкі праявілі сябе Мамадалі Тапавалдыеў, Мікалай Каянаў, Мікалай Залаты, Анатоль Мачахоўскі, Пётр Страздзін, Васіль Закрэўскі, браты Мікалай і Карл Захарчанкі, Браніслаў Злеўскі, Уладзімір Рабінін, Віктар Чысцякоў, Мікалай і Іван Сафонавы, Антон Белабрагін, Аляксандр Бублікаў, Мікалай Фёдараў, Антось Хайнацкі і іншыя. Вось толькі адзін прыклад баявой дзейнасці разведчыкаў. У маі 1943 г. група разведчыкаў з 8 чалавек 10-га атрада на чале з А. А. Белабрагіным абяззброіла паліцэйскі гарнізон на цагельным заводзе стн. Лотва. Было захоплена шмат зброі і боепрыпасаў. Аперацыя праведзена з дапамогай сувязных падпольшчыкаў Сяргея Шугалея і Веры Жарынай.

Добра праявілі сябе ў разведцы і нашы дзяўчаты Л. К. Крывельская, Валя Вараб'ёва, Зоя Аладзева, Зіна Платонава, Ніна Фаміна, Ніна Ласкевіч, Вольга Гарбацэвіч, Вольга Левановіч, Вольга Касталомава, Вольга Дземеш, Марыя Венядзіктава, Паліна Войтава. На рахунку кожнай па некалькі выхадаў на адказныя заданні, пушчаныя пад адхон воінскія эшалоны і іншыя дыверсіі.

Разведчыкі выконвалі абавязкі па сувязі з Беларускім штабам партызанскага руху. У 1942—1944 гг. з брыгады праз фронт накіроўваліся У. Рабінін, Л. Крывельская, А. Гарбацэвіч, В. Вараб'ёва, М. Венядзіктава, М. Тапавалдыеў, Г. І. Ігнаценка, Ф. М. Сядлецкі, І. Дз. Буланаў. У выніку штаб аказваў нам канкрэтную дапамогу. У брыгаду накіроўваліся радысты, інструктары падрыўной справы, перыядычна на самалётах пастаўлялася ўзрыўчатка, міны, зброя, боепрыпасы.

Камандаванне і разведка брыгады садзейнічалі групам, якія закідваліся ў тыл ворага па лініі галоўнага разведвальнага ўпраўлення Генеральнага штаба. Так, з базы брыгады ў 1943—1944 гг. дзейнічала разведгрупа на чале з маёрам Б. Н. Вацлаўскім.

Запісаў *У. Паўлаў*

ДАВЕДКА АБ АСАБОВЫМ СКЛАДЗЕ АТРАДАЎ ВАГ НА ЧАС ЗЛУЧЭННЯ З ЧАСЦЯМІ ЧЫРВОНАЙ АРМІІ

№№ отрядов	Личный состав	В том числе женщин	Погибло	Пропало без вести
1	485	56	59	5
5	362	23	50	5
10	376	41	37	1
20	418	32	50	10
25	152	5	18	2
31	364	26	17	3
60	331	28	37	3
Всего:	2488	211	268	29

Примечание: 5 декабря 1943 г. отряды № 15 и № 40 в количестве 485 человек откомандированы в Брестскую область, где они и соединились с Красной Армией.

НАРБ, ф. 3500, воп. 4, спр. 88, лл. 152—157.

Вооружение на 1 июня 1944 года: пулеметов — 115 (из них станковых — 10); автоматов — 245; винтовок — 1215; минометов — 7; ПТР — 6.

Там жа. Л. 165.

Партызаны брыгады «Чэкіст», узнагароджаныя Прэзідыумам Вярхоўнага Савета СССР у 1943 г.

За доблесть и мужество, проявленные в партизанской борьбе в тылу против немецких захватчиков, наградить*:

орденом Ленина — Горбатенкова Максима Трифоновича;

орденом Красного Знамени — Васина Александра Степановича, Галицина Павла Агафоновича, Денисова Александра Семеновича, Красякова Павла Аксентьевича, Лагуткина Николая Ивановича, Лукашенко Федоса Михайловича, Марченко Степана Васильевича, Мякотенко Петра Яковлевича, Никитченко Андрея Степановича, Нордмана Эдуарда Болеславовича, Нудэльмана Моисея Борисовича, Пехоту Николая Максимовича, Пушилина Сергея Андреевича, Рябинина Владимира Николаевича, Салафундинова Гальмухана Шарафудиновича, Скворцова Ивана Григорьевича, Солдатова Сергея Викторовича, Соломатина Николая Васильевича, Суворова Ивана Николаевича, Семдянкина Александра Федоровича, Хаткевича Ивана Егоровича, Шахмартова Дмитрия Александровича, Якимова Степана Никитича, Яковенко Николая Марковича;

орденом Красной Звезды — Аладьеву Зою Антоновну, Быстрова Григория Ефимовича, Воробьева Павла Петровича, Иванова Григория Семеновича, Иванова Михаила Ивановича, Каликиченко Андрея Ивановича, Клюшникова Бориса Николаевича, Корнева Петра Петровича, Котальникова Василия Степановича, Коянова Николая Ивановича, Кривельскую Любовь Кузьминичну, Массюрова Николая Ивановича, Султанова Гапара, Тихоненко Николая Григорьевича, Ульянова Павла Константиновича, Хромова Василия Павловича;

медалью «За отвагу» — Медведева Георгия Александровича, Шадрина Николая Егоровича, Якушко Илью Алексеевича;

медалью «За боевые заслуги» — Апанасенко Николая Кононовича, Евлампиева Степана Евлампиевича, Жукова Александра Григорьевича, Климанковича Владимира Кузьмича, Котельникова Николая Ильича, Крючко Михаила Ивановича, Мачаховского Анатолия Романовича, Олехновича Владимира Петровича, Семенкова Анатолия Ивановича, Чебышева Виктора Федоровича, Черных Валентина Дмитриевича, Чистякова Виктора Федоровича, Шестакова Николая Ильича, Щербакова Ивана Самсоновича.

НАРБ, ф. 4239, воп. 1, спр. 4, лл. 29—30.

---

* Названы партызаны брыгады «Чэкіст». (Дзённік камбрыга Г. Кірпіча, асабісты архіў.)

Група партызан брыгады «Чэкіст»
(фота з асабістага архіва камбрыга Г. А. Кірпіча)

С. І. Аўтановіч

М. Г. Венядзіктава

О. В. Гарбацэвіч

І. В. Кананыхін

Г. А. Кірпіч

М. П. Каржавін

П. А. Красякоў

П. А. Крынічка

М. Дз. Мільто

М. П. Сімдзянкіна

А. Ф. Сімдзянкін

А. Ф. Халянкова

Спіс узнагароджаных ордэнамі і медалямі партызан Шклоўскай ВАГ. 1944 г.:

орденом Красной Звезды: Кирпич Григорий Алексеевич, Базанов Александр Арсентьевич, Коновалов К. Ф.;

орденом Красного Знамени: Панфилов Семен Андреевич;

медалью «Партизану Отечественной войны» I степени: Кирпич Григорий Алексеевич, Кокина Ася Самойловна, Милюшников Михаил Михайлович, Петракевич Евдоким Михайлович;

медалью «Партизану Отечественной войны» II степени: Волков Иван Васильевич, Волков Григорий Петрович.

НАРБ, ф. 4237, воп. 1, спр. 4, л. 80.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

Падполле дзейнічала

Справядлівы характар вызваленчай барацьбы супраць нямецка-фашысцкіх акупантаў абумоўліваў аб'ектыўную непазбежнасць масавага народнага супраціўлення ворагу. Побач з узброенымі сіламі партызанскіх атрадаў і больш буйных фарміраванняў з самага пачатку акупацыі раёнаў Беларусі сталі дзейнічаць падпольныя партыйна-камсамольскія, маладзёжныя групы і антыфашысцкія арганізацыі, цесна звязаныя, як і партызаны, абапіраючыся на мясцовае насельніцтва. Спачатку падпольныя групы і арганізацыі дзейнічалі самастойна, а пасля стварэння падпольных партыйных і камсамольскіх раённых і абласных камітэтаў наладзілася каардынацыя іх работы ў населеных пунктах, больш цесная сувязь з партызанскімі фарміраваннямі.

У Шклоўскім раёне партыйна-камсамольскае падполле дзейнічала ў жніўні 1941 — лістападзе 1943 г. Яно складвалася з арганізацый, якія налічвалі 13 падпольных груп, больш за 100 падпольшчыкаў, у тым ліку 32 камуністы і 39 камсамольцаў. Групы, створаныя з рабочых, калгаснікаў, настаўнікаў, медработнікаў, студэнтаў, хатніх гаспадынь да пачатку 1942 г. аб'ядналіся ў падпольныя арганізацыі. Важную ролю ў стварэнні падполля адыгралі ваеннаслужачыя Чырвонай Арміі, што выйшлі з акружэння або ўцяклі з палону. Патрыёты падтрымлівалі сувязь з кіраўніцтвам Магілёўскага партыйна-камсамольскага падполля, камандаваннем партызанскай брыгады «Чэкіст», з лета 1943 г. працавалі пад кіраўніцтвам Шклоўскага падпольнага РК КП(б)Б.

Падпольная арганізацыя Гарадзецкага і Славенскага сельсаветаў, якую ўзначальвалі камуністы камандзір Чырвонай Арміі Іосіф Ф. Стукалаў, потым А. Я. Казлоў, аб'ядноўвала 5 падпольных груп: 3 у в. Любінічы (кіраўнікі Іосіф Стукалаў, Казлоў, камуніст М. М. Юр'еў, камсамольцы В. Ц. Грыгор'еў, У. Ц. Гурынаў, Іван Ф. Стукалаў, беспартыйны А. П. Гелахаў), група Любініцкай МТС (камсамольцы П. І. Рыбакоў, Р. В. Міронаў), в. Лешча (В. М. Шалаеў).

У арганізацыю Старавадвянскага і Каменна-Лаўскага сельсаветаў, якую ўзначальваў рабочы чыг. стн. Шклоў С. Л. Шугалей, уваходзілі падпольныя групы на чыг. стн. Лотва (кіраўнік Ф. С. Грышчанкаў) і ў в. Малое Міхайлава (Шугалей).

Арганізацыя «Патрыёт Радзімы», якую ўзначальваў камуніст капітан Чырвонай Арміі М. М. Ляднёў (пасля яго гібелі — настаўнік А. А. Сякацкі), дзейнічала на тэрыторыі Таўкачоўскага, Чарнаруцкага і Вялікалазіцкага сельсаветаў, налічвала 6 груп: у в. Вялікія Лазіцы (кіраўнікі: камандзір Чырвонай Арміі М. П. Каржавін, камсамолец М. Ф. Галіноўскі), в. Гаваяды (камуніст Г. А. Валасняў і камсамолка П. А. Крынічка), в. Тударава (камуністы І. В. Кананыхін і Л. Р. Камісараў), в. Смятанічы (камуністы П. А. і Р. А. Красяковы), в. Мерч (камуніст Ц. А. Герасімовіч), в. Зацішша (Сякацкі).

З першых дзён акупацыі камуністы і камсамольцы, беспартыйныя актывісты праводзілі гутаркі, распаўсюджвалі савецкія лістоўкі. Па радыё прымалі зводкі Саўінфармбюро, пісалі і распаўсюджвалі іх. Радыёпрыёмнікі былі ў Грыгор'ева, Рыбакова, Шугалея, Герасімовіча. Лістоўкі перадавалі на явачных кватэрах, якія ўтрымлівалі І. Д. Гуркін, Г. В. Бондарава (в. Любінічы), Б. А. Атрошчанка (в. Гаваяды), А. Р. Красякоў, Сякацкі, Л. В. Кандраценка (в. Вялікія Лазіцы). Явачныя кватэры адначасова служылі і складамі зброі. У доме Гуркіна зброю рамантавалі. Патрыётамі Гарадзецкага і Славенскага сельсаветаў было сабрана і перададзена партызанам 2 станковыя, 9 ручных кулямётаў, 2 мінамёты, вялікая колькасць вінтовак і боепрыпасаў. Перавозілі зброю К. В. Рыбакова (Мірона-

ва) і М. І. Новікаў. Падпольшчыкі арганізацыі «Патрыёт Радзімы» перадалі партызанам і выкарысталі самі шмат зброі, патронаў. Устанавіўшы ў снежні 1941 г. праз падпольшчыка в. Зацішша А. І. Галісевіча сувязь з Магілёўскім падполлем, удзельнікі арганізацыі «Патрыёт Радзімы» атрымлівалі з горада зброю, боепрыпасы і перадавалі іх у брыгаду «Чэкіст». Для перавозкі зброі Галісевіч і Г. М. Андрэеў выкарыстоўвалі павозку з двайным дном. У студзені 1942 г. любініцкія патрыёты Іосіф і Іван Стукалавы, М. І. Падчашанка на шашы Орша — Магілёў знішчылі нямецкіх аўтаматчыкаў. 24.05.1942 г. падпольшчыкі вёсак Любінічы і Лешча Грыгор'еў, П. С. Хамелеў, В. М. і П. М. Шалаевы, С. А. Шонін разам з партызанамі разграмілі паліцэйскі ўчастак і маслазавод у в. Гарадзішча, праз тыдзень — у в. Фашчаўка. У 1941 г. браты Фёдар, Іван, Дзяніс Грышчанковы пусцілі пад адхон варожы эшалон, узарвалі каля в. Малое Міхайлава 2 аўтамашыны. У красавіку 1942 г. патрыёты в. Малое Міхайлава спалілі ў в. Лотва сепаратарны пункт. Я. М. Снатко ўзарваў машыннае аддзяленне Латвянскага цагельнага завода. Да канца 1942 г. братамі Грышчанковымі на чыгункі Шклоў — Магілёў было ўзарвана 3 паравозы, 13 вагонаў, знішчаны 3 цыстэрны з бензінам. У кастрычніку 1941 г. падпольшчыкі в. Смятанічы на чале з П. А. Красяковым пусцілі пад адхон паравоз і 2 вагоны, у лістападзе — снежні 1941 г. група в. Мерч з засады на дарозе знішчыла 8 варожых салдат. Рэгулярна рабілі дыверсіі патрыёты в. Гаваяды, Тударава, Зацішша: падпільвалі тэлеграфныя слупы, ірвалі тэлефонную сувязь, разбіралі дряўляныя масты. Падпольшчыкі падтрымлівалі сувязь з партызанамі, перадавалі ім звесткі аб праціўніку, зброю, боепрыпасы, харчы. Сувязнымі былі Атрошчанка, М. Ф. Галіноўскі, Галісевіч, Герасімовіч, сёстры В. К. і М. К. Данільчанкі, Ф. І. Казлоў, Л. В. Кандраценка, Сякацкі, У. І. Янчэўскі і інш.

У барацьбе супраць нямецка-фашысцкіх захопнікаў загінулі А. П. Гелахаў, В. Ц. Герасімовіч, Х. Ц. Герасімовіч, І. Д. Гуркін, А. Я. Казлоў, А. Р. Красякоў, В. Дз. Кулікова, М. М. Ляднёў, А. Я. Маргуноў, Р. В. Міронаў, К. І. Новікаў, М. І. Новікаў, М. І. Падчашанка, А. Ф. Стукалава, А. А. Сякацкая, А. А. Сякацкі, М. М. Юр'еў.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне... С. 637—638.

БАРАНОЎСКІ Міхаіл Мікалаевіч. Ураджэнец в. Рыжкавічы. Да вайны працаваў інструктарам Шклоўскай міліцыі. Райкомам КП(б)Б быў пакінуты ў раёне для арганізацыі партызанскай і падпольнай барацьбы з ворагам. За даволі кароткі тэрмін здолеў арганізаваць групу патрыётаў з акружэнцаў, якія аказаліся на тэрыторыі Чарнаруцкага і Таўкачоўскага сельскіх Саветаў, а таксама мясцовых жыхароў. У яе ўвайшлі Павел Красякоў, Леў Салавей, Сяргей Пупышлін, Сцяпан Бабічаў, Міхаіл Іваноў, Зінаіда Платонава, Любоў Крывельская і інш.

У пачатку 1942 г. патрыятычная група пад кіраўніцтвам Бараноўскага яшчэ больш вырасла і пачала ўжо весці больш эфектыўную барацьбу з ворагам. А ў маі гэтага года атрадам, які ўзначаліў М. Бараноўскі, улілася ў партызанскую брыгаду «Чэкіст». Але нядоўга цягнулася яго жыццё — у канцы мая 1942 г. памёр. Быў пахаваны на могілках в. Хацькова, пасля вайны перахаваны на могілках в. Жукнева Талачынскага раёна.

Л. Анціпенка

У стане ворага

Бясстрашнымі змагарамі супраць гітлераўцаў былі браты Фёдар, Іван і Дзяніс Грышчанковы. Яны стварылі дыверсійную групу на чыгункі Орша — Магілёў. Дзякуючы добрай канспірацыі, яна не была раскрыта і праводзіла дыверсіі аж да прыходу Чырвонай Арміі.

Аб тым, як дзейнічалі браты, расказвае старэйшы з іх, кіраўнік групы Фёдар Сямёнавіч Грышчанкоў. «У трывожным і трагічным 1941 годзе я працаваў дзяжурным на станцыі Лотва Магілёўскага аддзялення Беларускай чыгункі. Два тыдні ідзе вайна. 8 ліпеня ў восем гадзін раніцы я заступіў на дзяжурства. Гадзін у 12 дня на станцыю верхам на кані прыскакаў старшыня Старавадвянскага сельсавета Падабед і паведаміў, што ў сямі кіламетрах ад станцыі немцы высадзілі дэсант з 5 танкамі. Фашысты базіруюцца ў лесе. Я неадкладна пазваніў у Магілёў у артполк, каб выехалі для знішчэння дэсанта. У гэты час чыгунка ў абодвух напрамках яшчэ працавала нармальна. На платформах, у вагонах вывозіліся мука, цукар і іншыя прадукты. А ў 16 гадзін на станцыі з'явіліся фашысты. Я тут жа званю

па селектару дыспетчару ў Магілёў. Дыспетчар мне не паверыў. Ён завяраў, што гэта нашы выехалі для знішчэння дэсанта. Праз лічаныя мінуты ў кантору дзяжурнага зайшоў тузін немцаў. Яны пабілі ўсю апаратуру, акрамя селектара. Стралялі па партрэтах, якія былі ў кабінеце начальніка станцыі.

Як толькі немцы выйшлі, я тэрмінова па селектару звязаўся з кіраўніком абароны Магілёва. Яго цікавіла, ці шмат немцаў на станцыі, куды яны бяруць кірунак. А немцы ішлі да Дняпра. Толькі я паспеў адказаць, як сувязь парушылася. Я паспяшаўся дадому, схаваўся. Мы з братам Іванам жылі ў дзяржаўных кватэрах на станцыі Лотва. Паўстала праблема, што рабіць далей. Пасля кароткіх разважанняў вырашылі пачаць барацьбу з акупантамі. Запасаліся зброяй, боепрыпасамі, хавалі іх у лесе. Потым пачалі пераразаць дрот нямецкай тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі. Да нас далучыўся брат Даніла, а потым мой сын Аляксей. Мы пазней праз Сяргея Шугалея звязаліся з партызанамі, дастаўлялі ім зброю.

Як толькі немцы ў 1941 годзе аднавілі рух па чыгунцы, мы атрымалі сваё першае дыверсійнае хрышчэнне, падклаўшы пад рэйку снарад. На ім падарваўся паравоз і перакуліўся ў адхон. Неўзабаве наладзілі яшчэ адну дыверсію, падарвалі на лясной дарозе дзве варожыя аўтамашыны.

Наступіў 1942 год. Праз Шугалея я пазнаёміўся з нашым палкоўнікам Рыжыкавым, які папрасіў мяне адправіцца ў Магілёў, падабраць там праз знаёмых чалавек 25, прывезці іх у Новы Міхайлоў для стварэння групы падрыўнікоў. Неўзабаве дабраўся да Магілёва, звярнуўся да добра мне знаёмага Карпянкова, які працаваў начальнікам станцыі Магілёў-2. Але ён аказаўся здраднікам, выдаў мяне ворагу. 7 сакавіка 1942 года я быў арыштаваны і пасаджаны ў Магілёўскай турме ў камеру-адзіночку. У ёй правёў 12 дзён. Допыты чаргаваліся пабоямі. У гэты час Шугалей рабіў спробы вырваць мяне з рук гестапа, звязаўся са знаёмым рускім настаўнікам, перакладчыкам гестапа. Пры яго садзейнічанні я быў вызвалены.

У мяне памацнела нянавісць да ворага. Я, Іван, Даніла і Аляксей даведаліся, што немцы ў пуні пад замком трымаюць сто кілаграмаў толу, капсулі і шнур. Мы ўсё гэта выкралі і вырашылі пайсці ў партызаны. Мяне і брата Івана Шугалей правёў у партызанскі атрад № 10 брыгады «Чэкіст». Але начальнік штаба Севасцьянаў прапанаваў

Ф. С. Грышчанкоў

Г. С. Шугалей

нам вярнуцца да дому, уладкавацца на працу да немцаў на станцыі Лотва і працягваць дыверсіі. Я пайшоў працаваць стрэлачнікам, а Іван пуцявым рабочым. Нам выдалі наручныя павязкі, і мы ў любы час маглі хадзіць па чыгунцы.

Начальнікам станцыі быў немец, дзяжурнымі — немец і два чэхі. Я завёў знаёмства з чэхамі, якія намякалі, што ненавідзяць фашыстаў, Гітлера і гатовы пайсці да партызан. Пазней яны мне дапамагалі, паведамлялі начны графік руху паяздоў.

З толу, капсуляў і шнуру мы самі выраблялі міны. А потым прыступілі да дыверсій.

У 1943 годзе на ахове чыгункі былі так званыя «народнікі». Некаторыя з іх хацелі перайсці да партызан. З такімі я часта заводзіў гаворку, намякаў, што магу дапамагчы. Перабежчыкаў сабралася 12 чалавек. Я прывёў іх да Шугалея ў лес. Усе яны былі перапраўлены ў партызанскі атрад.

Я да сённяшняга дня не магу забыць яшчэ адной нашай дыверсіі. Пасажырскі поезд Магілёў — Берлін са станцыі Лотва штодзённа адпраўляўся ў 12 гадзін ночы. У ім ездзілі афіцэры і салдаты, якія атрымлівалі водпускі. Падпільнаваўшы, калі ахова адышла ў бок, мы падклалі пад рэйку самаробную міну — кілаграмаў 25 толу. Выбух быў страшэнны.

Праз некаторы час мы вымушаны былі пакінуць казённыя кватэры і адправіцца ў вёскі, бо немцы сталі сачыць за намі, падазраючы ў дыверсіях. І ім удалося гэта ўстанавіць. За тое, каб мяне злавіць жывым, паліцаям абяцалася вялікая ўзнагарода. Тым часам я ўжо быў у атрадзе партызан».

«Ударны фронт». 1968. 28 снежня.

Падрыхтаваў *Л. Анціпенка*

Словам і асабістым прыкладам

З успамінаў Г. А. Кірпіча, былога члена Шклоўскага падпольнага райкома КП(б)Б.

...Вырашыўшы дзейнічаць у тыле ворага партызанскімі метадамі, мы неадкладна ўстанавілі сувязь з мясцовымі патрыётамі. Спачатку ўдалося сустрэцца з пакінутымі для работы ў падполлі былымі супрацоўнікамі раённага аддзела міліцыі П. А. Красяковым і М. М. Бараноўскім. Праз іх выйшлі на сувязь з другімі таварышамі. Байцы нашай групы С. С. Іконнікаў (Каняшкін), І. І. Калеснікаў і Ф. Т. Шваюк устанавілі кантакты з некаторымі камуністамі, якія засталіся ў вёсках Шклоўскага, Аршанскага і Круглянскага раёнаў. Сярод іх — старшыня Шпскага гарвыканкома К. А. Граблеўскі, дырэктар саўгаса «Індустрыя» Пухавіцкага раёна Ф. Т. Сіялка, інструктар Багушэўскага райкома партыі І. С. Шчарбакоў, дырэктар Аўгустоўскага санаторыя, які быў каля Беластока, П. Н. Клюшнікаў і яго брат лейтэнант Б. Н. Клюшнікаў, супрацоўнікі міліцыі М. Н. Іваноў (з Магілёва) і А. С. Дзянісаў (з Брэста).

...Дзякуючы смеласці і знаходлівасці патрыётаў Максіма Хадорыка, Марыі Хаўранковай і Ганны Несцяркавай, якія даставілі з Оршы друкарскую машынку і паперу, мы пачалі выпускаць лістоўкі. Па даручэнні партыйнай арганізацыі пісалі іх І. С. Шчарбакоў і А. С. Кокіна.

Вялікім было ўздзеянне і вуснай прапаганды. У вёсках часта выступалі з дакладамі, вялі гутаркі І. С. Шчарбакоў, Ф. М. Сядлецкі і іншыя.

...Раённы камітэт КП(б)Б падабраў прапагандыстаў і агітатараў, па 5—6 у кожным атрадзе з ліку не толькі палітработнікаў, але і радавых камуністаў. Яны рэгулярна выступалі з дакладамі, праводзілі гутаркі сярод партызан і насельніцтва.

...З пачуццём удзячнасці ўспамінаюцца і подзвігі падпольшчыкаў. Браты Іван і Васіль Малашкевічы з вёскі Міхайлова Шклоўскага раёна вывезлі з Магілёва ў брыгаду больш за 2 тоны солі — вельмі дэфіцытнай у тыле ворага. Акрамя таго, браты аказвалі бескарысную дапамогу сем'ям франтавікоў і народных мсціўцаў.

Зубныя ўрачы са Шклова Н. С. Швядзькова і Г. С. Касперская дастаўлялі партызанам медыкаменты і медыцынскія інструменты. Праз некаторы час урач Ганна Савельеўна Касперская перапраўлена нам бормашыну, а затым сама прыйшла ў брыгаду. Тады мы адкрылі зубаўрачэбны кабінет.

Шэсць дочак удзельніка грамадзянскай вайны Піліпа Кузьміча Хаўранкова, якія пражывалі ў вёсцы Ганцавічы, удзельнічалі ў барацьбе супраць фашысцкіх акупантаў (ім прысвечаны артыкулы на наступных старонках кнігі. — *Г. Н.*).

...Значная частка партызан і падпольшчыкаў — гэта моладзь. Выхаваная ў духу палымянага савецкага патрыятызму, яна адразу ж пасля акупацыі паднялася на барацьбу з ненавісным ворагам.

Актыўна дзейнічала камсамольска-маладзёжная падпольная арганізацыя пад кіраўніцтвам настаўніцы Марыі Калістратаўны Венядзіктавай. Пражываючы ў вёсцы Літоўскія Круглянскага раёна, яна ў сакавіку 1942 г. стала разведчыцай нашага 1-га атрада. Па задáнні камандавання М. К. Венядзіктава двойчы пераходзіла лінію фронту, дастаўляючы данясенні ў БШПР.

Вясной 1942 г. па ініцыятыве камісара брыгады Фёдара Міхайлавіча Сядлецкага ў вёсцы Дуброва Шклоўскага раёна стварылі камсамольска-маладзёжную падпольную арганізацыю імя К. Я. Варашылава. Аксіння Таланкова, Марыя Казлова, Таццяна Тальцова, якія ўваходзілі ў яе склад, вялі разведку ў Шклове і прыдняпроўскім умацаваным раёне праціўніка, распаўсюджвалі лістоўкі, заклікалі насельніцтва сабатаваць пастаўкі акупантам прадуктаў харчавання, цёплых рэчаў.

Падобныя арганізацыі ўзнікалі і ў іншых вёсках. Многія падпольшчыкі ў далейшым уліліся ў партызанскія атрады, затым сталі добрым папаўненнем для часцей Чырвонай Арміі.

...Усёй баявой і палітычнай работай камсамола кіраваў са жніўня 1942 г. Магілёўскі падпольны абком ЛКСМБ і ўпаўнаважаны ЦК ЛКСМБ па [Шклоўскаму] раёну П. Т. Волкаў. З чэрвеня 1943 г. прыступіў да работы Шклоўскі падпольны райком камсамола ў складзе М. А. Іванова (сакратар), В. В. Міціна (сакратар па прапагандзе), К. Ф. Захарчанкі, П. А. Галіцына і В. Ф. Чэбышава. Камсамольцы з'яўляліся вернымі памочнікамі камуністаў і ў баях з ворагам, і ў палітычнай рабоце сярод насельніцтва...

Партийное подполье в Белоруссии. 1941—1944. Мн., 1985. С. 204—211.

М. П. Хаўранкова

Е. П. Хаўранкова

М. П. Хаўранкова

З. П. Хаўранкова

Н. П. Хаўранкова

Г. П. Хаўранкова

Сям'я непакорных

Хаўранковы нарадзіліся ў в. Ганцавічы Шклоўскага р-на.

Матрона Піліпаўна (н. 18.11.1907), сувязная партызан. **Ефрасіння Піліпаўна** (н. 11.07.1912), сувязная партызан. **Марыя Піліпаўна** (12.08.1914 — жнівень 1943). Да вайны працавала эканамістам. У Айчынную вайну падпольшчыца, сувязная партызан. Распаўсюджвала лістоўкі сярод насельніцтва, забяспечвала партызан медыкаментамі, боепрыпасамі, звесткамі разведкі. У чэрвені 1943 г. арыштавана і закатавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Галіна Піліпаўна (н. 6.08.1919), настаўніца, сувязная партызан.

Надзея Піліпаўна (1.09.1922—21.09.1942). Перад вайной настаўніца ў Прапойскім (Слаўгарадскім) р-не. У Айчынную вайну па яе ініцыятыве сёстры збіралі зброю, памагалі параненым савецкім воінам. З мая 1942 г. разведчыца партызанскага атрада, потым партызанскай брыгады «Чэкіст». Праводзіла падпольныя камсамольскія сходы ў вёсках, садзейнічала ўступленню моладзі ў партызанскія атрады, удзельнічала ў баявых аперацыях. У верасні 1942 г. арыштавана і закатавана нямецка-фашысцкімі захопнікамі.

Зінаіда Піліпаўна (н. 11.07.1925), вяла разведвальную работу ў Шклоўскім і Аршанскім раёнах. У партызанах са жніўня 1942 г., сувязная партызанскай брыгады «Чэкіст». У студзені — верасні 1943 г. член Горацкага падпольнага РК ЛКСМБ. Выратавала 27 савецкіх ваеннапалонных, забяспечвала партызан боепрыпасамі, медыкаментамі.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне... С. 612—613.

З ХАРАКТАРЫСТЫК

ШАЙНІКАВА Марыя Францаўна.

ЧАРНАРУЦКІ СЕЛЬСАВЕТ

ВЁСКА ПАЛЫКАВІЧЫ

ГУЗАЎ Васіль К.
ГУЗАЎ Касьян Р., н. у 1890.
ГУЗАВА Ганна К., н. у 1916.
ГУЗАВА Вольга М.
ШАЎЧЭНКА Анастасія П., н. у 1913.
ШУНЬКОЎ Андрэй П., н. у 1912.

ВЁСКА РАМШЫНА

БАГДАНСКІ Іван П., н. у 1884.
ВОЛКАЎ Павел Якаўлевіч, н. у 1908.
КУРЛЯНКОЎ Лукаш В., н. у 1906.
КУРЛЯНКОЎ Аксён А., н. у 1869.
КУРЛЯНКОВА Уліта М., н. у 1909.
СІМАНАЎ Сафон І., н. у 1869.
ШЭПЕЛЕЎ Захар Ф., н. у 1904.

ВЁСКА ЧАРНАРУЧЧА

АГАФОНАЎ Аляксандр, н. у 1922.
АЎДЗЕЕНКА Надзея, н. у 1921.
ЗАЙЦАЎ А. І., н. у 1927.
ЗАЙЦАЎ Мікалай, н. у 1927.
ЗЯЗЮЛЬЧЫК Мікалай, н. у 1925.
ЗЯЗЮЛЬЧЫК Вера, н. у 1923.
КАЖАМЯКІН Мікалай, н. у 1925.
КАМАРОЎ Мікалай А., н. у 1910.
КЛЕШЧЫКАЎ Васілій, н. у 1874.
КЛЮШНІКАЎ Дзмітрый, н. у 1875.
КУРЛЯНКОВА Ганна, н. у 1918.
МАКАТАВА Надзея М., н. у 1924.
ПІЛЯЕВА Матруна, н. у 1910.
РАДЗЬКО Мікалай, н. у 1922.
САВЕЛЬЕЎ Рыгор, н. у 1917.
УЛАСАЎ Міхаіл, н. у 1901.
УСАЎ Пётр, н. у 1919.
ШАБУЛЕДА Мікалай, н. у 1922.
ЯЎСЕЕЎ Андрэй, н. у 1915.

ГОРАД ШКЛОЎ

АЗАРКЕВІЧ Мета Лейбавіч, н. у 1893.
АЛЬТШУЛЕР Песя, н. у 1913.
АЛЬТШУЛЕР Малка Абрамаўна, н. у 1915.
АЛЬТШУЛЕР Ісак, н. у 1890.
АНІПАХАВЕР Залман, н. у 1900.
АРМАН Гершэн, н. у 1909.
АТЛІВАНКІН Неях, н. у 1915.
АТЛІВАНКІН Гірша, н. у 1912.
АТЛІВАНКІНА Ліза, н. у 1921.
АФІЦЕРАВА Марыя Андрэеўна, н. у 1917.
АХМЕТАВА Марыя Іванаўна, н. у 1900.
БАБЧЫН Саламон Львовіч, н. у 1892.
БАРАСЦЕНЬ Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1933.
БАРЫШНІКАЎ Ісак, н. у 1885.
БАСКІН Ісак Мееравіч, н. у 1893.
БЕЛАЦАРКОЎСКАЯ Хая, н. у 1894.
БЕЛКІН Эся, н. у 1895.
БЕЛКІН Давід Г., н. у 1875.
БЕЛКІН Нохім Барысавіч, н. у 1864.
БЕНІНСОН Нохім, н. у 1896.
БЕНІНСОН Нохім, н. у 1880.
БЕНІНСОН Хая П., н. у 1893.
БЕНІНСОН Лена Н., н. у 1927.
БЕНІНСОН Носан Б., н. у 1885.
БЕНІНСОН Яша Н., н. у 1925.
БЕНІНСОН Нохім Навумавіч, н. у 1887.
БЕНІНСОН Рахіль Абрамаўна, н. у 1892.
БЕНІНСОН Малка Лейбаўна, н. у 1892.
БЕНІНСОН Нохім Гіршавіч, н. у 1898.
БЕНІНСОН Носым, н. у 1889.
БЕНЦЯНОВА Шура, н. у 1917.
БІТКОЎСКІ Уладзімір Іванавіч, н. у 1912.
БЛЮМ Зіна Саламонаўна, н. у 1900.
БЛЮМ Яша Іосіфавіч, н. у 1929.
БЛЮМ Соня Іосіфаўна, н. у 1931.
БЛЮМ Люба Іосіфаўна, н. у 1939.
БРАНСБУРГ Майсей Абрамавіч, н. у 1894.
БРОД Алтэр Самуілавіч, н. у 1875.
БРОД Міхля Ізраілеўна, н. у 1889.
БРОДКІН Аўрам Шэфелевіч, н. у 1872.
БЯРКОВІЧ Ара Давыдаўна, н. у 1878.
ВАЛАВІК Двейра Барысаўна, н. у 1893.
ВАЛАВІК Соня Львоўна, н. у 1925.
ВАЛАНСІН Ісак Лейбавіч, н. у 1873.
ВАЛЫНЕР Лейзар Ісакавіч, н. у 1885.
ВЯЛЬКОВІЧ Грыша Навумавіч, н. у 1894.
ГАЗДАНКЕР Лейба Рувімавіч, н. у 1915.
ГАМШЭЕВА Бася, н. у 1892.
ГАРАДОЎ Алтэр Майсеевіч, н. у 1884.
ГАРШАН Хаім, н. у 1890.
ГЕЛЕР Люба, н. у 1895.
ГЕЛЕР Давід Абрамавіч, н. у 1923.
ГЕЛЕР Лейзар Абрамавіч, н. у 1929.
ГЕЛЕР Абрам, н. у 1907.
ГІЛЬДЭНБЕРГ Ісак Лейзаравіч, н. у 1897.
ГІНДЗІН Эта Львовіч, н. у 1901.
ГІНДЗІН Якаў Хаімавіч, н. у 1927.
ГІСІН Мейлах, н. у 1896.
ГІСІН Ісак, н. у 1890.
ГОЛЬДБЕРГ Лёва Мееравіч, н. у 1891.
ГОЛЬДБЕРГ Гіта Шлёмаўна, н. у 1911.
ГРЫЗЕЛЬ Іосіф Андрэевіч, н. у 1911.
ГУРЭВІЧ Берэна, н. у 1900.
ГУРЭВІЧ Соня Львоўна, н. у 1918.
ДАБКІНА Хана Абрамаўна, н. у 1903.
ДАВІДАВА Хая Абрамаўна, н. у 1920.
ДЗІМЕНТ Цыва Львоўна, н. у 1907.
ДЗІНБАРГ Ліза Шлёмаўна, н. у 1903.
ДЗЯТКОВА Кацярына Іосіфаўна, н. у 1886.
ДОБІН Яфім Лейбавіч, н. у 1894.
ДОБІНА Рыва Мееравна, н. у 1908.
ДРАБКІНА Бася, н. у 1903.
ДРУКЕР Гірша, н. у 1876.
ДУБНІКАЎ Яша Аронавіч, н. у 1893.
ЕСІН Шлёма Абрамавіч, н. у 1894.
ЕЎЗЕЛЬМАН Абрам Пейсахавіч, н. у 1910.
ЗАДАВА Віта Львоўна, н. у 1910.
ЗАДАВА Сіма Наумаўна, н. у 1932.
ЗАДАЎ Меер Лейзаравіч, н. у 1900.
ЗАДАЎ Гірша Ісакавіч, н. у 1891.
ЗАДАЎ Залман, н. у 1883.
ІВАНОЎСКАЯ Марыя Іванаўна, н. у 1926.
ІЖЫНА Лёля Рыгораўна, н. у 1922.
ІЖЫН Федзя Рыгоравіч, н. у 1926.
ІЗРЫН Абрам Шмулевіч, н. у 1891.
ІТКІН Ізраіль Ісакавіч, н. у 1895.
КАБАНОЎ Іван Сцяпанавіч, н. у 1892.
КАГАН Лейба Давыдавіч, н. у 1891.
КАГАН Марголя Еселевіч, н. у 1894.
КАГАН Геня Лейбавіч, н. у 1907.
КАЗАКОЎ Рыгор Міхайлавіч, н. у 1923.
КАЗАКОЎ Міхаіл Мікалаевіч, н. у 1890.
КАПНІЦКІ Гірша, н. у 1886.
КАПШЫЦКІ Мендэль І., н. у 1880.
КАПШЫЦКАЯ Бася Мендэлеўна, н. у 1875.
КАТАРЖЫНСКАЯ Соня Ісакаўна, н. у 1890.
КАТАРЖЫНСКАЯ Вера Ісакаўна, н. у 1895.
КАЎФМАН Песя Лейбаўна, н. у 1890.
КАЎФМАН Аркадзій, н. у 1885.
КАЦ Якаў Лейзаравіч, н. у 1890.
КАЦМАН Соня Рыгораўна, н. у 1900.
КАЦМАН Леў Яфімавіч, н. у 1924.

КАЦМАН Ліза Яфімаўна, н. у 1930.
КАЧУРЫН Сара Мееравна, н. у 1890.
КАШЫН Файвель, н. у 1903.
КАШЫНА Бася Ісакаўна, н. у 1904.
КЕЙЛІН Мота Навумавіч, н. у 1930.
КЕЙЛІНА Ніна Навумаўна, н. у 1933.
КІЗІН Яфім Лейзаравіч, н. у 1873.
КІЗІНА Фаня Абрамаўна, н. у 1909.
КІЗІНА Рахіль Генадзьеўна, н. у 1927.
КІЗІН Айзік Генадзьевіч, н. у 1926.
КІЗІНА Галя Генадзьеўна, н. у 1932.
КІЗІН Генек Мееравіч, н. у 1906.
КЛЕБАНОЎ Гіля, н. у 1891.
КОКІН Хаім, н. у 1898.
КОКІН Барыс, н. у 1875.
КОКІН Сімон, н. у 1890.
КОКІНА Хана, н. у 1903.
КОКІНА Песя Гіршаўна, н. у 1897.
КОКІН Еся Абрамавіч, н. у 1891.
КРАСНЕР Файвель Барысавіч, н. у 1900.
КРОЛЬ Шая, н. у 1895.
КРОЛЬ Хома Саламонавіч, н. у 1907.
КРОЛЬ Лейба Барысавіч, н. у 1903.
КРЫВУЛІН Хоня Майсееўна, н. у 1894.
КУКУШКА Іван Пятровіч, н. у 1908.
КУЛЬБАЦКІ Іосіф Севасцьянавіч, н. у 1933.
КУРЧ Мітрафан Антонавіч, н. у 1893.
КУЎШЫНАЎ Максім Сцяпанавіч, н. у 1889.
ЛАПІС Ілья Беневіч, н. у 1898.
ЛАПІС Малка Ільінічна, н. у 1899.
ЛАПІС Соня Ісаеўна, н. у 1930.
ЛАПІС Чаша, н. у 1878.
ЛАПІС Маня Ісаеўна, н. у 1930.
ЛАПІС Ізя Ісаевіч, н. у 1928.
ЛАПІС Якаў Львовіч, н. у 1923.
ЛАПІС Янкель Яфімавіч, н. у 1897.
ЛАПІС Лея Ісакаўна, н. у 1900.
ЛЕВІН Шэна Барысавіч, н. у 1926.
ЛЕВІН Яфім Барысавіч, н. у 1928.
ЛЕВІН Ізя Барысавіч, н. у 1933.
ЛЕЙКІН Майсей, н. у 1900.
ЛЕЙКІН Лейба Ісакавіч, н. у 1896.
ЛІБКІНА Сара, н. у 1904.
ЛІТВІН Файвель, н. у 1885.
ЛІТВІН Алта Ісакаўна, н. у 1889.
ЛІЎШЫЦ Сара Паўлаўна, н. у 1902.
ЛІЎШЫЦ Шыціх Навумавіч, н. у 1894.
ЛЯСНІЧЫ Фелікс Андрэевіч, н. у 1895.
МАГДЭНКА Максім Віктаравіч, н. у 1925.
МАГІЛЕВІЧ Малка, н. у 1900.
МАГІЛЕВІЧ Соня Навумаўна, н. у 1920.
МАГІЛЕВІЧ Рыся Навумаўна, н. у 1922.
МАГІЛЕВІЧ Лёва Навумавіч, н. у 1927.
МАГІЛЕВІЧ Ілья Навумавіч, н. у 1926.
МАГІЛЕВІЧ Саша Навумавіч, н. у 1928.
МАГІЛЕВІЧ Цыпа, н. у 1893.
МАГІЛЕВІЧ Малка, н. у 1893.
МАГІЛЕВІЧ Хана, н. у 1891.
МАГІЛЕВІЧ Рыва Навумаўна, н. у 1903.
МАРГОЛІН Ісак, н. у 1886.
МАРОЗ Сара Ісакаўна, н. у 1891.
МАРОЗ Мендэль Абрамавіч, н. у 1879.
МАХОВЕР Маісей Шлёмавіч, н. у 1900.
МЕРКІН Ісак Лейзаравіч, н. у 1887.
МІНДЛІНА Сара Беркаўна, н. у 1905.
МІНДЛІН Лейба Ісакавіч, н. у 1905.
МІХАЙЛОЎСКІ Ілья, н. у 1901.
МОЦІНА Роза Гіршаўна, н. у 1924.
МЯНЦІНСКІ Іосіф, н. у 1907.
НІХАМКІНА Гіта, н. у 1900.
НІХАМКІНА Таня Давыдаўна, н. у 1923.
НІХАМКІНА Гіта Львоўна, н. у 1904.
НІХАМКІНА Хая З., н. у 1924.
НІХАМКІНА Оня З., н. у 1930.
НОТКІН Лейба, н. у 1895.
НЯЎСІХІНА Пая, н. у 1895.
ПАБОРЦАЎ Павел Елісеевіч, н. у 1883.
ПАЗЮК Рыва Саламонаўна, н. у 1891.
ПАЗЮК Мета М., н. у 1931.
ПАЙКІН Мендэль Эльевіч, н. у 1861.
ПАЙКІНА Рыся Беркаўна, н. у 1862.
ПАЛЯКАЎ Барух Львовіч, н. у 1890.
ПАПЕРЫН Хаім, н. у 1889.
ПАПКОЎ Георгій, н. у 1912.
ПАРФЁНАЎ Канстанцін Філімонавіч, н. у 1915.
ПАСТЭРЫН Хаім Самуілавіч, н. у 1890.
ПАТКІН Беня Эльевіч, н. у 1896.
ПЕРЛІН Леў, н. у 1895.
ПЕРЛІНА Іда Абрамаўна, н. у 1899.
ПЕРШЫН Якаў Абрамавіч, н. у 1875.
ПЕЎЗНЕР Якаў, н. у 1912.
ПЕЎЗНЕР Дана Ісакаўна, н. у 1923.
ПЕЎЗНЕР Міхаіл Ісакавіч, н. у 1931.
ПЕЎЗНЕР Міхаіл Ісакавіч, н. у 1932.
ПІНСКІ Яфім Лейзаравіч, н. у 1895.
ПЛІС Фрума Ізраілеўна, н. у 1912.
ПУХОВІЧ Зоя Бінамінаўна, н. у 1910.
ПУХОВІЧ Юлік Бінамінавіч, н. у 1936.
ПУХОВІЧ Бінамін Ісакавіч, н. у 1901.
ПУХОВІЧ Бася Ісакаўна, н. у 1900.
ПУХОВІЧ Яфім Файвелевіч.
ПЯЧЭРСКІ Давід Яфімавіч, н. у 1892.
РАЗЕНМАН СЯМЁН Львовіч, н. у 1882.
РАЗЕНМАН Рая Маркаўна, н. у 1898.
РАЗЕНМАН Леў Сямёнавіч, н. у 1925.
РАЗЕНМАН Алік Сямёнавіч, н. у 1933.
РАІНЧЫК Пётр Іванавіч, н. у 1913.
РАЙНШТЭЙН Роза, н. у 1900.
РАМАНОЎСКАЯ Кацярына Іванаўна, н. у 1887.
РАСКІН Аркадзій Яфімавіч, н. у 1904.
РАСКІН Уладзімір Яфімавіч, н. у 1907.
РАСКІНА Хася Абрамаўна, н. у 1904.
РАХІНШЭЙН Лейба, н. у 1883.
РОЗІН Бера, н. у 1900.
РУБІНАЎ Мейя Л., н. у 1878.
РЫЎКІНА Хая, н. у 1908.
РЫЎКІНА Майка, н. у 1892.
РЫЎКІН Яша Беркавіч, н. у 1924.
РЫЎКІН Ісак Лейзаравіч, н. у 1896.
РЫЎКІН Барыс Марголевіч, н. у 1896.
САГАН Саламон Ісакавіч, н. у 1869.
САГАНАВА Эстэр, н. у 1911.
САДОЎСКІ Лёва Абрамавіч, н. у 1912.
САКОВІЧ Сцяпан Піліпавіч, н. у 1915.
САХРЫН Беня, н. у 1897.
САХРЫНА Рыва Веньямінаўна, н. у 1889.

САХРЫН Сёма Навумавіч, н. у 1926.
САХРЫНА Брайна, н. у 1900.
САХРЫН Рува Лазаравіч, н. у 1923.
САХРЫН Ісак Лазаравіч, н. у 1939.
САХРЫНА Лея Веньямінаўна, н. у 1912.
САХРЫН Яфім Ільіч, н. у 1936.
САХРЫНА Соня, н. у 1915.
САХРЫН Валянцін, н. у 1936.
САХРЫНА Света, н. у 1937.
САХРЫН Беня, н. у 1899.
СІВЕРЫНАВА Антаніна Лаўрэнцьеўна, н. у 1915.
СКАВАРОДНІКАЎ Альтэр, н. у 1903.
СКАРАХОД Міра Міхайлаўна, н. у 1922.
СТАЛІПІНСКІ Мікалай Мацвеевіч, н. у 1917.
СТАЛІПІНСКІ Якаў Мацвеевіч, н. у 1920.
СТАЛЯРОЎ Мірон, н. у 1913.
СТУПІН Яўген Фёдаравіч, н. у 1917.
СУЛЬПАВАР Фіва, н. у 1913.
СУЛЬПАВАР Гірша, н. у 1912.
СУШКІНА Піня, н. у 1900.
СУШКІН Залман, н. у 1896.
СУШКІН Хоня Абрамавіч, н. у 1875.
ТАПКІНА Соня Абрамаўна, н. у 1913.
ТАПКІН Вова Мойшавіч, н. у 1928.
ТАПКІН Берук Мойшавіч, н. у 1929.
ТАПКІН Леў Саламонавіч, н. у 1934.
ТАРУГ Міхаіл Рыгоравіч, н. у 1902.
ТАРУГ Бася Маркаўна, н. у 1903.
ТАРУГ Яфім Міхайлавіч, н. у 1936.
ТАРУГ Якаў Міхайлавіч, н. у 1937.
ТРАПЕР Майсей, н. у 1893.
ТРАПЕР Яша, н. у 1886.
ТРОСЦІН Яфрэм Маркавіч, н. у 1902.
УХНАЛЁЎ Майсей Герасімавіч, н. у 1879.
УШЛІЦ Стэрна, н. у 1869.
ФАЙН Ісак Львовіч, н. у 1902.
ФЕЛЬДМАН Абрам Лейзаравіч, н. у 1915.
ФЕЛЬДМАН Яша Навумавіч, н. у 1927.
ФЕЛЬДМАН Нохім Абрамавіч, н. у 1898.
ФЕЛЬДМАН Іосіф Беркавіч, н. у 1884.
ФЕЛЬДМАН Роза Беркаўна, н. у 1883.
ФІЛЕР Гірша, н. у 1899.
ФЛЕЯР Гірша, н. у 1893.
ФЛЕЯР Навум Якаўлевіч, н. у 1863.
ФЛЕЯР Рэня, н. у 1906.
ФЛЕЯР Рува Лейзаравіч.
ХАЗАНАВА Лея, н. у 1905.
ХАЛІНСКІ Давід Львовіч, н. у 1899.
ХАСІД Янкель М., н. у 1885.
ХАСІД Гіта Ізраілеўна, н. у 1895.
ХОЗАК Марыя, н. у 1885.
ХОЗАК Максім, н. у 1863.
ХРАПОВІЦКІ Анатоль Францавіч, н. у 1924.
ЦАПКІНА Роза Ісакаўна, н. у 1926.
ЦАПКІНА Малка Лейбаўна, н. у 1892.
ЦАПКІН Берка, н. у 1893.
ЦЭЙТЛІН Ілья Мендэлевіч.
ЦЭЙТЛІН Абрам, н. у 1900.
ЦЭМЕХМАН Рахмейра, н. у 1895.
ЦЭМЕХМАН Лёва, н. у 1925.
ЦЭМЕХМАН Іда Ісакаўна, н. у 1898.
ЧАРНЫ Іосіф Сямёнавіч, н. у 1941.
ЧАРНАЯ Аня Сямёнаўна, н. у 1939.
ЧАРНЫ Ліпа, н. у 1869.
ЧАРНАЯ Мера Лейбаўна, н. у 1904.
ЧАРНЫ Сёма Лейбавіч, н. у 1932.
ЧАРНАЯ Песя Абраўна, н. у 1900.
ЧЭРНІН Гіля Абрамавіч, н. у 1887.
ЧЭРНІН Абрам, н. у 1893.
ШАВЕЛЬС Давід Нохімавіч, н. у 1875.
ШАПІРА Перла Міхайлаўна, н. у 1928.
ШАПІРА Міхаіл Міхайлавіч, н. у 1883.
ШАПІРА Хая Беркаўна, н. у 1885.
ШАПІРА Барыс І., н. у 1927.
ШАРКОЎ Кірыл Міхайлавіч, н. у 1912.
ШАРКОЎ Уладзімір Фёдаравіч, н. у 1922.
ШВАРЦ Лейвік Лейбавіч, н. у 1896.
ШВАРЦ Сара, н. у 1875.
ШВАРЦ Муся Саламонаўна, н. у 1906.
ШВАРЦ Хая Львоўна, н. у 1926.
ШМІТ Рыва А., н. у 1918.
ШНІЦЭР Соня Навумаўна, н. у 1887.
ШНІЦЭР Ніна Барысаўна, н. у 1920.
ШНІЦЭР Абрам Львовіч, н. у 1896.
ШУМІН Хаім Абрамавіч, н. у 1894.
ШУМІН Абрам, н. у 1913.
ШУМІН Эля, н. у 1875.
ШУМІН Піня, н. у 1898.
ШУМІН Абрам Ісакавіч, н. у 1898.
ШУР Сара, н. у 1889.
ШУР Міша Беркавіч, н. у 1928.
ШУР Хая Саламонаўна, н. у 1904.
ШУР Якаў Яфімавіч, н. у 1927.
ШУСТЭРМАН Бейя, н. у 1879.
ШЭЙНІН Яша, н. у 1905.
ШЭЙХЕТ Ісак Пінявіч, н. у 1912.
ЭСКІН Абрам Львовіч, н. у 1912.
ЭСКІН Янкель, н. у 1901.
ЭСТРЫН Абрам Львовіч, н. у 1903.
ЭСТРЫН Гірша, н. у 1907.
ЭСТРЫНА Сара Яфімаўна, н. у 1905.
ЭСТРЫНА Лея А., н. у 1882.
ЭСТРЫНА Мейта, н. у 1925.
ЭСТРЫН Шлёма Лейзаравіч, н. у 1900.
ЯЎЗЕЛЬМАН Абрам Пейсахавіч, н. у 1910.

Па даных камісіі, у спісы расстраляных не ўвайшло 20 ваеннапалонных. Іх імёны засталіся невядомымі.

Спісы падрыхтавалі
Н. Ільюшэнка, А. Турбінскі

Пра тых, хто прапаў без вестак

Як многа на Беларусі сем'яў, дзе боль страты да гэтай пары не сціхае. У гэтыя сем'і прыйшлі не пахавальныя, а ўсяго толькі паведамленні: прапаў без вестак. І такіх сотні тысяч. У першыя гады ваеннага ліхалецця, 1941—1942, тых, хто прапаў без вестак, загінула больш, чым тых, каго пахавалі пасля бою, у тылавым шпіталі, чыя смерць засведчана па ўсіх правілах у спісе беспаваротных страт.

Невядомымі гінулі салдаты, якія прынялі на сябе першы агнявы шквал. Яны паляглі на прыграніччы, пры адступленні і акружэнні цэлымі палкамі і дывізіямі. Ніхто не бачыў іх мёртвымі: лётчыкаў, што не вярталіся з баявога задання, разведчыкаў, якія гінулі ў тыле ворага без сведак, пехацінцаў, ад якіх не заставалася і следу пры пападанні снарадаў і бомбаў ці якіх жывымі засыпала ў траншэях. Гінулі ў партызанскіх атрадах і ў антыфашысцкім падполлі, на сваёй зямлі і на чужыне.

Цаной свайго жыцця яны знішчалі ворага. Без іх не было б Перамогі.

Асобным радком у гэтым пераліку — палон, лагеры, дзе бясследна знікалі сотні тысяч паланёных у баях воінаў.

Удовам і маці ваенкаматы давалі афіцыйныя тлумачэнні: прапаўшыя без вестак — гэта тыя, хто ў ходзе баявых дзеянняў не вярнуўся ў свае падраздзяленні, хаця большасць з іх загінула. Але баявыя абставіны не дазвалялі ўстанавіць гэта.

Не ведаючы пра месца пахавання роднага чалавека, немагчыма пахаваць яго ў сваім сэрцы. Людзі працягваюць шукаць і ў шэрагу выпадкаў знаходзяць сведак — аднапалчан, якія аднаўляюць падрабязнасці гібелі. Бывае, што знаходзяць і магілы.

На помніках ў вёсках, райцэнтрах, адкуль людзі ішлі на вайну, не заўсёды сустракаюцца імёны прапаўшых без вестак, расстраляных, памёршых ад голаду і здзекаў у канцлагерах.

Гэтую несправядлівасць, хоць і са спазненнем, выпраўляюць нашы кнігі — гісторыка-дакументальныя хронікі Памяці.

У. Лемяшонак

1945

ДА НАШЫХ ДЗЁН

У МІРНАЙ ПРАЦЫ

Час адраджэння

У абставінах, якія склаліся пасля выгнання акупантаў з тэрыторыі раёна, першараднай задачай паўстала хутчэйшае аднаўленне дзейнасці органаў савецкай улады, партыйных арганізацый, гаспадарчых і прафсаюзных органаў, камсамола, ад чаго залежаў поспех усёй дзейнасці па аднаўленні народнай гаспадаркі і аказанні дзейснай дапамогі Чырвонай Арміі. Вырашэнню праблемы падбору кадраў для работы ў вызваленчых раёнах надавалася асабліва важнае значэнне. У ліпені — жніўні 1944 г. пры расфарміраванні партызанскіх брыгад і атрадаў на партыйную, савецкую, гаспадарчую работу былі накіраваны дзесяткі былых камандзіраў, сакратароў падпольных райкомаў партыі і камсамола, работнікаў народнай асветы, медыкаў. Было вылучана таксама нямала радавых партызан і партызанак, камуністаў і беспартыйных, якія добра зарэкамендавалі сябе, праявілі ў барацьбе з ворагам.

Сакратаром Шклоўскага раённага камітэта партыі пасля вызвалення раёна стаў працаваць па накіраванні абласнога камітэта партыі Н. С. Гараднякоў. Яго неўзабаве адклікалі на іншую работу, а партарганізацыю раёна ўзначаліў былы сакратар Круглянскага падпольнага райкома Ф. С. Новікаў. Сакратарамі РК КП(б)Б працавалі І. С. Шчарбакоў, А. П. Масальская. Загадчыкам аргадзела быў Д. Г. Галанаў, аддзела прапаганды і агітацыі — І. В. Кулікоў. Выканком райсавета ўзначальваў Р. Я. Зусман. У састаў выканкома ўваходзілі І. П. Аляксееў, І. Н. Філіпаў, М. Е. Уланаў (начальнік аддзела НКДБ) і інш. 24 ліпеня 1944 г. адбыўся першы пасля вызвалення раёна сход партыйна-камсамольскага актыву. На ім была абмеркавана пастанова ЦК ВКП(б) і СНК СССР «Аб уборцы ўраджаю і нарыхтоўках сельскагаспадарчай прадукцыі ў 1944 годзе». З дакладам выступіў Ф. С. Новікаў.

* * *

Вайна яшчэ працягвалася, і лозунг «Усё для фронту!» заставаўся злабадзённым для жыхароў вызваленага раёна. Канкрэтнымі крокамі яго ператварэння на справе былі арганізаванае правядзенне ў кароткія тэрміны мабілізацыі грамадзян 1894—1926 гадоў нараджэння, адкамандзіраванне ў дзеючыя войскі партызан пасля расфарміравання атрадаў ВАГ, падрыхтоўка баявых рэзерваў для фронту. Было ўведзена абавязковае абучэнне ваеннай справе дарослых мужчын, а таксама дапрызыўнікаў у школах. Разгортвалася работа арганізацый Асаавіяхіма і Чырвонага Крыжа на прадпрыемствах, у калгасах, МТС, установах. Мабілізацыя людскіх рэсурсаў і баявых рэзерваў з'яўлялася ўсенароднай патрыятычнай справай, была важнай крыніцай папаўнення Чырвонай Арміі, яе падтрымкі.

Яркімі праявамі патрыятызму працоў-
іх раёна з'яўляліся масавы ўдзел
аднаўленні і рамонце мастоў, дарог,
нгункі, у зборы прадуктаў харчавання
я франтавікоў, сродкаў для стварэння
і рамонту баявой тэхнікі, у напружанай
і нялёгкай справе аднаўлення работы
прадпрыемстваў, калгасаў, МТС. Кра-
самоўнае сведчанне таму — старонкі ра-
ённай газеты таго часу.

РАДКІ З ГАЗЕТЫ

На пабудову самалёта «Камсамолец Шклоўшчыны»

Не забудзем той радасны і шчаслівы дзень, калі гордыя воіны 2-га Беларускага фронта вызвалілі наш раён ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў...

Мы, камсамольцы Гарадзецкага сельсавета, уносім са сваіх асабістых запасаў 6000 руб лёў для пабудовы самалёта «Камсамолец Шклоўшчыны» і перадаём яго доблесным воінам 2-га Беларускага фронта... Мы заклікаем усіх камсамольцаў, моладзь і працоўных раёна прыняць актыўны ўдзел у пабудове самалёта.

Гелахава В. Е., Ракава В. А., Новікава Н. З., Новікава О. З., Котава Е. І., Ярмоленка О. М., Ярмоленка Е. Н., Ціханава Э. А., Сліжыкава Е. Д., Карнее ва М. І., Лаўрова М. Н., Кулачкова М. К., Гурынаў Н. Т., Васількова В. Т.

«Чырвоны барацьбіт». 1945. 14 студзеня.

Мітынг калектыву райпрамкамбіната

З вялікай увагай рабочыя і служачыя прадпрыемства выслухалі даклад аб бліскучых поспехах Чырвонай Арміі на франтах Айчыннай вайны... Намеснік дырэктара райпрам камбіната т. Паўловіч заявіў:

— Наш калектыў дружна і самаадданa папрацаваў у 1944 г., выканаўшы праграму на 150 %, заваяваў у сацыялістычным спаборніцтве прамкамбінатаў вобласці пераходны Чырвоны сцяг абкома і аблвыканкома і атрымаў першую прэмію 10 000 руб. Не здаём тэмпаў і ў студзені 1945 г. Асобныя цэхі выканалі месячны план за 20 дзён.

...У адказ на поспехі франтавікоў мы будзем працаваць яшчэ лепш і сваімі сродкамі будзем дапамагаць фронту. Тут жа, на мітынгу, было сабрана на будаўніцтва танкаў больш за 5 тыс. руб. Калектыў рабочых вырашыў адлічыць 50 працэнтаў ад месячнай зарплаты рабочых і служачых на будаўніцтва танкаў для войск 2-га Беларускага фронта.

«Чырвоны барацьбіт». 1945. 26 студзеня.

На танк «Баявая падруга»

З вялікай актыўнасцю жонкі афіцэраў удзельнічаюць у зборы сродкаў на танк «Баявая падруга» для перадачы байцам 2-га Беларускага фронта. За апошнія некалькі дзён да слаўнай гадавіны Чырвонай Арміі сабрана звыш 50 000 руб.

Ініцыятыву і актыўнасць у зборы сродкаў праяўляюць члены жансавета пры райваенкамаце Някрасава А., жонкі афіцэрскага саставу Булановіч (г. Шклоў), Сёмчанка Ліза (Уланаўскі сельсавет), Шыраноўская (Старасельскі сельсавет).

«Чырвоны барацьбіт». 1945. 25 лютага.

Падарункі франтавікам

З вялікім уздымам прайшоў агульнагарадскі мітынг, прысвечаны падрыхтоўцы да 27-й гадавіны Чырвонай Арміі... Актывістка, маці двух франтавікоў, Моцная Т. заявіла:

— Нашы доблесныя воіны імкліва набліжаюцца да логава фашысцкага звера — Берліна... Каб дастойна сустрэць вялікае свята савецкага народа, мы не павінны аставацца ў даўгу перад нашымі сынамі і братамі, якія нясуць сцяг перамогі ў Берлін. Я падрыхтую для франтавікоў падарункі і даю 200 рублёў для параненых байцоў падшэфнага нам шпіталя.

Яе прапанову падтрымалі жонкі франтавікоў Булановіч і Майсеенка.

Мітынг аднадушна прыняў рашэнне — да 21 лютага сабраць сродкі, прадукты, цёплае адзенне, іншыя рэчы для ўручэння байцам падшэфнага шпіталя.

«Чырвоны барацьбіт». 1945. 15 лютага.

* * *

Працоўныя горада і раёна сабралі на пабудову танкаў больш за 360 тысяч рублёў уласных зберажэнняў. Пачын камсамольцаў і моладзі Гарадзецкага сельсавета аб пабудове самалёта «Камсамолец Шклоўшчыны» першымі ў горадзе падтрымалі камсамольцы, настаўнікі і вучні 2-й сярэдняй школы. Яны сабралі больш за 2000 рублёў. А калектывы арцеляў прамкааперацыі «Аб'яднаная праца» адлічылі ад сваіх зберажэнняў 10 000 рублёў на пабудову самалёта і танкаў. Работнікі райпрамкамбіната Паўлоўскі, Лучкоў, Бяляй і іншыя на гэтыя мэты ўнеслі па 200—250 рублёў.

Адначасова партыйныя і савецкія органы, службы раёна праяўлялі клопат пра першую пасля вызвалення ўборку ўраджаю. На дапамогу сельскім працаўнікам паспяшаліся гараджане. У выніку 5 верасня быў пададзены рапарт аб выкананні плана продажу зерня дзяржаве на 101 %. Акрамя таго, у фонд Чырвонай Арміі адпраўлена 17 тысяч пудоў хлеба.

Адным з характэрных паказчыкаў у ліквідацыі рэшткаў акупацыі ў першыя месяцы пасля вызвалення з'яўляецца аднаўленне школ і ўстаноў аховы здароўя. У першым навучальным годзе пачалі працаваць 106 сярэдніх, сямігадовых і пачатковых школ. У райцэнтры і многіх вёсках аднавілі работу бальніцы, амбулаторыі і медыцынскія пункты. Адчыніліся культурна-асветныя ўстановы, два дзіцячыя дамы, дом інвалідаў і састарэлых, дзіцячы садок і яслі. З прамысловых прадпрыемстваў горада аднавілі работу калектывы райпрамкамбіната і дзвюх швейных майстэрань. 5 ліпеня 1944 г. пачалося аднаўленне паляшшэнні жыллёвых умоў працаўнікоў горада і вёскі. За 8 месяцаў пасля вызвалення метадам народнай ініцыятывы адрамантавана 828 дамоў і 206 дамоў пабудавана зноў. Вось адна са шматлікіх публікацый на гэтую тэму ў раённай газеце.

Адбудаваны 23 дамы

Зусім зруйнавалі фашысцкія варвары вёску Гаваракі. Поўнасцю спалены ўсе дамы і гаспадарчыя пабудовы. Калгаснікі былі вымушаны жыць у наспех зробленых зямлянках.

Партыя і савецкі ўрад аказалі вялікую дапамогу калгаснікам у адбудаванні вёскі, выдзеліўшы доўгатэрміновыя крэдыты і будаўнічыя матэрыялы. Адбудавана 23 дамы калгаснікам, у тым ліку сям'і воіна Савецкай Арміі — Собалева Сяргея, дэмабілізаванаму воіну Собалеву Фёдару і калгаснікам Негіпаву Міхаілу, Біткоўскай Дар'і і іншым, якія жылі ў зямлянках. Пабудаваны зруб калгасніцы Рыськовай Ганне, падвезены матэрыялы для будаўніцтва яшчэ двух зрубаў.

М. Фёдараў

«Чырвоны барацьбіт». 1947. 3 ліпеня.

Аднаўленне сельскіх Саветаў

Адразу пасля вызвалення раёна ад нямецкіх акупантаў было створана 24 сельскія Саветы: Александрыйскі, Ардацкі, Высоцкі, Вяліка-Лазіцкі, Гарадзецкі, Гарадзішчанскі, Дарэчна-Шклоўскі, Заходскі, Каменна-Лаўскі, Княжыцкі, Нова-Брашчынскі, Мікіціцкі, Нічыпаравіцкі, Падгайцаўскі, Рыжкавіцкі, Славенскі, Сліжоўскі, Стара-Вадвянскі, Старасельскі, Таўкачоўскі, Уланаўскі, Чарнаруцкі, Чарнянскі, Фашчаўскі.

Калгасы раёна. 1947 г.

Александрыйскі сельсавет: «Запаветы Ільіча», імя Варашылава, імя Калініна, імя Луначарскага, імя Молатава, «Колас», «Новы быт», «Новы шлях», «Перамога», «Серп і молат», «Чырвоны штурм», «Энергія».

Ардацкі сельсавет: імя Дзяржынскага, імя Калініна, імя Леніна, імя Свярдлова, імя Сталіна, «Новы свет», «Пяцігодка ў чатыры гады».

Высоцкі сельсавет: імя Будзённага, імя Варашылава, імя Дзяржынскага, імя Леніна, імя Сталіна, «1 Мая», «Працаўнік», «17 год Кастрычніка», «Ульянка», «Чырвоная змена», «Чырвоная паляна», «Чырвоны Кастрычнік».

Вяліка-Лазіцкі сельсавет: «Ленінскі шлях», «Новае жыццё», «Перамога», «Рассвет», «Чырвоны Перакоп».

Гарадзецкі сельсавет: «Другая пяцігодка», імя Фрунзе, «Іскра», «Прамень вяку

нізму», «Ударнік Беларусі», «Чырвоны ўдарнік».

Гарадзішчанскі сельсавет: «Барацьба за сацыялізм», імя Будзённага, «Новы шлях», «Новыя Русакі», «Пралетарый», «Прамень», «Прамень Кастрычніка», «Шлях будаўніка», «Чырвоная зорка», «Чырвоны араты».

Зарэчна-Шклоўскі сельсавет: «Другая пяцігодка», «Запаветы Леніна», імя Максіма Горкага, «Прамень другой пяцігодкі», «Пражэктар», «Пуцілавец», «VII з'езд Саветаў».

Заходскі сельсавет: «Бальшавік Дняпра», імя Молатава, «Перамога», «VII з'езд Саветаў», «Чырвоны Асавец», «Чырвоны Кастрычнік».

Каменна-Лаўскі сельсавет: імя Кірава, імя Куйбышава, «Перамога», «Шлях камунізму», «Шлях Саветаў», «Чырвоны Гарадок».

Княжыцкі сельсавет: «Звязда», імя Калініна, імя Сталіна, «Новы шлях», «Перамога», «Чырвоны Гарадзец».

Мікіцініцкі сельсавет: імя Варашылава, імя Леніна, «Перамога», «1 Мая», «Рассвет», «Чырвоная змена», «Чырвоны шлях».

Нова-Брашчынскі сельсавет: «Барацьба», імя Калініна, імя Шмідта, імя Чалюскіна, «Новае жыццё», «Перамога», «1 Мая», «Прамень Кастрычніка», «Чырвоны араты», «Чырвоны шлях».

Нічыпаравіцкі сельсавет: «20 год БССР», імя Будзённага, «Перамога», «Ударнік», «Чырвонае Сормава», «Чырвоная зорка».

Падгайцаўскі сельсавет: «Барацьба», «Другая пяцігодка», імя Варашылава, «Новы быт», «Шлях сацыялізму».

Рыжкавіцкі сельсавет: імя Валадарскага, імя Варашылава, імя Кірава, імя Леніна, «Іскра», «Новы Гарадок», «Праўда», «Чырвоная ніва», «Усход», «Чырвоны Гарадок», «Чырвоны партызан», «Шлях сацыялізму».

Славенскі сельсавет: імя Кірава, «Ільіч», імя Дзяржынскага, «Молат», «Новае жыццё», «1 Мая», «Працавік», «Ударнік».

Сліжоўскі сельсавет: імя Кірава, «Калгаснік Беларусі», «Камінтэрн», «Камунар», «Новы шлях», «1 Мая», «Шлях Леніна», «Чырвоныя Сліжы».

Стара-Вадвянскі сельсавет: «Барацьба», «Беларусь», «Зара», імя Варашылава, імя Сталіна, «Новае жыццё», «Перамога», «15 год Кастрычніка», «Шлях пралетарыяту», «Чырвоны сцяг».

Старасельскі сельсавет: «Бальшавік», «Барацьба», «Зара», імя Варашылава, «Новае жыццё», «Новы лад», «Новы свет», «Перамога», «1 Мая», «Прагрэс», «Пралетарый», «Рассвет», «Сацыялізм», «Ураджай», «Уперад», «Чырвоны Кастрычнік».

Таўкачоўскі сельсавет: «Арлен», імя Варашылава, імя Леніна, «Кастрычнік», «Новы быт», «Рассвет», «Чырвоны змагар», «Чырвоны партызан».

Уланаўскі сельсавет: «20 год БССР», імя Будзённага, імя Варашылава, імя Дзяржынскага, імя Калініна, імя Красіна, імя Сталіна, «Пэўны шлях», «Чырвоны Кастрычнік».

Чарнаруцкі сельсавет: «Вольная праца», імя Войкава, імя Леніна, «Калектыўная праца», «Ленінскі шлях», «Новы лад», «Трактар», «Чырвоная Горка», «Чырвоная зорка», «Чырвоная ніва», «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны рубеж», «Чырвоны ўдарнік».

Чарнянскі сельсавет: «Аб'яднаная праца», «Другая пяцігодка», імя Карла Маркса, імя Молатава, «Новыя Аўчыненкі», «Орка», «Шлях пралетарыяту», «Чырвоны Кастрычнік», «Чырвоны сцяг».

Фашчаўскі сельсавет: «Першая пяцігодка», «XVII партз'езд», «Спартак», «Шлях сацыялізму», «Чырвоны араты».

Узнятыя з папялішчаў

За тры гады часовай акупацыі гітлераўцы нанеслі Шклову і раёну страты на мільёны рублёў. Былі спалены ці разбураны ўсе прамысловыя прадпрыемствы і адміністратыўныя памяшканні, каля трох тысяч жылых дамоў, 4 сярэднія, 10 сямігадовых і 14 пачатковых школ. У калгасах знішчана ўсё пагалоўе жывёлы і коней.

Пасля вызвалення раёна мне давялося працаваць старшынёй выканкома райсавета дэпутатаў працоўных. У той час здавалася, што на аднаўленне разбуранай ворагам народнай гаспадаркі раёна спатрэбяцца дзесяткі гадоў. Але патрыятызм і ініцыятыва савецкіх людзей рабілі сапраўдныя цуды. Сотні людзей, якія не маглі граміць ворага са зброяй у руках, не шкадавалі сіл, каб пусціць у строй прамысловыя прадпрыемствы, вывесці людзей з цёмных і сырых зямлянак, адкрыць школы і медыцынскія ўстановы, ачагі культуры і дзіцячыя дашкольныя ўстановы.

У першую чаргу былі адноўлены ўсе 205 калгасаў. Хлебаробы з дапамогай гараджан паспяхова ўбралі ўраджай і першымі ў вобласці рапартавалі аб выкананні плана збожжанарыхтовак. Летам 1944 г. былі адноўлены 3 машынна-трактарныя станцыі. Яны мелі 15 трактароў і 5 грузавых аўтамабіляў. Буйнейшую з іх — Шклоўскую МТС — узначаліў былы партызан Фядот Міхайлавіч Лукашэнка. Па выніках работы ў 1945 г. калектыў яе заваяваў першае месца ў вобласці...

Работы па аднаўленні папяровай фабрыкі «Спартак» і льнозавода пачаліся напачатку ліпеня 1944 г., а ў канцы 1948 г. яны далі першую прадукцыю. Яшчэ раней пачалі працаваць прамысловыя арцелі «Адраджэнне», «Чырвоны інвалід», «Чырвоны бондар», прамкамбінат райспажыўсаюза.

...Ужо ў першы пасляваенны год у раёне працавала 106 агульнаадукацыйных школ, 4 дзіцячыя дамы, 2 дзіцячыя садкі, раённы Дом культуры, 24 хаты-чытальні, раённая бальніца. Усяго 3 гады спатрэбілася, каб перавесці ўсе сем'і з зямлянак у жылыя дамы. На 1 студзеня 1948 г. быў дасягнуты даваенны ўзровень па колькасці фермаў буйной рагатай жывёлы, коней, авечак і птушкі, а таксама па асваенні пасяўных плошчаў.

Актыўнымі арганізатарамі аднаўлення народнай гаспадаркі раёна былі выканкомы гарадскога і сельскіх Саветаў, партыйныя і камсамольскія арганізацыі, а таксама былыя старшыні выканкомаў сельскіх Саветаў І. А. Давідовіч, В. Я. Літвінаў, Ф. М. Баланкоў, А. Т. Хаткевіч, дырэктары МТС І. Н. Сенакосаў, К. А. Шкуратаў, старшыні калгасаў М. П. Аладдзеў, М. І. Шпакаў і інш.

Р. Зусман. «Ударны фронт». 1979. 7 лістапада.

Дом, у якім ядналіся сэрцы

Шклоўскі дзіцячы дом № 2 дзейнічаў з 1945 па 1969 г. У пачатку 1947 г. мой бацька Пётр Аляксандравіч Грудзіна прыехаў у Шклоў на пасаду дырэктара гэтай дзіцячай установы. Разам з ім прыехала і мая будучая маці Надзея Мікіцічна Гуцол. На працягу 18 гадоў працаваў бацька ў дзіцячым доме.

Ён быў створаны на базе ўцалелых будынкаў даваеннай пачатковай школы. У цяперашні час тут размешчаны дзіцячая турыстычная база і дзіцячы садок № 3. Тады ж было ў дзіцячым доме звыш 200 сірот. Пра іх жыццё і быт расказвае Вера Сямёнаўна Алянькова, якая працавала выхавальніцай у дзіцячым доме 23 гады.

— У 1946 г. я прыехала працаваць у Шклоўскі дзіцячы дом № 2. Даручылі групу дзяцей дашкольнага ўзросту. У самой былі хворыя ногі, якія абувала ў гумавыя галёшы, сшытыя дротам, апраналася таксама вельмі сціпла. Дзяцей прывозілі да нас адусюль, у тым ліку знаходзілі ў лясах, разбітых вагонах. Яны былі паўраспрануты, галодныя, плакалі за кожную скарынку хлеба. Добра памятаю першых сваіх дзяцей Веру Купрэеву, Аню Бярозка, Таню Маргунову, Аркадзя Бачкарова. Вечары праходзілі пры капцілках. Дзеці спалі па двое «валетам». У пакоях было холадна, таму клаліся спаць у вопратцы і шапках. Печы палілі торфам, які прывозілі на адзіным сляпым кані па мянушцы Баян. Каб неяк забяспечыць дзяцей абуткам, па начах пад кіраўніцтвам кастэлянкі Фрузы са старых палітo шылі буркі. Купалі выхаванцаў у драўляных шайках і толькі старэйшых вадзілі ў гарадскую лазню.

Прывезеныя дзеці часам уцякалі, і на гэта ў кожнага была свая прычына. Памятаю, збеглі два хлопчыкі — браты. Знайшлі іх на станцыі Орша. На пытанне, чаму пайшлі з дзіцячага дома, пачулі адказ: «Трэба да мамы на магілку з'ездзіць».

...З часам умовы быту, вучобы і адпачынку дзяцей значна паляпшаліся. У 1954 г. у падсобнай гаспадаркі ўжо было 5 коней, столькі ж галоў буйной рагатай жывёлы, каля 20 свіней, аўтамашына ЗІС-5. Самы актыўны ўдзел ва ўсіх работах па рамонту памяшканняў, мэблі, добраўпарадкаванні тэрыторыі, іншай гаспадарчай дзейнасці прымалі непасрэдна самі выхаванцы. У плане работы дзіцячага дома на 1959 г. можна прачытаць: «Сіламі выхаванцаў адрамантаваць да новага навучальнага года ўсю мэблю, зрабіць скрынкі для чарнільніц, прадоўжыць работу на агародзе ў адпаведнасці з існуючым замацаваннем груп па ўчастках...»

Шмат сіл давялося затраціць, каб займець шэфаў. Удалося ўстанавіць цесныя сувязі з авіяцыйнай вайсковай часцю пасёлка Бал басава Аршанскага р-на. Ваенныя лётчыкі разам са сваімі сем'ямі часта бывалі ў дзяцей, прывозілі падарункі, выступалі з канцэртамі. З іх дапамогай удалося набыць духавыя інструменты, безумоўна, з таго часу ўсе святы праходзілі ў суправаджэнні духавой музыкі.

З часам ствараецца сталярная майстэрня. У ёй хлопцы выраблялі мэблю, дзверы, аконныя рамы, цацкі для гарадскіх дзіцячых садкоў. Абучаў іх гэтай справе Ільіч Саламонавіч Гальперын. Пад кіраўніцтвам жа Вольгі Аляксееўны Кіберавай дзяўчаты

Выкладчыкі і выхаванцы дзіцячага дома № 2. На здымках: П. А. Грудзіна каля дзіцячага дома; група супрацоўнікаў: (1-ы рад зверху) шафёр Ф. Н. Купцоў, выхавальніцы В. С. Алянькова, М. В. Аўтухова, Л. З. Купрэева, завуч А. А. Сараева, медсястра М. Н. Аляксандрава, заг. гасчасці М. Е. Зайцаў, (2-гі рад) выхавальніца В. А. Нагіпава, касір Н. В. Кунцова, повар Г. І. Парфёнава, медсястра М. Ф. Фёдарава, кастэлянка П. Лявонава, загадчыца склада А. В. Догман, (3-і рад) выхавальніца П. Я. Каралёва, завуч І. Я. Каралёў, П. А. Грудзіна, Н. Н. Грудзіна, бухгалтар А. Н. Лянская, (4-ы рад) выхавальніцы А. Гутарава, А. І. Аўраменка, музработнік А. П. Сербантовіч, выхавальніца Л. І. Даманькова, важатая А. П. Сенакосава; дырэктар з 1-м наборам; у час турыстычнага паходу

вучыліся шыць сукенкі, навалачкі, чахлы на коўдры, іншыя патрэбныя рэчы.

З выхаванцамі праводзілася вялікая спартыўна-аздараўленчая работа, працавалі гуркі па інтарэсах, была мастацкая самадзейнасць. Выхаванцы ўдзельнічалі ў турыстычных паходах у Магілёў, Оршу, Горкі. Было ўсё неабходнае для заняткаў фатаграфіяй. Набылі радыёлу, магнітафон, кінаапарат. Стала магчымым глядзець кінафільмы непасрэдна ў дзіцячым доме. А папулярнасць кіно была вельмі вялікай.

За гады, праведзеныя ў дзіцячым доме, у супрацоўнікаў і выхаванцаў складваліся пэўныя адносіны, якія вызначаліся не толькі належным узроўнем узаемаразумення, але і нейкім асаблівым даверам адзін да аднаго.

...Безумоўна, усё, што адбывалася ў дзіцячым доме, было ў полі зроку яго дырэктара. Шмат спраў штодзённа праходзіла праз яго рукі. Колькі сябе памятаю, прачнуся раніцай, а бацькоў ўжо дома няма. У сям'і ведалі, што на золку ён ідзе на пад'ём, вечарам — на адбой. Да нас часта дадому заходзілі супрацоўнікі, рэгулярна бывалі дзеці-сіроты, прыходзілі бацькі тых, у каго яны адшукваліся. Сям'я жыла тымі ж клопатамі, што і калектыў дзіцячага дома.

...З часам рэха вайны адыходзіла ўсё далей, дзяцей-сірот станавілася менш, і ў 1969 г. Шклоўскі дзіцячы дом № 2 быў зачынены, праіснаваўшы 24 гады. Але дружба, распачатая ў яго сценах, працягваецца да цяперашняга часу. Многія выхаванцы паранейшаму падтрымліваюць цесную сувязь паміж сабой і былымі супрацоўнікамі.

А. Грудзіна

АБ СТАНЕ РАЁНА НА 1.01.1952 г.

Территория — 1293 кв. км. Население — 59 551 чел., в том числе сельского — 53 350, городского — 6201 чел. Трудоспособного населения — 18 828 чел., в том числе мужчин — 5869, женщин — 12 956. Сельсоветов — 24, в них нас. пунктов — 260, горсовет — 1. Колхозов до объединения — 205, после объединения — 55. МТС — 4.

Предприятия: ф-ка «Спартак», льнозавод, раймаслопром, типография, райпромкомбинат, артелей (местной промышленности) — 7.

Школ в районе — 122 (9 СШ, 19 семилетних, 90 начальных и 4 вечерних), учащихся в них — 14 322. Библиотек — 19, изб-читален — 25, клубов — 49, красных уголков — 19. Радиоузел обслуживал 1097 радиоточек, в том числе на селе — 829.

Больниц — 2, фельдшерско-акушерских пунктов — 16, амбулаторий в сельской местности — 4. Врачей в районе — 28, среднего медперсонала — 137. Зооветпунктов и зооветучастков — 11.

* * *

Освоено посевных площадей по сравнению с довоенным периодом — 93 %. В 1950 г. колхозники получили на один трудодень зерновых в среднем по 0,680 кг, картофеля — 1,150 кг. План развития животноводства был выполнен по крупному рогатому скоту на 88 %, свиньям — 58,5 %, овцам — 90,7 %, лошадям — 97,1 %. План сдачи зерна по обязательным госпоставкам выполнен на 59 %, молока — на 82 %.

* * *

Урожайность (в центнерах). Пшеница озимая — 7,95, рожь озимая — 6,83, пшеница яровая — 4,05, ячмень — 5,38, овес — 3,97, гречиха — 1,74, вика — 1,5, бобовые — 1,2, льносемя — 0,33, льноволокно — 0,41, картофель — 32,9.

Общественное животноводство. Имелось (голов): лошадей — 6894, крупного рогатого скота — 10 114, в том числе коров — 2812; свиней (всего) — 6022, свиноматок — 1847, овец — 10 611, птицы — 48 928.

* * *

В 1951 г. в районе имелось: раймагов — 1, сельмагов — 4, лавок — 47, ларьков — 22, столовых — 3, закусочных — 7.

НАРБ, ф. 7, воп. 1, спр. 3127, лл. 63, 63аб., 76, 153, 158, 190.

Падрыхтаваў *Г. Напрэеў*

Пераадольваючы цяжкасці

Пасяўныя плошчы ў 1955 г. у параўнанні з папярэднім годам павялічаны на 3600 га. Паступова расла і ўраджайнасць. У «Чырвоным Гарадку» Каменна-Лаўскага сельсавета на плошчы ў 100 га намалочана па 13 ц азімага жыта з гектара і па 13,5 ц ячменю. Паляводчая брыгада калгаса «Чырвоны ўдарнік» Гарадзецкага сельсавета на чале з камсамольцам Васілём Брыкіным накапала па 300 ц бульбы з гектара. Па 4,5 ц ільновалакна з гектара сабралі звенні Барабанавай («Ударнік» Славенскага сельсавета), Жалаковіч («Спартак» Фашчаўскага сельсавета), Камедавай («Чырвоны ўдарнік» Чарнаруцкага сельсавета) і інш.

Пэўных поспехаў дасягнулі прамысловыя прадпрыемствы раёна. Арцелі «Чырвоны бондар», «Адраджэнне» і «Чырвоны інвалід» выканалі гадавыя заданні за 10 месяцаў. У 3 разы перакрыў гадавы план калектыў прамкамбіната райспажыўсаюза. Уступіла ў строй дзеючых папяровая фабрыка «Спартак». Да канца года ёю выпушчаны першыя 200 т паперы. («Ударны фронт». 1978. 7 лютага.)

...Партыя і ўрад аказвалі велізарную дапамогу калгасам раёна ў развіцці жывёлагадоўлі. З пачатку вызвалення было завезена 690 коней, 1760 галоў буйной рагатай жывёлы, 2210 — авечак і каля 4 тысяч птушак. На 1 студзеня 1948 г. быў дасягнуты даваенны ўзровень па колькасці фермаў буйной рагатай жывёлы, коней, авечак. Некалькі адставала свінагадоўля. Шчыльнасць жывёлы на калгасных фермах была нізкая.

Дапамогу ў развіцці ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці аказвалі калгасам машынна-трактарныя станцыі, якія толькі ў 1947 г. атрымалі 51 трактар. Усе 4 МТС выканалі гадавы план трактарных работ за 10 месяцаў. Перадавыя механізатары значна перакрылі нормы выпрацоўкі. Так, трактарыст Шклоўскай МТС Мікалай Маськоў пры гадавым заданні 805 га мяккага ворыва зрабіў 1189 га.

Важнае месца ў раёне займалі пытанні будаўніцтва. XIV пленум ЦК КП(б)Б паставіў задачу да 30-й гадавіны Вялікага Кастрычніка вывесці ўсе сем'і з зямлянак і іншых прыстасаваных памяшканняў. З гэтай задачай паспяхова справіліся. Апроч даведзенага задання ў 1947 г. узведзена 19 дамоў для інвалідаў вайны, 46 дамоў для сем'яў загінуўшых воінаў і мнагадзетных маці.

...На працягу чацвёртай пяцігодкі адбылася змены ў кіраўніцтве раённай партыйнай арганізацыяй. З лютага 1948 г. першым сакратаром райкома партыі працаваў В. М. Фралоў, другім — Ф. С. Новікаў і трэцім — А. І. Стаякоў. А ў 1951 г. раённую партарганізацыю ўзначаліў Ф. Р. Рудчанка. («Ударны фронт». 1978. 7 лютага.)

У гэтым жа годзе працоўныя раёна прыступілі да ажыццяўлення пятага пяцігадовага плана развіцця народнай гаспадаркі. Быў поўнасцю асвоены даваенны ўзровень пасяўных плошчаў. Далейшае развіццё атрымала грамадская жывёлагадоўля. Але недахоп сартавога насення, мінеральных угнаенняў стрымлівалі рост ураджайнасці ўсіх сельскагаспадарчых культур.

Палепшылася работа прамысловых прадпрыемстваў. Папяровая фабрыка «Спартак», райпрамкамбінат, арцель «Аб'яднаная праца» паспяхова выканалі планы, прадукцыйнасць працы ўзрасла на 9,8 %.

...У пачатку пятай пяцігодкі ў 118 школах раёна было 14,3 тысячы навучэнцаў. Працавала 638 настаўнікаў і 42 выхавальнікі дзіцячых дамоў.

Вялікая ўвага ўдзялялася павышэнню матэрыяльнай зацікаўленасці калгасаў і калгаснікаў у росце сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1953 г. быў адноўлены прынцып пагектарнага налічэння дзяржпаставак сельскагаспадарчых прадуктаў, установлены цвёрдыя стаўкі натураплаты за работу МТС. У канцы года дзяржава значна павысіла нарыхтоўчыя і закупачныя цэны на зерне, бульбу, гародніну, ільновалакно і семя, прадукты жывёлагадоўлі. У раёне стала шырэй укараняцца штомесячнае авансаванне калгаснікаў, якое садзейнічала росту іх актыўнасці і павышэнню прадукцыйнасці працы.

У 1954 г. калгасы раёна выканалі дзяржаўныя пастаўкі зерня на 104,3 %, бульбы — на 107,6, ільновалакна — на 131 і льносемя на 218 %. На ўборцы ўраджаю працавалі 107 самаходных зернеўборачных камбайнаў. Механізатары ўбралі больш за 31 тыс. га зернебабовых культур — 77,8 % уборачнай плошчы.

На Шклоўшчыне выраслі сапраўдныя майстры механізаванай уборкі ўраджаю. Камбайнер Фашчаўскай МТС Дашкевіч, напрыклад, убраў за сезон 575 га зерневых пры плане 220 га. Больш чым па 500 га ўбралі камбайнеры Другакоў, Каралёў, Жыгуноў і інш. Удзельнік Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі, ільноцерабільшчык Фашчаўскай МТС Антон Суслаў за сезон

выцерабіў 162 га лёну, выканаўшы 3 гадавыя нормы.

Далейшае развіццё ўсіх галін сельскагаспадарчай вытворчасці ўмацоўвала эканоміку гаспадарак. Стварыліся магчымасці для павышэння аплаты працы. У калгасе імя Фрунзе, напрыклад, на кожны працадзень выдавалася па 2 кг зерня, столькі ж бульбы, грубых кармоў і па 5 рублёў грошай. За высокія паказчыкі ў павелічэнні вытворчасці прадуктаў паляводства і жывёлагадоўлі калгасы імя Фрунзе і «Праўда» былі ўдзельнікамі Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўкі. З мэтай пераймання і ўкаранення ў практыку дасягненняў перадавікоў 137 чалавек з ліку кіраўнікоў і спецыялістаў калгасаў, звеннявых і іншых работнікаў сельскай гаспадаркі наведалі Усесаюзную сельскагаспадарчую выстаўку. («Ударны фронт». 1978. 14 лютага.)

Аднак у развіцці народнай гаспадаркі раёна не ўсё ішло добра. Сістэматычна не выконвалі заданняў маслазавод, райспажыўсаюз, арцель «Перамога». У калгасах «Сацыялізм», «Новае жыццё», «Шлях пралетарыяту», «Звязда» зерневых з гектара пасеваў збіралі ўсяго па 4 ц, ільносемя і валакна — па 2—2,5 ц. Марудна развівалася жывёлагадоўля. У некаторых калгасах на карову надойвалі па 540—670 літраў малака. На 100 га сельгасугоддзяў у раёне было ўсяго 11 галоў буйной рагатай жывёлы, у тым ліку 4 каровы, 12 авечак, і на 100 га ворыва — 16 свіней. МТС не выканалі планаў па механізацыі працаёмкіх працэсаў у жывёлагадоўлі і здабычы торфу.

Вясной 1955 г. ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР звярнуліся да партыйных арганізацый і савецкіх органаў з заклікам паслаць у вёску 30 тысяч вопытных работнікаў з мэтай умацавання адстаючых калгасаў кіруючымі кадрамі. На заклік адгукнуліся многія камуністы раёна. Загадчык аддзела сельскай гаспадаркі райвыканкома Ф. А. Тарасаў узначаліў калгас «Перамога», дырэктар Бярозаўскага дзіцячага дома І. П. Лактарысенка — калгас «Прамень камунізму». Па рэкамендацыі райкома партыі былі выбраны старшынямі калгасаў камуністы Г. Д. Дарашкееў, А. І. Грыбанаў, П. І. Сопелеў, Л. К. Забабонін, Р. Ф. Мазетаў, Г. І. Кандрацьеў і інш. Яшчэ раней калгас «Бальшавік» узначаліў супрацоўнік райупаўміназга А. К. Тамашэвіч.

...1956 г. азнаменаваўся значным павышэннем матэрыяльнага і культурнага дабрабыту працоўных. Скараціўся рабочы дзень у перадсвяточныя і перадвыхадныя дні, установлены 6-гадзінны рабочы дзень для падлеткаў. Павышаны размеры пенсій па старасці і інваліднасці, адменена плата за навучанне ў сярэдніх і вышэйшых навучальных установах, павялічылася працягласць водпускаў па цяжарнасці і родах.

...Працягвалася ўзбуйненне дробных калгасаў. У 1958 г. іх стала ў раёне 38. На базе МТС была створана рамонтна-тэхнічная станцыя. У ходзе рэарганізацыі МТС калгасам перададзена рознай сельскагаспадарчай тэхнікі агульным балансавым коштам 12,9 мільёна рублёў. Перайшлі ў калгасы 665 механізатараў, якія раней працавалі ў МТС.

...Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за поспехі ў развіцці сельскай гаспадаркі і дасягненне высокіх паказчыкаў па вытворчасці і нарыхтоўцы мяса, малака, збожжа, бульбы, лёну і іншых прадуктаў сельскай гаспадаркі, за ўкараненне дасягненняў навукі і перадавых метадаў у сельскагаспадарчую вытворчасць старшыня калгаса імя Леніна П. В. Грышанаў узнагароджаны ордэнам Леніна. Ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга ўзнагароджаны камбайнер А. С. Казлоўскі, брыгадзір трактарнай брыгады В. П. Раманаў, старшыня калгаса імя Фрунзе П. М. Сяркоў, свінарка гэтай гаспадаркі Н. М. Халянкова, старшыня калгаса імя Карла Маркса М. П. Шчарбакоў, звеннявая калгаса «Барацьба» Г. П. Шчарбакова і інш. Усяго ордэнамі і медалямі былі ўзнагароджаны 39 чалавек. («Ударны фронт». 1978. 14 сакавіка.)

М. Ільюшэнка

РАДКІ З ГАЗЕТЫ

Ільнозавод уступіў у строй

Да Вялікай Айчыннай вайны Шклоўскі ільнозавод быў адным з перадавых заводаў Беларусі па пярвічнай апрацоўцы лёну. Нямецкія захопнікі дашчэнту разбурылі яго. Калектыў рабочых і інжынерна-тэхнічных работнікаў на месцы развалін неўзабаве пасля вызвалення прыступіў да будаўніцтва вопытнага эксперыментальнага завода на пярвічнай

апрацоўцы лёну. Дзякуючы спаборніцтву ў гонар 30-годдзя БССР, будаўнікі завода закончылі ўзвядзенне вытворчага корпуса машыннага аддзялення, сартыровачнага цэха, сушыльнай гаспадаркі, пабудавалі склад гатовай прадукцыі і жылы дом на 60 кватэр. У індывідуальным і брыгадным спаборніцтве рабочыя завода дасягнулі пэўных поспехаў. Брыгады каменшчыкаў Анатоля Шустава і Пятра Пятрова, штодзённа выконваючы нормы на 120—140 %, вылажылі 800 кубічных метраў сцен, забетаніравалі 1200 кубаметраў жалезабетонных перакрыццяў цэхаў. Цяслярскія брыгады Паўла Маёра і Рыгора Аўрама ва зрабілі 15 тысяч квадратных метраў апалубачных работ.

Учора, 31 снежня, быў дадзены першы гудок. Завод уступіў у строй дзеючых.

«Чырвоны барацьбіт». 1949. 1 студзеня.

Адбудавана занава

У 1936 г. у в. Фашчаўка была адчынена сярэдняя школа. Яна размяшчалася ў прыгожым двухпавярховым будынку. Але нямецка-фашысцкія захопнікі знішчылі яго. На месцы руін вырас новы двухпавярховы будынак. 24 студзеня 1950 г. яго класы напоўніліся радаснымі галасамі школьнікаў.

«Чырвоны барацьбіт». 1950. 3 лютага.

Новы магазін

Закончана будаўніцтва новага цаглянага магазіна ў в. Александрыя. Ён добра абсталяваны. Тут ёсць гастранамічны і бакалейны аддзелы.

Днямі адбылося адкрыццё магазіна. Тут у шырокім выбары прадуктовыя тавары, адзенне, трыкатажныя і парфумерныя вырабы, абутак і іншыя тавары.

«Чырвоны барацьбіт». 1953. 4 чэрвеня.

Калгасы набываюць аўтамашыны

Сельгасарцелі «Праўда» Рыжкавіцкага сельсавета, «Ударнік» Александрыйскага і «Ленінскі шлях» Вяліка-Лазіцкага сельсавета за зданае дзяржаве мяса ў лік закупак атрымалі аўтамашыны «ЗІС-150». За звышпланавае малако калгас імя Фрунзе займеў аўтамашыну «ГАЗ-51». Гэта трэцяя аўтамашына ў гаспадарцы. Днямі калгасу пастаўлена яшчэ адна машына «ЗІС-150» за зданае мяса. У бліжэйшы час калгасы «Прамень Камунізму» Гарадзецкага сельсавета, «Чырвоны Кастрычнік» Чарнаруцкага і іншыя за пастаўленыя дзяржаве прадукты жывёлагадоўлі таксама атрымаюць аўтамабілі.

М. Шчарбакоў. «Чырвоны барацьбіт». 1953. 29 лістапада.

Удасканаленне адобрана ў Маскве

Апарат-гідраразбівальнік служыць для папярэдняй разбіўкі цэлюлозы, драўлянай масы, макулатуры. Яго дзеянне заснавана на прынцыпе гідраўлічнай варонкі, ствараемай вярчальнай крылаткай на дне ванны. У выніку цэнтрабежнага закону цяжкія часткі адкідваюцца да перыферыі ванны і прыціскаюцца да яе сценак. Па прапанове галоўнага механіка папяровай фабрыкі «Спартак» Сямігіна на дне ванны былі зроблены металічныя «кішэні», у якія і ўлаўліваюцца ўсе цяжкія часткі. Такім чынам удалося механізаваць сартыроўку макулатуры, адмовіўшыся ад дадатковага штату рабочых. Навінка была адобрана на канферэнцыі папернікаў у Маскве і рэкамендавана для іншых фабрык.

А. Аўдзеў. «Чырвоны барацьбіт». 1955. 6 мая.

Лес — народнае багацце

За пятую пяцігодку ў раёне пасеяна і пасаджана лясоў на плошчы каля 2000 га. І ўсё ж, з-за нявыкананых, бессістэмных парубак лясістасць змяншаецца і цяпер дасягае 12 % усёй тэрыторыі Шклоўшчыны. Толькі за 1955 г. у дзяржаўных лясах знішчана самавольнымі парубкамі 4185 кубаметраў драўніны.

М. Пятроўскі. «Чырвоны барацьбіт». 1956. 3 лютага.

Электрыфікацыя калгаса

Узмоцненымі тэмпамі ідзе электрыфікацыя сельгасарцелі імя Карла Маркса. Праводзяцца электралініі да грамадскіх будынкаў і жывёлагадоўчых памяшканняў. У хуткім часе «лямпачкі Ільіча» заззяюць у дамах калгаснікаў.

Л. Аўраменка. «Чырвоны барацьбіт». 1956. 18 сакавіка.

Узнагароды — дыпломы, медалі, аўтамабіль

За поспехі ў развіцці калгаснай вытворчасці калгасу імя Фрунзе прысуджаны Дыплом 2-й ступені Галоўвыстаўкома УСГВ і грузавы аўтамабіль. Старшыня гаспадаркі П. М. Сяркоў узнагароджаны Малым залатым медалём і радыёпрыёмнікам, намеснік старшыні Р. А. Грыбанаў — Вялікім сярэбраным медалём і радыёпрыёмнікам, брыгадзір 5-й паляводчай брыгады І. П. Пятроў — Малым залатым медалём і матацыклам, звеняявая Е. Т. Кіргізава — Малым сярэбраным медалём і наручным гадзіннікам «Звязда». Малыя сярэбраныя медалі атрымалі аграном калгаса У. М. Падскробкін, загадчык аўцафермы Ф. Д. Гуркін, пастухі В. С. Лэўдзікаў, М. П. Гелахаў, брыгадзір будаўнічай брыгады М. Т. Букетаў, калгаснік Ц. Пятроў.

«Чырвоны барацьбіт». 1956. 4 красавіка.

Чырвоны сцяг — перадавой МТС

Механізатары Шклоўскай МТС летась заваявалі першынство ў вобласці па ўсіх паказчыках. Абком прафсаюза і абласное ўпраўленне сельскай гаспадаркі прысудзілі ім пераходны Чырвоны сцяг і прэмію — радыёпрыёмнік «Мінск-Р7». Сцяг уручыў калектыву старшыня абкома прафсаюза работнікаў сельскай гаспадаркі Казлоў. Дырэктар МТС Пікас заклікаў механізатараў у гэтым годзе працаваць яшчэ лепш. У адказ брыгадзіры трактарных брыгад Раманаў і Ліпскі далі слова выканаць планы трактарных работ на 125 %, эканоміць паліва і змазачныя матэрыялы.

Перадавым механізатарам уручаны грашовыя прэміі. Сярод іх брыгадзіры трактарных брыгад Путнін, Раманаў, Чайкоў, трактарысты Паўлаў, Саўчанка, Касьянаў, слесары Аладдзеў, Гункевіч, камбайнеры Аніськоў, Перчанкоў і інш.

«Чырвоны барацьбіт». 1956. 4 мая.

Больш за тысячу парасят

Шэсць гадоў працуе маладая свінарка Ніна Халянкова на ферме калгаса імя Фрунзе. За гэты час атрымала і вырасціла больш за тысячу парасят. Яна займаецца і адкормам свіней. За апошнія гады адкарміла 80 свіней агульнай вагой больш за 10 тон. За гэтыя поспехі Ніна Халянкова ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга.

«Чырвоны барацьбіт». 1958. 29 студзеня.

Удзельнікі ВДНГ

Калгас «Запаветы Леніна». Настрыжана воўны ў 1957 г. на 100 га сельгасугоддзяў па 16 кг. Ад ста аўцаматак вырашчана па 95 ягнят. Рост валавога выхаду прадукцыі ў параўнанні з двума папярэднімі гадамі склаў: па мясу — 83,4 %, па малаку — 63,3, па шаніцы — 192 %. Удзельнікамі выстаўкі зацверджаны М. З. Азараў — старшыня калгаса, І. Ц. Шкуроў — брыгадзір, П. А. Сотнікава, І. Л. Хрытанькоў — члены брыгады, В. Ф. Рыбакова — аўчар.

Калгас імя Карла Маркса. Надоена малака на карову па 2595 кг і на 100 га сельгасугоддзяў атрымалі 202,5 ц. Настрыжана воўны на 100 га сельгасугоддзяў па 40 кг, на адну авечку — 2,3 кг. Ад ста аўцаматак атрымана па 96 ягнят, мяса на 100 га сельгасугоддзяў па 49,5 ц. Рост валавога даходу ад малака ў параўнанні з папярэднімі двума гадамі склаў 60 %. Удзельнікамі выстаўкі зацверджаны: М. П. Шчарбакоў — старшыня калгаса, К. А. Іванова, М. М. Мукамола

ва — даяркі, С. Я. Платонава — цялятніца, В. А. Іваноў — аўчар.

Калгас імя Леніна. Летась надоена малака на карову 2539 кг, на 100 га сельгасугоддзяў атрымана 202,5 ц, мяса — 36,9 ц. Рост валавога выхаду прадукцыі ў параўнанні з двума папярэднімі гадамі склаў: па малаку — 192 %, мясу — 180, яйках — 548,8 %. Удзельнікамі выстаўкі зацверджаны: П. В. Грышанаў — старшыня калгаса, В. П. Грышанава, Г. Н. Новікава, Г. М. Стаськова, В. А. Крупень — даяркі, А. А. Шарай, М. Я. Чарняўская — цялятніцы, Ф. А. Грышанаў, С. І. Дзям'янаў — заг. фермы, А. І. Радкевіч — заатэхнік.

З калгаса **«Бальшавік»** удзельнікамі выстаўкі зацверджаны: Г. П. Корнева, Н. П. Мільто — даяркі, А. А. Кармёнак — цялятніца.

З калгаса **«VII з'езд Саветаў»:** П. В. Ракаў — брыгадзір, С. М. Самуйлава — звеннявая, К. А. Суманькова — член звяна.

Калгас «Праўда». Настрыжана воўны на 100 га сельгасугоддзяў па 20 кг, вырашчана па 90 ягнят на 100 аўцаматак і ярак. Павялічаны валавы выхад прадукцыі ў параўнанні з двума папярэднімі гадамі ў наступных размерах: ячменю на 98, яек на 64,5 %. Зніжаны сабекошт прадукцыі: бульбы на 23,5 %, гародніны на 33,3, ялавічыны на 41, птушынага мяса на 64,5 %. Удзельнікамі выстаўкі зацверджаны: Т. Е. Свістуноў — старшыня калгаса, С. Е. Паўловіч — чабан, М. Ф. Драздоў — бухгалтар.

Права ўдзелу ў выстаўцы атрымаў Н. С. Галецкі — ільноцерабільшчык Шклоўскай МТС.

«Чырвоны барацьбіт». 1958. 22 жніўня.

За поспехі ў атрыманні высокіх ураджаяў ільну раён у 1966 г. быў удзельнікам ВДНГ. Выканком прысудзіў раёну Дыплом II ступені, калгасу імя Фрунзе — Дыплом I ступені, калгасу імя Кірава — Дыплом II ступені, калгасам «50 год Кастрычніка», імя Леніна і льнонасенстанцыі — Дыпломы III ступені.

Залаты медаль атрымаў старшыня калгаса імя Фрунзе П. М. Сяркоў, сярэбраны — агранам гэтай жа гаспадаркі М. З. Гелахава і першы сакратар РК КПБ С. М. Дзікун, бронзавы — нам. начальніка райупраўлення сельскай гаспадаркі Ф. С. Касцючэнка.

Бронзавыя медалі таксама ўручаны перадавікам вытворчасці калгасаў імя Фрунзе: звеннявым па лёну М. В. Астапавай, Т. Е. Залуцкай, свінарцы К. А. Патапавай; імя Кірава: аграному Н. І. Ніканавай, брыгадзіру паляводчай брыгады В. І. Казлову, звеннявой па лёну В. Я. Капашыла; «50 год Кастрычніка»: старшыні калгаса А. К. Судакову, эканамісту Н. В. Івановай, трактарысту І. П. Цемруку; імя Леніна: старшыні калгаса М. К. Краўцову, аграному А. С. Сімончык, звеннявой па лёну М. Е. Казаковай, механізатару В. С. Мазалькову; ільнонасенстанцыі: загадчыку А. Н. Ермаловічу, старшаму аграному Ц. Т. Баркоўскаму, участковым аграномам Е. П. Малахавай і Н. В. Равяка, былому ўчастковаму аграному (цяпер пенсіянеру) В. Д. Раманаву.

«Ударны фронт». 1967. 12 снежня.

Група гаспадарак, брыгад, асобныя паляводы і жывёлаводы раёна былі ўдзельнікамі ВДНГ СССР 1972 г. Яны адзначаны выстаўкомам. Дыпломамі I ступені ўзнагароджаны калектывы саўгаса «Гарадзішча» і 6-й брыгады калгаса імя Кірава; Дыпломам II ступені — калектыў 1-й брыгады гэтага ж калгаса.

Сярод адзначаных Дыпломам гонару калектыў калгаса «Праўда» і старшыня гэтай жа гаспадаркі А. К. Тамашэвіч, залатым медалём — дырэктар саўгаса «Гарадзішча» Т. І. Галіца і брыгадзір калгаса імя Кірава У. П. Дзям'янаў.

Сярэбраным медалём узнагароджаны члены калгаса імя Кірава: трактарыст Д. М. Шчарбакоў, брыгадзір І. Я. Макараў, загадчык фермы М. С. Чарнякоў, цялятніца Л. І. Самсонава; члены калгаса «Праўда»: галоўны аграном Г. С. Шаўша, птушніца Л. Ф. Лукашэнка, трактарыст І. С. Котаў; з саўгаса «Гарадзішча»: галоўны аграном І. С. Плоткін, трактарыст І. С. Савельеў.

Бронзавым медалём адзначаны з калгаса імя Кірава члены брыгад І. Ц. Юралько, Н. І. Дударава, Я. Ф. Ярошкіна, Ф. Я. Архіпава, шафёр Л. В. Выдроў; з калгаса «Праўда» былы нам. старшыні Л. Ц. Паўловіч, птушніца С. Н. Манькоўская, брыгадзір В. Ц. Вырвіч, камбайнер І. Р. Шаркоў, члены брыгад М. П. Арловіч, М. П. Маісеева, Т. А. Шушанкова, шафёры І. М. Маісееў, М. І. Савельеў; з саўгаса «Гарадзішча» начальнікі вытворчых участкаў М. Ц. Матросаў, Г. Ф. Герасімаў, Л. В. Саўко, работніцы З. Л. Жэлаковіч, М. А. Шамунь, цялятніца М. Ц. Партненка, свінарка Г. М. Бяспалка, камбайнер Ф. Ф. Кавалёў, шафёры В. Ф. Галанаў, У. А. Кірылін, Л. Е. Рыжкоў.

«Ударны фронт». 1973. 25 студзеня.

За годам — год, падзея — за падзеяй

У юбілейным для БССР 1959 г. для паслуг насельніцтва ў раёне працавалі РДК, клуб папяровай фабрыкі «Спартак», 22 сельскія клубы, 8 дамоў-чытальняў, 72 масавыя і дзіцячыя бібліятэкі. Дзеці навучаліся ў 120 школах. Жыхароў раёна абслугоўвалі 4 бальніцы, столькі ж урачэбных участкаў і 22 фельчарскія пункты.

Шклоў інтэнсіўна забудоўваўся. Толькі ў 1962 г. у горадзе здадзены ў эксплуатацыю новы кінатэатр «Мір», будынак спецшколы, дзіцячы садок № 4, дзіцячыя яслі папяровай фабрыкі «Спартак». Уведзены ў строй два карпусы райбальніцы, цэх масавага пашыву на камбінаце бытавога абслугоўвання, два гарадскія аддзяленні сувязі, мэблевы цэх прамкамбіната, некалькі магазінаў. У наступныя два гады было здадзена ў эксплуатацыю ў горадзе 7 тысяч кв. м жылой плошчы, узведзена 200 індывідуальных дамоў, пабудаваны 4-я сярэдняя школа, райунівермаг, банк.

Разам з тым, прамысловыя прадпрыемствы мелі пэўныя цяжкасці па матэрыяльна-тэхнічнаму забеспячэнню, не хапала кваліфікаваных кадраў на прадпрыемствах мясцовай прамысловасці. На асобных прадпрыемствах знізіўся выпуск прадукцыі на рубель асноўных фондаў. Такая з'ява назіралася ў райаб'яднанні «Сельгастэхніка», на льнозаводзе, Гарадзішчанскім і Лотвянскім цагельных заводах. На прадпрыемствах мала ўдзялялася ўвагі якасці выпускаемай прадукцыі, у тым ліку на папяровай фабрыцы «Спартак», ільнозаводзе, маслазаводзе, прамкамбінаце. І гэта не дзіўна. У той час асноўным паказчыкам быў паказчык па выпуску валавой прадукцыі. Па ім ацэньвалася і заахвочвалася работа калектываў.

1966 г. памятны тым, што на Шклоўшчыне з'явіліся першыя Героі Сацыялістычнай Працы. Гэтага высокага звання былі ўдастоены свінарка калгаса імя Фрунзе К. А. Патапава, старшыня гэтай жа гаспадаркі П. М. Сяркоў, камбайнер саўгаса «Гарадзішча» А. С. Каралёў.

У гэты час ільнозавод становіцца адным з буйнейшых аднатыпных прадпрыемстваў СССР. На ім упершыню была ўведзена паточная лінія па атрыманні валакна з саломкі па паскоранаму фізічна-хімічнаму спосабу.

Восьмая пяцігодка папоўніла рады Герояў Сацыялістычнай Працы. Імі сталі свінарка саўгаса «Гарадзец», маці-гераіня Н. М. Баранава, першы сакратар райкома партыі С. М. Дзікун, звеннявая-льнаводка ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга калгаса імя Кірава К. С. Макарава, старшыня гэтай жа гаспадаркі В. Г. Пархоменка.

Менавіта самай высокай ураджайнасці за пасляваенны час дасягнуў раён у 1970 г. Збожжавых у сярэднім на кожным гектары было атрымана па 21,5 ц, бульбы — па 150 ц. Ураджайнасць збожжавых і бульбы за восьмую пяцігодку падвоілася.

Паспяхова развівалася жывёлагадоўля. У тым жа годзе на 100 га сельгасугоддзяў атрымана 101,2 ц мяса — рост за пяцігодку ў 2,7 раза, малака 382,1 ц — за 5 гадоў яго вытворчасць узрасла на 71,9 %. Значна былі перакрыты заданні па продажу дзяржаве сельскагаспадарчай прадукцыі. План па продажу збожжа выкананы на 205 %, бульбы — на 105, мяса — на 120 %. Добрую ацэнку атрымалі жывёлаводы раёна за старанную працу ў 1970 г. Ім быў уручаны пераходны Чырвоны сцяг ЦК КПБ і Савета Міністраў БССР. А калектыву калгаса імя Кірава па выніках восьмай пяцігодкі ўручаны ордэн Працоўнага Чырвонага Сцяга.

У 1971—1975 гг. у Шклове пабудавана шмат жылля. У выніку штогод у сярэднім 255 сем'яў спраўлялі навасэллі або паляпшалі жыллёвыя ўмовы. За гэты час з'явілася новая Паркавая вуліца, вакол якой неўзабаве ўзнік мікрараён. У наступныя гады завершана ўзвядзенне першай чаргі камбіната будаўнічых матэрыялаў і вырабаў, які выпускае прадукцыю ў асноўным для сяла. Уступіў у строй магазін «Дзіцячы свет». Было здадзена ў эксплуатацыю прафтэхвучылішча, якое з першага 1979/80 навучальнага года рыхтавала спецыялістаў для лёгкай прамысловасці рэспублікі. У далейшым профіль яго расшырыўся. Тут цяпер набываюць прафесію механізатара, кулінара, швачкі і інш.

Дзевятая пяцігодка ўзяла эстафету ад восьмай у справе нарошчвання тэмпаў развіцця сельскай гаспадаркі. Яшчэ прыбаўляліся ўраджаі на палях, не змяншалі вытворчасць малака і мяса жывёлаводы. Перадавыя з іх атрымлівалі ўрадавыя ўзнагароды. А бульбаводу-механізатару калгаса імя Андрэева (цяпер АТ «Ніва») М. В. Другакову было прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. У канцы сакавіка 1981 г. ён

шаванні з нагоды прысваення звання Героя Сацыялістычнай Працы прымала галоўны аграном калгаса імя Кірава Н. І. Ніканава.

Значна палепшыліся ў горадзе бытавыя ўмовы. З пускам у дзеянне ачысных узвядзенняў з'явілася магчымасць будаваць добраўпарадкаванае жыллё, узводзіць цэлыя мікрараёны, як правіла, з пяціпавярховымі дамамі. Адзін з іх узнік паміж паркам і папяровай фабрыкай «Спартак», другі — у раёне былой ПМК-39. Шматпавярховыя жылыя гмахі ўзняліся каля райаб'яднання «Сельгастэхніка», на 1-й Савецкай вуліцы (цяпер Савецкая). За тры гады ў эксплуатацыю здадзена больш за 20 тысяч кв. м жылля. Актыўна ўзводзілі яго для сваіх рабочых і служачых папяровая фабрыка «Спартак», райаб'яднанне «Сельгастэхніка», будаўнічыя арганізацыі.

На базе прамкамбіната працягвалася будаўніцтва корпуса мэблевай фабрыкі. Праўда, тэрміны ўвядзення яе ў строй зрываліся, бо гэта быў няпланавы аб'ект. Яна пачала даваць прадукцыю ў 1980 г. Узводзілася другая чарга камбіната будматэрыялаў і вырабаў.

22 верасня 1985 г. у расквечаны, пасвяточнаму ўпрыгожаны гарадскі парк сабраліся шклоўцы, іх госці, каб адзначыць 450-годдзе свайго горада. Пасля ўрачыстага мітынгу на адкрытай эстраднай пляцоўцы адбыўся вялікі святочны канцэрт. Яго пачаў зводны хор калектываў мастацкай самадзейнасці горада. Перад гараджанамі і гасцямі Шклова таксама выступілі вакальны ансамбль папяровай фабрыкі «Спартак», вакальная група мастацкай самадзейнасці льнозавода. Сваё майстэрства прадэманстравалі на свяце самадзейныя калектывы раённага Дома культуры, гарадской музычнай школы, Дома піянераў і школьнікаў і інш.

У дні святкавання юбілею горада з канцэртамі перад шклоўцамі выступіў вакальна-інструментальны ансамбль «Верасы» пад кіраўніцтвам лаўрэата прэміі Ленінскага камсамола, народнага артыста Беларускай ССР Васіля Раінчыка, які вырас у Шклове, атрымаў тут першапачатковую музычную адукацыю.

З нагоды юбілею горада ў фае клуба «Чырвоны Кастрычнік» была разгорнута выстаўка вырабаў прамысловых прадпрыемстваў, сферы абслугоўвання Шклова, сельгаспрадукцыі гаспадарак раёна. Розныя ўзоры паперы дэманстраваліся папяровай фабрыкай «Спартак», набор шафаў «Янтар», двухтумбавы пісьмовы стол — мэблевай фабрыкай. Тры стэнды райсельгастэхнікі змяшчалі дэталі і запасныя часткі — вырабы яе прамысловай групы са стальнога і капронавага ліцця. Шырокім асартыментам былі прадстаўлены вырабы райбыткамбіната, завода дарожна-будаўнічых вырабаў, ільнозавода, камбікормавага завода, райспажыўсаюза, прадукцыя раслінаводства калгасаў «Праўда», імя Кірава, імя Фрунзе, імя Леніна эксперыментальнай базы «Спартак».

Вынікі работы працоўных калектываў Шклоўшчыны за адзінаццатую пяцігодку былі падведзены на XXXI райпартканферэнцыі. За 5 гадоў працоўныя калектывы горада на ўдасканаленне тэхналагічных працэсаў асвоілі больш за 7 мільёнаў рублёў. Аўтаматызавана і механізавана 8 вытворчых ліній, 41 рабочае месца. Звыш плана выпушчана прадукцыі на 4 мільёны рублёў.

Побач з тым на канферэнцыі адзначалася, што райком партыі, некаторыя пярвічныя партарганізацыі не змаглі наладзіць зладжанай, мэтанакіраванай работы па выкананні праграмы кожным калектывам. Не былі дасягнуты паказчыкі па росту аб'ёмаў вытворчасці льнозаводам і камбінатам кааператыўнай прамысловасці (былы хлебазавод). Калектыў мэблевай фабрыкі не справіўся з планам рэалізацыі па дагаворах. Большасць прадпрыемстваў не выканала планы па ўкараненні новай тэхнікі. Толькі ў апошнім годзе пяцігодкі страты ад браку прадукцыі склалі 35 тысяч рублёў.

За пяцігодку будаўнікі раёна асвоілі 77 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў. Здадзена 46 тысяч кв. м жылля, з іх 22 тысячы — у горадзе, на 780 месцаў павялічыліся дзіцячыя дашкольныя ўстановы. Але карэннага пералому ў гэтай галіне дабіцца не ўдалося. Асвоена на 8 мільёнаў рублёў капітальных укладанняў менш, чым у папярэдняй пяцігодцы. Не забяспечылі выкананне пяцігадовых планаў ПМК-39 і МПМК-124.

За час пяцігодкі на развіццё сельскай гаспадаркі раёна накіравана 46 мільёнаў рублёў, што дазволіла павялічыць асноўныя вытворчыя фонды на 33 %, энерганасычаныя магутнасці на 27 %, энергаўзброенасць працы ўзрасла ў 1,3 раза. Істотны ўклад у выкананне Харчовай праграмы ўнеслі калектывы калгасаў імя Кірава, імя Фрунзе, «Чырвоны Кастрычнік», «Запаветы Леніна», якія датэрмінова выканалі пяцігодку па продажу дзяржаве асноўных відаў сельгаспрадукцыі. У цэлым жа па раёну не ўдалося выйсці на рубяжы Харчовай праграмы па

вытворчасці і продажу асноўных відаў прадукцыі. Было недапастаўлена дзяржаве 11 000 т мяса і 30 000 т малака, што стала вынікам недастатковай работы па павелічэнні ўраджайнасці зерневых і кармавых культур. Калі ў калгасах імя Кірава, імя Фрунзе, саўгасе «Гарадзішча» стабільна атрымлівалі больш за 30 ц зерня з гектара, то ў калгасах імя Калініна, «Ударнік», «Перамога», «50 год Кастрычніка» ўраджайнасць не дасягнула і 20 ц. Галоўнымі прычынамі таму былі нізкі ўзровень тэхналагічнай, выканаўчай дысцыпліны, арганізацыі працы, слабая матэрыяльна-тэхнічная база насенняводства.

Можа гэта быў пачатак абвалу, які напаткаў усе калектывы горада і вёсак не на адзін год? Праўда, з 1987 г. у прамысловасці намецілася хаця і кволае, але праясненне. Працоўныя калектывы ўдасканальваюць гаспадарчы механізм і ўпраўленне. Асновай дзейнасці стаў поўны гаспадарчы разлік, які забяспечваў самаакупнасць і самафінансаванне, зацікаўленасць кожнага рабочага ў дасягненні канчатковых вынікаў. Па такіх прынцыпах пачалі працаваць калектывы райкамбіната бытавога абслугоўвання, райспажыўсаюза, камбікормавага завода. Адным словам, рабіліся намаганні ў вырашэнні першапачатковых задач перабудовы ўпраўлення народнай гаспадаркай, замацоўваліся пазітыўныя тэндэнцыі ў развіцці эканомікі раёна.

Але навальніца нестабільнасці набліжалася. Яе, як эстафету, перадаў 1990 г. свайму малодшаму брату — 1991 г. Менавіта ў гэты час большасць працоўных калектываў Шклова сутыкнулася з цяжкасцямі ў забеспячэнні сыравінай. Па гэтай прычыне збіваўся рытм выпуску прадукцыі на папяровай фабрыцы «Спартак», мэблевай фабрыцы, а калектыў ільнозавода значна знізіў аб'ёмы выпуску сыравіны як у 1990 г., так і ў наступным — 1991 г. Разбалансаванасць спажывецкага рынку, востры недахоп шэрага тавараў першай неабходнасці не абышлі стараной горад і раён. Асабліва яны ўзмацніліся пры пераходзе на рыначныя адносіны.

Праўда, у горадзе прымаліся меры па забеспячэнні таварнай масай спажывецкага рынку. Прамысловыя прадпрыемствы нарошчвалі аб'ёмы выпуску тавараў народнага спажывання, платных паслуг. Планы і заданні па гэтых паказчыках пастаянна перавыконваліся і ў 1990 і ў 1991 гг. Але гэтыя тавары і паслугі неўзабаве сталі дарагімі. Пастаянны рост цэн у наступныя гады значна пагоршыў сацыяльны стан гараджан і сяльчан.

У гэтыя гады статысты раёна найчасцей карыстаюцца словам «знізіўся». Так, у 1994 г. прамысловыя прадпрыемствы раёна знізілі аб'ём вытворчасці ў супастаўімых цэнах на 23,5 %. Прычыны таму — цяжкасці ў рэалізацыі прадукцыі, памяншэнне магчымасцей закупак сыравіны, матэрыялаў, камплектуючых вырабаў, а таксама ўзаемныя непастаўкі за адпраўленую прадукцыю.

Партыйны апарат у раёне адышоў ад кіраўніцтва вытворчасцю. А мясцовыя Саветы, у тым ліку і гарсавет, яшчэ слаба заяўлялі аб сабе. Справа ў тым, што іх улада не падмацоўвалася матэрыяльнымі і фінансавымі рэсурсамі. Да поўнай іх улады яшчэ была няпэўная адлегласць.

Узнікшыя малыя прадпрыемствы, фермерскія гаспадаркі хоць і ўносілі пэўны ўклад у развіццё эканомікі раёна, але не сталі вырашальнымі ў развіцці грамадства з прычыны сваёй малалікасці, слабай эканамічнай і тэхнічнай базы.

Сацыяльна-эканамічнае становішча раёна пры пераходзе да рыначных адносін аказалася незайздросным. Большасць насельніцтва крыўдавала на тое, што рэзка знізіліся даходы, таму з'явілася трывога за заўтрашні дзень, які можа прынесці галечу і голад. На зарплату стала цяжка пражыць, асабліва сельскім працаўнікам.

Гараджане і сяльчане Шклоўшчыны жылі надзеяй на лепшы час, на прыстойнае жыццё.

Л. Анціпенка

Аб рабоце народнай гаспадаркі раёна за 1993 год

Агульны аб'ём прамысловай вытворчасці ў супастаўімых цэнах знізіўся на 446 млн 921 тысячу рублёў, або на 11,9 %. Зніжэнне аб'ёмаў вытворчасці дапусцілі ўсе прадпрыемствы: папяровая фабрыка «Спартак» — на 14,5 %, ільнозавод — 22, камбікормавы завод — 1,4, малаказавод — 6,3, КБМіВ — на 34,3 %. Выраблена менш паперы на 7882 т, ільновалакна — на 197 т, мэблі — на 76 882 тысячы рублёў.

У калгасах і саўгасах раёна атрымана 33,8 ц збожжавых і зернебабовых з гектара, бульбы накапана — па 144 ц, каранеплодаў — па 359 ц. Не суцяшае вытворчасць асноўных відаў прадукцыі жывёлагадоўлі.

Атрымана толькі 7552 т мяса (у жывой вазе), або 80 % да ўзроўню папярэдняга года. Валавы надой малака склаў 28 485 т — 92 %. Сярэдні надой на карову склаў 2362 кг.

За кошт усіх крыніц фінансавання капітальныя ўкладанні выкарыстаны на 165,6 % да гадавога ліміту. Аб'ём будаўніча-мантажных работ выкананы на 153,9 %. У жыллёвым будаўніцтве за кошт усіх крыніц фінансавання ўзведзена 11 443 кв. метры жылля пры плане 28 843 кв. метры. Капітальныя ўкладанні выкарыстаны на 124 %.

Агульны аб'ём тавараабароту за кошт новых цэн павялічыўся ў 11,9 раза, аб'ём тавараабароту грамадскага харчавання — у 14,5 раза, платных паслуг аказана ў 9,3 раза больш.

Артыкул падрыхтаваны па матэрыялах райаддзела статыстыкі.

Вынікі работы народнай гаспадаркі раёна за 1995 год

Аналіз вынікаў работы паказвае, што прадпрыемствамі раёна выпушчана прадукцыі ў дзеючых цэнах на 150 852 мільёны руб. Аб'ём вытворчасці ў супаставімых цэнах павялічыўся да ўзроўню папярэдняга года на 5,5 %. Хранічна адстаюць толькі 4 (з 11) прадпрыемствы: мэблевая фабрыка, маслазавод, камбінат кааператыўнай прамысловасці, акцыянернае таварыства «Памяць». Прычыны гэтага звязаны з цяжкасцямі па рэалізацыі прадукцыі. Прадпрыемствы недастаткова вывучаюць кан'юнктуру рынку збыту. Уплываюць і ўзаемныя неплацяжы за адпраўленую прадукцыю.

Вяскоўцы стараліся стабілізаваць вытворчасць. Нядрэнныя паказчыкі атрыманы па ўраджайнасці асноўных сельгаскультур. Гаспадаркі раёна сабралі на 25,5 ц збожжа. Найвышэйшая ўраджайнасць яго атрымана ў калгасах імя Кірава, «Чырвоны Кастрычнік», АТ «Ніва», саўгасе «Юбілейны». Дзяржзаказ па продажу збожжа гаспадаркі выканалі на 138 %.

Поспехаў дасягнулі і льнаводы. Сярэдні збор ільновалакна склаў 7,7 ц з га. Асабліва добры лён урадзіў у калгасах «50 год Кастрычніка», імя Фрунзе, «Дняпроўскі», імя Кірава і саўгасе «Рабочы». Дзяржзаказ па валакну раён выканаў на 156 %.

Бульбы накапана па 148 ц з га. Сапраўднымі майстрамі па вырошчванні «другога хлеба» сталі бульбаводы калгаса «Запаветы Леніна». Яны накапалі па 250 ц клубняў з га.

У 1995 г. узрасла колькасць буйной рагатай жывёлы на 360 галоў, свіней — на 1055 галоў (9,6 %). Аб'ём рэалізацыі жывёлы павялічыўся ў 11 гаспадарках. Найбольшага росту прывагі дасягнулі калгасы «Шлях да камунізму», «Дняпроўскі» і саўгас «Рабочы». Знізілі прывагі жывёлы ў калгасах «Бальшавік», імя Калініна, саўгасе «Гарадзішча» і інш.

У цэлым сярэднясутачныя прывагі на вырошчванні і адкорме маладняку склалі 400 г, або знізіліся на 11 г, а свіней павялічыліся на 16 г. Павелічэнне прывагі буйной рагатай жывёлы забяспечылі калгасы імя Свярдлова, «Запаветы Леніна», саўгас «Гарадзец». Павялічылі валавы надой малака ў калгасах «Шлях да камунізму», «Зара», «Дняпроўскі»; знізілі — калгасы «Перамога», імя Калініна.

На капітальным будаўніцтве асвоена 67 682,2 млн руб. капітальных укладанняў. Будаўніча-мантажных работ выканана на 50 846 млн руб. Працягвалася будаўніцтва за кошт чарнобыльскіх сродкаў. Уведзены аб'екты: школа ў в. Ордаць, газаправод на 28,2 км, 47 кватэр агульнай плошчай 4482 кв. метры, памяшканне для буйной рагатай жывёлы на 400 галоў, пункт апрацоўкі і захавання збожжа на 5500 т, рамонтна-тэхнічная база АТС з аддзяленнем сувязі на 200 месцаў.

Усяго ў прыватную ўласнасць перайшло 1268 кватэр. За год прыватызавана 320 кватэр. Жыллёвая квота налічана 1920 чалавекам. Жыллёвыя чэкі атрымалі 455 чалавек, у тым ліку сельскай мясцовасці — 255 чалавек.

Павялічаны агульны аб'ём тавараабароту і грамадскага харчавання, платныя паслугі. Аднак у супастаўленых цэнах агульны аб'ём тавараабароту па раёну знізіўся на 26,4 %, аб'ём платных паслуг насельніцтву — на 14,2 %.

Прадпрыемствы і арганізацыі атрымалі 38 001 млн руб. прыбытку, ён павялічыўся ў 4,9 раза.

Прамысловыя прадпрыемствы атрымалі 15 123 млн руб. прыбытку, што ў 7,7 раза больш, чым у 1994 г. Страты дапусцілі 5 прадпрыемстваў і арганізацый, сярод іх МПМК-283, маслазавод і відэапракат.

Калгасы і саўгасы атрымалі 22 878 млн руб. прыбытку, што ў 4 разы больш папярэдняга года. Стратных гаспадарак няма.

Раённы аддзел статыстыкі

Працаваць і жыць за свой кошт

...У 1996 г. перш за ўсё выканкомам праводзілася работа па ўдасканальванні стылю і выпрацоўцы новых падыходаў у кіраўніцтве галінамі народнай гаспадаркі і сацыяльнай сферы, павышэнні патрабавальнасці да кіруючых кадраў за стан на даручаным участку. Прыярытэтны характар насілі пытанні пераадолення крызісных з'яў у эканоміцы, стабілізацыі сацыяльна-эканамічнага развіцця горада і сельскіх населеных пунктаў, павышэння эфектыўнасці работы выканкомаў сельскіх Саветаў дэпутатаў.

Вялікае месца ў дзейнасці выканкома займалі пытанні функцыяніравання прамысловасці як адной з галоўных галін эканомікі. У 1996 г. тут намеціліся пазітыўныя зрухі, што праявілася ў нарошчванні аб'ёмаў прамысловай вытворчасці. Як станоўчую можна адзначыць работу працоўных калектываў камбіната кааператыўнай прамысловасці, ААТ папяровай фабрыкі «Спартак», камбікормавага завода.

Станоўчыя тэндэнцыі намеціліся ў рабоце будаўнічага комплексу. За кошт усіх крыніц фінансавання ў раёне выкарыстана капукладанняў на 77,9 млрд р., у тым ліку будаўніча-мантажных работ выканана на 59,3 млрд р., вышэй на 2,1 % ад узроўню 1995 г. Асноўную ўвагу мы сканцэнтравалі на скарачэнні аб'ёмаў незавершанага будаўніцтва. Уведзена ў дзеянне асноўных фондаў на 57,1 млрд р. Здадзены ў эксплуатацыю 3 шматкватэрныя дамы — камунгаса і мэблевай фабрыкі, ЖБК райспажыўсаюза, 2 дамы ДБМ, 8 аднакватэрных жылых дамоў у п. Гавяды, 7 двухкватэрных у в. Гарадзец, СШ на 108 вучняў у в. Александрыя, лазня на 100 месц у г. Шклове, сельскія ўрачэбныя амбулаторыі ў п. Гавяды і інш. Першыя крокі зроблены па частцы будаўніцтва жылля ў сельскай мясцовасці як індывідуальнымі забудоўшчыкамі, так і гаспадаркамі. Сумесныя намаганні кіраўнікоў гаспадарак, спецыялістаў, усіх працаўнікоў вёскі з дапамогай дзяржавы дазволілі па папярэдніх падліках выйсці на ўзровень валавой прадукцыі ў супастаўных цэнах на 104,4 % ад узроўню 1995 г., у тым ліку ў раслінаводстве на 11,5 %, жывёлагадоўлі — на ўзровень 1995 г. Задача, пастаўленая прэзідэнтам А. Р. Лукашэнкам, атрымаць прырост валавой прадукцыі 2—3 % дасягнута, хоць уклад у яе вырашэнне калектываў далёка не раўназначны.

Галоўным вынікам работы галіны раслінаводства з'яўляецца тое, што ў 1996 г. атрымана ураджайнасць зерневых 31,8, або плюс 6,3 ц з гектара да 1995 г., прыбаўка валавога збору зерня саставіла 18,6 тыс. т. Гэта другі паказчык у вобласці сярод раёнаў. У калгасе імя Кірава атрымана 50,2 ц, «Чырвоны Кастрычнік» — 42,6, імя Фрунзе — 39, імя Свярдлова — 37 ц з гектара. Як станоўчае трэба адзначыць, што значную прыбаўку па зерню, звыш 30 % да 1995 г., атрымалі ў калгасах «Ударнік», «Дняпроўскі», «Уперад», «Зара», «Шлях да камунізму», саўгасах «Гарадзішча», «Рабочы», на эксперыментальнай базе «Спартак».

Некалькі лепш калгасы і саўгасы спрацавалі па вытворчасці бульбы. Атрымана сярэдняя ўраджайнасць 154, або плюс 6 ц з гектара да 1995 г., а па валавой вытворчасці прырост склаў 15 %. Традыцыйна атрымліваюць нядрэнныя ўраджаі калгасы «Чырвоны Кастрычнік», імя Кірава, імя Фрунзе, «Запаветы Леніна». У тых жа практычна ўмовах губляюць калгасы «Дняпроўскі», імя Калініна, «Маяк», «Рассвет», «Першае Мая».

Пры ўсіх неадназначных адносінах да лёну ў раёне ўдалося захаваць пасяўныя плошчы на ўзроўні папярэдніх гадоў, а вытворчасць валакна павялічыць на 10 %, атрымаць ураджайнасць 9 ц з гектара, што дазволіла выканаць дзяржзаказ па льновалакну на 163 %, забяспечыць работу льнозавода на год у дзве змены. Лепшых вынікаў дасягнулі льнаводы калгасаў імя Кірава, «Запаветы Леніна», імя Фрунзе, «Радзіма», саўгаса «Гарадзец», дзе ўраджайнасць валакна перавысіла 10 ц.

Прадметам паўсядзённай увагі ў сельскай гаспадарцы была і застаецца жывёлагадоўля, удзельная вага яе прадукцыі ў валавым аб'ёме састаўляе 49,2 %. Асноўным відам прадукцыі, які вызначае ўзровень вядзення гэтай галіны, з'яўляецца малако, але тут было дапушчана зніжэнне надояў супраць 1995 г. Асноўнай прычынай зніжэння ўзроўню вытворчасці малака з'явілася недастатковая работа па аднаўленні статка, незахаванне тэхналагічных патрабаванняў утрымання догляду і кармлення кароў і рад іншых прычын.

Вынікам усёй работы гаспадарак з'яўляецца фінансавае становішча, аналіз якога паказвае, што, завяршыўшы сельскагаспадарчы год, 5 гаспадарак — «Чырвоны Кастрычнік», імя Свярдлова, АТ «Ніва», «Юбілейны», «Уперад» — маюць грошы на разліковых рахунках, няма запазычанасці па

пазыках і картатэцы, 6 гаспадарак маюць адносна ўстойлівае фінансавае становішча і 17 — дрэннае.

Фермерскіх гаспадарак цяпер у раёне 78. У 1996 г. утвораны 3 гаспадаркі, спынілі дзейнасць — 15. За выключэннем агародніны, у фермерскіх гаспадарках ураджайнасць сельгаскультур атрымана на 10—13 % ніжэй, чым у калгасах і саўгасах. Наша пазіцыя тут адназначная: права на жыццё маюць усе формы гаспадарання на зямлі, але павінна быць і адпаведная аддача. Зямля патрабуе рацыянальнага выкарыстання.

Раённаму выканаўчаму камітэту ў 1996 г. шмат прыйшлося працаваць па вырашэнні праблем жыццезабеспячэння нашых людзей і сацыяльных пытанняў. Нягледзячы на сур'ёзныя фінансава-эканамічныя цяжкасці, удалося забяспечыць дастаткова стабільную работу вытворчага аб'яднання жыллёва-камунальнай гаспадаркі, у асноўным задаволіць патрабаванні насельніцтва ў паслугах. Без сур'ёзных выдаткаў прайшоў ацяпляльны сезон.

У 1996 г. некаторая работа праведзена па паляпшэнні гандлёвага абслугоўвання. Змяніліся ў лепшы бок знешні выгляд магазінаў, культура абслугоўвання. Арганізавана 22 кірмашы, 16 выстаў-продажаў. Вядзецца работа па павышэнні якасці выпускаемай прадукцыі.

Нядрэнна ў 1996 г. спрацавалі па выкананні праграмы па пераводу жылога фонду раёна на прыродны газ. Пракладзена 2,2 км газаправоду нізкага ціску па гарадскіх вуліцах Піянерская, імя Карла Маркса, Ільнозаводская, 11 ліпеня, Чырвоная Слабада, завулку Аўражны, ліквідавана групавая ёмістасць з пераводам на прыродны газ па вуліцы Калгасная. Працягваюцца работы па мантажу газаправода ў в. Александрыя.

У галіне адукацыі намаганні выканкома былі накіраваны на вырашэнне пытанняў, звязаных з пераходам на новы змест адукацыі, напрацоўку асноў дыферэнцыяцыі навучання, умацавання матэрыяльна-тэхнічнай базы, стварэнне ўмоў для пераходу на самазабеспячэнне ў арганізацыі харчавання, аздараўленне вучняў, актывізацыю пазаўрочнай і пазашкольнай работы. За прайшоўшы перыяд праведзена рэарганізацыя ДЮСШ. Дома піянераў і турысцкай станцыі ў Раённы цэнтр пазашкольнай дзейнасці. Праводзіцца падрыхтоўчая работа па перадачы на баланс аддзела адукацыі ведамасных дзіцячых садкоў і стварэнні устаноў тыпу «сад-школа». Заканчваецца рэканструкцыя дзіцячага садка калгаса імя Дзяржынскага пад сямейны дзіцячы дом Афанасьевых.

Выканком пастаянна трымае ў полі зроку праблемы аховы здароўя. Лячэбныя ўстановы ўкамплектаваны кадрамі здавальняюча, няма праблем з сярэднім медперсаналам. За кошт прыцягнутых сродкаў, гуманітарнай і спонсарскай дапамогі лячэбныя ўстановы папоўніліся сучаснай дыягнастычнай і працэдурнай апаратурай на суму больш за 2 млрд р. Разам з тым, сельскія ўчастковыя бальніцы, ФАПы адчуваюць востры недахоп медыкаментаў і прэпаратаў, бялізны і абсталявання.

У 1996 г. актывізавалася работа па рэалізацыі культурнай палітыкі. Аддзелам культуры (Г. А. Валозіна) вядзецца пошук новых форм і метадаў работы, накіраваных на развіццё народнай творчасці, пошук аптымальных форм культурнага абслугоўвання насельніцтва (выязныя канцэрты, народныя святы, клуб-бібліятэка). Наспела неабходнасць і ёсць перадумовы для стварэння тэатра і школы мастацтваў. Але застаецца ў культуры шмат нявырашаных пытанняў.

Пад пастаянным кантролем выканаўчага камітэта знаходзіліся пытанні, звязаныя са своечасовым прызначэннем і выплатамі пенсій, дапамог, размеркаваннем гуманітарнай дапамогі. Абмеркавана пытанне аб сацыяльнай абароне ветэранаў вайны і працы. Пры чатырох сельскіх участковых бальніцах адкрыта 20 сацыяльных ложкаў для адзінокіх і састарэлых людзей. За кошт бюджэтных сродкаў пабудавана 13 кватэр для ўдзельнікаў вайны і воінаў-інтэрнацыяналістаў, 4 — для шматдзетных сем'яў, размеркавана 2 т рэчываў гуманітарнай дапамогі і больш за тону харчавання шматдзетным, малазабяспечаным сем'ям і сем'ям, якія выхоўваюць дзяцей-інвалідаў, аказана значная дапамога дзецям-сіротам.

...Паўната вырашэння праблем раёна ў многім вызначалася магчымасцямі бюджэтнага фінансавання. Для павелічэння даходаў бюджэту раёна павышаны стаўкі зямельнага падатку на ўчасткі, выдзеленыя грамадзянам для садоўніцтва, дачнага будаўніцтва і агародніцтва, вядзення асабістай падсобнай гаспадаркі. За кошт гэтага дадаткова ўцягнута ў бюджэт 120 млн р. Устаноўлена арэндная плата за зямельныя ўчасткі для вырошчвання сельскагаспадарчай прадукцыі, дадаткова прыцягнуты 131 млн р. У мэтах эканоміі плацежных сродкаў і зніжэння нядоімкі праводзяцца ўлікі запазычанасці паміж суб'ектамі гаспадарання. У той жа час сітуацыя з рэалізацыяй бюджэту аказалася вельмі напружанай. Па чакаемай ацэнцы выкананне яго даходнай часткі вызначаецца ў 26,7 млрд р., што прыкладна на 5 млрд менш, чым намячалася. Такое становішча з выкананнем даходнай часткі раёна адэкватна адбілася на фінансаванні яго расходаў. Але пры ўсіх цяжкасцях у першачарговым парадку здзяйснялася фінансаванне заработнай платы, харчавання, медыкаментаў.

Прымаліся меры па эканоміі расходнай часткі бюджэту. Цяпер за ўсё трэба плаціць і жыць — за свой кошт.

Са справаздачы на сесіі райсавета старшыні раённага выканаўчага камітэта
Г. М. Лаўранкова

Вынікі эканамічнага і сацыяльнага развіцця раёна ў 1997 г.

...Вынікі работы народнай гаспадаркі раёна за 1997 г. сведчаць аб станоўчай дынаміцы функцыяніравання народнагаспадарчага комплексу. Выкананы важнейшыя заданні па сацыяльна-эканамічным развіцці, вызначаныя прэзідэнтам і ўрадам рэспублікі.

Прамысловасць. Аб'ём яе вытворчасці (510,9 млрд р.) узрос супраць узроўню 1996 г. у супастаўных цэнах на 24,1 %. З ростам на 52,5 % выпушчана тавараў народнага спажывання.

Сельскагаспадарчая вытворчасць. Аб'ём валавой прадукцыі склаў 48,6 млрд р., як і ў 1996 г. Дзяржзаказ па продажу збожжа раён выканаў на 106 %. Панесены страты на бульбяных палетках. У 1997 г. намецілася ўстойлівая тэндэнцыя павелічэння пагалоўя жывёлы і яе прадукцыйнасці. Дзяржзаказ па продажу малака выкананы на 113 %.

У **капітальным будаўніцтве** за кошт усіх крыніц фінансавання асвоена 95,8 млрд р., пры плане 86,9. Уведзены ўсе запланаваныя аб'екты, за выключэннем пускавога комплексу рамонтна-тэхнічнай базы АГП «Шклоўскае» і стадыёна сярэдняй школы ў п. Гавяды. Здадзена ў эксплуатацыю жылых дамоў агульнай плошчай 9135 кв. м, што і было прадугледжана праграмай на 1997 г.

Зрухі ў сацыяльнай сферы. На 81 % павялічыліся грашовыя даходы насельніцтва, а рэальная заработная плата павялічылася на 79 % і склала ў 1997 г. у прамысловасці — 1544 тыс. р., сельскай гаспадаркі — 1174, будаўніцтве — 1729, бюджэтнай сферы — 1600 тыс. р.

Не ўсё задуманае ў 1997 г. удалося ажыццявіць. І ўсё ж дасягнутыя вынікі дазваляюць сцвярджаць, што практычна ўсе працоўныя калектывы раёна здольны сёння не толькі іх замацаваць, але і дабіцца больш значных паказчыкаў.

«Ударны фронт». 1998. 6 лютага.

ЧАЛАВЕК СЛАЎНЫ ПРАЦАЙ

Удастоены звання Героя Сацыялістычнай Працы

БАРАНАВА Ніна Мітрафанаўна. Нарадзілася ў 1922 г. у в. Акунёўка. Бацька — удзельнік Кастрычніцкай рэвалюцыі і грамадзянскай вайны, памёр у 1927 г. Цяжка было маці выхоўваць шасцярых непаўналетніх дзяцей. Дапамагала савецкая ўлада. У 1931 г. сям'я ўступіла ў калгас. Яшчэ калі вучылася ў школе, Ніна часта прыходзіла на ферму і дапамагала сваёй старэйшай сястры Ульяне даглядаць жывёлу, прывучылася даіць кароў. Марыла стаць настаўніцай, але планам не дадзена было збыцца. Пачалася Вялікая Айчынная вайна...

Пасля вызвалення раёна Баранава Н. М. прымае актыўны ўдзел у станаўленні калгаса «Прамень камунізму» на радзіме мужа. Працавала звеннявой па лёну, брыгадзірам паляводчай брыгады. У 1959 г. на аснове дробных калгасаў быў створаны саўгас «Радзец», дзе Ніна Мітрафанаўна працуе цялятніцай, а ў 1960 г. пераводзіцца на свінаферму. Сваёй самаадданай працай яна дасягнула высокіх паказчыкаў. У 1971 г. атрымала ад кожнай з 45 свінаматак на 22 парасяты. Значна павялічыліся прывагі і саставілі 550—600 грамаў у дзень.

У 1971 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР за добрасумленную працу, высокія паказчыкі ў рабоце Баранавай Н. М. прысвоена званне Героя Сацыялістыч-

Н. М. Баранава

М. В. Другакоў

С. М. Дзікун

А. С. Каралёў

най Працы. Узнагароджана медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна».

Ніна Мітрафанаўна — маці-гераіня. Яна выхавала дзесяць дзяцей. Прывучала іх да працы. Усе яны атрымалі адукацыю і добрасумленна працуюць.

Баранава выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. У цяперашні час жыве ў вёсцы Гарадзец.

ВЕРАБ'ЁЎ Мікалай Васільевіч. Нарадзіўся ў в. Камароўка ў сям'і настаўніка. У 1961 г. узначаліў Чавускі будаўніча-мантажны ўчастак, з 1971 г. — перасоўную механізаваную калону «Сельспецмантаж». Удастоены звання Герой Сацыялістычнай Працы 8 красавіка 1971 г. Мае шэраг урадавых узнагарод.

М. В. Вераб'ёў жыве ў Чавусах.

ДРУГАКОЎ Мікалай Віктаравіч. Нарадзіўся ў 1930 г. у в. Азер'е. Пасля заканчэння сямігодкі і курсаў механізатараў працаваў трактарыстам. Зволіўшыся з радоў Савецкай Арміі, зноў стаў механізатарам у калгасе імя Андрэева.

За высокія вытворчыя паказчыкі ў 1972 г. Мікалай Віктаравіч узнагароджаны ордэнам Леніна, у 1971 г. — ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. У 1977 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Другакову Мікалаю Віктаравічу прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Другакоў М. В. — трактарыст першага класа. Свой вопыт перадае маладым механізатарам. З'яўляецца настаўнікам моладзі. Прымае актыўны ўдзел у грамадскім жыцці калгаса. На аснове механізаванага звяна Другакова М. В. у калгасе імя Андрэева створана школа перадавога вопыту па апрацоўцы і ўборцы бульбы.

Жыве ў вёсцы Азер'е.

ДЗІКУН Сяргей Мікалаевіч. Нарадзіўся ў 1922 г. у в. Кнышэвічы Светлагорскага р-на Гомельскай вобл. у сялянскай сям'і. Закончыў у 1940 г. Парычскую сярэднюю школу, затым паступіў у Ленінградскае авіяцыйна-тэхнічнае вучылішча, пасля заканчэння якога служыў у Савецкай Арміі. Актыўна ўдзельнічаў у Вялікай Айчыннай вайне, быў цяжка паранены.

Зволіўшыся з радоў Савецкай Арміі, С. М. Дзікун вучыўся ў Бабруйскай міжабласной школе, потым працаваў прапагандыстам Бабруйскага абкома партыі, загадчыкам парткабінета аддзела прапаганды і агітацыі, сакратаром Старобінскага райкома партыі.

Пасля заканчэння ў 1953 г. Рэспубліканскай партыйнай школы пры ЦК КПБ Сяргей Мікалаевіч працаваў намеснікам дырэктара па палітчастцы, сакратаром партыйнай арганізацыі Бераснёўскай МТС, сакратаром, другім сакратаром Кіраўскага райкома партыі.

У 1961 г. Дзікун выбіраецца першым сакратаром Шклоўскага райкома КПБ. На гэтай пасадзе ён працаваў больш сямнаццаці гадоў. За ўмелае кіраўніцтва сельскагаспадарчай вытворчасцю раёна Сяргею Мікалаевічу Дзікуну ў 1971 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

У 1978 г. быў зацверджаны старшынёй партыйнай камісіі пры Магілёўскім абкоме КПБ.

Дзікун С. М. прымаў актыўны ўдзел у грамадска-палітычным жыцці, карыстаўся глыбокай павагай і давер'ем працоўных. Ён быў дэлегатам XXIV з'езда партыі, выбіраўся членам ЦК КПБ, дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР сёмага склікання, членам Магілёўскага абкома КПБ, дэпутатам абласнога і раённага Саветаў народных дэпутатаў.

Памёр 7 кастрычніка 1978 года.

КАЛАСОЎСКІ Пётр Міхайлавіч. Нарадзіўся ў былым М. Старасселлі ў сям'і селяніна-беднякa. У 1917 г. закончыў пачатковую школу, у 1922 г. — 3 класы Старасельскай школы II ступені. Адразу пасля заканчэння школы юнак уступіў у камсамол і пачаў сваю працоўную дзейнасць у якасці ўпаўнаважанага па рабоце з батракамі ў былым Капыскім р-не ад райкома камсамола.

Потым Пётр нядоўгі час працуе рабочым Аршанскага цвікавога завода ў Барані. Далейшы лёс закінуў яго ў Самарскую губерню, куды ён прыехаў разам з родзічамі. У маі 1926 г. быў выбраны сакратаром Дзмітрыеўскага валаснога камітэта камсамола. Крыху пазней пераходзіць на партыйную работу.

Калі пачалася Вялікая Айчынная вайна, быў накіраваны сакратаром Волжскага райкома партыі. Быў узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалём «За доблесную працу ў Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.».

У пасляваенны час асабліва шмат увагі Пётр Міхайлавіч удзяляў развіццю сельскай гаспадаркі. У 1948 г. яму прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы за высокі ўраджай пшаніцы, вырашчаны ў Волжскім р-не ў 1947 г. Пётр Міхайлавіч часта наведваў Беларусь, сваё роднае Старасселле, радаваўся поспехам сваіх аднасяльчан.

Памёр у 1958 г. У музеі мясцовай школы змешчаны матэрыялы, якія расказваюць пра яго жыццё і працоўную дзейнасць.

КАРАЛЁЎ Аляксей Сямёнавіч. Нарадзіўся ў 1923 г. у сялянскай сям'і ў в. Новыя Сліжы. Бацька быў удзельнікам грамадзянскай вайны, адным з першых уступіў у сельскагаспадарчую арцель. Ён і прывіў любоў да тэхнікі сыну Алёшу. Калі ў вёсцы з'явіўся першы трактар, хлопчык не ўяўляў сабе жыццё без гэтай машыны. Пасля смерці бацькі ён спрабуе паступіць на курсы трактарыстаў пры Любінічскай МТС, але малады ўзрост перашкаджае. Толькі праз тры гады, у 1939 г., ён пачаў вывучаць трактар. Вясной 41-га закончыў курсы, але папрацаваць доўга не прыйшлося: пачалася вайна. Трактары Любінічскай МТС трэба было перагнаць у Траекураўскі р-н Разанскай вобл. На фронт трапіў толькі праз год. Служыў на Далёкім Усходзе. Пасля вайны паступае ў Мсціслаўскую школу механізацыі сельскай гаспадаркі. У 1951 г. заканчвае яе і з таго часу не пакідае камбайн, працуючы

К. С. Макарава

ў саўгасе «Гарадзішча», затым — «Юбілейны». Заўсёды быў лепшым у раёне. Убіраў па 500, 600 і больш гектараў. Да яго прыязджалі вучыцца, сам ездзіў да суседзяў, раскрываў свае сакрэты, а яны ў яго простыя: любоў да тэхнікі.

За высокія вытворчыя паказчыкі ў 1966 г. Каралёву А. С. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Узнагароджаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, многімі медалямі.

Каралёў А. С. выбіраўся дэпутатам Вярхоўнага Савета БССР. Зараз жыве ў вёсцы Новыя Сліжы.

МАКАРАВА Кацярына Сяргееўна. Нарадзілася ў 1918 г. у в. Заполле ў беднай сялянскай сям'і. У 1924 г. на сям'ю абрушваецца вялікае гора — памерла маці. Малалетняй Каце прыходзілася выконваць усю хатнюю работу. У 1931 г. сям'я ўступае ў калгас і жыццё стала наладжвацца.

Пасля сямігадовай школы Кацярына Сяргееўна ў 1936 г. паступае на курсы трактарыстаў. Яна паспяхова заканчвае вучобу і накіроўваецца на работу ў Любінічскую МТС. Працуе трактарысткай.

Разам з мужам, Яфімам Макаравым, добрасумленна працуе ў калгасах зоны Любінічскай МТС. Падрасталі дзеці.

У гады Айчыннай вайны сям'я Макаравых пазнала ўсе жахі фашысцкай акупацыі.

Пасля вызвалення прыйшлося шмат і настойліва працаваць над аднаўленнем свайго калгаса.

У 1957 г. Кацярына Сяргееўна назначаецца звеннявой па вырошчванні лёну ў калгасе імя Кірава. Звяно пад кіраўніцтвам Макаравай дабіваецца вялікіх поспехаў, штогод атрымліваючы з кожнага гектара па 8—11 ц ільновалакна.

У 1971 г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР Макаравай Кацярыне Сяргееў

Н. І. Ніканава

В. Г. Пархоменка

К. А. Патапава

П. М. Сяркоў

не за высокія паказчыкі ў вырошчванні лёну прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Кацярына Сяргееўна жыве ў вёсцы Славені, знаходзіцца на заслужаным адпачынку.

НІКАНАВА Ніна Іванаўна. Нарадзілася ў 1933 г. у в. Сцефанова Горацкага р-на ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі ў 1958 г. накіроўваецца на работу галоўным аграномам ва ўзбуйненую сельскагаспадарчую арцель імя Кірава. Зарэкамендавала сябе ўмелым кіраўніком сельскагаспадарчай вытворчасці. Ніна Іванаўна шмат увагі надае пытанням развіцця земляробства, далейшага нарошчвання аб'ёмаў вытворчасці і нарыхтовак зерня, бульбы, ільнопрадукцыі на аснове шырокага выкарыстання дасягненняў навукі і перадавога вопыту.

Вялікая творчая работа аграномічнай службы, якую доўгі час узначальвала Н. І. Ніканава, дазваляла калгасу пры любым надвор'і атрымліваць стабільна высокія ўраджаі. За кошт інтэнсіўнага выкарыстання зямлі, укаранення ў вытворчасць высокаўраджайных кармавых культур у гаспадарцы створана трывалая кармавая база для грамадскага статка.

За вялікія заслугі перад Радзімай у 1983 г. Ніканавай Ніне Іванаўне прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Яна ўзнагароджана двума ордэнамі Леніна, ордэнамі Кастрычніцкай Рэвалюцыі і «Знак Пашаны».

Ніканавай Н. І. прысвоена ганаровае званне «Заслужаны работнік сельскай гаспадаркі БССР».

У сучасны момант Ніна Іванаўна жыве ў вёсцы Мікіцінічы.

ПАРХОМЕНКА Васіль Гаўрылавіч. Нарадзіўся 1.03.1930 г. у в. Радзвінава Шчорскага р-на Чарнігаўскай вобл. у сям'і рабочага. Пасля заканчэння школы працаваў кінамеханікам у Асіповіцкім р-не. З 1951 па 1956 г. служыў у Савецкай Арміі. З 1956 па 1958 г. працаваў інспектарам аддзела культуры Шклоўскага райвыканкома.

У лютым 1958 г. быў выбраны старшынёй калгаса імя Кірава Шклоўскага р-на. У той час гэтая гаспадарка была эканамічна слабай, на нізкім узроўні знаходзіліся земляробства і жывёлагадоўля.

Пад непасрэдным кіраўніцтвам Васіля Гаўрылавіча з года ў год узмацнялася матэрыяльна-тэхнічная база, інтэнсіўна вяліся жывёлагадоўля і раслінаводства, узрасла прадукцыйнасць працы. Гэта дало свае станоўчыя вынікі.

За працоўныя поспехі ў восьмай пяцігодцы гаспадарка ўзнагароджана ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга. Пастановай бюро Магілёўскага абкома КПБ і аблвыканкома калгасу прысвоена званне «Гаспадарка высокай культуры земляробства». Узровень вытворчасці мяса на 100 га сельскагаспадарчых угоддзяў дасягнуў 352,8 ц. Гаспадарка штогод выконвае планы продажу дзяржаве ўсіх відаў прадукцыі. Калгас 11 разоў з'яўляўся пераможцам ва Усесаюзным сацыялістычным спаборніцтве і ўзнагароджваўся пераходным Чырвоным сцягам ЦК КПСС, Савета Міністраў СССР, ВЦСПС і ЦК ВЛКСМ. Калгас імя Кірава быў неаднаразовым удзельнікам УДНГ СССР.

За вялікія заслугі ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці Пархоменку В. Г. указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 8 красавіка 1971 г. прысвоена званне Героя Сацыялістычнай Працы. Ён таксама ўзнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР і шматлікімі медалямі.

Пархоменка В. Г. неаднаразова выбіраўся дэпутатам абласнога, раённага і мясцовага Саветаў народных дэпутатаў, членам Магілёўскага абкома КПБ, членам бюро Шклоўскага райкома КПБ. Прымаў актыўны ўдзел у руху барацьбы за мір.

Памёр 20 снежня 1987 года.

ПАТАПАВА Кацярына Антонаўна. Нарадзілася 10.01.1928 г. у в. Старасселле ў сялянскай сям'і. Да вайны вучылася ў школе, марыла прадоўжыць вучобу ў ВНУ. Але мары не здзейсніліся. Пачалася Вялікая Айчынная вайна.

Пасля выгнання нямецка-фашысцкіх захопнікаў камсамолка Патапава прымае актыўны ўдзел у аднаўленні свайго роднага калгаса «Чырвоны ўдарнік». Спачатку працуе звеннявой па льну, затым прызначаецца брыгадзірам паляводчай брыгады. Як актыўную камсамолку яе выбіраюць дэлегатам на XVIII з'езд ЛКСМБ.

У 1949 г. Кацярына Антонаўна накіроўваецца на работу ва ўзбуйнены калгас імя Фрунзе. Працуе свінаркай па вырошчванні парасят. Калектыў свінафермы неаднаразова заваёўваў права ўдзельнічаць ва Усесаюзнай сельскагаспадарчай выстаўцы. Свінарка Патапава К. А. тры разы ўзнагароджвалася медалём выстаўкі.

Сваёй працавітасцю і стараннасцю Кацярына Антонаўна дабівалася вялікіх поспехаў, атрымлівала ад кожнай свінаматкі па 20—22 парасяты і болей.

Партыя і ўрад высока ацанілі працу калгасніцы. Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР ад 22 сакавіка 1966 г. за высокія паказчыкі ў рабоце ёй прысвоена высокае званне Героя Сацыялістычнай Працы.

Патапава К. А. выбіралася дэпутатам Вярхоўнага Савета СССР.

У цяперашні час жыве ў вёсцы Старасселле.

СЯРКОЎ Піліп Міхайлавіч. Нарадзіўся 20.01.1905 г. у в. Старасселле. З ранніх гадоў пачаў працаваць, дапамагаючы бацькам у сельскагаспадарчай працы. Пасля заканчэння пачатковай школы шмат часу аддае самаадукацыі.

Калі ў Любінічах была створана камсамольская ячэйка, Сяркоў П. М. адным з першых уступае ў камсамол, дзе прымае актыўны ўдзел у рабоце з моладдзю.

У 1929 г. сям'я Сяркоўых уступае ў калгас, а Піліп накіроўваецца на вучобу. Ён паспяхова заканчвае Шклоўскую міжраённую школу калгасных кадраў і накіроўваецца на работу ў родныя мясціны. Спачатку прызначаецца брыгадзірам калгаса «Чырвоны ўдарнік», а ў хуткім часе калгаснікі выбіраюць яго старшынёй.

На выбарах у мясцовыя Саветы ў 1938 г. Сяркоў П. М. выбіраецца дэпутатам і сакратаром Гарадзецкага сельсавета.

У гады Вялікай Айчыннай вайны прымае ўдзел у партызанскім руху ў Беларусі. Пасля вызвалення раёна ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў Піліп Міхайлавіч накіроўваецца на работу загадчыкам Шклоўскага камунгаса. У 1945 г. уступае ў члены КПСС. Дэпутаты горада аказалі Сяркову вялікае давер'е, выбраўшы яго старшынёй гарадскога Савета народных дэпутатаў. Але душа хлебароба цягнулася да зямлі. Па рэкамендацыі райкома КПБ у 1949 г. калгаснікі калгаса «Чырвоны ўдарнік» выбіраюць яго старшынёй арцелі. У 1950 г. выбіраецца старшынёй узбуйненага калгаса імя Фрунзе, дзе бесперапынна працуе да выхаду на пенсію.

За дваццаць гадоў на пасадзе старшыні калгаса Сяркоў П. М. праявіў сябе як здольны арганізатар і кіраўнік сельскагаспадарчай вытворчасці.

Званне Героя Сацыялістычнай Працы Сяркову П. М. прысвоена ў 1966 г. Узнагароджаны таксама ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга і многімі медалямі. Памёр 1 сакавіка 1988 года.

Узнагароджаныя ордэнам Леніна

АНДРЭЙЧЫКАВА Антаніна Дзмітрыеўна — звеннявая калгаса «Зара» (1972).

АРЦЁМ'ЕЎ У. Л. — старшыня калгаса «Пяцігодка ў чатыры гады» (1949).

БАБКОВА Марыя Астапаўна — свінарка калгаса імя Андрэева (1973).

ВІННІКАЎ Гаўрыла Максімавіч — Шклоў, чыгуначнік (1960).

ВОЛКАЎ Уладзімір Сяргеевіч — дыспік Шклоўскага лясніцтва (1970).

ГАЛІЦА Трафім Іванавіч — дырэктар саўгаса «Гарадзішча» (1978, 1980).

Т. І. Галіца

У. І. Паўловіч

С. М. Ганчароў

ГАНЧАРОЎ Сямён Мікалаевіч — узнагароджаны ў час вайны (1945).

ГАРШОВА Настасся Сямёнаўна — свінарка калгаса імя Фрунзе (1978).

ГЕЛАХАВА Марыя Захараўна — галоўны аграном калгаса імя Фрунзе (1977).

ГРОМАЎ Мікалай Данілавіч — механізатар саўгаса «Гарадзішча» (1971).

ГРЫШАНАЎ Павел Восіпавіч — старшыня калгаса імя Леніна (1955).

ДАВЫДЗЕНКА Лідзія Іванаўна — галоўны аграном саўгаса «Рабочы» (1979).

ДРАЗДОЎ Мікалай Пятровіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса «Праўда» (1984).

ЖЫПРАЎ Міхаіл Іванавіч — брыгадзір саўгаса «Рабочы» (1977).

ЗАЛУЦКАЯ (Халянкова) Тамара Яграўна — ільнавод калгаса імя Фрунзе (1970).

ЗОЦІКАЎ Віктар Дзмітрыевіч — механізатар племсаўгаса «Гарадзішча» (1977).

КАВАЛЁЎ Фёдар Фядосавіч — трактарыст саўгаса «Гарадзішча» (1975).

КАЗІМІРАВА Софія Барысаўна — цялятніца калгаса імя Андрэева (1973).

КАЗЛОЎ Віктар Захаравіч — механізатар калгаса імя Свярдлова (1973).

КАЎРЫЖКА Фёдар Фядосавіч — узнагароджаны ў час вайны (1941).

КЛІМЯНКОЎ Аляксандр Емяльянавіч — старшыня калгаса «Зара» (1972).

ЛІПКІНА Марыя Макараўна — звеняявая калгаса імя Фрунзе (1966).

МАЖАРАВА Таццяна Васільеўна — галоўны заатэхнік калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973).

МАТРОНКІН Уладзімір Пятровіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса «Праўда» (1978).

ПАЎЛОВІЧ Уладзімір Іванавіч — сетачнік папяровай фабрыкі «Спартак» (1978).

ПАДВОЙСКІ Іван Данілавіч — старшыня райвыканкома (1969).

ПРОХАРАЎ Ілья Арцёмавіч — трактарыст калгаса імя Фрунзе (1977).

РУДЧАНКА Фёдар Рыгоравіч — былы сакратар РК КПБ (1949).

РУБАНАЎ Віктар Восіпавіч — трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973).

САБАЛЕЎСКІ Пётр Аляксандравіч — чыгуначнік (1969).

СЕЛЯДЦОЎ Фёдар Васільевіч — узнагароджаны ў час вайны.

СЛЯПЦОВА Ганна Пракопаўна — звеняявая па льну калгаса імя Кірава (1973).

СОБАЛЕВА Пелагея Васільеўна — настаўніца Шклоўскай рускай сярэдняй школы (1969).

ФІЛІПЕНКА Аляксей Мацвеевіч — галоўны аграном калгаса імя Свярдлова (1973).

ШУГАЛЕЙ Генадзь Сяргеевіч — галоўны бухгалтар калгаса «Зара» (1973).

ШЧАРБАКОВА Арына Гаўрылаўна — майстар змены льнозавода (1965).

Узнагароджаныя ордэнам Кастрычніцкай Рэвалюцыі

БЕДУШЭЎСКІ Міхаіл Сяргеевіч — слесар раённага аб'яднання «Сельгастэхніка» (1973).

ГАРБАТЫ Мікалай Якаўлевіч — былы старшыня калгаса імя Андрэева (1973).

ГРОМАЎ Мікалай Данілавіч — свінар саўгаса «Гарадзішча» (1976).

ДЗЕМЯНКОВА Марыя Пятроўна — цялятніца калгаса імя Кірава (1984).

ДРАЗДОВА Лідзія Мацвееўна — свінарка калгаса імя Фрунзе (1975).

ДУМЛЕР Аляксандр Георгіевіч — старшыня калгаса імя Фрунзе (1986).

ЖЫПРАЎ Міхаіл Іванавіч — начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Рабочы» (1973).

КАВАЛЁЎ Фёдар Фядосавіч — трактарыст племсаўгаса «Гарадзішча» (1982).

КАДУШКІНА Варвара Сцяпанаўна — намеснік старшыні калгаса імя Фрунзе (1985).

КІЦА Юрый Пятровіч — старшыня калгаса імя Фрунзе (1975).

НІКАНАВА Ніна Іванаўна — галоўны аграном калгаса імя Кірава (1976).

ПАРХОМЕНКА Васіль Гаўрылавіч — старшыня калгаса імя Кірава (1981).

РАМАНЕНКА Міхаіл Мікалаевіч — трактарыст калгаса «Зара» (1973).

САВЕЛЬЕВА Вольга Аляксандраўна — даярка саўгаса «Рабочы» (1973).

САЛДАЦЕНКА Алена Васільеўна — галоўны аграном калгаса «Запаветы Леніна» (1977).

СЯЧКОЎ Валянцін Емяльянавіч — загадчык свінафермы племсаўгаса «Гарадзішча» (1977).

ТРУСАЎ Леанід Максімавіч — трактарыст калгаса «Дняпроўскі» (1977).

Узнагароджаныя ордэнам Дружбы народаў

ІВАШНЁЎ Віктар Васільевіч — электраманцёр папяровай фабрыкі «Спартак» (1986).

КІРЫЛАЎ Аляксандр Сцяпанавіч — механізатар саўгаса «Юбілейны» (1988).

МАТРОСАЎ Мікалай Цімафеевіч — загадчык вытворчага ўчастка саўгаса «Гарадзішча» (1984).

САФРОНАВА Лідзія Сілівестраўна — повар аб'яднання грамадскага харчавання (1982).

СВІРСКІ Браніслаў Ягоравіч — слесар раённага аб'яднання «Сельгастэхніка» (1988).

Узнагароджаныя ордэнам Працоўнага Чырвонага Сцяга

АБУХОЎСКАЯ Лідзія Антонаўна — даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1988).

АДАМАВА Фядора Данілаўна — свінарка калгаса імя Свярдлова (1966).

АКУЛЁНАК Вікенцій Фёдаравіч — дырэктар саўгаса «Спартак» (1966).

АНІСЕНКА Ніна Мацвееўна — даярка калгаса «Запаветы Леніна» (1981).

АНІСІМАЎ Рыгор Філімонавіч — трактарыст калгаса імя Фрунзе (1977).

АТРОШКІНА Валянціна Андрэеўна — даярка калгаса «Авангард» (1973).

АТРОШКІН Фёдар Іванавіч — сакратар парткома калгаса імя Фрунзе (1975).

АЎТУХОВА Ганна Емяльянаўна — даярка калгаса імя Кірава (1975).

АФАНАСЬЕВА Тамара Прохараўна — свінарка калгаса «Запаветы Леніна» (1973).

АФАНАСЬЕЎ Міхаіл Фёдаравіч — галоўны ветэрынарны ўрач раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі (1966).

БАЖАНАЎ Фёдар Іванавіч — трактарыст калгаса імя Дзяржынскага (1973).

БАРКОЎСКАЯ Тамара Іванаўна — калгасніца калгаса «Маяк» (1973).

БАРКОЎСКІ Канстанцін Васільевіч — жывёлавод калгаса «Маяк» (1973).

БАРЫСАЎ Пётр Міхайлавіч — шафёр калгаса імя Карла Маркса (1973).

БАТУРЭВІЧ Вольга Пятроўна — звеняявая калгаса «Бальшавік» (1966).

БУГАЕНКА Алена Пятроўна — даярка саўгаса «Гарадзец» (1973, 1982).

БУКЕТАВА Аксіння Трафімаўна — даярка саўгаса «Гарадзец» (1973).

БЯЛЯЕЎ Мікалай Іларыёнавіч — сакра-

тар партыйнай арганізацыі саўгаса «Рабочы» (1973).

БЯСПАЛКА Ганна Макараўна — свінарка саўгаса «Гарадзішча» (1975).

ВАЛУЕВІЧ Іван Савасцьянавіч — былы начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Гарадзец» (1973).

ВАРАНЦОЎ Аляксандр Аляксандравіч — машыніст папераробчай машыны папяровай фабрыкі «Спартак» (1974).

ВАРАНЦОЎ Пётр Цімафеевіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса імя Андрэева (1977).

ВАСІЛЬЕВА Ганна Савельеўна — цялятніца саўгаса «Гарадзец» (1966).

ВЕРАМ'ЁЎ Уладзімір Іванавіч — трактарыст калгаса «Ударнік» (1975).

ВІЁТКА Мікалай Міхайлавіч — старшыня калгаса «Ударнік» (1966).

ГАЛІНОЎСКАЯ Клаўдзія Міхайлаўна — даярка калгаса «Шлях да камунізму» (1973).

ГАЛІНОЎСКАЯ Любоў Васільеўна — калгасніца калгаса «Рассвет» (1973).

ГАЛІЦА Трафім Іванавіч — дырэктар саўгаса «Гарадзішча» (1966).

ГАЛКОЎСКІ Восіп Фаміч — начальнік цэха папяровай фабрыкі «Спартак» (1974).

ГАЎРУСЕЎ Сцяпан Якаўлевіч — трактарыст калгаса «Зара» (1973).

ГРЫГОР'ЕВА Марыя Сазонаўна — даярка калгаса імя Карла Маркса (1966).

ДАВІДОВІЧ Антаніна Францаўна — даярка саўгаса «Гарадзец» (1981).

ДАВЫДЗЕНКА Лідзія Іванаўна — галоўны аграном саўгаса «Рабочы» (1973).

ДАРАШКЕЕЎ Рыгор Данілавіч — намеснік дырэктара саўгаса «Гарадзец» (1973).

ДЗЕНІСЕВІЧ Мікалай Фёдаравіч — трактарыст калгаса «Праўда» (1977).

ДЗІКУН Сяргей Мікалаевіч — першы сакратар РК КПБ (1966, 1973, 1978).

ДРАЗДОЎ Мікалай Пятровіч — брыгадзір калгаса «Праўда» (1972, 1973).

ДРУГАКОЎ Уладзімір Астапавіч — трактарыст калгаса імя Андрэева (1973).

ЕМЯЛЬЯНАЎ Віктар Сцяпанавіч — сакратар партыйнай арганізацыі калгаса імя Кірава (1973).

ЗАРУБІЦКІ Апанас Фёдаравіч — дырэктар саўгаса «Гарадзец» (1966).

ЗДАРАВІКОЎ Іван Васільевіч — камбайнер калгаса імя Свярдлова (1977).

ЗОЦІКАЎ Віктар Дзмітрыевіч — звеняявы саўгаса «Гарадзішча» (1973).

ІВАНОВА Зоя Елісееўна — галоўны заатэхнік калгаса «Зара» (1973).

ІЎКІНА Таццяна Ціханаўна — звеняявая калгаса «Запаветы Леніна» (1972).

КАВАЛЁЎ Віктар Іванавіч — трактарыст калгаса «Радзіма» (1973).

КАВАЛЁЎ Фёдар Фядосавіч — трактарыст саўгаса «Гарадзішча» (1973).

КАВАЛЁЎ Васіль Фаміч — галоўны бухгалтар калгаса імя Фрунзе (1978).

КАВАЛЬКОВА Вольга Цітаўна — даярка калгаса імя Кірава (1973).

КАВАЛЁЎ Яўген Рыгоравіч — звеняявы саўгаса «Рабочы» (1973).

КАДУШКІНА Варвара Сцяпанаўна — галоўны эканаміст калгаса імя Фрунзе (1973).

КАЖАМЯКА Лідзія Канстанцінаўна — свінарка калгаса «Радзіма» (1973).

КАЖАМЯКА Надзея Паўлаўна — даярка калгаса імя Свярдлова (1973).

КАКУШКА Уладзімір Аляксандравіч — машыніст папераробчай машыны папяровай фабрыкі «Спартак» (1986).

КАЛІНОВІЧ Юлія Фядосаўна — даярка саўгаса «Юбілейны» (1973).

КАНАХОЎСКІ Аляксандр Дзмітрыевіч — старшыня калгаса імя Карла Маркса (1977).

КАТУШКІН Пётр Міхайлавіч — старшыня калгаса «Запаветы Леніна» (1972).

КАТЛОЎСКІ Канстанцін Сямёнавіч — трактарыст калгаса «Уперад» (1973).

КІРГІЗАВА Ніна Іванаўна — даярка саўгаса «Юбілейны» (1973).

КІСЯЛЁЎ Мікіта Рыгоравіч — загадчык свінагадоўчай фермы калгаса імя Фрунзе (1966).

КЛІМЯНКОВА Кацярына Цітаўна — даярка калгаса імя Кірава (1966).

КЛІМЯНКОЎ Аляксандр Емяльянавіч — старшыня калгаса «Зара» (1973).

КЛЯЦКО Міхаіл Трафімавіч — начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Рабочы» (1973).

КОГАЛЬ Валянціна Міхайлаўна — брыгадзір участка льнозавода (1974).

КРУПЕНЬКА Ніна Іларыёнаўна — калгасніца калгаса «Запаветы Леніна» (1973).

КРУПЕНЬКА Міхаіл Дзмітрыевіч — трактарыст калгаса «Запаветы Леніна» (1975).

КРУПЕНЬ Настасся Васільеўна — цялятніца калгаса «Дняпроўскі» (1975).

КУЛЬКОВА Марыя Сямёнаўна — даярка калгаса «Зара» (1975).

КУТУЗАВА Ева Фёдараўна — даярка калгаса «Зара» (1966, 1973).

ЛАДУЦЕНКА Марыя Кірылаўна — брыгадзір калгаса імя Дзяржынскага (1972).

ЛАЎРОВА Надзея Васільеўна — даярка саўгаса «Рабочы» (1973).

ЛЕАНЕНКА Аляксей Фёдаравіч — брыгадзір калгаса «Ударнік» (1973).

ЛЕЎДЗІКАЎ Аляксей Сцяпанавіч — камбайнер калгаса імя Фрунзе (1972).

ЛІПСКІ Міхаіл Іванавіч — трактарыст калгаса «Запаветы Леніна» (1977).

ЛУК'ЯНАВА Валянціна Трафімаўна — даярка калгаса імя Свярдлова (1977).

МАГІЛЁЎЦАЎ Міхаіл Мінавіч — брыгадзір калгаса імя Карла Маркса (1973).

МАЗАЛЬКОЎ Віктар Сяргеевіч — трактарыст калгаса імя Леніна (1982).

МАЛІНОЎСКАЯ Таццяна Сцяпанаўна — настаўніца СШ № 1 (1976).

МАРКЕВІЧ Васіль Андрэевіч — трактарыст калгаса «Радзіма» (1973).

МАРОЗАЎ Мікалай Панфілавіч — трактарыст калгаса «Зара» (1977).

МАТРОНКІН Уладзімір Пятровіч — брыгадзір калгаса «Праўда» (1973).

МАТРОСАЎ Міхаіл Цімафеевіч — начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Гарадзішча» (1973).

МАЦВЕЕНКА Надзея Іванаўна — даярка калгаса «Бальшавік» (1966).

МЕЛЬНІКАЎ Васіль Сафонавіч — трактарыст калгаса «50 год Кастрычніка» (1972).

МІЛЬТО Аркадзь Дзмітрыевіч — старшыня калгаса імя Свярдлова (1973).

МІЦКЕВІЧ Настасся Рыгораўна — льнаводка, в. Александрыя (узнагароджана да вайны).

НІКІЦІН Аляксандр Епіфанавіч — старшыня калгаса «Дняпроўскі» (1977).

ПАБЯДЗІНСКІ Пётр Нікіфаравіч — трактарыст саўгаса «Гарадзец» (1973).

ПАДОЛЬСКАЯ Галіна Восіпаўна — намеснік начальніка вытворчага ўчастка саўгаса «Спартак» (1972).

ПАДСКРОБКІН Уладзімір Макаравіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса імя Фрунзе (1975).

ПАПКОВА Любоў Мікалаеўна — аграном калгаса імя Кірава (1976).

ПАРХОМЕНКА Васіль Гаўрылавіч — старшыня калгаса імя Кірава (1966).

ПАЎЛОВІЧ Дзмітрый Сямёнавіч — трактарыст калгаса «Праўда» (1973).

ПАЎЛОВІЧ Вера Міхайлаўна — калгасніца калгаса «Радзіма» (1973).

ПАЎЛЮЧЭНКА Фёдар Іванавіч — дырэктар саўгаса «Рабочы» (1973).

ПАЎЛЮЧЭНКА Яўгенія Андрэеўна — даярка калгаса «Праўда» (1977).

ПЕРЧАНКОЎ Віктар Васільевіч — брыгадзір калгаса імя Свярдлова (1973).

ШНТАЛЮШКА Іван Рыгоравіч — шафёр Магілёўскага вытворчага аўтакамбіната № 1 (1973).

ПРАВАЛІНСКАЯ Марыя Аляксандраўна — звеняявая калгаса «Маяк» (1973).

ПРАКОФ'ЕЎ Валянцін Яфімавіч — трактарыст калгаса «Перамога» (1975).

ПРОХАРАЎ Ілья Арцёмавіч — трактарыст калгаса імя Фрунзе (1973).

ПУЧКОВА Раіса Іванаўна — даярка калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1975).

РАДЗЬКОЎ Мікалай Несцеравіч — свінар калгаса імя Фрунзе (1973).

РАТНІКАВА Марыя Мацвееўна — даярка саўгаса «Рабочы» (1975).

РУБАШАВА Ганна Раманаўна — брыгадзір калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1977).

РЫЖКОЎ Леанід Емяльянавіч — шафёр саўгаса «Гарадзішча» (1973, 1978).

САЛДАЦЕНКА Алена Васільеўна — галоўны аграном калгаса «Запаветы Леніна» (1973).

САМСОНАЎ Віктар Іванавіч — камбайнер калгаса «Запаветы Леніна» (1977).

САЎКІНА Валянціна Аляксандраўна — старшыня калгаса імя Дзяржынскага (1977).

САЎЧАНКА Віктар Сцяпанавіч — трактарыст калгаса «Маяк» (1975).

СІГЕЙКІНА Алена Максімаўна — з'ём-шчыца льновалакна льнозавода (1966).

СІГЕЙКІН Анатоль Фёдаравіч — шафёр Магілёўскага вытворчага аўтакамбіната № 1 (1973).

СІЛКІНА Зінаіда Пятроўна — галоўны бухгалтар райспажыўсаюза (1975).

СКАРАБАГАТЫ Анатоль Якаўлевіч — галоўны ветурач саўгаса «Гарадзішча» (1973).

СЛЯПЦОВА Ганна Пракопаўна — звеняявая калгаса імя Кірава (1966).

СКРЫГАН Надзея Паўлаўна — даярка калгаса імя Андрэева (1966).

СМАЛЯКОЎ Іван Уладзіміравіч — шафёр калгаса «Дняпроўскі» (1973).

СТРУКАЎ Мікалай Пракопавіч — трактарыст калгаса імя Карла Маркса (1977).

СУДАКОЎ Анатоль Кірылавіч — старшыня калгаса «50 год Кастрычніка» (1975).

СЯРКОЎ Міхаіл Канстанцінавіч — трактарыст калгаса імя Фрунзе (1973).

ТАМАШЭВІЧ Анатоль Кузьміч — старшыня калгаса «Праўда» (1977).

ТАМАШЭВІЧ Зінаіда Іванаўна — цялятніца калгаса «Маяк» (1981).

ТКАЧУК Аляксандр Антонавіч — пашальён раённага вузла сувязі (1974).

ТУРБІНСКІ Леанід Рыгоравіч — шафёр Магілёўскага вытворчага аўтакамбіната № 1 (1973).

УСАВА Софія Канстанцінаўна — начальнік вытворчага ўчастка саўгаса «Гарадзец» (1973).

ФАЦКАЯ Ева Пятроўна — цялятніца калгаса «50 год Кастрычніка» (1973).

ФЕДАРОВІЧ Валянціна Сцяпанаўна — звеннявая калгаса «Маяк» (1973).

ФЕДЧАНКА Уладзімір Аксёнавіч — трактарыст саўгаса «Гарадзішча» (1972).

ФЯДОТАЎ Іван Пятровіч — намеснік начальніка вытворчага ўчастка саўгаса «Гарадзішча» (1973).

ХАЛЮКОВА Марыя Яфімаўна — звеннявая калгаса імя Фрунзе (1973).

ХОРТАЎ Аляксей Макаравіч — камбайнер саўгаса «Рабочы» (1973).

ЦІТОВА Лідзія Дзмітрыеўна — даярка калгаса імя Андрэева (1973).

ЦОДАЎ Мікалай Васільевіч — шафёр калгаса імя Свярдлова (1973).

ЦЫМБАЛАЎ Мікалай Цімафеевіч — начальнік вытворчага ўчастка калгаса імя Фрунзе (1973).

ЦЫМБАРЭВІЧ Карл Віктаравіч — трактарыст калгаса «Шлях да камунізму» (1972).

ШАБУЛДА Віктар Сцяпанавіч — брыгадзір калгаса імя Свярдлова (1973).

ШАЙКОВА Ніна Іванаўна — звеннявая калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973).

ШАЙКОВА Ніна Паўлаўна — звеннявая калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1973).

ШАЙКОЎ Анатоль Сцяпанавіч — трактарыст калгаса «Чырвоны Кастрычнік» (1977).

ШАКАЛЕЦ Іван Восіпавіч — камбайнер калгаса імя Кірава (1972).

ШАСТАКОЎ Емяльян Навумавіч — загадчык свінагадоўчай фермы калгаса імя Фрунзе (1966).

ШУЛЬГОЎСКАЯ Валянціна Восіпаўна — старшая прадаўшчыца магазіна гарадскога спажывецкага таварыства (1974).

ШУРПЯЛЁЎ Анатоль Лукіч — брыгадзір калгаса імя Карла Маркса (1977).

ШУЦКАЎ Фядос Васільевіч — каваль міжкалгаснай будаўнічай арганізацыі (1977).

ШЧАРБАКОЎ Даніла Міхайлавіч — камбайнер калгаса імя Кірава (1982).

ШЧАРБАКОЎ Мікалай Іванавіч — трактарыст калгаса «1 Мая» (1973).

ШЧАРБІНСКАЯ Рыма Кірылаўна — начальнік раённага вытворчага ўпраўлення сельскай гаспадаркі (1966).

ЯГОЎДЗІК Фёдар Міхайлавіч — загадчык вытворчага ўчастка калгаса імя Фрунзе (1972).

ЯРМОЛЕНКА Софія Раманаўна — даярка калгаса імя Карла Маркса (1977).

Прысвоена званне «Маці-гераіня»

АНЦЮКОВА Вольга Яўсееўна — в. Палыкавічы.

АЎТУХОВА Марыя Пятроўна — калгас імя Кірава.

БАРАНАВА Ніна Мітрафанаўна — в. Гарадзец.

ГЛАДЗІКАВА Паліна Міронаўна — в. Тросна.

ІВАНОВА Ганна Андрэеўна — в. Забродзе.

ІСАКАВА Софія Кузьмінічна — калгас імя Кірава.

КАЗІМІРАВА Софія Барысаўна — в. Еўдакімавічы.

МАШКОВА Софія Фёдараўна — в. Смальянцы.

МІЛЬТО Марыя Апанасаўна — г. Шклоў.

НЯЧАЕВА Раіса Міхайлаўна — в. Вялікая Камароўка.

ПЯТРОВА Ніна Макараўна — в. Старасселле.

СЕНАКОСАВА Раіса Лук'янаўна — в. Фашчаўка.

СІДАРАВА Ефрасіння Міхайлаўна — калгас «Аб'яднаная праца» былога Чарнянскага сельсавета.

СКАПЦОВА Ніна Ягораўна — в. Тросна.

СОБАЛЕВА Вольга Андрэеўна — в. Гаваракі.

СУДЗЕЙНАЯ Ніна Нікіфараўна — в. Чарапы.

ЯКАС Тамара Мікалаеўна — саўгас «Юбілейны».

Прафесары са Ржаўцаў

Мне шчасціць на сустрэчы з цудоўнымі людзьмі нашай роднай зямлі. За шматгадовую журналісцкую дзейнасць нямала было знаёмстваў з людзьмі, чыё жыццё — сапраўдны подзвіг, гонар і слава Шклоўшчыны. І вось яшчэ адно знаёмства — з сям'ёй Варанковых са Ржаўцаў.

...Сустрэцца, праўда, давялося толькі з **Аляксандрам Аляксандравічам ВАРАНКОВЫМ**. Ён вырас у вялікай сялянскай сям'і, дзе гадавалася пяць дзяцей — дзве сястры і тры браты. Каб зрабіць «жывую» капейку, бацька Аляксандр Ягоравіч быў вымушаны пайсці працаваць на папяровую фабрыку. Рабочай справе ён прысвяціў амаль паўстагоддзя.

Час ішоў, дзеці падрасталі, Аляксандр найшоў бацькоўскай жыццёвай дарогай, выбраў прафесію паперніка. Разам з жонкай Кацярынай Аляксееўнай выхавалі трох дзяцей, якія атрымалі вышэйшую адукацыю і паспяхова працуюць у розных галінах народнай гаспадаркі краіны. Браты **Іван і Мікалай** сталі навукоўцамі, дасягнулі звання прафесараў.

Іван яшчэ да Айчыннай вайны закончыў сераднюю школу, паступіў у Ленінградскі горны інстытут. Паспеў правучыцца тут адзін год. Яго здольнасці ў вучобе былі заўважаны, але студэнта прызвалі на вайсковую службу. Не пашанцавала салдату. Палову тэрміну адслужыў і яго камісавалі з-за хваробы. Іван вярнуўся ў родную вёску. Пэўны час лячыўся, потым уладкаваўся працаваць у Шклоўскім райана. Калі стан здароўя крыху палепшыўся, паехаў у Маскву на універсітэт імя Ламаносава, дзе паступіў на гістарычны факультэт. Падараная прыродай фенаменальная памяць, ад бацькоў атрыманая ў спадчыну працавітасць, сваё жаданне набыць як мага больш глыбокіх ведаў, падтрымка і дапамога выкладчыкаў далі добрыя ўсходы. Паспяхова закончыў вучобу і атрымаў дыплом з адзнакай. Затым былі аспірантура, работа выкладчыкам гісторыі на факультэце, абарона дысертацыі. Стаў прафесарам, дэканам гістарычнага факультэта, кіраваў кафедрай. Хвароба, аднак, паскорыла прыход трагічнага дня...

— Аляксандр Аляксандравіч, а якім быў бацька Мікалай?

— Самы малодшы ў сям'і, ён цяжкімі жыццёвымі вёрстамі настойліва крочыў да вышыні навукі, і ўзнагарода за яго настойлівасць у дасягненні сваёй мары — званне

М. А. і І. А. Варанковы

А. А. Гадуноў

прафесара, высокакваліфікаванага біёлага. Ён да таго паспеў закончыць Полацкі лесатэхнікум, адслужыў належны тэрмін у Савецкай Арміі, некаторы час працаваў садаводам у Батанічным садзе ў Маскве, тут жа паступіў на біялагічны факультэт Маскоўскага дзяржаўнага універсітэта імя Ламаносава. З Батанічным садам не парываў сувязі. Яшчэ будучы студэнтам, тут ажыццяўляў доследныя работы, вынікі якіх затым выкарыстаў, працягваючы вучобу ў аспірантуры, у навуковых мэтах. Сёння прафесар **Мікалай Аляксандравіч Варанкоў** вядомы ў навуковым свеце біёлаг, плённа працуе ў адным з маскоўскіх навукова-даследчых інстытутаў.

С. Жукоўская

ГАДУНОЎ Аляксандр Антонавіч, н. у 1921 г. у в. Фашчаўка ў сям'і селяніна. Пасля заканчэння сярэдняй школы ў 1939 г. з атэстатам выдатніка паступіў у Ленінградскі універсітэт, які закончыў пасля вайны. Ваяваў на фронце танкістам. У 1945 г. — камандзір роты цяжкіх танкаў ІС-122. Пасля цяжкага раненя пазбавіўся рукі. З 1950 г. на працягу 20 гадоў працаваў у Ленінградскім дзяржаўным універсітэце, дзе прайшоў шлях ад аспіранта да прафесара, дэкана эканамічнага факультэта. Пяць гадоў загадваў кафедрай управлення вытворчасцю Ленінградскага інжынерна-эканамічнага інстытута імя П. Тальяці. У 1976 г. па запрашэнні пераязджае ў Мінск у інстытут народнай гаспадаркі і працуе на пасадзе загадчыка кафедры ўпраўлення да 1991 г. У сувязі з арганізацыяй Акадэміі ўпраўлення пераходзіць на работу ў гэтую навучальную

А. Е. Дарасевіч

В. Ц. Ісаеў

У. М. Канаплёў

У. А. Лаліні

ўстанову. Вучоны падрыхтаваў 13 кандыдатаў эканамічных навук, аўтар звыш 50 навуковых прац.

Ратны і працоўны шлях А. А. Гадунова адзначаны шэрагам узнагарод — ордэнамі Аляксандра Неўскага, Айчыннай вайны I і II ступеняў, многімі медалямі і ганаровымі граматамі.

А. А. Гадуноў памёр 10.02.1994 г., пахаваны на радзіме.

Л. Анціпенка

ДАРАСЕВІЧ Аляксандр Еўдакімавіч, н. 28.10.1946 г. у в. Папоўцы ў сям'і калгасніка. Пасля заканчэння сярэдняй школы № 3 г. Шклова год працаваў старшым піянерважатым Барсукоўскай спецшколы. Закончыў Смаленскі медыцынскі інстытут. Яшчэ студэнтам падрыхтаваў некалькі навуковых прац. Пасля заканчэння інстытута стаў аспірантам, з 1980 г. — аспірантам кафедры паталагічнай анатоміі, старшым навуковым супрацоўнікам даследчай лабараторыі інстытута. У снежні 1987 г. прайшоў па конкурсу на пасаду загадчыка кафедры паталагічнай анатоміі. Сумесна з прафесарам У. У. Зарудзіным падрыхтаваў манаграфію «Асноўныя прынцыпы інтэграцыі паталагічнай анатоміі з медыка-біялагічнымі дысцыплінамі», якая атрымала высокую адзнаку на III Усесаюзнай навукова-метадычнай канферэнцыі. А. Е. Дарасевіч таксама аўтар рада іншых навуковых прац. Доктар медыцынскіх навук. Прафесар. У 1994 г. створана новае навукова практычнае аб'яднанне — Смаленскі абласны інстытут паталогіі. Яго, поруч з абавязкамі загадчыка кафедры, узначаліў Аляксандр Еўдакімавіч. А яшчэ ён прэзідэнт грамадскай арганізацыі — Смаленскай асацыяцыі вучоных.

В. Паўлава

ІСАЕЎ Віктар Цітавіч, н. 7.11.1937 г. у в. Камароўка. У 1956 г. закончыў Каменна-Лаўскую СШ. У 1956—1960 гг. — служба ў Паўночным ВМФ (падводнік). Пасля звальнення вучыўся ў Мінскім педінстытуце імя А. М. Горкага на гісторыка-геаграфічным факультэце, які закончыў у 1965 г. з адзнакай і быў пакінуты працаваць у інстытуце асістэнтам на кафедры ўсеагульнай гісторыі.

З 1969 па 1971 г. быў аспірантам; абараніў кандыдацкую дысертацыю на тэму «Падрыхтоўка і рост кадраў рабочага класа БССР у пасляваенныя гады (1945—1950)». З 1977 па 1990 г. — дэкан па рабоце з замежнымі студэнтамі, пасля — дацэнт кафедры славянскай гісторыі і метадалогіі гістарычных навук. У розных выданнях апублікавана каля 30 навуковых прац, навукова-папулярных артыкулаў.

Г. Напрэеў

КАНАПЛЁЎ Уладзімір Мікалаевіч, н. 3.01.1954 г. у в. Акуленцы Магілёўскага р-на. Адукацыя вышэйшая — у 1975 г. закончыў Магілёўскі педінстытут. Па прафесіі — настаўнік геаграфіі. З 1975 па 1976 г. працаваў у спецшколе г. Шклова. У 1976—1977 гг. служыў у радах Савецкай Арміі. Пасля звальнення — педработа ў СШ № 3. З 1983 па 1994 г. — работа ў органах унутраных спраў, настаўнік-выхавальнік Шклоўскай спецшколы-інтэрната.

Канаплёў У. М. займаўся педагагічнай дзейнасцю і адначасова ў 1993—1994 гг. з'яўляўся даверанай асобай і памочнікам народнага дэпутата Вярхоўнага Савета РБ Лукашэнкі А. Р. Пасля яго перамогі на прэзідэнцкіх выбарах з 10 ліпеня 1994 г. працаваў галоўным памочнікам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь.

28 мая 1995 г. Канаплёў У. М. выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета РБ трынаццатага склікання па Шклоўскай выбарчай акрузе № 177. Узначаліў дэпутацкую фракцыю «Згода», з'яўляўся членам Прэзідыума Вярхоўнага Савета. Пасля рэферэндуму 1996 г. выбраны намеснікам Старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь.

М. Бабок

КАЧАНАЎ Фёдар Яфімавіч, пахаваны на вясковых могілках у Зароўцах. На радзіме бацькоў знайшоў адважны лётчык свой апошні прытулак. Да гэтага ж у яго быў вялікі і гераічны шлях.

Пачаў яго Фёдар Качанаў пасля сямігодкі. Па закліку «Камсамолец, на самалёт!» ён паступае ў Тамбоўскае авіяцыйнае вучылішча.

Успамінае былы авіяцыйны механік Іван Чарэйка: «...Восенню 1941 г., атрымаўшы накіраванне ў 380-ы знішчальны авіяполк, упершыню сустрэўся з капітанам Фёдарам Яфімавічам Качанавым. Было нашаму камандзіру палка ў той час 28 гадоў. Аднак, нягледзячы на маладосць, лётчык ён быў вопытны, адважны. Гэтаму вучыў і падначаленых.

Дарэчы, калі ў дзень першамайскага свята 1942 г. Ф. Я. Качанаву было прысвоена званне маёра, яго грудзі ўпрыгожваў ордэн Чырвонага Сцяга. І атрымаў ён гэтую ўзнагароду ў баях супраць японцаў, калі быў у Кітаі».

Вялікая Айчынная вайна працягвалася, а ў палку, дзе служыў маёр Качанаў, маладыя лётчыкі спасцігалі азы паветраных баёў перад адпраўкай на фронт. Сваю баявую практыку ім перадаваў Фёдар Яфімавіч.

У пасляваенны час палкоўнік Ф. Я. Качанаў быў камандзірам палка, злучэння. Апошняе месца службы генерал-маёра авіяцыі Качанава — Далёкі Усход.

Я. Данцоў

«Ударны фронт». 1987. 21 сакавіка.

ЛАЛІНІ Уладзімір Альбертавіч, н. у 1947 г. у паселішчы Сант-Антоніс на поўначы Італіі ў сялянскай сям'і. Праз 6 гадоў

паступіў у першы клас пачатковай школы. А ў 1957 г. разам з бацькамі пераехаў у Беларусь, у Шклоў — на радзіму маці, якая была вывезена акупантамі на працу ў Германію ў 1942 г. Пасля набыцця сярэдняй адукацыі ў СШ № 3 г. Шклова паступіў у Віцебскі медыцынскі інстытут, які закончыў у 1970 г. За выдатныя поспехі ў вучобе быў рэкамендаваны ў клінічную ардынатуру па тэрапіі. У 1973 г. паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю па раздзелу кардыялогіі. З 1975 па 1977 г. — старшы навуковы супрацоўнік буйнога маскоўскага НДІ. У 1978 г., знаходзячыся на стажыроўцы ў Балонскім універсітэце (Італія), здаў экстэрнам экзамены, абараніў дыпломную работу і атрымаў званне доктара медыцыны гэтага універсітэта. З 1979 г. працуе ў Віцебскім медыцынскім інстытуце, прайшоў усе ступені навукова-педагагічнай лесвіцы — ад асістэнта да прафесара, загадчыка кафедры шпітальнай тэорыі і функцыянальнай дыягностыкі. У 1989 г. абараніў доктарскую дысертацыю ў Каўнаскай медыцынскай акадэміі.

За час работы ў інстытуце апублікаваў 83 навуковыя працы, падрыхтаваў трох кандыдатаў навук. Займаецца навуковымі даследаваннямі ў галіне выкарыстання тэорыі катастроф у кардыялогіі.

Л. Анціпенка

МАІСЕЕНКАЎ Аляксандр Макаравіч, н. 6.07.1936 г. у в. Баброва Дубровенскага р-на. З 1939 па 1954 г. жыў у Шклове. Закончыў СШ № 2 з залатым медалём, паступіў у Маскоўскі інстытут тонкай хімічнай тэхналогіі імя Ламаносава, які паспяхова закончыў у 1960 г. Вучыўся ў аспірантуры Інстытута арганічнай хіміі імя М. Дз. Зялінскага. У 1964 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1974 г. — доктарскую. Прафесар. Член-карэспандэнт Расійскай акадэміі навук (1990). Працаваў загадчыкам лабараторыі ў Інстытуце арганічнай хіміі імя М. Дз. Зялінскага, нам. рэдактара часопіса «Органическая химия». Навуковая спадчына налічвае больш за 250 навуковых прац і патэнтаў.

Памёр 1 лістапада 1992 г.

Н. Буйніцкая

МАРЦЭЛЕЎ Станіслаў Віктаравіч, н. 1.01.1925 г. у в. Шарыбаўка Буда-Кашалёўскага р-на. Гісторык. Член-карэспандэнт

А. М. Маісеенкаў

С. В. Марцэлеў

Я. П. Мікалуцкі

Г. Л. Напрэеў

АНБ (1980), сапраўдны член (акадэмік) Міжнароднай акадэміі інфармацыйных тэхналогій і ўпраўленчых ведаў (1996), доктар гістарычных навук (1972), прафесар (1992). Лаўрэат Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь (1990).

Да Айчыннай вайны жыў у Шклове. Бацька працаваў на льнозаводзе. У 1939—1941 гг. вучыўся ў сярэдняй школе № 2. Удзельнік партызанскага руху.

У 1950 г. закончыў гістарычны факультэт БДУ. Працаваў рэдактарам раённай газеты і газеты палітаддзела МТС (г. п. Відзы). З 1953 г.— у апараце ЦК КПБ: інструктар, заг. сектара, з 1965 г.— заг. аддзела культуры. У 1976—1995 гг.— дырэктар Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АНБ, з 1995 г. — саветнік пры дырэкцыі МЭФ НАНБ.

Надрукаваў больш за 300 навуковых прац, у тым ліку 9 манаграфій. Падрыхтаваў 7 кандыдатаў навук. Адзін са стваральнікаў 7-томнага (у 8 кнігах) «Збору помнікаў гісторыі і культуры Беларусі», сааўтар і галоўны рэдактар 6-томнай «Гісторыі выяўленчага мастацтва Беларусі».

Старшыня праўлення Беларускага таварыства аховы помнікаў гісторыі і культуры і Нацыянальнага камітэта РБ па вывучэнні і распаўсюджванні ведаў аб славянскіх культурах. У 1980—1991 гг.— рэдактар часопіса «Помнікі гісторыі і культуры Беларусі».

У 1967—1980 гг.— дэпутат Вярхоўнага Савета БССР.

Узнагароджаны трыма ордэнамі Працоўнага Чырвонага Сцяга, ордэнамі Айчыннай вайны I ступені, «Знак Пашаны», 10 медалямі.

Асноўныя працы: Печать Советской Белоруссии. Мн., 1967; На путях строительства социализма (Печать Белоруссии в 1926—1937 гг.). Мн., 1972; К духовному расцвету (исторический опыт развития белорусской советской культуры). Мн., 1974; Художественная культура Белоруссии на современном этапе. Мн., 1978; Печать Белоруссии в период развитого социализма. Мн., 1982.

Г. Напрэеў

МАРЧАНКА Яфім Цімафеевіч, н. у 1913 г. у в. Мікалаеўка. Бацька займаўся сельскай гаспадаркай. У 1932 г. пайшоў. Маці працавала ў калгасе да пачатку вайны. Яфім да 1928 г. жыў з бацькам і, закончыў 6 класаў Шклоўскай сямігодкі. Слабае матэрыяльнае становішча не дало магчымасці прадоўжыць вучобу, і ён у 1928 г. паступае ў Магілёўскую прафшколу будаўнікоў, але і яе з-за цяжкіх матэрыяльных умоў не закончыў. У 1929 г. працуе на будаўніцтве фабрыкі штучнага валакна ў Магілёве. Вучыцца ў ФЗВ, а з пускам фабрыкі працуе ў хімічным цэху.

У 1930 г. як 25-тысячнік быў накіраваны ў вёску. Працуе старшынёй выканкома Сімакавіцкага сельсавета Бялыніцкага р-на. У 1931—1932 гг. з'яўляецца старшынёй Цянерынскага сельсавета Круглянскага р-на. Некалькі месяцаў быў намеснікам загадчыка Бялыніцкага раённага зямельнага аддзела. З 1932 па 1934 г. працуе старшынёй Галоўчынскага сельсавета.

Яфім Цімафеевіч паступова падымаўся па службовай лесвіцы. У 1934—1935 гг. ён — дырэктар Бялыніцкай нарыхтоўчай канторы Крыху больш за 2 гады служыў у Чырвонай Арміі. Тут ён заканчвае курсы палкавой школы НКУС УССР. Будучы памочнікам камандзіра ўзвода, вучыцца ў Днепрапятроўскім вячэрнім КамВНУ начсаставу НКУС. У 1937 г.— інструктар палітработы дывізіёна 159-га палка НКУС УССР. Звольніўшыся са службы, прыязджае ў 1939 г. у Магілёў, дзе займае пасаду палітрука лётнай часці Магілёўскага аэраклуба. Адначасова вучыцца на пілота. У маі таго ж года Магілёўскі гарваенкамат адпраўляе Марчанку ў 2-ю Беларускую стралковую дывізію на курсы ўдасканалення каманднага саставу запасу. А праз некалькі месяцаў у саставе гэтай дывізіі на пасадзе камандзіра кулямётнага ўзвода, потым камандзіра кулямётнай роты 200-га стралковага палка прыняў удзел у вызваленчым паходзе ў Заходнюю Беларусь. У снежні 1939 г. Марчанка пераводзіцца ў 50-ю стралковую дывізію, якая адпраўляецца на Фінскі фронт.

У час Вялікай Айчыннай вайны знаходзіўся ў дзеючай арміі на Заходнім, Паўднёва-Заходнім, 3-м Украінскім, 1-м Беларускім франтах на пасадах камандзіра батальёна, начальніка аператыўнага аддзела, начальніка штаба дывізіі, камандзіра дывізіі. Ён — удзельнік абарончых баёў у Беларусі, на Смаленшчыне, пад Масквой, вызвалення Данбаса, Адэсы, Варшаўска-Пазнанскай і Берлінскай аперацый.

Вось паслужны спісак атрымання ім воінскіх званняў: 1940 — лейтэнант, 1941 — старшы лейтэнант, капітан, 1942 — маёр, падпалкоўнік, 1943 — палкоўнік, 1953 — генерал-маёр, 1959 — генерал-лейтэнант. Пасля вайны закончыў Ваенную акадэмію Генеральнага штаба Узброеных Сіл СССР, камандаваў брыгадай, дывізіяй, быў першым намеснікам камандуючага войскамі Уральскай ваеннай акругі, першым намеснікам начальніка Вышэйшых курсаў «Выстрал» імя Б. Н. Шапашнікава.

Дзяржава высока ацаніла заслугі Я. Ц. Марчанкі. Ён узнагароджаны ордэнам Леніна, трыма ордэнамі Чырвонага Сцяга, ордэнам Суворава II ступені, двума ордэнамі Чырвонай Зоркі, медалямі.

Я. Ц. Марчанка памёр 24.01.1980 г.

В. Гузаў

«Ударны фронт». 1989. 28 снежня.

МІКАЛУЦКІ Яўген Пятровіч, н. 20.11.1959 г. у в. Саськаўка. Пасля заканчэння Фашчаўскай СШ вучыўся ў Беларускай сельскагаспадарчай акадэміі. Спецыяльнасць па адукацыі — эканаміст-арганізатар сельскагаспадарчай вытворчасці. У 1982—1988 гг. працаваў начальнікам жывёлагадоўчага комплексу, галоўным эканамістам племгаса «Гарадзішча» Шклоўскага р-на, два гады (11.1982—10.1984) узначальваў камсамольскую арганізацыю гэтай гаспадаркі. З 1988 па 1994 г. працаваў у сістэме кантрольна-рэвізійных органаў Магілёўскага аблвыканкома, Галоўнага ўпраўлення эканамічнага кантролю Дэпартамента эканамічнага кантролю па Магілёўскай вобласці. З 1994 г.— начальнік Галоўнага ўпраўлення Службы кантролю Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь па Магілёўскай вобласці. Са снежня 1996 г.— старшыня Камітэта дзяржаўнага кантролю па Магілёўскай вобласці.

У маі 1995 г. выбраны дэпутатам Вярхоўнага Савета Рэспублікі Беларусь ад Круглянска-Бялыніцкай выбарчай акругі № 163. З'яўляўся членам камісіі па заканадаўству Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь.

6 кастрычніка 1997 г. у выніку тэрарыстычнага акта загінуў. Як адзначалася Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь і ва ўрадавым некралогу, Я. П. Мікалуцкага «вызначалі выключна адказныя адносіны да даручанага ўчастка работы. Гэта быў ініцыятыўны, валявы і прынцыповы кіраўнік, які ўмеў згуртаваць калектыў, аб'ектыўна і ўзважана ацаніць сітуацыю, прыняць правільнае рашэнне... Уважлівыя і чулыя адносіны да людзей, што былі характэрныя для Я. П. Мікалуцкага, у поўнай меры праявіліся ў дэпутацкай дзейнасці ў Нацыянальным сходзе Рэспублікі Беларусь».

Г. Напрэеў

НАПРЭЕЎ Георгій Лаўрэнцьевіч, н. 1.05.1923 у в. Ордаць. Кандыдат гістарычных навук (1963), дацэнт (1966); закончыў Рэспубліканскую партыйную школу (1951), Мінскі педінстытут імя А. М. Горкага (1953), аспірантуру АН БССР (1963). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны (07.1941—05.1945). Пасля звальнення з СА ў 1948 г.— інструктар РК КПБ (Шклоў, 1948—1949), рэдактар газеты палітаддзела МТС (Поразава, Гродзенская вобл., 09.1951—07.1953), інструктар аддзела агітацыі і прапаганды ЦК КПБ (07.1953—05.1958), рэдактар «Блакнота агітатара» (05.1958—05.1964), загадчык кафедры журналістыкі, моў і літаратуры Мінскай ВПШ (05.1964—10.1984).

В. І. Новікаў

Галоўныя кірункі навуковых даследаванняў — партызанскі рух у гады Вялікай Айчыннай вайны, развіццё сельскай гаспадаркі ў пасляваенныя гады, арганізацыя і планаванне работы рэдкалектываў.

Член рэдкалегіі і адзін з аўтараў выдання «Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков в годы Великой Отечественной войны». Мн. Т. 2. 1984; Т. 3. 1985.

НОВІКАЎ Васіль Іванавіч, н. 23.02. 1911 г., в. Чорная Рыжкаўскага сельсавета. Пасля заканчэння чатырохгадовай працоўнай школы (1922) некаторы час працаваў на бацькоўскай зямлі, а ў 1930 г. скончыў трохмесячныя курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў і атрымаў права весці заняткі ў пачатковых класах. Вучыўся ў Магілёўскім педвучылішчы. Са снежня 1933 г. па верасень 1935 г. працаваў дырэктарам Дамановіцкай НСШ (Мазырскі р-н). Тады ж закончыў курсы сацыяльна-гістарычнага аддзялення Магілёўскага педінстытута. Настаўнічаў у Ельскай сярэдняй школе, у 1937—1938 гг.— у сярэдняй школе № 3 г. Армавіра. У 1939—1940 гг. хварэў, некаторы час працаваў у вучкамбінаце, сакратаром Армавірскага ГК ВЛКСМ. Са жніўня 1940 па 15 лістапада 1941 г. вучыўся ў Вышэйшай партыйнай школе пры ЦК ВКП(б). Накіраваны на партработу ў г. Ашхабад. З 1942 г.— на фронце, палітработнік. Служыў у Савецкай Арміі да жніўня 1946 г. Пасля звальнення працаваў загадчыкам аддзела ў Віцебскім абкоме партыі, затым сакратаром Маладзечанскага АК КП(б)Б. Адначасова ў Маладзечанскім настаўніцкім інстытуце быў выкладчыкам, часова выконваў абавязкі заг. кафедры асноў марксізму-ленінізму. У 1948 г. прыняты на вучобу ў Акадэмію грамадскіх навук (Масква). Абараніў кандыдацкую дысертацыю па спецыяльнасці філосаф. Накіраваны на работу ў Чыцінскую вобласць на пасаду сакратара абкома ВКП(б)Б. Там таксама працаваў выкладчыкам у абласной 2-гадовай партшколе. У 1954 г. зацверджаны ў вучоным званні дацэнт. Пасля скасавання Маладзечанскай вобласці працаваў, да выхаду на пенсію, у Мінскай вышэйшай партыйнай школе ў якасці дацэнта кафедры філасофіі.

Г. Напрэеў

ПАЛЯКОЎ Аляксандр Максімавіч, н. у 1939 г. у в. Бушлякі ў сялянскай сям'і. Скончыў пачатковую школу, потым Каменна-Лаўскую СШ. Два гады служыў у Савецкай Арміі. У 1961 г. паступіў у Кіеўскі інстытут народнай гаспадаркі на факультэт эканомікі прамысловасці. Са студэнцтва заняўся навуковай працай. Пасля атрымання дыплома размяркоўваецца на машынабудаўнічы завод. Неўзабаве прызначаецца начальнікам пададдзела Дзяржплана Украіны. Крыху пазней становіцца кіраўніком сектара планавання і кан'юнктуры рынку Міністэрства машынабудавання лёгкай і харчовай прамысловасці СССР.

У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, затым выкладаў у Кіеўскім тэхналагічным інстытуце харчовай прамысловасці на эканамічным факультэце. Быў загадчыкам кафедры эканомікі. Падрыхтаваў два падручнікі для студэнтаў па эканоміцы харчовай прамысловасці, некалькі манаграфій, 120 іншых навуковых работ. Сярод іх найбольш значныя: «Развіццё і размяшчэнне важнейшых галін харчовай прамысловасці», «Эфектыўнасць вытворчасці малочнай прамысловасці», «Павышэнне эфектыўнасці галін аграпрамысловага комплексу», «Прагноз развіцця сялянскай гаспадаркі для назапашвання харчовых тавараў», «Развіццё рынкавых адносін у новых умовах гаспадарання». У 1988 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Праз год яму было прысвоена званне прафесара. У 1991 г. вучоны выбіраецца акадэмікам аграрнай акадэміі Украіны. У 1994 г. А. М. Палякоў пераехаў у Беларусь. У Магілёўскім тэхналагічным інстытуце прызначаны на пасаду загадчыка кафедры эканомікі і арганізацыі вытворчасці.

Н. Буйніцкая

РАІНЧЫК Васіль Пятровіч, н. 7.03. 1950 г. у в. Чарапы. Закончыў Шклоўскую

музычную школу па класу баяна, тры курсы Магілёўскага музычнага вучылішча па класу баяна і Мінскую сярэднюю спецыяльную музычную школу пры кансерваторыі па класу фартэпіяна. Беларускую Дзяржаўную кансерваторыю закончыў па класу фартэпіяна ў выкладчыка В. В. Шацкага і па класу кампазіцыі ў народнага артыста СССР прафесара Г. А. Глебава.

Васілём Раінчыкам напісана больш за 120 песень, канцэрт для фартэпіяна з аркестрам, кантата «Мальчыш-Кібальчыш» для дзіцячага хору, салістаў і сімфанічнага аркестра, сімфанічныя варыяцыі, балет «Крылы над Расіяй», значная колькасць камерна-інструментальных твораў, народнай, эстраднай, электроннай музыкі.

В. Раінчык — член Саюза кампазітараў, мастацкі кіраўнік ансамбля «Верасы». З кастрычніка 1997 г. з'яўляецца галоўным дырэктарам, музыкальным кіраўніком Дзяржаўнага маладзёжнага тэатра эстрады.

За вялікі ўклад у беларускую нацыянальную культуру В. Раінчыку прысвоена званне «Народны артыст Беларусі». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны».

Г. Напрэеў

РОСМАН Іосіф Самуілавіч, н. у 1913 г. у в. Старасселле. Працаваць пачаў, яшчэ калі быў школьнікам. У 1929 г. уступіў у камсамол. Быў дэлегатам I Усебеларускага з'езда рабселькораў. У 1934 г. закончыў Мінскі педінстытут, пасля чаго стаў выкладчыкам гісторыі на рабфаку ў г. Бабруйску. Год служыў у Чырвонай Арміі, пасля звальнення працаваў дырэктарам сярэдняй школы ў г. Бабруйску, дырэктарам полацкага педвучылішча. Са снежня 1938 па верасень 1940 г.— у апараце ЦК КП(б)Б: інструктар, лектар. З верасня 1940 па лістапад 1941 г. вучыўся ў ВПШ пры ЦК ВКП(б), адкуль накіраваны на партработу ў Казахстан: працаваў заг. аддзела Сяміпалацінскага гаркома партыі, намеснікам заг. аддзела Сяміпалацінскага АК КП(б)К. У кастрычніку 1944 г. адазваны ў распараджэнне ЦК КП(б)Б. Займаў пасады памочніка другога сакратара ЦК, заг. аддзела друку, паліграфіі і выдавецтваў. З 1950 г.— выкладчык гісторыі партыі ў Рэспубліканскай, пазней — Мінскай вышэйшай партыйнай школе, дзе працаваў амаль 40 гадоў. Абараніў кандыдацкую дысертацыю. У снежні 1975 г. абараніў доктарскую дысертацыю па тэматыцы гісторыі Кампартыі Беларусі ў перадваенныя гады. Прафесар.

В. П. Раінчык

І. С. Росман

За шматгадовую плённую працу, актыўны ўдзел у грамадскім жыцці Росману І. С прысвоена званне «Заслужаны работнік Вышэйшай школы Беларускай ССР». Узнагароджаны ордэнам «Знак Пашаны», многім медалямі СССР, трыма Ганаровымі грамацтамі Вярхоўнага Савета БССР.

Памёр у 1996 г.

Г. Напрэеў

РЭДЗЬКО Усевалад Пятровіч, н. у 1937 г. у Шклове. Закончыў СШ № 2 (1954), Ленінградскі электравакуумны тэхнікум (1956). Вышэйшую адукацыю атрымаў у Томскім дзяржаўным універсітэце і быў пакінуты на кафедры эксперыментальнай фізікі. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, затым працаваў старшым навуковым супрацоўнікам у Сібірскім фізіка-тэхнічным інстытуце. З 1972 г.— у Магілёўскім аддзяленні інстытута фізікі АНБ: навуковы супрацоўнік, вучоны сакратар, заг. лабараторыі. У 1985 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Прафесар. З 1987 г.— нам. дырэктара інстытута фізікі па навуковай рабоце, кіраўнік Магілёўскага аддзялення АН БССР, з 1992 г.— дырэктар-арганізатар, з 1993 г.— дырэктар Інстытута прыкладной оптыкі АНБ.

У. П. Рэдзько рэзультатыўна працуе ў галіне інтэгральнай оптыкі, з'яўляецца аўтарам 130 навуковых работ, у тым ліку 22 аўтарскіх пасведчанняў на вынаходніцтва. У 1984 г. адзначаны Дзяржаўнай прэміяй БССР у галіне навукі і тэхнікі. У 1996 г. абраны членам-карэспандэнтам НАН Беларусі.

Г. Напрэеў

У. П. Рэдзько

Э. А. Сенакосаў:

намічных навук (1972), званне дацэнта (1977) і прафесара (1993). З 1964 г. вядзе навукова-педагагічную работу ў ВНУ (Кішынёў, Цірaспаль), выконвае абавязкі загадчыка кафедры эканамічнай тэорыі і дэкана факультэта (1984—1997).

Пад кіраўніцтвам праф. Л. Р. Сенакосавай распрацоўваліся планы комплекснага развіцця асобных рэгіёнаў Рэспублікі Малдова. Ёю апублікаваны 3 манаграфіі і каля 100 навуковых работ па праблемах эканомікі.

Л. Р. Сенакосава — старшыня рэспубліканскага навукова-метадычнага Савета па грамадска-эканамічных навуках. Выбіралася дэпутатам гарадскога Савета і гаркома КПМ.

Н. Буйніцкая, Г. Напрэеў

СЕНАКОСАЎ Эдуард Аляксандравіч, н. 2.07.1937 г. у в. Фашчаўка ў сям'і служачага. Пасля заканчэння ў 1955 г. Фашчаўскай СШ працаваў на мясцовай МТС. З 1956 па 1960 г. служыў у Ваенна-марскім флоце СССР. У 1965 г. з адзнакай закончыў фізіка-матэматычны факультэт Кішынёўскага дзяржаўнага універсітэта. Усе гады вучобы з'яўляўся ленінскім стыпендыятам. У 1971 г. абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1990 г. прысуджана вучоная ступень доктара фізіка-матэматычных навук, у 1993 г. — званне прафесара. За навуковыя дасягненні ў галіне тэхналогіі паўправадніковых матэрыялаў і прыборных элементаў на іх аснове Э. А. Сенакосаву прысвоена званне лаўрэата Дзяржаўнай прэміі ў галіне навукі і тэхнікі (1989). Пад яго кіраўніцтвам падрыхтавана 7 кандыдатаў навук. Ім надрукавана каля 150 навуковых работ, атрымана 5 патэнтаў на вынаходніцтва.

З 1965 г. Э. А. Сенакосаў вядзе педагагічную работу ў ВНУ, выконваючы ў розны час абавязкі дэкана, загадчыка кафедраў. З 1994 г. з'яўляецца загадчыкам кафедры цвёрдацельнай электронікі і кіраўніком навукова-даследчай лабараторыі ў Прыднястроўскім дзяржуніверсітэце (г. Цірaспаль). Апошнія дзесяць гадоў — член і вучоны сакратар Савета па абароне дысертацый па спецыяльнасці «фізіка паўправаднікоў і дыэлектрыкаў», член навукова-метадычнага савета Маскоўскага дзяржаўнага педагагічнага універсітэта.

СЕНАКОСАВА Людміла Рыгораўна, н. у в. Чамаданы. У 1956 г. закончыла Фашчаўскую СШ, у 1964 г. — Кішынёўскі дзяржаўны універсітэт і атрымала адукацыю эканаміста. Мае вучоную ступень кандыдата эка-

ПОСТАНОВЛЕНИЕМ ЦЕНТРАЛЬНОГО КОМИТЕТА КПСС
И СОВЕТА МИНИСТРОВ СССР
от 31 октября 1989 года
ПРИСУЖДЕНА
ГОСУДАРСТВЕННАЯ ПРЕМИЯ СССР
СУБОЧУ
Валерию Станиславовичу —
за создание крупногабаритных взаимозаменяемых опор
№ 22267
МОСКВА

В. С. Субач. У цэнтры кіравання касмічнымі палётамі (другі справа)

С. М. Сямешчанка

СЯМЕШЧАНКА Софія Мікалаеўна. Напярэдадні свята Вялікага Кастрычніка ЦК КПСС і Савет Міністраў СССР прысудзілі вялікай групе перадавікоў навукі, тэхнікі, літаратуры, мастацтва і архітэктуры Ленінскія і Дзяржаўныя прэміі СССР 1986 года. Сярод узнагароджаных — і наша зямлячка, начальнік вытворчага ўчастка калгаса імя Кірава.

«Ударны фронт». 1986. 11 лістапада.

ФАДЗЕЕЎ Валерый Аляксеевіч, н. 1.01.1946 г. у в. Навасёлкі. У 1962 г. закончыў Гарадзішчанскую СШ. Пасля вучыўся ў тэхнічным вучылішчы, да 1966 г. працаваў у Чалябінску токарам, слесарам кантрольна-вымяральных прыбораў і аўтаматыкі. Пасля пераезду ў Мінск да 1973 г. быў токарам ў адным з цэхаў трактарнага завода, намеснікам сакратара камітэта камсамола. У 1973—1975 гг. — інструктар, заг. сектара, нам. загадчыка аддзела Мінскага абкома ЛКСМБ. З адзнакай скончыў вячэрняе аддзяленне юрыдычнага факультэта БДУ.

З 1975 па 1994 г. працаваў у юрыдычным упраўленні апарату Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь: рэферэнт, старшы рэферэнт, намеснік начальніка аддзела, намеснік начальніка ўпраўлення, начальнік упраўлення. Удзельнічаў у падрыхтоўцы шэрага законапраектаў Рэспублікі Беларусь, у тым ліку законаў аб уласнасці, аб арэндзе, аб прадпрыемствах, аб прадпрымальніцтве, аб эканамічнай няздольнасці і банкруцтве, аб процідзеянні манапалістычнай дзейнасці і развіцці канкурэнцыі. Аўтар некалькіх навуковых прац па юрыдычнай тэматыцы. У складзе рабочай групы канстытуцыйнай камісіі прымаў удзел у падрыхтоўцы праекта Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь. З красавіка 1994 г. па снежань 1996 г. з'яўляўся членам, намеснікам старшыні Канстытуцыйнага суда Рэспублікі Беларусь.

Узнагароджаны медалём «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна». У 1995 г. прысвоена званне «Заслужаны юрыст Рэспублікі Беларусь».

Г. Напрэеў

ФІЛІПАЎ Уладзімір Іванавіч, н. 12.12. 1911 г. у в. Старасселле, генерал-лейтэнант (1963). Заслужаны работнік культуры РСФСР (1968). Член КПСС з 1938 г. У Чырвонай Арміі з 1929 г. Закончыў Аб'яднаную Беларускую ваенную школу імя ЦВК БССР (1932), Інстытут фізкультуры ў Ленінградзе (1960). Удзельнік вызвалення Заходняй Беларусі ў 1939 г., савецка-фінляндскай вайны 1939—1940 гг. У Айчынную

В. І. Шабайлаў

В. В. Шынкароў

вайну на Паўднёвым, Паўднёва-Заходнім, Закаўказскім, Паўночна-Каўказскім, 1-м і 2-м Прыбалтыйскім франтах: камандзір танкавага батальёна, нам. камандзіра, камандзір танкавай брыгады, камандуючы бранятанкавымі і механізаванымі войскамі арміі. Пасля вайны — на адказных пасадах ў войску, ВНУ. У 1962—1970 гг. — старшыня спартыўнага камітэта Міністэрства абароны СССР.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941—1945. Мн., 1970. С. 606.

ШАБАЙЛАЎ Віктар Іванавіч, н. 8.02.1931 г. у в. Мікалаеўка. Юрыст. Член-карэспандэнт АНБ (1986), доктар юрыдычных навук (1980), прафесар (1992), заслужаны дзеяч навукі Беларусі (1994).

У 1948—1951 гг. — студэнт Магілёўскага педвучылішча. 1951—1953 гг. — служба ў Савецкай Арміі. Пасля звальнення год працаваў настаўнікам у Александрыйскай НСШ, затым зноў вучоба ў Белдзяржуніверсітэце на юрыдычным факультэце, які закончыў у 1959 г. На працягу двух гадоў быў стажорам на пасадзе народнага суддзі ў Магілёўскім абласным судзе, працаваў памочнікам пракурора ў пракуратуры г. Магілёва, памочнікам пракурора Мсціслаўскага р-на.

У снежні 1961 г. В. І. Шабайлаў залічаны ў аспірантуру аддзела прававых навук (мэтавая аспірантура ў Інстытуце дзяржавы і права АН СССР). Абараніў у сакавіку 1964 г. кандыдацкую дысертацыю, а ў 1980 г. — доктарскую дысертацыю на тэму: «Арганізацыйна-прававыя праблемы кіравання сацыяльна-культурным будаўніцтвам». Навуковая дзейнасць Віктара Іванавіча звязана з Акадэміяй навук Беларусі: са снежня 1964 г. ён працуе ў Інстытуце філасофіі і права на пасадзе навуковага супрацоўніка, з 1973 г. — заг. сектара (аддзела дзяржаўнага права і кіравання Інстытута філасофіі і права АНБ).

З характарыстыкі, выдадзенай кіраўніцтвам інстытута:

«...В. И. Шабайлов зрелый и высококвалифицированный научный сотрудник, добросовестно и творчески работает над повышением политического, профессионального уровня, является одним из ведущих ученых республики в области государственного управления, советского и административного права».

Віктар Іванавіч прымае актыўны ўдзел у заканатворчай рабоце, у тым ліку ў падрыхтоўцы Канстытуцыі Рэспублікі. Сектарам дзяржправа і кіравання, які ён узначальвае, падрыхтавана і апублікавана 18 манаграфій (4 з іх і каля 50 іншых навуковых работ падрыхтаваў асабіста); шэсць супрацоўнікаў сектара абаранілі кандыдацкія дысертацыі. Нямала часу ўдзяляе загадчык сектара грамадскай рабоце: доўгі час узначальваў камітэт народнага кантролю, прафсаюзную арганізацыю інстытута; з'яўляецца членам вучоных саветаў па абароне доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, членам экспертнага савета ВАК РБ, з 1996 г. — член Канстытуцыйнага суда РБ, кансультацыйнага савета адміністрацыі Прэзідэнта. У 1994 г. В. І. Шабайлаву прысвоена званне «Заслужаны дзеяч навукі Рэспублікі Беларусь».

Г. Напрэеў

ШЫНКАРОЎ Васіль Васільевіч, н. 15.01.1939 г. у в. Заполле Славенскага сельсавета (цяпер калгас імя Кірава). У 1957 г. закончыў Забродскую СШ. З 1957 па 1962 г. — студэнт Магілёўскага педінстытута (філфак). Пасля заканчэння інстытута працаваў дырэктарам Межанскай васьмігодкі, затым — дырэктарам Баравіцкай васьмігодкі Браслаўскага р-на.

Служыў у Савецкай Арміі. З канца 1964 г. займаў пасады інструктара райкома партыі, са студзеня 1965 г. — першага сакратара Браслаўскага райкома камсамола. У 1970—1974 гг. — інструктар, нам. заг. аддзела аргпартработы Віцебскага абкома партыі. З 1974 па 1977 г. з'яўляўся аспірантам Акадэміі грамадскіх навук (Масква). Там жа абараніў кандыдацкую па праблеме развіцця дэмакратычных асноў кіравання калгасамі.

З 1977 па 1986 г. — работа ў апараце ЦК КПБ: інструктар, заг. сектара дзяржаўных і грамадскіх арганізацый, інспектар. З 1986 г. — прарэктар па вучэбнай і навуковай рабоце Мінскай ВПШ, дацэнт кафедры партыйнага будаўніцтва. У 1991 г. закончыў дактарантуру пры АГН, абараніў доктарскую дысертацыю па тэме: «Сістэмны падыход у выпрацоўцы і рэалізацыі аграрнай палітыкі». Вучоная ступень — доктар гістарычных навук. Палітолаг. Са студзеня 1992 г. — адказны арганізатар, а затым загадчык сектара па сувязях з Вярхоўным Саветам, палітычнымі партыямі і грамадскімі рухамі Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь. З 1996 г. — загадчык сектара Камісіі Вярхоўнага Савета РБ па дзяржаўнаму будаўніцтву і мясцоваму самакіраванню. З ліпеня 1997 г. — загадчык аддзела па ўзаемадзеянні з Нацыянальным сходам РБ адміністрацыі Прэзідэнта РБ.

Г. Напрэеў

Удастоены звання «Заслужаны»

БАБЧАНКА Віталь Аляксеевіч, н. у 1935 г. у Гомелі ў сям'і рабочага-каваля. Сярэднюю адукацыю атрымаў у Нова-Данбасе (Украіна) у 1954 г. Пасля тэрміновай службы ў арміі закончыў Магілёўскае музычнае вучылішча імя Рымскага-Корсакава ў 1961 г. Завочна закончыў Белдзяржкансерваторыю ў 1974 г. У Шклове пачаў працаваць выкладчыкам дзіцячай музычнай школы з 1961 г., з 1970 г. — дырэктар гэтай школы. З 1996 г. — на пенсіі.

Адзначаны Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, Граматай Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР, значкамі I і II ступеняў Усесаюзнага фестывалю самадзейнай мастацкай творчасці. Званне заслужанага работніка культуры Беларускай ССР прысвоена ў 1990 г.

БРЫКІН Васіль Кірылавіч, н. у 1924 г. у в. Стараселле Гарадзецкага сельсавета ў сялянскай сям'і. У 1941 г. закончыў СШ № 3 г. Шклова, у 1953 г. — Мінскі дзяржаўны педінстытут імя А. М. Горкага, выкладаў гісторыю ў СШ № 2 г. Шклова, служыў у Савецкай Арміі. З 1958 г. і да выхаду на пенсію ў 1984 г. — дырэктар Забродскай СШ.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «Партызану Вялікай Айчыннай вайны», «За ўзяцце Кёнігсберга», «За доблесную працу. У азнаменаванне 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна», дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1967 г.

БУЕВІЧ Вітольд Палікарпавіч, н. 1.05.1933 г. у в. Забалоцце Талачынскага р-на. Скончыў Кожанаўскую сярэднюю школу, потым Мінскі медыцынскі інстытут (з адзнакай). У 1957 г. накіраваны ў Шклоўскі р-н. Працаваў галоўным урачом Чарнаруцкай участковай бальніцы, з 1959 г. — урач-гінеколаг у Шклоўскай раённай бальніцы, намеснік галоўнага ўрача. З мая 1965 г. — галоўны ўрач раённай бальніцы, адначасова і галоўны ўрач Шклоўскага р-на. Заслужаны работнік аховы здароўя Рэспублікі Беларусь (1995).

В. П. Буевіч узнагароджаны ордэнамі Леніна, Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалём «За доблесную працу», Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, нагрудным знакам М. І. Пірагова і Дыпломам т-ва Чырвонага Крыжа і Чырвонага Паўмесяца СССР.

А. Бялясаў

БЫКАВА Ніна Іванаўна, н. у 1924 г. у в. Раздзел Мсціслаўскага р-на. У 1941 г. закончыла 9 класаў, у 1945 г. — Магілёўскае педагагічнае вучылішча і працавала настаўніцай пачатковых класаў Фашчаўскай СШ да выхаду на пенсію ў 1979 г.

В. А. Бабчанка

В. К. Брыкін

Н. І. Быкава

Н. Р. Вашэцькова

М. Ф. Ільюшэнка

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1966 г.

ВАШЭЦЬКОВА Нэлі Раманаўна, н. у 1934 г. у пас. Асінаўка Буда-Кашалёўскага р-на ў сям'і рабочага. У 1952 г. закончыла Шарыбаўскую НСШ. Пасля заканчэння ў 1956 г. Гомельскага педагагічнага вучылішча працавала арганізатарам піянерскай работы Клічаўскага Дома піянераў і школьнікаў, з 1957 г. — загадчыцай аддзела па рабоце сярод піянераў і моладзі Клічаўскага РК ЛКСМБ. З 1959 г. працуе выхавальніцай дзіцячага садка, потым настаўніцай пачатковых класаў СШ № 1 г. п. Бялынічы. З 1963 г. — выхавальніца Шклоўскай спецшколы, з 1965 па 1989 г. — настаўніца пачатковых класаў СШ № 4 і СШ № 1 г. Шклова.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1971 г.

ІЛЬЮШЭНКА Міхаіл Фёдаравіч, н. у 1914 г. у в. Барыскавічы ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння сямігадовай школы працаваў брыгадзірам, рахункаводам у калгасе. Закончыў у 1937 г. Аршанскі настаўніцкі інстытут, працаваў завучам, дырэктарам Лакуцянскай НСШ. Завочна вучыўся ў Магілёўскім педінстытуце, закончыў яго ў 1939 г. У гэтым жа годзе пачаў тэрміновую ваенную службу на Чарнаморскім флоце. Удзельнік вайны. З 1945 па 1966 г. працаваў у Шклове нам. дырэктара, дырэктарам школы, інспектарам, загадчыкам аддзела адукацыі райвыканкома.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, медалямі «За абарону Севастопаля», «За перамогу над Германіяй у Вялікай Айчыннай вайне 1941—1945 гг.», «За працоўную доблесць» і інш., значком «Выдатнік народнай адукацыі». Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1964 г.

КАВАЛЁВА Раіса Іванаўна, н. у 1932 г. у пас. Шэлудзькі Мглінскага р-на Бранскай вобл. у сям'і калгаснікаў. У 1950 г. закончыла СШ № 1 г. Магілёва, у 1954 г. — Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў. Тады ж пачала працаваць у СШ № 3 г. Шклова.

Узнагароджана Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР. Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1979 г.

КАЗАКЕВІЧ Уладзімір Антонавіч, н. у 1924 г. у в. Княжыцы ў сялянскай сям'і. У 1955 г. закончыў Магілёўскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці фізіка і матэматыка. Працаваў у Княжыцкай сямігадовай школе настаўнікам, дырэктарам. З 1957 г. — завуч, дырэктар Фашчаўскай СШ, з 1967 г. — загадчык райана, з 1972 па 1987 г. — дырэктар СШ № 1 г. Шклова.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені і Працоўнага Чырвонага Сцяга, медалямі «За баявыя заслугі», «За працоўную доблесць», дзвюма Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР. Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1965 г.

МАКСІМОВІЧ Валянціна Прохараўна, н. у 1932 г. у г. Шклове. Пасля заканчэння ў 1952 г. Магілёўскага педагагічнага вучылішча працавала старшай піянерважатай у Каменна-Лаўскай СШ, з 1954 па 1985 г. — настаўніца геаграфіі гэтай жа школы.

Узнагароджана ў 1968 г. Ганаровай граматай Вярхоўнага Савета БССР, у 1971 г. — ордэнам «Знак Пашаны», у 1977 г. — значком «Выдатнік народнай адукацыі». Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1978 г.

МАТРОСАВА Вольга Восіпаўна, н. у 1914 г. у в. Сарціслаў у сялянскай сям'і. Закончыла Гарадзішчанскую НСШ і ў 1938 г. Магілёўскае педагагічнае вучылішча. Працавала настаўніцай пачатковых класаў Гарадзішчанскай НСШ, у савецкім тыле ў час Вялікай Айчыннай вайны, а пасля яе заканчэння — у Мікіціницкай васьмігадовай школе да выхаду на пенсію.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1960 г.

МІХАЛЮТА Іван Францавіч, н. у 1919 г. у в. Фашчаўка. У 1939 г. скончыў сярэднюю школу, паступіў у Інстытут кінематаграфіі (Масква), але з першага ж курса быў прызваны ў Чырвоную Армію. Накіравалі ў Беласток, які да таго часу стаў савецкім. Служыў салдатам, вучыўся ў палкавой школе, атрымаў званне старшага сяржанта, а потым і пасаду старшыны аўтароты, якая абслугоўвала штаб 10-й арміі. У першыя ж часы нападу фашысцкай Германіі давялося адведаць моцны бомбавы ўдар, з ім — убачыць першых забітых, параненых, пакалечаных... Пасля было адступленне, прарывы з варожага акружэння, апошняе — з-пад Мінска. Спроба выйсці да сваіх часцей не ўдалася. Аказаўся на акупіраванай зямлі. Дайшоў да роднай вёскі. Тут удзельнічаў у стварэнні групы падпольшчыкаў, пасля партызаніў.

Пасля вызвалення Магілёўшчыны ад акупантаў быў накіраваны на курсы рэзерву ЦК КП(б)Б, затым на работу ў Маладзечанскую вобласць. Працаваў прапагандыстам Радашковіцкага РК КП(б), загадчыкам аддзела культпрасветработы раёна, дырэктарам лектарскага бюро аблвыканкома, намеснікам начальніка аблупраўлення культуры. У 1958 г. закончыў тэатральны інстытут у Маскве, з лістапада гэтага года — дырэктар Гродзенскага абласнога драмтэатра. У 1967 г. удастоены ганаровага звання «Заслужаны дзеяч культуры БССР». У чэрвені 1968 г. назначаны дырэктарам Беларускага акадэмічнага тэатра імя Янкі Купалы, дзе і працаваў да 1980 г. Пасля выхаду на пенсію некаторы час быў дырэктарам Дома літаратараў Саюза пісьменнікаў БССР. З 1985 г. — дырэктар вучэбнага тэатра Акадэміі беларускіх мастацтваў.

Узнагароджаны ордэнам Айчыннай вайны II ступені, некалькімі Ганаровымі граматамі Вярхоўнага Савета БССР, медалямі, шматлікімі ўзнагародамі Міністэрстваў культуры СССР і БССР.

Г. Напрэеў

Р. І. Кавалёва

У. А. Казакевіч

В. П. Максімовіч

І. Ф. Міхалюта

МУРАЎЁВА Ганна Арцёмаўна, н. у 1926 г. Закончыла ў 1950 г. Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут па спецыяльнасці выкладчыца беларускай мовы і літаратуры. Працавала ў СШ № 3 г. Шклова да выхаду на пенсію.

Узнагароджана медалём «За працоўную доблесць», значком «Выдатнік народнай адукацыі». Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1972 г.

НОВІКАВА Варвара Яфімаўна, н. у 1902 г. у в. Шастакі ў сялянскай сям'і. Напярэдадні Вялікай Айчыннай вайны закончыла Віцебскі педагагічны інстытут па спецыяльнасці біёлаг. Пасля вайны працавала ў Гарадзецкай сямігадовай школе да выхаду на пенсію ў 1958 г.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1956 г.

НОСАВА Зінаіда Нікіфараўна, н. у 1923 г. у в. Комсенічы ў сялянскай сям'і. У 1938 г. закончыла Стара-Вадвянскую сямігадовую школу, у 1941 г. — Магілёўскае педагагічнае вучылішча. З 1944 г. працавала

Г. А. Мураўёва

В. Я. Новікава

З. Н. Носава

А. А. Радоўская

настаўніцай, загадчыцай Бушлякоўскай пачатковай школы, з 1948 г.— настаўніца пачатковых класаў СШ № 3 да выхаду на пенсію ў 1978 г.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1964 г.

РАДОЎСКАЯ Алена Аркадзьеўна, н. у 1922 г. Закончыла Магілёўскі дзяржаўны педагагічны інстытут. Выкладала геаграфію ў СШ № 1 г. Шклова, потым з 1965 г.— у СШ № 4 да выхаду на пенсію ў 1977 г.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1968 г.

РАМАНЧАНКА Фёдар Максімавіч, н. у 1920 г. у в. Высокі Барок Краснапольскага р-на ў сялянскай сям'і. У 1938 г. закончыў Краснапольскую сярэднюю школу. Пасля курсаў пачаў працаваць настаўнікам Ячна-Будскай пачатковай школы, потым на Енакіеўскім металургічным заводзе (Данбас), бухгалтарам будканторы трэста «Дальшахтбуд» (г. Уладзівасток). Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1946 па 1980 г. працаваў настаўнікам, загадчыкам Какойскай пачатковай школы, настаўнікам Высока-Борскай СШ Краснапольскага р-на, нам. дырэктара СШ № 1, дырэктарам СШ № 3 г. Шклова. Пенсіянерам да 1990 г. працаваў у райспажыўсаюзе.

Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I ступені і Чырвонай Зоркі, двума медалямі «За адвагу» і інш., знакам «Выдатнік народнай адукацыі». Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1972 г.

РЭЯНТОВІЧ Ганна Станіславаўна, н. у 1925 г. у в. Фашчаўка ў сялянскай сям'і. Закончыла Фашчаўскую СШ, у 1946 г.— Магілёўскі настаўніцкі двухгадовы педінстытут па спецыяльнасці гісторыка-філолага, завочна ў 1965 г.— літфак Магілёўскага педагагічнага інстытута. На працягу 30 гадоў працавала настаўніцай рускай мовы і літаратуры Фашчаўскай СШ, з іх 15 — нам. дырэктара па вучэбна-выхаваўчай рабоце.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1968 г.

СТАРЫНСКАЯ Кацярына Лявонаўна, прафесію настаўніцы набыла яшчэ да 1917 г. Доўгі час загадвала былой пачатковай чыгуначнай школай у г. Шклове. З 1965 г. два гады працавала ў СШ № 4 г. Шклова, пасля чаго выйшла на пенсію.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1958 г.

СТУКАЛАВА Ганна Сігнееўна, н. у 1922 г. у в. Любінічы ў сялянскай сям'і. У 1941 г. закончыла Забродскую СШ, потым завочна Полацкае педагагічнае вучылішча. З 1944 па 1977 г. працавала настаўніцай пачатковых класаў ў школах Славенскага сельсавета.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1968 г.

СУРАЎЦАВА Галіна Капітонаўна, працавала настаўніцай у Чарнянскай СШ.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1968 г.

ХРАМЦОЎ Іван Нікіфаравіч, н. у 1915 г. у в. Літвінавічы. Пасля заканчэння ў 1931 г. 7 класаў Гарадзішчанскай школы на аднагадовых курсах у г. Шклове набыў прафесію настаўніка пачатковых класаў. Пачаў працаваць настаўнікам у в. Запольнае Любанскага р-на. З 1935 г.— настаўнік пачатковых класаў у в. Рыжкавічы. Завочна закончыў у 1938 г. Магілёўскае педагагічнае вучылішча і пачаў працаваць настаўнікам пачатковых класаў у в. Гарадзішча. У 1939 г. прызваны на сапраўдную вайсковую службу. Удзельнік Вялікай Айчыннай вайны. З 1945 г. працуе настаўнікам Навасёлкаўскай сямігодкі, потым Гарадзішчанскай СШ да выхаду на пенсію ў 1975 г.

Узнагароджаны ордэнамі Славы III і II ступеняў, медалямі «За адвагу», «За ўзяцце Кёнігсберга» і інш.

Званне заслужанага настаўніка школы БССР прысвоена ў 1959 г.

Л. Анціпенка

Незвычайны лёс

Напэўна, можна сказаць, што ў яго ёсць усё, пра што можа марыць чалавек, які прысвяціў сябе мастацтву — пастаянны поспех, слава, узнагароды. Ён — лаўрэат рэспубліканскага, усесаюзнага, міжнародных конкурсаў. Заслужаны артыст рэспублікі. Але ёсць у жыцці гэтага артыста штосьці такое, што не дазваляе назваць яго пестуном лёсу. Наадварот, слухаючы яго, задумваешся над тым, колькі ж настойлівасці, працы, нечалавечых намаганняў прыклаў ён, каб ажыццявіць сваю мару.

Мой расказ пра Івана Тамашэвіча, сляпога спевака.

У дзяцінстве на яго і яго сястру Тамару немаведама адкуль звалілася страшэнная хвароба — атрафія зрокавага нерва. Яго жыццё пакінуў свет фарбаў, але застаўся свет гукаў. І ўсё больш і больш пачала вабіць, прыцягваць музыка. Змяніліся яго адносіны да хатняй «радыёкропкі». Сімфоніі, оперныя арыі, аркестравыя п'есы, рамансы, песні — усё знаходзіла водгук у яго душы. А яшчэ ў гэтага хлапчука быў голас. Гучны, прыгожы...

Упершыню сур'ёзна і на поўную сілу голас Івана загучаў у царкве. Па парадзе бабулі ён пачаў наведваць рэпетыцыі царкоўнага хору. Іван асвоіў азы музычнай граматы. А калі стаў салістам хору, зразумеў, што яму патрэбна музычная адукацыя. Таму была вучоба па класу баяна ў школе таленавітых дзяцей, і шчаслівая сустрэча са сляпым музыкам Яўгенам Чаркасавым, якая ў многім вызначыла яго далейшы лёс, было Гродзенскае музычнае вучылішча, дзе пазнаёміўся са славутым спеваком П. Лісіцыянам.

Але побач была і «проза» жыцця. З цяжкім уздыхам успамінае Іван Тамашэвіч пакуты ў цесных пакоях інтэрната, бяссонныя ночы, поўныя роздуму, што рабіць далей — ісці ў сельскі клуб музычным кіраўніком ці далей прабівацца да сваёй мэты — атрымаць

Ф. М. Раманчанка

Г. С. Рэянтовіч

К. Л. Старынская

І. У. Тамашэвіч

вышэйшую музычную адукацыю.

Ён спрабаваў паступіць у Беларускую кансерваторыю, рэктарам якой у той час быў кампазітар Уладзімір Алоўнікаў. На субяседванне абітурыент Іван Тамашэвіч прыйшоў пад руку з бацькам. Здзіўленню членаў прыёмнай камісіі не было мяжы. Сляпы спявак на сцэне?! Дзе ўбачыш? І навошта, у нас жа відушчых хапае.

— Усё ж я настаяў, каб мяне праслухалі,— расказвае ён.

І з поспехам прайшоў усе туры па спецыяльнасці. Можа са злосці, але праспяваў так, што і сам не чакаў.

— Чую размову ў камісіі: «Наш хлопец. Можа, прымем?» А ў адказ: «Як жа мы возьмем, калі рэктар супраць...»

І па асноўнаму прадмету паставілі «тройку». Паспрабаваў пагаварыць з рэктарам, той ветліва засмяяўся і параіў: «У цябе і без таго добры голас, выдатны слых. На хлеб заробіш».

Тамашэвіч зрабіў другую спробу паступіць у кансерваторыю — у Ленінградскую. Паспяхова прайшоў два туры. А на трэці,

рашаючы, прыйшоў сам рэктар, вядомы піяніст Серабракоў. І ўсё паўтарылася, амаль слова ў слова і парада: «Падрыхтуйце праграму і выступайце з сольнымі канцэртамі».

Іван і тады не апусціў рукі. Дабіўся аўдыенцыі ў Н. Сняжковай — намесніка старшыні Савета Міністраў рэспублікі. І Івана Тамашэвіча прынялі на музычна-педагагічны факультэт Мінскага педінстытута. Вось тады ён і зазнаў гора. Жонка з дзіцем у Бабруйску, а ён у сталіцы ды яшчэ ў інтэрнаце, размешчаным за 7 кіламетраў ад інстытута. Раніцай разам з усімі няцяжка было дабрацца да аўдыторыі. А вось назад даводзілася блукаць аднаму — у сакурснікаў заняткі былі па індывідуальнаму раскладу.

Пасля заканчэння інстытута яму прапанавалі працаваць выкладчыкам у Мінску, але ён паехаў па размеркаванні ў Полацк.

...Паступова ў рэспубліцы прыйшоў да высновы: трэба стварыць цэнтр для інвалідаў, дзе вялася б культурна-масавая работа, дзе людзі маглі б знайсці прыкладанне сваім творчым здольнасцям. Узначаліць цэнтр прапанавалі Івану Тамашэвічу. Яму трэба было стварыць хор, аркестр, музычны лекторый, музычную бібліятэку для сляпых і многае, многае іншае.

Ён даў згоду.

Пакінуў Полацк, пераехаў у Мінск і з галавой акунуўся ў работу. Практычна ажыццявіць намечанае аказалася на многа цяжэй, чым ён думаў. Колькі сіл, нерваў забрала хаджэнне па інстанцыях, «выбіванне» будматэрыялаў, абсталявання, арганізацыя студыі, пашыў касцюмаў і бездань іншых спраў. І ўсё ж Іван Тамашэвіч здолеў дастойна рэалізаваць даручаную яму справу.

...Мы пазнаёміліся ў канцэртнай зале кансерваторыі. У той вечар тут адбыўся сольны канцэрт заслужанага артыста Рэспублікі Беларусь Івана Тамашэвіча. Гэта быў своеасаблівы рэванш за той даўні «правал», калі абітурыенту Тамашэвічу паставілі «тройку». Гледачы апладысментамі сустракалі кожны нумар.

Так, Іван Тамашэвіч дамогся свайго. Але няма цяпер спакою ў яго душы. Студыя перажывае цяжкі час. Скарачаюцца штаты, уразаюцца асігнаванні...

— Як ні горка гэта разумець, — разважае ўслых Тамашэвіч, — але ў які раз пацвярджаецца сумная ісціна: у часы вялікіх сацыяльных узрушэнняў у першую чаргу церпіць культура — самы безабаронны, самы дарагі набытак чалавецтва.

Пасляслоўе. Іван Тамашэвіч нарадзіўся ў в. Мерч Шклоўскага р-на, вучыўся ў Шклоўскай школе-інтэрнаце для сляпых і слабабачачых дзяцей.

Р. Колабаў. «Зоязда». 1993. 8 кастрычніка.

Гады, аддадзеныя людзям

Гэтага чалавека добра ведаюць дарослыя і дзеці. Сын селяніна, ён прысвяціў усё жыццё служэнню народу, яго здароўю. Яшчэ ў пачатку XX стагоддзя Мікалай Арцёмавіч Карначэнка з атэстатам фельчара едзе ў Касцюковічы. Малады медык вывучаў людзей, людзі вывучалі яго, пасябравалі. Пацікавілася і паліцыя, чаму Карначэнка збірае па вечарах сялян. Фельчар быў вымушаны паехаць яшчэ далей у глыбінку — зусім забытую вёску Старынку.

З таго часу мінула больш за 60 гадоў, якія аддадзены медыцыне, справе аховы здароўя. Мікалай Арцёмавіч у першыя гады Савецкай улады закончыў Маскоўскі медыцынскі інстытут. А ў першыя дні вайны сельскі ўрач стаў пад сцягі абаронцаў Радзімы. Хірург санітарнай часці маёр Карначэнка абслугоўваў два шпіталі. Аперыраваў параненых і пад бамбёжкай, і пры святле ад акумулятараў.

— Памятаю, на Курскай дузе гэта было, — успамінае Мікалай Арцёмавіч. — Наш шпіталь трапіў пад бамбёжку, а на аперацыйным стале паранены, святло патухла. Салдаты не разгубіліся. Пад'ехалі на машынах і ад акумулятараў далі электрычнасць, і мы аперацыю закончылі.

Подзвіг ваеннага ўрача Карначэнкі быў адзначаны ордэнам Чырвонай Зоркі, медалямі.

Толькі ў 1946 г. Карначэнка вярнуўся ў родную вёску Староселле на Шклоўшчыне. Трэба было наладжваць абслугоўванне насельніцтва. За гэтую работу пільна ўзяўся Карначэнка. У вёсках будаваліся фельчарскія пункты, аднаўлялася работа раённай бальніцы. Як галоўнаму ўрачу і хірургу яму даводзілася лячыць хворых і займацца гаспадарчымі справамі.

Аднойчы зімой, спяшаючыся да хворага, возчык так падагнаў каня, што сані перакуліліся і ўрач ударыўся аб дрэва. Захапіла дыханне, нельга было ўзняцца. Як пазней высветлілася, аказаліся паламанымі некалькі рэбраў. Але, пераадольваючы боль, урач дабраўся да хворага, аказаў яму дапамогу, потым лячыўся сам.

Шматгранная работа медыка зноў была адзначана, але ўжо ў мірны час, — ордэнамі «Знак Пашаны» і Леніна. Яму было прысуджана званне заслужанага ўрача Беларускай ССР. Працаўнікі Шклоўшчыны на працягу многіх гадоў выбіралі гэтага сціплага чалавека сваім дэпутатам у мясцовыя Саветы.

С. Жукоўская

«Ударны фронт». 1968. 24 кастрычніка.

Прага Пятра Алейнікава

Пётр Мартынавіч Алейнікаў нарадзіўся 12 ліпеня 1914 г. у в. Крывель у сям'і селяніна. Рана астаўся без бацькі — на шостым годзе жыцця. Мартын Алейнікаў працаваў лесасплаўшчыкам на Дняпры. Аднойчы зваліўся з плыта ў сцюдзёную восеньскую ваду, доўга хварэў. І яму не было суджана падняцца з пасцелі... Пеця і старэйшыя двое дзяцей асталіся на руках гаротнай маці. І таму жанчына вымушана была адправіць дзетак жабраваць.

Пеця часта начаваў у зале чыгуначнай станцыі Шклоў, у гарадскім парку на лаўцы. Гараджане шкадавалі яго, частавалі ежай. Яны ж уладкавалі Пецю на дзяржаўны кошт у Шклоўскую школу-інтэрнат. Ён аказаўся старанным і здольным вучнем. Але злоснікі напісалі ў школу, што ў яго ёсць маці, а ў школу-інтэрнат залічвалі толькі круглых сірот. І яго прытулкам зноў стала вуліца. Праўда, па ініцыятыве аднаго старога настаўніка Пецю сабралі грошы, наялі прытулак з харчаваннем. Зноў ён бегаў у школу.

Выпала неўрадлівае лета, таму ў маці не было чаго браць з ежы. І Пеця стаў зарабляць сам — сек дровы, ганяў коней у малатарні, нават наняўся нянькай. А на летніх канікулах прападаў у гарадскім парку. Тут стараўся патрапіць у кіно любым шляхам, круціў дынама-машыну — для паказу кіно трэба была электрычнасць. Здружыўся з кінамеханікам, які дазваляў яму круціць ручку праекцыйнага апарата. Здаралася, што па дзесятку разоў праглядаў фільмы, таму дакладна пераказваў змест, разыгрываў цікавыя сцэнкі з кінакарцін з удзелам Чарлі Чапліна, Ігара Ільінскага. Гараджане на «канцэртах» юнага Алейнікава рагаталі, дзівіліся дакладнасці ў перадачы сцэн і эпізодаў. Гэта была першая яго акцёрская школа.

П. М. Алейнікаў

Аднойчы Пеця скапіраваў, як мясцовы бацюшка прагульваўся з матушкай у парку. У канцы прадстаўлення з'явіўся сам бацюшка. Ён сказаў хлопцу:

— Успамянеш маё слова... Будзе з цябе артыст!

Ён выдаў першы ганарар будучаму артысту — чырвонец.

Пасля таго лета Пеця не стаў вучыцца. Яго захапіла кіно. Сабраўся ехаць у Маскву. На вакзале расказаў пра гэта знаёмаму настаўніку. І ён адгаварыў хлопца ад Масквы — няма поўнай агульнай адукацыі. Пеця засумаваў, бадзяжнічаў. Трапіў у Аршанскі дзіцячы прыёмнік-размеркавальнік, потым — у Барсукоўскую дзіцячую калонію. Тут зноў пачаў вучыцца. Па яго ініцыятыве ў калоніі адкрыўся гурток драматычнага мастацтва. Алейнікаў быў яго кіраўніком і дасціпным выканаўцам роляў.

Неўзабаве яго адпраўляюць у 1-ю Усебеларускую камуну імя 10-годдзя Кастрычніцкай рэвалюцыі. Тут Пеця таксама кіраваў драматычным гуртком, які набыў папулярнасць у Магілёве. Алейнікаў выконваў камедыйныя ролі, захапляўся мастацкім чытаннем. Ведаў на памяць многія вершы Ф. Багушэвіча, М. Танка, Я. Коласа, Я. Купалы, паэму «Тарас на Парнасе». У камуне яму пашанцавала сустрэцца з заслужаным артыстам РСФСР Б. В. Кумельскім, які параіў: «Вам трэба вучыцца! Абавязкова вучыцца. Шмат, упарта. З вас можа атрымацца сапраўдны акцёр...»

Пасля заканчэння сярэдняй школы Пётр лейнікаў адправіўся ў Ленінград для па-туплення ў інстытут сцэнічных мастацтваў. онкурс быў ашаламляльны — на 40 месцаў жно тысяча заяў. Але наш зямляк удала райшоў сіта адбору і быў залічаны на інематаграфічнае аддзяленне заслужанага еяча мастацтваў РСФСР Сяргея Герасі-ава.

Пад уплывам вопытнага педагога і адда-ых мастацтву сяброў Пятро стараецца зай-ацца ў майстэрні, паступова становячыся ацёрам-мастаком, набываючы інтэлект і уст. І яшчэ студэнтам Пятро Алейнікаў чынае здымацца ў кінафільмах. Выконвае евялікія ролі ў карцінах «Я кахаю», «Су-трэчы», «Сяляне».

Даведаўшыся, што Белдзяржкіно знахо-віцца ў Ленінградзе, ён адправіўся на бела-ускую кінафабрыку. Алейнікаў стараўся агаварыць на роднай мове. Але на яго лядзелі, як на дзівака. Тут нічога не было еларускага, сцэнарыі былі далёкія ад жыц-я рэспублікі. І пры другім наведванні Пят-а абыякава сустрэлі ў Белдзяржкіно, пыт-ва аднесліся да земляка, хоць яму надта арцела штосьці зрабіць для роднай Бела-усі.

Але Алейнікава меў на прыкмеце С. Гера-маў, запрасіўшы на ролю Пецькі Малібогі кінафільме «Сямёра смелых». Роля мала-ому артысту ўдалася. Алейнікаў стаў на-асхват у рэжысёраў, а гледачу не цярпелася устрэцца з любімым артыстам на экране. отым здымкі ў фільмах «За Савецкую адзіму», «Камсамольск».

Не галоўная выпала роля Пятру Алейні-аву ў чарговым яго фільме «Трактарысты». ым не менш ён запомніўся гледачам сваёй ртуознай гульнёй. У кінафільме пра шах-ераў «Вялікае жыццё» Пётр Алейнікаў вы-наў ролю маладога забойшчыка Вані Кур-кага. Гэта была чарговая ўдача.

Потым былі новыя ролі, карціны ваенных одоў.

На здымках фільма «Неба Масквы», як асказвае А. Слесарэнка ў нарысе «Пятро лейнікаў», артыст пражыў моцнае ўзру-зынне і ледзьве астаўся жывы. Фільм пры-ячаўся лётчыкам, што абаранялі сталіцу. Яго падвесілі ў кабіне самалёта пад столь высачэзнага павільёна. Раптам кабіна сарва-лася і паляцела ўніз. Усе, хто быў на здымачнай пляцоўцы, у тым ліку і тыя, што страхавалі, трымаючы ў руках запасныя канаты, здранцвелі. Але не разгубіўся сам Алейнікаў і праявіў спрыт героя, якога іг-раў. У момант выскачыў з кабіны і ўхапіўся за край фанернага задніка. Павіс на нейкія секунды, сарваўся і ўпаў. Удар быў амарты-заваны. Ад кабіны ж асталіся толькі трэскі.

Для многіх было дзівам, калі ў 1946 г. кі-нарэжысёр Л. Арнштам запрасіў на ро-лю А. С. Пушкіна Пятра Алейнікава ў філь-ме «Глінка». Артыст затурбаваўся, але па-гадзіўся. Доўга і настойліва працаваў над увасабленнем вобраза Пушкіна.

А потым для П. Алейнікава наступілі цяжкія часіны, калі жыццё апанавалі скан-далы. Для яго не было ходу. Найбольш здымаліся фільмы-спектаклі. Артыст быў за-нядбаны надоўга. Ён вымушаны калясіць па краіне, выступаючы ў эстрадных канцэртах, спадзеючыся вярнуцца на экран.

Ён не шкадаваў сябе. Набыў мокры плеў-рыт. Пасля аперацыі астаўся з адным лёг-кім. Адолела пасіўнасць.

Цяпер зачасціў на Шклоўшчыну. У адпа-чынку і працы на лузе бавіў свой час з зем-лякамі. Бываў на радзіме з канцэртнай бры-гадай. Пасля адной такой паездкі на радзіму яго запрасіў, нарэшце, рэжысёр «Туркмен-фільма» Булат Мансураў зняцца ў фільме «Наталенне смагі».

Але гэта былі апошнія здымкі Пятра Алейнікава. Ён адчуваў сябе блага. Да таго ж даймала сярэднеазіяцкая спякота. Таму спяшаўся завяршыць здымацца.

І вось адлёт у Маскву. Зайшла гаворка змяніць назву фільма.

— Булат, — сказаў Пётр Мартынавіч Мансураву. — Я цябе вельмі прашу, не мяняй, бо гэты фільм — наталенне маёй акцёр-скай смагі...

...Не дапамаглі маскоўскія медыкі. 9 чэр-веня 1965 г. перастала біцца сэрца Пятра Мартынавіча Алейнікава.

Яго прах спачывае на Новадзявочых мо-гілках.

Л. Анціпенка

З МАТЭРЫЯЛЬНАЙ І ДУХОЎНАЙ СПАДЧЫНЫ ШКЛОЎШЧЫНЫ

Помнікі архітэктуры і будаўніцтва

У сярэднія вякі Беларусь называлі «краі-най замкаў». Праз кожныя 20—30 км стаялі ўмацаваныя гарады і мястэчкі, пад абарону якіх у гадзіну трывогі збіралася навакольнае насельніцтва. Гэта адносіцца і да ранняй гісторыі Шклова. Даследчыкі лічаць, што горад пачаў сваё існаванне на высокім і кру-тым беразе рэчкі Шклавянкі (зараз Серабранка) каля в. Стары Шклоў.

Пабудаваны магнатамі Хадкевічамі замак на беразе Дняпра паклаў пачатак новаму паселішчу, якое стала паспяхова развівацца. У гэты час на Беларусі, сугучна з Заходняй Еўропай, пачаўся рух рэлігійнай рэфарма-цыі — пратэстанцтва. Геранім і Карл Хад-кевічы будуюць у Шклове Кальвінскі збор. Пабудова сумяшчала рысы готыкі (стромкія дахі, стральчатыя байніцы, гранёныя апсі-ды, кантэформы) і рэнесансу (цыліндрыч-ныя склянкі, атыкі, расчленены фасад). Аляксандр Хадкевіч у 1592 г. перадаў яго каталіцкаму ордэну дамініканцаў і пабуда-ваў мураваны касцёл. Дзякуючы вопісу, які захаваўся, можна ўявіць знешні выгляд да-мініканскага манастыра. Найгалоўнае стано-вішча займаў мураваны касцёл і званіца. Побач з імі размяшчаўся драўляны мана-стыр, які меў шэраг падсобных памяшкан-няў: клець, люднік, сянніцу, дзве канюшні, вазоўню, мураваную піваварню, старую драў-ляную лазню, а таксама калодзеж з драўля-ным колам і вялізны сад.

Развіццю Шклова, які ў першай палове XVII ст. займаў сёмае месца па памерах і колькасці жыхароў пасля Вільні, Магілёва, Бярэсця, Слуцка, Мінска і Полацка, садзей-нічалі і магутныя абаронныя збудаванні. З усходу горад надзейна прыкрываў Днепр. З поўдня і захаду, дзе працякала Серабран-ка, дзякуючы дамбе з плацінаю ўзнікла вялі-кае возера. Яно прыкрывала Шклоў і яго новы замак, які стаяў каля зліцця рэк. Згодна з інвентаром 1643 г., абарончы роў за-паўняўся вадой ракі Серабранка. Праз яе быў перакінуты мост на «ізбіцах», які пад-водзіў да брамы з «узводам» — пад'ёмным мостам «на чопах жалезных з рэфамі жа-лезнымі». Увесь пабудаваны з дрэва, замак з аднаго боку ад ракі прыкрываў паркан, з другога — вастракол. Горад абкружаў ма-гутны земляны вал, на якім стаяў «паркан из дерева, построенный избицами, с башня-ми и брамами». (Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 140.)

Толькі з аднаго, паўночнага боку Шклоў не меў натуральных умацаванняў. Таму тут акрамя землянога вала быў зроблены аба-рончы роў. За яго межамі знаходзілася прадмесце Заперакопскае. Напярэдадні вай-ны Расіі з Рэччу Паспалітай у 1654—1667 гг. Шклоў уяўляў сабой вялікі горад, які меў шэраг прадмесцяў — Аршанскае, Шклоўскае, Рыжкаўскае, Заперакопскае і самае шматлюднае — Задняпроўскае.

Даволі падрабязнае апісанне абарончых збудаванняў Шклова было зроблена ў 1657 г. рускім ваяводам І. М. Шалачанавым. Згод-на з гэтым вопісам, горад абараняўся 26 драўлянымі вежамі розных памераў і канст-рукцый. З іх уласна вежаў было 14, у тым ліку 3 брамы. Між іншым, назва гарадскіх брам адрозніваецца ад папярэдніх назваў. Брама Капыская названа «Днепровскими проезжими воротами», брама Астроўская — «Башней Теской», Галоўчынская — «Песоч-ной». І толькі Магілёўская брама захавала сваю назву. Дзейнічалі толькі двое варот: Дняпроўскія (Капыскія) і Пясочныя (Галоў-чынскія). Магілёўскія вароты былі наглуха засыпаны зямлёй. Найбольшай магутнасцю выдзяляўся ўсходні палявы бок абароны, які цягнуўся ад вусця Серабранкі ўверх, уздоўж правага берага Дняпра. Тут было 8 вялікіх і столькі ж малых вежаў — «выводов».

У апісанні падрабязна расказваецца пра знешні выгляд усіх збудаванняў. Так, вежа «Угорская Рябновская», якая знаходзілася на мысе пры зліцці рэк, была чатырох'-яруснай, з трыма «мостами», рубленая ў «две стены». Падножжа вежа мела чаты-рохвугольнае, з узроўню другога яруса пера-ходзіла ў васьмігранік, зроблены «в одну стену». Далей, уверх па Дняпры, ішло прас-ла сцяны даўжынёй у 55 сажняў (117,3 м), якое падводзіла да «мерницы», за якой прасла ў 107 сажняў даўжынёй (2228,3 м) упіралася ў вежу «села Дивного». Гэта была пабудова, зрубленая ў восем вуглоў з двума мастамі. Даўжыня аднаго яе боку раўнялася 4,5 сажня (каля 9,6 м).



Ратуша, г. Шклоў



Ад вежы «звено города» ў 32 сажні (62,2 м) падыходзіла да Дняпроўскай (Капыскай) брамы, якая, безумоўна, выдзялялася сваімі памерамі сярод астатніх вежаў горада. Яна мела страху ў чатыры схілы, чатыры «моста», г. зн. пяціярусная, знізу чатырохвугольная, з другога яруса — васьмівугольная. Даўжыня сцяны каля падножжа дасягала 6,5 сажня (13,7 м). На другім паверсе брамы размяшчалася палкавая гармата. Калі прыняць сярэднюю вышыню кожнага яруса за 4 м, вышыня яе са страхою дасягала не менш за 25 м. (Мордовцев Д. Л. Авантюристы. Исторический вестник. Т. 22. СПб., 1875.)

У час ваенных дзеянняў 1654—1667 гг. Шклоў не раз трапляў у эпіцэнтр вайны і, безумоўна, вынік для яго быў вельмі сумны. Інвентар 1661 г. зафіксаваў, што з 1120 дамоў, якія былі ў горадзе ў 1650 г., захавалася толькі 490, а насельніцтва зменшылася з 8540 да 4375 чалавек.

Пасля замірэння паміж Маскоўскай дзяржавай і Польшчай шклаўчане зноў будуюцца. У 1682 г. узводзяцца праваслаўныя Успенскі і Уваскрэсенскі манастыры. Колькасць жыхароў пачала ўзрастаць, але Паўночная вайна зрабіла сваю справу. І ў 1715 г. тут налічвалася толькі 6210 жыхароў.

У 1690 г. у Шклове адбыўся моцны пажар, які знішчыў «амаль увесь замак і вялікую вежу», а таксама гандлёвыя лаўкі і фарны касцёл. Аднак умацаванні яго былі пазней адноўлены.

Перапланіроўка Шклова адбылася пасля пажару 1769 г. Упершыню горад ператварыўся ў арганізаванае паселішча, разбітае на рэгулярныя кварталы. У гэты час на Беларусі, як і ў шэрагу еўрапейскіх краін, пры распрацоўцы гарадскіх забудоў у сістэме плошчаў рознага прызначэння адна адводзілася пад ратушу — будынак органаў гарадскога самакіравання (магістрата). Таму і ў



Папяровая фабрыка, 1898 г.

Шклове самым прыгожым месцам была квадратная плошча, пасярод якой велічна ўзвышаўся цудоўны будынак гарадской ратушы. Менавіта з гэтага месца пачалася рэканструкцыя горада.

Шклоўская ратуша, помнік архітэктуры канца XVIII ст. Пабудавана ў стылі класіцызму. Мураваны будынак пастаўлены на гарадской плошчы ў комплексе з гандлёвымі радамі. Асноўныя памяшканні групаваліся на 2-м паверсе абапал шырокага каруткага калідора. 1-ы паверх прарэзаны ў цэнтры параднымі варотамі ў двор гандлёвых радоў. Завершана ратуша стройнай 8-гранай вежай, размешчанай па восі будынка на высокім квадратным пастаменце. Аднапавярховыя (з 2-павярховымі рызалітамі па вуглах) гандлёвыя рады разам з ратушай утваралі прамавугольны двор, які меў ужо 2 уязныя брамы. Архітэктурны дэкор пабудаваны па чляненні фасадаў шырокімі лапаткамі, прамавугольнымі вокнамі і паўцыркульнымі аркадамі. Помнік не захаваўся. Вядзецца ўзнаўленне, рэстаўрацыя застаўшагася ад разбурэння (гл.: БелСЭ. Мн., 1974. Т. 11. С. 330).

Галоўная плошча стала цэнтрам горада, ад якой па плану былі пракладзены вуліцы з пабудаванымі па адзінаму ўзору драўлянымі дамамі. Бралі ад плошчы пачатак і дзве ліпавыя алеі. Адна з іх вяла ў напрамку Магілёва, другая — да старажытнага замка.

У канцы XVIII ст. у Шклове з'яўляюцца новыя гаспадары. Спачатку рускі фельдмаршал Р. Пацёмкін, а потым генерал С. Зорыч. Ім застаўся адбудаваны пасля пажару, памаладзелы горад. Тут хутка будуюцца мануфактуры: шоўкавая, суконная, залаташвейная, парусная фабрыка, канатны, скураны, гадзіннікавы і іншыя заводы. Узводзяцца будынкі тэатра, кадэцкага корпуса, палаца ўладальніка і іншыя пабудовы. Шклоў шпарка развіваецца і па шэрагу паказчыкаў, у першую чаргу гандлёва-эканамічных, абышоў суседні Магілёў.

У сярэдзіне XIX ст. праз тэрыторыю сучаснага Шклоўскага раёна быў пракладзены новы шлях, які злучыў Санкт-Пецярбург з Кіевам. Уздоўж дарогі будаваліся паштовыя станцыйныя дамы. Адзін з такіх будынкаў захаваўся ў вёсцы Лакуці. Комплекс складаўся са станцыйнага дома, службовага флігеля і гаспадарчых пабудоў (каретнай, стайні, пуні), якія разам утвараюць замкнёны ўнутраны двор. Станцыйны дом — адна павярховы мураваны прамавугольны ў плане будынак, пакрыты вальмавым дахам. Цэнтр галоўнага фасада вылучаны ганкам з двух схільнай навіссю на фігурных кранштэйнах (чыгуннае ліццё). На дваравым фасадзе па

Асабняк Крывашэіна ў парку

восі сіметрыі размешчана невялікая пабудова з выхадам на ўнутраны двор. Вокны прамавугольныя, галоўны ўваход з паўцыркульным імпастам. Фасады без дэкору, завершаны прафіляваным карнізам. Усе гаспадарчыя пабудовы, аб'яднаныя ў агульны П-падобны будынак з двухсхільным дахам, а таксама агароджа выкананы закідной тэхнікай з драўляных брусоў у мураваныя шулы. Будынак працягвае служыць дарожным будаўнікам.

У другой палове XIX ст. пасля заняпаду мануфактур і гандлю ў Шклове буйнога будаўніцтва не вялося. Толькі ў канцы стагоддзя міністр шляхоў зносін Расійскай імперыі А. Крывашэін купіў Шклоўскі маёнтак у мясцовага памешчыка Ваейкава і ў 1898 г. пабудаваў у Шклове кардонную фабрыку. Паралельна ішла закладка сядзібы, якая фарміравалася каля Дняпра на месцы ляснога гаю. Яна ўключыла парк, вялікі сад (плошчай 25—30 га), вытворчую і гаспадарчую зоны. Доўгімі алеямі парк звязваўся з садам, кардоннай фабрыкай, утвараючы адзіны комплекс.

Закладка парка пачалася ў 1902—1903 гг. Ён займае амаль роўную тэрыторыю, у плане мае форму прамавугольніка. Цэнтрам кампазіцыі з'яўляецца прысядзібны дом. Перад заходнім яго фасадам размешчаны вялікі парадны партэр. Раней ён быў акружаны нізкімі бардзюрамі і дэкарыраваны штамбавымі ружамі. Цэнтральную частку займала клумба, аформленая экзатычнымі раслінамі — драпэнанай і эхеверыяй. Паркавы партэр не захаваўся.

Да параднай часткі парка з супрацьлеглых бакоў вялі дзве ўязныя алеі. Паўночная, кляновая, перасякала парк у папярочным напрамку і звязвала яго з прычалам на Дняпры. У адносінах да яе арыентаваны службовыя флігелі. Адзін з іх каля парадна га двара служыў кухняй і пральняй. Тут жа два дрэвы таполі белай, якія фіксавалі прыпынак карэт. У другім флігелі (разабраны ў 1993 г.), размешчаным на адной восі з першым на ўскраіне парка, спыняліся госці, прыбываючыя ў маёнтак водным шляхам. Паўднёвая ўязная (ліпавая) алея кароткая. Яна падводзіць да ўсходняга боку партэр, адкуль праменямі расходзяцца паркавыя алеі, злучаныя бакавымі, што ўтварае структурную аснову гэтай часткі парка. Алея таполяў выводзіць на бакавыя алеі, прамалінейна размешчаныя ўздоўж паўночнай і паўднёвай мяжы памесця. З паўднёвага боку парк быў абсаджаны фармаваннай загараддзю з караганы і абнесены агароджай. Уздоўж яе ідзе алея з таполяў. З супрацьлеглага боку парка алея не захавалася. Вялікая колькасць алей, якія вызначаюць кампазіцыйную пабудову парка, складае яго асаблівасць.

Цэнтральная паляна парка фланкіравана рознавялікімі, трохвугольнай формы сектарамі. Абодва сектары прадстаўлены групамі

дрэў сасны звычайнай, дуба і ліпы з адзіночнымі дрэвамі елкі і клёна. Значнае месца займаюць групы бэзу і спірэі.

Насаджэнні парка складаюць у асноўным мясцовыя віды, а ў аранжарэях, на клумбах вырошчваліся экзатычныя расліны. Парк стварыў мясцовы садоўнік С. І. Маліноўскі, жыхар вёскі Уланава. На працягу двух гадоў ён вучыўся садоўніцтву ў Варшаве. І ягo ўдзелам закладваліся паркі ў суседніх маёнтках (Дымава, Бярозаўка).

Парк параўнальна добра захаваўся і з'яўляецца каштоўным помнікам садова-паркавага мастацтва.

Архітэктурным помнікам з'яўляецца прысядзібны дом. Асабняк пабудаваны з дрэва, аднапавярховы, пакрыты пакатым вальмавым дахам. Па баках цэнтральнай часткі, якая выступае, зроблены сіметрычныя ўваходы, аформленыя ганкамі з рознымі слупамі і парапетам — балюстрадай у завяршэнні. Тарэц цэнтральнай часткі вырашаны ў выглядзе галерэі з такімі ж рознымі слупамі. Фасады будынка багата дэкарыраваны рознымі накладнымі дэталямі, якія імітуюць мураваныя класіцыстычныя формы. Плоскасці сцен гарызантальна ашаляваны і завершаны развітым антаблементам з фрызам і карнізам вялікага вынасу на розных фігурных кранштэйнах. Вуглы аздоблены накладным рустам. Па нізу сцен вертыкальнай шалёўкай вылучана падаконная панель. На галоўным фасадзе ў цэнтры і над бакавымі крыламі зроблены дэкаратыўныя трохвугольныя франтоны. Вялікія прамавугольныя аконныя праёмы аздоблены ліштвамі з філенгавымі нішамі і сандрыкамі. Інтэр'ер значна зменены ў час рэканструкцыі. Захаваліся дзве кафельныя печы, розны плафон столі ў правым крыле будынка. Асабняк з'яўляецца помнікам драўлянага дойлідства з элементамі неакласіцызму.

Цікавым помнікам грамадзянскай архітэктуры з элементамі стылю «мадэрн» з'яўляецца і будынак праўлення папяровай фабрыкі. Двухпавярховы, у плане блізкі да квадрата, пабудаваны з цэглы ў 1898 г. Галоўны паўночны фасад вылучаны трохпавярховай вежай, завершанай высокім шатром, заломы якога падтрымліваюцца рознымі фігурнымі кранштэйнамі. На ніжнім паверсе вежы зроблены ўваход у будынак. Бакавыя фасады ў цэнтры раскрапаваны рызалітамі. Асноўны аб'ём накрыты вальмавым дахам, рызаліты — двухсхільнымі дахамі, што стварае складаную маляўнічую кампазіцыю пакрыцця. У цэнтры даху зроблены своеасаблівы ліхтар, які асвятляе вестыбюль другога паверха. Аконныя праёмы згрупаваны сіметрычна адносна восі кожнага з фасадаў, на першым паверсе лучковыя, на другім — паўцыркульныя, аформленыя разнастайнымі абрамленнямі. Дэкаратыўныя дэталі фасадаў выкананы цаглянай муроўкай: замкавыя камяні, руст, сухарыкі. Унутры пакоі згрупаваны вакол цэнтральнага вестыбюлю. Планіроўка паверхаў ідэнтычная. Яны злучаны двухмаршавай лесвіцай, размешчанай у вежападобным аб'ёме. Пад будынкам вялікі падвал.

У канцы 80-х гадоў бягучага стагоддзя да будынка была зроблена прыбудова, якая цяпер скрывае першапачатковы выгляд паўднёвага боку. А менавіта паўднёва-ўсходні вугал будынка быў вылучаны шырокім балконам на капсолях і вялікім акном з лучковай арачнай перамычкай, што прыдавала забудове асаблівую арыгінальнасць.

* * *

Значную цікавасць уяўляе мураваная Праабражэнская царква ў Шклове. Будынак крыжападобны ў плане, цэнтральнай кампазіцыі. Над сяродкрыжжам узвышаецца вялікі васьмігранны светлавы барабан, накрыты гранёным шлемападобным купалам. Паміж крыламі крыжа ўбудаваны 4 квадратныя ў плане трох'ярусныя вежападобныя аб'ёмы. Верхнія васьмігранныя ярусы са скразнымі праёмамі завершаны гранёнымі купаламі. Розныя вышыні аб'ёмаў надаюць кампазіцыі вытанчанасць і вертыкальную накіраванасць. Усе фасады вырашаны з ярка выяўленай сіметрыяй, падкрэсленай восевым размяшчэннем уваходу, над якімі па два акны з арачнымі завяршэннямі. Іх матыў паўтараюць вялікія аркі накшталт закаморкаў у завяршэнні сцен. Пластычная аздоба фасадаў даволі стрыманая: тонкія прафіляваныя карнізныя цягі, пілястры, плоскія нішы. Інтэр'ер двухсветлавы, сяродкрыжжа перакрыта самкнутым скляпеннем, астатнія часткі залы — цыліндрычнымі скляпеннямі з распалубкамі. У паўднёва-заходняй вежы — лесвіца на званіцу. Дэкаратыўны акцэнт у інтэр'еры зроблены на групах тонкіх калонак, якія падтрымліваюць светлавы барабан. У 1993 г. на галоўным купале быў адноўлены дах і ўстаноўлены новы крыж.

А. Грудзіна

Спіс помнікаў архітэктуры Шклоўскага раёна, занесеных у «Збор помнікаў гісторыі і культуры Беларусі: Магілёўская вобласць»

(Мн., 1986. С. 378–392).

1. Ратуша — помнік грамадзянскай архітэктуры, які таксама занесены ў каталог помнікаў сусветнай архітэктуры, выдадзены ў ЗША.
2. Будынак канторы папяровай фабрыкі «Спартак» — помнік грамадзянскай архітэктуры з элементамі стылю «мадэрн».
3. Асабняк у парку — помнік драўлянага дойлідства з элементамі неакласіцызму.
4. Былы жылы дом (вул. Савецкая, 54) — помнік грамадзянскай архітэктуры.
5. Былы жылы дом (вул. Паштовая, 31) — помнік грамадзянскай архітэктуры.
6. Сінагога (вул. Дзікуна, 99) — помнік мураванага дойлідства.
7. Касцёл Пятра і Паўла — помнік эклектычнай архітэктуры.
8. Праабражэнская царква — помнік эклектычнай архітэктуры, у якім спалучаны рысы стыляў псеўдавізантыйскага і «мадэрн».
9. Пакроўская царква (в. Вялікія Лазіцы) — помнік драўлянага дойлідства з элементамі класіцызму.
10. Царква (в. Старое Высокае) — помнік архітэктуры з рысамі псеўдарускага стылю.
11. Паштовая станцыя (в. Лакуці) — помнік грамадзянскай архітэктуры.

Будынак былой сінагогі

Шклоўскі кадэцкі корпус: з гісторыі стварэння і дзейнасці

Да 1778 г. Расія мела толькі дзве вучэбна-выхаваўчыя ўстановы для падрыхтоўкі афіцэраў у сухапутныя войскі: Сухапутны кадэцкі корпус (утвораны ў 1732 г.) і Артылерыйскі і інжынерны шляхецкі корпус (утвораны ў 1758 г.). Абедзве ўстановы знаходзіліся ў Санкт-Пецярбургу.

С. Г. Зорыч неўзабаве пасля пераезду ў Шклоў, які яму падарыла Кацярына II, вырашае стварыць і тут ваенна-вучэбную ўстанову. Ён добра разумеў вялікую патрэбнасць у адукаваных людзях для далучанай да Расіі Беларусі, да таго ж разлічваў на падтрымку сваёй дабрадзейкі. Як сведчаць архіўныя матэрыялы, Зорыч бярэ на выхаванне дваіх збяднелых дваран — Георгія Кіслякова і Васіля Райковіча, а крыху пазней яшчэ пяць чалавек з мясцовых дваранскіх нашчадкаў. Па меры павелічэння колькасці навучэнцаў неабходна было мець своеасаблівую школу, што Сямён Гаўрылавіч і ажыццявіў, стварыўшы новую ўстанову — Шклоўскае высакароднае вучылішча, а дзень заснавання яе — 24 лістапада 1778 г.— названы быў днём імянін Кацярыны II.

Першымі клопатамі заснавальніка вучылішча былі клопаты аб забеспячэнні яго настаўнікамі. Па тагачасных умовах давялося выпісваць іх з-за мяжы, на што затрачвалася да 2 тысяч рублёў штогод. Прыехалі выкладчыкі па розных вучэбных прадметах з Берліна, Трыра, Бруселя, Гётынгенскага універсітэта. Вядомы імёны толькі двух настаўнікаў: Даж (матэматык) і Лазіч. Усяго ж у вучылішчы працавала ад 20 да 30 настаўнікаў. Іх аклады складалі ад 300 да 1100 рублёў. Законавучыцелем выхаванцаў на працягу 17 гадоў быў настаяцель Успенскай царквы протаіерэй Аляксандр Старынкевіч.

Для вучылішча Зорыч набыў за 8 тысяч рублёў багатую па тым часе бібліятэку і на яе папаўненне кнігамі і часопісамі штогод расходаваў больш чым па 200 рублёў. Бібліятэка ўтрымлівала, у прыватнасці, 178 рускіх, 743 французскія, 70 нямецкіх, 12 польскіх і 27 лацінскіх кніг. У вучылішчы меўся свой музей, для якога былі набыты заалагічная калекцыя (чучалы звяроў і птушак і інш.), розныя інструменты і прыборы: астранамічныя, фізічныя, геадэзічныя, іншыя вучэбныя дапаможнікі.

Зорыч перадаў вучылішчу сваю багатую карцінную галерэю, у якой меліся арыгіналы і копіі карцін Рубенса, Цяньера, Дольча і другіх вядомых майстроў.

Колькасць выхаванцаў вучылішча штогод павялічвалася: праз дзесяць гадоў іх стала больш за сотню, а ў 1797 г.— 252 чалавекі. Гэта былі дзеці дваранскіх родаў з Магілёўскай, Смаленскай, Чарнігаўскай і другіх суседніх губерняў, былі дзеці і з Францыі, Польшчы, Чарнагорыі, Грэцыі, Турцыі. Іх узрост — ад 8 да 18 гадоў. Вучні дзяліліся на тры разрады: поўныя пансіянеры, паўпансіянеры і прыходзячыя. Кожны пансіянер штогод абыходзіўся Зорычу ў 120 рублёў, паўпансіянеры мелі сваю вопратку, абутак і абыходзіліся ў 68 рублёў. Тыя, хто жыў на поўным утрыманні, атрымлівалі абмундзіраванне: мундзір, камзол, чаравікі, фуражкі, бялізну і інш. Калі колькасць выхаванцаў стала значнай, іх пачалі дзяліць на два ўзводы кавалерыі (кірасірскі і гусарскі) і на дзве пяхотныя роты (грэнадзёрскую і егерскую). Для выхаванцаў і афіцэраў кожнага падраздзялення мелася асобая форма параднага абмундзіравання, а паўсядзённа насілі аднолькавую спрошчаную форму: сурдут, камзол, панталоны з сукна.

Напачатку вучылішча размяшчалася ў флігелі, каля дома Зорыча. Новы трохпавярховы мураваны дом быў узведзены і адкрыты ў 1793 г. Вучылішча размяшчалася на правым беразе Дняпра фасадам да вялікай дарогі, што праходзіла праз Шклоў. Па баках галоўнага корпуса даўжынёй у 52 сажні стаялі два драўляныя флігелі, у якіх памяшчаліся лазарэт і музыкальная каманда. Кошт усіх пабудоў перавышаў 50 тысяч рублёў.

Выхаванцаў перавялі ў новае памяшканне 22 верасня 1793 г., што суправаджалася вялікім парадам, святкаваннем на працягу 8 дзён. На жаль, не прайшло і шасці гадоў, як 22 мая 1799 г. дом згарэў, а выхаванцаў вучылішча перавялі ў адзін з прыватных дамоў Зорыча. Пажар знішчыў значную частку маёмасці, кніг, карцін, прыбораў. Частку расцягнулі ў час пажару.

Цікава, што ўстанова, не маючы афіцыйнай ваеннай назвы, у адміністрацыйных адносінах мела характар ваенна-вучэбнай, бо кіравалася ваенным статутам, ці, больш правільна, палкоўніцкімі інструкцыямі пяхотнага і коннага палка. Выхаванцы па заведзенаму парадку ўставалі ў пяць гадзін раніцы, збіраліся на агляд і на малебен, а пасля снедання адпраўляліся ў класы, дзе мелі па

Будынак былой ямской станцыі, в. Лакуці

тры ўрокі да поўдня. Затым абедалі, дзве гадзіны адпачывалі, зноў ішлі на тры ўрокі (да 8 гадзін вечара), вячэралі і ў 9 гадзін вечара клаліся спаць.

У вучэбным плане вучылішча мела пяць класаў: з аднагадовым курсам для трох малодшых, з двухгадовым у чацвёртым і трохгадовым у пятым класах. Размеркаванне вучэбных прадметаў па класах было наступным: 1-ы клас — чытанне і пісьмо па-руску, французску і нямецку, па 16 гадзін на кожны прадмет; 2-і клас — чытанне і пісьмо па-руску, французску і нямецку, па 16 гадзін; 8 гадзін арыфметыкі і 4 гадзіны малявання; 3-і клас — закон Божы, 2 гадзіны; граматыка рускай, французскай, нямецкай моў, па 8 гадзін; 8 гадзін арыфметыкі; па 4 гадзіны гісторыі, геаграфіі, малявання; 4-ы клас — расійскае красамоўства, 4 гадзіны; французскі і нямецкі стыль, па 4 гадзіны; 5-ы клас — расійскае вершаскладанне, 2 гадзіны; 14 гадзін вышэйшай матэматыкі; 4 гадзіны артылерыйскай справы; 2 гадзіны тактыкі; ваенная і грамадзянская архітэктуры, па 4 гадзіны на прадмет. Выхаванцы старэйшых курсаў навучаліся, акрамя таго, фехтаванню, танцу, інструментальнай музыцы. Калі Зорыч жыў у горадзе, яны павінны былі танцаваць балеты, забаўляць яго гасцей, удзельнічаць у спектаклях — камедыйных і оперных.

Пасля заканчэння курса навучання выхаванцы выпускаліся з вучылішча і па хадайніцтву Зорыча прызначаліся на службу, пераважна ваенную. Першы выпуск адбыўся ў 1785 г. Да 1796 г. вучылішча падрыхтавала 268 кадэтаў. Большасць з іх сталі служыць у армейскіх і гарнізонных палках, артылерыі, у 1798 г. 10 чалавек паступілі ў Чарнаморскі флот. Адпраўляючы выпускнікоў на службу, Зорыч забяспечваў іх абмундзіраваннем, дапамагаў уладкавацца.

Многія выхаванцы вучылішча вызначыліся яшчэ пры жыцці Зорыча, напрыклад, браты Іван і Пётр Кахоўскія, А. І. Маркевіч (выпуск 1788 г.) — будучы генерал-лейтэнант, аўтар шэрага фізіка-матэматычных даследаванняў артылерыйскай зброі, Н. Пятраеў (выпуск 1799 г.) — аўтар некалькіх арыгінальных сачыненняў па матэматыцы, фартыфікацыі і механіцы і многія іншыя. У запісках генерал-губернатара Магілёўскай губерні Л. Н. Энгельгарда, таксама выхаванца Шклоўскага вучылішча, знаходзім упамінанне, што ў ім былі «хорошие учителя» і што многія выхаванцы выносілі з вучылішча «большие сведения, особенно по математике». З няменшай удзячнасцю былыя выхаванцы вучылішча ўспаміналі Зорыча і праз дзесяткі гадоў пасля яго смерці. Нехта Падлаў расказваў, што калі ён у 40-х гадах прывёз састарэламу бацьку (выпуск 1793 г.) партрэт яго заснавальніка, то стары са слязамі на вачах сказаў: «Теперь только я понимаю, как много сделал для нас Зорич, и сожалею о том, как мало ценили мы в то время его внимание к нам и заботы о нас».

У 1797 г. паступіў указ Паўла I прылічыць вучылішча ў Шклове да казённага ведамства і назваць яго Шклоўскім. Імператар прапанаваў Зорычу зноў паступіць на службу, узвёў яго ў званне генерал-лейтэнанта і шэфа Ізюмскага гусарскага палка, а вучылішча прыняў на дзяржаўны кошт. У лютым 1800 г. дырэктар вучылішча Фліверк атрымаў другі указ: «...от вверенного Вам Шкловского кадетского корпуса обо всём... относиться прямо ко мне».

Фліверк паведаміў Паўлу «аб няўтульнасці памяшкання кадэтаў у доме Зорыча, зусім да гэтага непрыстасаваным», пасля чаго атрымаў указ ад 16 сакавіка 1800 г.: «Господин полковник Фливерк! Получил донесение Ваше от 6 марта. Усмотря из оного неудобство быть вверенному Вам кадетскому корпусу в Шклове, по неимению там достаточной для него квартиры, думаю перевести его в Гродно, где находится дворец довольно велик, и для того повелеваю Вам, чтобы мало-помалу Вам перевести туда вверенный Вам корпус и для его переводу какое время удобнее почитаете и какие распоряжения Вами сделаны будут, меня уведомите».

2 красавіка 1800 г. Фліверк па невядомай прычыне быў звольнены са службы. Замест яго дырэктарам прызначылі палкоўніка В. К. Катлера.

У запісках Дабрыніна, апублікаваных у часопісе «Русская старина» (№ 9. 1871 г.), падрабязна расказваецца пра пераезд вучылішча ў Гродна.

Пасля малебну кадэты (іх было 211 чалавек) з абозам на 106 конях, з лазарэтам, у якім знаходзілася 30 хворых, крануліся ў дарогу... Праз тры тыдні пасля выступлення са Шклова корпус прыбыў у Гродна. У 1807 г. яго перавялі ў Смаленск, адтуль у Маскву і назвалі першым Маскоўскім кадэцкім корпусам.

Такім чынам, створанае Зорычам «благородное училище» стала трэцяй па ліку вучэбнай установай для падрыхтоўкі афіцэраў у Расіі.

А. Турбінскі

Шклоўскі балет

«Мы знаем по описям, запискам и бумагам, что представления, даваемые в шкловском имении Зорича, превосходили по великолепию придворные спектакли русские, былые польские, императорские австрийские в Шенбрунне и французские спектакли в Версале», — так писал исследователь крепостного усадебного театра В. Г. Сахновский. (Музыкальный театр Белоруссии. Мн., 1990. С. 235.)

...Балет в Шклове возник на грани 1779—1780 гг. — между приездом графа С. Г. Зорича в новую свою вотчину и подготовкой встречи Екатерины II. К этому времени, как писал в «Записках» С. А. Тучков, «театр и оранжерея с преогромными залами вскоре были построены». Далее он сообщает, что «комедианты были посредственны и лучшие сочинения были играны охотниками и кадетами. Но балеты были весьма хороши, а также музыка и певчие». (Записки Сергея Александровича Тучкова. СПб., 1906. С. 250.)

Организация театра и обучение танцам крепостных были поручены П. Барцантии, которого в документах именовали «машинист театра и учитель благородного общества детей танцевать, флорентийской артиллерии прапорщик». Это был один из многочисленных авантюристов, нашедших себе пристанище в Шклове. В одном из следственных документов по шкловскому имению указывалось, что «он уроженец города Флоренции. Паспорт предъявил из города Любека. С сим паспортом выехал в Россию назад тому 8 лет (находился при вольных театрах Московском и Петербургском, но аттестатов из тех мест не имеет). К Зоричу прибыл из Петербурга в Шклов предшествием ее Императорского Величества в белорусские губернии в 1780 году по общей подорожной... с разного звания мастеровыми людьми для разных построений, как то театра и фейерверка». (ЦГАДА, ф. 7, д. 37, л. 161.)

Возможно, что в 1779—1780 гг. была организована и балетная школа, ибо воспоминания немецкого путешественника Х. Шлегеля, посетившего Шклов перед приездом Екатерины II, свидетельствовали о том, что занятия с крепостными танцовщиками были поставлены на серьезную основу. Х. Шлегель писал: «Зорич выбрал из своих крепостных несколько девушек, обучил их театральному танцу, и эта попытка увенчалась счастливым успехом. Люди, знакомые с петербургским театром, утверждают, что здешние танцовщицы мало и даже ни в чем не уступают столичным. К ним приставлена смотрительница и итальянец (Мариодини), мастера своего дела, обучившие их театральному танцу. Всех танцовщиц 20. Они находятся под непрестанным наблюдением смотрительницы и упражняются во французском разговоре, чтении, письме и счете. Они разговаривают по-французски свободно. Девушки живут в отдельном доме и занимаются все вместе. По одну сторону зала находится их спальня, с другой стороны живет их учитель, который проявляет много забот об их сценическом образовании. Господин Мариодини купил белорусскую девушку, у которой он открыл замечательный танцевальный талант*. Она хороша собой. Занятия с ней идут с исключительным успехом, и он верит, что со временем она будет первой танцовщицей в Петербурге». (Schlegel Sh. Reisen in den Jahren, 1801, 1807 und 1815 Meiningen, 1823. T. 3. C. 171.)

Празднества в Шклове в 1780 г. были необычайно пышными. В день приезда в усадьбу Зорича Екатерины II и австрийского императора Иосифа II «открылось шесть театров». (Русская старина. 1898. Т. 95. С. 567.) В представлениях участвовали не только кадеты, но и крепостные танцовщики школы Мариодини.

Через год балетная труппа Зорича была в состоянии ставить самостоятельные спектакли: во время торжеств в честь официального открытия Шкловского дворянского училища в 1781 г. «кадеты сыграли небольшую русскую комедию, а собственная балетная труппа хозяина исполнила аллегорический балет с хором». (Дразен Н. В. К истории крепостного театра: Шкловский балет // Столица и усадьба. 1914. № 12-13. С. 9.)

Среди крепостных танцовщиков графа С. Г. Зорича упоминаются наиболее талантливые. К. Е. Буткевич исполнял в основном первые, серьезные партии пантомимного характера, для воплощения которых были необходимы незаурядные драматические способности. В «демихарактерных» танцах отличались К. Н. Скоробогатов и Ф. Шамборский, в комических партиях — Е. С. Чу-

* Очевидно, речь идет о первой танцовщице шкловского балета Е. Азаревичевой. И если это предположение верно, то Мариодини перепродал ее Зоричу, ибо она фигурирует среди людей, вошедших в его наследство в 1800 г.

тиков. Выделялись своими способностями танцовщики Е. Ф. Полетыка, С. Куськин (Кусаков) и братья Р. и Г. Беккеры. «Первыми танцовщиками» шкловского балета были родственницы Екатерина Лукьяновна и Пелагея Азаревичевы. Документы по имению Зорича донесли до нас имена пятерых крепостных танцовщиц: Е. К. Суворовой (Соваровой), Н. Е. Сониной, М. Бушинской (Гушинской), Е. Даховниковой, А. Максимовичевой.

Что касается репертуара балетной труппы, то он остался неизвестным. Балетная труппа привлекалась к различным апофеозам, театрализованным приветствиям и пантомимам, к которым был склонен вкус сиятельного «парвеню»: С. Г. Зорич происходил из богатых сербских крестьян. Среди пантомим, в которых участвовали ученики Мариодини, была поставленная 26 мая 1780 г. в Шклове «Двойная женитьба Арлекина, или Арлекин, счастливый в магии». В числе ее участников — дворяне Могилевской губернии и крепостные танцовщики и танцовщицы С. Г. Зорича.

Судя по воспоминаниям современников, Арлекин — частый герой комических балетов шкловского придворного театра. Об этом, в частности, говорится в довольно колоритных воспоминаниях сербского дворянина А. С. Пищевича, который посетил Шклов в 1783 г. Рассказывая об усадьбе и царивших в ней нравах, А. Пищевич с сарказмом писал: «Зорич сделал сие место довольно приятным, съезды бывают велики и время проходит в разных веселостях; далее концерты и самобеднейший театр занимают попеременно сей миниатюрный дворик, владыка которого должен более, нежели стоит его имение... Есть одно заведение в Шклове, которое из самолюбия Зорич устроил, но не меньше полезное; я говорю о так называемом кадетском корпусе, в котором принимают до 200 молодых дворян, учат их иностранным языкам и разным наукам, а главное, попечение, казалось, клонилось из них сделать танцмейстеров и актеров, прыгать они начали уже изрядно и разговаривали на театре довольно толковито... и, будучи в жару лет своих, играют комедии и прыгают балет с двадцатью крестьянскими девками, выбранными из деревень г-на Зорича, лиц столь занимательных, что кадеты идут охотно на театр». Далее А. Пищевич описывал, что он видел на сцене: «Театр кончился тем, что я имел удовольствие апплодировать великому дурачеству. Родственник мой гвардии капитан Хорват в арлекинском платье увеселял шкловскую публику прыганьем балета в первой паре с дочерью первого Зоричева повара... молодая повариха была прекрасна и хорошо воспитана в Варшаве». (Пищевич А. Чтения в Обществе ист. и древностей Российских... 1885. Ч. I. Кн. I. С. 29.) По свидетельству Н. В. Дразена, в партии Арлекина предстал перед зрителями не кто иной, как Д. И. Хорват, сын И. О. Хорвата — владельца крепостного театра, который работал в 30—40-х годах XIX в. в селах Спасское и Головчино Курской губернии.

Вспоминая дни учебы в шкловском корпусе, С. Б. Броневский писал, что Зорич «непрерывно давал балы, обеды, балеты, концерты» и вел себя «вроде видинского паши, имея сераль из балетных девушек». (Исторический вестник. 1889. Т. 38. № 12. С. 503.) Крепостных танцовщиц раздаривал, выдавая замуж за своих слуг. Так, например, случилось с крепостной балериной П. Азаревичевой, которую Зорич подарил своему камердинеру Й. де Ламмона.

О завершающем периоде работы шкловского балета почти не сохранилось сведений. Когда исчез из Шклова Мариодини, неизвестно. Но 4 февраля 1795 г. в Шклове появляется новый балетмейстер — М. Пренчинский. Сведения о нем донесли до нас фискальные документы: за графом С. Г. Зоричем и его гостями был учрежден негласный надзор, и по поручению генерал-прокурора сената князя П. В. Куракина в Шклов был послан с тайной миссией действительный тайный советник Николаев, который за короткий срок собрал необходимые сведения о персонале и гостях шкловского имения. В его сообщении Куракину от 19 апреля 1799 г. фигурирует и М. Пренчинский, «уроженец Белаго Стоку, имеет аттестат от графини Браницкой от 13 октября 1791 г., подорожную из Риги до Шклова за подписанием генерал-поручика и кавалера барона фон Дерпалена — учитель танцевального класса от 4 февраля 1795 года». (ЦГАДА, ф. 7, д. 3347, с. 15.)

Не вызывает сомнений, что М. Пренчинский работал в театре и в балетной школе, но приглашен он был С. Г. Зоричем в кадетский корпус и получал как учитель танцев самый большой в корпусе оклад — 1124 руб. 35 коп. в год (для сравнения можно указать, что в том же корпусе учитель российской грамматики получал 200 руб., а арифметики — 364 руб. 40 коп. в год). Работал М. Пренчинский в корпусе и в 1798 г., о чем свидетельствовал перечень расходов. В нем за 28 июня 1798 г. было отмечено, что выдано на покупку кадетам, назначенным г-ном балетмейстером Пренчинским к танцеванию балетов 20 человекам «по и падэ» чулок бумажных, суммы оная — 20 руб. 80 коп. Примечательно, что М. Пренчинский упоминается в этом документе как балетмейстер, подготавливающий кадетов к «танцеванию балетов». Последние сведения о М. Пренчинском относятся к 1799 г.: корпус был взят под опеку и переводится в Гродно, а с корпусом уезжает «мужской кордебалет», но уехал ли с кадетами М. Пренчинский, неизвестно. Возможно, что он остался в шкловском имении, где, несмотря на тяжелую болезнь владельца, «всякий день комедии или бал», как доносил о том в рапорте в Санкт-Петербург Николаев.

После смерти С. Г. Зорича шкловский придворный театр прекратил свое существование. Оркестр уехал вместе с кадетским корпусом, а балетная труппа осталась не у дел. Но в 1800 г. решилась и ее судьба: после переговоров гофмаршала и директора императорских театров А. Л. Нарышкина с опекуном над имением дворянином Петро-во-Соловово и наследником С. Г. Зорича генерал-майором Д. Неранчичем в Шклов был командирован русский балетмейстер И. И. Вальберх. Он отбирает из балета 14 человек и увозит их в Санкт-Петербург. После приезда в Санкт-Петербург, куда они прибыли 18 апреля 1800 г., обер-камергер А. Л. Нарышкин обратился в контору театральной дирекции с официальным «Предложением»: «Выписанных из Шклова и доставленных для здешнего театра танцеров и танцерок, всего четырнадцать человек, о именах которых прилагается список, предлагаю конторе: числить в службе при балетной труппе, и для того включить их в список, и производить им жалованья в год каждому по двести рублей и сверх того квартиру и дрова, начиная жалованья выдачу со второй половины нынешнего апреля месяца». (ЦГИА, ф. 97/221, д. 37, с. 92.) Так начался петербургский период шкловских артистов, целиком относящийся к истории русского балетного театра.

Закрытием Шкловского театра в 1799 г. окончилась эпоха крепостного балета на территории Белоруссии.

...Только в начале XX в. появляются условия для создания национального профессионального театра и профессиональной белорусской хореографии, начальным этапом которой необходимо считать танцевальные программы труппы И. Т. Буйницкого.

Г. И. Барышев. Театральная культура Белоруссии XVIII века. Мн., 1992. С. 213—218, 245—246.

Беларускія артыстычныя дынастыі

В XIX в. были широко известны театральные (балетные) династии Азаревичевых, Буткевичей, музыкальные династии Стефановичей, Миладовских. Большой популярностью пользовалось семейство Подобедовых. Глава его, Корнила Подобедов, был крепостным екатерининского вельможи Зорича и служил музыкантом при Шкловском кадетском корпусе Могилевской губернии.

После смерти Зорича его имение было разделено между наследниками Давидом Неранчичем и Арсением Черноевичем. Корпусные музыканты попали к Неранчичу, который в 1800 г. продал их в уплату за долги Зорича в Гродно и Москву, семьи же их отошли к Черноевичу и остались в Шклове. При этом распались десятки семей: дети остались без отцов, жены без мужей.

Судьба шкловских музыкантов после продажи оказалась более печальной, большинство из них было лишено всякой возможности заниматься искусством и превращено в прислугу.

Уязвленный этим, Неранчич писал в письме к Г. Р. Державину: «Токмо восемь человек полагаются в чине корпусных музыкантов, остальные же употребляются в услужении, сие тем делается прискорбнее, что покойный брат мой издержал на заведение и обучение оных великий капитал и они в бытность здесь одного жалования в год около трех тысяч рублей получали, теперь находясь в услужении, совершенно лишаются искусства своего, что я, яко владелец имения, чувствительным убытком должен почитать».

О дальнейшей судьбе Корнилы Подобеда пока ничего не известно.

По-иному сложилась судьба его детей — Михаила и Ивана. Незаурядная музыкальная одаренность братьев проявилась рано и настолько ярко, что Черноевич распорядился обучать их игре на музыкальных инструментах. Михаила на скрипке, Ивана на виолончели. Успехи братьев Подобедовых были поразительны.

К чести Черноевича нужно заметить, что он смог не только оценить выдающиеся дарования своих крепостных, но и понять, что для развития их таланта крепостное состояние не только тормоз, но и верная гибель. И в 1824 г. Михаил, а в 1827 г. Иван были отпущены «вечно на волю».

Михаил Подобедов был зачислен в оркестр императорских театров 16 сентября 1824 г. с обязанностью играть на скрипке и альте, с жалованием 1000 рублей в год, ему было присвоено звание придворного камер-музыканта.

Из этих фактов можно безошибочно заключить, что Михаил Корнилович, еще будучи крепостным в Шклове, достиг высокого профессионального исполнительного мастерства. Вскоре Михаил Подобедов стал одним из лучших скрипачей Придворного оркестра и по праву завоевал высокий авторитет и уважение у коллег. К сожалению, дорогой ценой досталось М. Подобедову одобрение дирекции. Прослужив всего 9 лет и 2 месяца, он оказался не способным продолжать дальнейшую службу из-за быстро прогрессирующей болезни глаз. 11 июня 1835 г. скрипач ослеп полностью.

Иван Подобедов после приезда из Шклова в 1827 г. сумел завоевать почетное место в Петербургском оркестре. Согласно контракту Подобедов был обязан исполнять первую виолончель в балетах, малых операх, драмах и водевилях. Причем артист, по его собственным словам, не имел ни одного дня свободы, и даже будучи «расстроен здоровьем», вынужден был исполнять свои обязанности. Репутация И. Подобедова в оркестре была очень высокой. Инспектор музыки Л. Маурер отмечал «отличный талант и примерную усердную скрипку Подобедова», подчеркивая, что последний «очень полезен и даже необходим при наших оркестрах». Однако, несмотря на огромный талант и все старания, Ивану Корниловичу не удалось добиться широкой артистической известности и получить доступ к концертной эстраде.

Горькой была судьба талантливых артистов, которые чувствовали себя иноземными в собственной стране. Неудовлетворенность своим артистическим положением заставляла И. К. Подобедова искать другие формы творческой деятельности. В частности, он долгое время обучал игре на виолончели в театральной школе и в Павловском кадетском корпусе.

Тридцать три года прослужил И. Подобедов при петербургских театрах и почти все это время занимал ответственное место солиста-виолончелиста, редчайший случай в исполнительской практике тех лет. В 1860 г. Ивана Корниловича не стало. Но фамилия Подобедовых не перестала звучать в петербургских театрах. Две его дочери — Надежда и Екатерина стали драматическими актрисами. Они с блеском выступали на столичных сценах и пользовались большой популярностью у публики.

Артистическая династия Подобедовых внесла яркую страницу в историю русской художественной культуры XIX века.

К. Александров

«Нёман». 1981. № 5.

Адпушчаныя на волю

Многія з прыгонных артыстаў тэатра Зорыча сталі вядомымі не толькі на Шклоўшчыне, але і ў Пецярбургу, Маскве. Сярод іх сям'я Азарэвічаў (Азарэвічавых). Зачынальніцай яе з'яўляецца Пелагея (гады нараджэння і смерці не вядомы). На сцэне артыстку ведалі пад прозвішчам Жывакіні (справа ў тым, што яна была замужам за італьянскім мастаком Джавакіні). Нарадзілася ў Шклове, была прыгоннай «тансёркай» тэатра Зорыча. Выконвала асноўныя партыі. Адпушчана на волю ў 1799 г. Да 1812 г. танцавала на маскоўскай сцэне. Маці Васіля Ігнатавіча (нарадзіўся ў 1805 г., памёр 18 (30).01.1874 г.). Рускі акцёр. З 1825 г. працаваў у Малым тэатры. Вызначыўся як комік-буф у вадэвілях. Спалучаў прастату, натуральнасць выканання з яркай гратэскавасцю, буфанадай, імправізацыяй (часта сатырычнай). Родапачынальнік сям'і рускіх акцёраў Жывакіні.

Кацярына Лук'янаўна Азарэвічава (год нараджэння не вядомы, нарадзілася ў Шклове, памерла пасля 1870 г.), беларуская і руская артыстка балета. Пляменніца Пелагеі, маці Надзеі Апалонаўны і Марыі Апалонаўны. Да 1799 г. вядучая танцоўшчыца Шклоўскага тэатра Зорыча. Вучаніца М. Пранчынскага. У 1800 г. вывезена ў ліку 14 прыгонных акцёраў са Шклова і перада дзена дырэкцыі Пецярбургскіх імператарскіх тэатраў. У 1802 г. адпушчана на волю.

Надзея Апалонаўна (нарадзілася пасля 1802 г. у Пецярбургу, год смерці не вядомы). Па мужу Навіцкая, на сцэне Азарэвічава 1-я, руская артыстка балета і драмы. Вучылася з сястрой Марыяй у Шахаўскога ў «Маладой трупе». Дэбютавала ў 1812 г. («Мальцэста» Антаналіні). У 1821—1826 гг. выступала на пецярбургскай імператарскай сцэне.

Марыя Апалонаўна (нарадзілася ў 1804 г. у Пецярбургу, памерла 14.11.1888 г.). На сцэне вядома як Азарэвічава 2-я, руская артыстка. Вучаніца А. Шахаўскога і К. Сямёнавай. У 1821—1843 гг. іграла на пецярбургскай імператарскай сцэне. Першая выканаўца ролі Лізы ў «Горы ад розуму» А. Грыбаедава (1831 г.).

Пётух Павел (гады нараджэння і смерці не вядомы), беларускі хормайстар 2-й паловы XVIII ст. З сям'і свяшчэнніка. З 1781 г. працаваў у Шклоўскім тэатры Зорыча, дзе навучаў прыгонных спевакоў. А да гэтага працаваў у Магілёве ў епіскапа Г. Канінскага.

Скарабагаты Кірыла Нічыпаравіч (гады нараджэння і смерці не вядомы), беларускі і рускі артыст балета канца XVIII — пачатку XIX ст. З сялян. Да 1800 г. — прыгонны танцоўшчык Шклоўскага тэатра Зорыча. З 1800 г. — характарны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага тэатра. Адпушчаны на волю ў 1820 г. Выкладаў танец у маёнтку князёў Галіцыных у Сярдопалі.

Чуцікаў Яфрэм Сямёнавіч (год нараджэння не вядомы, нарадзіўся ў Шклове, памёр 8 (20).06.1841 г.), беларускі і рускі артыст балета. Да 1800 г. — прыгонны танцоўшчык Шклоўскага тэатра Зорыча. У 1800—1822 гг. — характарны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага тэатра. У 1822 г. адпушчаны на волю.

Палітыка Яўсей Піліпавіч (год нараджэння не вядомы, нарадзіўся каля Шклова, памёр 7 (19).12.1820 г.), беларускі і рускі артыст балета. Да 1800 г. — прыгонны танцор Шклоўскага тэатра Зорыча. У 1800—1817 гг. — пантамімны танцоўшчык Пецярбургскага імператарскага тэатра. У 1817 г. адпушчаны на волю.

Буткевіч Красцьян Ягоравіч (год нараджэння не вядомы, нарадзіўся каля Шклова, памёр 2.10.1846 г.), беларускі і рускі артыст балета. Да 1800 г. — прыгонны танцор Шклоўскага тэатра Зорыча. Да 1825 г. — пантамімны танцоўшчык балетнай трупы Пецярбургскага імператарскага тэатра. У 1822 г. адпушчаны на волю.

Л. Аксёнаў

«Ударны фронт». 1993. 7 красавіка.

Экскурс у этнаграфічную спадчыну

У рэспубліцы выдзелена 5 гісторыка-этнаграфічных рэгіёнаў — Паазер'е, Падняпроўе, Цэнтральная Беларусь, Панямонне і Заходняе Палессе. Шклоўшчына належыць да Падняпроўскага рэгіёна. Адметнасць яго па планіроўцы пасяленняў: вяночныя дамы, гумны, у канцы сядзіб — абавязкова лазні. Жыхары Шклоўшчыны займаліся земляробствам. Зямля наразалася палоскамі, якія размяжоўваліся сцежкамі. Нашы мудрыя продкі на адным загоне сеялі праз два гады на трэці. Найперш сеялі пшаніцу, авёс, ячмень, апошнімі — грэчку, бульбу, лён.

Рэчы побыту ў асноўным былі самаробныя. Прылады працы, посуд, мэблю рабіў кожны гаспадар сам. З плеценых вырабаў былі распаўсюджаны кошыкі. Керамічным посудам забяспечвалі сябе і нават вывозілі яго за межы ганчары вёсак Зорка, Вільянава, Благаўка, Літвінавічы. Асабліва высокім попытам карыстаўся посуд Благаўкі. Спецыялісты мяркуюць, што гэта ў першую чаргу — майстэрства, а потым — адметнасць гліны. Гаршкі і гарлачы благаўскіх ганчароў захоўваюцца як экспанаты ў Беларускім дзяржаўным музеі народнай архітэктуры і побыту. Вось чаму на Шклоўшчыне шмат прыказак і прымавак звязана менавіта з гэтай дзейнасцю: «Жыццё пражыць — не гаршчок зрабіць», «Ад гаршка — два вяршка», «Назаві хоць гаршком...», «У добрага ганчара гаршчок сам варыць».

Апраналіся сяляне і мяшчане ў саматужныя строі. Верхнюю вопратку — кажухі, світкі — шыў кравец. Звычайна ён кватараваўся ў гаспадара і шыў кажухі, шапкі-вушанкі са скур зайцоў і авечак. Сарочкі, спадніцы, нагавіцы, фартухі шылі жанчыны з ільняной тканіны і сукна хатняга вырабу. Дзеці да 7—8-гадовага ўзросту насілі доўгія сарочкі.

Штодзённае харчаванне сялян і местачкоўцаў не надта было разнастайным, але на стол два разы на дзень падавалася страва з мясам. На снеданне — капуста з мясам, малочна-бульбяны ячневы суп з мясам. На абед — каша з мясам, тушаная бульба (скрылькі) з мясам, кісель аўсяны. На вячэру — малочная заціркa, кіслае малако, тварог. Святочныя стравы — бліны, аладкі, якія мазаліся маслам, здорам, макаліся ў смятану, да іх падавалася віналіна, смажаная яешня з грыбамі, мёд. У пост елі купленыя селядцы, цёрты мак, семя канопляў, грыбы.

Для духоўнай культуры шклоўцаў характэрным з'яўляецца захаванне агульнаславянскіх рыс у народных абрадах, вераваннях і фальклоры. Апошні на Шклоўшчыне вельмі слаба даследаваны, у тым ліку ў асноўных крыніцах беларускай фальклорнай спадчыны — у працах Шэйна, Раманава, Федароўскага, Шырмы, Гілевіча. А між тым нам ёсць што збіраць, захоўваць і перадаваць у спадчыну дзецям. Вельмі багатая ў нас абрадавая паэзія. Наведаўшы нашы мясціны, этнограф Кудрынскі ў 1905 г. пісаў: «Беларус не працуе, а свяшчэннадзействуе». Як бачна, чалавек і зямля ў нашых продкаў — адно цэлае, як чалавек і Бог. Выязджаў, скажам, заходскі селянін першы раз у поле і прасіў: «Зямля-матухна, дай маім дзецям хлеба, а ўсім людзям красы». Прыгожым полем любаваліся ўсе людзі вёскі: «Ой, жыта ўрадзіла ўсім на дзіва». Існаваў і маральны фактар — удзячнасць селяніну ад іншых людзей. Напрыклад, спявалі песню ў дзень першага выгану жывёлы на пашу:

А ў нашага хазяіна
Поле роўнае
Ды ўдалае.
Сто год жыці табе ў жыце!

Або высмейвалі:

Крывое поле,
Крывое.
Дай Бог табе
вока такое.
Як ты ўзараў,
Каб цябе Бог пакараў!
Як ты пасеяў,
Што вецер развеяў.

Зямля і хлеб былі свяшчэннымі на Шклоўшчыне. Таму хлеб і каша — найбольш папулярныя абрадавыя стравы. Хлебам сустракаюць гасцей, маладажонаў: «Хлебам-соллю вас прывячаем — шчасця, долі жадаем». Хлеб неслі ў поле на першую сяўбу: «Калі з хлебам арэш, сееш — значыць і жаць будзе што». Каша з цэлага зерня (ячменнага, прасянога) — неад'емная частка радзіннага, вясельнага, памінальнага, каляднага, жніўнага абрадаў. Цэнтральнае месца ў святкаванні радзін на Шклоўшчыне адводзілася бабулінай кашы. Таксама на другі дзень вяселля падносілі кашу маладой. На памінкі варылі салодкую ячневую кашу, а таксама рытуальную страву — канун. Такі абрад і зараз жыве. А калядная куцця! Каша з цэлага тоўчанага ячменю. І зараз нашы бабулі частуюць ёй на Каляды. Куцця спачатку абносіцца вакол хаты, каб паспрыяць будучаму ўраджаю. Вяршок каляднай кучы аддаецца курам — каб добра неслі. На гэтую абрадавую страву запрашалі мароза: «Мароз, мароз, хадзі куццю есці». Прыслухоўваліся. «Не ідзеш, ну дык не прыходзь і не марозь ні гуркоў, ні пшаніцы, ні ўсякай путаніцы, ні сеяльнікаў старых, ні пагонышчыкаў маладых».

Асабліва магічная сіла надавалася блінам і аладкам. Відаць, сама іх форма сімвалізавала сонца і яго гадавы круг. Старажытная абраднасць ляжыць у аснове калядавання, масленіцы, шчадравання, валачобніцтва. Калі хадзілі па вёсцы калядоўнікі, ні адзін гаспадар не спаў — валачобнікі прыйдуць, пажадаюць шчасця і долі, здароўя, ураджаю і прыплоду. Тыя дворы, якія абміналіся калядоўшчыкамі, ганьбаваліся — гаспадар злы і скупы:

Не хочаш дарыць, скупы, пойдзеш з намі
Снягі таптаць, сабак дражніць, людзей смяшыць.

А добраму і шчодраму гаспадару жадалі:

Дарыце гасцей, не ганіце гасцей,
Гэтыя госці не частыя: у гадочак толькі разочак
Дай жа вам Божа ў пуні прыплод, у гумне сто коп.

Многія абрады звязаны з культам продкаў — Радаўніца, Дзяды. Кажуць пра Радаўніцу: «Да абеду аруць, у абед плачуць, а пасля абеду скачуць».

Цікавымі, на мой погляд, з'яўляюцца ў нас веснавыя абрады. Асабліва ўражваюць песні-вяснянкі. Паводле народных звычаяў, клікаць вясну ў нашых мясцінах пачыналі з Благавешчання. Гукалі вясну з узвышаных месцаў, пагоркаў, гуменных стрэх, берагоў рэк. Пры гэтым на адкрытых месцах распальвалі агні, палілі старызну — ачышчалі зямлю, спявалі:

Благаславі, Божа, зіму замыкаці,
Зіму замыкаці, вясну загукаці.

Гэтая песня была запісана ў 1903 г. у нашых мясцінах. Яна жыве і сёння.

Цікавыя народныя прыкметы мы запісалі на Шклоўшчыне ў час паходу: «Калі на

Стрэчанне певень нап'ецца з-пад страхі ваду, то на Юр'е конь наесца травіцы», «Як на Стрэчанне адліга — з ураджаю будзе квіга». Вельмі стражытнымі з'яўляюцца ў нас Саракі. Па іх сачылі, якая будзе вясна. Калі ад Стрэчання да Саракоў не ішлі дажджы, то летам чакалася засуха. Калі на Саракі на стрэхах ляжаў снег, то на Юр'е не выганяць кароў з хлявоў. «На Саракі мароз — яшчэ сорак маразоў тож».

Не спыняюся на нашых абрадах, якія ўспрымаюцца як народныя святы. Сярод іх вяселлі. Гэта была вялікая народная опера, дзе кожны выконваў сваю ролю таленавіта і ўмела, а дэкарацыямі да такіх народных гуляняў была сама прырода. Чалавек і прырода былі адным цэлым у нашых продкаў. Яны гэта адлюстроўвалі ў вусна-паэтычнай творчасці, звяртаючыся да зямлі: «Зямля-матухна», «Зямелечка, зямля сырая», «Вясна-вясёначка», «Лецечка весёленькае», «Хлебушак-бацечка», «Каравай-сонейка», «Бярозанька-падружка», «Бярозанька-сястрычка». У песнях, прыказках, прымаўках Падняпроўя лексіка светлая, лёгкая. Нават звычайнае жыццё і побыт (ён быў даволі цяжкі) апаэтызаваліся нашымі продкамі: чарачка залатая, вядзерца сярэбранае, дамочак высокі, гаспадар багаты, жана ўдала ды прыгожа, дочухна-красуха.

Хто ведае, чаму на нашых ручніках і сарочках такая прыгажосць? Яны ж служылі ўсяго толькі утылітарным мэтам. Вучоныя-этнографы сцвярджаюць, што характэрная асаблівасць Падняпроўя — насычанасць каларыту ў адзенні, ткацтве. Шклоўскія строі зачароўвалі этнографаў. На жаль, большасць ужо страчана назаўсёды.

Т. Мароз

«Ударны фронт». 1995. 20 снежня.

Газетным радком

Адкрыта музычная школа

Выдатны падарунак атрымала наша дзятва. У Шклове адкрыта раённая музычная сямігадовая школа. Цяпер тут працуе тры класы — фартэпіяна, баяна і домбры, у якіх навучаецца 85 дзяцей горада. Для іх навучання набыты 2 піяніны і столькі ж баянаў. У хуткім часе будуць закуплены і іншыя музычныя інструменты, неабходныя для абучэння вучняў музыцы.

М. Фёдараў

«Чырвоны барацьбіт». 1959. 29 верасня.

Новы клас музычнай школы

За шэсць гадоў работы музычнай школы адбылося два выпускі — 24 навучэнцы атрымалі пасведчанні, з іх 14 чалавек паступілі вучыцца ў музычныя вучылішчы Магілёва, Смаленска. Сярод іх Ткачонак, Паўловіч, Кірыленка, Ціханава, Раінчык, Цымбарэвіч. Выпускніца школы Вольга Марозава на выдатна закончыла Магілёўскае музычнае вучылішча і асталася ў ім выкладаць музыку, адначасова паступіла завочна ў кансерваторыю.

Сёлета адчынены яшчэ адзін клас школы — духавых інструментаў. Парог школы пераступяць хлапчукі і дзяўчынкі, якія будуць прыняты па класах фартэпіяна, баяна, акардэона, домбры, балалайкі і трубы.

М. Рыўкін

«Ударны фронт». 1965. 21 жніўня.

Незвычайны аркестр

Ці не праўда, незвычайна гучыць: жаночы духавы аркестр. А ён існуе пры клубе папяровай фабрыкі «Спартак».

— У пачатку года завітаў да нас выкладчык Магілёўскага музычнага вучылішча Аркадзь Таўкачоў, — расказвае загадчыца клуба П. П. Агеева. — Мы вырашылі стварыць мужчынскі духавы аркестр. Але вельмі мала мужчын згадзілася займацца музыкай. Вось тады Таўкачоў прапанаваў стварыць жаночы духавы аркестр. Мы ўспрынялі такое як жарт. Але ён зусім сур'ёзна растлумачыў нам, што такі духавы аркестр ужо ёсць у Магілёве.

Няпроста было пераканаць жанчын. Але паспрабавалі і захапіліся. Жанчыны для ігры патрэбны не кволыя. Некаторыя расчараваліся і пакінулі аркестр. Але самыя настойлівыя не здаваліся. Гэта Таццяна Лабанава, Любоў Рыдзеўская, Наталля Войтава, Святлана Чарных. Вакол гэтага касцяка групава

Памяшканне музычнай школы, г. Шклоў

ліся навічкі. Цяпер аркестр поўнасцю ўкамплектаваны. Нават мае пэўную перавагу перад магілёўскім: у іх іграюць толькі на трубах, а ў нас ёсць саксафон, флейта, кларнет, ударныя і іншыя інструменты, — ганарыцца Агеева. — А зусім нядаўна аркестр быў адзначаны на абласным аглядзе-конкурсе.

«Ударны фронт». 1987. 15 снежня.

Самабытныя па форме і выкананні

Ручнікі, абрусы, посцілкі, дзяруга, шкурцянкі, сеннікі, шарпінкі, андаракі, кашуміркі — прадметы ўсім знаёмыя, а некаторыя і звыклыя, неабходныя ў нашым паўсядзённым побыце. Гэтыя традыцыйныя вырабы ў кожным раёне мелі свае адметныя асаблівасці. З мэтаю вывучэння народных тканін і папаўнення калекцыі Рэспубліканскім музеем народнай архітэктуры і быту была праведзена этнаграфічная экспедыцыя па паўночнай Магілёўшчыне, у прыватнасці, у Шклоўскім і Бялыніцкім раёнах. Удалося таксама сабраць канкрэтныя гісторыка-мастацкія помнікі народнай культуры.

Традыцыйныя шклоўскія і бялыніцкія тканіны — несумненна цікавая з'ява. Гэта помнікі глыбока традыцыйныя, самабытныя па сваёй мастацкай форме і тэхнічных прыёмах выканання. З даволі шырокага пералі-ку прадметаў многія цяпер прадстаўлены ў музейных зборах. Галоўным чынам гэта прадметы ўпрыгожвання жылля: ручнікі, абрусы (настольнікі), старажытныя дзяругі і нават зніклыя з ужывання трапкачы. Даволі складаней справа з традыцыйным касцюмам як жаночым, так і мужчынскім. Захаваліся льняныя клятчатыя спадніцы «шарапінкі», бо іх насілі пажылыя жанчыны не так ужо і даўно — у пасляваенныя 50-я гады. Сустракаюцца, хоць і радзей, шарсцяныя андаракі, паясы. Рэліктавымі сталі белыя спадніцы, затканыя знізу карункавай тканінай, практычна зніклі традыцыйныя па крою, матэрыялу і арнаментацыі сарочкі, фартухі.

Мы, удзельнікі экспедыцыі, адчувалі разуменне, дабразычлівыя адносіны і падтрымку мясцовых жыхароў, работнікаў культуры. Наша асаблівая ўдзячнасць тым, хто дармова перадаў музею шэраг цудоўных помнікаў. У Шклоўскім раёне нам падаравалі два ручнікі А. М. Іванова з Ордаці, таксама ручнік П. Д. Герасімовіч з Мерчы, пояс і саматкан Марыя Захараўна Савянкова з Ордаці, саматкан і хустку Юлія Маісееўна Сікорына, маслабойку Ганна Рыгораўна Сякацкая з Дубраўкі Фашчаўскага сельсавета, кашміровую хустку Станіслава Станіславаўна Мікалуцкая.

В. Фадзеева

«Ударны фронт». 1987. 3 студзеня.

Кучарынскія вячоркі

Марына Аляксееўна Сяркова вельмі любіць дзяцей, сваю настаўніцкую працу і вёску. Гэтую любоў яна разам з педкалектывам імкнецца прывіць вучням Ржаўцаўскай НСШ, дзе выкладае мову і літаратуру. Яна выхоўвае ў вучняў пачуцці аседласці, каб яны змаглі прадоўжыць справу сваіх бацькоў-хлебаробаў. Выхаванню такіх пачуццяў садзейнічае і літаратурны гурток у школе. Яго галоўная ідэя — выхоўваць дзяцей на традыцыях народнай мастацкай творчасці, вывучаць духоўную спадчыну народа на мясцовым матэрыяле. І дзеці з вялікім задавальненнем наведваюць вясковых старажылаў, робяць запісы песень, прыпевак. І не толькі запісваюць, а і выконваюць іх. З гэтай мэтай стварылі фальклорны ансамбль, у якім удзельнічаюць вучні, настаўнікі, вяскоўцы розных узростаў.

Нядаўна адбылося першае выступленне ансамбля. Гэта было сапраўднае свята ў Кучарынскім сельскім доме культуры. Гледачы ўбачылі больш за 40 удзельнікаў ансамбля. Было ўражанне — нібы трапілі ў вясковую хату мінуўшчыны: усюды ручнікі, тканыя і вышываныя сурвэткі, абрусы. Уздоўж сцяны — лаўкі, на якіх сядзяць жанчыны, дзяўчаты, юнакі. Хто прадзе кудзелю, хто вышывае, хто вяжа. Усе задушэўна спяваюць беларускія песні, затым танцоры выходзяць у круг. Танцы змяняюцца гульнямі. Асабліва апладзіравалі хлапчукам, якія выконвалі беларускія народныя мелодыі на сельскіх бытавых прыладах — лыжках, качалках, пральнай дошцы і інш.

Хораша спяваюць разам са сваімі дочкамі і сынамі паляводка Вера Антонаўна Афанасьева, даяркі Зінаіда Пятроўна Кальчэўская і Кацярына Андрэеўна Зайцава, загадчыца фермы Галіна Сяргееўна Ліпская, повар дзіцячага садка Антаніна Фёдараўна Саўкіна. Праяўляюць актыўнасць даяркі Любоў Цімафееўна Кандакова і яе дачка Марына. Паспяхова выступаюць на калгаснай сцэне з сынамі загадчыцы дзіцячага садка Любоў Аляксееўна Цімошчанка і сельскага магазіна Таццяна Аляксееўна Міранкова, дырэктар Дома культуры Надзея Аляксандраўна Піваварава. У мастацкую самадзейнасць прывялі сваіх дзяцей настаўнікі школы Алена Міхайлаўна Рыжанкова, Тамара Міхайлаўна Сяркова, Ганна Іванаўна Лазіцкая.

На вячорках можна выпіць шклянку духмянага чаю, пакаштаваць цёплыя бліны, здобу. Але нязменным спадарожнікам вяскоўцаў застаецца песня.

С. Жукоўская

«Ударны фронт». 1989. 12 студзеня.

Дом культуры, г. Шклоў

Памяшканне СШ № 4

У форме народнай традыцыі

З энтузіязмам сустракалі Купалле ў саўгасе «Гарадзішча». Свята наладзілі каля возера ў Русаках. Пасля адкрыцця свята Купала з Купалінкай віталі прысутных і частавалі іх каравaем пад гукі музыкі, а саўгасны хор праспяваў беларускую народную песню «Купалінка».

Ганаровае права запаліць купальскае вогнішча прапануецца токару гаспадаркі Б. М. Чэлашаву. Разгараецца вогнішча, і ўсе прысутныя разам з казачнымі персанажамі (русалачкай, вядзьмаркамі, чортам) водзяць карагод вакол яго, наладжваюць гульні, танцы, спяваюць беларускія народныя песні, а пасля ўсе шукаюць кветку шчасця — папараць-кветку. Таму, хто знаходзіць яе, уручаецца прыз.

Л. Чапялінская

«Ударны фронт». 1989. 25 ліпеня.

Музей у... вучэбным кабінеце

Своечасова і добра падрыхтаваліся да новага навучальнага года настаўнікі Княжыцкай НСШ. З густам афармлены ўсе вучэбныя кабінеты. Але самае прыемнае ўражанне астаецца пасля наведвання кабінета беларускай мовы і літаратуры. Тут зроблены інтэр'ер сялянскай хаты, дзе размешчаны макет вясковай печы, сапраўдныя кросны, пралка, розныя атрыбуты сялянскага быту, узоры ганчарных вырабаў, саматканыя ручнікі і абрусы, адзенне, якое насілі нашы бабулі, іншыя прадметы, без якіх не магла існаваць прыватная сялянская гаспадарка. Адным словам, гэты клас нагадвае маленькі этнаграфічны музей.

Усе экспанаты сабраны ў жыхароў навакольных вёсак. А кросны, пралку, саматканыя ручнікі, спадніцу і кофту з беларускім арнаментам прывезла настаўніца беларускай мовы і літаратуры Тамара Сяргееўна Андрэева. Гэтыя рэчы ёй падаравала яе 106-гадовая бабуля Лізавета Уладзіміраўна, якая жыве ў в. Падсолтава Мсціслаўскага р-на.

А. Бялясаў

«Ударны фронт». 1990. 20 верасня.

Пад эгідай народных

У Шклове і вёсках раёна нямала калектываў мастацкай самадзейнасці. Адны з іх увабралі ў сябе не адно пакаленне самародкаў народнай творчасці, другія выступаюць на клубных сцэнах лічаныя гады. Есць і калектывы, якім прысуджана ганаровае званне «народны». Пра іх і пойдзе гаворка.

Гарадскі ансамбль народных інструментаў створаны ў 1969 г. Нязменным яго кіраўніком з'яўляецца дырэктар Шклоўскай дзіцячай музычнай школы, заслужаны работнік культуры Беларускай ССР Віталь Аляксеевіч Бабчанка. Ансамбль аб'ядноўвае 20 чалавек, усе яны па прафесіі музыканты. У яго рэпертуары творы беларускіх кампазітараў і кампазітараў блізкага і далёкага замежжа. Галоўны напрамак работы самадзейнага калектыву — інтарэс да народнай музыкі, усебаковае развіццё індывідуальных здольнасцей кожнага яго ўдзельніка. Ансамбль прымаў актыўны ўдзел у розных мерапрыемствах раёна, абласных аглядах, конкурсах, рэспубліканскіх фестывалях. Яго ўдзельнікі і кіраўнік неаднаразова ўзнагароджваліся граматамі Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь, управлення культуры аблвыканкома, раённых арганізацый. Ганаровае званне «народны» ансамблю прысвоена ў 1980 г. за высокі ідэйна-мастацкі ўзровень рэпертуару і выканаўчае майстэрства.

Хор калгаса «Маяк» створаны на базе калектыву мастацкай самадзейнасці Уланаўскага СДК у 1976 г. У яго саставе было 30 удзельнікаў — гэта калгаснікі, настаўнікі, спецыялісты сельскай гаспадаркі. Ініцыятарамі стварэння калектыву выступілі былы старшыня калгаса Мікалай Сямёнавіч Врагаў і педагог Шклоўскай дзіцячай музычнай школы Ірына Васільеўна Гаеўская. Росквіту напулярнасці хору актыўна садзейнічаў і яго акампаніятар Барыс Восіпавіч Цымбарэвіч. Калектыў паспяхова, па-майстэрску выконваў песні беларускіх і рускіх кампазітараў, беларускія народныя песні, творы іншых народаў. Хор у жніўні 1980 г. удастоены звання «народны». На вялікі жаль, у цяперашні час хор у поўным саставе не выступае. З яго ўдзельнікаў створаны добры вакальны калектыў. Мастацкі кіраўнік Уланаўскага СДК Сяргей Мікалаевіч Врагаў узначаліў яго. У вакальным ансамблі захаваліся традыцыі народнага хору. У 1994 г. на раённым аглядзе-конкурсе ваенна-патрыятычнай песні, прысвечаным 50-годдзю вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, ён заняў першае месца сярод вакальных калектываў раёна.

Мастацка-канцэртная брыгада «Шклаўчанка» створана ў 1979 г. па ініцыятыве і пад кіраўніцтвам Галіны Іванаўны Прохаравай — дырэктара РДК. У саставе калектыву 15 удзельнікаў: педагогі, работнікі культуры, прамысловых прадпрыемстваў, вучні старэйшых класаў школ горада. Галоўную ўвагу самадзейныя артысты надаюць выступленням не толькі ў клубах, але і на фермах, палявых станах. Праграмы выступленняў «Шклаўчанкі» складзены на мясцовым матэрыяле: «Экалогія — зона трывогі», «Подзвігу салдата пакланіцеся», «З крыніц жыватворных» і інш. Удзельнікі брыгады прымаюць актыўны ўдзел у мерапрыемствах раёна і РДК: канцэртах мастацкай самадзейнасці, тэатралізаваных прадстаўленнях, шоу-праграмах, тэматычных масавых мерапрыемствах. Цяпер кіраўніком мастацка-канцэртнай брыгады з'яўляецца метадыст РДК Таццяна Іванаўна Давідовіч. Ганаровае званне «народны» калектыў атрымаў у лютым 1988 г.

Духавы аркестр РДК быў створаны ў 1987 г. У яго саставе 16 самадзейных артыстаў. Гэта музыканты-аматары. Аб'ядноўвае іх любоў да музыкі, хаця працуюць яны на розных прадпрыемствах горада. Гэта — рабочыя, інжынерна-тэхнічныя работнікі, служачыя. Калектыў заўсёды ў пошуку новага рэпертуара, самаўдасканальвання свайго выканаўчага майстэрства. Кіруе аркестрам з часу яго стварэння педагог па адукацыі, чалавек, улюблёны ў сваю прафесію — Уладзімір Сцяпанавіч Андрэенка. Калектыў прымае ўдзел ва ўсіх мерапрыемствах як у горадзе, так і на сяле, у абласных і рэспубліканскіх святах. З'яўляецца дыпламантам абласнога агляду духавых аркестраў. У жніўні 1993 г. самабытнаму калектыву прысвоена званне «народны».

Л. Сатнічэнка

На мудрыя слоўцы здатны і шклоўцы

Прыказкі, прымаўкі, запісаныя на Шклоўшчыне

- Бабы каюцца, а дзеўкі замуж збіраюцца (г. Шклоў).
- Бывае, і карова лапці абувае (в. Рыжкавічы).
- Барада вяліка, а розуму ні на лыка (в. Забродзе).
- Беднасць не грэх, але да граха даводзіць (в. Старасселле).
- Галава, што чан, а розуму ні на капусны качан (в. Ржаўцы).
- Дурань вучыцца на сваіх памылках, а разумны — на чужых (в. Старасселле).
- Завёў новага сябра — набыў і яго ворага (в. Старасселле).
- Заварыў кашу — не шкадуй і масла (г. Шклоў).

Запас бяды не чыніць і хлеба не просіць (г. Шклоў).

І чорта не баіцца, і Бога не стыдзіцца (в. Забродзе).

Каля воўнага гумна і свіння разумна (в. Хоцімка).

Колас без зярняткі, што жанчына без дзіцяткі (г. Шклоў, аўтар).

Каму агрэх, а каму жыта мех (г. Шклоў).

Лежачы на печы толькі грэеш плечы (г. Шклоў, аўтар).

Летам кожны кусцік начаваць пусціць (г. Шклоў).

Май — хоць на печ уцякай (г. Шклоў).

Не кажы пра сябе пагана — гэта зробяць твае знаёмыя (в. Старасёлле).

Папрацуеш да поту — з'ясі ў ахвоту (г. Шклоў).

Піў-піў, пакуль сто хвароб нажыў (г. Шклоў).

Поле словам не засееш (в. Фашчаўка).

Пустое слова, як салома, — больш месцам, ды мала вагой (в. Славені).

Хлеб-соль еш, а праўду рэж (г. Шклоў).

Сабраў *Л. Анціпенка*

Перыфразы

Валодаючы гаспадарскім позіркам, прыхапіў з сабой не толькі сякеру, знойдзеную пад лаўкай, а і лаўку.

Будзеш мець сто рублёў — сябры самі знойдуцца.

Мары

Загадчыка фермы: здаць слана на мясакамбінат у канцы года.

Бюракрата: дацягнуць да пенсіі.

Агародніка-шклаўчаніна: выйсці на замежны рынак з гуркамі.

Старшыні калгаса: здаць сваю пасаду ў арэнду.

В. Байдакоў

Гумарыстычныя выслоўі

Нішто так не скарачае жыццё, як доўгі язык.

Нішто не каштуе так танна і не абыходзіцца так дорага, як доўг.

Не варта крыўдаваць на праўду — лепш за ўсё адказаць тым жа.

Схаваць глупства таксама нялёгка, як і паказаць свой розум.

Час — грошы. Вось чаму яго так вечна не хапае.

Думка пакінула яго галаву, не вытрымаўшы адзінства.

Скажы мне, хто твой вораг, і я скажу, ці засталіся ў цябе сябры.

Выйшаўшы ў людзі, не забудзь, што ты быў чалавекам.

Аўтамабіль — не раскоша, а сродак самавыражэння.

Беражыце маладых жанчын — гэта будучыя цешчы.

В. Логінаў

«Ударны фронт». 1988. 10 красавіка.

Гумар па-шклоўску

Парады: каб не спатыкнуцца, не абанязкова глядзець пад ногі, дастаткова не азірацца па баках; калі рыба не клюе, не варта пляваць на чарвяка, лепш плюнуць на рыбалку, зматаўшы вудачкі.

Прыкметы склерозу: стары забыўся папрасіць у залатой рыбкі другую старую; Ямеля забыўся папрасіць у шчупака розуму; бюракрат забыўся, што час цяпер не той.

Кожнаму сваё: Бразілія — краіна кофе, Кітай — краіна рысу, Шклоў — сталіца агуркоў.

В. Байдакоў

«Ударны фронт». 1988. 10 верасня.

Павучальныя дыялогі

— Парай, што рабіць? Узяў доўг, а аддаваць няма чым.

— Заварыў кашу — сам і расхлёбвай.

— Шмат надойваеце малака?

— Дзе быць таму малаку, калі колам па баку.

— Ну, як? Спадабаўся малады?

— Абы былі грошы, дык будзе і харошы.

— Ці задаволіў на гэты раз начальнік просьбу?

— Абяцанка-цацанка, дурню радасць.

— Ну, як? Сын разумней бацькі? Вучыцца добра?

— Ад яблыні — яблыка, ад ёлкі — шышка.

— Закахаліся мы з сябрам у адну дзяўчыну. Што рабіць?

— Адно яйцо на два сняданкі не разделіш.

— Ну і дурань, пасварыўся і на вочы не паказваецца.

— Баба з калёс — каню лягчэй.

— Дзіва і толькі — другі раз «Масквіча» выйграў!

— Багатаму і сава носіць.

— Мужык п'е, і жонка пачала прыкладвацца да чаркі.

— Балота без чорта не бывае.

— Бядуе мой сусед, што памыліўся ажаніцца.

— Вочкі бачылі, што выбіралі, то няхай цяпер не плачуць.

— Так і глядзіць, каб сваю работу спіхнуць на мяне.

— Белыя ручкі чужую работу любяць.

— Вось уліп дык уліп. Паскардзіўся старшыні на Сямёна, а ён яму з радні, ніякіх мер не прыняў, нават і ў вус не дзьме.

— Варона вароне вочы не дзяўбе.

— Не разумею суседзяў: то чубяцца, то мілуюцца, што вадой не разальеш.

— Добрая сварка — у хаце папраўка.

— Ну і людзі! Адсеяліся і бароны ў полі пакідалі.

— Дорага лыжка перад абедам.

— Папрасіў жа, каб нікому не расказвала, а яна разнесла на ўсю вёску, як сарока.

— Еш боршч з грыбамі і трымай язык за зубамі.

— Грозіўся, што пагоніць Пятра з работы мятлою, а ён і сёння працуе, ды муціць ваду.

— З вялікага грому малы дождж бывае.

Л. Анціпенка

Стогадовы юбілей школы

Не пазнаць было Фашчаўскую сярэднюю школу Шклоўскага р-на чацвёртага кастрычніка 1997 г. Усюды кветкі, упрыгожанні, выставы. А людзей розных узростаў сабралася столькі, што і ў прасторным, нядаўна пабудаваным будынку школы было цесна. Былі тут хлеб-соль ганаровым гасцям і ўрачысты ўздым сцяга школы, былі віншаванні і падарункі ад намесніка старшыні Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага схода Рэспублікі Беларусь У. М. Канаплёва, старшынь раённага Савета М. Р. Яроміча, райвыканкома Г. М. Лаўранкова, дырэктара мясцовага саўгаса «Спартак» У. В. Громава, былых выпускнікоў школы: Я. П. Мікалуцкага — старшыні Камітэта дзяржкантролю Магілёўскай вобласці, дэпутата Нацыянальнага схода РБ (трагічна загінуў ад рукі забойцы 6.10.97 г. — *Рэд.*), У. І. Макейчыка — міністра турызму і спорту РБ, Э. А. Сенакосава — прафесара, А. І. Рэянтовіча — ветэрана Айчыннай вайны і педагагічнай працы, Г. С. Рэянтовіч — заслужанай настаўніцы БССР, А. В. Мікалуцкага — старшыні калгаса з Гомельшчыны, Э. А. Сякацкага — дырэктара Магілёўскага прадпрыемства «Аўтасервіс», А. А. Крупенькі — галоўнага інжынера аб'яднання «Агракамплект», А. А. Рэўтавай — настаўніцы Акунёўскай школы, Г. Л. Напрэева — перадваеннага сакратара камсамольскай арганізацыі школы, кандыдата гістарычных навук.

Цікавым і змястоўным быў даклад дырэктара школы Г. І. Пармона. Ён аддаў школе больш трыццаці гадоў і добра ведае яе гісторыю. А пачыналася яна ў 1897 г. з адкрыцця народнага вучылішча. У прыстасаваным памяшканні, за самаробнымі сталамі сталі вучыць грамаце і закону божаму 35 хлопчыкаў і адну дзяўчынку. Захаваліся імёны першых настаўнікаў. Імі былі Мяфодзій Васілевіч і святар Анатолій Багдановіч.

Прайшло нямала часу і ў 1933 г. былая народная, затым пачатковая школа стала няпоўнай сярэдняй школай, праз два гады — сярэдняй. Да Айчыннай вайны адбыліся тры выпускі СШ і 42 — пасляваенныя. Атэстат сталасці атрымалі 2091 вучань, 74 — яшчэ і медалі.

Розныя лёсы склаліся ў выпускнікоў школы. Адны пайшлі ў навуку, другія сталі заслужанымі дзеячамі культуры, адукацыі, трэція — добрымі настаўнікамі, працаўнікамі народнай гаспадаркі (у кнізе названы многія з іх. — *Рэд.*). З 57 даваенных выпускнікоў 14 загінулі на франтах і ў партызанах. Мінутай маўчання ўшанавалі прысутныя тых, хто вучыўся ў школе і каго ўжо няма сярод нас.

Юбілей школы супаў з пярэдаднем прафесійнага свята педагогаў — Днём настаўніка. Таму ўсе яны, вясковыя педагогі, былі спаўна адораны добрымі пажаданнямі. Прыемна было пачуць са слоў дырэктара, што больш адной трэці вучняў школы займаюцца на «4» і «5», што юбілей сустрэлі без другагоднікаў. Вядома, перад школай, яе калектывам ёсць нямала цяжкасцей, праблем, якія трэба вырашаць. Аб іх, у гэты святочны дзень, не вельмі хацелася гаварыць. А вось ад цудоўнага канцэрта, у якім прынялі ўдзел народны артыст РБ В. Раінчык, артысты ансамбля казакоў, майстры эстрады Беларусі і Расіі, надоўга застанецца добры ўспамін.

Н. Буйніцкая, Г. Напрэеў

Жыве бібліятэка...

Каб зрабіць поўны агляд усяго, чым жыве раённая бібліятэка і яе сельскія філіялы, дня не хопіць. Пераступіўшы парог культустановы, наведвальнік трапляе ў цудоўны храм духоўнасці, за што самыя шчырыя пачуцці ўдзячнасці заслугоўвае калектыў бібліятэкараў пад кіраўніцтвам Валянціны Шалкавой... Пад дэвізам «Пошукі, шляхі абнаўлення» бібліятэкары раёна скіроўваюць свае намаганні, каб актывізаваць прапаганду кнігі і роднай мовы. Для гэтага арганізавалі бібліятэкі перасоўкі і пункты выдачы літаратуры па месцу жыхарства вяскоўцаў. Праводзяцца літаратурныя вечары і агляды навінак літаратуры. Сярод іх «Час і лёсы», «Радок, абарваны куляй» (пра пісьменнікаў, якія не вярнуліся з вайны), «Гадзіны цікавых наведамленняў — стоп-факт» (як стаць цікавым субяседнікам). Такія мерапрыемствы наладжваліся ў Нова-Брашчынскай, Каменна-Лаўскай, Славенскай і іншых бібліятэках.

У раённай бібліятэцы не толькі кнігі, але і мноства іншых сродкаў выкарыстоўваюць у мэтах узбагачэння духоўнасці чалавека. Пацвярджэнне таму «Урокі дабрыні», «Урокі па выхаванні цудоўнага», «Кветкі і фантазія», «Ветлівасць на кожны дзень», «Высокае слова — Міласэрнасць», якія праводзіліся ў Заровецкай, Нова-Брашчынскай, Фашчаўскай бібліятэках. Славенскія кнігалюбы арганізавалі дыспут «Погляд збоку на сябе». Атрымалася цікавая размова пра нашу годнасць, неабходнасць больш увагі ўдзяляць развіццю культуры. Гэтай жа мэце служаць і кніжныя выставы «Біблія — кніга жыцця», «Падлетак і закон», «Чырвоная кніга прыроды», «Здаровы лад жыцця — здаровыя звычкі». Яны наладжаны ў раённай, Высоцкай, Заходскай, Любініцкай бібліятэках.

Асаблівае месца адведзена прапагандзе беларускай літаратуры. У гонар 110-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа былі афармлены адкрытыя кніжныя паліцы «Я. Купала — нашa будучыня», «Песняры народных дум» і інш. Наладжана пастаянна дзеючая кніжная выстаўка па тэмах «Галасы Прыдняпроўя», «Паэты — нашы землякі», «Нашы сучаснікі — паэты». Напэўна, доўга будуць памятаць у Ордаці праведзены вечар у бібліятэцы, прысвечаны жыццю і літаратурнай дзейнасці паэта-земляка Анатоля Сербантовіча. Пра яго гаварылі тыя вяскоўцы, хто ведаў паэта.

Цікава прайшлі літаратурна-музычныя вечары «Дала мне маці гэту мову як спадчыну і запавет». Бібліятэкары прапагандуюць беларускі фальклор, этнаграфію. Першыя крокі зроблены ў адраджэнні народных традыцый у святкаванні памятных дат: «Гуканне вясны», «Купалле», «Каляды». Асабліва весела гэтыя святы прайшлі ў Гарадзішчы, Стараселлі, Слабодцы, Заходах. А ў Акунёўцы арганізавалі тэатралізаваныя вячоркі, у якіх удзельнічалі людзі розных узростаў. Гучалі беларускія народныя песні, выконваліся танцы. Людзі ўспаміналі мінулае.

У сельскіх бібліятэках энтузіясты-кнігалюбы дапамаглі аформіць кніжныя палічкі «Святы і абрады — у наш быт», «Святы беларускага народа», «Беларуская культура ўчора і сёння».

Належную ўвагу бібліятэкары ўдзяляюць духоўнай загартоўцы школьнікаў. Праз кнігі, разнастайныя мерапрыемствы выхоўваюць у дзяцей рысы цудоўнага. Колькі радасці прыносіць школьнікам лялечны тэатр у дзіцячай бібліятэцы.

Шмат цікавага ў дзейнасці клубаў і аб'яднанняў па інтарэсах. Так, у раённай бібліятэцы функцыяніруе клуб «Фларыянт». Кіруе ім Ірына Селядцова. На занятках клуба адбываюцца карысныя дыспуты пра культуру, мастацтва, паэзію, па розных накірунках літаратуры.

У раённай бібліятэцы добрая скарбонка пласцінак, фанаграм. Прыемна зайсці ў залу, дзе размешчаны абаненты. Багацце літаратуры, тэлевізар, кветкі, мяккая мэбля — усё стварае чытачу добры настрой. Кнігалюбы затрымліваюцца каля кніжнай выставы «Нам засталася спадчына», дзе сабраны легенды і паданні, песні розных часоў. Выстава «Затрымай свой выбар на гэтых кнігах» знаёміць з навінкамі літаратуры абанента.

...Цёплае слова за творчую дзейнасць заслужылі бібліятэкары Ірына Селядцова, Ірына Гурская, Ларыса Ісакава, Валянціна Ляўковіч, Ніна Кірпічэнка і многія іншыя. Раённая бібліятэка сёння — сапраўдны цэнтр культуры.

С. Жукоўская

«Ударны фронт». 1995. 11 кастрычніка.

Вынікі грамадскага агляду

За дасягнутыя поспехі ў арганізацыі абслугоўвання насельніцтва, выкананне ўмоў агляду па выніках работы ў 1960 г. раённай бібліятэцы Міністэрствам культуры БССР прысвоена ганаровае званне «Лепшая бібліятэка рэспублікі». Загадчыца бібліятэкі А. К. Давідовіч адзначана значком «За выдатную работу». Работніцы бібліятэкі Ніна Лужанкова, Валянціна Палякова, Вера Бандаркова ўзнагароджаны Ганаровымі граматамі абласнога ўпраўлення культуры і абкома прафсаюза работнікаў культуры. Бібліятэкар раённай дзіцячай бібліятэкі Марыя Гарусава адзначана Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры.

Званне «Лепшая бібліятэка вобласці» з уручэннем дыплома прысвоена Каменна-Лаўскай, Высоцкай, Старасельскай бібліятэкам і клубнай бібліятэцы Гарадзішчанскага сельскага клуба. Загадчыца Каменна-Лаўскай бібліятэкі Ванда Рыдзеўская ўзнагароджана значком «За выдатную работу». Ганаровай граматай Міністэрства культуры БССР і БРК прафсаюза работнікаў культуры адзначана загадчыца Высоцкай сельскай бібліятэкі Зінаіда Тарасава.

А. Клімава

«Чырвоны барацьбіт». 1961. 11 мая.

У назвах вуліц — гісторыя

Вуліца, вясковая ці гарадская, таксама мае сваю гісторыю. Яна звычайна атрымлівае «прозвішча» па нейкіх прыкметах ці гістарычных падзеях. Праходзіць час, ён прыносіць новыя падзеі, якія ўплываюць і на назвы вуліц. У гэтым не цяжка пераканацца, калі прайсціся вуліцамі нашага горада.

Сетка вуліц Шклова ў асноўным прамавугольная. Яна канчаткова склалася ў канцы XVIII ст., калі была пабудавана ратуша. Вуліцы горада былі пракладзены строга па яе вуглах з поўдня на поўнач падоўжаныя і з захаду на ўсход — папярочныя.

На паўночным баку горада пры Аршанскай заставе (цяпер гэтае месца ў народзе называецца «Рагаткай») знаходзілася два камянёвыя слупы і вал ад возера на захадзе, да Дняпра — на ўсходзе. У народзе гэтае месца называлі «Брамай». Такая застава была зроблена спецыяльна для ўзяцця «правіянтавага» збору — пошліны за ўвозімы і вывозімы з горада тавар.

Падоўжаныя вуліцы Шклова да рэвалюцыі 1917 г. насілі назвы Мяшчанская, Сялянская, Прабойная, Ганчарная, Карпілаўка (апошняя пралягала да былога возера), Лазарэтная. Гэтыя назвы адлюстроўвалі сацыяльнае і матэрыяльнае становішча іх насельнікаў. Так, па Мяшчанскай і Сялянскай жылі багатыя мяшчане, гандляры, служачыя. Бедната будавалася на ўскраінах, як вуліца Карпілаўка.

Гарадское самаўпраўленне і валасны стараста зусім не праяўлялі клопату пра добраўпарадкаванне мястэчка. У ім уладарыла антысанітарыя. Па вуліцах вясной і восенню было цяжка праехаць і прайсці. На гандлёвай плошчы каля радоў было самае гразкае месца. На вуліцах не было тратуараў.

...Пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі ў ліпені 1918 г. на пасяджэнні мясцовага рэўкома паўстала пытанне аб аднаўленні разбуранай вайной народнай гаспадаркі і добраўпарадкаванні Шклова. У выніку былі заменены старыя назвы вуліц. Мяшчанская і Сялянская перайменаваны адпаведна ў 1-ю і 2-ю Савецкія, Прабойная атрымала назву Ленінская. Папярэчныя вуліцы ў 20-я гады былі названы — Луначарская, Карла Маркса, Урыцкага. Якія назвы яны насілі раней, не ўстаноўлена. Вуліцы Дняпроўская, Паштовая вядомы з часоў пабудовы ратушы. Пралетарская ў свой час называлася Маставой, бо была замошчана драўляным насцілам ад моста да Ленінскай вуліцы. Пра назву вуліцы Ганчарнай вядома, што на ёй прадавалі ў базарныя дні ганчарныя вырабы.

У канцы 20-х гадоў мястэчка расшырала свае граніцы. На паўночны захад ад «Рагаткі» побач з паркам узніклі два рабочыя пасёлкі, якія атрымалі і адпаведныя назвы — 1-ы рабочы пасёлак і 2-гі рабочы пасёлак.

У пачатку 30-х гадоў на поўнач ад Шклова размясцілася МТС, на паўночны ўсход ад парка пабудаваны льнозавод. Побач з карпусамі гэтых прадпрыемстваў раслі жылыя пабудовы, узнікалі новыя вуліцы. Ад «Рагаткі» да МТС пралегла Калгасная вуліца. Пазней вакол яе сфарміраваліся вуліцы Першамайская, 8 Сакавіка, Ільнозаводская, Садовая, Лугавая, Юбілейная, Камсамольская, 11 Ліпеня, Загарадная, Гагарына, Кастрычніцкая, Чыгуначная, Дзекабрыстаў, Прыгарадная, Пушкінская.

Шклаўчане свята берагуць памяць пра герояў Вялікага Кастрычніка, грамадзянскай і Вялікай Айчыннай войнаў. Так, вуліца Загарадная перайменавана ў вуліцу Бакуновіча — матроса з крэйсера «Аўрора». Мена

Шклоў, 1901 г.

віта на гэтай вуліцы ён доўга жыў. У памяць Героя Савецкага Саюза М. А. Карначонка вуліца Малое Падбор'е была названа яго імем. Выканком гарсавета прысвоіў 2-й Савецкай вуліцы імя С. М. Дзікуна, былога першага сакратара РК КПБ, Героя Сацыялістычнай Працы. Новую вуліцу назвалі імем Пятра Алейнікава, вядомага артыста, заслужанага артыста РСФСР.

Горад адлічвае гады, расце, расшыраецца, мяняе назвы вуліц па гістарычных патрэбах.

М. Ільюшэнка

«Ударны фронт». 1986. 23, 25 верасня.

Свята вуліц

Прайшло свята цэнтральнай вуліцы горада — 1-й Савецкай. З гэтай нагоды ў гарадскім скверы каля помніка загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны воінам і партызанам сабраліся сотні гараджан.

На ўпрыгожанай адкрытай эстрадзе выступаюць удзельнікі мастацкай самадзейнасці РДК. Вядучая — дырэктар Дома культуры Галіна Прохарава цёпла і сардэчна вітае прысутных са святам і дае слова заслужанаму настаўніку школы БССР, ветэрану вайны і працы М. Ф. Ільюшэнку. Краязнаўца падрабязна расказаў пра гісторыю старажытнага горада на Дняпры. Ён адзначыў, што гэтая назва вуліцы была дадзена пад час 5-годдзя Вялікага Кастрычніка. На ёй былі размешчаны райком партыі і райвыканком, культурна-асветныя ўстановы, раённая бальніца, гандлёвыя прадпрыемствы. У час нямецкай акупацыі ўсе пабудовы былі знішчаны агнём і зруйнаваны. За апошнія гады 1-я Савецкая стала самай прыгожай у горадзе. Тут узведзены шматпавярховыя жылыя дамы, памяшканні раённага вузла сувязі, школы-інтэрната, універмага, кінатэатра «Мір». На вуглу вуліц Пралетарская і 1-я Савецкая размешчана прафесійна-тэхнічнае вучылішча, дзе рыхтуюць кадры для прадпрыемстваў лёгкай прамысловасці і сельскай гаспадаркі.

З вялікай увагай прысутныя на святе слухалі выступленне ветэрана Вялікай Айчыннай вайны, былога лётчыка, падпалкоўніка ў адстаўцы, жыхара гэтай вуліцы С. М. Ганчарова. Пасля выступлення артыстаў вядучая расказала пра жыхароў вуліцы, якія абаранялі Радзіму, самаадданана працавалі ў розных галінах народнай гаспадаркі, асветы і аховы здароўя. Удзельнікі свята праявілі цікавасць да выстаўкі прыкладнога мастацтва і кветак, экспанаты якой зроблены і вырашчаны жыхарамі 1-й Савецкай.

«Ударны фронт». 1985. 22 жніўня.

Дом Саветаў

* * *

Калгасная вуліца — самая даўжэзная ў горадзе. На ёй размешчаны адзін з буйнейшых у Беларусі льнозавод, камбікормавы завод, райсельгастэхніка, райсельгасхімія, мэблевая фабрыка, МПМК-283, ільнонасенстанцыя, СШ № 4, спартыўны корпус, многія іншыя арганізацыі і ўстановы. У даўніну вуліца з'яўлялася часткаю кацярынінскага шляху, які пралягаў з Прыбалтыкі праз Полацк, Талачын, Шклоў, Магілёў і далей у Расію. Тады вуліца называлася Сялянскай. У канцы 20-х гадоў, у час калектывізацыі, яе перайменавалі ў Калгасную.

Днямі на вуліцы адбылося свята, на якое прыйшлі не толькі яе жыхары, але і прадстаўнікі многіх калектываў прадпрыемстваў, устаноў, арганізацый, ветэраны вайны і працы. Свята адбылося на плошчы каля райсельгастэхнікі. Старшыня выканкома гарадскога Савета А. М. Чупрынскі павіншаваў сабраўшыхся са святам, якое ў Шклове становіцца традыцыйным, расказаў пра гісторыю Калгаснай, перспектывы яе развіцця.

На святе прагучалі цёплыя словы ў адрас заслужаных людзей, якія жывуць на вуліцы. Гэта П. В. Тарасаў, які нязменна чвэрць стагоддзя ўзначальваў прафсаюзную арганізацыю райсельгастэхнікі, фрэзероўшчык Я. П. Пацехін, інжынер У. К. Юркевіч, газаэлектразваршчык М. Ф. Кавалёў, слесар М. Е. Рыбаключаў, шафёр А. В. Савельеў і многія іншыя.

Удзельнікам свята прысвяціў свае музычныя творы вакальна-інструментальны ансамбль клуба «Чырвоны Кастрычнік». Была наладжана выстаўка прыкладнога мастацтва народных умельцаў — жыхароў вуліцы.

«Ударны фронт». 1986. 9 жніўня.

Літаратурная карта Шклоўшчыны

АНЦІПЕНКА Лявон (Леанід Міхайлавіч), н. 25.01.1935 у в. Цінькаў Крычаўскага р-на ў сям'і рабочага-чыгуначніка і калгасніцы. Закончыў Бацвінаўскую СШ (1953), Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя А. М. Горкага — гісторыка-філалагічны факультэт, беларускае аддзяленне (1959). Потым тры гады працаваў дырэктарам Ракашыцкай школы Уздзенскага р-на. З 1963 — літаратурны супрацоўнік, загадчык сельгасаддзела шклоўскай раённай газеты «Ударны фронт». З 1965 працуе намесні-

Л. М. Анціпенка

Н. В. Галіноўская

кам рэдактара, з 1975 — рэдактарам гэтай жа газеты, з 1995 — на пенсіі. Жыве ў Шклове. Член СЖ РБ.

Першыя свае байкі надрукаваў у чэрыкаўскай раённай газеце (20 мая 1954 «Мядзведзь і самакрытыка»). Потым яго байкі, сатырычныя і лірычныя вершы, пародыі, апаняданні друкаваліся ў газетах «Магілёўская праўда», «Звязда», «ЛіМ», «Чырвоная змена», у часопісах «Вожык», «Полымя», «Беларусь» і іншых перыядычных выданнях. Сааўтар калектыўных зборнікаў «Вожык» у дарозе» (1966), «Беларуская байка» (1986), «Асцюкі за каўняром» (1989), «Ранішняя дарога» (1990) і інш. Выдаў зборнік вершаў, эпіграм і пародый «За лугамі, за ракою» (1994).

Мядзведзь і самакрытыка

(Байка)

У гушчары
Сабраліся звяры.
Як наступіла цішыня на зборы,
Мядзведзь сказаў: — Сябры мае,
Зайцы мне скардзіліся ўчора —
Ім Воўк праходу не дае,
Ён крыўдзіць іх на кожным кроку,
Няма спаконо ім — бяда!
Я так мяркую: зараз Воўку
Дадзім мы слова, грамада,
Няхай сябе пакрытыкуе наймацней,
Каб самакрытыка яго прабрала да
касцей.
...І ў гушчары
Аж да зары
Ваўчуга кляўся,
Зайцоў не крыўдзіць даў зарок.
Назаўтра ж зноў сваім заняўся —
Ваўком застаўся Воўк.

Кіраўнікоў я ведаю такіх,
Што не прымаюць мер крутых
Да тых,
Што у грахах клянуцца,
А выпраўляць іх — не імкнуцца.

ГАЛІНОЎСКАЯ Ніна Васільеўна, н. 18.12.1935 у в. Вялікія Лазіцы ў сялянскай сям'і. У 1955 закончыла Магілёўскае дашкольнае вучылішча. Працавала выхавальніцай дзіцячага садка торфапрадпрыемства «Калпеніца» Брэсцкай вобл., дзіцячага дома ў м. Лунна Гродзенскай вобл. (1955—1958), карэктарам газеты «Мінская праўда» (1962—1963), карэктарам друкарні выдавецтва «Звязда», затым — выдавецтва ЦК КПБ (1963—1967). У 1967—1968 — рэдактар мастацкіх фільмаў газеты «Кінонедзеля Минска». Член СП РБ.

Першы верш апублікавала ў 1958 (скідзельская раённая газета «Красное знамя»). Аўтар кніжак вершаў пра дзяцей «Давайце пазнаёмімся» (1962), «Лясная зарадка» (1965), «Размова сняжынак» (1968), «Сяргей чыкаў параход» (1972), «Кніжчыны сябры» (1975), «Мой дзень» (1977) і інш.

Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. С. 117—118.

Лета

У сукенцы каляровай,
У хусцінцы васільковай
Ходзіць лета па палях,
Па расквечаных лугах.
Звоніць песняй жаўруковай,
Кожны дзень званчэйшай, новай.
Дбайна сонечнае лета
Спеліць ягады для дзетак.
Любіць з імі забаўляцца,
Загараць, спяваць, купацца.
Дораць дзеці лету ўсмешкі,
Гульні, песні і пацешкі.
А расчуленае лета
Дорыць ім букеты кветак.

Незвычайны карагод. Мн., 1986. С. 11.

ЖЫГОЦКІ Мікола Рыгоравіч, н. 4.11.1931 у в. Мерч. Вучыўся ў мясцовай пачатковай школе, Вяліка-Лазіцкай сямігодцы, Магілёўскім машынабудаўнічым тэхнікуме. Пасля вайсковай службы, дзе супрацоўнічаў у рэдакцыях газет «Гвардеец» і «Сын Родины», закончыў аддзяленне журналістыкі філфака Белдзяржуніверсітэта (1959). Працаваў літсупрацоўнікам у рэдакцыях газет «Звязда», «Чырвоная змена», а з 1957 — навуковы супрацоўнік Літаратурнага музея Якуба Коласа. Складальнік зборніка артыкулаў «Народны настаўнік Якуб Колас» (1966), аўтар кніг: «Сцежкамі паэта» (1990), «Легендарны дзед» і «Сэрца пакідаю вам» (1993), «У цяжкі час вайны суровай» (1994), «Побач з Коласам» (1986), сааўтар кнігі «Аляксандр Лукашэнка — Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь» (1997).

М. Р. Жыгоцкі

Песня

...Я ў роднай вёсцы. Спаць буду пад паветкай, у свежым духмяным сене, якое пахне чэрвеньскімі росамі. Так я спаў у дзяцінстве ўлетку, калі жыў з бацькамі. Сам я вясковы, таму і душа ў мяне вясковая — такая, што ад паху кропу і палыну заходзіцца. Хвёдар Раманкевіч — добры мой знаёмы, ведае гэта і лічыць за свайго. З ахвотай расказвае аб калгасных справах. Яму — пенсіянеру — патрэбна выгаварыцца, устурбаваць мяне сваімі сялянскімі справамі.

Хвёдар Раманкевіч доўгі час быў брыгадзірам, стварыў дружны зладжаны калектыў. Іншы раз не дасыпаў, не даядаў, стараўся не дзеля сваёй асабістай справы, а дзеля людзей, дзеля агульнага дабрабыту.

Крыху памаўчаўшы, ён запытаўся:

— Памятаеце, як некалі зерне на таку прэла? Сунеш руку ў жыта — пячэ. Дух салодкі такі. А ўздыхнеш — і горка на душы становіцца...

Я ўспамінаю. Косы цёплы дождж. На адкрытым таку — абмалочанае жыта, а зверху яго паліває лівень. Зерне чарнее ад перагрэву. У сельгасарцелі не было клецяў для збожжа. Не было кароўнікаў, птушатнікаў і іншых будынкаў.

— Цяпер у вас лепш, — спрабую змякчыць думкі Раманкевіча.

— Так яно і павінна быць, колькі ж можна было таптацца на месцы. За пасляваенныя гады пабудаваны новыя жывёлагадоўчыя памяшканні, млын, піларама. Прыведзены да ладу многія дамы аднавяскоўцаў, асабліва ў суседняй вёсцы Лазіцы. У хатах тэлевізары, электрычнае святло, радыё. Дзеці вяскоўцаў вучацца ў сярэдняй школе, якая была створана на базе сямігодкі. У калгасе шмат тэхнікі, усё робяць машыны, не так як некалі ўручную.

Адно бяда, на дарогі ў калгасе не звяртаецца ўвага, асабліва ў Мерчы, вясной ні праехаць ні прайсці, хоць бы ў вёсцы мост паправілі.

...Шмат гадоў назад у гэтых мясцінах былі балоты, што параслі мохам у таўшчыню некалькіх сажняў. Імхі (беларуская німярэча), ці мярэча, паступова зарасталі бярэзнікам, на якіх з'яўляліся рэдкія пасяленні. Тут і выраслі першыя сялянскія хаты, потым вёска, якую па-мясцоваму назвалі «Мерча». Яна ўтульна размясцілася ўздоўж рэчкі «Бялуга». З сяла, у якім налічвалася звыш 100 сялянскіх хат, выйшлі і сталі вядомымі людзьмі: начальнікам будаўнічага ўпраўлення, дэпутатам Мінскага гарадскога савета выбіраўся Якаў Андрэевіч Жыгоцкі, у танкавых часцях, у званні палкоўніка, служыў Піліп Мікалаевіч Палітыка, інжынерам-маёрам быў Раман Ігнатавіч Красякоў, намеснікам міністра фінансаў Украіны служыў Кірыла Якаўлевіч Кавалеўскі, у планава-фінансавай установе працаваў, а потым быў намеснікам старшыні камітэта па працы Васіль Іванавіч Кавалеўскі, які ў свае маладыя гады быў настаўнікам пачатковай школы ў гэтай вёсцы. На сцэнах тэатраў сталіцы, у палацах, клубах, па радыё і тэлебачанні нярэдка можна пачуць голас заслужанага артыста рэспублікі Івана Мікалаевіча Тамашэвіча і яго сястры Тамары. Прафесію інжынера-будаўніка набыў Віктар Рыгоравіч Жыгоцкі, які прымаў актыўны ўдзел у адбудове беларускай сталіцы — Мінска. Многія з жыхароў загінулі на франтах Вялікай Айчыннай вайны. На заходнім канцы вёскі знаходзяцца могілкі, дзе пахаваны аднавяскоўец-партызан Хвёдар Сцяпанавіч Жыгоцкі, ёсць брацкая магіла воінаў-франтавікоў, якія загінулі пры вызваленні гэтых мясцін ад гітлераўскіх акупантаў.

Пагутарылі... Мяне чакае сена пад паветкай, а Хвёдара — рыпучы тапчан у сенцах. І раптам чуем мы, як дзесьці сярод дамоў раздаўся пералівісты перабор: прадрыжаў у нерухомым паветры і абарваўся.

У наступную хвіліну мы ўжо ведаем: гэта вясковы гарманіст, калгасны каваль Арцём Рахметаў праверыў галасы сваёй двухрадкі. Мясцовыя жыхары называюць яго «майстар, залатыя рукі». За што б ні ўзяўся Арцём, з чым бы да яго не звярнуўся вясковец, усё зробіць, паслухаецца. Да гэтага ў яго прыроджаны талент.

— Паслухаем, — сказаў Хвёдар і сеў на прыступку ганка.

А гармонік ужо не іграў, а спяваў, здавалася, што ён выгадвае словы. І гэтыя «словы», такія простыя, зразумелыя, далёка разносіліся па сялу.

— Арцём моладзь склікае, — прагаварыў Раманкевіч. — Зараз збяруцца як матылі на агонь.

...Вось дзесьці ў канцы вуліцы мякка стукнулі весніцы, потым яшчэ і яшчэ. Дзяўчаты ў светлых сукенках спяшаліся туды, дзе граў гармонік. Тут як тут і хлопцы. Яны ішлі шумна, насярэдзіне

А. М. Жыгуноў

вуліцы. Калі ўсе сабраліся каля Арцёма і абкружылі гарманіста, гармонік змоўк. Па сялу пакаціўся рознагалосы смех і гаворка. Загаманілі дзяўчаты: «Цішэй! Цішэй! І ўсе пачулі дзіўны голас:

Мы, вясковыя дзяўчаты,
Тут працуем і жывём...
Ураджай заўжды багаты,
Без затрымкі убяром.

— Гэта Вольга Палітыка — лепшая даярка, — сказаў прыслухаўшыся Раманкевіч.

З хвіліну памаўчаў:

— Наш каваль добра працуе ў кузні, але і за гармонікам не хібіць. Не адно свята, не адно вяселле давялося яму сыграць на сваім вяку. І заўсёды яму людзі рады.

Вось гарманіст налёг на басы і нечакана завёў новую мелодыю. Гармонік уздыхаў, радаваўся, сумаваў і весяліўся. Але і сум і радасць былі аднолькава светлыя, аднолькава ўсім блізкія і зразумелыя.

Мы слухалі так, быццам самі спявалі гэту песню, самі жылі яе словамі і мелодыяй.

Дзявочы голас узляцеў, бы лёгкая птушка:

Маладая ды вясёлая прайду...

Гучала песня, гучала ўсё навокал. Сціхла песня — і замерла зямля. Дамы, дрэвы, цьмяныя стагі, далёкае нямое неба, здавалася, прыслухоўваліся, чагосьці чакалі яшчэ такога ж дзіўнага і непаўторнага. І я чакаў, і мне было мала гэтай песні.

Хвёдар Пятровіч памаўчаўшы ціха прамовіў:

— Песня душу ачышчае.

Песня! Колькі гадоў табе, песня? Хто не слухаў цябе, хто не спяваў? І ўсё роўна цябе не выслухалі, не выспявалі да канца. Для кожнага ты свая, своеасаблівая, па-свойму зразумелая і непаўторная. Ты цячэш з сэрца чалавека, ты гаворыш з сэрцамі людзей, і таму ў табе жыве сама душа народа.

Хвёдар Раманкевіч нячутна ўстаў і ціхенька пайшоў у сенцы.

Я застаўся на ганку. Астывала паветра, ноч набірала сілу. Цьмяна бялеў бярозавы гай.

Упала зорка, быццам хтосьці высек доўгую іскру. І там, дзе яна патухла, я ўбачыў паміж узгоркам палоску зары.

М. Жыгоцкі

ЖЫГУНОЎ Алесь (Аляксандр Міхайлавіч), н. 27.11.1954 у в. Тройца ў сялянскай сям'і. Закончыў Нова-Брашчынскую СШ (1970), працаваў загадчыкам клуба ў в. Баркі. Пасля заканчэння філалагічнага факультэта Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна (1976) — настаўнік беларускай і рускай мовы і літаратуры Чарневіцкай СШ Глыбоцкага р-на. З 1980 — карэспандэнт-арганізатар Глыбоцкага раённага радыё, з 1988 — загадчык аддзела радыёінфармацыі раённай газеты «Шлях перамогі». З 1989 працуе ў рэдакцыі раённай газеты «Веснік Глыбоччыны» (новая назва газеты). Жыве ў Глыбокім. Член СП РБ з 1982.

Першыя вершы надрукаваў у 1972 (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў вершаў «Матчына вышыванка» (1984), «Мая Тройца» (1993).

Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. С. 209.

Тройца

Блукаў мой продак,
Мусіў прыпыніцца,
Бо затаміўся
За паўдзён высокі.
У боскай Тройцы
Род мой караніцца,
Ратаяў род,
Музыкаў, хлебапёкаў.
У гэтай вёсцы
Я заўжды жаданы,
Хоць сябраў сын
Пацешна хмурыць броўкі.
Як птушкі,
Пасля доўгае радоўкі
Вяртаюся —
І гояцца ўсе раны.
Мне крышку акрыяць,
Крыляць даволі,
Надыхацца
Шчымлівым пахам мяты.
Дачуць душой,
Як на бацькоўскім полі
На голас мой
Праклюнуцца зярняты.

Мая Тройца. Мн., 1993.

КРУПЕНЬКА Яўген Міхайлавіч, н. 20.08.1936 у в. Саськаўка ў сялянскай сям'і. Пасля заканчэння Фашчаўскай СШ працаваў літсупрацоўнікам у рэдакцыі шклоўскай раённай газеты «Чырвоны барацьбіт» (1954—1955). Служыў у Савецкай Арміі (1955—1958). З 1958 — літсупрацоўнік газеты «За вяртанне на Радзіму» (цяпер «Голас Радзімы»), з 1959 — часопіса «Блакнот агітатара», з 1961 — загадчык аддзела часопіса «Бярозка». У 1970 закончыў Літаратурны інстытут імя М. Горкага ў Маскве. Пасля заканчэння інстытута — супрацоўнік газеты «Чырвоная змена». Член СП РБ з 1980. Памёр 4.02.1990.

Першыя вершы ў рэспубліканскім друку апублікаваў у 1956 (газета «Чырвоная змена»). Аўтар зборнікаў вершаў «Салаўі» (1969), «Нядзеля» (1972), «Буслины човен» (1975), «Слон пад мікраскопам» (1978), «Стрэчанне» (1981), «Юбілейныя бліны» (1984), «Карэнні» (1986) і шэрага іншых. Перакладаў на беларускую мову творы рускіх і грузінскіх паэтаў. Выступаў з літаратурна-крытычнымі артыкуламі і рэцэнзіямі.

Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. С. 303.

Шклоўшчына

(Урыўкі з паэмы)

Я вас прашу:
На Шклоўшчыну праедзьце,
Да нас хоць на хвілінку завітайце.
На выбар у любую хату
Заходзьце і не бойцеся сабак.
Іх не трымаюць землякі і нават
Дзвярэй не замыкаюць за сабой.
Вам будуць рады. І заўжды з дарогі
Вам твар сцюдзёнай асвяжаць вадой,
Засцелюць стол абрусам самым чыстым.
Вам на пачэсным покуце сядзець,
Да раніцы бяседзе быць сяброўскай.
Гасцінныя заўсёды землякі.
У іх сумленне, як крышталь, спрадвеку,
Як назва роднай Шклоўшчыны маёй...
Вы толькі
Хоць назвы вёсак шклоўскіх пачытайце:
Тут пяць Дубровак і сяло Дуброва,
Бо меднаствольныя гаі звіняць.
Барок — і малады лясок шуміць.
Дубкі — дубовы гай стаіць тут старажылам,
Сасноўка — сосны ля дзвярэй і вокнаў,
А Вішанька — у вішнях расцвіла.
Бель — па суседству ў яблыневым цвеце,
Якое харство, які цудоўны пах!
Не толькі ў Белі, нат у Ганчарах,
Дзе круг ганчарны круціцца ад ранку.

Я. М. Крупенька

А. С. Сербантовіч

Наведайце Заходы — дзе сонца не заходзіць.
Вось ціхі Прудок — толькі людзі не ціхія.
У Дабрэйцы — як заўсёды — сэрцы добрыя.
У Лакуцях —
як усюды —
адчувае локаць сусед суседа.
У Славенях — коні слаўныя,
У Дзіўнаве — песні дзіўныя...
У людзей — цудоўныя імёны:
Алеся — нарадзілася ў лесе,
Поля — пшаніцу жне ў полі,
Алёна — лён поле,
Галінка — у садзе галінка,
Маланка — вочы-маланкі,
Ганка — гасцей сустракае на ганку,
Вера — у чалавека вера,
Надзея — у хлопцаў надзея...

Карэнні. Мн., 1986. С. 222—224.

ЛАЗУРКІН Рыгор Андрэевіч, ураджэнец в. Башкіраўка.

У свой час ён дэбютаваў на старонках раённай газеты ў жанры сатырычных замалёвак, мініяцюр. Змясціў некалькі твораў у калектыўнай кнізе сатыры «Ад варот — паварот». З'яўляецца адным з аўтараў калектыўнага зборніка «Тысяча и одна ночь» (М., 1979). Выйшла ў свет яго першая кніга сатырычных апавяданняў, гумарэскаў, мініяцюр пад назвай «Тайная вячэра».

ПАНКОВА (Папкова) Марыя, нарадзілася ў в. Падкняжанне. Пасля заканчэння БДУ працавала ў райгазеце ў Жыткавічах, потым бібліятэкарам у Слаўгарадскім р-не. Першая салідная публікацыя — падборка вершаў у часопісе «Маладосць».

СЕРБАНТОВІЧ Анатоль Станіслававіч, н. 13.05.1941 у в. Ордаць у сям'і настаўніка. У 1960 экстэрнам здаў экзамены за 10 класаў у Роска-Сялецкай СШ Аршанскага р-на і паступіў на аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя

У. М. Шыцік

У. І. Леніна. Адначасова з вучобай (з 1963) і пасля заканчэння універсітэта (1965) быў літсупрацоўнікам часопіса «Бярозка», з 1969 — газеты «Піянер Беларусі». Член СП РБ з 1967.

Памёр 21.03.1967.

Першыя вершы надрукаваў у 1959 (газета «Магілёўская праўда»). Выйшлі зборнікі паэзіі «Азбука» (1966), «Міннае поле» (1968), «Жаваранак у зеніце» (1989).

Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. С. 492.

• • •

Спачатку аб прозвішчы. Прозвішча наша
Мой прадзед калісьці ў застоллі прыдбаў,
Калі ён са смакам сярбаў сыраквашу,
Капусту гарачую гучна сярбаў.

І пэўна, і мела, і мае значэнне
Тое,
што каб на калені не ўпаў,
Май нарадзіў, а хрысціў мяне чэрвень
І ў свінцовай купелі купаў.

Там, дзе я вырас, — сасна пры сасонцы,
Як дзеці, спавіты ў пялёнкі лугоў.
І чырвань сцягоў уліваецца ў сонца,
А сонца сцякае у чырвань сцягоў.

Я ўзяў у ячменю характар яршысты.
Даў мне задуменнасць задумлівы бор,
А барвы сцягоў — уяўленне аб чыстым,
Год сорак першы — нянавісць і боль!

Жаваранак у зеніце. Мн., 1989. С. 170.

ШАЎЦОЎ Іван Міхайлавіч — вядомы рускі пісьменнік. Нарадзіўся ў 1920 г. у в. Мікіцінічы. Яго бацька — селянін — рана памёр. Будучы пісьменнік закончыў сямігадовую школу, працаваў загадчыкам аддзела Шклоўскай раённай газеты «Прамень камунізму», неўзабаве паступае ў Аршанскі педагагічны тэхнікум. Вучобу спалучае з работай у аршанскай газеце «Ленінскі прызыў» няштатным карэспандэнтам. Пасля тэхнікума паступае ў ваеннае вучылішча пагранічных войск.

Вайна заспела Шаўцова на паўднёва-заходняй граніцы як начальніка пагранзаставы. Удзельнічаў у баях з гітлераўцамі, камандаваў разведгрупай і атрадам. Служыў у дэсантных войсках. Пасля раненняў і лячэння паступіў у Літаратурны інстытут імя М. Горкага і абраў жыццёвы шлях пісьменніка. Пісаць пачаў на ваенныя тэмы, бо добра ведаў жыццё салдат і афіцэраў усіх родаў войск: служыў у авіяцыі, плаваў на караблях і падводных лодках, ведаў службу пагранічнікаў і адвагу дэсантнікаў. Пасля працуе спецыяльным карэспандэнтам газет «Красная звезда» і «Советский флот», быў уласным карэспандэнтам газеты «Известия» ў Балгарыі. Працаваў намеснікам галоўнага рэдактара часопіса «Москва». Першым напісаў у «Известиях» пра абаронцаў Брэсцкай крэпасці.

У 1954 г. у выдавецтве «Молодая гвардия» выйшла кніга апавяданняў Івана Шаўцова «Юность Болгарии», а ў Тамбоўскім выдавецтве — кніга «Подвиг богатыря».

І. М. Шаўцоў вядомы таксама кнігамі «Свет не без добрых людей», «Орел смотрит на солнце», «На краю света», «Тля». Раман «Набат» завершаны ў 1995 г. Ён пра сучасны смутны час Расіі.

І. Маісееў

ШЫЦІК Уладзімір Мікалаевіч, н. 31.08.1922 у г. Шклове ў сям'і рабочага. Вучыўся ў Маскоўскім электратэхнічным інстытуце інжынераў чыгуначнага транспарту (1940—1943), у Куйбышаўскім індустрыяльным інстытуце. У снежні 1944 вярнуўся ў Шклоў і працаваў тэхнікам-канструктарам на папяровай фабрыцы «Спартак». У 1949 закончыў аддзяленне журналістыкі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. У 1949—1952 працаваў у рэдакцыі газеты «Сталинская молодежь», у 1953—1964 — у рэдакцыі газеты «Калгасная праўда» (у 1962—1990 — «Сельская газета»), у 1965—1966 — адказным сакратаром газеты «Літаратура і мастацтва», у 1978—1983 — карэспандэнтам «Сельской газеты». Член СП РБ з 1962.

Першае апавяданне апублікаваў у 1952 (газета «Сталинская молодежь»). У 1958 у часопісе «Полымя» надрукаваў аповесць «Назаўсёды». Аўтар аповесцяў «Сосны адшумелі сваё» (1960), «Апошняя арбіта» (1962), «Майская раніца» (1963), зборнікаў фантастычных апавяданняў і аповесцей «Зорны камень» (1967), «Парсекі за кармой» (1970), «У час не вярнуліся» (1975), «Маскі над абрывам» (1977), кніг фантастыкі і дэтэктываў «Другая версія» (1979), «Трансплутонавыя афелі» (1982) і інш.

Беларускія пісьменнікі. Мн., 1994. С. 620.

• • •

Варта спыніцца на рабоце літаратурнага аб'яднання пры райгазеце «Ударны фронт», якая, па сутнасці, з'яўляецца творчай лабараторыяй мясцовай літаратурнай моладзі.

Вельмі радасна адчуваць, як папаўняюцца рады пачынаючых літаратараў здольнымі, таленавітымі аўтарамі. У першую чаргу — гэта ўраджэнцы раёна. Сярод іх — Міхась Ісаеў, Пётр Давідовіч, Галіна Логвінава, Валянціна Канькова, Леанід Галіноўскі, Мікола Лісоўскі, Сяргей Батурэвіч, Лідзія Шайда, Яўгенія Гуцол, Георгій Вярбіцкі. Адчуваецца, што кожны з іх валодае прыроднымі паэтычнымі здольнасцямі, а астатняе залежыць ад асабістага жадання аўтара, ад яго настойлівасці і ўпартасці ў дасягненні мэты, ад сістэматычнай работы над сабой.

М. Няхай

З гісторыі вёсак

Азер'е. У рукапісных крыніцах упершыню ўпамінаецца пад 1560 як сяло Азёры. У 1580 аддана ў пажыццёвае валоданне памешчыку. У 1604 непадалёку быў гаспадарскі дом і фальварак. Мелі ся два вадзяныя млыны. У 1643 адкрыта карчма. У 1772 — 50 двароў, 40 жыхароў ва ўладанні гр. П. Завадоўскага. З 1871 сяло Азер'е (61 двор, 486 жыхароў) і фальварак (2 двары, 1 жыхар) — у Нічыпаравіцкай воласці. З 1924 — у Заходскім сельсавеце Лупалаўскага, з сакавіка 1931 — Шклоўскага р-на.

Акунёўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1651 сяло — у складзе маёнтка Сліжы. У 1670 — 23 двары, у Анікавіцкім войтаўстве Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1737 сяло Акунёўка (25 двароў), у 1773 — 40 двароў, 272 жыхары — ва ўладанні памешчыка ў Капыскім павеце. У 1897 — 68 двароў, 393 жыхары ў Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. Непадалёку быў хутар (6 жыхароў).

Александрыя. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў сярэдзіне XVII ст. як мястэчка ў Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства. У 1695 — цэнтр войтаўства (41 двор) у Шклоўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У сярэдзіне XVII ст. меліся гандлёвыя лаўкі, млын, карчма. Пры першым статыстычным апісанні Магілёўскай губерні (1783—1784) пазначана як мястэчка (53 двары, 378 жыхароў, 2 царквы, млын...). Належала памешчыку, уваходзіла ў Капыскі павет. У Айчынную вайну 1812 г. каля вёскі дзейнічаў атрад Д. Давыдава. У 1886 сяло (54 двары, 312 жыхароў, 2 млыны, кузня, малельны дом, 2 школы граматы) уваходзіла ў Старасельскую воласць Аршанскага павета, з'яўлялася дзяржаўнай маёмасцю. Непадалёку знаходзіўся маёнтак, фальварак (2 двары, 23 жыхары, вадзяны млын і крупарушка). У 1909 — у сяле 99 двароў, 682 жыхары, у маёнтку 13 жыхароў. З 26.04.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета Гомельскай губерні РСФСР, з 18.11.1920 — у Віцебскай губерні, з 3.03.1924 — у складзе БССР, з 20.08.1924 — у Капыскім р-не Аршанскай акругі. У 1969 да вёскі далучаны пас. Александрыя. З 8.07.1931 — у Шклоўскім р-не.

Аляксандраўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1817 пасёлак (15 двароў, 108 жыхароў) — у Чарнаруцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 — 30 двароў, 130 жыхароў.

Апалонаўка. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XX ст. У 1909 вёска (15 двароў, 83 жыхары) — у Шклоўскай воласці. У снежні 1929 — далучана в. Хадзевічы.

Астравец. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. З 20.08.1924 — у Заходскім сельсавеце Лупалаўскага, з сакавіка 1931 — Шклоўскага р-на.

Аўгустоў. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1780-х гг. — у складзе маёнтка Плешчыцы ў Магілёўскім павеце, належала гр. П. В. Завадоўскаму. У 1841—1847 дзейнічаў цукровы завод. Меўся млын. З 1924 — у Падгайскім, з 1930 — у Заходскім, з лістапада 1965 — у Гарадзецкім сельсавеце.

Аўрамаўка. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Аўчыненкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Барыскаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 33 двары, 193 жыхары. У 1858 г. сяло (121 рэвізская душа) — у Магілёўскім павеце. У 1882 адкрыта земская школа. У 1897 — 68 двароў, 478 жыхароў, у Шклоўскай воласці. Непадалёку была сядзіба (3 жыхары).

Бабічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1695 — 12 двароў, у 1785 — 15 двароў, 128 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка. У 1880 — 26 двароў, 183 жыхары. У 1897 — 34 двары, 214 жыхароў, у Чарнаруцкай воласці Магілёўскага павета.

Бабчына. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1743 — у Аршанскім павеце. У 1785 — у складзе маёнтка Шупені Магілёўскага павета, шляхецкая ўласнасць, з 1847 — уласнасць памешчыка, якому належалі каля 1200 дзесяцін зямлі, млын, вінакурны завод. У 1909 — 23 жыхары. З 26.04.1919 — у Чарнаруцкай волаці Магілёўскага павета Гомельскай губерні, з 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці.

Багушоўка. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў сярэдзіне XVII ст., калі ўваходзіла ў Вышкаўскае войтаўства Шклоўскага графства. У 1771 — 2 двары, 14 жыхароў. У 1783 — тут быў фальварак (20 жыхароў). У 1854 пачаў дзейнічаць вінакурны завод, у 1862 — мукамольня. У 1897 фальварак (31 жыхар) — у Старасельскай воласці Аршанскага павета. Памешчыку належала 2651 дзесяціна зямлі. З 20.08.1924 — у Аляксандрыйскім сельсавеце Капыскага, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Баркі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У яго другой палове — уласнасць гр. Агінскага. У час Айчыннай вайны 1812 г. была спалена французскімі войскамі. Адноўлена. У 1897 — 103 двары, 657 жыхароў. Меліся школа граматы, хлебазапасны магазін. Побач быў фальварак (2 двары, 24 жыхары, вадзяны млын, суконная фабрыка). У 1907 адкрыта земская школа. У 1909 у сяле — 122 двары, 1120 жыхароў, у маёнтку — 1 двор, 62 жыхары. З 26.04.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета, з 8.07.1931 — Талачынскага, з 5.12.1931 — Шклоўскага р-на.

Баркі-Зара (Баркі-2). Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Барсукі. Упершыню ўпамінаецца ў пісьмовых крыніцах у XVIII ст. У 1785 — 40 двароў, 308 жыхароў, цэнтр маёнтка, уласнасць праваслаўнай царквы. У канцы XVIII ст. сяло належала архіепіскапу Беларускаму і Магілёўскаму Анастасію. У Айчынную вайну 1812 г. жыхары разграмілі маёнтак архіепіскапа Шашацкага, які стаў на бок акупантаў, забралі зерне, жывёлу. У 1857 сяло — у Магілёўскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. Была адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1912 створана калонія малагадовых злачынцаў (існавала да 1917). У пачатку 20-х гг. тут была арганізавана дзіцячая камуна, якая ў 1931 ператварылася ў дашкольны дзіцячы дом.

Барыскавічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як цэнтр войтаўства ў Шклоўскім графстве. У 1771 — 10 двароў, 53 жыхары. У 1785 — 13 двароў, 95 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў у Магілёўскім павеце, уладанне памешчыка. У 1897 — 17 двароў, 112 жыхароў — у Шклоўскай воласці. У аднайменным пасёлку, які знаходзіўся паблізу, было 27 двароў, 156 жыхароў.

Башкіраўка. Вядома з XIX ст. У 1856, сумесна з суседняй в. Гарадзец, на правах спадчыны належала памешчыцы А. В. Танеевай (Любініцкая воласць). Дзейнічалі пастаялы двор, вінакурны завод, вадзяны млын. У 1897 пад такой жа назвай былі ўрочышча (1 двор, 9 жыхароў), а ў 1909 — хутар (1 двор, 8 жыхароў). З 20.08.1924 — у Кіяжыцкім сельсавеце Шклоўскага р-на, з лістапада 1965 — у Гарадзецкім сельсавеце.

Бель. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1604 г. як сяло (104 «дымы») у Плешчацкім войтаўстве Аршанскага павета. Дзяржаўная ўласнасць. У 1635 — 86 двароў, у 1785 — 73 двары, 388 жыхароў, уласнасць Аршанскага езуіцкага касцёла. У 1897 — 62 двары, 393 жыхары, у Нічыпаравіцкай волаці, у 1909 — 67 двароў, 466 жыхароў. З 20.08.1924 — у Падгайцаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на. З 11.03.1960 — у Заходскім сельсавеце.

Благаўка. У 1616, па інвентару, сяло, якое мела ў той час назву Пагост, мела 54 валокі зямлі ў Чамаданскім войтаўстве. У 1742 сяло Благаўка (яно ж Пагост) мела 26 двароў, у 1785 — 50 двароў, 312 жыхароў, у Капыскім павеце. Дзяржаўная ўласнасць. У 1812 спалена французскімі войскамі. У 1858 — 105 рэвізскіх душ, у Горацкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 57 двароў, 339 жыхароў, у Гарадзішчанскай волаці Горацкага павета.

Бушлякі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1667 — маёнтак у Аршанскім павеце Віцебскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1786 (сяльцо Бышлякі) — 20 двароў, 175 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1848 — 21 двор, 177 жыхароў, цэнтр маёнтка.

Брус. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Бяланава. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Бярозаўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1783 — 15 двароў, 76 жыхароў. У 1897 — фальварак у Старасельскай воласці.

Валосавічы. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1525. У 1626 — 46 двароў, належала Капыскаму кальвінісцкаму збору. У 1650 — у Капыскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1897 — 30 двароў, 197 жыхароў, у Любініцкай волаці Горацкага павета.

Варопанка. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1829 в. Варапаны (3 двары, 19 жыхароў) — у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1909 — 19 двароў, 161 жыхар, у Старасельскай воласці Аршанскага павета.

Вішанька. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Вышкава. Вядома па рукапісных крыніцах з сярэдзіны XVII ст. як войтаўства ў Шклоўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 10 двароў, 62 жыхары. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай — у Капыскім павеце Магілёўскай губерні. У 1783 — 12 двароў, 105 жыхароў, у 1909 — 41 двор, 286 жыхароў. З 26.04.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета Гомельскай, з 18.01.1920 — Віцебскай губерні РСФСР, з сакавіка 1924 — у складзе БССР, у Аляксандрыйскім сельсавеце Капыскага, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Вялікае Замошша. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1807 — 30 двароў, 190 жыхароў, у Бараньскай волаці Аршанскага павета. Са жніўня 1924 — у Аляксандрыйскім сельсавеце.

Вялікае Зарэчча. Складаецца з двух пасяленняў: Малое і Вялікае Зарэчча. Па народнаму паданню, заснаванне Зарэчнага Шклова адносіцца да часу Паўночнай вайны. Мястэчка размясцілася на тым месцы, дзе быццам бы стаяў абоз рускай арміі пасля звароту яе з-пад Палтавы. У 1897 Зарэчны Шклоў (Вялікае і Малое Зарэчча) — мястэчка (148 двароў, 1228 жыхароў) у Любініцкай волаці Горацкага павета. З 1924 — у Зарэчна-Шклоўскім сельсавеце.

Вялікае Уланава. Вядома па рукапісных крыніцах як в. Уланава-1, у Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства Аршанскага павета. У першай палове XVII ст. тут быў фальварак, шляхецкая ўласнасць. У 1735 — 26 двароў, 159 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 в. Уланава-1 Вялікае (48 двароў, 323 жыхары) у Старасельскай воласці Аршанскага павета. Мелася школа граматы, якая ў 1907 пераўтварылася ў царкоўнапрыходскую. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета ў Шклоўскім р-не, з 1963 — у Старасельскім сельсавеце.

Вялікае Чорнае. Вядома па рукапісных крыніцах з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Чарнаруцкім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1696 — 47 двароў. У 1785 — 42 двары, 340 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 — 55 двароў, 377 жыхароў, у Чарнаруцкай волаці Магілёўскага павета. Меліся царкоўнапрыходская школа, пастаялы двор, драўляная царква. З 20.08.1924 да 16.07.1954 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на. У 1956 да вёскі далучаны пасёлак Доўгі Абарок.

Вялікая Камароўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1785 — 22 двары, 162 жыхары, у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. Мелася драўляная царква, у 1887 адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1950-х гг. далучана в. Прыгоннікі.

Вялікая Лотва. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 — в. Лотва (37 двароў, 261 жыхар) у Старасельскай воласці Аршанскага павета. Мелася школа граматы. У 1909 — 37 двароў, 273 жыхары.

Вялікая Мухамораўшчына. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Вялікі Міхайлоў. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 — пасёлак Новае Міхайлова (ён жа Багданаўка) — 3 двары, 23 жыхары, у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. Побач быў фальварак (1 двор, 10 жыхароў). У 1909 у в. Новы Міхайлоў — 16 двароў, 81 жыхар, у маёнтках Міхайлова — 2 двары, 12 жыхароў. З сакавіка 1960 — у Каменна-Лаўскім сельсавеце. У 1967 да вёскі далучаны вв. Нісаўка, Горка.

Вялікі Мяжнік. Вядома па рукапісных крыніцах з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Вышкаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 15 двароў, 88 жыхароў. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай — у Капыскім павеце. У 1783 — 14 двароў, 105 жыхароў, уласнасць С. Р. Зорыча. У 1897 — 23 двары, 140 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. З 20.08.1924 — у Аляксандрыйскім сельсавеце Капыскага р-на, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Вялікія Аўчыненкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1897 — 68 двароў, 678 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 77 двароў, 555 жыхароў, непадалёку была сядзіба (1 двор, 3 жыхары). У сярэдзіне 1920-х гг. в. Аўчыненкі падзелена на дзве: Вялікія А. і Малыя А.

Вялікія Лазіцы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — вёска у Магілёўскай акрузе. У 1785 — у складзе маёнтка Галоўчына Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 — 62 двары, 365 жыхароў, у Таўпечыцкай волаці Магілёўскага павета. Меліся царкоўнапрыходская школа, царква. У 1967 — далучана в. Аляксееўка.

Вялікія Славені. Па рукапісных крыніцах вядома з XVIII ст. У 1785 — 25 двароў, 155 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 с. Славені (63 двары, 363 жыхары) — у Любініцкай волаці Горацкага павета. Непадалёку быў фальварак (3 двары, 11 жыхароў, карчма). Дзейнічала царква.

Вялікія Сліжы. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. У 1777 — у Капыскай акрузе, у 1858 — у Горацкім павеце, уласнасць памешчыка, які ў 1866 меў тут 362 дзесяціны зямлі і карчму. Мелася царква. У 1897 — 16 двароў, 97 жыхароў, у Гарадзішчанскай волаці Горацкага павета. Непадалёку быў хутар (5 двароў, 25 жыхароў) і фальварак (2 двары, 14 жыхароў). У 1901 адкрыта царкоўнапрыходская школа. У 1909 — 14 двароў, 141 жыхар, у фальварку — 1 двор, 5 жыхароў.

Вялікі Стары Шклоў. У рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1535 г., калі Шклоў быў спалены рускім ваяводай В. Шуйскім. У 1563 Ян Хадкевіч пабудаваў палац і кальвінісцкі збор, а ў 1619 Аляксандр Хадкевіч заснаваў Дамініканскі кляштар з вялікай бібліятэкай. У 1695 у Старым Шклове мелася 29 двароў. У 1771 — цэнтр войтаўства, 25 двароў, 159 жыхароў. З 1777 — валоданне ген. С. Р. Зорыча. У 1874 адкрыта земская школа. У 1897 — 50 двароў, 341 жыхар, у Шклоўскай воласці.

Гаваракі. Вядома па рукапісных крыніцах з першай паловы XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 26 двароў, 205 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 27 двароў, 195 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета.

Гавяды. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1785 — 33 двары, 174 жыхары, у складзе маёнтка Галоўчына Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка, які ў 1840 меў у вв. Гавяды і Смятанічы 1186 дзесяцін зямлі, 3 карчмы. У 1897 — 77 двароў, 461 жыхар, у Таўпечыцкай

воласці Магілёўскага павета. Непадалёку быў фальварак (1 двор, 5 жыхароў).

Ганцавічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. у 1857 — у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 12 двароў, 60 жыхароў, у Шклоўскай воласці Магілёўскага павета. У 1930 ва ўрочышчы Ганцавічы былі створаны вінаводчая і агародняя гаспадаркі, якія ўваходзілі ў склад калгаса.

Гарадзец. Па рукапісных крыніцах вядома з XVII ст. У 1635 сяло (32 дворы) — у Плешчыцкім войтаўстве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1650 — у Чурылаўскай воласці Капыскага графства Віцебскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У 1670 — 28 двароў, у Гарадзецкім войтаўстве. Пасля першага падзелу Рэчы Паспалітай уладальнікам вёскі стаў гр. П. Завадоўскі. У 1785 — 63 дворы, 451 жыхар, у Капыскім павеце Магілёўскага намесніцтва. Меліся млын, царква. У сярэдзіне XIX ст. працаваў цукровы завод. У 1890 адкрыта школа. У 1897 — 96 двароў, 558 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. Непадалёку былі 2 фальваркі: у адным — 4 дворы, 27 жыхароў, у другім — 3 дворы, 15 жыхароў. У канцы 1930-х гг. у выніку ссялення хутароў у вёсцы стала 120 двароў, 620 жыхароў. З 1960 — у Фашчаўскім сельсавеце, з 1.10.1965 — цэнтр сельсавета.

Гарадзішча. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 як сяло ў Шклоўскай воласці Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, шляхецкая ўласнасць. У сярэдзіне XVII ст. — у Шарцілаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, у канцы XVII ст. — фальварак, шляхецкая ўласнасць. У 1695 — 11 двароў, у 1771 — 22 дворы, 111 жыхароў. У 1785 — 26 двароў, 173 жыхары, у Капыскім павеце Магілёўскага намесніцтва, уладанне памешчыка. Меліся драўляная царква, млын, суконная фабрыка. З 1865 дзейнічала гарбарня. У 1897 — 50 двароў, 321 жыхар, цэнтр воласці Горацкага павета. У 1884 адкрыта народнае вучылішча. У 1977 да вёскі далучаны вв. Літвінавічы, Русакі, Старое Вільянава.

Гарадзянка. Вядома па рукапісных крыніцах з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства. У 1695 — 2 дворы, шляхецкая ўласнасць. У 1785 в. Гарадзянка-Церабушка (21 двор, 130 жыхароў — у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка, які меў у Шклове і вв. Забранае, Сямёнаўка, Францаўка, Гарадзянка, Пікавічы, Прыют, 6590 дзесяцін зямлі, вадзяны млын, 2 крупарушкі. У 1897 — 16 двароў, 122 жыхары, у Шклоўскай воласці.

Гарадок. Засяленне месца адбылося ў старажытнасці, а сучасная вёска заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. З 1924 — у Княжыцкім, з 1965 — у Гарадзецкім сельсавеце.

Гарадок. Вядома з пачатку XVII ст. У 1604 сёлы Гарадок і Варонкі аддадзены Старасельскаму касцёлу. У 1606 — у складзе Тройцкага фальварка Аршанскага павета. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1794 сёлы Гарадок і Варонкі аб'ядналіся ў адну вёску з назвай Гарадок. У 1897 — 65 двароў, 414 жыхароў, у Старасельскай воласці. Побач быў засценак (1 двор, 5 жыхароў). З 1924 — у Старасельскім сельсавеце Капыскага, з 1931 — Талачынскага, з 5.12.1931 — Шклоўскага р-на.

Гвалтоўнік. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 — засценак (13 двароў, 93 жыхары) — у Старасельскай воласці Аршанскага павета.

Герасімоўшчына. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Горка. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Грамакі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — вёска ў Магілёўскай акрузе. У 1785 — сяльцо, уладанне шляхціца (5 двароў) — у Магілёўскім павеце. У 1897 — 6 двароў, 43 жыхары, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1961 да вёскі далучана в. Гурковішча.

Дабрэйка. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XVII ст., калі вёска ўваходзіла ў склад Магілёўскага замка. У XVIII ст. былі дзве вёскі: Вялікая Дабрэйка і Малая Дабрэйка ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства. У 1715 у В. Дабрэйка меліся млын, вінакурня, карчма. У першай палове XVIII ст. непадалёку ўзнік фальварак. У 1771 у вёсцы В. Дабрэйка было 26 двароў, 160 жыхароў, у вёсцы М. Дабрэйка — 33 дворы, 198 жыхароў. У 1785 абедзве вёскі — у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета. У канцы XVIII ст. — у валоданні С. Р. Зорыча і С. Ф. Герасімава. Налічвалі разам 75 гаспадарак, 467 жыхароў. У 1909 у вёсцы М. Дабрэйкі — 6 двароў, 36 жыхароў, у вёсцы В. Дабрэйкі — 69 двароў, 451 жыхар, на хутары — 1 двор, 3 жыхары. У канцы 1920-х гг. вёскі аб'ядналіся.

Данькавічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У першай яго палове быў фальварак, у 1771 вёска — 25 двароў, 126 жыхароў. У 1897 — 36 двароў, 211 жыхароў, у Шклоўскай воласці.

Дзіўнава. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло Дзіўнае ў Шклоўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 51 двор, 259 жыхароў. У 1785 — 43 дворы, 211 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1858 — 32 дворы, 164 жыхары, у Горацкім павеце. У 1897 — 63 дворы, 392 жыхары, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета.

Дзяжкі. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Дубраўка. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XVII ст. Па інвентару 1635 была ў валоданні Аршанскага касцёла. У 1695 — 14 двароў. У 1785 — 29 двароў, 211 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1869 памешчык І. В. Рубаноўскі меў тут 1063 дзесяціны зямлі. У 1897 — 37 двароў, 241 жыхар, у Чарнаруцкай воласці Магілёўскага павета.

Дубраўка-1. Па рукапісных крыніцах вядома з пачатку XVII ст. У 1604 — 38 двароў, у Плешчыцкім войтаўстве Магілёўскага старостава, дзяржаўная ўласнасць. У 1616 — аддана Аршанскай

калегіі езуітаў. У 1785 — 30 двароў, 193 жыхары, у складзе маёнтка Хвашчаўка Магілёўскага павета. У 1897 — 58 двароў, 431 жыхар, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. Непадалёку быў фальварак (2 двары, 10 жыхароў). З 1924 — у Фашчаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Дубраўка-2. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло Дуброўнікі ў Плешчыцкім войтаўстве. У 1785 — 29 двароў, 211 жыхароў, уласнасць памешчыка. Пасля 1917 уваходзіла ў Нічыпаравіцкую воласць Горацкага павета, з 1924 — у Нічыпаравіцкім сельсавеце Лупалаўскага, з 2.03.1931 — Шклоўскага р-на.

Дуброва. Упершыню ўпамінаецца ў інвентары Магілёўскай эканоміі 1635. У 1909 — 13 двароў, 125 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета.

Дымава. Вядома па рукапісных крыніцах з 1541 як сяло ў складзе маёнтка Дудаковічы, шляхецкая ўласнасць. У 1606 упамінаецца ў адмежаванні Старасельскага касцёла. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1897 — 10 двароў, 59 жыхароў, у Старасельскай воласці. Побач быў аднайменны фальварак (3 дворы, 35 жыхароў, вадзяны млын). У 1909 — 10 двароў, 65 жыхароў, у маёнтку — 19 жыхароў.

Еўдакімавічы. Па рукапісных крыніцах вядома з 1560 г. як сяло ў Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1604 — у Плешчыцкім войтаўстве, аддана ў часовае валоданне Магілёўскаму касцёлу. У 1742 — уласнасць Магілёўскай плябаніі. У 1785 — 16 двароў, 194 жыхары, у складзе маёнтка Заходы, уласнасць Магілёўскага архіепіскапства. У 1810 — 31 двор, 166 жыхароў, у Магілёўскім павеце. У 1897 — 44 дворы, 297 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. З 20.08.1924 — у Заходскім сельсавеце Лупалаўскага, з сакавіка 1931 — Шклоўскага р-на.

Забор'е. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1844 — 44 жыхары, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1858 — у Горацкім павеце. З 1924 — у Старасельскім сельсавеце Капыскага р-на, з 1931 — Талачынскага, з 5.12.1931 — Шклоўскага р-на.

Забродцзе. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1652 — сяло. У 1670 — 58 двароў у Гарадзецкім войтаўстве Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 61 двор, 401 жыхар, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка, які меў тут 2575 дзесяцін зямлі і пастаялы двор. У 1897 — 80 двароў, 499 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. Непадалёку былі фальварак (4 дворы, 36 жыхароў) і карчма (1 двор, 6 жыхароў). Дзейнічалі 2 вадзяныя млыны, крупарушка. У 1914 адкрыта земская школа.

Завараты. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 як сяло Заварот (25 двароў) — у Дамануўскім войтаўстве Магілёўскага старостава, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 — 24 дворы, 162 жыхары, у складзе маёнтка Плешчыцы Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 — 28 двароў, 210 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. З 20.08.1924 — у Нічыпаравіцкім сельсавеце Лупалаўскага, з 2.03.1931 — Шклоўскага р-на.

Загор'е. Вядома па рукапісных крыніцах XVIII ст. У 1785 — 22 дворы, 136 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 — 29 двароў, 183 жыхары, у Шклоўскай воласці Магілёўскага павета. У 1915 адкрыта земская школа.

Займішча. (Да 1967 — в. Новае Займішча і в. Старое Займішча.) Вядома па рукапісных крыніцах з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Сасноўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 18 двароў, 176 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У канцы XVIII ст. — 22 дворы, 181 жыхар, належала С. Р. Зорычу. У 1897 — 47 двароў, 307 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 49 двароў, 369 жыхароў. Дзейнічала земская школа.

Заполле. Вядома па рукапісных крыніцах з XVI ст. У 1562 — сяло ў Стайкаўскай воласці. У 1670 — 11 двароў, у Гарадзецкім войтаўстве Капыскага графства Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 20 двароў, 127 жыхароў, у Капыскім павеце Магілёўскага намесніцтва. У 1897 — 40 двароў, 274 жыхары, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 47 двароў, 320 жыхароў.

Зароўцы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., у Барыскаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 41 двор, 256 жыхароў. У 1897 — 66 двароў, 524 жыхары, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1908 адкрыта земская школа. У 1909 — 77 двароў, 513 жыхароў. У 1953 — да вёскі далучана в. Прылепаўка, у 1967 — в. Калінава.

Засценкі. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Заходы. Вядома па рукапісных крыніцах з 1604 як сяло Заход (47 двароў) — у Плешчыцкім войтаўстве, дзяржаўная ўласнасць, у часовым валоданні Магілёўскага касцёла. У 1785 — цэнтр маёнтка ў Магілёўскім павеце, уласнасць Магілёўскага каталіцкага архіепіскапства. Дзейнічалі 2 вадзяныя млыны, драўляны гаспадарскі дом, вінакурня, касцёл. У 1841 пабудавана з дрэва царква. У 1848 — 20 двароў, цэнтр казённага маёнтка, у Магілёўскім павеце. У 1858 — 75 рэвізскіх душ, у Горацкім павеце. У 1883 адкрыта школа. У 1897 — 37 двароў, 243 жыхары, у Нічыпаравіцкай воласці. У 1909 — 44 гаспадаркі, 284 жыхары; непадалёку хутар (1 двор, 8 жыхароў). З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Лупалаўскага, з 2.03.1931 — Шклоўскага р-на.

Заходы. Вядома па рукапісных крыніцах з 1567 як сяло ў Магілёўскай воласці Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1604 — 47 двароў, у Плешчыцкім войтаўстве, часовае ўладанне Магілёўскага касцёла. У 1771 — 38 двароў, 141 жыхар, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 49 двароў, 280 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 48 двароў, 315 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета.

З 20.08.1924 — у Гарадзецкім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Зацішша. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 засценак (9 двароў, 76 жыхароў) — у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 — 14 двароў, 89 жыхароў.

Зямцы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., у Барыскаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1635 — сяло Галубіна (яно ж Зямцы) — у Чамаданскім войтаўстве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 — 4 двары, 33 жыхары, у Магілёўскім павеце, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць намешчыка. У 1897 — 10 двароў, 65 жыхароў, у Бараньскай воласці Аршанскага павета. Побач быў аднайменны фальварак (1 двор, 11 жыхароў).

Калінаўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1897 — 17 двароў, 146 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 18 двароў, 115 жыхароў.

Каменка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1783 — 14 двароў, 113 жыхароў. Упамінаецца як уладанне намешчыка. У 1907 адкрыта земская школа. У 1909 — 8 двароў, 93 жыхары.

Каменка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — сяло Камянец у Капыскай акрузе. У 1897 — 9 двароў, 69 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. Побач было аднайменнае ўрочышча (3 двары, 31 жыхар). У 1909 — 8 двароў, 93 жыхары, ва ўрочышчы — 4 двары, 27 жыхароў.

Каменныя Лавы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1667 — сяло ў Аршанскім павеце, шляхецкая ўласнасць. У 1780 было 9 двароў, 83 жыхары, 741 дзесяціна зямлі, большая частка якой была занята лесам, належала шляхціцу. У 1785 — 12 двароў, 75 жыхароў, у Магілёўскім павеце. У 1909 — 44 двары, 280 жыхароў.

Капысіца. Вядома з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Вышкаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1695 — 22 двары. У 1783 — 46 двароў, 253 жыхары, уласнасць С. Р. Зорыча. У 1897 — 72 двары, 476 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У аднайменным засценку — 10 двароў, 62 жыхары. У 1902 адкрыта школа. У 1909 — 85 двароў, 587 жыхароў. З 26.01.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета, з 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце Капыскага, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Карасі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 29 двароў, 222 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць намешчыка. У 1897 — 48 двароў, 300 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. У 1909 — 57 двароў, 332 жыхары.

Карбатоўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 — 5 двароў, 29 жыхароў, у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 6 двароў, 39 жыхароў.

Карзуны. Па рукапісных крыніцах вядома з сярэдзіны XVII ст., калі ўваходзіла ў Вышкаўскае войтаўства Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1643 тут быў млын, сукнавальня. У 1695 — 6 двароў, у 1771 — 15 двароў, 80 жыхароў. Побач быў фальварак (3 двары, 26 жыхароў, вадзяны млын), у Капыскім павеце. З 1861 — у Старасельскай воласці. У 1897 — 31 двор, 203 жыхары, у засценку — 18 двароў, 100 жыхароў. У 1909 у вёсцы — 40 двароў, 190 жыхароў, у засценку — 13 двароў, 114 жыхароў. З 26.04.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета Гомельскай, з 18.11.1920 — Віцебскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 — ва Уланаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Клімавічы. Вядома па рукапісных крыніцах XVII ст., уваходзіла ў Чарнаруцкае войтаўства Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1783 — 34 двары, 261 жыхар, уласнасць С. Р. Зорыча і С. Ф. Герасімава. У 1909 — 67 двароў, 302 жыхары. З 26.04.1919 — у Чарнаруцкай воласці Магілёўскага павета.

Клін. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак, у Старасельскім сельсавеце.

Клін. Вядома па рукапісных крыніцах з 1909, калі гэта было ўрочышча (4 двары, 17 жыхароў), уваходзіла ў Маслакоўскую воласць Горацкага павета.

Княжыцы. Па рукапісных крыніцах вядома з 1604 як сяло Княжыцк у Плешчыцкім войтаўстве Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1612 каралём Сігізмундам III аддана Аршанскай езуіцкай калегіі, якой належала да 20-х гадоў XIX ст. У канцы XVIII ст. у сяле — 41 двор, 265 жыхароў. У 1864 адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1897 — сяло Княжычкі (52 двары, 313 жыхароў) — у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 68 двароў, 415 жыхароў. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на.

Копысь. Пасёлак і чыгуначная станцыя на лініі Магілёў — Орша. Заснаваны як чыгуначная станцыя ў 1902 г. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце.

Крывель. Па рукапісных крыніцах вядома з 1604 г. як сяло ў Плешчыцкім войтаўстве, дзяржаўная ўласнасць. Кароль Сігізмунд III даравaў вёску Аршанскай езуіцкай калегіі, якой яна належала да 20-х гг. XIX ст. У 1797 дзейнічала праваслаўная царква. У канцы XVIII ст. было 30 двароў, 253 жыхары, у складзе маёнтка Хвашчаўка Магілёўскага павета. У 1834 — сяло Крывялёва (34 двары, 157 жыхароў), уласнасць намешчыка. У 1897 — 47 двароў, 327 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 59 гаспадарак, 401 жыхар. З 20.08.1924 — у Княжыцкім, з 22.10.1963 — у Гарадзецкім сельсавеце Шклоўскага р-на. Да вёскі ў 1940 далучаны пас. Валожыка.

Кучарына. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1785 — 9 двароў, 92 жыхары, уласнасць намешчыка. У 1909 — 21 двор, 101 жыхар, у Любініцкай воласці Горацкага павета.

Ладыжына. Упамінаецца ў рукапісных крыніцах у 1742 як абруб Глінічаўскі (ён жа Ладыжынскі) у Даманоўскім войтаўстве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 — 5 двароў, 21 жыхар, у складзе маёнтка Плешчыцы Магілёўскага павета, належала графу П. Завадоўскаму. У 1897 былі вв. Ладыжына-1 (2 двары, 21 жыхар) і Ладыжына-2 (3 двары, 27 жыхароў) у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 у абедзвюх вёсках налічвалася 6 двароў, 57 жыхароў. У 30-х гг. вёскі былі аб'яднаны.

Лакуці. У рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1643 як сяло ў Плешчыцкім войтаўстве Аршанскага павета, дзяржаўная ўласнасць. У 1742 сяло Лакуцёва (яно ж Дуброўка) налічвала 16 двароў. У другой палове XVIII ст. — у валоданні графа П. Завадоўскага. Тады ў ёй быў 31 двор, 267 жыхароў. У 1785 — 35 двароў, 214 жыхароў, у складзе маёнтка Плешчыцы. Пасля пракладкі ў 1845 шашы Віцебск — Магілёў ў сяле размясцілася паштовая станцыя, якая мела 30 коней. Яе будынак, узведзены ў сярэдзіне XIX ст. па ўзорнаму праекту 1843, з'яўляецца помнікам грамадзянскай архітэктуры. У 1897 — 47 двароў, 329 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці. У 1909 — 52 двары, 356 жыхароў. Паштовая станцыя была скасавана, застаўся 1 двор, 9 жыхароў. У час акупацыі Шклоўшчыны ў 1918 вёска знаходзілася ў прыфрантавой паласе і ўваходзіла ў склад РСФСР. З 20.08.1924 — у Падгайцаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на, з 11.03.1960 — у Заходскім сельсавеце.

Лешча. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1785 — 18 двароў, 122 жыхары, уласнасць намешчыка. У 1824 — 16 двароў, 122 жыхары, уласнасць Магілёўскага касцёла. У 1897 — 40 двароў, 265 жыхароў, у Маслакоўскай воласці Горацкага павета. У 1909 — 39 двароў, 293 жыхары.

Лідзіна. Вядома з XIX ст. У 1897 — засценак (9 двароў, 70 жыхароў) у Старасельскай воласці.

Літоўск (Да 17.07.1967 — вв. Літоўск-1 і Літоўск-2.) У рукапісных крыніцах упамінаецца ў сярэдзіне XVII ст., калі ўваходзіла ў Высокаўскае войтаўства Шклоўскага графства. У 1785 — в. Літоўка (18 двароў, 131 жыхар) — у складзе маёнтка Шклоў. У другой палове XVIII ст. вёска Літоўская з'яўлялася сумесным уладаннем С. Р. Зорыча і С. В. Герасімава. Праз стагоддзе вёска ўпамінаецца як Літоўск у Магілёўскім павеце. У 1880 — 25 двароў, 144 жыхары. Памешчык меў тут 676 дзесяцін зямлі і карчму. У 1897 — 34 двары, 198 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 43 двары, 283 жыхары. Са жніўня 1924 — у Высоцкім сельсавеце.

Лопавічы. Вядома па рукапісных крыніцах як вёска ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 33 двары, 148 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць намешчыка. У 1897 — 21 двор, 155 жыхароў, у Шклоўскай воласці. На аднайменным хутары было 2 двары, 8 жыхароў. У 1909 — 21 двор, 165 жыхароў. З 20.08.1924 — у Шклоўскім р-не.

Лотва. Вядома з XVIII ст. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1785 — 8 двароў, у складзе маёнтка Вадва Магілёўскага павета, уласнасць намешчыка. У канцы XVIII ст. — 22 двары, 143 жыхары, належала С. Р. Зорычу. У 1909 — 37 двароў, 273 жыхары.

Лотва. Пасёлак, чыгуначная станцыя. Вядомы з XIX ст. У 1897 — 4 двары, 26 жыхароў, у 1909 — 4 двары, 41 жыхар. Са жніўня 1924 — у Старавадзянскім, з сакавіка 1960 — Каменна-Лаўскім сельсавеце.

Лутна. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Лысая Гара. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Любінічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1670 — 63 двары, у Гарадзецкім войтаўстве Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1777 — сяло Любіміч у Капыскай акрузе Магілёўскай губерні. У 1858 — у Горацкім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 88 двароў, 556 жыхароў. Меліся школа (народнае вучылішча), хлебазапасны магазін, піцейны дом, царква. У 1909 — 92 двары, 620 жыхароў, дзейнічалі млын, прыёмны пакой.

Ляхаўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Чарнаруцкім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 12 двароў, 84 жыхары ў складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка. У 1897 — 9 двароў, 59 жыхароў, у Чарнаруцкай воласці. У аднайменным фальварку, які знаходзіўся непадалёку, было 33 жыхары, меўся млын. У 1909 — 9 двароў, 55 жыхароў, у фальварку — 13 жыхароў.

Майсеенкі. Вядома з XIX ст. У 1897 вёска (яна ж Наваселле) налічвала 17 двароў, 158 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 22 двары, 158 жыхароў.

Майсеенкі. Вядома з сярэдзіны XVII ст. як вёска ў Шклоўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 16 двароў, 130 жыхароў, уласнасць памешчыка, які ў 1871 меў тут 891 дзесяціну зямлі, карчму і млын.

Малая Камароўка. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. У 50-х гг. да вёскі далучаны пас. Будзённага.

Малая Лотва. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Малое Замошша. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1897 — 8 двароў, 72 жыхары, у Бараньскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 11 двароў, 86 жыхароў. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце.

Малое Зарэчча. Вядома з XIX ст. У 1897 былі вёскі Малое Зарэчча і Вялікае Зарэчча (Зарэчны Шклоў), у Любініцкай воласці. У 1940 — 83 двары, 428 жыхароў. У 1994 — 96 гаспадарак, 215 жыхароў.

Малое Уланава. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска Уланава-2 у Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — в. Ніжні Уланаў (8 двароў, 71 жыхар), уласнасць памешчыка. У 1897 — в. Уланава-2 Малое (14 двароў, 99 жыхароў),

у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 24 двары, 182 жыхары.

Малое Чорнае. Вядома з XVII ст. як вёска ў Чарнаруцкім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 27 двароў, 204 жыхары, у Магілёўскім павеце. У 1897 сяло Чорнае Малое (38 двароў, 265 жыхароў), у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 35 двароў, 252 жыхары.

Малы Міхайлоў. Пачатак вёсцы паклаў пасёлак Новае Міхайлова (ён жа Багданаўка), які ў 1897 налічваў 3 двары, 23 жыхары і ўваходзіў у Таўпечыцкую воласць. У 1909 — 16 двароў, 81 жыхар. Паблізу былі 2 маёнткі.

Малы Мяжнік. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1897 — Мяжнікі Малыя (10 двароў, 82 жыхары), у Старасельскай воласці. У 1909 — 12 двароў, 78 жыхароў. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце. У 1958 да вёскі далучана в. Сярэдні Мяжнік, якая па рукапісных крыніцах вядома з 1695.

Малы Стары Шклоў. Вядома па рукапісных крыніцах з XIX ст. У 1880 — 37 двароў, 213 жыхароў. З 1924 — у Рыжкавіцкім сельсавеце.

Малыя Аўчыненкі. Па рукапісных крыніцах в. Аўчыненкі вядома з XIX ст. У 1897 — 68 двароў, 478 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 77 двароў, 555 жыхароў, непадалёку сядзіба (1 двор, 3 жыхары). У сярэдзіне 1920-х гг. в. Аўчыненкі падзелена на дзве: Малыя і Вялікія Аўчыненкі.

Малыя Лазіцы. Заснавана ў выніку адгалінавання ад в. Лазіцы, якая ў 1785 налічвала 32 двары, 221 жыхара, была ў складзе маёнтка Галоўчына Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 побач быў фальварак Лазіцы (1 двор, 9 жыхароў) і карчма (1 двор, 11 жыхароў). У 1909 — 70 двароў, 403 жыхары.

Малыя Славені. Заснавана ў 1920-х гг. у выніку падзелу в. Славені на дзве: Вялікія і Малыя Славені.

Малыя Сліжы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У канцы XVIII — пачатку XIX ст. уласнасць графа Агінскага. Гаспадар маёнтка ў 1859 меў тут 348 дзесяцін зямлі і млын. У 1897 — 52 двары, 369 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці. У аднайменным фальварку было 4 двары, 15 жыхароў. У 1909 у вёсцы — 57 двароў, 476 жыхароў, у фальварку — 1 двор, 2 жыхары. У 1961 далучана в. Кулажанка.

Манькава. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1667 — маёнтак Манькашчызна ў Аршанскім павеце. У 1777 — Манькоў у Капыскай акрузе. У 1897 — фальварак (2 двары, 35 жыхароў) у Старасельскай воласці. У 1909 — 2 маёнткі, 2 двары, 25 жыхароў. З 26.04.1919 — у Старасельскай воласці Аршанскага павета Гомельскай, з 18.11.1920 — Віцебскай губерні РСФСР, з 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце.

Махавое. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. У 30-х гг. — пасёлак у Высоцкім сельсавеце.

Мацава. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У канцы XVII ст. знікла. У 1897 — засценак (17 двароў, 97 жыхароў) у Старасельскай воласці. У 1909 — 8 двароў, 70 жыхароў.

Мерч. Вядома па рукапісных крыніцах з 1743 як сяло ў Аршанскім павеце. У 1785 — 27 двароў, 145 жыхароў, у складзе маёнтка Галоўчын Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У 1897 — 65 двароў, 378 жыхароў, у Таўпечынскай воласці Магілёўскага павета. У 1909 — 67 двароў, 398 жыхароў.

Мікалаеўка. Вядома з XIX ст. У 1897 — пасёлак (14 двароў, 86 жыхароў) у Шклоўскай воласці. У 1909 — 16 двароў, 86 жыхароў. Са жніўня 1924 — у Высоцкім сельсавеце. Пасля яго скасавання ў 1960 — у Каменна-Лаўскім сельсавеце.

Мікалаеўка. Вядома з XIX ст. У 1897 — пасёлак (2 двары, 2 жыхары) у Нічыпаравіцкай воласці. З 20.08.1924 — у Нічыпаравіцкім сельсавеце Лупалаўскага р-на Магілёўскай акругі, з 2.03.1931 — у Шклоўскім р-не.

Мікіцінічы. Упершыню ўпамінаецца ў рукапісных крыніцах у 1650, калі была ў Чурылаўскай воласці Капыскага графства Аршанскага павета, належала шляхціцу. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1783 — 46 двароў, 368 жыхароў. Гаспадарская маёнтка ў 1856 меў тут 1201 дзесяціну зямлі. У 1897 — 81 двор, 501 жыхар, у Любініцкай воласці. У 1909 — 91 двор, 629 жыхароў.

Навасёлкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1785 — 51 двор, 440 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 72 двары, 481 жыхар, у Гарадзішчанскай воласці. У 1909 — 83 двары, 587 жыхароў.

Наваселле. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. З 20.08.1924 — у Падгайцаўскім, з 11.03.1960 — у Заходскім сельсавеце.

Нізоўцы. Вядома з XVIII ст. У 1777 — в. Нізоўе ў Капыскай акрузе. У 1785 — 10 двароў, 63 жыхары, належала Шклоўскаму дамініканскаму кляштару езуітаў. У 1897 — 18 двароў, 167 жыхароў, у Старасельскай воласці. У 1909 — 26 двароў, 189 жыхароў. З 20.08.1924 — ва Уланаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Нічыпаравічы. У рукапісных крыніцах упершыню ўпамінаецца як сяло ў Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 — аддана памешчыку. У 1604 — 42 двары, у Даманоўскім войтаўстве, прыпісана да Магілёўскага замка, а потым да Магілёўскай каралеўскай эканоміі. У 1785 — 56 двароў, 298 жыхароў, мелася драўляная царква, у складзе маёнтка Плешчыцы, уласнасць памешчыка. У канцы XVIII ст. — у валоданні графа П. В. Завадоўскага. У 1857 сяло было дзяржаўнай уласнасцю. У 1875 пачала дзейнічаць школа (народнае вучылішча), з канца XIX ст. — царкоўнапрыходская школа. У 1880 дзейнічалі 2 царквы. У 1897 — 37 двароў, 232 жыхары, цэнтр воласці Горацкага павета. Непадалёку быў фальварак (1 двор, 10 жыхароў). У 1909 — 44 двары, 267 жыхароў, у фальварку — 2 двары, 22 жыхары. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Лупалаўскага р-на Магілёўскай акругі, з 3.03.1931 — Шклоўскага р-на. З 1952 — у Фашчаўскім сельсавеце.

Новае Брашчына. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 22 двары, 138 жыхароў. У 1777 — в. Брашчын Новы ў Капыскай акрузе. У 1785 — 29 двароў, 180 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1868 адкрыта школа. У 1897 — 48 двароў, 329 жыхароў, у Старасельскай воласці. У 1909 — 50 двароў, 281 жыхар. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на. З 1954 — ва Уланаўскім, а з 1963 — у Старасельскім сельсавеце.

Новае Вільянава. Заснавана ў пачатку XX ст. У 1909 быў фальварак (1 двор, 1 жыхар) у Гарадзішчанскай воласці.

Новае Высокае. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. З 1960 у Каменна-Лаўскім сельсавеце.

Новая Вадва. Вядома з XIX ст. У 1897 — засценак (21 двор, 146 жыхароў) у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. У 1909 — 23 двары, дзейнічаў млын. Непадалёку быў маёнтак (1 двор, 6 жыхароў).

Новая Лешча. Вядома з пачатку XX ст. У 1909 — хутар (15 двароў, 43 жыхары) у Любініцкай воласці.

Новыя Аўчыненкі. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Новыя Комсенічы. У 1897 — вёска Нова-Комсенічы (яна ж Юзэфава), налічвала 15 двароў, 75 жыхароў, у Таўпечыцкай воласці. У 1909 — 23 двары, 164 жыхары. Са жніўня 1924 — у Старавадвянскім сельсавеце. У 1967 да вёскі далучаны вв. Клімянкі, Латышчына.

Новыя Сліжы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска (4 двары) у Анікаўскім войтаўстве Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — уласнасць памешчыка. У 1897 — 14 двароў, 93 жыхары.

Новыя Стайкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 быў гаспадарскі дом, у Капыскай акрузе. У 1858 — у Горацкім павеце. У 1897 — 45 двароў, 302 жыхары, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 43 двары, 340 жыхароў.

Новыя Чамаданы. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак. З 20.08.1924 у Княжыцкім, з 1960 — Фашчаўскім, з 22.10.1963 — Гарадзецкім сельсавеце.

Ордаць. У рукапісных крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1604 г. як сяло Вордаць у Шклоўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1777 — в. Ардота ў Капыскай акрузе. У 1857 — в. Ордат у Чавускім павеце, уласнасць памешчыка. У 1889 адкрыта школа граматы, якая ў 1909 пераўтворана ў земскую. У 1897 — 136 двароў, 882 жыхары, у Гарадзішчанскай воласці. У 1909 — 159 дамоў, 1050 жыхароў. З 20.08.1924 — у Шклоўскім р-не.

Падгайцы. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1604 як сяло (44 двары) у Плешчыцкім войтаўстве Магілёўскага старасты-эканоміі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства, дзяржаўная ўласнасць. У 1785 — 35 двароў, 221 жыхар, у складзе маёнтка Плешчыцы, уласнасць памешчыка і Аршанскага езуіцкага касцёла. У 1897 — 59 двароў, 332 жыхары, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 59 двароў, 379 жыхароў. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на. У сакавіку 1960 Падгайцаўскі сельсавет скасаваны, і вёска ўвайшла ў Заходскі сельсавет.

Падкняжанне. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст., калі была ў Вышкаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 23 двары, 175 жыхароў, уласнасць С. Р. Зорыча. У 1897 — 43 двары, 303 жыхары, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 53 двары, 372 жыхары. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце Капыскага, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Палыкавічы. Вядома з XVIII ст. як вёска Палукавічы ў Капыскім павеце. У 1783 — 31 двор, 134 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1897 — 35 двароў, 253 жыхары, у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 38 двароў, 267 жыхароў. З 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці, з 20.08.1924 — у Чарнаруцкім сельсавеце.

Панізоўе. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як пасёлак у Зубраўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 25 двароў, 195 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1909 — 5 двароў, 50 жыхароў, у Старасельскай воласці. З 20.08.1924 — ва Уланаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на, з 22.10.1963 — у Старасельскім сельсавеце.

Папоўка. Вядома з XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 12 двароў, 69 жыхароў. У 1785 — уласнасць памешчыка. У 1897 — 3 двары, 35 жыхароў у Старасельскай воласці. У 1909 — 2 двары, 26 жыхароў.

Папоўцы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 10 двароў, 86 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка. У 1897 — 28 двароў, 186 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 32 двары, 246 жыхароў.

Патапава. Упершыню ўпамінаецца ў рукапісных крыніцах з 1604 г. як сяло ў Даманоўскім войтаўстве (51 двор), дзяржаўная ўласнасць. У 1785 — Патапаўка (54 двары, 248 жыхароў), у складзе маёнтка Плешчыцы Магілёўскага павета, уласнасць графа Завадоўскага. У 1897 — 43 двары, 345 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 48 двароў, 369 жыхароў. З 20.08.1924 — у Нічыпаравіцкім сельсавеце Лупалаўскага р-на, з 2.03.1931 — у Шклоўскім р-не. З 1952 — у Фашчаўскім сельсавеце.

Перакоп. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Плешчыцы. У рукапісных крыніцах упершыню ўпамінаецца ў 1522, калі была ў складзе Магілёўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У 1580 — аддана памешчыку. У 1604 — цэнтр войтаўства Магілёўскага старасты-эканоміі, дзяржаўная

ўласнасць. У 1635 в. Плешчыцы (яна ж Левашковічы) налічвала 140 двароў, меліся царква і карчма. У 1792 — 56 двароў, побач знаходзіўся фальварак, 2 вадзяныя млыны, сукнавальня, карчма. У 1785 — цэнтр маёнтка і Плешчыцкага войтаўства, 116 двароў, 780 жыхароў, уласнасць царквы. З канца 1880-х гг. пачала дзейнічаць царкоўнапрыходская школа. У 1897 — 165 двароў, 1077 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 176 двароў, 1209 жыхароў. У час акупацыі заходняй часткі Шклоўшчыны кайзераўскімі войскамі знаходзілася ў прыфрантавой паласе і ўваходзіла ў склад РСФСР. З 20.08.1924 — у Падгайцаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на. У 1967 да вёскі далучаны вв. Ляды, Шкатаўка.

Прасалы. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з іншых вёсак. З 20.08.1924 — ва Уланаўскім сельсавеце.

Прунцаўка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1777 — в. Прунцаўка ў Капыскай акрузе. У 1785 — 24 двары, 158 жыхароў, уласнасць памешчыка. Мелася царква. У 1897 — 28 двароў, 193 жыхары, у Маслакоўскай воласці Горацкага павета. Непадалёку была сядзіба (4 двары, 10 жыхароў). У 1909 — 29 двароў, 209 жыхароў.

Пруды. Па рукапісных крыніцах вядома з XVIII ст., калі былі вв. Пруды (26 двароў, 123 жыхары) і Ніжнія Прудкі (13 двароў, 87 жыхароў) у Магілёўскай акрузе. Уласнасць памешчыка. У фальварку Церахавы Пруды (7 двароў, 64 жыхары) былі вадзяны млын і сукнавальня. У 1808 — у Магілёўскім павеце, уласнасць царквы. У 1897 у в. Ніжнія Прудкі былі 34 двары, 238 жыхароў, 2 млыны, 2 хлебазапасныя магазіны, у в. Церахавы Пруды — 12 двароў, 87 жыхароў, хлебазапасны магазін. Працавалі млын і сукнавальня. У 1909 у Ніжніх Прудках — 32 двары, 246 жыхароў. У Церахавых Прудах — 16 двароў, 125 жыхароў. З 20.08.1924 — у Заходскім сельсавеце Лупалаўскага р-на, з 2.03.1931 — у Шклоўскім р-не.

Путнікі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Сасноўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 25 двароў, 139 жыхароў. У 1781 заснавана суконная мануфактура (існавала да 1809). У 1785 — 30 двароў, 199 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, належала С. Р. Зорычу і С. Ф. Герасімаву. У 1858 — 31 двор, 133 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1897 — 42 двары, 282 жыхары, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У фальварку, што знаходзіўся побач, было 2 двары, 6 жыхароў. З 20.08.1924 — у Гарадзецкім сельсавеце.

Пясчанка. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Рагозна. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1750 — 82 двары, 240 жыхароў, у складзе маёнтка Горкі Аршанскага павета Віцебскага ваяводства. У 1777 — в. Рагозік у Магілёўскай акрузе. У 1858 была 51 рэвізская душа, уласнасць памешчыка. У 1897 — 31 двор, 209 жыхароў, у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 29 двароў, 194 жыхары. З 26.04.1919 — у Чарнаруцкай воласці, з 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці, з 20.08.1924 — у Чарнаруцкім сельсавеце.

Радзішана. Вядома па рукапісных крыніцах з пачатку XVII ст. У 1604 — с. Радзішын у Шклоўскай воласці, шляхецкая ўласнасць. У сярэдзіне XVII ст. — сяло ў Сасноўскім войтаўстве. У 1771 — сяло Вялікае Радзішына (17 двароў, 133 жыхары) і Малое Радзішына (12 двароў, 38 жыхароў). У 1785 — у Капыскім павеце Магілёўскага намесніцтва. У 1858 — у Горацкім павеце, уласнасць памешчыка. Побач быў маёнтак, гаспадар якога ў 1868 меў 217 дзесяцін зямлі. У 1897 — адзін населены пункт (32 двары, 215 жыхароў) у Гарадзішчанскай воласці. У 1909 — 38 двароў, 292 жыхары.

Рамшына. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1743 як сяло ў Аршанскім павеце. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай — у складзе маёнтка Шупень (8 двароў, 56 жыхароў), уладанне памешчыка. Меліся 2 млыны. У 1858 налічвалася 38 рэвізскіх душ, у Магілёўскім павеце. У 1867 памешчык меў 442 дзесяціны зямлі і карчму. У 1897 — с. Рамшын (яно ж Забалоцце) у Чарнаруцкай воласці (27 двароў, 181 жыхар). Непадалёку фальварак (26 жыхароў). У 1909 — 23 двары, 188 жыхароў, у фальварку — 1 двор, 7 жыхароў. З 26.04.1919 — у Чарнаруцкай, з 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці Магілёўскага павета.

Ржаўцы. Па рукапісных крыніцах вядома з XVII ст. У 1650 — сяло (48 двароў) у Чурылаўскай воласці Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 63 двары, 442 жыхары, у Капыскім павеце меўся млын. Уласнасць памешчыка. У 1897 — 103 двары, 693 жыхары, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 120 двароў, 792 жыхары.

Рудзіцы. Па рукапісных крыніцах вядома з 1604 як сяло (36 двароў) у Чамаданаўскім войтаўстве, дзяржаўная ўласнасць. Меўся млын на р. Бася. У 1897 — 65 двароў, 459 жыхароў, у Чэрнеўскай воласці Чавускага павета. У 1909 — 72 двары, 535 жыхароў.

Рудня. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Сасноўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 32 двары, 160 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 45 двароў, 282 жыхары, у Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. У 1909 — 48 двароў, 318 жыхароў.

Рыжкавічы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1643 — 20 двароў з Рыжкавіцкага прадмесця належалі дамініканскаму касцёлу ў Шклове, астатнія былі ў валоданні памешчыка. У 1695 — 107 двароў у Шклоўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. З 1877 працаваў цагельны завод. У 1890 адкрыта школа. У 1897 — прадмесце м. Шклоў (82 двары, 447 жыхароў) у Шклоўскай воласці. У 1909 — 90 двароў, 450 жыхароў.

Рэпалава. Заснавана ў 1920-х гг.

Савелінкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 18 двароў, 132 жыхары, у складзе маёнтка Шклоў, сумеснае валоданне С. Р. Зорыча і С. Ф. Герасімава. У 1897 — 32 двары, 188 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1908 г. адкрыта земская школа. У 1909 — 35 двароў, 233 жыхары. З 20.08.1924 — у Высоцкім сельсавеце.

Сапронькі. Па рукапісных крыніцах вядома з XVII ст. У 1650 — 49 двароў, у Чурылаўскай воласці Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 35 двароў, 244 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 32 двары, 297 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 37 двароў, 284 жыхары.

Сасноўка-1. Заснавана ў пачатку 1920-х гг.

Сасноўка-2. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1695 уваходзіла ў Шклоўскае графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 53 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка, які ў 1867 меў тут 1186 дзесяцін зямлі і карчму. У 1897 побач былі фальварак (3 двары, 26 жыхароў) і сядзіба (3 двары, 27 жыхароў), у Маслакоўскай воласці Горацкага павета. У 1909 — 39 двароў, 285 жыхароў; ва ўрочышчы — 1 двор, 9 жыхароў; на сядзібе — 3 двары, 16 жыхароў.

Саськаўка. Вядома з XVIII ст., налічвала 29 двароў, 206 жыхароў, належала Аршанскай калегіі езуітаў. У 1897 — 39 двароў, 247 жыхароў, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 39 двароў, 285 жыхароў. У 1959 далучана в. Пугачы.

Святлоўка. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Селішча. Вядома з XIX ст. У 1897 — 22 двары, 136 жыхароў, у Таўпечыцкай воласці. На хутары было 2 двары, 15 жыхароў. У 1909 — 29 двароў, 201 жыхар, на сядзібе — 1 двор, 8 жыхароў.

Сарціслаў. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., у першай палове якога з'яўлялася цэнтрам войтаўства ў Шклоўскім графстве. Побач быў фальварак. У 1695 — 16 двароў, у складзе маёнтка Шклоў Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1897 — 40 двароў, 276 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. У 1909 — 47 двароў, 324 жыхары. Дзейнічала земская школа.

Сіняўшчына. Заснаваны пасёлак у 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Сісенева. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Вышкаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 8 двароў, 42 жыхары.

Скубілаўка. Заснавана ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Слабодка. Упамінаецца ў сярэдзіне XVII ст. як вёска ў Вышкаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 21 двор, 116 жыхароў. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай — у Капыскім павеце. У 1785 — 22 двары, 194 жыхары, меліся драўляная царква, млын, пільня. Належала С. Р. Зорычу. У 1897 — 65 двароў, 428 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 68 двароў, 442 жыхары, дзейнічала царкоўнапрыходская школа. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце Капыскага р-на Аршанскай акругі, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Слабодка. Па рукапісных крыніцах вядома з XVIII ст. У 1785 — 15 двароў, 92 жыхары, належала Аршанскаму езуіцкаму кляштару. У 1897 — 36 двароў, 212 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 43 двары, 276 жыхароў. З 20.08.1924 — у Княжыцкім, з 22.10.1963 — у Гарадзецкім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Слаўгарадскі. Пасёлак заснаваны ў 1991 перасяленцамі-чарнобыльцамі са Слаўгарадскага р-на.

Сліжы. Упершыню ў рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1651 г. як сяло Новыя Сліжы. У 1785 — у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 15 двароў, 96 жыхароў, на сядзібе — 3 двары, 13 жыхароў. У 1909 — 14 двароў, 150 жыхароў, мелася царкоўнапрыходская школа. З 1925 да 16.07.1954 — цэнтр сельсавета.

Смальянцы. Упершыню ўпамінаецца пад 1606 пры абмежаванні ўладанняў Старасельскага касцёла. У 1777 — вёска ў Капыскай акрузе. У 1782 — уладанне князёў Агінскіх. У 1897 — 45 двароў, 283 жыхары, у Старасельскай воласці. Побач хутар (1 двор, 3 жыхары). У 1909 — 47 двароў, 259 жыхароў.

Смятанічы. Вядома па рукапісных крыніцах, калі вёска была падаравана Галоўчынскаму касцёлу. У 1743 — сяло ў Аршанскім павеце, у 1777 — у Магілёўскай акрузе. У 1785 — 37 двароў, 230 жыхароў. У складзе маёнтка Галоўчына, уласнасць памешчыка. Меўся млын. У 1840 памешчык валодаў у вв. Смятанічы і Гаваяды 1186 дзесяцінамі зямлі, 3 карчмамі. У 1869 заснавана ганчарна-кафельнае прадпрыемства (50 рабочых). У 1897 — 66 двароў, 356 жыхароў, у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. Меліся кузня, школа граматы, 2 хлебазапасныя магазіны, пастаялы двор. У фальварку, які знаходзіўся непадалёку, было 23 жыхары. У 1904 адкрыта земская школа. У 1909 — 70 двароў, 457 жыхароў, на хутары — 4 двары, 25 жыхароў. У 1967 далучаны вв. Засценак, Зялёная Рошча, Краснаярск, Падчэрны.

Стараселле. У рукапісных крыніцах упамінаецца ў 1650. Сяло (34 двары) уваходзіла ў Чурылаўскую воласць Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1670 — у Гарадзецкім войтаўстве. У 1785 — 33 двары, 244 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1864 адкрыта школа. У 1897 — 59 двароў, 379 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 67 дамоў, 481 жыхар.

Стараселле. Па рукапісных крыніцах вядома з 1557, калі тут пачалася валочная памера. У 1561 — мястэчка, цэнтр маёнтка, належала Сапегам. У 1656 Казімір Сапега аддаў мястэчка сваёй пляменніцы Нерушэвіч, ад якой яно перайшло да пратэстанцкай царквы. У час рускапольскай вайны 1654—1667 — разбурана. У Айчынную вайну 1812 М. І. Кутузаў (13.11) знаходзіўся тут са сваёй кватэрай. У XIX ст. — у Аршанскім павеце. У 1827 — 526 жыхароў, у Капыскім пав-

це. У 1862 адкрыта школа. У 1897 — мястэчка (143 двары, 926 жыхароў), цэнтр воласці Аршанскага павета. У 1905 адкрыта пантовае аддзяленне. З 26.04.1919 — у Гомельскай, з 18.11.1920 — у Віцебскай губерні РСФСР, з 20.03.1924 — у Капыскім р-не (да 26.07.1930), з 8.07.1931 — у Талачынскім, з 5.12.1931 — у Шклоўскім р-не.

Старая Вадва. Вядома па рукапісных крыніцах з 1561 як в. Вадва, шляхецкая ўласнасць. У 1567 — цэнтр маёнтка. У 1785 — 68 двароў, 334 жыхары, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. Меліся мураваная царква, драўляны гаспадарскі дом, 2 вадзяныя млыны, вінакурня. У 1842 памешчык меў 1175 дзесяцін зямлі. У 1897 — 60 двароў, 380 жыхароў, у Таўпечыцкай воласці Магілёўскага павета. Меліся 2 фальваркі (2 двары, 25 жыхароў), адзін з якіх быў названы Вадва-Юзэфаўка. Непадалёку быў хутар (2 двары, 15 жыхароў). У 1900 пачала дзейнічаць царкоўнапрыходская школа. У 1909 — 82 двары, 472 жыхары. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на. У 1967 да вёскі далучана в. Лотва-Вадва.

Старое Брашчына. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. у Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства. У першай палове XVII ст. быў фальварак, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 16 двароў, 101 жыхар, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 10 двароў, 103 жыхары, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — засценак Стара-Брашчына (11 двароў, 105 жыхароў).

Старое Высокае. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., цэнтр войтаўства. У 1785 — 26 двароў, 166 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка. У канцы XVIII ст. — 8 двароў, 81 жыхар, сумеснае ўладанне С. Р. Зорыча і С. Ф. Герасімава. У 1858 — 38 рэвізскіх душ, у Магілёўскім павеце, дзейнічала царкоўнапрыходская школа. У 1880 меліся вадзяны млын, карчма, царква. У 1897 — 24 двары, 160 жыхароў, у Шклоўскай воласці. Непадалёку была сядзіба (1 двор, 6 жыхароў). У 1909 — 29 двароў, 185 жыхароў, у сядзібе — 2 двары, 5 жыхароў. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета.

Старыя Стайкі. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Гарадзецкім войтаўстве Капыскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 33 двары, 247 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка.

Старыя Чамаданы. Упамінаецца ў рукапісных крыніцах з 1560 як сяло ў Магілёўскай воласці, дзяржаўная ўласнасць. У 1580 аддана ва ўладанне памешчыку. У 1604 — 69 двароў, цэнтр войтаўства, дзяржаўная ўласнасць. У 1612 да сяла было прыпісана 70 валок ворыўнай зямлі, аддана каралём Сігізмундам Аршанскай езуіцкай калегіі. У 1785 — 62 двары, 463 жыхары, у Капыскім павеце. З 20-х гг. XIX ст. — ва ўладанні дзяржавы. У 1897 — 126 двароў, 867 жыхароў, у Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. У 1908 адкрыта земская школа. У 1909 — 133 двары, 982 жыхары. З 20.08.1924 — у Фашчаўскім сельсавеце.

Ступляны. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. У 1695 — 12 двароў, у Чарнаруцкім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 14 двароў, 133 жыхары, уласнасць С. Р. Зорыча і С. Ф. Герасімава. У 1897 — 40 двароў, 256 жыхароў, у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 44 двары, 297 жыхароў. З 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці Магілёўскага павета, з 3.03.1924 — у Шклоўскім р-не.

Таўкачы. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст., вёска ў Чарнаруцкім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1771 — 30 двароў, 166 жыхароў. У 1777 — у Магілёўскай акрузе. У 1785 — 38 двароў, 296 жыхароў, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка. У 1897 — 54 двары, 394 жыхары, у Чарнаруцкай воласці. У 1909 — 58 двароў, 403 жыхары. У 1912 адкрыта земская школа.

Тройца. Па рукапісных крыніцах вядома з XVII ст., у Чырчынскім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1606 — фальварак Тройцкі, аддадзены каралеўскім прывілеем Старасельскаму касцёлу Аршанскага павета «з гумном, ворывам, агародамі, з млынам і ставам на р. Бярозаўка і сёламі Гарадок і Варонкі». У 1777 — вёска і гаспадарскі дом, у Капыскай акрузе. У 1785 — 21 двор, 257 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 13 двароў, 87 жыхароў, у Старасельскай воласці. Побач быў засценак (1 двор, 15 жыхароў). У 1909 — 20 двароў, 96 жыхароў. З 26.04.1919 — у Гомельскай, з 18.11.1920 — у Віцебскай губерні, з 20.08.1924 — у Шклоўскім р-не. З 1963 — у Старасельскім сельсавеце.

Тросенка. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Тросна. Вядома па рукапісных крыніцах з 1777. У 1785 — 21 двор, 257 жыхароў, у Магілёўскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1858 — цэнтр маёнтка. У 1897 — 21 двор, 149 жыхароў, у Старасельскай воласці. Побач быў хутар Тросна (ён жа Мураванка) — 3 двары, 10 жыхароў, дзейнічаў вадзяны млын. У 1909 — 22 двары, 172 жыхары, на хутары — 1 двор, 2 жыхары.

Трылесіна. Вядома з XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1777 — у Капыскай акрузе. У 1785 — 15 двароў, 78 жыхароў, уласнасць памешчыка. У 1897 — 15 двароў, 109 жыхароў, у Старасельскай воласці. У 1909 — 12 двароў, 118 жыхароў.

Трэбушкі. Вядома з XVII ст. як вёска Трыбухі ў Высокаўскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1695 — 8 двароў, у 1780 — 10 двароў, 34 жыхары, у Магілёўскім павеце, сумеснае валоданне С. Зорыча і С. Герасімава. У 1897 — 18 двароў, 105 жыхароў, у Шклоўскай воласці. У 1909 — 17 двароў, 111 жыхароў. З 20.08.1924 — у Высоцкім, з 1960 — у Каменна-Лаўскім сельсавеце.

Тударава. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Чарнаруцкім войтаўстве, шляхецкая ўласнасць. У 1783 — 43 двары, 341 жыхар, у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць С. Зорыча і С. Герасімава. У 1880 адкрыта школа. У 1909 — 81 двор, 571 жыхар, у Чарнаруцкай воласці. З 26.04.1919 — у Чарнаруцкай, з 9.05.1923 — у Шклоўскай воласці.

Фашчаўка (яна ж Хвашчаўка, Блеўкі). Упамінаецца ў рукапісных крыніцах у пачатку XVII ст. У 1612 з'яўлялася фундушам караля Сігізмунда III Аршанскай езуіцкай калегіі. У 60-х гг. XVII ст. князь Чартарыйскі заснаваў тут касцёл і місію езуітаў. У 1772 — у Аршанскім павеце. У 1785 — 35 двароў, 271 жыхар, цэнтр маёнтка Магілёўскага намесніцтва, меліся мураваны касцёл, 2 млыны. Штогод, у пачатку ліпеня, адбываліся двухдзённыя кірмашы, на якія з'язджаліся гандляры з Магілёва, Шклова, Чавус, сяляне з навакольных вёсак. Дзейнічала 28 лавак. Ва ўладанні езуітаў была да пачатку 60-х гг. XIX ст., а потым дзяржаўным уладаннем, здавалася ў арэнду. У 1848 — 133 двары, у Магілёўскім павеце. У 1897 адкрыта школа (народнае вучылішча). У 1907 — 71 двор, 471 жыхар, у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 85 двароў, 412 жыхароў. З 20.08.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на.

Хадулы. Упамінаецца ў рукапісных крыніцах пад 1560. У 1604 — сяло Хадулавічы ў Плешчыцкім войтаўстве, належала Аршанскаму касцёлу. У 1695 — у Шклоўскім графстве, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 17 двароў, 136 жыхароў, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — 37 двароў, 248 жыхароў, у Любініцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 56 двароў, 266 жыхароў.

Хацькова. Вядома па рукапісных крыніцах як сяло Ходкава ў складзе маёнтка Дудаковічы, шляхецкая ўласнасць. У 1667 — у Аршанскім павеце. У 1777 — сяло Хацкава ў Капыскай акрузе. У 1797 — валоданне Шклоўскага кляштара. У 1857 — у Магілёўскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. У 1897 — 20 двароў, 138 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета.

Хілец. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Вышкаўскім войтаўстве Віцебскага ваяводства. У 1897 — 43 двары, 206 жыхароў, у Старасельскай воласці Аршанскага павета. У 1909 — 39 двароў, 268 жыхароў. З 20.08.1924 — у Александрыйскім сельсавеце Капыскага, з 8.07.1931 — Шклоўскага р-на.

Хоцімка. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вёска ў Барыскавіцкім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1897 — 14 двароў, 96 жыхароў, у Магілёўскім павеце. У 1909 — 117 жыхароў. Са жніўня 1925 — у Рыжкавіцкім сельсавеце.

Царковішча. Вядома па рукапісных крыніцах з XVIII ст. У 1785 — 15 двароў, 64 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1795 — 13 двароў, 87 жыхароў. У 1897 в. Царковішча (яна ж Чудзенка) налічвала 10 двароў, 63 жыхары, у Гарадзішчанскай воласці. У 1909 — 16 двароў, 96 жыхароў.

Царковішча. Вядома па рукапісных крыніцах з 1777. У 1785 — 20 двароў, 132 жыхары, у складзе маёнтка Барсукі Магілёўскага павета. У 1857 — дзяржаўная ўласнасць. У 1817 — 36 двароў, 255 жыхароў, у Палыкаўскай воласці. У 1909 — 52 двары, 280 жыхароў. Непадалёку сядзіба (1 двор, 3 жыхары). У 1910 адкрыта земская школа. З 20.08.1924 у Каменна-Лаўскім сельсавеце Шклоўскага р-на.

Цвыркава. У 1669 — сяло Цвіркаў, уласнасць Кіева-Пячорскага манастыра. У 1777 — у Магілёўскай акрузе. У 1785 — с. Свіркава (28 двароў, 176 жыхароў), у складзе маёнтка Барсукі. У 1857 — у Магілёўскім павеце, дзяржаўная ўласнасць. У 1897 — 30 двароў, 202 жыхары, у Таўпечыцкай воласці. У 1909 — 35 двароў, 227 жыхароў. З 1960 — у Каменна-Лаўскім сельсавеце.

Цішоўка. Пасёлак заснаваны ў 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Чарапы. У рукапісных крыніцах упамінаецца пад 1604 як сяло (50 двароў) у Даманоўскім войтаўстве, дзяржаўная ўласнасць. У 1635 — 66 двароў. У 1785 — 58 двароў, 358 жыхароў, у складзе маёнтка Плешчыцы Магілёўскага павета, уласнасць памешчыка. У канцы XVIII ст. — ва ўладанні графа П. Завадоўскага. У 1897 — у Нічыпаравіцкай воласці Горацкага павета. У 1909 — 46 двароў, 355 жыхароў. У 1911 адкрыта школа. З красавіка 1919 — у Гомельскай губерні, з 20.08.1924 — у Нічыпаравіцкім сельсавеце Лупалаўскага р-на, з 2.03.1931 — у Шклоўскім р-не. З 1952 — у Фашчаўскім сельсавеце.

Чарнаручча. Па рукапісных крыніцах вядома з XVII ст., калі тут былі два пасяленні: Чарнаручча Старое і Чарнаручча Новае, цэнтр войтаўства Шклоўскага графства Аршанскага павета, шляхецкая ўласнасць. У 1771 Чарнаручча Старое налічвала 23 двары, 144 жыхары, Чарнаручча Новае — 8 двароў, 44 жыхары. Пасля падзелу Рэчы Паспалітай — у Магілёўскім павеце, належалі С. Р. Зорычу і С. Ф. Герасімаву. З 1861 — цэнтр воласці Магілёўскага павета. У 1872 значная частка вясковых зямель належала адстаўному генералу А. Ігнаціусу. Яму належалі таксама вадзяны млын, карчма, вялікі сад. З 1880 працавала бальніца. У 1886 меліся 2 царкоўнапрыходскія школы. У 1892 збудавана вінакурня. У 1897 — с. Чарнаручча (яно ж Навасёлкі), 40 двароў, 254 жыхары. Непадалёку быў фальварак (64 жыхары, вінакурня, млын). У 1909 у вёсцы — 37 двароў, 246 жыхароў, у маёнтку — 27 жыхароў. У кастрычніку 1917 вяскоўцы разграмілі маёнтак, памешчыцкую зямлю падзялілі. У 1918 аднавіў дзейнасць спажывецкі кааператыў, заснаваны ў 1915. З 20.09.1924 — цэнтр сельсавета Шклоўскага р-на.

Чырвонае. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Чырвоная Горка. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі.

Чырвоны Прамень. Заснавана ў 1933 г., калі было закончана будаўніцтва Лотвянскага цагельнага завода.

Чырчына. Вядома па рукапісных крыніцах з XVII ст. як вв. Чырчык Стары і Чырчык Новы,

цэнтр войтаўства Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1777 — с. Чырчын у Капыскай акрузе. У 1785 — 9 двароў, 82 жыхары, уласнасць памешчыка. У 1909 побач быў маёнтак.

Шастакі. У 1604 упамінаецца як сяло (32 двары) у Чамаданаўскім войтаўстве, дзяржаўная ўласнасць. У 1616 упамінаецца ў інвентары Магілёўскай воласці. У 1742 — 28 двароў, 266 жыхароў, памешчыцкае ўладанне. У канцы XVIII ст. належала Магілёўскаму казённаму ведамству і знаходзілася ў пажыццёвым карыстанні шляхціца. У 1897 — 41 двор, 241 жыхар, у Гарадзішчанскай воласці Горацкага павета. Непадалёку быў хутар (2 двары, 19 жыхароў) і ўрочышча (1 двор, 2 жыхары). У 1909 — 48 двароў, 361 жыхар.

Шнараўка. У 1785 — в. Вашнараўка (10 двароў, 83 жыхары), у складзе маёнтка Шклоў, уласнасць памешчыка, які ў 1860 меў тут 1986 дзесяцін зямлі, 3 карчмы. У 1897 — пас. Шнараўка (ён жа Багданаўка) і аднайменная ўладальніцкая сядзіба (22 жыхары). У 1909 — 10 двароў, 59 жыхароў, у фальварку — 1 двор, 4 жыхары, у засценку Малая Шнараўка — 2 двары, 14 жыхароў і на хутары — 1 двор, 5 жыхароў.

Шчацінка. Упамінаецца ў сярэдзіне XVII ст. як вёска ў Чырчынскім войтаўстве Шклоўскага графства, шляхецкая ўласнасць. У 1785 — 2 двары, 24 жыхары, у Капыскім павеце, уласнасць памешчыка. У 1897 — фальварак (8 двароў, 60 жыхароў) у Старасельскай воласці Аршанскага павета. Побач быў засценак Новая Шчацінка (ён жа Рагожанка), 13 двароў, 90 жыхароў.

Ябланава. Заснавана ў пачатку 1920-х гг. перасяленцамі з суседніх вёсак.

Матэрыял падрыхтаваны аддзелам архітэктуры Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору НАН Беларусі пад рэдакцыяй члена-карэспандэнта НАН Беларусі *С. В. Марцэлева.*

Населеныя пункты Шклоўскага раёна (па стану на 1.01.1997 г.)

Горад Шклоў (14 700 жыхароў).

Александрыйскі сельсавет: вёскі Александрыя (175—344)[1], Багушоўка (26—45), Вышкава (38—53), Вялікае Замошша (7—8), Вялікі Мяжнік (91—278), Герасімоўшчына (22—25), Капысіца (59—94), Карзуны (22—31), Малое Замошша (46—90), Малы Мяжнік (42—62), Манькава (17—27), Нізоўцы (34—58), Падкняжанне (44—71), Прасалы (34—58), Слабодка (72—152), Тросенка (23—36), Хілец (39—62), Ферма*, пас. Копысь (21—38).

Ардацкі сельсавет: вёскі Вішанька (3—4), Грамакі (33—52), Дзіўнава (102—167), Новае Вільянава (27—47), Новае і Старое Займішча (32—50), Ладыжына (15—18), Ордаць (281—682), Радзішана (54—80), Рудзіцы (87—150), Шастакі (35—47).

Гарадзецкі сельсавет: вёскі Аўгустоў (34—57), Башкіраўка (18—35), Вялікае і Малое Зарэчча (93—465), Гарадзец (183—470), Гарадок (22—27), Заходы (89—160), Княжыцы (92—157), Крывель (97—175), Новыя Чамаданы (45—77), Путнікі (72—149), Слабодка (72—152), Хадулы (56—93).

Гарадзішчанскі сельсавет: вёскі Акунёўка (184—357), Благаўка (87—149), Вялікія Сліжы (61—114), Гарадзішча (310—1018), Карасі (34—62), Літвінавічы, Лысая Гара (3—6), Маісеенкі (7—11), Малыя Сліжы (24—52), Навасёлкі (82—174), Новыя Сліжы (6—12), Рудня (24—46), Русакі*, Сарціслаў (32—49), Сліжы (6—10), Старое Вільянава*, Царковішча (68—136).

Заходскі сельсавет: вёскі Азер'е (56—109), Астравец (5—7), Бель (75—137), Еўдакімавічы (179—459), Заходы (59—120), Лакуці (112—253), Мікалаеўка (39—64), Навасёлле (21—33), Падгайцы (23—39), Плешчыцы (177—344), Пруды (36—66).

Каменна-Лаўскі сельсавет: вёскі Аўрамаўка (2—3), Барсукі (95—193), Бушлякі (84—189), Васільеўка*, Вялікая Камароўка (73—205), Вялікая Мухаманаўшчына (7—16), Вялікі Міхайлоў (30—63), Дабрэйка (130—349), Зашчыта (10—13), Каменныя Лавы (99—232), Літоўск (40—131), Лотва (32—62), Маісеенкі (7—11), Малая Камароўка (17—33), Малы Міхайлоў (19—32), Махавое (19—36), Мікалаеўка (9—15), Новае Высокае (17—23), Новая Вадва (3—9), Новыя Комсенічы (29—49), Савелінкі (52—109), Сіняўшчына (2—3), Старое Высокае (29—53), Старая Вадва (108—447), Трэбушкі (21—44), Царковішча (68—136), Цвыркава (76—140), пасёлкі Лотва (96—224), Чырвоны Прамень (55—125).

Рыжкавіцкі сельсавет: вёскі Аляксандраўка (19—35), Апалонаўка (24—37), Аўчыненкі (18—33), Брус (5—15), Бяланава (14—29), Вялікае Чорнае (98—199), Вялікі Стары Шклоў (79—154), Вялікія Аўчыненкі (69—141), Ганцавічы (14—20), Гарадзянка (36—66), Данькавічы (104—217), Дзяжкі (7—19), Загор'е (61—102), Зароўцы (133—238), Засценкі (9—10), Зямцы (46—92), Іскра*, Краснае (?), Лопавічы (10—18), Лутна*, Малое Чорнае (72—196), Малы Стары Шклоў (70—190), Малыя Аўчыненкі (52—132), Новыя Аўчыненкі (6—9), Папоўцы (38—48), Рыжкавічы (427—1122), Рэпалава (22—34), Тросна*, Хоцімка (22—42), Шнараўка (27—56), Чырвонае*, Яблянава (10—13).

Старасельскі сельсавет: вёскі Баркі-1 (66—156), Баркі-2 (20—25), Баркі-3*, Баркі-4*, Бяразаўка (2—4), Варопанка (5—8), Вялікае Уланава (114—306), Вялікая Лотва (41—61), Гаваракі (18—30), Гарадок (20—29), Гаршкова*, Горка (2—2), Гвалтоўнік (9—16), Дуброва (14—18), Дымава (12—19), Забор'е (8—17), Калінаўка (39—84), Каменка (41—63), Клін (16—29), Лідзіна (3—4), Лутна (6—8), Малое Уланава (39—68), Малая Лотва (31—48), Мацава (8—12), Новае Брашчына (46—106), Папоўка (5—9), Пясчанка (22—46), Сісенева (20—42), Смальянцы (61—139), Старасельле (209—501), Старое Брашчына (19—35), Тройца (53—140), Тросна (35—60), Трылесіна (6—12), Хацькова (32—58), Чырчына (40—86), Шахава*, Шчацінка (18—50).

Славенскі сельсавет: вёскі Валосавічы (43—87), Вялікія Славені (86—175), Забродзе (154—325), Залешча*, Зароўе*, Заполле (54—84), Каменка (36—80), Клін (16—29), Кучарына (64—170), Лешча (22—39), Любінічы (164—461), Малая Сасноўка (26—35), Малыя Славені (223—765), Мікіцінічы (85—147), Новая Лешча (22—34), Новыя Стайкі (20—61), Пронцаўка (39—61), Ржаўцы (106—224), Сапронькі (46—67), Сасноўка (29—45), Старасельле (122—216), Старыя Стайкі (80—191).

Таўкачоўскі сельсавет: вёскі Акцябр*, Барыскавічы (28—40), Вялікія Лазіцы (69—151), Гаваяды (64—158), Дубраўка (43—65), Зацішша (20—32), Ляхаўка (5—10), Малыя Лазіцы (69—123), Малыя Смятанічы (30—39), Мерч (39—53), Мілёры*, Перакоп (8—8), Селішча*, Скубілаўка (5—7), Смятанічы (9—15), Таўкачы (57—160), пасёлак Слаўгарадскі (85—217).

Фашчаўскі сельсавет: вёскі Дубраўка (113—191), Дубраўка-2 (37—51), Завараты (27—80), Нічыпаравічы (64—110), Патапава (76—105), Сасноўка (29—45), Святлоўка*, Фашчаўка (309—692), Чамаданы (126—225), Чарапы (78—128).

Чарнаруцкі сельсавет: вёскі Бабічы (24—34), Бабчына (9—16), Карбатоўка (112—220), Кліматічы (84—250), Рубеж*, Палыкавічы (27—47), Рагозна (29—56), Рамшына (47—93), Ступляны (54—96), Тударава (112—280), Чарнаручча (130—343), Чырвоная Горка (22—49).

Падрыхтаваў *Л. Анціпенка*

[1] У дужках першая лічба — колькасць двароў, другая — колькасць жыхароў. Звесткі на 1997 год.

* Зорачкай (*) пазначаны населеныя пункты, якія перасталі існаваць у сувязі з узбуйненнем, не аднавіліся пасля вайны і па іншых прычынах.

Рэха Чарнобыля

На сваіх і чужых не дзелім

...Бясспрэчна, як старшыня сельскага Савета я не магла раней дапусціць, што разам са звыклымі справамі давядзецца вырашаць і чарнобыльскія. Як вядома, Шклоўшчына не падверглася забруджванню радыенуклідамі пасля аварыі на ЧАЭС. А вось шэраг паўднёва-ўсходніх раёнаў Магілёўскай вобласці гэтая бяда не абмінула, у тым ліку і Слаўгарадскі р-н. Таму далейшае жыццё ў многіх вёсках Слаўгарадчыны стала небяспечнае. Пацярпелым на выбар прапаноўваліся чыстыя раёны. Менавіта такі чысты куточак аблюбавалі на Шклоўшчыне жыхары вёскі Кулікоўка Слаўгарадскага р-на — на тэрыторыі нашага сельсавета. Кулікоўцы спынілі свой выбар на Гавядах. Першымі сюды прыехалі кулікоўскія мужчыны, чалавек дзесяць, якія старанна ўзяліся за стварэнне адпаведнай базы для сваіх землякоў. Першачаргова паклапаціліся пра часовае жыллё. Жылі разам сем'ямі, пакуль будаўнікі не завяршылі цагляныя катэджы. Некаторым слаўгарадскім сем'ям калгас «Расвет» выдзеліў часова кватэры.

Сельскі Савет па іх просьбе надзяліў прысядзібнымі ўчасткамі для вырошчвання агародніны, бульбы і збожжавых. Мы разумелі, што кулікоўцы — людзі вясковыя і жыць без карміцелькі-зямлі ім нельга.

Размеркаванне жылля для перасяленцаў таксама не абыходзіцца без мясцовай улады. Гэтая работа не заключаецца толькі ў тым, каб выпісаць ордэр, хаця за апошнія два гады асабіста мне прыйшлося запоўніць каля сотні такіх ордэраў. За кожнай паперкай у маёй памяці назаўсёды застаўся лёс канкрэтнага чалавека, якому цяжка было развітацца з ранейшай мясцінай — радзімай, каб пераехаць да нас, у Гавяды. Увачавідкі паўстаюць зламаныя іх лёсы. Як бы разам дзелім іхнюю бяду, іхні сум па радзіме.

Але не толькі на жыллёвых момантах, што датычацца чарнобыльскіх праблем і пытанняў, замыкаецца сфера дзеянняў сельскага Савета. Зразумела, у новым пасёлку, які вырас побач з Гавядамі, акрамя маладых сем'яў, жывуць і састарэлыя людзі. Некаторым з іх патрэбны догляд і дапамога. Такіх людзей шмат ёсць і ў нашых вёсках. Як сваіх, так і пераселеных старых мы не пакідаем без увагі. Пры магчымасці выдзяляем сродкі. Рамантуем дахі, печы. Такую дапамогу сельскі Савет аказаў нядаўна інваліду Вялікай Айчыннай вайны Аляксандру Іванавічу Шарамкову, сёстрам Софіі Васільеўне і Вользе Васільеўне Лапарэнкам.

Вядома, старыя адзінокія людзі, якія пераехалі з забруджанай зоны, жывуць у нядаўна пабудаваных, добраўпарадкаваных кватэрах, але яны патрабуюць догляду. На просьбе сельскага Савета большасць сусядзяў аказвае ім дапамогу.

Н. Андрэйчыкава

Афганскае водгулле

Боль бацькоў ніколі не сунімць

Мінула колькі гадоў з часу вываду савецкіх войск з Афганістана. У беларусаў, былых грамадзян ранейшага Саюза, неадназначныя адносіны да той замежнай вайны. Але ў адным, бадай, павінны ўсе мы быць аднадушнымі — у вялікай павазе да памяці загінуўшых воінаў, у нязменным спачуванні да іх няўцешных бацькоў. Менавіта на гэтым быў зроблены акцэнт у нашай гутарцы са старшынёй раённага аб'яднання воінаў-інтэрнацыяналістаў «Памяць» Сяргеем Мініным.

— Нядаўна ў Маскве Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка яшчэ раз на міжнародным узроўні падцвердзіў, што

Г. А. Бабейкін

У. М. Ільюшэнка

А. Ф. Салапаеў

нашы салдаты не будуць служыць і ваяваць на чужой зямлі.

— Так, мы не хочам ваяваць, але той, хто лічыць сябе сапраўдным мужчынам, павінен ведаць гэтую навуку і быць гатовы бараніць Айчыну. Менавіта ваенна-патрыятычнае выхаванне моладзі з'яўляецца адной з асноўных задач нашага аб'яднання «Памяць», членамі якога праводзіліся ўрокі мужнасці ў шклоўскіх школах, дарэчы, і цяпер праходзяць у іх Дні памяці загінуўшых воінаў-афганцаў.

— Сяргей, давай яшчэ раз пайменна ўспомнім салдат са Шклоўшчыны, якіх забрала вайна ў Афганістане.

— Паспеўшы толькі атрымаць медаль «За адвагу», загінуў на той вайне і знайшоў апошні прытулак на Рыжкавіцкіх могілках шкловец, былы выпускнік СШ № 4 **Генадзь Бабейкін.** Дарэчы, пакуль толькі ў гэтай школе ёсць у музеі куток загінуўшага воіна-афганца. Родам з вёскі Аўчыненкі, закончыў у свой час Чарнянскую СШ, атрымаўшы ордэн Чырвонай Зоркі, у труне вярнуўся з Афгана **Уладзімір Ільюшэнка.** Узнагароджаны такім жа ордэнам, загінуў на афганскай зямлі і ўраджэнец вёскі Дзіўнава, былы выпускнік Ардацкай сярэдняй школы **Алег Салапаеў.** Шануючы памяць гэтых салдат, наведвалі іх сем'і, адзначалі разам Дзень памяці загінуўшых воінаў-афганцаў у ранейшыя гады. Усклалі кветкі і на магілу ў вёсцы Вышкава афіцэра запаса **Уладзіміра Скарабагатава,** які памёр ад хваробы, падчас афганскай вайны.

...Мы памятаем і заўсёды нізка кланяемся бацькам Генадзя Бабейкіна — Раісе Андрэеўне і Анатолію Міхайлавічу, Уладзіміра Ільюшэнкі — Іраідзе Андрэеўне і Міхаілу Сцяпанавічу, Алега Салапаева — Фёдару Савельевічу (маці памерла ўжо) і Уладзіміра Скарабагатава — Танне Адамаўне і Уладзіміру Ільічу... І хоць дзяржава праяўляе клопат пра гэтыя сем'і, але, зразумела, усім гэтым не заменіш і не вернеш загінуўшых сыноў. Яны будуць жыць у нашай памяці!

У. Паўлаў

«Ударны фронт». 1996. 14 лютага.

ШКЛОЎСКІ РАЁН

БІБЛІЯГРАФІЯ

Александров А. А. Княгиня Ольга: Летопись, археология, топонимика. Псков, 1987. С. 90–93.

Алексеев Л. В. Полоцкая земля: Очерки истории Северной Белоруссии в IX–XIII вв. М., 1966.

Алексеев Л. В. Смоленская земля в IX–XIII вв.: Очерки истории Смоленщины и Восточной Белоруссии. М., 1980.

Антипов В. Г. Парки Белоруссии. Мн., 1975. С. 100–101.

Артеменко И. И. Племена Верхнего и Среднего Поднепровья в эпоху бронзы. М., 1967.

Археалогія і нумізматыка Беларусі: Энцыкл. Мн., 1994.

Баркулабаўскі летапіс // Помнікі старажытнай беларускай пісьменнасці. Мн., 1975. С. 116–117.

Барышев Г. И. Театральная культура Белоруссии XVIII в. Мн., 1992. С. 213–218; 245–246.

Без-Карнилович М. Исторические сведения о примечательнейших местах Белоруссии. Спб., 1855. С. 17–18.

Беларуская савецкая энцыклапедыя: У 12 т. Т. 11. Мн., 1974. С. 207.

Белорусская ССР. Краткая энциклопедия: В 5 т. Т. 5. Мн., 1981. С. 430.

Беларусь у Вялікай Айчыннай вайне. 1941–1945. Мн., 1990.

Белорусские древности. Мн., 1957.

Белоруссия в эпоху феодализма: Сб. док.: В 3 т. Т. 1. Мн., 1959. С. 23–28; Т. 2, 1960. С. 262, 371–372; Т. 3, 1961. С. 100–101.

Белоруссия в эпоху капитализма: Сб. док.: В 3 т. Т. 1. Мн., 1983. С. 23–24; Т. 2, 1990. С. 179–180.

Белоруссия в борьбе против польских захватчиков в 1919–1920 гг. Мн., 1940.

Билецкий А. Описание Любинического прихода Горецкого уезда. Могилев, 1899.

Бич О. М. Рабочее движение в Белоруссии в 1861–1909 гг. Мн., 1983. С. 275–277.

Болбас М. Ф. Развитие промышленности в Белоруссии. 1795–1861. Мн., 1966.

Болбас М. Ф. Промышленность Белоруссии. 1860–1900. Мн., 1978.

Борьба за Советскую власть в Белоруссии. 1918–1920: Сб. док.: В 2 т. Т. 1. Мн., 1960. С. 63, 171, 281–283.

Булкин В. А. Некоторые данные об исторической географии Центральной Белоруссии (Древнерусское государство и славяне). Мн., 1983.

Бычкоў А. Нарыс з гісторыі Магілёўшчыны. Мн., 1927.

Вапановіч Я. Н. Слоўнік назваў населеных пунктаў Магілёўскай вобласці. Мн., 1983.

Вела нас партия. Мн., 1984. С. 351–360.

Великая Октябрьская социалистическая революция в Белоруссии. Т. 2. Мн., 1957. С. 816.

Великая Отечественная война. 1941–1945. 2-е изд. М., 1973.

Верещагин П. Д. Из истории переселения крестьян Могилевской губернии на окраины России в конце XIX – начале XX в. // Уч. зап. М., 1956. Вып. 3.

Военно-статистическое обозрение Российской империи. Т. 8, ч. 3. Могилевская губерния. СПб., 1898.

Волости и важнейшие селения Европейской России. Вып. 5. Губернии Литовской и Белорусской областей. СПб., 1886.

Восстание в Литве и Белоруссии. 1863–1864. М., 1965. С. 485.

В памяти народной. М., 1969.

Всенародная борьба в Белоруссии против немецко-фашистских захватчиков: В 3 т. Мн., 1983–1985.

Выржыкоўскі А. А. Вывучэнне курганоў ля в. Капысіца Шклоўскага раёна // Беларускія старажытнасці. Мн., 1972.

Гарады і гарадскія пасёлкі Беларусі. Мн., 1981.

Географическо-статистический словарь Российской империи / Сост. П. Семёнов. СПб., 1865.

Герои Советского Союза – могилевчане. Мн., 1985.

Гісторыя Беларускай ССР: В 5 т. Т. 1. Мн., 1972; Т. 2, 1972; Т. 3, 1973; Т. 4–5, 1975.

Гісторыя Беларусі ў дакументах і матэрыялах. Т. 1. Мн., 1936; Т. 2, 1940.

Гісторыя беларускага тэатра. Т. 1. Мн., 1983. С. 212–218.

Голас Радзімы. 1982. 4 сак.; 1987. 18 чэрв.

Гордеев Б. П. Могилевщина: Памятники бессмертной славы. Мн., 1986. С. 140.

Гражданская война и военная интервенция в СССР: Энцикл. М., 1983. С. 119, 536.

Грицкевич А. П. Частновладельческие города Белоруссии в XVI–XVIII вв. Мн., 1975. С. 18, 63, 80.

Дела их золотом горят. Мн., 1976.

Дембовецкий А. С. Опыт описания Могилевской губернии: В 3 т. Могилев, 1882–1884.

Документы и материалы по истории Белоруссии: В 4 т. Мн., 1936, 1940, 1953, 1954.

Древности железного века в междуречье Десны и Днепра: Свод археологических источников. Вып. 11–12. М., 1962.

Егорейченко А. А. К истории населения Белоруссии в раннем железном веке // СА. 1982. № 1.

Ермаловіч М. І. Старажытная Беларусь: Полацкі і Новагародскі перыяды. Мн., 1990. С. 3–38, 75–77.

Живописная Россия / Под ред. П. Семёнова. Т. 3, ч. 2. Белорусское Полесье. СПб., 1882. С. 236, 301, 310, 410–411.

Жучкевич В. А. и др. Города и села Белорусской ССР: Ист.-геогр. очерки. Мн., 1959.

Загорульский Э. М. Древняя история Белоруссии: Очерки этнической истории и материальной культуры до IV в. Мн., 1977.

Записки Северо-Западного Императорского русского географического общества: В 4 кн. Вильня, 1910–1914.

Збор помнікаў гісторыі і культуры: Магілёўская вобласць. Мн., 1986. С. 380–387.

Зябловский Е. Землеописание Российской империи. Ч. 3. СПб., 1810.

Ігнатоўскі У. М. Кароткі нарыс гісторыі Беларусі. Мн., 1991.

Известия Могилевского Совета... 1918–1919.

Исаенко В. Ф. Археологическая карта Белоруссии: Памятники каменного века. Вып. 1. Мн., 1968.

Исторический вестник. Т. 22. СПб., 1885.

Их именами названы: Энцикл. справ. Мн., 1987.

Календарь для духовенства Могилевской епархии на 1899 год. Могилев, 1899.

Калечиц Е. Г. Первоначальное заселение Белоруссии. Мн., 1984.

Калечиц Е. Г. Памятники каменного и бронзового веков Восточной Белоруссии. Мн., 1987.

Кернажыцкі К. І. Гаспадарка прыгоннікаў Беларусі ў канцы XVIII і першай палове XIX ст. Мн., 1935.

Копытин В. Ф. Археологические памятники Шкловского района. Могилев, 1993. С. 27–49.

Коялович М. Чтение по истории Западной России. СПб., 1884.

Крестьянское движение в Белоруссии после отмены крепостного права (1861–1862 гг.): Док. и материалы. Мн., 1959.

Культура. 1993. 24 мая. С. 4–5.

Ластоўскі В. Ю. Кароткая гісторыя Беларусі. Вільня, 1910. С. 11–12, 218–219.

Левко О. Н. К проблеме этнокультурного развития населения северо-восточной Белоруссии в I – нач. II тысячелетия: Тез. докл. Мн., 1990.

Левко О. Н. К проблеме этнокультурного развития населения северо-восточной Белоруссии в I – нач. II тысячелетия // Славяне: адзінства і мнагастайнасць: Тэз. дакл. Мн., 1990.

Левко О. Н. Средневековая Орша и ее округа: Ист.-археол. очерк. Орша, 1993.

Левко О. Н. Памятники второй половины I тыс. н. э. северо-восточной Белоруссии в свете формирования племенных «княжений» // Гіст.-археал. зб. Мн., 1994. № 5.

Левко О. Н. Пути и характер расселения славян на территории северо-восточной Белоруссии // VI конгресс Муса. С. 38–41.

Левко О. Н., Колосовский Ю. В. К вопросу о культурной принадлежности городищ 3-й четверти I тыс. н. э. Оршанского Поднепровья // Археалогія і старажытная гісторыя Магілёўшчыны і сумежных тэрыторый. Магілёў, 1994. С. 133–141.

Легенды і паданні. Мн., 1983.

Лучин А. П. 1812 г.: Наполеон в пределах Могилевской губернии. Могилев, 1912.

Лысенко П. Ф. Дреговичи. Мн., 1991.

Магілёўшчына да дзесятае гадавіны Кастрычніцкай рэвалюцыі. Магілёў, 1927.

Маліцэўскі У. А., Пабока П. М. Шклоў // Нашы гарады. Мн., 1991. С. 294–301.

Мастацтва Беларусі. 1988. № 1. С. 69–71.

Митрофанов А. Г. Железный век средней Белоруссии (VII–VI вв. до н. э.– VII в. н. э.). Мн., 1978.

Могилевская епархия: Ист.-стат. описание: В 4 кн. Могилев, 1905–1908.

Могилевская область БССР. Мн., 1975.

Могилевская старина. Вып. 1. Могилев, 1900; Вып. 2, 1901; Вып. 3, 1903.

Могилевские губернские ведомости. Часть неофициальная. 1848. № 1; 1898. № 20.

Могилевские епархиальные ведомости. 1885–1906.

Могилевщина. Вып. 1. Могилев, 1991; Вып. 3, 1993.

Навеяно в сердце народном. Мн., 1984.

Народное образование в Могилевской губернии. 1912–1913 гг. Могилев, 1913.

Нарысы гісторыі Беларусі. Мн., 1995.

Насевіч В. Л. Род князёў Друцкіх у гісторыі Вялікага княства Літоўскага (XIV–XVI стст.): Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 81–103.

Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпоху жалеза. Мн., 1992. С. 83–86.

Обзор Могилевской губернии. Могилев, 1883–1915.

Обломский А. М. Племена лесной зоны и лесостепь в I–III стст. н. э. // Насельніцтва Беларусі і сумежных тэрыторый у эпоху жалеза. Мн., 1992. С. 83–86.

Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. СПб., 1857.

Описание городов и местечек Могилевской губернии. Могилев, 1882.

Опыт описания Могилевской губернии. Кн. 3. Могилев, 1882. С. 44–48.

Очерки Белоруссии: Ист. прошлое. СПб., 1876.

Очерки мятежного движения Могилевской губернии в 1863 г. Ч. 1–2. Вильня, 1865.

Очерки по археологии Белоруссии. Ч. 1, Мн., 1970; Ч. 2, 1972.

Очерки этнической истории и материальной культуры (до IX в.). Мн., 1977.

Памятные книжки Могилевской губернии на 1861—1916 гг.

Первоисточники для истории Могилевского края / Под ред. Е. Р. Романова. Вып. 1. Могилев, 1916.

Поболь Л. Д. Археологические памятники Белоруссии: Железный век. Мн., 1983.

Поболь Л. Д. Славянские древности Белоруссии: Железный век. Мн., 1979.

Поболь Л. Д. Славянские древности Белоруссии: Ранний этап зарубинецкой культуры. Мн., 1971.

Побратимы Матросова (Ежков). Мн., 1984. С. 211—218.

Подпольные комсомольские органы Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. Мн., 1976.

Подпольные партийные органы Компартии Белоруссии в годы Великой Отечественной войны. 1941—1945. Мн., 1975.

Полипенко М. Ф. Этнография Белоруссии. Мн., 1981.

Польскі С. А. Нарысы геаграфіі гарадоў Беларускай ССР. Мн., 1973. С. 121—122.

Помнікі гісторыі і культуры. 1984. № 2. С. 19—20.

Попов Р. Белоруссия и белорусы. Мн., 1879.

Прамень камунізму. 1935—1936.

Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі. Мн., 1988.

Преступления немецко-фашистских оккупантов в Белоруссии. Мн., 1963.

Романов Е. К эпохе 1812 года // Могилевские ведомости. 1896. № 42, 44, 60.

Романов Е. Р. Раскопки в имении Чирчино // Могилевская старина. Вып. 1. Могилев, 1900.

Романовский М. Т. Развитие мануфактурной промышленности Белоруссии (вторая половина XVIII — первая половина XIX века). Мн., 1966.

Россия: Полное геогр. описание нашего Отечества. Т. 9. Верхнее Поднепровье и Белоруссия. СПб., 1905. С. 468—470.

Русско-белорусские связи: Сб. док. Мн., 1963. С. 307—308, 316—317, 326.

Севостьянов Г. Н., Жуковская В. М. За линией фронта. Мн., 1981.

Седин А. А. Новые городища в Восточной Белоруссии (Могилевщина). Вып. 3. Могилев, 1992.

Седов В. В. Славяне Верхнего Поднепровья и Подвинья. М., 1970.

Седов В. В. Происхождение и ранняя история славян. М., 1979.

Симонов К. Разные дни войны. Т. 1. М., 1982. С. 100—101.

Слюнькова И. Н. Архитектура городов Верхнего Приднепровья. XVII — середина XIX в. Мн., 1992.

Спадчына. 1993—1994.

Список населенных местностей Могилевской губернии. Могилев, 1910. С. 17—21, 54—60, 137—139.

Старажытная беларуская літаратура. Мн., 1990. С. 50—59.

Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 88—89.

Статистический обзор Могилевской губернии по 1914 г. Могилев, 1915, февраль. С. 14—21.

Тарасаў С. В. Полацкае княства (Станаўленне і барацьба за дзяржаўную незалежнасць) // Старонкі гісторыі Беларусі. Мн., 1992. С. 37—46.

Тарасенко В. Р. К истории позднеродового общества на территории Белоруссии // Изв. АН БССР. 1948. № 2.

Ткачоў М. А. Замкі і людзі. Мн., 1991. С. 139—146.

Топографические примечания на знатнейшие места путешествия ея Императорского Величества в Белорусском наместничестве. СПб., 1780.

Топольская М. Б. Dobra Szklowskie na Bialorusi Wschodni ej XVII w. Warszawa, 1969, s. 35, 72, 74...

Третьяков П. Н. Восточнославянские племена. М., 1953.

Третьяков П. Н. По следам древних славянских племен. Л., 1982.

Турчинович Ф. Обозрение истории Белоруссии с древнейших времен. СПб., 1857.

Усе раёны БССР. Мн., 1933.

Фурсов М. В. Исторический очерк Могилевской губернии. Могилев, 1882.

Чантурия В. А. Архитектура Белоруссии к XVIII — началу XIX в. Мн., 1962. С. 7, 138, 217—218.

Шляхі калектывізацыі. 1930. № 5—7; 1931. № 7—11.

Штыхаў Г. В. Галасы далёкіх продкаў. Мн., 1968.

Штыхаў Г. В. Насельніцтва зямель Беларусі ў IX—XIII стст. З глыбіні вякоў. Наш край. Мн., 1992.

Шчарбакоў В. К. Нарыс гісторыі Беларусі. Ч. 1. Мн., 1934.

Эканамічная гісторыя Беларусі: Курс лекцый. Мн., 1993.

Этнаграфія Беларусі: Энцыкл. Мн., 1959.

ЗМЕСТ

Да чытача (17).

Ад часоў першабытных — 1917

Зямля нашых продкаў (19). З гісторыі вывучэння археалагічных помнікаў (19). Паселішчы каменнага і бронзавага вякоў (21). Помнікі эпохі жалеза і раняга сярэднявечча (25). Асваенне Шклоўшчыны славянамі (30). Рэестр помнікаў археалогіі (32). Старонкі мінулага (35). У складзе Вялікага княства Літоўскага (35). Шклоўскія землі ў XIY—XYIII стст.: межы, уладальнікі (38). Сімвал горада (41). Магнацкая і сялянская гаспадарка Шклоўскага графства (43). Апусташэнне за апусташэннем (44). У складзе Расійскай імперыі (47). На службе ў Расіі (48). Жыццё Зорыча ў Шклове (49). На рубяжы XYIII — XIX стст. (51). Пра Шклоўшчыну расказвалася (54). З дакументаў мінулага (57). Падзеі 1863 г. на Шклоўшчыне (62). Адміністрацыйна-тэрытарыяльны падзел на пачатак XX ст. (64). Царкоўныя прыходы (64). Царкоўнапрыходскія школы (66). Загінулі ў руска-японскую вайну 1904—1905 гг. (67). Напярэдадні першай рэвалюцыі ў Расіі (67). У гады першай сусветнай вайны (70). Родам са Шклоўшчыны (72).

1917—1941

Да новага грамадскага ладу (77). Ад Лютага да Кастрычніка (77). Дакументы сведчаць (79). Падпольны падраённы камітэт РКП(б) у Шклове (81). Радкі з газет (88). Актыўныя змагары за новы лад жыцця (90). Вачыма карэспандэнтаў (99). У мірны час (104). Першыя камуністычныя суботнікі (105). Радкі з газет (106). Са справаздачы павятовага і акружнога эканамсаветаў (108). Утварэнне раёна (108). З даклада нам. старшыні акрвыканкома аб стане Шклоўскага раёна... (109). З пратакола пленума Шклоўскага РК КП(б)Б ад 3 сак. 1926 г. (111). Радкі з газет (112). З даклада ў СНК БССР старшыні камісіі па эканамічным абследаванні Шклоўскага раёна (114). У некалькі радкоў (117). Пастанова бюро ЦК КП(б)Б «Аб становішчы ў Шклоўскай раённай партарганізацыі Магілёўскай акругі» (122). Са справаздачы аб дзейнасці райпартарганізацыі (125). У некалькі радкоў (126). Праверка сцвярджала (128). У некалькі радкоў (132). Удзельнікі УСГВ у 1940 г. (135). Ахвяры беспадстаўных рэпрэсій (137).

1941—1945

У гады Вялікай Айчыннай вайны (156). Абарона Шклова (157). У першыя месяцы акупацыі раёна (161). Палітыка рабаўніцтва, насілля, крывавага тэрору (162). Народ не пакарыўся (171). Букштынаў Ф. І. У барацьбе за вызваленне роднай зямлі (172). Партызанскія фарміраванні, якія дзейнічалі на Шклоўшчыне (175). Кірпіч Г. А. (179). Буланаў І. Дз. З успамінаў (180). Іваноў Р. С. З успамінаў (183). Счаслаўскі П. І. (184). З дакладной запіскі камандавання партызанскай брыгады «Чэкіст» у ЦК КП(б)Б (185). Атрады дзейнічаюць (188). Удары па ворагу мацнелі (201). Разведка дакладвала. З успамінаў П. А. Галіцына (210). Партызаны брыгады «Чэкіст», узнагароджаныя ордэнамі і медалямі СССР (212). Падполле дзейнічала (214). Надышоў час вызвалення (222). Дакументы сведчаць (223). Загад Вярхоўнага Галоўнакамандуючага (236). Адзначаны Зоркай Героя (236). Сляды вайны: матэрыяльныя і людскія страты (243). Воіны Чырвонай Арміі, якія загінулі ў гады Вялікай Айчыннай вайны пры абароне і вызваленні раёна... (256). Воіны-землякі, якія загінулі ці прапалі без вестак на франтах Вялікай Айчыннай вайны... (273). Спіс партызан брыгады «Чэкіст», якія загінулі ці прапалі без вестак у 1942 — ліпені 1944 г. (392). Ахвяры фашызму: мірныя грамадзяне раёна, загубленыя акупантамі (396).

1945 — да нашых дзён

Час адраджэння (411). Аднаўленне сельскіх Саветаў (413). Калгасы раёна. 1947 г. (413). Узнятыя з папялішчаў (414). Дом, у якім ядналіся сэрцы (415). Аб стане раёна на 1.01.1952 г. (417). Радкі з газеты (419). За годам — год, падзея за падзеяй (423). Вынікі работы народнай гаспадаркі раёна за 1995 г. (426). Працаваць і жыць за свой кошт (427). Вынікі эканамічнага і сацыяльнага развіцця раёна ў 1997 г. (429). Чалавек слаўны працай (429). Прысвоена званне «Маці-гераіня» (438). Акрыліліся на зямлі Шклоўскай (439). Удастоены звання «Заслужаны» (451). З матэрыяльнай і духоўнай спадчыны (459). Помнікі архітэктуры і будаўніцтва (459). Шклоўскі кадэцкі корпус (464). Шклоўскі балет (467). Экскурс у этнаграфічную спадчыну (471). Газетным радком (473). Літаратурная карта Шклоўшчыны (483). З гісторыі вёсак (489). Населеныя пункты Шклоўскага раёна (па стану на 1.01.1997 г.) (502). Рэха Чарнобыля (503). Афганскае водгулле (504). Бібліяграфія (506).

* * *

У пошуку і зборы матэрыялаў для гісторыка-дакументальнай хронікі «Памяць» прымалі ўдзел прадстаўнікі грамадскасці і краязнаўцы раёна: Р. А. Андрэева, Л. М. Анціпенка, Н. І. Буйніцкая, А. П. Грудзіна, С. М. Жукоўская, М. Ф. Ільюшэнка, Н. Н. Ільюшэнка, В. Ф. Капыцін, Э. А. Карніловіч, І. Я. Краўцоў, І. В. Кулікаў, Л. В. Кроцікаў, В. М. Паўлава, У. А. Паўлаў, А. Л. Турбінскі, А. М. Чупрынскі.

У падрыхтоўцы спісаў загінуўшых жыхароў раёна ўдзельнічалі супрацоўнікі райваенкамата, раённага, гарадскога і сельскіх Саветаў, праваахоўных органаў, раённага краязнаўчага музея.

Фота: А. Н. БЯЛЯСАЎ. З архіўных фондаў, перыядычных выданняў, фатаграфій, што захаваліся ў сем'ях грамадзян.

Навукова-папулярнае выданне

ПАМЯЦЬ

Гісторыка-дакументальная хроніка Шклоўскага раёна

Мастацкі рэдактар
Дз. Я. Дзівін

Тэхнічныя рэдактары
В. П. Безбародава,
В. М. Берсан

Карэктары
Л. В. Лебедзева,
Л. М. Макейчык,
А. З. Ліпень,
А. М. Кудлачонак

Здадзена ў набор 27.10.97. Падпісана да друку 10.08.98. Фармат 70×100 1/16. Папера афсетная. Гарнітура Кудрашоўская. Афсетны друк. Ум. друк. арк. 41,5. Ул.-выд. арк. 52,6. Тыраж 5000 экз. Заказ 2058.

Дзяржаўнае прадпрыемства выдавецтва «Універсітэцкае» Дзяржаўнага камітэта Рэспублікі Беларусь па друку. Ліцэнзія ЛВ № 9 ад 31.12.97. 220048, Мінск, пр. Машэрава, 11.

Ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга паліграфкамбінат ВІІП імя Я. Коласа. 220005, Мінск, вул. Чырвоная, 23.